# ПАХАВАННЕ
# ПАМІНКІ
# ГАЛАШЭННІ

БЕЛАРУСКАЯ
НАРОДНАЯ
ТВОРЧАСЦЬ

АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ
І ФАЛЬКЛОРУ

# БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1986

АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ
І ФАЛЬКЛОРУ

# ПАХАВАННІ
# ПАМІНКІ
# ГАЛАШЭННІ

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1986

ББК 82.3Бел-6
П21

Рэдакцыйная калегія:

В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік (галоўны рэдактар), Г. І. Цітовіч

Укладанне тэкстаў, уступны артыкул і каментарыі У. А. Васілевіча

Артыкул, сістэматызацыя і каментарыі напеваў Т. Б. Варфаламеевай

Рэдактар А. С. Фядосік

Рэцэнзенты:

Л. А. Малаш, Т. К. Чабан, кандыдаты філалагічных навук

**Пахаванні. Памінкі. Галашэнні**/Рэд. кал.: А. С. Фядосік

П21 (гал. рэд.) і інш.; Укладанне тэкстаў, уступ. артыкул і камент. У. А. Васілевіча; Артыкул, сістэматызацыя і камент. напеваў Т. Б. Варфаламеевай.— Мн.: Навука і тэхніка, 1986.— 615 с.: нот. іл.— (Беларус. нар. творчасць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).

Том з'яўляецца першым нацыянальным зборнікам, які аб'ядноўвае этнаграфічныя, фальклорныя і музычныя матэрыялы, звязаныя з пахаваннямі і памінкамі.

Кніга разлічана на фалькларыстаў, этнографаў, моваэнаўцаў, мастакоў, музыкантаў, выкладчыкаў, студэнтаў і інш.

П $\frac{4702120200-086}{М316-86}$ 128—86

ББК 82.3Бел-6

© Выдавецтва «Навука і тэхніка», 1986.

# БЕЛАРУСКІЯ ЖАЛОБНЫЯ АБРАДЫ І ГАЛАШЭННІ

Жалобныя ўшанаванні — пахаванні і памінкі — з'яўляюцца завяршальным звяном у сямейнай абраднасці. Са смерцю і бядой у дом прыходзілі турботы, звязаныя з праводзінамі нябожчыка ў апошні шлях. Пахавальны рытуал — гэта нібы падвядзенне вынікаў жыцця чалавека, даніна ўдзячнасці за яго прыжыццёвыя справы. Таму з самага моманту смерці і да аддання цела зямлі кожнае абрадавае дзеянне прасякнута глыбокай павагай і любоўю да памёршага. Усе самыя дарагія словы гучаць у галашэннях у дні апошняга развітання. Захоўваць памяць пра мёртвых і пасля хаўтур жывыя заўсёды лічылі за свяшчэнны абавязак.

Вывучэнне пахавальнай і памінальнай абраднасці нашага народа мае даволі глыбокія гістарычныя карэнні. Адзін з першых зваротаў да гэтай тэмы знаходзім мы ў XVI ст. у напісанай на лацінскай мове кнізе Яна Ласіцкага «Пра рэлігію, ахвярапрынашэнні, вясельныя, пахавальныя абрады русінаў, маскавітаў і татараў» [1]. Нягледзячы на пэўную тэндэнцыйнасць аўтара, пададзеныя звесткі маюць для нас вялікую каштоўнасць. Паводле меркаванняў сучасных даследчыкаў, этнаграфічныя запісы былі зроблены Я. Ласіцкім у наваколлі Заслаўя [2].

Аднак толькі ў XIX ст. пачынаецца сістэматычнае вывучэнне народнага быту і культуры беларусаў. Праца М. Чарноўскай [3] паклала пачатак даследаванням розных жанраў беларускага фальклору і народных звычаяў. Упершыню ёй было надрукавана апісанне радаўніцы на Беларусі па матэрыялах Чэрыкаўскага павета. Дакладна захаваўшы бытавыя дэталі, народныя выказванні, аўтар здолела адчуць гуманістычную сутнасць памінальных свят нашага народа. Кароткія звесткі пра радаўніцу і па-

---

[1] Łasicki J. De Russorum, Moskovilarum et Tartarorum Religione, sakrificiis, nuptiarum, funerum...— Spirae Nemetum, 1582, s. 243—246.

[2] Вяселле. Абрад / Уклад. К. А. Цвірка.— Мн., 1978, с. 6.— (Беларус. нар. творчасць).

[3] Czarnowska M. Zabytki mitologii słowiańskiej w zwyczajach wiejskiego ludu na Białej Rusi dochowywane.—Dziennik Wileński, 1817, t. 6, s. 400—403.

мінкі на Віцебшчыне знаходзім мы ў артыкуле К. Фалютынскага[4]. Першае апісанне святкавання дзядоў у сялянскай хаце са спробай асэнсавання гэтага звычаю, а таксама некаторыя моманты пахавальнага абраду пададзены ў нарысе А. Мухлінскага[5]. У пэўнай ступені дапаўняюць гэтыя звесткі старонкі кнігі Л. Галамбёўскага[6]. Значную цікавасць мае кніга А. Рыпінскага «Беларусь», у якой выказаны назіранні за галашэннямі па нябожчыках[7]. Аўтар адзначае пераважна імправізацыйны характар гэтага вуснапаэтычнага жанру. Каштоўнасць набываюць звесткі пра папярэдняе развучванне дзяўчатамі мелодыі галашэння.

Неаднаразова матэрыялы, звязаныя з пахаваннямі, памінкамі, народнымі вераваннямі пра смерць, з'яўляліся на старонках «Могилевских губернских ведомостей»[8]. Правядзенне пахавання і памінак у розных кутках Беларусі апісваецца ў радзе публікацый, змешчаных на старонках тагачаснай перыёдыкі[9].

У 1847 г. у Вільні выйшла на польскай мове кніга Яўстафія Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета», дзе ва ўсёй разнастайнасці пададзены цэлы шэраг памінальных абрадаў: прыкладзіны, радаўніца, стаўроўскія, змітраўскія і зімовыя дзяды, што дае магчымасць адчуць адметнасць кожнага з іх. Неабходна адзначыць, што ў публікацыях некаторых пазнейшых этнографаў і фалькларыстаў (П. М. Шпілеўскі, М. А. Дзмітрыеў і інш.) су-

---

[4] Фалютынский К. Народные праздники, увеселения, поверья и суеверные обряды жителей Белоруссии.— Вестник Европы, 1828, № 3—4, с. 82—83, 87, 91.

[5] Мухлинский А. Праздники, забавы, предрассудки и суеверные обряды простого народа в Новогрудском повете Литовско-Гродненской губернии.— Вестник Европы, 1830, № 14—16, с. 148—150, 153, 274.

[6] Gołębiowski Ł. Lud Polski, jego zwyczaje, zabobony.— Warszawa, 1830, s. 54.

[7] Rypiński A. Białoruś.— Paryż, 1840, s. 59—62.

[8] М. П. Праздник дедов в Белоруссии, 1842, № 3, с. 58 (перадрукавана затым у «Литературной газете», 1842, № 3); П. З. Дзяды (Семейная сцена из быта белорусских крестьян). 1849, № 17 (прыкметы, якія нібыта прадказваюць смерць, апублікаваны ў № 4, 6 за 1849 г.).

[9] J. J...wicz [Józef Jaroszewicz?]. Sobote pominalne.— Ondyna Druskienickich źródeł. Zesz. 1.— Grodno, 1846, s. 21—23; Юркевич И. Островский приход Виленской губернии Лидского уезда.— Этнографический сборник, издаваемый ИРГО. СПб, 1853, вып. 1, с. 290; Zieńkiewicz R. O uroczyskach ludu polskiego.— Bibliotcka warszawska, 1853, t. 1, s. 110—115; Анимелле Н. Быт белорусских крестьян.— Этнографический сборник, издаваемый ИРГО. СПб, 1854, вып. 2, с. 209—214; Неверович В. О праздниках, поверьях и обычаях у крестьян белорусского племени.—Памятная книжка Смоленской губернии на 1859 год.— СПб, 1859, с. 133—135, 145—152; Серебренников Ф. Обычаи и обряды крестьян Себежского уезда при крестинах, свадьбах и похоронах.— Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год.— СПб, 1865, с. 89—90.

стракаюцца фрагменты абрадаў, часам ледзь не дaслоўна перапісаныя з кнігі Я. Тышкевіча.

Пра пахаванне і памінкі дэталёва расказана этнографам і фалькларыстам П. М. Шпілеўскім[10]. За выключэннем запазычаных у Я. Тышкевіча апісанняў памінак, абрад пахавання зроблены самастойна. Аднак у перадачы П. М. Шпілеўскага ён перанасычаецца забабонамі, якім надаецца таямнічая значнасць. Некаторыя моманты пры гэтым не знаходзяць аналагаў ні ў адпаведнай літаратуры па беларускаму быту, ні ў абагульненых працах даследчыкаў гэтай тэмы. Такая акалічнасць дае падставы лічыць, што аўтар не заўсёды прытрымліваўся этнаграфічнай дакладнасці і ва ўгоду займальнасці падключаў часам фантазію. Ён упершыню ў XIX ст. надрукаваў адно беларускае галашэнне. Тры ўзоры галашэнняў (але названых песнямі) прыводзіць у манаграфіі «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» А. Кіркор[11]. Яго ж праца «Рэшткі язычніцтва ў святкаваннях, абрадах і песнях»[12] часткова паўтарае папярэднюю, а часткова створана на новым матэрыяле. Апісваючы народныя звычаі, аўтар падкрэслівае трываласць старажытных абрадаў у жыцці сялян, павагу ў народзе да памяці продкаў. Неабходнасць галашэння на любым пахаванні здаецца А. Кіркору нечым дзікім, ненатуральным, што ідзе не ад пачуцця, а ад традыцыі.

У канцы 50-х гадоў мінулага стагоддзя Генеральны штаб распачаў збор матэрыялаў па вывучэнню заходніх земляў Расіі. Афіцэрамі гэтай установы накопліваліся геаграфічныя, статыстычныя і этнаграфічныя звесткі па розных губернях. Пазней, у пачатку наступнага дзесяцігоддзя, пачалі выходзіць тамы, у ліку якіх былі і прысвечаныя губерням, населеным беларусамі. Сярод разнастайнай інфармацыі трапіла туды нямала этнаграфічнага матэрыялу (нярэдка, праўда, выкарыстанага з папярэдніх публікацый). Больш-менш арыгінальныя паведамленні па пахавальнай і памінальнай абраднасці зрэдку трапляюцца, бадай, толькі ў томе па Гродзенскай губерні[13].

У фальклорным зборніку М. А. Дзмітрыева побач з іншымі вуснапаэтычнымі і этнаграфічнымі матэрыяламі былі змешчаны запісы пахавання і сезонных памінак (часткова яны друкаваліся

---

[10] Шпилевский П. М. Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических поверьях.— Пантеон. СПб, 1856, т. 25, кн. 1, с. 12—30.

[11] Этнографический сборник, издаваемый ИРГО.— СПб, 1858, вып. 3, с. 150—154.

[12] Живописная Россия.— СПб; М., 1882, т. 3, ч. 2, с. 257—282.

[13] Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния.—СПб, 1863, ч. 2, с. 626, 837—839.

перад гэтым у «Памятнай кніжцы Віленскага генерал-губернатарства на 1868 год»), а таксама звязаныя са смерцю забабоны [14]. Некаторыя абрады, як адзначалася вышэй, былі перапісаны з друкаваных раней выданняў і толькі дзе-нідзе былі дапоўнены новымі фактамі. Змешчана тут таксама некалькі галашэнняў, часткова ўзятых з названай вышэй манаграфіі А. Кіркора, аднак у адрозненне ад яго М. А. Дзмітрыеў у гэтай форме выказвання чалавечага гора бачыў не проста звычай; ён даводзіў, што галашэнне ідзе «з глыбіні прастадушнага сэрца». Згадвалася ў кнізе некалькі павер'яў, якія, паводле народных уяўленняў, прадказваюць смерць. Нататкі свяшчэнніка Іаана Бермана змяшчаюць падрабязны пералік страў, якія звычайна рыхтаваліся для памінальнага стала, прыводзіцца досыць цікавая памінальная імправізацыя старца [15]. Разам з працай Бермана ў «Записках ИРГО» быў апублікаваны зборнік І. І. Насовіча «Беларускія песні». Уключаныя ў яго апісанні радаўніцы і дзядоў (с. 59, 63—64) часткова кампілятыўныя.

Кніга Ю. Ф. Крачкоўскага [16] з'явілася першай спробай абагульнення беларускага этнаграфічнага матэрыялу. Аўтар разам з уласнымі запісамі выкарыстаў са спасылкамі публікацыі папярэднікаў: Я. Тышкевіча, П. Баброўскага, М. Дзмітрыева. Зводзенне ў адзіную працу шматлікіх даных, сабраных у розных кутках, зроблена было не дзеля таго, каб вывесці нейкі агульны беларускі абрад, за што ў наш час ужо папракаўся Ю. Ф. Крачкоўскі [17]. Прыём, выкарыстаны ім, нельга лічыць ненавуковым, паколькі даследчык назапашанымі звесткамі, раскіданымі раней па розных крыніцах і сабранымі ўпершыню, меў мэтай з большай яснасцю паказаць шматграннасць праяўлення абрадаў на тэрыторыі Беларусі.

Артыкул А. Троіцкага «Уклад» [18] быў напісаны з пазіцыі праваслаўнага свяшчэнніка. Аднак побач з асуджэннем язычніцтва ў сямейных святах сялян аўтар шчыра захапляецца духоўнымі скарбамі народа: «А якое багацце матэрыялу, колькі народнай паэзіі,— словам, усё жыццё простага чалавека з усімі яго праява-

---

[14] Дмитриев М. А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев Северо-Западного края.— Вильна, 1869, с. 210—220, 258—262.

[15] Берман И. Календарь по народным преданиям в Воложинском приходе Виленской губернии Ошмянского уезда.— Записки ИРГО по отделению этнографии. СПб, 1873, т. 5, с. 28—31.

[16] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина.— М., 1874, с. 121—124, 156—160, 198—200.

[17] Бандарчык В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст.— Мн., 1964, с. 122.

[18] Литовские епархиальные ведомости, 1875, № 8, 11, 18, 30.

мі і адносінамі заключаецца ў народных вераваннях, легендах, галашэннях, казках, абрадах» [19]. Апублікаваны ім матэрыял змяшчае багата каштоўных этнаграфічных падрабязнасцей, тут жа цытуюцца фрагменты шасці галашэнняў. Некаторыя цікавыя звесткі можна знайсці ў нарысе А. Васільевай [20], хоць у ім нельга прыняць аўтарскае разуменне народнай этыкі. Значную каштоўнасць захоўвае да нашых дзён грунтоўная праца А. С. Дамбавецкага. У кнізе ўпершыню зроблена спроба разгледзець жыццё, быт беларусаў паводле іх саслоўяў: сялян, былую шляхту, мяшчан. Матэрыялы, часткова ўзятыя з папярэдніх друкаваных крыніц, паказваюць адметнасці характару розных сацыяльных груп, іх быту і жыццёвага ўкладу. Адбілася гэта, як відаць з апісанняў, і на правядзенні пахаванняў, памінак. У групе наезджага насельніцтва складальнік вылучае велікарусаў-стараабрадцаў, цыганоў і яўрэяў. Этнаграфічны матэрыял, сабраны ў гэтых раздзелах, сапраўды унікальны, паколькі паведамляе даволі рэдкасныя факты пра мала вывучаныя нацыянальныя меншасці Беларусі [21].

Жыццёвы лад жыхароў Палесся знайшоў шырокае асвятленне ў этнаграфічным зборніку Д. Г. Булгакоўскага «Пінчукі». Выклікаюць цікавасць народныя жалобныя абрады, а таксама прыкметы, павер'і, якія бытуюць сярод пінчукоў у сумныя дні развітання з нябожчыкам [22]. Прыводзіцца адно галашэнне, у асобны раздзел зведзены погляды сялян на смерць і на замагільнае жыццё.

Адна з найбольш значных постацей у беларускай фалькларыстыцы — Павел Васільевіч Шэйн. Першы яго зварот да тэмы праводзін чалавека ў апошні шлях на беларускім матэрыяле адбыўся ў зборніку «Беларускія народныя песні». Тут было змешчана пяць галашэнняў і некалькі этнаграфічных апісанняў [23]. Буйнейшая ж праца П. В. Шэйна «Матэрыялы для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю», якая выйшла ў некалькіх кнігах, па сённяшні дзень застаецца адной з найбольш каштоўных у гісторыі беларускай фалькларыстыкі. Самы поўны да гэтага часу збор беларускіх галашэнняў

---

[19] Литовские епархиальные ведомости, 1876, № 17, с. 137.

[20] Васильева А. Крестьянские поминки в Мозырском уезде.— Минские губернские ведомости, 1877, № 45 (часть неофициальная).

[21] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии.— Могилев, 1882, кн. 1, с. 493—494, 513, 637, 649—650, 673, 693, 765—767.

[22] Записки ИРГО по отделению этнографии.— СПб, 1890, т. 13, вып. 3, с. 185—187, 190—192.

[23] Шейн П. В. Белорусские народные песни с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями.— СПб, 1874, с. 370—377.

(звыш 80) і апісанняў абрадаў пахаванняў і памінак знаходзіцца ў адным з тамоў гэтага выдання (СПб, 1890, т. 1, ч. 2), дзе яны размешчаны па трох раздзелах, кожнаму з якіх папярэднічае уступнае слова складальніка. Даючы навуковую ацэнку памінкам, ён падзяляе іх на прыватныя і агульныя, або грамадскія. У агульных памінках у сваю чаргу Шэйн вылучае адпаведна порам года дзяды восеньскія, зімовыя, веснавыя (сярод іх — радаўніцу), летнія. Дзякуючы сетцы шматлікіх карэспандэнтаў у зборніку даволі шырока прадстаўлена геаграфія народных звычаяў. Сярод апісанняў, разнастайных па свайму стылю і навуковай вартасці, асабліва вылучаюцца запісы М. Я. Нікіфароўскага — бадай, самага таленавітага шэйнаўскага карэспандэнта. Глыбокай назіральнасцю пазначаны змешчаныя там нататкі М. Я. Нікіфароўскага пра пахавальныя галашэнні, пра вераванні ў прадказанне смерці. (Водгукам на гэты раздзел шэйнаўскага тома з'явілася публікацыя М. В. Доўнар-Запольскага, які адзначыў наяўнасць у кнізе «вельмі важнага для этнаграфічнай навукі матэрыялу з захаванымі прыкметамі сівой даўніны» і намаляваў агульную схему беларускіх пахавальных абрадаў[24].) У наступных тамах «Матэрыялаў...» Шэйн апублікаваў некаторыя творы, фальклорнае паходжанне якіх цвярджаць даволі складана, пад рубрыкамі «На хаўтурах, дзевяцінах і на радаўніцы» і «Малітвы і малітоўныя вершы»[25], а таксама дадатковыя апісанні дзядоў і радаўніцы, некаторыя павер'і[26].

Пачэснае месца ў беларускай навуцы займае «Смаленскі этнаграфічны зборнік» У. М. Дабравольскага, дзе ўпершыню было вывучана насельніцтва беларуска-рускага пагранічча. У раздзелах «Смерць. Пахаванне»[27] змешчаны абразок «Смерць бабы». Вучоны апісвае пахавальныя звычаі мясцовых жыхароў, уяўленні пра замагільнае жыццё, святкаванне радаўніцы і змітраўскай суботы, публікуе некалькі арыгінальных галашэнняў, песень старцаў і інш.

Народныя вераванні, у прыватнасці тыя, што звязаны з уяўленнямі пра смерць, душу, замагільны свет, былі надрукаваны на старонках кніг А. Я. Багдановіча, М. Я. Нікіфароўскага, А. К.

---

[24] М. З. Погребальные обряды белорусов.— Виленский вестник, 1890, № 197.

[25] Шейн П. В. Материалы...— СПб, 1893, т. 2, с. 652—673.

[26] Там жа, 1902, т. 3, с. 16—17, 68—69, 73, 89—90, 164, 353—354, 372—375, 516—518.

[27] Записки ИРГО по отделению этнографии.— СПб, 1894, т. 23, вып. 1, с. 303—337.

Сержпутоўскага[28]. У манументальнай працы М. Федароўскага прыкметы і забабоны класіфікаваны ў адпаведнасці з этапамі пахавальнага абраду[29]. У VI і VIII тамах «Люду беларускага», якія выйшлі ў 1960 і 1980 гг. у Варшаве, знайшлі месца адпаведна два і тры галашэнні.

Этнаграфічныя нарысы А. Р. Пшчолкі[30] пры яўным адбітку на іх белетрызацыі ўсё ж даюць дастаткова поўную карціну пра святказанне дзядоў, пра выпраўленне чалавека ў апошні шлях. У адным з твораў па ходу дзеяння прыводзіцца сем галашэнняў.

Паўднёва-ўсходняе беларуска-украінскае пагранічча падрабязна было даследавана М. М. Косіч у працы «Літвіны-беларусы Чарнігаўскай губерні, іх быт і песні»[31]. Апісанне радаўніцы ілюструецца фрагментам галашэння.

Этнаграфічныя публікацыі, прысвечаныя пахаванню ці памінкам, знаходзілі месца ў самых розных перыядычных выданнях. Часцей за ўсё ў іх паведамлялася аб правядзенні тых ці іншых абрадаў у канкрэтнай мясцовасці[32].

Шмат увагі ўдзяліў вывучэнню пахавальнай абраднасці беларусаў Еўдакім Раманавіч Раманаў. У «Матэрыялах для вывучэння гаворак Магілёўскай губерні»[33] ён змясціў некалькі галашэнняў маці па дзіцяці і прыкметы смерці. А пазней у адным з та-

[28] Богданович А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов.— Гродно, 1895, с. 22, 34, 50—57; Никифоровский Н. Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи.— Витебск, 1897, с. 2, 72, 245, 278—296; Сержпутоўскі А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў.— Мн., 1930, с. 205—212.

[29] Federowski M. Lud Białoruski na Rusi Litewskiej.— Kraków, 1887, t. 1, s. 318—323.

[30] П-ко А. Деды (Этнографический очерк из жизни лепельских белорусов).— Витебские губернские ведомости, 1898, № 76—78; его ж. Микитовы хаутуры (Очерки из жизни белорусских крестьян).— Витебские губернские ведомости, 1901, № 59, 69, 72, 77 (асобнае выданне: Пщелко А. Р. Микитовы хаутуры: Очерк из белорусской жизни.— 2-е изд.— Витебск, 1910).

[31] Живая старина, 1901, вып. 3—4, отд. 2, с. 5—6, 37—38.

[32] Л. С. Деды.— Гродненские губернские ведомости, 1891, № 97; [Без подпісу]. Дзеды.— Ковенские губернские ведомости, 1893, № 96; М. Р. Народный обычай.— Гродненские губернские ведомости, 1898, № 39; Городокский уезд.— Витебские губернские ведомости, 1902, № 156 (тут прыводзіцца цікавы спеў сляпога старца на могілках у час памінак); Wińcza H. Dziady na Litwie.— Tygodnik Illustrowany, 1904, № 44, s. 835—836 (каштоўнасць публікацыі складаюць не толькі маляўнічыя апісанні прыкладзін і дзядоў, але таксама ўпершыню ўжытыя унікальныя малюнкі і фотаздымкі); Sawicka I. Zwyczaje dziadów na Mińszczyźnie.— Ziemia, 1912, t. 3, n. 47, s. 765.

[33] Могилевские губернские ведомости, 1902, № 70—71 (перадрукавана затым у зб. «Могилевская старина».— Могилев, 1903, вып. 3, с. 67—68, 73—74).

моў асноўнай працы жыцця — «Беларускім зборніку» — Е. Р. Раманаў па схеме П. В. Шэйна надрукаваў запісы, асобна вылучаючы пахавальны абрад, агульныя памінкі і значную колькасць галашэнняў[34].

Імператарскае Рускае Геаграфічнае Таварыства (РГТ) пакінула даволі прыкметны след у гісторыі вывучэння характару, быту і духоўнай культуры нашага народа. На старонках «Этнографического обозрения», «Записок ИРГО по отделению этнографии» пастаянна друкаваліся каштоўныя працы вучоных-этнографаў, гісторыкаў, фалькларыстаў. Аднак значная частка архіўных матэрыялаў РГТ не была ў свой час надрукавана. Неабходнасцю знаёміць шырокія колы грамадскасці з архіўнымі багаццямі было выклікана з'яўленне кнігі Д. К. Зяленіна «Апісанне рукапісаў вучонага архіва Імператарскага Рускага Геаграфічнага Таварыства» (Пг., 1914—1916, вып. 1—3). Рукапісы, сабраныя ў архіве, у розныя часы дасылаліся членамі таварыства і аматарамі (настаўнікамі, чыноўнікамі, свяшчэннікамі), у значнай ступені пашыралі веды даследчыкаў, дапаўняючы вядомыя звесткі новымі фактамі.

Станаўленне беларускай савецкай навукі пра народную творчасць у значнай ступені звязана з імем выдатнага фалькларыста, этнографа і бібліёграфа А. А. Шлюбскага. У зборніку «Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны» (Мн., 1928, т. 2) у радзе з іншымі матэрыяламі змешчана 15 галашэнняў, а хаўтурны звычай скампанаваны ў сукупнасці народных прыкмет, павер'яў. А. А. Шлюбскі першы падвёў вынікі збіральніцкай працы папярэдніх этнографаў і фалькларыстаў, у тым ліку і ў галіне пахавальных абрадаў і галашэнняў, ім быў распрацаваны геаграфічны паказальнік на падставе даўніх і сучасных публікацый.

Па-ранейшаму прыцягвала ўвагу даследчыкаў беларускае Палессе. Грунтоўнае вывучэнне гэтага рэгіёна звязана з імем вядомага польскага вучонага К. Машынскага[35]. Звяртаючыся да тэмы сялянскай жалобы, этнограф намаляваў абстаноўку, якая панавала ў хаце падчас развітання з нябожчыкам і памінак, падрабязна праінфармаваў пра даты святкавання як прыватных, так і агульных памінальных дзён. Назіранні К. Машынскага за ста-

---

[34] Романов Е. Р. Белорусский сборник.— Вильна, 1912, вып. 8, с. 524—550.

[35] Moszyński K. Polesie wschodnie.— Warszawa, 1928, s. 208—214; яго ж. O badaniach muzyczno-etnograficznych na Polesiu.— Ludsłowiański. Kraków, 1933, t. 3, zcsz. 1, dział B. Etnografja, s. 73; яго ж. Kultura ludowa słowian.— Warszawa, 1968, t. 2, Kultura duchowa, cz. 2, s. 808.

нам плакальшчыцы ў момант узнікнення ў яе свядомасці слоў галашэння, роспыты пра спосабы стварэння гэтых рэчытатываў над нябожчыкам маюць вялікую навуковую каштоўнасць. Адзінае змешчанае беларускае галашэнне пададзена не ў арыгінале, а ў перакладзе на польскую мову. Народныя ўяўленні пра смерць асветлены таксама ў працах беларускага і польскага этнографа Ч. Пяткевіча[36]. Аўтар спыняе ўвагу на падрыхтоўцы чалавека да уласнай смерці, на ўдзеле ў пахаванні плакальшчыцы, прыводзіць узоры двух галашэнняў. У вялікім аглядзе ўсіх дзядоў Ч. Пяткевіч для паўнаты ўяўлення прыцягнуў назіранні папярэдніх даследчыкаў.

Першапраходцам у вывучэнні беларусаў, што насялялі тэрыторыю Латвіі, быў нястомны збіральнік беларускага фальклору, настаўнік, выдатны культурны дзеяч С. П. Сахараў. У сваім, на жаль, адзіным друкаваным зборніку фалькларыст змясціў 5 галашэнняў і даволі цікавую малітву старцаў, якая чыталася пры памінанні нябожчыкаў[37]. Кожнай групе твораў у зборніку пасланы кароткія папярэднія заўвагі збіральніка пра час і месца іх выканання.

У пасляваенны час апісанні пахавання і памінак, запісы галашэнняў сустракаюцца даволі рэдка. У выпушчаным чарговым томе збору твораў О. Кольберга[38] апублікаваны фрагменты апісанняў пахавання, зробленых рознымі збіральнікамі і, верагодна, самім аўтарам. У томе «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны» (Мн., 1961) змешчаны 2 галашэнні. У зборніку «Беларускі фальклор у сучасных запісах» (Мн., 1973), што выйшаў пад рэдакцыяй В. А. Захаравай, апублікавана 6 галашэнняў, сабраных на Брэстчыне. Пра сучасныя пахавальныя абрады напісана ў кнігах А. Мялешкі «Савецкая сямейная абраднасць Беларусі» (Мн., 1976, с. 194—215) і «Новыя грамадзянскія абрады і рытуалы» (Мн., 1978, с. 72—89). Былі таксама выдадзены «Рэкамендацыі па правядзенню жалобнага абраду пахавання» (Мн., 1978). Значную цікавасць уяўляе даследаванне Ф. Сяліцкага, прысвечанае жалобнай абраднасці Вілейшчыны[39], якое ўключае

---

[36] Pietkiewicz Cz. Dusza i śmierć w wierzeniach Białorusinów.— Ziemia, 1930, nr 10, s. 190—195; яго ж. Umarli w wierzeniach Białorusinów.— Pamiętnik warszawski, 1931, rok 3, zesz. 2, 3, s. 34—49, 70—89.

[37] Сахараў С. П. Народная творчасць латгальскіх і ілукстэнскіх беларусаў.— Рыга, 1940, вып. 1, с. 118—120.

[38] Kolberg O. Dzieła wszystkie, Białoruś — Polesie.—Wrocław—Poznań, 1968, t. 52, s. 308—310.

[39] Sielicki F. Pieśni pogrzebowe i dziadowskie, śpiewane w b. powiecie Wilejskim.— Acta Universitatis Wratislaviensis, nr 589, Slavica Wratislaviensia. Wrocław, 1982, t. 22, s. 91—104.

некалькі арыгінальных галашэнняў, а таксама цыкл нарысаў пра хаўтурныя абрады беларусаў Беласточчыны М. Шаховіча[40]. Апісанні вызначаюцца этнаграфічнай дакладнасцю, у іх дэталёва намаляваны ўсе этапы пахавальнага абраду, названы канкрэтныя мясціны бытавання тых ці іншых абрадавых асаблівасцей. У апошнія гады неаднаразова ў тэарэтычных даследаваннях беларускіх фалькларыстаў-музыказнаўцаў друкаваліся тэксты галашэнняў з нотамі[41].

Народныя вераванні пра смерць, замагільнае існаванне душы, шматлікія абрадавыя дэталі пахавання і памінак здаўна выклікалі цікавасць даследчыкаў. Фалькларысты, этнографы (П. В. Шэйн, Е. Р. Раманаў, М. В. Доўнар-Запольскі, А. Я. Багдановіч і інш.) нярэдка рабілі спробы вытлумачыць шматлікія і разнастайныя рытуальныя дзеянні, разгадаць ахутаны таямнічасцю магічны сэнс пэўнай з'явы і яе паходжанне. У XIX ст. з'яўляюцца працы, прысвечаныя пахавальным звычаям. Сур'ёзнай спробай вывучэння праблемы стала кніга А. Катляроўскага «Пра пахавальныя звычаі язычніцкіх славян» (М., 1868), у якой прадмет быў даследаваны ў гістарычным аспекце, на падставе шырокага кола крыніц разгледжаны формы пахавальных абрадаў ад самых першых упамінанняў пра іх у літаратуры розных славянскіх народаў. У разгляд вучонага трапляюць таксама беларускія матэрыялы. А. Катляроўскі ў кнізе, сціпла ім самім названай «карэктурнымі лістамі аднаго раздзела з навукі славянскай бытавой старажытнасці», прааналізаваў у параўнальным плане ўсе асноўныя моманты пахавальнага абраду, даў сістэмны агляд уяўленняў язычніцкіх славян пра пасмяротнае існаванне.

Значнае месца ў беларускай філалогіі, гісторыі займае фундаментальная праца Я. Ф. Карскага «Беларусы». У асобным з яе тамоў прасочваецца ўся жанравая структура беларускага фальклору, вылучаны таксама раздзел «Абрады пры пахаванні і пахавальныя галашэнні»[42]. Шматграннасць розных звычаяў дала Карскаму падставу сцвярджаць пра неаднолькавы час іх узнікнення: пачынаючы ад дагістарычнай эпохі часоў язычніцтва і

---

[40] «Хаўтурныя абрады», «Паміранне» (напісаны ў сааўтарстве з Янкам Леанчуком); «Нараджанне», «Развітальны вечар», «Пахаванне», «Душа», «Замагільнае жыццё».— Ніва, 1980, № 11, 15, 19, 21, 23, 25, 27.

[41] Елатаў В. І. Ад песні да песні.— Мн., 1961, с. 54—55; Можейко З. Песенная культура белорусского Полесья; Село Тонеж.— Мн., 1971, с. 20—21, 60—63, 203; Мажэйка З. Я. Песні беларускага Паазер'я.— Мн., 1982, с. 250—258.

[42] Карский Е. Ф. Белорусы.— М., 1916, т. 3: Очерки словесности белорусского племени, вып. 1. Народная поэзия, с. 295—324.

канчаючы сучаснасцю. Маладаследаванасць галашэнняў і абрадаў Я. Ф. Карскі вытлумачваў спецыфічнасцю абставін, у якіх яны праяўляліся. Выкарыстоўваючы запісы П. В. Шэйна, М. Я. Нікіфароўскага, У. М. Дабравольскага, Ю. Ф. Крачкоўскага, ён паэтапна разглядаў ход пахавальнага і памінальнага абрадаў. У даследаванні ў гістарычным аспекце аналізаваўся характар пахавальных абрадаў у славян: спальванне трупаў і закопванне ў зямлю. Аўтар спрабаваў высветліць сэнс некаторых магічных дзеянняў пахавальнага рытуалу. Звяртаючыся да абрадаў і галашэнняў, вучоны прыгадваў упамінанні пра іх у летапісах і старажытнай літаратуры. Формы пабудовы, вобразны строй галашэнняў (эпітэты, сімволіка і г. д.), паводле слушнага сцвярджэння Я. Ф. Карскага,— рысы глыбокай даўніны.

Значным крокам у вывучэнні тэмы пахавання была кніга А. Фішара, якую можна прызнаць, бадай, найпаўнейшым зводам жалобных абрадаў усёй славянскай тэрыторыі [43]. У ёй аўтар ахоплівае таксама этнаграфічныя даныя з быту многіх народаў свету. Багата асветлена ў кнізе і Беларусь. Увесь матэрыял размешчаны па некальгі раздзелах, дзе адлюстроўваюцца ўсе этапы сямейнай жалобы, пачынаючы ад прадчування смерці (прыкметы, вераванні) і агоніі да памінак пасля пахавання.

У 20-я гады даволі актыўна выступаў на ніве беларускай фалькларыстыкі выдатны пісьменнік З. Бядуля. Пахавальным галашэнням прысвечаны старонкі нарыса «Народная імправізацыя». Гэту паэтычную форму выказвання чалавечага гора пісьменнік называў «адной з першых форм у паэзіі», паколькі, на яго думку, галашэнне «творыцца не штучна, а ліецца з набалелай душы, з гаротнага сэрца проста, не задумваючыся аб тым, як сказаць свае словы, каб яны выходзілі прыгажэйшымі» [44]. З. Бядуля імкнуўся пранікнуць у душэўны стан чалавека ў момант яго вялікага гора (у якасці ілюстрацый былі ўзяты запісы Е. Р. Раманава).

Пра беларускія галашэнні ўпамінаецца таксама ў кнізе В. Бугеля [45]. На падставе матэрыялаў П. В. Шэйна пабудаваў сваё даследаванне пра беларускія памінальныя рытуалы Ю. Галомбэк [46].

---

[43] Fischer A. Zwyczaje pogrzebowe ludu polskiego.— Lwów, 1921.

[44] Беларускі каляндар на 1922 год.— Вільня, 1921, с. 26.

[45] Bugiel W. Lamentowa grupa pieśni pogrzebowych. Studium porównawcze.— Przemyśl, 1925, s. 23—26.

[46] Gołąbek J. Dziady białoruskie.— Lud, 1925, t. 4, serja 2, ogólnego zbioru, t. 25, s. 1—40.

У савецкі час пра галашэнні пісалася (дзе некалькімі радкамі, а дзе больш грунтоўна) у радзе навуковых і навучальных прац[47].

Значная літаратура па беларускіх пахавальных і памінальных абрадах і неадрыўна звязаных з імі галашэннях захавала з мінулых часоў каштоўныя звесткі з жыцця, побыту і духоўнага свету нашага народа. Сабраныя разам, яны даюць магчымасць разгледзець адзін з глыбінных аспектаў народнай культуры.

Пахавальны абрад беларусаў у асноўных сваіх момантах праводзіўся і праводзіцца аднолькава ва ўсіх рэгіёнах. Аднак кожны этап стабільных абрадавых дзеянняў у залежнасці ад геаграфічнага бытавання характарызуецца шматлікімі дадатковымі праявамі, афарбоўваецца мясцовымі традыцыямі. Звядзенне розных фактаў не мае на мэце вывесці нейкі адзіны нацыянальны абрад (адзіным, нават з пэўнымі агаворкамі, выглядае ён хіба што ў схеме сваіх асноўных этапаў). Такая спроба непатрэбная і немагчымая, бо нярэдка пры параўнанні некаторых абрадавых момантаў можна назіраць зусім непадобныя і нават супрацьлеглыя дзеянні, абумоўленыя мясцовымі ўяўленнямі, павер'ямі.

Перш чым пачынаць разгляд уласна пахавальнага абраду, варта і нават неабходна закрануць пытанне, неад'емнае ад праблем вывучэння фальклору, народнай псіхалогіі і свядомасці. Сама з'ява смерці ўяўляецца чалавеку наколькі натуральнай і прывычнай, настолькі ж загадкавай і таямнічай. У сваіх імкненнях зразумець гэту з'яву чалавечае мысленне нарадзіла шмат паданняў і казак, прыкмет і забабонаў. Чалавек спрабаваў спасцігнуць таямніцу смерці праз знешнія праявы прыроды ці бытавыя здарэнні, спрабаваў прадказаць набліжэнне канчыны блізкага ці знаёмага праз бачаны сон. Калі ў радзе выпадкаў уважлівыя назіранні маглі ў сапраўднасці прыкмеціць узнікненне прычын недалёкай смерці, то нярэдка прадказванні хуткага адыходу з жыцця засноўваліся на адной выдумцы. Тым не менш, відаць, не варта народныя павер'і (не толькі тыя, што датычаць смерці) заўсёды зводзіць толькі да забітасці, інтэлектуальнай неразвітасці нашых продкаў, хоць гэты фактар таксама меў істотнае месца. Больш

---

[47] Грынблат М. Я.— У кн.: Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць. Мн., 1967, с. 88—90; Кабашнікаў К. П. Нарысы па беларускаму фальклору.— Мн., 1963, с. 52—53; яго ж. Ад традыцыйнага фальклору да рэвалюцыйнай паэзіі.— Мн., 1969, с. 20—22; Ахрыменка П. П.— У кн.: Беларуская вуснапаэтычная творчасць / Пад рэд. М. Р. Ларчанкі. Мн., 1966, с. 84—85; Фядосік А. С. Пахавальныя галашэнні.— У кн.: Беларуская народна-паэтычная творчасць / Пад рэд. М. Р. Ларчанкі. Мн., 1979, с. 220—229; Пилипенко М. Ф. Этнография Белоруссии.— Мн. 1981, с. 130 і інш.

падрабязна аналізуючы тыя ці іншыя прыкметы, павер'і, нават забабоны, мы адчуем, як моцна выступаюць у іх асацыятыўныя сувязі, як чалавечае мысленне ўстанаўлівае нябачныя на першы пагляд даволі пераканаўчыя аналогіі між рэальнымі падзеямі і магчымымі іх вынікамі. Няма гаворкі, любы народ у сваёй свядомасці носіць вялікі запас забабонаў і павер'яў — вынік шматвяковай забітасці, прыгнечанасці. Але пранікненне за абалонку гэтай сферы дапаможа адчуць паэтычнае, казачна-фантастычнае пераўтварэнне навакольных з'яў; неразуменне таямніц прыроды, таямніц жыцця прыводзіць да алегарычнага тлумачэння свету. І таму вельмі важна не сарамліва замоўчваць выдаткі змрочнага мінулага ў свядомасці народа, не накідвацца паспешліва з ваяўнічым запалам на развянчанне таго, што абверг адукаваны век, а паспрабаваць пранікнуць у глыбіню народнай думкі, прайсціся па зарослых сцежках народных уяўленняў. Такое вывучэнне адкрыла б іншую грань светаўспрымання нашых продкаў, і мы б убачылі тыя непасрэдныя сувязі (па-свойму лагічна абумоўленыя!), якія яднаюць жыццё рэальнае з міфічным, выдуманым светам. Неабходна адзначыць, што шырока распаўсюджаныя некалі прымхі і павер'і далёка не заўсёды браліся народам на веру. Вельмі часта яны існавалі самі па сабе як вынік яго фантазіі — побач з казкамі, паданнямі і іншымі фальклорнымі жанрамі. Зрэшты ледзь не ўсе абрадавыя дзеянні заснаваны іменна на разнастайных павер'ях. Іх нельга абысці як найбольш старажытны элемент пахавання і памінак.

Да ліку павер'яў, якія нібыта прадказвалі набліжэнне смерці, адносіліся між іншым і наступныя: калі сабака вые ўгору, калі зязюля кукуе на страсе, калі курыца запяе пеўнем, калі ў хату праз разбітую шыбу залятае птушка, калі ўночы дзверы самі сабой расчыняюцца і г. д. Лічылася, што надыходу смерці папярэднічаюць таксама некаторыя сны: царква, чорныя харугвы, свечкі, абразы, выкапаная магіла; калі нехта падае ў яму або вядзе баразну, выганяе скаціну ў поле; белая свіння, каршун, які каго-небудзь задзірае; калі выпадае зуб, калі сякуць дрэва, калі з'яўляюцца памершыя раней бацькі, балота, пясок, гліна і інш.

У дахрысціянскія часы характар пахавальных абрадаў у славянскіх плямёнаў (крывічоў, радзімічаў) быў неаднолькавы. Да найбольш старажытнай формы адносіцца спальванне мёртвых. Здаўна агонь лічыўся сімвалам ачышчэння, яму таксама прыпісвалася ўласцівасць абароны ад нячыстай сілы. Выкарыстанне агню на пахаваннях і памінках у больш позпія часы і нават сёння ўзыходзіць да старажытных часоў культу агню. Аднак дзесьці з пачатку нашай эры адданне мёртвых зямлі стала асноўнай фор-

май пахавання. Паводле навуковых сведчанняў, звычай хаваць у труне бярэ пачатак з Грэцыі.

З прыходам на ўсходнеславянскія землі хрысціянства ва ўсіх сферах жыцця нашых продкаў адбыліся істотныя пераўтварэнні. Новая вера, што прыйшла на змену старой, рашуча змагалася з язычніцкай спадчынай: дзе падмяняла яе, а дзе, адчуўшы пэўную сугучнасць, выкарыстоўвала ў сваёй рэлігійнай палітыцы, надаючы ёй новы хрысціянскі характар. Бадай, ніводны з народных звычаяў не адчуў на сабе такога ярка выразнага ўплыву хрысціянства, як пахаванне і памінкі. У выніку сучасныя жалобныя абрады, як пісаў Я. Ф. Карскі, «змяшчаюць толькі нязначныя рэшткі, якія ўжыліся разам з хрысціянствам, ад глыбокай даўніны, калі яны знаходзілі для сябе адпаведны грунт у агульным рэлігійным язычніцкім светасузіранні»[48]. Язычніцкі і хрысціянскі элементы зжыліся і цесна перапляліся ў гэтых абрадах, захоўваючы ва ўспрыняцці народа адзіную, непадзельную жалобную ўрачыстасць.

Спрадвеку ў сялянскай свядомасці жыло цвёрдае перакананне: сваю смерць чалавек павінен сустракаць ва ўласнай хаце. Іменна сюды, у сумную перадсмяротную гадзіну, збяруцца сваякі і суседзі, а калі надыдзе смерць — сын закрые вочы, а дачка пагалосіць. І наадварот, нядобрым знакам лічылася сустрэць чалавеку смерць не ў родных сценах.

Адчуўшы набліжэнне смерці, хворы звычайна, калі быў пры памяці, прасіў паклікаць свяшчэнніка для апошняй споведзі. Гэта рабілася, калі царква знаходзілася непадалёку. У іншых выпадках паміралі без споведзі — тады старэйшы ў сям'і павінен быў перахрысціць паміраючага. Адначасова па жаданню хворага заходзілі яго родныя і сябры, і ў іх прысутнасці ён навучаў членаў сям'і, як у далейшым весці гаспадарку, прасіў не сварыцца, жыць у згодзе, паважаць пераемніка, аддаваў распараджэнні наконт падзелу паміж блізкімі маёмасці. Перад кананнем хворы абавязкова прасіў ва ўсіх прысутных дараваць яму прыжыццёвыя крыўды. Пры цяжкай смерці сваякі стараліся палегчыць пакуты паміраючага. Народнае тлумачэнне маруднай смерці цеснай зітаванасцю душы і цела нарадзіла павер'е развязваць пры цяжкім кананні вузлы, расшпільваць гузікі, адмыкаць замкі. Адным словам, раз'ядноўваліся магчымыя ўвасабленні душы і спакутаванага цела. А каб душа не шукала доўга выйсця і свабодна пакінула памяшканне, адчынялі дзверы ў хаце, вароты ў хляве, у коміне душнікі, зрывалі дошкі са столі, вымалі верхні касяк дзвя-

[48] Карский Е. Ф. Белорусы, т. 3, вып. 1, с. 298.

рэй. Пры асабліва цяжкай агоніі пасылалі ў царкву, каб свяшчэннік адчыніў царскія вароты.

Лічылася, што душа без болю адыдзе ў вечнасць, калі канаючаму даць свечку. Найбольшай пашанай карысталіся ў народзе свечкі, пасвечаныя ў царкве на грамніцы або ў перадвелікодны тыдзень. Гэтыя свечкі пастаянна захоўваліся ў доме на самыя розныя выпадкі — ці сямейныя нагоды, ці навальніцы. Здаўна ўзнікла вера, што запаленая свечка, дадзеная безнадзейна хвораму ў апошнія хвіліны яго жыцця, асвятляе шлях на той свет. Яна ўшаноўвалася як знак пакаяння і даравання грахоў. У момант надыходу смерці нехта з блізкіх тушыў свечку, пры гэтым сачылі, у якім напрамку пойдзе дым: калі ўгору — душа, маўляў, ідзе да праведных, калі сцелецца па зямлі — напакутуецца. (Нешта падобнае назіралася яшчэ ў час хваробы. Калі дым задзьмутай свечкі слаўся па лаве — бачылі ў гэтым прадказанне блізкай смерці, калі ішоў угору — справа павінна пайсці на папраўку.) Затым гэту свечку ставілі ў пасудзіну з зернем.

Нябожчыку шчыльна закрывалі рот і «спячатвалі» вочы («каб не ўцягнуў у сябе ці не выгледзеў каго з жывых»). Рабілі гэта самыя блізкія. У цяперашні час з надыходам смерці ў доме спыняецца гадзіннік і хаваюцца ці завешваюцца люстэркі і ўсё бліскучае — нябожчык не павінен «бачыць» свой адбітак.

Адначасова бліжэйшыя з радні жанчыны пачыналі першыя галашэнні. Часам, каб паведаміць пра смерць аднавяскоўцам, выходзілі галасіць на вуліцу.

Адразу некага з хатніх пасылалі ў царкву «па рэчы», неабходныя для правядзення пахавання: крыж (распяцце), харугвы («прачэсы», «значкі»), венчык для нябожчыка і малітву, часам — ручны званок і пакрывала. Прасілі свяшчэнніка «на пад'ём», перадавалі грошы «на пазвоннае», каб царкоўным звонам апавясціць наваколле пра смерць чалавека.

У той жа час хтосьці з хатніх жанчын ці суседка пачыналі распальваць печ звычайна саломай ці тонкімі паленцамі, каб нагрэць ваду для мыцця нябожчыка. Здаралася, у ваду падкладвалі некаторыя травы. Разам з вадой гатаваўся сціплы абед для тых, хто прымаў удзел у падрыхтоўцы пахавання. Як правіла, людзі, што мылі і апраналі нябожчыка, рабілі і неслі труну, капалі яму і г. д., не павінны былі знаходзіцца ў сваяцтве, прынамсі цесным, з нябожчыкам. Адмаўляць у дапамозе лічылася вялікім грахом: «І мы памром, і нас людзечкі добрыя будуць мыць». Плата за якую б там ні было дапамогу ў перыяд пахавання бралася надзвычай рэдка. У пераважнай большасці выпадкаў памёршага мылі два-тры чалавекі свайго полу, хутчэй за ўсё сябры.

У заходняй частцы Беларусі гэта справа даручалася нярэдка старэнькім абмывальшчыцам. У часе мыцця акрамя занятых непасрэдна гэтай справай ніхто са староніх не меў права прысутнічаць — існавала нават пагроза асабістай смерці. Вадзе, якой мылі цела, даволі часта прыпісваліся незвычайныя ўласцівасці. Так, верылі, што таму, хто да гэтага часу баяўся нябожчыкаў, варта памыцца гэтай вадой, як яго страх назаўсёды пройдзе. Тую ваду, здаралася, прымалі за сродак збавення ад зубнога болю. Цяжка паверыць, што падобныя рэчы правяраліся на практыцы. Часцей за ўсё вада ад мыцця нябожчыка лічылася шкоднай, і яе стараліся выліць туды, дзе не свеціць сонца, дзе не ходзяць людзі і жывёлы — пад вугал нежылой забудовы. Нельга нічога было выліваць каля пчол, бо інакш тыя маглі перамерці, а новыя не завесціся. Як бачым, за гэтымі павер'ямі праглядаюцца элементарныя правілы гігіены. Са смерцю чалавека яго хвароба магла і не пакінуць хату. Таму ваду вылівалі ў месца, схаванае ад людскога вока, спальвалі салому, на якой ляжаў нябожчык, і адзежу, у якой паміраў, асабліва калі прычынай смерці была заразная хвароба.

Яшчэ пры жыцці чалавек клапаціўся пра тое, у чым, у якім убранні з'явіцца ён на сустрэчу са сваімі продкамі. Пры падрыхтоўцы да смерці, калі быў хоць які дастатак, у куфар звычайна адкладвалася самае лепшае, чыстае адзенне. На Віцебшчыне жанчына захоўвала смяротную кашулю ў кубле і ў вольную часіну разглядвала яе, гаварыла з ёю.

Цікава ў гэтай сувязі прывесці ўрывак з артыкула Міхася Раманюка: «Многае з таго, чым мог бы ганарыцца наш нашчадак, адышло ў нябыт разам са сваімі стваральніцамі.

У гэтым павінны не толькі мы, час, але і адвечны звычай нашых бацькоў — хаваць нябожчыка ў святочна нашытым і натыканым чырвонымі крыжыкамі, зоркамі і ромбікамі адзенні сваёй работы. Прыгадваецца сустрэча ў в. Морач Клецкага раёна, калі адна з бабуль на маю просьбу прадаць музею нашытую саматканую кашулю адказала: «Хачу, дзеткі, каб у адзёжы сваёй работы мяне і пахавалі, бо на тым свеце дзяды не пазнаюць, хто мы» [49].

Вядомы выпадкі, калі на смерць адкладвалася вянчальная адзежа, якую калі і апраналі, дык рэдка і ў самыя важныя моманты жыцця.

Апраналі нябожчыка, як правіла, згодна з яго завяшчаннем, улічваючы таксама ўстойлівыя мясцовыя традыцыі. Амаль на

---

[49] Раманюк М. Мелодыі народнага хараства.— Літ. і маст., 1980, № 33, 15/VIII, с. 14.

усёй тэрыторыі Беларусі сяляне калісьці хавалі сваіх нябожчыкаў у самаробнай палатнянай адзежы. У больш позніяя часы, калі перавагу пачалі аддаваць прамысловым вырабам, адзежа на нябожчыка была купленая і ў асноўным цёмная.

Цела перавязвалася поясам, за які закладвалі нож, кашалёк ці кавалак палатна ў выглядзе ручніка. Дарэчы прыгадаць, што некаторых прадстаўнікоў пануючых класаў калісьці клалі ў труну, падперазаных славутымі слуцкімі паясамі[50].

На ногі нацягваліся белыя, зрэдку, наадварот, чорныя панчохі, калі ж іх не было — закручвалі ногі ў чыстыя палатняныя анучы, затым абувалі ў новыя лыкавыя лапці. Найбольш заможных клалі ў ботах. Шмат у якіх кутках Беларусі і цяпер захаваўся звычай класці мужчыне ў труну галаўны ўбор — палатняную ці войлачную шапку.

Ва ўсім строі жанчын дамінавалі белыя колеры: у кашулі, спадніцы, падперазанай тасёмкай, хустцы або намётцы, панчохах. Калі ж у мясцовай традыцыі адзежа вызначалася яркасцю колераў, гэта адбівалася і на адзенні, прызначаным для апошняга шляху: чырвоны баваўняны андарак, кофта з чырвонымі ўзорамі, сарочка з тканымі чорнымі і чырвонымі ніткамі, каптур быў павязаны на галаве цёмнай хусткай, радзей выкарыстоўваліся каляровыя хусткі. На ногі ў панчохах ці анучках надзяваліся лапці або загадзя ці наспех пашытыя з чорнага каленкору чаравікі. З часам крамная адзежа і абутак амаль выцеснілі выробленыя ўласнымі рукамі.

На Палессі характэрнай асаблівасцю пры ўбранні жанатых людзей маладога яшчэ веку было тое, што ім расшпільвалі каўняры ў кашулях і не завязвалі галаўных убораў і панчох. Гэта тлумачылася павер'ем, паводле якога жывым удаве ці ўдаўцу лягчэй было неўзабаве ўступіць у новы шлюб. І наадварот, хусцінка завязвалася на шыі ў памёршага маладога хлопца (Горацкі павет), нібыта сімвал не завязанага пры жыцці сямейнага вузла. Іменна таму пахаванні хлопцаў і дзяўчат на некаторых этапах пераклікаюцца з вясельным абрадам.

Звычайна маладых нябожчыкаў апраналі як пад вянец. Гэты звычай захаваўся да нашых дзён. Дзяўчат прыбіралі ў белае, прычасаная галава магла быць непакрытая, ці на яе ўскладваўся прыбраны кветкамі вэлюм, ці рознакаляровыя стужкі, ці вянкі,

[50] У фондах Дзяржаўнага музея БССР (н/в 10 503) захоўваецца «літы» слуцкі пояс, знойдзены ў наш час у Мазыры, у магіле памешчыка і ваяводы Лінкевіча, пахаванага ў 1837 г. Пра пахаванне магнатаў і шляхты на Беларусі гл. кн.: Мальдзіс А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя.— Мн., 1982, с. 204—205.

ці павязвалі белую або каляровую хустку, паклаўшы побач букеты з руты. Ручнікі навешвалі на харугвы і крыжы, прынесеныя з царквы, а таксама ўскладвалі на рукі маладых нябожчыкаў як спадзяванне, што на тым свеце шлюб адбудзецца. (Вядома, што ручнічкамі звязваюцца рукі жаніха і нявесты, калі тыя бяруць шлюб.) У завяршэнне на рукі нежанатых нябожчыкаў надзяваліся шлюбныя пярсцёнкі.

Малых дзяцей прыбіралі аднолькава: без галаўнога ўбору, у белай кашульцы і панчохах.

Амаль заўсёды нябожчыку — у кішэню ці за пазуху — клалі дробныя грошы, каб на тым свеце ён мог расплаціцца за месца і мёртвыя не прагналі яго з могілак. У рукі, складзеныя на грудзях, даюць насоўку. Да застывання рукі і ногі звязваюць, рот падвязваюць хусцінкай; на вочы, калі яны не закрываліся, клалі медныя манеты, расправлялі скажоныя рысы твару, расчэсвалі. Памёршым сваёй смерцю давалася ў рукі свечка ці абразок.

Пасля ўсіх прыгатаванняў да таго часу, пакуль зробяць труну, цела клалі на спецыяльна адведзенае месца, часцей за ўсё на лаву, на покуці — галавой да абразоў, а нагамі да дзвярэй, што, як і вынас нагамі ўперад, як бы сімвалізавала выхад смерці з дому. Каля галавы ставілі бохан хлеба. Прынесеная з царквы пратэса («прачэса») ставілася на прызбе да вынасу труны, паведамляючы ўсім яшчэ з вуліцы, што ў хаце жалоба.

Неўзабаве пасля таго як прыбяруць нябожчыка і пакладуць на пачэсны кут, без запрашэння пачыналі прыходзіць знаёмыя і суседзі — вестка пра смерць разносілася хутка. Стаўшы над нябожчыкам, маліліся, жанчыны галасілі, мужчыны звярталіся да яго з рознымі пытаннямі, як да жывога. Усе суцяшалі родных, тыя расказвалі падрабязнасці канчыны, успаміналі яго добрымі словамі.

Абавязковым у пахавальным абрадзе лічылася амаль беспераліннае чытанне ці спяванне пры памёршым псалтыра. Звычайна запрашалі чытаць вясковага грамацея.

У перыяд знаходжання нябожчыка хата несла жалобу, што выяўлялася не толькі ў сумным настроі блізкіх і падрыхтоўцы да пахавання, але і ў іншых, прадыктаваных абрадам звычаях. Дзе-нідзе адной з асноўных праяў знешняй жалобы было і застаецца чорнае адзенне на сваяках ці прынамсі чорная хустка на галаве ў жанчыны. З вокнаў вывешваліся белыя ручнікі, на падаконніках ставіліся шклянка чыстай вады, хлеб-соль. Усё гэта было прызначана для душы, якая, паводле вераванняў, пакінула цела і на працягу дзевяці (ці сарака) дзён мусіць наведваць родныя сцены, дзе зможа пачаставацца, памыцца і выцерціся. Пакуль ня-

божчык знаходзіўся ў хаце, падлога пакідалася немяцёная. Не прынята было з той хаты пазычаць — каб смерць не з'явілася і ў іншую сям'ю. Ніхто ў сям'і ў гэтыя сумныя дні не працуе. Часам жалобны настрой ахопліваў усё сяло, і да самага пахавання стараліся не выконваць некаторых гаспадарчых заняткаў. Асабліва забараняліся дзеянні, звязаныя з зараджэннем новага жыцця. У такія дні пазбягалі сеяць, падкладваць яйкі пад квактуху і г. д. Нават нараджэнне дзіцяці ў час, калі ў сяло прыйшла смерць, лічылася непажаданым. Відаць, клопатам пра будучага чалавека, пра тое, каб прыход яго ў гэты свет адбыўся нармальна, былі выкліканы розныя правілы, звычаі, якія патрабавалі ад цяжарных жанчын пэўных паводзін на пахаванні. Сам факт смерці, трагічны ў сваёй сутнасці, здольны сур'ёзна падзейнічаць на нервовы і псіхічны стан чалавека. Жанчыну, якая носіць у сабе новае жыццё і з асаблівай вастрынёй успрымае ўсе навакольныя падзеі, смерць блізкага чалавека можа надзвычай моцна ўразіць, што тоіць у сабе пагрозу для здароўя будучага дзіцяці. Таму ў кульмінацыйныя моманты абраду, як, напрыклад, калі труну заносяць у дом, калі кладуць у яе нябожчыка, калі выносяць з дому і г. д., узмацняўся плач і гора адчувалася яшчэ з большай сілай, цяжарныя абавязаны былі пакідаць хату. Ва ўсім гэтым праглядваецца звычайны клопат пра жывых і тых, хто неўзабаве з'явіцца на гэты свет.

Не толькі ў знак жалобы, а хутчэй за ўсё з гігіенічных меркаванняў, пазбаўляючыся цяжкага паветра, хату пасыпалі ў залежнасці ад пары года ці аерам, ці яловымі галінкамі або духмянымі раслінамі. Старэйшыя людзі вельмі часта падкурвалі памёршага, яго ложа, усю хату засушанай травой, што захоўвалася ў любой гаспадыні.

Пастаянна каля нябожчыка хто-небудзь знаходзіўся. Калі не было блізкіх, на ноч без запрашэння з'яўляліся суседзі — паглядзець, успомніць свайго аднавяскоўца.

У ліку іншых клопатаў узнікала пытанне, каго запрасіць капаць магілу і зрабіць труну. Звычайна на такую справу запрашаліся майстры, вопытныя суседзі ці далёкія сваякі. Выконваць гэту работу не лічылася грахом нават у свята. Рабілі, як правіла, без грошай, але гаспадары лічылі сваім абавязкам добра пачаставаць тых, хто ў цяжкую хвіліну прыйшоў на дапамогу. Пачастунак паўтараўся і пасля зробленай работы. Труну збівалі з сасновых ці яловых дошак. Дно труны амаль паўсюдна выкладвалася прутамі і лісцем ад нарыхтаваных венікаў, сенам, травамі ці свежымі кветкамі, паверх пасцілаўся кавалак палатна. Бакавыя сценкі або пакідалі некранутымі, або аббівалі белым каленкорам

ці таксама палатном. Рэшткі, што заставаліся пры вырабе дамавіны — стружкі, трэскі,— нярэдка клалі ў сярэдзіну, ці выкідвалі дзе-небудзь каля плота на мяжы, або спальвалі.

Паўсюдна аднačасова з прадметамі, якія патрабаваліся ці лічыліся пажаданымі паводле царкоўнага абраду — венчык, малітва, абразок, свечка,— нябожчыку клалі ў труну любімыя ім або неабходныя пры жыцці рэчы: курыльшчыку — люльку з капшуком, тытунь, крэмень, крэсіва, а хто любіў нюхаць — табакерку, карты, амаль заўсёды грошы, рабочыя прылады — нож, сякеру, серп і г. д. Рамеснікам давалі адпаведныя іх занятку інструменты. Складванне ў труну прадметаў звязвалася з тым, што «замагільны свет разумеўся, як працяг зямнога» [51]. Развітанне з чалавекам выглядае ў народным абрадзе як провады ў амаль рэальны далёкі шлях, таму выпраўленне нябожчыка як жывога кранае сваёй наіўнай верай у тое, што ўсё неабходнае падарожніку спатрэбіцца яму і на тым свеце.

Магілу капаюць на раней абраным сваякамі ці яшчэ нябожчыкам пры жыцці месцы ў дзень пахавання. У выпадку, калі далакопы натраплялі на ранейшае захаванне, у яму, каб патрывожаныя мерцвякі не выгналі новага прышэльца, кідалі грошы ці іншыя каштоўныя рэчы. Выкапаўшы магілу, складвалі над ямаю крыж-накрыж рыдлёўкі.

Згодна з устаноўкай хрысціянскай царквы, цела нябожчыка трэба было хаваць на трэці дзень. Народ па-рознаму ставіўся да гэтага патрабавання. З аднаго боку, сям'я дапажыла апошнімі гадзінамі знаходжання на зямлі блізкага чалавека і нават марудзіла з пахаваннем, нібы жадаючы ўпэўніцца ў немагчымасці звароту да жыцця свайго роднага. Аднак пераважная большасць сялян імкнулася як мага хутчэй, асабліва ў гарачую ў прамым і пераносным сэнсе працоўную пару, аддаць мёртвае цела зямлі. На гэта было шмат прычын. Спрадвечная традыцыя спраўляць памінкі па нябожчыку і частаваць усіх, хто дапамагаў у пахаванні ці проста завітаў у хату, акрамя душэўных перажыванняў вымагала ад гаспадароў таксама немалых выдаткаў, што маглі сабе дазволіць хіба што толькі заможныя. Да таго ж пачынаючы з ранняй вясны і канчаючы халоднай восенню селянін літаральна не меў продыху ад бясконцых гаспадарчых клопатаў. Гаспадарка мела штодзённую патрэбу ў яго руках, яго ўвазе. І руплівы земляроб не мог не рваццa ў гэтыя вымушаныя дні бяздзейнасці да сваёй карміцелькі — ён абавязаны быў дбаць пра заўтрашні ка-

[51] Чистяков В. А. Представление о дороге в загробный мир в русских похоронных причитаниях XIX—XX вв.— У кн.: Обряды и обрядовый фольклор. М., 1982, с. 123.

валак хлеба. Вось чаму зусім натуральным і даравальным было нярэдка яго імкненне як мага хутчэй пахаваць блізкага нябожчыка. На Піншчыне нават лічылі, што доўга трымаць цела ў хаце — грэх. У Аршанскім павеце існавала перакананне, што памёршаму цяжка да таго часу, пакуль яго не закапаюць у зямлю.

У большасці мясцовасцей хавалі на другі дзень, выконваючы цвёрдае правіла: цела павінна пераначаваць у роднай хаце. Бывалі выпадкі, калі труну неслі на могілкі ў дзень смерці.

Па ўсёй Беларусі, як і ў шматлікіх іншых краях, застаўся пры вынасе цела (ці адразу пасля вынасу) звычай абсыпання нябожчыка і прысутных, лавы, дзе стаяла труна, і ўсёй хаты зернем: жытам, пшаніцай, ячменем, аўсом, хмелем, узятымі з пасудзіны, дзе стаяла запаленая свечка. Выкананне гэтага абраду, як і іншых, прызнавалася абавязковым з-за боязі, што нябожчык не будзе садзейнічаць з таго свету. Сыпалі зерне гаспадар (гаспадыня), хто-небудзь з родных, прыяцеляў ці з тых, хто начаваў пры нябожчыку або рабіў труну. Зерне кідалася не толькі ў хаце, але і на двары. Існуе шмат тлумачэнняў гэтаму шырока распаўсюджанаму абраду. Найбольш пашыраны погляд на гэта дзеянне — як на сродак захавання ў сям'і хлеба, каб нябожчык не вынес са сваёй хаты хлеба і дастатку, пакінуўшы родных галоднымі. Таксама бытавала павер'е, што ўраджай хлеба залежыць ад асабістага шчасця пэўнага члена сям'і і калі такое шчасце належала памёршаму, то няхай яно застаецца ў хаце і пасля яго смерці. Верылі таксама, што рассыпаны хлеб пазбавіць дом ад хуткай смерці. Гэты абрад зрэдку тлумачыўся таксама імкненнем хатніх затрымаць у доме дух блізкага чалавека тым, што ён застанецца лічыць зярняты.

Не менш архаічным абрадам (ён горш захаваўся да нашых дзён) быў праход праз парог. Назаўсёды пакідаў чалавек родныя сцены, дзе нярэдка праводзіў усё сваё жыццё. Апошняе развітанне з роднай хатай таксама падкрэслівалася пры вынасе. На Палессі ў знак цяжкага расстання дамавіну паволі працягвалі праз кожны парог. На Гродзеншчыне і ў некаторых іншых раёнах, мінаючы парог, спыняліся і на хвіліну стаўлялі труну на дол, што мусіла азначаць паклон роднаму парогу. Выходзячы, стараліся нічога не забыцца, каб пазбегнуць новай блізкай смерці. Адразу пасля выпраўлення нябожчыка ў хаце пачынаюць наводзіць парадак.

Прыкметнае месца ў абрадзе займаў конь, на якім везлі нябожчыка. Пазбягалі браць жарэбных кабыл, баючыся, што яны скінуць жарабят, а самі падохнуць. Сачылі за паводзінамі каня, нярэдка аказвалі яму асаблівую пашану.

Провады нябожчыка на могілкі былі і застаюцца, бадай, адным з самых урачыстых этапаў усяго пахавальнага абраду. Правесці ў апошні шлях выходзілі ўсе жыхары вёскі. Мясцовымі традыцыямі дыктавалася або везці нябожчыка на могілкі, або несці на руках. На чале пахавальнай працэсіі, як правіла, ішоў, трымаючы крыж з распяццем хтосьці са старэйшых па ўзросту аднавяскоўцаў. За ім два-тры пажылых мужчыны неслі харугвы (пратэсы), крыж надмагільны, вянкі; далей ішлі свяшчэннік, пеўчыя, затым неслі ці везлі дамавіну, за якой ішлі блізкія і суседзі. У вёсцы Рабак Слуцкага раёна да гэтага часу ўсіх памёршых праводзяць на могілкі з крыжам, які потым захоўваецца ў хаце нябожчыка да наступнага пахавання ў сяле, а тады перадаецца далей.

У заходніх раёнах Беларусі труну часта везлі па вуліцы ў зачыненым выглядзе, асабліва пры пахаванні прадстаўнікоў каталіцкага насельніцтва.

У час пахавальнага шэсця па вёсцы трэба было аддаць даніну пашаны. Калі абставіны не дазвалялі суправаджаць нябожчыка да магілы, тыя людзі хрысціліся ўслед працэсіі, а ў некаторых месцах кідалі ў бок труны жменю пяску ці снегу ці, вярнуўшыся да хаты, адграбалі яго ў тым жа напрамку ад сваіх варот. Гэтым дзеяннем выконвалася, з аднаго боку, тое, што было б зроблена на могілках, калі сыплюць «лёгкую зямліцу» ў яму. А з другога — нібы надавала ўпэўненасці, што нябожчык не будзе турбаваць вёску.

У правядзенні народных абрадаў, уключаючы і пахаванне, нямала момантаў, прызначэнне і сэнс якіх зацемнены часам, і дапамагчы разгадаць не ў стане былі нават тыя, хто выконваў іх («Нашы дзяды так рабілі, і мы так робім...»). Павер'і і забабоны, што панавалі ў час абраду, мелі ў радзе выпадкаў сімвалічны сэнс. Уяўленне смерці як нейкай канкрэтнай асобы, якая нябачна прысутнічае побач, вымагала ў пэўных умовах адпаведных паводзін, нараджала бясконцую колькасць самых разнастайных звычаяў. У іх не столькі верылі, колькі баяліся адступіцца ад векавых традыцый. Так, калі неслі па вуліцы труну, нельга было спаць, каб соннага, безабароннага смерць не прыбрала к сабе. Нельга было па дарозе на могілкі скарачаць шлях і ехаць праз сезонныя дарогі (зімой праз палі, балоты), праз чужыя агароды — і з-за ненадзейнасці дарогі, і каб не пашкодзіць будучаму ўраджаю. Нельга было выглядаць з акна ці з дзвярэй, калі вязуць нябожчыка, а трэба было далучыцца да шэсця — тут ужо ўступаў у сілу закон народнай этыкі. Благой прыкметай лічылася напаткаць чалавека, які ішоў насустрач працэсіі,— ён абавязкова

павінен быў аб'ехаць або прыстроіцца да пахавання, каб не вярнуць у вёску смерць.

Апошняе развітанне з нябожчыкам адбывалася на могілках. Родныя, блізкія, суседзі цалавалі нябожчыка, плакалі, галасілі. Закалочаную дамавіну апускалі на вяроўках ці на доўгіх ручніках або палатне шырынёй 4—5 пядзей, каб дарога на той свет была шырокая, як палатно. У гэты ж момант у яму кідалі грошы, каб новы нябожчык мог выкупіць на могільніку і для сябе месца. Закопвалі звычайна тыя, хто капаў яму або нёс труну. Шмат дзе ў Беларусі і на Украіне было распаўсюджана так званае «пячатанне» магілы. Ці перад апусканнем у зямлю, ці на ўжо насыпаным узгорачку з чатырох вуглоў крыж-накрыж стукалі рыдлёўкай. Гэты звычай вельмі шанаваўся сялянамі і месцамі сустракаў адпор духавенства. Тым не менш адзінага погляду на гэты звычай не было, і святары нярэдка, адправіўшы літыю, уласнаручна ставілі рыдлёўкай крыжыкі на свежым насыпе.

На ўсіх вясковых могілках сваякоў стараюцца хаваць сем'ямі, «каб родным на тым свеце лягчэй было сысціся». Пры пахаванні перавага аддаецца сваім могілкам, таму вельмі часта нябожчыкаў прывозяць здалёк хаваць на радзіму, побач са сваімі продкамі. Магілы праваслаўных размяшчаліся, як правіла, галавой на захад, а нагамі на ўсход, католікаў — наадварот. Часцей за ўсё на гатовыя насыпы ставілі драўляны крыж, хай сабе і маленькі, пакуль не зробяць пастаянны, вялікі, або прывязуць каменную пліту, якія будуць служыць помнікам. На Віцебшчыне памер крыжа залежаў ад узросту нябожчыка. На крыжы вешаліся хвартушкі, ручнікі з той жа мэтай, што і ў хаце ў час жалобы. Згодна з мясцовымі звычаямі крыж ці помнік ставіцца або каля ўзгалоўя, або ў нагах; на магілах садзілі дрэвы і кветкі.

Адным з найвялікшых грахоў лічылася ў народзе пазбаўленне чалавекам уласнага жыцця. Ушанаванне памяці памёршага, якое складала сутнасць пахавальнага абраду, у выпадках з самазабойцамі падмянялася асуджэннем. Самазабойцаў хавалі нямытымі, у той адзежы, у якой яны сустракалі смерць. Труну рабілі з абы-якіх дошак, клалі прадмет, якім чалавек пазбаўляў сябе жыцця: нож, вяроўку. Самым блізкім забаранялася быць пры пахаванні. Цела закопвалі дзе-небудзь на ўзвышшах, у лесе, на балоце, на скрыжаванні дарог ці на месцы самазабойства. Магілу завальвалі каменнем ці ламаччам, заганялі асінавы кол. Рабіць памінкі ці прыкладзіны, галасіць па тым, хто сваёй воляй пакончыў жыццё, забаранялася.

П а м і н к і былі традыцыйным завяршэннем пахавальнага

абраду[52]. Бяднейшыя сем'і, якія не ў стане былі паклікаць на жалобны стол, частавалі прысутных куццёй непасрэдна на могілках. Але такое здаралася ў выпадку крайняй беднасці. Пры іншых абставінах сям'я згаджалася цярпець голад, нястачу, але абавязкова ладзіла памінальны стол.

Калі памінкі павінны былі адбыцца дома, то на «жалобны стол» запрашаліся ўсе прысутныя на пахаванні. Да цяперашняга часу можна назіраць, як у першую чаргу за стол садзяць на самае пачэснае месца старэйшага чалавека. Пільная ўвага тлумачыцца не толькі пашанай да саліднага ўзросту, яна, відаць, сваім вытокам узыходзіць да веравання, згодна з якім наступная смерць павінна забраць з прысутных таго, хто больш пажыў. Такі закон прыроды, і ён з цвярозым разуменнем прымаўся ўсімі. Па гэтай жа прычыне ўважліва сачылася, каб з памінак першымі не ішлі маладыя, бо баяліся, што хто раней з іх выйдзе — той раней памрэ.

Памінальны стол, што адбываўся адразу пасля пахавання, нярэдка меў назву, адпаведную галоўнай, абавязковай страве, якая на ім выстаўлялася: «гарачкі» — ад гарачага пшанічнага хлеба (паляніцы), што не рэзалі, а проста разрывалі рукамі (пару, якая ішла ад свежавыпечанага хлеба, павінна была, як лічылі, падмацоўвацца душа); «клёцкі». (У Крычаўскім і Чэрыкаўскім паветах гэта слова наогул атаясамлівалася са смерцю. Пра безнадзейна хворага казалі: «Ну, клёцкі яму!» — што значыла: неўзабаве яго будуць памінаць.)

Памінкі заўсёды і па сённяшні дзень пачынаюцца з куцці (кашы з якіх-небудзь круп, запраўленых маслам ці алеем і мёдам) або кануна (рассычанай мёдам вады з пакрышанымі ў ёй абаранкамі, булкай). Частаваліся адной ці трыма лыжкамі кануна з агульнай міскі, па чарзе перадаючы яе адзін аднаму.

Стол рабіўся ў адпаведнасці з дастаткам сям'і. Калі пералічыць тыя стравы, што падаваліся ў розных мясцовасцях Беларусі, то атрымаецца досыць ладны спіс — нездарма ж лічылася: большая колькасць страў на жалобным стале — большы гонар памёршаму. Аднак не трэба забывацца, што дазволіць такое магла далёка не кожная сям'я.

Не абыходзілася памінальнае застолле і без выпіўкі. Калі чарка была адна, кожны па чарзе перадаваў яе наступнаму, а перад тым, як выпіць, паміналі нябожчыка. Гарэлка на памінальных сталах дапамагала заглушыць напатканае гора, прытупіць

[52] Памінкі, якія праводзяцца па канкрэтнай асобе на працягу першага года з дня яе смерці, у этнаграфічнай літаратуры звычайна называюцца «прыватнымі».

боль страты. Паводле сведчанняў многіх этнографаў, пілі на памінках у меру. Калі ж нехта выпіваў лішняе — гэта ўспрымалася як верх непрыстойнасці. Аднак, на жаль, далёка не ўсюды і не заўсёды выконваўся гэты мудры закон. Нярэдка здаралася, што колькасць выпітага пераходзіла межы і высакароднае па сутнасці прызначэнне памінальнага стала — ушанаванне светлай памяці нябожчыка — апашлялася, губляла свой сэнс.

Асобнае месца на стале было адведзена чарцы для спатолення смагі душы памёршага — у выдзеленую спецыяльна талерку або проста на абрус адкладвалі крыху стравы. Без гэтага рытуалу не пачынаюць памінак і цяпер. Жыла ў народзе вера, што нябожчыку стане лягчэй і ён будзе больш спрыяць сваёй сям'і, калі душа яго пачастуецца стравамі з жалобнага стала.

Пасля заканчэння вячэры рэшткі на стале не прыбіраюцца да наступнага дня.

Звычай «будзіць нябожчыка», які выконваецца назаўтра пасля пахавання, захаваўся на Беларусі па сённяшні дзень. Сям'я памёршага як развіднее ішла на могілкі. З сабой бралі рыдлёўку, каб паправіць насып, і тое, што патрабавалася для незялічкага памінання. Абняўшы магілу, з крыкам і плачам звярталіся блізкія да памёршага, яшчэ не ў стане зміркцца з думкай пра яго незваротнасць, просячы яго абудзіцца ад вечнага сну, устаць і паглядзець на тых, каго ён пакінуў.

Сяляне пастаянна клапаціліся пра сваіх «пакойнічкаў», і гэта не выглядала нейкім вымушаным абавязкам, а было душэўнай патрэбай, неабходнасцю. У кожным канкрэтным выпадку памінкі пасля смерці адбываліся ў наступныя па ліку дні: трэці (калі ён не супадаў з днём пахавання) — «трацціны»; зрэдку шосты; дзевяты — «дзевяціны»; дзе-нідзе дваццаты («паўсарачыны», «трацціны» — ад 3-х тыдняў); усюды — саракавы («саракавіны», «сарачыны», «саракапуст», «саракі», «шасціны» — ад 6-ці тыдняў); адзначаліся таксама «паўгодкі», «гадавіна» («ракавіны», «угодкі»). На ўсе гэтыя памінкі збіраюцца галоўным чынам самыя блізкія людзі. Праводзяцца яны, як і ў дзень пахавання, хіба што больш сціпла і стрымана. Відаць, у старажытнасці большасць памінак адбывалася непасрэдна на магіле. Паводле сцвярджэння археолагаў, «звычай і тэрміны памінак несумненна перайшлі ад дагістарычнага часу, доказам таго з'яўляюцца насланенні ў курганах, аддзеленыя пластамі попелу і вугля, утворанымі ад спаленых на абрадах памінак вогнішчаў» [53].

---

[53] Татур Г. Х. Очерк археологических памятников на пространстве Минской губернии и ее археологическое значение.— Мн., 1892, с. 225.

У большасці мясцін Беларусі гадавіна з дня смерці завяршала цыкл прыватных памінак. На Віцебшчыне, праўда, на лакальнай тэрыторыі існавалі яшчэ адны «траціны» — трэцяя гадавіна смерці. Сустракаліся і іншыя тэрміны правядзення памінак.

На прыватныя памінкі заўсёды запрашалі толькі самую блізкую радню. Рэдка які абрад абыходзіўся без старцаў, ім аказвалі асаблівую пашану — нездарма іх чытанне і спевы малітваў у выпадках адсутнасці свяшчэнніка ўспрымаліся часам сялянамі як амаль эквівалентная замена. Выключнае стаўленне да старцаў, жабракоў у народа падмацоўвалася шчырым спачуваннем беднасці. Можа на гэтай глебе і нарадзілася перакананне, што старцы — у пэўнай ступені пасрэднікі паміж жывымі і мёртвымі і ахвяраванае беднаму ці галоднаму вернецца на тым свеце крэўнаму нябожчыку.

У ліку памінальных звычаяў беларускага народа істотную ролю адыгрывалі месцамі захаваныя і па сённяшні дзень прыкладзіны (прыкла́ды). Пад гэтым паняццем разумеюць звычай упарадкавання магілы — пастаноўку крыжа ці помніка, абкладванне насыпу дзёрнам і г. д. У пераважнай большасці прыкладзіны праводзіліся ў бліжэйшую восень пасля пахавання — свайго роду завяршэнне цыкла прыватных памінак, толькі ўжо не ў хаце, а на могілках. У гэты дзень сям'я і блізкія нябожчыка слухалі набажэнства ў царкве, пасля чаго ішлі на могілкі, дзе, навёўшы неабходны парадак, прама на насыпе рассцілалі абрус і паміналі. Пасля прыкладзін у доме заканчвалася жалоба па нябожчыку.

З прыняццем хрысціянскай веры паступова ў славян увайшло ў звычай ставіць на магілах крыжы (на Беларусі драўляныя і металічныя крыжы былі бадай самымі распаўсюджанымі помнікамі). Ставіўся на магілу і камень. Аднак існавалі і іншыя надмагільныя знакі, якія, можа, і далі назву — прыклады, прыкладзіны. Прыкладамі называліся драўляныя збудаванні на магілах. Дошкі збіваліся ў выглядзе прамавугольніка, які падтрымліваў форму насыпу. Калі зямля з часам зарастала травой, магіла нагадвала скрынку, пакрытую дзёрнам. На Міншчыне прыклад нагадваў века труны (нярэдка яго называлі «хаткай», ён меў нават дах і акенца) і пакрываў цалкам насып. Абкладванне магілы ішло са старажытных часоў. Згодна з аднымі меркаваннямі, магілу такім чынам ахоўвалі ад нападу звяроў. Іншая гіпотэза засноўвалася на падабенстве надмагільных збудаванняў і звычайнай хаты: форма прыклада выглядала як зруб, а крыжы часам нагадвалі двухскатны дах. Гэта нібы падкрэслівала вераванне ў замагільнае жыццё як працяг зямнога. Яшчэ ў мінулым стагод-

дзі ў цэнтральнай частцы Беларусі і на Палессі сустракаўся звычай класці на ўсю даўжыню насыпу тоўстае дрэва, абгабляваную гранёную калоду накшталт труны.

Адначасова з устанаўленнем помніка на магілу клалі бліны, арэхі, гарбузы і інш.

Усе памінкі па нябожчыках, якія агульна адзначаліся ў народзе па пэўных днях і ў якіх яскрава ўвасобіўся не толькі перажытак культу продкаў, але і выразны гуманістычны дух нашага народа, аб'ядноўваюцца ў вельмі ёмістым і змястоўным паняцці «дзяды». Пад дзядамі народ разумеў таксама ўсіх мёртвых продкаў ці іх душы незалежна ад полу, узросту. У продках народ бачыў свае жыццёвыя — фізічныя і духоўныя — карэнні. Таму з такой стараннасцю дбаў ён пра падрыхтоўку да дзядоў, абмяжоўваючы сябе ў штодзённым побыце і адкладваючы ўсё лепшае на «прыход продкаў»; таму з такой глыбокай пашанай праводзіў гэты абрад, прызнаючы яго нароўні з нядзельнымі і святочнымі днямі. Гэта светлая рыса беларускага селяніна была адзначана яшчэ ў мінулым стагоддзі: «... варта запытацца, дзе больш павагі і любові да памёршых родных і продкаў, дзе больш разумення духоўных зносін з імі, дзе, нарэшце, больш паэзіі,— ці ў людзях адукаваных, якія спачатку паплачуць, потым памоляцца і хоць зрэдку ўспомняць, але якія прыйшлі б у жах, калі хто з мерцвякоў задумаў бы да іх з'явіцца; ці ў гэтым народзе, які ўсёй душой іх заклікае, верыць, што яны прыходзяць, і лічыць гэта за шчасце. Так званы «просты народ» зразумеў і адчуў патрэбу ісці па слядах продкаў і для гэтага неабходнасць пастаяннага адзінства з імі» [54].

Святкаванне дзядоў, часам неадпаведнае жыццёваму дастатку сям'і, лічылася амаль паўсюдна першачарговай неабходнасцю. У гэтым імкненні народа пераплятаюцца матывы рознага характару, інерцыя традыцыі спалучалася з рознымі іншымі меркаваннямі. Тут побач з пашанай прысутнічаў дзесьці і страх, што пакрыўджаныя няўвагай нябожчыкі не будуць дапамагаць справам жывых: «Хто дзядоў не ўважаець, таму ўсяляк бываець»; «Нельга пазбягаць дзядоў, бо раз не адзначыў — і скаціна здохла» (існавала вера, што дзяды маюць сілу ўздзейнічаць таксама і на ўраджай). Тут і цёплыя, сардэчныя ўспаміны па незабыўных нядаўна памёршых: «Дзядам трэба ўсяляк спагадаць, бо яны святыя госці з таго свету, за намі скучаюць, жадаючы нам усякага дабра, і журацца». Тут і перасцярога, што душа будзе паку-

---

[54] Татур Г. Х. Очерки археологических памятников на пространстве Минской губернии и ее археологическое значение, с. 227.

тавацьь, калі яе не памянуць як належыць, і боязь за невыкананне завешчанай абраднасці ўзяць на душу вялікі грэх перад богам і пачуць ганьбаванне за знявагу памяці мёртвых.

Дзяды — абрад своеасаблівы, і вера ў тое, што ў гэты дзень душы продкаў спускаюцца на зямлю, каб паглядзець, як іх ушаноўваюць, як нашчадкі рупяцца пра спадчыну, пакінутую імі, вымагала ад людзей строгіх паводзін, абмяжоўваючы ў пэўных дзеяннях. Памінальны характар свята не дапускаў ніякіх забаў, гульняў, скокаў ці спеваў, што лічылася б абразай для мёртвых. Атмасфера панавала сумная і строгая.

Памінальныя дні, якія існавалі ў народзе яшчэ з часоў язычніцтва, з прыходам на славянскія землі хрысціянства ў радзе выпадкаў змянілі свае аблічча, захаваўшы старажытныя адметнасці і ўвабраўшы рысы новай рэлігіі. Калі звярнуцца да канкрэтных сведчанняў, то можна як у колькасці агульных памінак, так і ў часе і характары іх правядзення заўважыць мясцовую адметнасць. Адной з яе прычын было веравызнанне, якое падзяліла наш народ на праваслаўных і каталікоў, што ў канчатковым выніку таксама абумовіла некаторую этнаграфічную стракатасць. Каталіцкая царква выдзеліла адзіныя штогадовыя памінкі — дзень усіх святых, або так званы задушны, 1 лістапада (н. ст.). У некаторых раёнах заходняй часткі Беларусі агульныя памінкі адзначаліся каталіцкім насельніцтвам два разы на год. Праваслаўны каляндар вызначае ў якасці памінальных дзён некалькі дат, сярод якіх вылучаюцца: мясапусная субота напярэдадні вялікоднага паста; радаўніца; траецкая субота і змітраўская субота. У асноўным яны супадаюць з тымі, што адзначаюцца ў народзе, аднак у залежнасці ад мясцовых звычаяў дзяды святкаваліся праваслаўным насельніцтвам да шасці і болей разоў. Несупадзенні дзядоў з царкоўнымі памінкамі прыходзіліся на наступныя дні: напярэдадні Ўзнясення (Случчына); перад пакровам — «пакроўцы» (Магілёўскі пав.); напярэдадні дня св. Міхаіла, 8 лістапада ст. ст. (Рэчыцкі пав.); перад кожным квартальным пастом — піліпавым (калядным), пятровым, спасавым, вялікім, а таксама стаўроўскія дзяды (Барысаўскі пав.); чацвер на святым тыдні (Палессе); субота за два тыдні перад піліпаўкай; чысты чацвярток (Смаленшчына); чацвер пасля змітраўкі (Ашмянскі пав.) і інш. [55]

Асноўныя, амаль паўсюдныя дні агульных памінак звычайна

[55] Пра разнастайнасць тэрмінаў правядзення памінальных дзён на Палессі гл.: Толстая С. М. Деды в полесском народном календаре.— Конференция «Балто-славянские этнокультурные и археологические древности. Погребальный обряд». Тез. докл. М., 1985, с. 81—82.

падзяляюць адпаведна порам году на зімовыя (масляныя), веснавыя (радаўніца, велікодныя), летнія (траецкія) і восеньскія (змітраўскія, асяніны) дзяды. Яны мелі і свае, народныя назвы. Так, у Слонімскім павеце дзяды, што спраўляліся перад заговінамі на масленіцу, называліся «мяснымі», або «тоўстай суботай». «Тоўстымі» зваліся на Быхаўшчыне змітраўскія дзяды. Чацвер велікоднага тыдня ў радзе мясцовасцей называўся «наўскім вялікаднем»[56], ці «вялікаднем мёртвых». У Дрысенскім, Быхаўскім і іншых паветах, нягледзячы на тое што памінальны стол адбываўся ў пэўны час (дзе вечарам, дзе каля паўдня), кожны памінальны дзень меў сваю асабістую назву: перад змітраўкай — «вячэра па радзіцелях», перад масленкай — снеданне, перад тройцай — «полыдзень», у панядзелак перад радаўніцай — «абед па радзіцелях».

Па спосабу правядзення ўсе дзяды падзяляліся на тыя, што адзначаліся выключна ва ўласнай хаце, і тыя, якія праходзілі непасрэдна на могільніках, дзе пахавана радня. Асабліван пашанай у беларусаў карысталіся з першай групы змітраўскія дзяды, з другой — радаўніца. Усе астатнія пры некаторых адметнасцях, пра якія будзе гаварыцца ніжэй, нагадваюць менш выразныя іх адбіткі.

Дзень, які папярэднічаў дзядам, у некаторых усходніх, паўночных і заходніх раёнах Беларусі дзе-нідзе насіў назву «бабы». У адных мясцінах, акрамя назвы, ужо ў XIX ст. ніякіх рытуалаў не захавалася (Магілёўшчына, Палессе), у другіх — цьмяна праглядваўся своеасаблівы пачатак да памінання продкаў ці, наадварот, завяршэнне. На Лепельшчыне «бабы» адрозніваліся ад «дзядоў» больш сціплым асартыментам страў. На Случчыне ў гэты дзень скаромнага на застоллё не выстаўлялі, а пяклі посныя блінцы, варылі квас з грыбамі ці вяленай рыбай і кісель; на магілкі нават улетку не хадзілі. Магчыма, у старажытныя часы ўшанаванне продкаў праводзілася ў два дні, у адпаведнасці з полам нябожчыка. Аднак катэгарычна настойваць на гэтым меркаванні нельга, паколькі ў яго карысць акрамя назвы і часу правядзення нічога больш не гаворыць.

Там, дзе папярэдняга застолля не было, у сем'ях ішла вельмі актыўная падрыхтоўка да дзядоў, якая працягвалася, здаралася, цэлы дзень, а то і болей. Мужчыны прыбіралі панадворак, жанчыны завіхаліся ў хаце, як перад прыходам дарагіх гасцей. Усё старанна чысцілі, бялілі сцены, мылі і шаравалі падлогу, сталы,

[56] «Наўскі» («навий») паходзіць ад старажытнаславянскай назвы «навье» — духі, цені памёршых. У некаторых раёнах Віцебшчыны і іншых «наўцамі» называюць нядаўніх нябожчыкаў.

лавы, прыбіралі хатні інструмент, працíралі абразы, завешвалі іх чыстымі ручнікамі, на Палессі — прыбіралі галінкамі хвоі, елкі, гронкамі каліны. Усё гэта рабілася затым, каб душам, якія нібыта прыйдуць на вячэру, было чыста і нішто не замінала і каб паказаць продкам, наколькі дбала падтрымліваецца нашчадкамі парадак у спадчыннай гаспадарцы. На ўсходняй і паўночна-ўсходняй тэрыторыі Беларусі абавязковым рытуалам пасля падрыхтоўчай работы ўжо на змярканні было наведванне лазні. У народзе нават казалі: «Трэба грэшнае цела абмыць, а патом і дзяды адбыць». Згодна з даўнейшымі вераваннямі, нібыта напярэдадні памінальных застолляў (г. зн. 4—5 разоў на год), дзяды атрымліваюць рэдкую магчымасць памыцца і накіроўваюцца ў лазню.

Этнографы мінулага адзначалі, што ў беднякоў стол на дзяды быў амаль такі ж сціплы, як і ў звычайныя дні. У тых сем'ях, дзе можна было дазволіць раскошу, калолі гадавалага кабана, рэзалі цялушку ці авечку. Прэстыжным лічылася для гаспадыні выставіць найбольш мясных страў. Колькасць страў на дзядах дыктавалася не толькі магчымасцямі гаспадароў, але і ўстойлівымі правіламі. Абавязкова няпарная лічба прысмакаў вагалася дзесьці ад 5 да 15 і болей.

Стол на дзядах, як на любой сямейнай урачыстасці беларусаў, ахопліваў, калі заняцца пералічэннем, ледзь не ўсю нацыянальную кухню. Дзяды, здавалася б, па сваёй сутнасці — свята сумнае, і на першы погляд можа паказацца незразумела дзіўным намаганне гаспадыні як мага шырэй дэманстраваць свае здольнасці. Аднак ідэя дзядоў мае і другі, адваротны, бок: ушаноўваючы мёртвых, чалавек сваёй стараннай падрыхтоўкай і цырымоніяй абраду імкнуўся «пацешыць душачкі» продкаў і тым самым паказаць усю паўнату сваіх магчымасцей і імкненняў — так як ён гэта рабіў перад жывымі гасцямі на радзінах або на вяселлі. Таму іменна гаспадыні руплівацца, каб побач з абавязковымі стравамі прыгатаваць ласункі, якія асабліва былі любімыя дзядамі.

Пералік таго, што падавалі на памінках у беларусаў, склаў бы ладны спіс. Але каб мець хоць нейкае ўяўленне пра памінальны стол, дастаткова спыніцца на канкрэтных прыкладах. Вось як выглядаў стол на дзядах у Ашмянскім павеце. Першыя дзве стравы мусілі быць посныя. Спачатку падавалі гарох з малаком і кіслы крупнік з грыбамі ці рыбай. Затым выстаўлялася кіслая капуста з ялавічынай, прэсны крупнік з пеўнем ці з курыцай — непарэзанай; потым ішла юшка са свіным мясам і абавязкова з галавой; верашчака з каўбас і саланіны з падлівай; куцця (каша). Былі таксама смажаніна з ялавічыны, макароны, сыр у мас-

ле, малако кіслае. Каша ячная з маслам ці салам завяршала вечар. Амаль паўсюды парадак падачы страў строга вытрымліваўся.

Дзяды — сямейнае свята, і яно вымагала ад усіх членаў сям'і прысутнічаць у гэты дзень у роднай хаце. Тыя, хто знаходзіўся ў ад'ездзе, спяшаліся дадому. Амаль усюды святкаванне адбывалася аднолькава. Пачыналі часцей за ўсё тады, калі надыходзіў час запальваць агонь. Апраналіся па-святочнаму, засцілалі стол белым абрусам. Гаспадар хаты ці старэйшы ў сям'і, запаліўшы свечку, прымацоўваў яе каля абразоў ці ставіў на стол і чытаў малітву. У народзе падтрымлівалася вера, што душы продкаў нябачна прысутнічаюць у хаце, і для іх проста на стол, пад стол, за акно, а часцей у асобную пасудзіну ў самым пачатку адлівалася гарэлка і адкладвалася патрошку ад кожнай стравы.

У кожнай амаль вёсцы заклікі-запрашэнні нябожчыкаў выражаліся па-свойму, змяшчалі ў сабе розныя адценні.

«Праведныя радзіцелі! Хадзіце к нам вячэраць. І самі, і вядзіце з сабой малых дзетак, і тых, каму не к каму іці!» (Быхаўскі пав.).

«Дзеду, ідзі да абеду!» (Гродзеншчына).

«Святыя дзяды, завём вас: хадзіце да нас! Ёсць тут усё, што бог даў, чым толькі хата багата. Просім вас: ляціце да нас!» (Сураж).

На Віленшчыне гаспадар, заклікаючы душы, па чарзе пералічваючы сваіх памёршых, пасля кожнага імені дадаваў слова «хаўтуры». У Пінскім павеце за стол адразу не садзіліся, а ў маўчанні чакалі, калі «паядуць душачкі», і толькі пасля знаку гаспадыні пачыналі есці.

Стол, як і на прыватных памінках, пачынаўся вельмі часта з кануна або куцці. Потым гаспадар падымаў чарку, памінаў нябожчыкаў, жадаў жывым прыждаць наступных дзядоў. Далей чарка, калі яна была адзіная, перадавалася гаспадыні, а затым ішла па старшынству. Абышоўшы ўсіх, вярталася да гаспадара.

Застолле праходзіла даволі напружана — маўчалі або ўспаміналі памёршых добрым словам і ніколі благім. Сур'ёзнасць падтрымлівалі ў тых выпадках, калі прысутнічалі старыя, якія думалі і пра сваю магчымую адсутнасць на наступных дзядах. Сядзелі за сталом доўга. Калі апошняя смерць у хаце яшчэ балела свежай ранай, не абыходзілася і без плачу. Галашэнне лічылася неад'емным атрыбутам дзядоў: «Нягодзе пакойнічкам, як тым старцам, кінуць па крошцы... Трэба і паплакаць, і пажалаваць, то і яны нас не забудуць».

Стол, як правіла, пакідалі для падмацавання сіл памёршых

душ непрыбраным, а толькі засцілалі яго зверху абрусам. Нярэдка моладзь не лічылася са строгімі правіламі бацькоў і цішком уночы даядала пакінутае дзядам. Калі хітрыкі не раскрываліся, то гаспадыні цешыліся, што патрафілі пачастункамі нябожчыкам. Можна было пачуць, як сялянкі скардзіліся, што дзяды ўночы былі надта наравістыя і з-за адсутнасці дзевяці страў вывернулі штосьці на стол у знак незадаволенасці, не здагадваючыся, што непарадак на стале павялічыўся з дапамогай земных сіл. Рэшткі ад святкавання пакідалі для старцаў, для хатніх птушак і жывёлы, сыпалі крохі на страху. У звычаях палешукоў, як заходніх, так і ўсходніх, было кідаць рэшткі страў у рэкі, азёры, ставы, калі там утапіўся хто-небудзь з родных.

Ужо ў XIX ст. сучаснікамі не раз адзначалася распадзенне спрадвечных абрадаў, што выяўлялася ў паслабленні строгасці іх правядзення: недакладны час святкавання, невыкананне розных рытуалаў, завешчаных традыцыяй, староннія размовы за сталом і вясёлы настрой пасля вячэры.

З усіх памінальных урачыстасцей, што адбываліся на могілках, найбольш пашыраным на Беларусі абрадам была, несумненна, радаўніца. Фанетычна гэта слова вымаўляецца неаднолькава ў дыялектах: раданіца, радуніца, радоніца, радыніца, радоўніца, радуўніца, радаўшчыца. Наконт паходжання гэтага слова паміж этымолагамі няма згоды. Адны ўзводзяць яго да літоўскага rau-da — пахавальная песня, галашэнне, другія — да ведыйскага ra-danh — ахвярадаўства, якое ў сваю чаргу мае корань rad — даваць, рыхтаваць. Існавалі таксама трактоўкі славянскага паходжання паняцця «радаўніца». Шматлікія этнографы выводзяць яго ад слоў «радасць», «радавацца», зыходзячы з таго, што жывыя ідуць на могілкі, каб паведаміць мёртвым на «наўскі вялікдзень» радасную вестку пра ўваскрасенне Хрыста ці проста пра абуджэнне прыроды. Радаўніцу называлі самым радасным святам нябожчыкаў яшчэ таму, што ў гэты рэдкі дзень яны нібыта атрымліваюць права пабыць побач з жывымі і таму вельмі чакаюць яго. Да гэтай інтэрпрэтацыі паходжання паняцця схіляўся, спасылаючыся на Д. С. Анічкава, акадэмік Я. Ф. Карскі, які пісаў, што назва радаўніцы «ўказвае на вясёлы характар гэтай урачыстасці: жывыя нібыта хочуць з надыходам вясны павесяліць сваіх нябожчыкаў, задобрыць іх, каб яны не толькі не перашкодзілі земляробу выкарыстаць тыя даброты, якія абяцае вясна, але каб дапамагалі яму сваім таямнічым вешчым уздзеяннем на яго лёс і на яго гаспадарку» [57]. Падобнае тлумачэнне зна-

[57] Карский Е. Ф. Белорусы, т. 3, вып. 1, с. 158—159.

ходзіцца і ў «Этнаграфічным нарысе Беларусі» М. А. Янчука (М., 1918—1920, с. 177). На нашу думку, нягледзячы на пашыранасць гэтай гіпотэзы, такое тлумачэнне ўсё ж цяжка прыняць безагаворачна, бо як бы там ні было, але ў аснове сваёй гэты абрад па сваёй сутнасці далёкі ад весялосці і нават пераўзыходзіць смуткам усе астатнія дзяды. Шпілеўскі выказваў меркаванне, што «радаўніца» бярэ аснову ў паняццях «рада», «радзіць» — жывыя ідуць да продкаў, дзядоў, каб парадзіцца з імі. Ён пісаў, што засноўваў сваю думку на народным павер'і, паводле якога першы, хто на радаўніцу з'явіцца на могілкі, пачуе ад крэўных нябожчыкаў параду, як здабыць скарб. Кожная са спроб тлумачэння паходжання слова «радаўніца» па-свойму пераканаўчая і аддаць перавагу нейкай адной цяжка. З-за спрадвечнасці выканання абраду наўрад ці магчыма з пэўнасцю прызнаць толькі якое-небудзь адно меркаванне[58].

Радаўніца адбывалася ў аўторак на «правады» (г. зн. на дзевяты дзень пасля вялікадня — лічба, відаць, не выпадкова супадае з чарговым днём прыватных памінак). Ю. Ф. Крачкоўскі пісаў, што ў некаторых мясцінах радаўніца дзялілася на «жывую» (у панядзелак сям'я малілася за жывых) і «мёртвую» (у аўторак паміналі памёршых).

Да радаўніцы, здаралася, прыстасоўвалі народныя назіранні: калі яе надыход супадаў з маладзіком, то гэта абяцала добры ўраджай; калі месяц быў у апошняй квадры, «у веташку» — чакалі нішчымніцу. Гэта адбілася і ў прыказцы: «Радаўніца веташка — не будзем есці хлеб з гаршка».

Увесь характар радаўніцы трапна схоплены ў другой народнай прымаўцы: «На радаўніцу да абеда пашуць, па абедзе плачуць, а ўвечары скачуць». Сапраўды, першая палавіна дня ад будняў амаль нічым не адрознівалася. Людзі выконвалі розныя гаспадарчыя працы. Дзе-нідзе, закончыўшы да полудня, мыліся ў лазні, пасля чаго ўжо лічылі за грэх працаваць. Гаспадыня ж загадзя ці з самай раніцы гатавала розныя прысмакі. Закончыўшы падрыхтоўку, апрануўшыся ў святочнае, складвалі ў хустку ці кош стравы, і сям'я выпраўлялася ў царкву на абедню або адра-

[58] Дарэчы будзе ўказаць на яшчэ адну хоць і далёка не навуковую версію паходжання слова «радаўніца», пераказаную ў нататках Н. Сіняўскага «Красавік месяц у беларускіх сялян Смаленскай губерні»: «Прывяду тут даволі арыгінальнае тлумачэнне гэтага слова свяшчэннікам Краснінскага павета сяла С. Ён пераконваў мяне, што слова «радуніца» паходзіла ад таго, што ў старажытнасці ў славян быў бог Рада, якому пакланяліся, падаючы на зямлю ніц. І вось з гэтых двух слоў «рада» і «ніц» выйшла назва свята» (Смоленские губернские ведомости, 1862 г., добавление к № 24 (часть неофициальная), с. 183).

зу на могілкі. Калі родныя былі пахаваны на розных могілках, выходзілі з дому раней, каб усіх наведаць у гэты дзень. Дома заставаліся толькі знямоглыя старыя і дзеці. У царкве адслужваліся паніхіды па нябожчыках, сяляне запрашалі папа на могілкі, частавалі ў багадзельнях і на цвінтары бедных і жабракоў.

Перад тым як пачаць памінальную трапезу, сваякі прыводзілі магілы ў парадак: раўнялі насып і абкладвалі дзёрнам, устанаўлівалі, калі не было, ці выраўнівалі пахілены крыж або помнік, павязвалі іх ручнікамі, ладзілі агароджы, садзілі дрэвы, кусты, кветкі. Некаторыя пачыналі гэта рабіць яшчэ з раніцы.

Усюды ў гэты дзень амаль над кожнай магілай, асабліва свежай, галасілі жанчыны, прыпаўшы тварам да насыпу, звяртаючыся да нябожчыка, як да жывога, молячы яго ўстаць і паглядзець на свет. Як і пры пахаванні, галашэнне гучыць на радаўніцу то заціхаючы, то ўспыхваючы з новай сілай ад самага прыходу сваякоў на могілкі ажно да прыцемку, калі трэба разыходзіцца.

На могілкі па запрашэнню мог з'яўляцца прыходскі святар. Ён па чарзе адпраўляў літыі над магіламі, пераходзячы ад аднаго роду да другога. Па заканчэнні благаслаўляў усім трапезу і ехаў на наступныя могілкі. Калі святара не было, малітвы спявалі і чыталі старцы, за што атрымлівалі ўзнагароду — пачастункі, ці проста запрашаліся пасядзець разам: «Хадзіце памінаць нашых радзіцеляў!» Хрысціянскі абрад заканчваўся, пачыналася язычніцкая трызна. На падпраўленых магілках рассцілаўся абрус, на які выстаўлялася куцця з запаленай свечкай, велікодныя стравы, прыхаваныя спецыяльна да гэтага дня: мёд, тварог, бліны, каўбасы, мяса, яечня, пірагі і г. д. — агульная колькасць у адпаведнасці з мясцовым звычаем у парным ці часцей у няпарным ліку.

Перш чым пачынаць, на магілу для нябожчыка адкладвалася кожная страва, адлівалася абавязкова мядовая сыта і, вядома, гарэлка. Адным з рытуалаў было закапванне ў зямлю ці качанне крыж-накрыж са словамі «Хрыстос уваскрэс!» фарбаваных велікодных яек па насыпу — так званае «хрыстосаванне з мёртвым». У гаворках стараліся прытрымлівацца ўспамінаў пра нябожчыкаў. Знаходзячыся поруч, адна сям'я запрашала другую, ішлі на суседнія магілы, узаемна памінаючы знаёмых і блізкіх. Усе рэшткі, што заставаліся пад канец стала, раздавалі бедным, пакідалі сёе-тое на магілах, нават чыгункі з ядой.

Многія звесткі мінулых часоў і не надта даўніх сведчаць, як некаторыя памінальнікі, ужо адправіўшы жалобны стол, без меры пілі гарэлку. І нярэдка здаралася, што засыналі тут жа, на мо-

гільніку, а то, трацячы розум, распачыналі сварку. Гэта якраз і давала падставу буржуазным этнографам рабіць агульныя вывады пра разбэшчанасць народа, а сам абрад трактаваць як лішні повад для п'янкі. Былі, аднак, мясціны, дзе гарэлка на радаўніцу зусім не ўжывалася.

Часцей за ўсё, апраўдваючы прымаўку, што на радаўніцу «ўвечары скачуць», людзі, пераважна маладыя, ішлі з могілак у карчму ці чыю-небудзь хату, дзе пад гукі дудкі і гармоніка мясцовых музыкаў заканчвалі ўрачыстасць гульбішчам. Старыя людзі і дзеці разыходзіліся па хатах, а то і прысутнічалі тут жа, пазіраючы на маладых, за пачастункамі і гутаркай праводзілі час, нават спявалі розныя песні. Вечарынка магла цягнуцца да раніцы. Пры ўсім разуменні недарэчнасці такога фіналу, яго несумяшчальнасці з абрадам, што папярэднічаў гэтым танцам, людзі прызнавалі за сабой грэх, апраўдваліся і ўказвалі на спрадвечнасць звычаю. Сапраўды, такое мажорнае завяршэнне радаўніцы нагадвае характар старажытных трызн, калі адразу пасля памінак побач з магілай пачыналіся гульні, у якіх удзельнікі дэманстравалі свой спрыт і сілу [59].

Як ужо гаварылася вышэй, правядзенне памінак на могілках адбывалася далёка не ўсюды ў аўторак паслявелікоднага тыдня. «Наўскі вялікдзень», «вялікдзень мёртвых», або яшчэ «стары вялікдзень», святкаваўся ў чацвер велікоднага тыдня. У многіх кутках Палесся ён фактычна замяняў радаўніцу і адзначаўся нароўні з вялікаднем. Лічылася, што ў гэты дзень нябожчыкі з'яўляюцца хрыстосавацца са сваімі жывымі сваякамі.

Неабходна сказаць і пра летнія дзяды, іначай траецкія (духавы, стаўроўскія, сёмка). Асаблівае пашырэнне памінальная субота напярэдадні тройцы мае ва ўсходніх раёнах Беларусі. Папулярнасць яе і форма правядзення там такія ж, як радаўніцы ў цэнтральнай частцы Беларусі. Яшчэ ў «Стоглаве» сустракаем мы апісанне гэтых памінак: «В троицкую суботу по селом и по погостом сходятся мужи и жены на жальниках и плачутся по гробом умерших с великим воплем и егда скомрахи учнут играти во всякие бесовские игры и они от плача преставше начнут скакати и плясати и в долони бити и песни сотонинские пети...» [60] Руская царква на працягу ўсяго сярэдневякоўя змагалася з дахрысціянскімі звычаямі, якімі суправаджалася памінанне нябожчыкаў на могілках. Самі галашэнні асуджаліся як шкодныя для нябожчыкаў. Толькі ў 1715 г. Пётр I забараніў «непрыстойны і забабонны

---

[59] Терещенко А. Быт русского народа.— СПб, 1848, ч. 3, с. 120.
[60] Стоглав.— СПб, 1863, с. 140.

звычай выць, прыгаворваць і рвацца над памёршым»[61]. У радзе мясцін траецкія дзяды фігуравалі як стаўроўскія. З імі звязваецца легенда, не раз працытаваная беларускімі пісьменнікамі і этнографамі, якая прыводзіцца і ў гэтым выданні. Асаблівасцю іх было тое, што, сабраўшы частку страў, гаспадар згінаўся пад стол і тройчы паўтараў: «Стаўры, Гаўры, гам, прыхадзіце к нам!» Сярод іншых дзён летнія дзяды святкуюцца ў наш час на Пятра (Вілейскі раён) і на Спаса (Беласточчына).

Г а л а ш э н н і. У рытуалах абодвух жалобных абрадаў — як пахавальнага, так і памінальных—адыгрывалі важную ролю і былі іх неад'емным кампанентам галашэнні. Пад гэтым паняццем звычайна разумеюць плач з імправізаваным прыгаворам. У першую чаргу гэта форма выражэння чалавечага гора звязваецца са смерцю і радзей з памінаннем чалавека. (Аднак варта ўказаць і на такія разнавіднасці галашэнняў, як вясельныя, рэкруцкія, з нагоды выключных сямейных абставін ці стыхійных няшчасцяў. Некалькі ўзораў такога, калі не сказаць галашэння, дык прынамсі ляманту, прыводзіцца ў томе.)

Плач па нябожчыках як натуральны водгук на страту блізкай істоты мог узнікнуць у самай аддаленай старажытнасці, калі чалавек уступіў у сямейныя і грамадскія формы быту. Відаць, яшчэ на ранніх этапах першабытнаабшчыннага ладу галашэнні ў часе пахаванняў набылі рытуальны характар, паколькі не маглі не з'яўляцца выражэннем страху перад таямнічасцю смерці, перад верай ва ўсемагутнасць нябожчыкаў у вырашэнні лёсу жывых. Улагоджваннем памёршага нібыта забяспечвалася яго ахова ад ліха і спрыянне з замагільнага свету тым, хто заставаўся на зямлі. Галашэнні, як і сам абрад, набывалі магічнае значэнне. І ўсё ж абмяжоўваць патрэбу чалавека ў галашэннях і іншых абрадавых функцыях толькі страхам ці пэўнымі практычнымі меркаваннямі было б няправільна. Варта паглыбіцца ў поўныя трагізму тэксты, і няцяжка будзе пераканацца ў іншай прычыне, якая прымушае галасіць на хаўтурах і памінках і якая падтрымлівае праз стагоддзі існаванне гэтага жанру. Плач над нябожчыкам — гэта перш за ўсё выражэнне смутку, бяссілля перад смерцю, усведамленне расстання з блізкім чалавекам назаўсёды.

«Пахавальная лірыка ўяўляе сабой адзін з тых відаў славеснай мастацкай творчасці, існаванне якіх з несумненнасцю засведчана на працягу ўсёй чалавечай гісторыі»[62]. Галашэнні па нябож-

---

[61] Адрианова-Перетц В. П. Очерки поэтического стиля Древней Руси.— М.; Л., 1947, с. 137.

[62] Русские плачи (причитания).— Л., 1937 / Вступ. статья Н. П. Андреева и Г. С. Виноградова, с. VI.

чыках у той ці іншай агульнай форме былі ўласцівы ці не ўсім народам на зямлі, пра што сведчыць сусветная літаратура. Плакальшчыцы існавалі і ў старажытным Егіпце і Індыі, пра іх захоўваюць звесткі антычная літаратура, эпас Скандынавіі і Францыі. Нямала ўзораў галашэнняў па забітых (вядома, у пераказах) змяшчаюць старажытныя летапісы: «Аповесць мінулых часоў», «Задоншчына», «Сказанне пра Барыса і Глеба», «Жыціе Аляксандра Неўскага» і інш.

Вядомы ўкраінскі даследчык І. Свянціцкі ў сваёй тэорыі фарміравання і развіцця галашэнняў прытрымліваўся даволі лагічнай думкі пра ўзнікненне твораў гэтага жанру з воклічаў ад болю страты чалавека, якія ператвараліся ў выслоўі, далучалі да сябе эпітэты, разрастаючыся паступова «да велічыні самастойных паэтычных параўнанняў і іх сумы, аб'яднанай у адно цэлае як рытмам і рыфмай, так і асноўнай думкай усялякага галашэння наогул — узвялічыць пры народзе нябожчыка» [63].

Пахавальныя галашэнні заснаваны на прыроднай уласцівасці чалавека рэагаваць на страту блізкай істоты плачам — не проста слязьмі, а плачам уголас, з рыданнямі і стогнамі. Слёзы і крык давалі эмацыянальную разрадку арганізму, і душэўны боль, які накопліваўся знутры, знаходзіў у галашэнні свой выхад. Не аднойчы здаралася чуць на сучасных пахаваннях, дзе традыцыйныя элементы народнага абраду (у тым ліку і галашэнні) амаль не мелі выяўлення, як старэйшыя, больш вопытныя жанчыны ўгаворваюць маладзейшую, на якую абрынуўся ўвесь цяжар гора: «Ты паплач, пагаласі, табе ж будзе лягчэй». У словах гэтых — перакананне, што галасны плач патрэбны не дзеля захавання рытуальнай формы (хоць і такі факт таксама мае месца), нават не дзеля нябожчыка, а дзеля яе самой, асірацелай ці аўдавелай жанчыны, якой смерць блізкага ў гэтыя хвіліны здаецца жывой ранай. Відаць, іменна падсвядомае разуменне плачу як сродка палягчэння душэўнага болю і прадвызначыла яму ролю абавязковага абрадавага дзеяння. У мінулыя часы ўхіляцца жанчыне на пахаванні ад плачу ні ў якім разе было нельга. Яна мусіла аплакваць нават найгоршага, нялюбага мужа, інакш не абралася б сораму ад аднавяскоўцаў за сваё маўчанне. Яна магла выказваць крыўду за ліхое жыццё са сваім мучыцелем і за гэта не мела б ніякіх нараканняў ці тым больш затоенай незадаволенасці ад прысутных. Плакальшчыцы дазвалялася выказваць у сваім галашэнні ўсё, чым балела душа. «Галашэнне,— пісаў А. Я.

[63] Свенціцький І. Похоронні голосіння.— У кн.: Этнографічний збірник.— Львів, 1912, т. 31—32, с. 17—18.

Багдановіч,— слёзная імправізацыя, у якой з аднаго боку даецца выхад натуральнаму пачуццю жалю, але разам з тым гэта абрад — публічнае выражэнне гора, звязанае з ухваленнем нябожчыка» [64].

Галашэнні скрозь гучаць на працягу ўсяго пахавальнага абраду, пачынаючы з самага моманту смерці. Голасным плачам з прыгаворамі дзе-нідзе паведамлялі аднавяскоўцам пра смерць у доме, выйшаўшы на вуліцу. Галасілі, калі збіраліся каля прыбранага нябожчыка, калі прыносілі ў хату труну і перакладвалі ў яе цела, калі з'яўляўся хто-небудзь новы з блізкай радні, калі выносілі труну з хаты і са двара, і з асаблівай сілай — калі апошні раз развітваліся на могілках і апускалі труну ў яму. Галасілі пасля пахавання назаўтра з раніцы — на сваім двары і прыйшоўшы «будзіць памёршага» на могілкі, а таксама на памінках і проста ўспамінаючы. Цішыня падчас хаўтур панавала ў хаце, калі мылі нябожчыка (баяліся спалохаць анёлаў, якія панясуць яго душу), калі правіў літыю свяшчэннік. Не галасілі таксама ўночы.

Жанчыны плакалі да стомы, да знямогі, аднак і тут адчувалі меру — берaглі сілы і душэўны стан напаткаўшай гора, нагадвалі пра неадкладныя клопаты: «Перастань, Прасенька, плакаць, галаву сваю раздуруваць! Ты етым яго не падымеш. Думай-ка луччы, як бы яго схаваць і памянуць!» Часам адчай і рыданні дасягалі такой эмацыянальнай сілы, што назіральнікі баяліся не толькі за здароўе плакальшчыцы, але і за яе жыццё. Празмерна доўгае галашэнне шмат часу пазней пасля хаўтур таксама не заахвочвалася ў народзе. Няўцешным маці, жонцы ці дачцы давалі зразумець, што ад іх плачу нябожчык не знаходзіць у магіле спакою. Жыццё працягвалася, і трэба было дбаць пра зямныя клопаты.

Галашэнне на пахаванні ў беларусаў з'яўлялася пэўнай этычнай нормай, праявай павагі да памёршага і яго родных, калі ішло ад далёкіх сваякоў або суседзяў. Чым гучней і даўжэй плакалі, тым у вачах людзей выказвалася большая любоў да нябожчыка.

Галасіць па мёртвых — амаль цалкам жаночае прызванне (надзвычай рэдка і, зразумела, больш стрымана і сціпла ў час найвялікшай бяды галашэнне вырываецца і ў мужчын). Як правіла, галосіць бліжэйшая радня. Калі ж блізкіх няма, а парушыць традыцыю непажадана — сваякі просяць пагаласіць якую-небудзь спрактыкаваную асобу. У наш час гэта здараецца вельмі рэдка. Цяпер звычай фармальнага плачу, пазбаўленага шкадавання нябожчыка, амаль не сустракаецца, хоць у мінулым ён

---

[64] Богданович А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов, с. 52.

несумненна меў месца, а яго носьбіты — прафесіянальныя плакальшчыцы — ахвотна прымалі ўдзел у сумных нагодах. Часам гэтыя плакальшчыцы шчыра падзялялі чужую бяду, і іх плач гучаў з непадробным шкадаваннем. Там, дзе гэта не здаралася, карціна выглядала інакш, што было ацэнена этнографам адпаведным чынам: «Яны (наёмныя плакальшчыцы.— *У. В.*) праводзяць нябожчыка і прысутнічаюць пры пахаванні з адчайным крыкам, ненатуральнымі воклічамі і рыданнямі. Дзіка глядзець на такую сцэну, выкліканую да жыцця не пачуццём, а толькі звычаем, хоць і ў гэтым выпадку нельга не дзівіцца непрыхільнай павазе да памяці і абрадаў продкаў» [65]. Зрэшты і сам народ у так званых парадыйных галашэннях высмейваў бяздушную прафесіянальнасць некаторых плакальшчыц, якія, нават не ведаючы імя нябожчыка, выконвалі сваю справу. Вядома, сярод прызнаных мясцовых плакальшчыц сустракаліся і такія, што, не праліўшы ніводнай слязінкі, сваім мастацтвам бралі ў палон усіх прысутных.

Наогул, умець галасіць павінна была калісьці кожная жанчына. Ад гэтага абавязку вызваляліся хіба толькі безгалосыя і старыя, не здольныя выцягнуць плач голасам. Захаваліся звесткі, што даўней дзе-нідзе дзяўчаты нават навучаліся падчас звычайнай будзённай працы мелодыі галашэння, каб калі-небудзь пры выпадку выявіць свае магчымасці [66]. «Варта адзначыць, жанчыны надзелены вялікім мастацтвам у гэтай справе. Вар'іруючы галашэнні, яны надаюць разнастайныя адценні матывам і выразу ў голасе. Сустракаюцца такія, якія, маючы прыемны голас, выражаюць у плачы такую глыбіню пачуццяў, што людзі з самымі моцнымі нервамі не могуць пры гэтым утрымацца ад слёз, плачуць усе ад дзіцяці да старога»,— пісаў П. В. Шэйн [67].

Калі каля труны збіралася шмат жанчын, кожная паасобку, а то і ўсе разам нястомна выказвалі немым крыкам сваё гора. Там, дзе боль страты быў непадробны, жанчына не думала ні пра вернасць рытуалу, ні пра майстэрства. Яе ўласнае гора ахоплівала ўсю яе істоту, і, здавалася, сама прырода дыктавала ёй правілы паводзін, і амаль несвядома ў плачы нараджаліся незавучаныя, нікім не падказаныя словы: «Гэта не песня, што панімаеш яе, а гэта як да душы даходзіць, то прыкладаеш гэта слова...» — тлумачыла калісьці працэс стварэння рэчытатыву палеская сялянка Хвядося Корж [68].Назіранні і ўсе адказы на нашы роспыты сыхо-

[65] Киркор А. Этнографический взгляд на Виленскую губернию, с. 151.
[66] Rypiński A. Białoruś, s. 62.
[67] Шейн П. В. Материалы...— СПб, 1890, с. 525.
[68] Moszyński K. O badaniach muzyczno-etnograficznych na Polesiu, s. 73.

дзяцца ў адным: галашэнні маюць пераважна імправізацыйны характар. «У жаль увядзеш і астальных, як пачнеш,— гаварыла інфарматарка з Вілейскага раёна.— Яно само прыходзіць. Успамінаецца ці сваё гора, ці як яна, нябожчыца, гаравала. Успамінаеш і прыгаворваеш...» [69] Нездарма Змітрок Бядуля называў галашэнні «вытокам шчырай паэзіі ўсяго чалавецтва».

Імправізацыя характэрна для многіх фальклорных жанраў. Без свабоднага ходу думкі, без адхіленняў, дадаткаў, купюр і іншых варыяцый немагчыма ўявіць кожнае новае выкананне твора казачнікам. Над калыскай немаўляткі спявае маці калыханку, прыдумваючы самыя пяшчотныя, самыя цёплыя словы, якія ў наступны раз зноў будуць іншымі. Здараецца часта, што, забыўшыся слова ці знайшоўшы раптам больш дакладнае, адпаведнае, спявачка робіць падмену нават у якой-небудзь класічнай каляндарнай ці сямейнай песні з цвёрдым устойлівым тэкстам. Пры ўсёй, здавалася б, аднастайнасці формы, кампазіцыйных прыёмаў, вобразаў, галашэнні ўсё ж не падобны адно на адно, пакольні кожнае выяўляе сабой персанальную творчасць. Вар'іраванне твораў гэтага жанру магчыма потым, калі пераказваецца тэкст свайго ці чужога колішняга прычытвання. Тады адсейваецца неабавязковае, упарадкоўваецца натуральная для ўзрушанага стану плакальшчыцы хаатычнасць, неарганізаванасць тэксту, які жыве ў свядомасці; уводзяцца новыя, часта традыцыйныя песенныя вобразы — адным словам, адбываецца набліжэнне да нейкага агульнага стэрэатыпу. Але ўсё гэта магчыма значна пазней, калі эмацыянальны ўздым даўно перажыты. У час пахавання «гуканне ўдавы разрастаецца ўсё больш, яно не ўкладваецца ў прыдуманую народам эпічную форму, а дыхае непасрэдным лірычным пачуццём, падказаным стратай мужа, бязрадасным станам удаўства... Фантазія разрастаецца..., ствараючы рад змрочных карцін з рэальным адлюстраваннем будучай долі яе і сірот» [70]. Рэдка хто з міжвольных сведкаў галашэння застаецца спакойны. Яно ўзрушвае, яго нельга безудзельна абмінуць, як нельга прайсці праз чалавечае гора наогул.

Галашэнні, створаныя здольнай ад прыроды асобай, у адрозненне ад імправізацый звычайных, хоць і шчырых плакальшчыц, набываюць мастацкую сілу. Іменна ў гэтых выпадках, калі, паводле слоў З. Бядулі, «слёзы ў перлы застываюць», плач з прыгаворам — галашэнні — можна далучыць да твораў народнай паэзіі. Як пісаў П. В. Шэйн яшчэ ў мінулым стагоддзі, на паха-

---

[69] АІМЭФ, ф. 8, воп. 79, спр. 159, сш. 2, л. 44. Зап. У. А. Васілевіч.
[70] Добровольский В. Н. Смоленский этнографический сборник.— СПб, 1894, ч. 2, с. 316.

ванні нярэдка «складваюць цэлыя элегіі, поўныя паэзіі, мастацкасці і прыгажосці»[71]. Галашэнні ў спосабе стварэння штосьці агульнае маюць з калыханкамі; хоць па спосабу выражэння гэтыя жанры можна лічыць палярнымі. У абодвух выпадках жанчыне хочацца сказаць самае лепшае, чым поўніцца яе душа, самымі пранікнёнымі словамі, якія захоўвае ў сваіх невычэрпных скарбніцах мова. Аднак у калыханках словы маці прасякнуты шчасцем з-за таго, што яе дзіця жыве на свеце, што ў яго ёсць будучыня. І зусім іншым, супрацьлеглым адчуваннем поўніцца напалову імправізаванае галашэнне над труной — гэтай апошняй «калыскай», дзе чалавеку наканавана спаць вечна. Усведамленне таго, што памёршы ўжо ніколі не зможа пачуць добрых слоў, прыспешвае жанчыну «ў апошні дзянёчак, у апошні часочак» выказаць усё не сказанае пры жыцці. «Цяжка знайсці дзе-небудзь столькі ласкальных слоў, колькі іх знаходзіць... беларус, калі гаворыць ласкавую прамову... Іменна пераважна і выключна на хаўтурах можна наслухацца ласкальных беларускіх слоў»,— пісаў М. Я. Нікіфароўскі[72].

Бадай ніколі пры жыцці (хіба толькі ў раннім дзяцінстве) чалавеку не адрасавалася столькі пяшчоты, ласкі і любові. І да бацькі, які б ён ні быў — суровы ці спагадлівы — звярталіся кранальна: татулька, татулечка, мілюсенькі, раднюсенькі, жаласлівы, кармільчык. Бліжэй за ўсіх да маці заставалася дачка, нават калі лёс разлучаў іх. Клічучы маці, сірата малявала яе вобраз рэальнымі жывымі фарбамі, быццам з натуры, называючы «жаласніцай жалкай», «сустракальніцай прыхільнай», «праваднiцай шчырай», «прывумніцай», «прыдумшчыцай», «парадніцай». Вобраз набываў мастацкую сілу, калі ў трагічны маналог упляталіся элементы народнай сімволікі: «сівая лесавая кукулічка», «шэрая зязюлечка», «галубачка сызакрылая», «пташачка малінаўка», «жаўраначка», «саколачка», «рыбачка», «ягадка», «вішанька красная». З прыроднага свету адбіраліся тыя сімвалы, якія ўвасаблялі сабой светлы воблік маці, яе чысціню, бяскрыўднасць і безабароннасць («ляжыш, як былінaчка, зламана»). Кожнае слова, звернутае да нябожчыка незалежна ад ступені сваяцтва, па-свойму кранае. Праз паэтычны сімвал раптам высвечваецца, нібы сілуэт, вобраз памёршага. Напрыклад, прыгажосць дачкі ў свядомасці маці паўстае ў вобразах «ластачкі залётнай», «птушачкі-перапёлачкі», «лябёдачкі белай», «кудравай бярозы», «чырвонай рожы», «каліны спелай, высокай». Памёршага сына

---

[71] Шейн П. В. Материалы...— СПб, 1890, с. 543.
[72] Там жа, с. 514—515.

маці называлі «труждонічкам невялічкім», «шчабятунчыкам», «салавеічкам шэрым», «дубанькам зялёным, кучаравым», «яварам высокім», «пчолачкай адлётнай»...

Страта мужа ў доме была па-свойму балючай. Жанчына пазбаўлялася заступніцтва, сваёй надзейнай апоры ў гаспадарцы, мужчынскай ласкі — усё гэта таксама гучала ў апошнім звароце да мужа: «залаценькі каласок», «маё соўнейка», «мой месячык», «сізы галубок», «хазяін любы», «шчамялёчак», «працаўнічок міленькі», «надзеждушка верная», «работнічак, гаротнічак». Кожнае слова не толькі нясе ў сабе бязмерную любоў, але і тоіць нейкі глыбінны і зразумелы толькі плакальшчыцы і таму, да каго яна звяртаецца, падтэкст.

Нярэдка выпадкова народжаны асацыятыўны вобраз нечакана становіцца штуршком да цэлай тэмы, якая вар'іруецца ў прадвызначаным тым вобразам рэчышчы. Іншасказальнасць як мастацкі сродак яшчэ больш узмацняе матыў недарэчнасці, трагічнасці смерці.

«Яварэ, хто цябе падсёк, падрубаў? У каго такая гостра сякера була, што магла цябе ссекці?»

«Ягадачка недаспелая, чым жа цябе здзьмухнула — ці буйным ветрыкам, ці пташачкі склявалі?»

«Маманька карміліца, краснае маё сонца! Закацілась за цёмныя лясочкі, за шэрыя барочкі».

«Кветачка ясная, чаму ж ты так скора перацвіла, адышла?»

«Рыбанька залаценькая, як пакупалася, так і не паднялася».

Плакальшчыцы цяжка паверыць у незваротную страту. Узіраючыся ў нерухомае цела, яна ў сваім шкадаванні нібы стараецца пераканаць сябе ў рэальнасці надышоўшай смерці, у немагчымасці вяртання памёршага да жыцця: «Галовачка мая дарагая наклапаталася і нагаравалася; ручачкі міленькія дробненькія наработаліся дзень і ноч; ножачкі дарагія нахадзіліся ўсюдых — не было ім спакою»; «ясныя вочанькі зажмурыліся». Гэтыя словы — свайго роду падвядзенне рысы пад жыццём сумленнага працаўніка і сем'яніна.

Пахавальнае галашэнне — гэта па сутнасці апошняе слова, з якім можна звярнуцца да нябожчыка, пакуль ён яшчэ не аддадзены зямлі, пашкадаваць яго, папрасіць прабачэння за ўсе крыўды, распытаць, даць наказ на той свет. Дачка гатова зрабіць немагчымае, каб толькі вярнуць маці да жыцця: «Я твае ручкі адагрэю, вочкі адкрыю, толькі ўстань!» І ў роспачы цалуючы вочы, рукі, быццам жадае абудзіць яе ад вечнага сну, але «вочкі не адкрываюцца, ручкі не разнімаюцца». З дарогі ў нябыт звароту няма, і, як апошняя спроба перасцерагчы, не даць знікнуць, вы-

рываюцца словы: «Ножачкі мала хадзілі, а цяпер не туды ідзяцё». Запозненай падзякай, дакорам самім сабе, не вартым апраўдання і жаласці, вырываюцца прачулыя словы ўнукаў, звернутыя да бабулі: «Ты ж нас гадавала, калыхала, труждanніца, бабунічка. Мы твае ножкі прытамілі — нас калыхаючы, прыказкі нам усякія спяваючы; ручкі твае паатарвалі — нас носячы».

Можна адчуць, што галашэнні пры ўсім сваім імправізацыйным спосабе стварэння маюць усё ж ва ўласным жанравым паэтычна-вобразным ладзе цесную сувязь з традыцыйнай песеннай творчасцю. Асабістыя эмоцыі выказваюцца не толькі словамі, народжанымі непасрэдна, імправізавана, але традыцыйнымі сродкамі выражэння. Паэтычныя формулы трывала замацаваны ў свядомасці плакальшчыц і пераходзяць з пакалення ў пакаленне амаль без змен. «З момантам цеснага злучэння вольнай імправізацыі і абраду,— пісаў І. Свянціцкі,— галашэнне пачало камянець у сваіх паэтычных зваротах-карцінах, пакуль зусім не перайшло як пэўны вызначаны канон у рэпертуар абрадавых плакальшчыц...» [73]

Пры ўсім на першы погляд падабенстве галашэнняў амаль кожнае з іх мае непаўторныя матывы, дэталі, вобразы. Магчымы розныя тыпы ўнутранай сістэматызацыі жанру, але, відаць, найбольш адпавядаў бы той, пры якім высветліліся б нейкія мастацкі абумоўленыя заканамернасці. У дачыненні да тэкстаў пахавальнай паэзіі беларусаў рэгіянальны прынцып быў бы мала прыстасаваны. Па-першае, галашэнні, запісаныя ў розных кутках Беларусі, у плане паэтычных вобразаў і тэм мала чым розняцца паміж сабой. Па-другое, друкаванне твораў у адпаведнасці з нормамі беларускага правапісу нівеліруе некаторыя фанетычныя асаблівасці мовы арыгіналаў. Не падыходзіць таксама і паэтапны прынцып, паколькі ў імправізацыях далёка не заўсёды чуецца прывязанасць да пэўнага абрадавага моманту. Тэматычны падзел жанру пры наяўнасці ў галашэннях адначасова некалькіх матываў і часта проста хаатычнасці думкі наогул быў бы проста немагчымы. Найбольш прыдатнай, думаецца, з'яўляецца выпрабаваная яшчэ ў мінулым стагоддзі класіфікацыя галашэнняў паводле прадстаўнікоў сваяцтва, да якіх звяртаецца плакальшчыца. У агульных тэмах, матывах, пытаннях, уласцівых усім «сваяцкім» групам, кожная з іх пры такім падзеле дазваляе ўбачыць збіральны вобраз паасобнага родзіча. Любая ступень сваяцтва ўтварае сваё адметнае «магнітнае поле», куды сыходзяцца адметныя вобразы, сваё кола тэм, праблем, пытанняў. І шмат з выплакана-

[73] Свенціцькі І. Похоронні голосіння, с. 18.

га па мужу розніцца ад таго, што галосяць па брату, па маці, па дачцы і г. д.

Апорай сям'і, яе галоўным кармільцам заўсёды лічыўся гаспадар. Усе яго клопаты перакладваліся цяпер на плечы ўдавы ці дзяцей, і тая цяжкая праца, якая пры жывым гаспадары дзялілася між усімі пароўну і не здавалася празмерна цяжкай, уяўлялася цяпер непасільнай, нібы вырастала на вачах: «У мяне зямелькі было нямножанька — палосанька была і вузенька і караценька, а цяпер стала і доўга і шырока, і будзе стаяць някошана, няжаць няворана, буду хадзіць і ручанькі ламаць». Блізкіх апаноўвае страх за будучае, яно малюецца як суцэльная бяда, якой не будзе канца: «Хто будзе адзяваці, карміці? Каму пакінуў сошаньку, іванькy? Зарасцець ніванька быльнічкам, Згніець сошанька пад бярозачкай»; «Як жа без цябе зімачку перазімаваці? Дроў ні паленца, печачка халодная».

Асабліва балюча ўражваў плач дзяцей: «Можа пад вугольчыкам будзем начаваць абарваныя і абшарпаныя, гаротненькія». Пра малых дзетак згадвае ў звароце да нябожчыка ўвесь час і сама ўдава: «Чаму ты пакінуў свае птушаняткі?»; «Якому суседу ты наказ даваў, каб тваіх дзетачак даглядаў?»; «Сямёра дзетак, усе малыя, не бяруцца за цэп, а бяруцца за хлеб». Разам з тым жанчына пачынае разумець уласную адзіноту, што наступае на яе. Любоў да чалавека, якому дагаджала, ад якога мела дзяцей і які яе таксама любіў, раптам перапыніла няўмольная смерць. У сваіх роспытах удава нібы жадала высветліць прычыны, чаму блізкі чалавек «з маладосці пакінуў, а да старасці не давёў», не падумаў пра будучае, дакарала мёртвага, дакарала сябе, быццам адчувала за сабой нейкую віну: «Ці ж я табе не спадручна была, ці ж не ўмела да цябе гутарыць? Ці ж не спадабала я табе, ці ж не шанцавала табе за мной? Ці ж на тое жыла, каб плакаць на магілцы на тваёй? Можа я цябе не сцерагла? Можа я табе напрыкралася? Можа ты не злюбіў сваёй печкі-лаўкі і папробаваць прышлося зямлю сырую, сцюдзёную? Ці ж табе не лепей было цёпла жыць?»

Галашэнні дачкі па маці прасякнуты асаблівай пяшчотай і паэтычнасцю. Ніхто, бадай, акрамя дачок, не можа так выказаць горыч страты. Іх галашэнні нібы ўвабралі ў сябе душэўны боль і ўсіх мужчын сям'і—мужа, сыноў нябожчыцы, якія па традыцыі вымушаны былі стрымана перажываць сваё гора. Дочкі выказвалі і сваю асабістую бяду: яны, спадчынніцы, назаўсёды пазбаўляліся сваёй дарадчыцы, суцяшальніцы, якая лепш за ўсіх на свеце разумела сваё дзіця. Асабліва маладыя дзяўчаты, у якіх сталае жыццё толькі пачыналася, вельмі балюча перажывалі сваё сіроц-

кае становішча: не было ўжо да каго прыхінуцца, пажаліцца, падзяліцца горам ці радасцю, параіцца; не было каму іх пабуджаць, «коскі заплятаць». Самыя значныя падзеі дзяўчыны былі яшчэ наперадзе, і сустракаць іх яна мусіла ўжо без маці: «Хто ж нашу свадзьбачку будзе гуляць? Хто нашых гасцей будзе вітаць?»; «Хто мяне з-пад вянца ўстрэціць? Хто мне трубачкі палатна ў парадак прывядзець?»

Пакінуўшы бацькоўскі дом і звіўшы сваё гняздо, дачка, адарваная ад маці, рада была кожнаму выпадку пабачыць яе, асабліва калі свой лёс не надта песціў: «Хто мяне так сустрэнець, правядзець, як матулечка? Хто аб здароўі папытаець, пра худобаньку праведаець? Пра майго няўдаліцу так распросіць? Па майму гору так папячаліцца? Маей дабраце так урадуецца? К каму пайду прыкрую праўду скажу?» Маці заўсёды станавілася заступніцай, першай памочніцай, калі была жывая: «Хто майго супастата цяпер уймець, як ён разгуляецца? Хто дзяцей панянчыць?»

Вобраз маці выступае ў галашэннях увасабленнем святла і цяпла, яна — як жывая душа ўсёй сям'і, таму з адыходам маці ўсіх апаноўвае пустата і холад: «Хатачка наша будзе чужая, куточкі цёмныя...»

У галашэннях па дзецях з надзвычайнай сілай гучала наракание на смерць, якая да пары насуперак прыродзе забірае іх раней за бацькоў, не даўшы нацешыцца жыццём: «Чаму ж ты так хутка шчэзла, як ранняя раса, як волас у агню?»; «Ці мне цябе нада хаваці?» Дзіця адышло ў іншы свет, а матчын непакой за яго далейшы лёс станавіўся як бы працягам яе зямных клопатаў. Яна не ў стане змірыцца з тым, што назаўсёды разлучана са сваёй крывінкай: «Хто табе там будзець лучча роднае маткі? Хто ж табе будзе слаць пасцельку мягчэй за мяне?»; «Хто цябе там калыхаць будзе без сваёй люлечкі, без сваёй матулечкі?»; «Ці не ўпадабала майго спавівання, даглядання, калыхання?»

Якімі б дарослымі ні былі сыны і дочкі, яны заўсёды застаюцца для маці дзецьмі, яе ўцехай, спадзяваннем на будучае. Адзінокая бездапаможная старасць («З кім я цяпер буду гаварыці — толькі з шэрай зязюлькай, з пустой хаткай?») іменна ў дзецях — уласным працягу — бачыла сваю адзіную падтрымку, сваю «пераменку», свайго «хлебнічка». Без іх невядома, як давядзецца дажываць адмераныя лёсам гады. «Хто ж маёй старасці прыгледзіць, пітынькі-естынькі падасць?» — у роспачы пытаецца старая маці. У напаткаўшым яе горы ўсё, здаецца, нагадвае пра адсутнасць роднага дзіцяці; яно не бяжыць насустрач матцы, не бавіцца з дзецьмі на вуліцы, не рве красачкі, яго мясцеч-

ка за столікам гуляе, без яго пастушкі ідуць пасвіць конікі. І маці нават не гоніць ад сябе думку пра смерць дзіцяці. Яна прыслухоўваецца да спеву дзяўчатак, і ёй будзе здавацца, што яна чуе голас сваёй дачушкі. Яна будзе ўзірацца ў акенца, прыглядацца да людзей, прачынацца ўночы ад ледзь чутнага шолаху — ва ўсім ёй будзе здавацца радзімы вобраз: «Пайду ў хату — хата нямая, гукну ў хату — хата глухая, няшчасцейка толькі гукаець». У галашэннях па дзецях нярэдка нeяк раўніва, са шчырай зайздрасцю і нязменным жалем смерці супрацьпастаўляецца жыццё, якое віруе навокал: «Бабкі выйдуць гуляць са сваімі дзеткамі на вуліцу, а я ж буду на магільнічку кукаваць».

Смерць у юначым узросце — гэта заўсёды няспраўджаныя бацькоўскія надзеі. Ці не з найвялікшым хваляваннем чакаюць бацькі галоўнай падзеі жыцця сваіх дзяцей — іх шлюбу, і колькі гора звальваецца на іх плечы, калі раптоўна смерць забірае іх сына ці дачку. Замест вяселля ў хату прыходзіць іншы абрад. І гэтыя дзве супрацьлеглыя ўрачыстасці коратка акрэсліла народная прыказка: «Вяселле слаўна песнямі, а хаўтуры — выем». У галашэннях, як і ў самім пахавальным абрадзе маладых, часам гучаць матывы непрычаканага шлюбу. Такія хаўтуры плакальшчыца называе «вяселлейкам горкім, не радасным, не вясёлым», «не такім, як людскае» («Уся наша бяседанька слёзкамі ўмываецца»). Плачучы па дачцы, матка бядуе, што тая «ўсіх тавырышак не пааддавала замуж», «усіх вяселлейкаў не пагуляла», шкадуе, што не «гібаці» ёй ніколі караваю, «не расціці зялёнай рутанькі», «не гадаваці малыя дзетанькі». Гледзячы на апранутую па традыцыі ў белую шлюбную сукенку памёршую дачку, маці ніяк не можа забыцца на неадгулянае яе вяселле: «Устань, скажы, каторых мне сватоў падпеаразаць? Да на якую староначку замуж ідзеш?»; «Дзе твае сваткі? Чаму яны такія нядобрыя — бяруць доню, не пытаюцца, а ты ідзеш?» З тым жа звяртаюцца і да хлопца, як да жаніха перад шлюбам: «А каго ж ты будзеш прасіць падбратнічкам? А каго ты будзеш прасіць падмузычнікам? А каго ж ты будзеш сабе ў сваццейкі браці? Чаму ты свайго татачку не гукаеш на радачку? Каторага ён будзіць табе коніка выпраўляць, выводзіць-выводжываць?» Не спраўдзіліся і матчыны мары: «Я ж думала нявестку маці, шчоб мяне намёткамі вязалі, а я ждала і не дождалася. А я мусіла і рукавязнікі і ручнікі ў цэркаў даваці, з аброкам у цэркаў ісці». Цяжка ўявіць большае душэўнае выпрабаванне, чым пахаванне ўласных дзяцей. Ці не кожная маці, калі б гэта было магчыма, згадзілася б памерці сама, каб толькі дзіця яе засталося жывое. Вынашанае і выпакутаванае, яно ёй даражэй за ўласнае жыццё: «Я ж цябе ра-

джала — умірала, гадавала — гаравала, цёмнай ночкі недасыпала».

Асноўную частку паэтычнага зместу пахавальных галашэнняў складаюць успаміны пра памёршых, пералічваюцца ўсе іх дадатныя якасці, прыгадваецца ўсё тое добрае, чым нябожчык пакінуў па сабе на гэтым свеце добрую памяць: «Устанеш расою, працуеш у полі, робіш за ўсіх — пачынанне і сканчанне ўсё з цябе»; «У поле, бывала, паедзеш і ў двор рупішся, каб копку прывезці і гумно паглядзець, і змалаціць, і ў поле паспець — пасеяць і закапаць». Галосячы па дзецях, маткі ўспаміналі пра іх паслухмянасць, вясёлы нораў, пастаяннае жаданне дапамагчы: «Ты мне і вадзіцы прынясеш, і кароўку напасціш, і сенца эбярэш, і скацінку накорміш»; «Бывала, выйду на жніво ў поле, сама стану жаць, а ты кала мяне, а ўвечары ты мне і снапочкі паносіш».

Трагізм у галашэннях па любімаму мужу, па бацьках, па дзецях гучыць надзвычай напружана. Нават калі мы не з'яўляемся непасрэднымі сведкамі імправізацыйнага рэчытатыву, да нас гэту сілу людскога болю даносіць ужо само слова. Не менш душы ўкладвалі плакальшчыцы ў галашэнні па старых людзях: смерць блізкага — заўсёды гора. І ўсё ж, хаваючы старых, плакалі куды больш стрымана — маўляў, стары чалавек пажыў сваё. І калі па маладому аплаквалі няздзейсненае ім, то ў адносінах да старога чалавека гэтай балючай тэмы не існавала: за адмераны век ён усё сваё зрабіў. І таму горыч страты выказваецца падзякай за дапамогу ў гаспадарцы, у гадаванні малых дзяцей. Нязначныя для іншага выпадку дарагія ўспаміны набываюць у галашэннях па старых, як пад павелічальным шклом, асаблівую значнасць, і на падставе той ці іншай дробнай дэталі можа развіцца цэлы расказ пра дабрачыннасць памёршага.

У галашэннях над нябожчыкамі, несумненна, дапускаліся перабольшванні, калі гаворка ішла пра іх дабрату і розныя іншыя станоўчыя якасці. Але пэўнае прыхарошванне любага вобраза ішло ад чыстага сэрца і не выглядала крывадушшам ці несправядлівасцю. Непадробная шчырасць галашэнняў гучала і ў тых рэдкіх выпадках, калі пра ліхога гаспадара нельга было сказаць нічога добрага. І тады з вуснаў зрывалася горкая праўда. Яна была не помстай — проста набалелая душа прычакала нарэшце хвіліну, калі крыўдзіцель кінуў гэты свет, вызваліўшы пакутніцу ад пабояў і лаянкі: «Ты ж мяне не любіў, не жалеў. Я з табой нажылася, нагаравалася... Босая нахадзілася па марозу»; «Не раз я начавала ў чужой хатцы пад вуглом. Калі дзетак успею захаваць, а калі не... Не раз ты іх, бедных, напужаў... Не глядзеў, што яны абарваныя, не папытаўся, што яны накормленыя». Гэта

тэма, паэтычна завершаная ў лірычных песнях пра жаночую долю, нібы губляла ў галашэннях сваю мастацкую абалонку і раскрывалася з амаль дакументальнай дакладнасцю. Чаго варта была мужнасць удавы, калі на развітанне яна гаварыла свайму няўдаліцу з якім, нагараваўшыся, не ведала за ўсё жыццё «ні будня, ні празнічка»: «Ты ў мяне не заслужыў, штоб я па табе плакала... Добра, што цябе бог узяў, можа, мае косці адпачынуць ад тваіх рук!» Папракалі не толькі ліхога мужа. Не магла стрымаць сваёй крыўды дачка па бацьку-валацугу, што ўкарочваў век усім блізкім. Не таілася нявестка, наракаючы на свёкра ці свякруху: «Рана пабуджала, на сяле абслаўляла; не памочніца, а нябыльніца; не парадніца, а зрадніца. Параіш — а после абславіш. Дабраты мне не мысліла, воўкам глядзела, а цяпер і саўсем не хочаш!»

І ўсё ж суровыя прыгаворы і асуджэнні не часта гучалі на хаўтурах. Галашэнні былі напоўнены шкадаваннем, глыбокім смуткам. Несуцяшальнай плакальшчыцы здавалася, што са смерцю дарагога чалавека павінна было б анямець усё навокал. Ёй цяжка было паверыць, што той, над кім яна гаруе, знерухомеў назаўсёды, а прырода працягвае жыць па сваіх законах: «Пташачкі заспяваюць, казявачкі пааджываюць, мурашачкі павыпаўзаюць..., а цябе ў пясочак закапаюць»; «Цяпера і мошачка на свет божы выходзя, і цыплёначак з яечка выклюецца, і лісточак і травіначка вылазя на цёплае сонейка, адзін ты... з зямелькі не выйдзеш». Як пра нейкую несправядлівасць гаворыць плакальшчыца: «Усе птушкі і звяры будуць, а цябе не будзе!»

Вобраз нябожчыка ў галашэннях ствараецца такім чынам, што, развітаўшыся з жыццём, ён, яго душа быццам адыходзяць у навакольную прыроду, растваракоцца ў ёй. Прыродны свет тым самым нібыта бярэ яго пад сваю ахову і, здаецца, нясе жывым суцяшэнне: «Пайду ў чыстае поле — буду гукаць на раздоллі, буду слухаць, як над тваёй магілачкай старыя бярозы шумяць». Разам з тым усемагутная прырода заклікаецца на дапамогу вярнуць блізкага чалавека: «Каб дожджыкі палілі і зямельку размылі, каб перуны труначку тваю разбілі, каб соўнейка ажывіла». Да сіл прыроды звяртаюцца і тады, калі здаецца, што страту перажыць немагчыма, а ў жыцці не знайсці ніякага паратунку: «Расступіся, сіняе возера! А залі ты мяне з дзеткамі маімі!»

Не толькі ў зваротах да мёртвага, але і ва ўсім паэтычным змесце галашэнняў выразна гучыць народная сімволіка. У разгорнутай карціне вобразы-сімвалы ствараюць алегарычную карціну сямейнага гора: «Закацілася яснае сонейка, што не грэець нас, горкіх сірацінанак. Веюць на нас ветры сцюдзёныя: куды

ветрачкі падуюць — туды мы пацягнемся». Сімволіка была параджэннем асацыятыўнага мыслення чалавека і ў спалучэнні з паэтычным дарам, пільнай назіральнасцю знаходзіла выхад у мастацкіх вобразах народнай творчасці. Фантазія чалавека, падмацаваная верай у несмяротнасць душы, малявала вобраз мёртвага то ў выглядзе нябесных свяціл («Прыйдзі хоць позненька, хоць раненька, узыйдзі хоць месячкам, паявіся хоць зорачкай»), то дрэва («Бярозка, бярозанька, чаму ў матачку не пераменішся, сваёй дачкі да й не спытаеш?»; «Бабачка, грушачка мая старэнькая»). Аднак часцей за ўсё душа ўвасаблялася ў арнітаморфныя вобразы. Адыход з жыцця параўноўваўся з птушынымі пералётамі. Вобраз бязмежнага, недасяжнага чалавеку выраю ўзнікае амаль кожны раз, калі плакальшчыца праводзіць памёршага ў апошні шлях: «З якімі пташачкамі ў вырай паляціш? З гусачкамі? З буслечкамі? З салаўямі?» Як і ў зваротах, так і ў гэтым выпадку вобраз атрымлівае развіццё, выклікае тэму заўчаснасці смерці. Са скрухай папракаюць нябожчыка за тое, што ён «паспяшаўся», «зарань памёр»: «Шчэ ўсе пташачкі кругом лятаюць ды з намі спяваюць». Знаходзілі адпаведныя словы і калі завітвала смерць «напроці зімушкі, халоднай, сцюдзёнай»: «А ты халодненькая, голенькая, а ўсе тваe костачкі змерзнуць». Асаблівым дысанансам ва ўсеагульнай прыроднай гармоніі выглядае адыход чалавека з жыцця напрадвесні, калі ўсё жывое абуджаецца ад зімовай скаванасці: «Пташачкі з выраю, а дзіцятка ў вырай. Ці зязюлечка падкукавала? Ці салавеечка падшчабятаў? Ці туды цябе падгаварылі? Усіх пташачак з выраю дажджуся, а свайго дзіцятачкі — ні век».

Расстанне назаўжды клалася невыносным цяжарам для тых, хто заставаўся жыць. Аддаючы цела зямлі, а душу нібыта праводзячы ў вырай, жывыя наказвалі мёртваму прыходзіць з нябыту, вяртацца любымі праявамі прыроды: «Ці ты соўнейкам ўзыдзеш? Ці ты вутанькай праплывеш?»; «Ці ты ка мне птушачкай узляціш? Ці ты ка мне казявачкай успаўзеш»? У галашэннях падрабязна распытваюць мёртвага, куды ён выпраўляецца, дзе яго выглядаць (у зялёным гаёчку, на вуліцы, перад акном, у садочку, пад бярозай ці пад крутым берагам), як яго пазнаваць (ці па пер'ечку, ці па галасочку). Плакальшчыца абяцае, што будзе ўвесь час чакаць як самага дарагога госціка: «Я б вулачкі павымятала б, столікі пазасцілала б, кубачкі паналівала б»; «Будзем дажыдаці — цвятком сцежкі ўсцілаці».

Нярэдка жанчына дакарае сама сябе ў няўважлівасці да памёршага пры яго жыцці, нават ускосна ўскладвае прычыну бяды на сябе. Яна нібы адчувае сваю віну перад мёртвымі за тое, што

ўсіх хавае, а сама жыве: «Няхай бы я да лягла ў ямку, чым я кладу вас усіх маладзенькіх». У адваротным выпадку вінаваціць сябе і дачка перад бацькам: «Ты мяне, маладзенькую, выгадаваў. Я цябе, старэнькага, не дагледзела...»

Галашэнні гучалі на кожным этапе пахавальнага абраду і з асаблівай сілай узмацняліся, калі ў дом прыносілі труну — бачучы напамінак пра блізкі ўжо час развітання з дарагім чалавекам. Гэта апошняе ложа, апошні прытулак, у галашэннях асацыіруецца з роднай хатай, супастаўляецца з ёю і разам з тым супрацьпастаўляецца ёй: дом — дамавіна. Сэнсавы аналаг аднача-сова з'яўляецца і сэнсавым антыподам: «Збудавалі ж табе новую хатачку харошанькую, толькі цесненькую, нявідненькую ды халодненькую... без сенечак, без акошачак, нікога табе не відна будзе»; «Тут жа ветрыкі не завеюць, птушачкі не залятаюць». Тэма ўласнай хаты часцей гучыць у галашэннях па мужчынах, на памяць прыходзяць успаміны пра пабудову родных сцен: «Ставіў хату новую, казаў, добра жыць будзе, майстрам казаў, каб пяць акон рабілі». Апусцелы са смерцю гаспадара дом становіцца маўклівым помнікам яго працавітасці. Горкім папрокам напоўнены словы ўдавы, звернутыя да гаспадара, за тое, што ён не захацеў у раскошнай хаце жыць, што вырашыў аддзяліцца ад родных і таму «наняў плотнічкаў, сабраў работнічкаў». Просячы майстроў зрабіць для бацькі дамавіну, дачка наказвала: «Зрабіце татку дамочак вясёленькі, каб ён быў раскошненькі, прасячыце аконечка, каб ён адтуль мог глядзець на мяне». Заўчаснасць смерці падкрэсліваецца асабліва тады, калі нябожчык пры жыцці не паспеў дабудаваць дом і воляй лёсу пасяляецца ў іншы — на аднаго яго збудаваны. Бядуе, вядома, і матка па дзіцяці, якому ў яго новай, зробленай за адзін дзянёк хатачцы без вугольчыкаў «не можна будзець устаць і з лялькай пагуляць».

У сваім звароце да нябожчыка жанчына расказвае пра тое, што адбываецца навокал — як прыходзяць адведаць суседзі, як прыязджаюць здалёк сваякі і знаёмыя, дакарае памёршага за безудзельнасць у зборышчы: «Усе падружанькі твае сабраліся, усе дружкі пазляталіся, а ты, дружка, ціхенька ляжыш, нікога не ўгашчаеш, гуляці не прыглашаеш»; «Як прыйдуць людзі — усіх на лаву саджаў, а цяпер усю заняў, нікога не пускаеш!» Тут, у хаце, галосячы, жанчыны прыгадвалі, як чалавек марудна расставаўся з жыццём ці, наадварот, памёр раптоўна, калі нішто не прадказвала яго канчыну: «Заўчора араў, касіў, а ўчора ўжо піт-тачкі прасіў, а ўранні свечачку дзяржаў, а ўвечары і саўсім сканаў». Пасля таго як цела праляжала ноч у хаце, назаўтра з раніцы плакальшчыца пачынала роспыты ў нябожчыка, які ўжо

нібыта паспеў пагасцяваць у продкаў. У кожным пытанні чуецца працяг прыжыццёвых клопатаў, непакой за магчымую самотнасць памёршай душы: «Як табе спалася, начавалася? Ці ты вячэрала, ці снедала? Як там цябе страчалі: чы з сур'ёзам, чы з угрозай, чы з музыкай? Устань, ды хадзі з намі снедаць...»

Плакальшчыца, фіксуючы ход навакольных падзей, часам перапыняла сваё галашэнне над нябожчыкам, каб звярнуцца да прысутных са словамі падзякі за дапамогу і падтрымку ў напаткаўшым яе горы, прасіла параіць, як жыць далей, шукала спагады: «Людцэ мае мілыя, родныя, усе плачце, крычэце, мамачку разбудзеце»; «А мае цётачкі, дайце парадачку, як жыць без татачкі. Дзякуй вам, цётачкі, дзедзечкі, што памагаеце хаваць мне татачку, што ка мне прыхінуліся. Што б я адна рабіла?» Плакальшчыца прасіла падзякаваць мёртваму за яго ласку, якую адчуў хоць калі кожны, хто прыйшоў з ім развітацца. Узаемныя крыўды, калі такія існавалі паміж нябожчыкам і кім-небудзь з прысутных, у сумны час праводзін павінны былі поўнасцю дараваццa. Паміраючы, калі быў у стане, рабіў гэта яшчэ адчуўшы набліжэнне хуткага канца. У сваю чаргу прабачэння ў мёртвага прасілі жывыя, што з'явіліся на жалобу. Каб ніякія крыўды не перашкаджалі мёртваму на тым свеце, плакальшчыца звярталася да прысутных: «Суседзькі мае мілыя, прасціце маіму гаспадарочку, можа, каму ён быў прыкры, можа, з кім напрыкрыўся, прасціце яму і не кляніце яго, любыя суседачкі і мілыя дзетачкі».

Пры апошнім расстанні, як правіла перад вынасам з дому і на могілках, з асаблівай настойлівасцю гучаць заклікі да мёртвага ўстаць, паглядзець навокал, прамовіць хоць слоўца, даюцца развітальныя наказы «на той свет». Самыя частыя з іх — просьба прысылаць вестачкі, прылятаць да сваіх родных хоць у сне, хоць наяве — у любы час: «Прыхадзі памагаць слоўцам, парадачкай часценька, днём і ночкай цёмнай, каб было цёпла ў хаце, быў хлеб на стале, бяды-гора не зналі, дружненька жылі».

Вобраз нябожчыка ў галашэннях станавіўся часта ўвасабленнем чысціні і сумлення. Над мёртвым прыгнечаная горам жанчына прасіла прысутных не пакідаць яе і асірацелую сям'ю ў бядзе. Згода і абяцанні сваякоў і суседзяў клапаціцца, дапамагаць гучалі як прысяга над святыняй.

Найвышэйшага эмацыянальнага накалу дасягалі галашэнні на завяршальным этапе пахавальнага абраду. Самі могілкі і асабліва падрыхтаваная яма выклікалі новы прыліў роспачы: «Якая ямачка глыбокая! Табе будзе тут цесненька і нявідненька!» Цяжка дадаць што-небудзь да слоў, якія вырываюцца ў жанчыны пры самым апошнім развітанні, калі да самага канца

не хочацца верыць, што здарылася непапраўнае і нічога змяніць ужо нельга. Гэты крык душы немагчыма перадаць ніякімі іншымі словамі: «Людаанькі, не закрывайце, да не ўпускайце ў ямку. Яна ж заснула так моцна. Яна зарэ ўстане, да не засыпайце, яна прачнецца, да вылезе, да прыйдзе дадому, бо яна ў нас адненькая, яна ж прыйдзе нас даведацца!» Нібы сама па сабе вылівалася з душы, даносячы да кожнага бязмежнасць трагедыі, народная паэзія: «Замкнуць цябе трыма замочкамі. Першы замочак — грабовыя дошчачкі, другі замочак — жоўты пясочак, трэці замочак — травачка-муравачка». І праз гэтыя «замочкі» ўжо нікому не прабіцца, ніхто з блізкіх не адчыніць «хатачкі»; «не засвеціць сонейка».

Традыцыйная паэтыка, што вырастала з народных песень, арганічна ўпляталася ў імправізаваны рэчытатыў. Паэтычныя вобразы галашэнняў, нягледзячы на сваю спецыфічнасць, на імправізацыйнасць стварэння, усё ж свядома ці падсвядома складаліся ў асноўным тымі ж моўна-выяўленчымі сродкамі, што і народная песня. Пры супастаўленні мастацкіх структур абодвух жанраў можна пераканацца, што галашэнні не проста знаходзяцца ў вобразнай залежнасці ад песень, але пэўным чынам адлюстроўваюць стан песеннага бытавання ў народзе. У тых мясцовасцях, дзе народная вусная творчасць, у прыватнасці традыцыйная песня, адышла на другі план пад уздзеяннем павеваў сучаснасці, а таксама ў тых асоб, якія заўсёды слаба валодалі майстэрствам спеваў, галашэнні, як правіла, зводзяцца да празаічнага (не па форме, а больш па зместу) пераказу фактаў, хоць зрэдку і згадваюцца тыя ці іншыя паэтычныя вобразы.

Параўноўваючы запісы галашэнняў, зробленыя ў мінулым стагоддзі, з сучаснымі запісамі, няцяжка прасачыць, што развіццё гэтага жанру ідзе па шляху вобразнага спрашчэння. Такі вынік можна, відаць, растлумачыць звужэннем сферы бытавання традыцыйнай песні, аслабленнем мастацкага ўплыву на жалобныя імправізацыі. Новыя ж песні, народжаныя іншым векам, падуладныя імклівай калейдаскапічнай змене, не ў стане пранікнуць у тыя сферы, куды мела доступ спрадвечная народная песня, сучасныя песенныя вобразы не пераносяцца ў прамаўленні над нябожчыкамі. Цяпер куды больш часта гучаць матывы, узятыя з рэальнага жыцця, якія сваімі нечаканымі непрадказальнымі паваротамі здольны паказаць драматызм падзеі з амаль дакументальнай праўдзівасцю і часам проста ашаламіць эмацыянальным уздзеяннем. Такім чынам, сталая паэтычная форма і імправізацыя знаходзяцца ў пэўным балансе і абедзве вызначаюць ступень майстэрства выканаўцы. Калі паэтычная падсвет-

ка надавала нейкую агульнасць усім творам гэтага жанру, то без яе кожнае галашэнне набывае большую адметнасць дзякуючы індывідуалізаванаму паказу канкрэтнай сітуацыі. Нам не даводзілася сустракацца з выпадкамі, каб у нашы дні галашэнні развучваліся загадзя — значыць, у неабходны момант плакальшчыца вымушана ў асноўным імправізаваць тэкст, але пры гэтым выкарыстоўваць, калі ведае, запас чутых раней устойлівых форм, так званых блокаў, з якіх звычайна складаюцца традыцыйныя плачы.

Неаднаразова даследчыкамі і збіральнікамі выказваліся меркаванні пра імклівае аджыванне галашэнняў як жанру цяжкага мінулага. Думаецца, што, калі б гаворка ішла пра рэкруцкія ці некаторыя бытавыя галашэнні, сапраўды абумоўленыя пэўным грамадскім ладам, такое сцвярджэнне было б слушным. Што ж датычыць галашэнняў на жалобных абрадах, то ў пераважнай большасці яны ўзнікаюць без усялякага ўздзеяння сацыяльных умоў, і таму гаварыць пра іх знікненне неправамерна. Дзе ёсць жыццё, там нязменна заўсёды прысутнічае і смерць. І ў якія б светлыя часы ні жыў чалавек, смерць блізкага заўсёды будзе перажывацца ім як найвялікшае гора, аптымізм жа ў такія хвіліны выглядаў бы проста недарэчна. На нашу думку, хаўтурныя галашэнні з'яўляюцца адным з самых трывалых фальклорных жанраў, які наўрад ці знікне калі-небудзь, хіба што набудзе іншыя, відаць, больш стрыманыя і ў тэкставых і ў меладычных адносінах формы. Празаізацыя, змяншэнне лірыкі, а тым больш эпікі ў галашэннях сведчаць не пра адміранне жанру, а пра плаўны пераход яго ў іншую якасць.

Той факт, што ў параўнанні з песнямі ці прыказкамі галашэнні мала пададзены ў запісах фалькларыстаў, прычым не толькі беларускіх, яшчэ не азначае вымірання жанру. У гэтым няцяжка пераканацца, пабыўшы ў нашы дні (асабліва ў вёсцы) на пахаваннях, на радаўніцы. Зразумела, запісванне галашэнняў мае свае складанасці. Гэта і нязручныя ўмовы для ўслухоўвання ў словы плакальшчыцы падчас хаўтур і тым больш немагчымасць адразу зафіксаваць тэкст і «голас», што тлумачыцца ў першую чаргу этычнымі меркаваннямі. Гэта і амаль паўсюднае, вельмі для нас зразумелае катэгарычнае адмаўленне жанчыны ўзнаўляць у памяці галашэнне (хоць бы толькі яго словы), якое яна калісьці прамаўляла над нябожчыкам, перад незнаёмымі, далёкімі сваімі мэтамі ад яе гора збіральнікамі фальклору. Акрамя таго, існуе ўсё ж у жывых зноў-такі зразумелы спрадвечны страх перад усім, што звязана са смерцю. Галашэнне без прычыны выклікае падсвядомую боязь наклікаць на сябе і сваіх родных

смерць. Яшчэ ў мінулым стагоддзі М. А. Дзмітрыеў пісаў: «Сялян не адразу можна прымусіць праспяваць галашэнне, яны сцвярджаюць, што без сапраўднага выпадку нельга заводзіць яго: «Калі я буду заводзіць з нарокам, то скора загалашу і сапраўды»[74].

Пра надзвычайнае эмацыянальнае ўздзеянне плачу сведчаць тыя факты, што ў час Вялікай Айчыннай вайны фашысцкія захопнікі і іх прыслужнікі забаранялі людзям галасіць па забітых. Плач гэты здольны быў абудзіць штосьці чалавечнае нават у тых, хто страціў яго. Але ворагі баяліся гэтага абуджэння, лепш было не чуць людскога гора, абвінавачванняў, праклёнаў, прысуду сумлення. У галашэннях мінулай вайны, здаецца, галосіць саама шматпакутная беларуская зямля. Іх узрушальная сіла перарастала з асабістага гора ва ўсенародную трагедыю.

З пахаваннем галашэнні не канчаліся. Прыходзячы час ад часу на магілкі, родныя, абняўшы магілу, «гукалі» памёршага. Гэта быў працяг пачатай яшчэ на хаўтурах размовы з мёртвым, шкадаванне, скарга, суцяшэнне. Зноў гучалі нараканні на цяжкі лёс, выказвалася немагчымасць змірыцца са стратай, ліліся бясконцыя ўспаміны, паведамляліся навіны. Памяць пра памёршых праносілася жывымі праз усё жыццё.

Вялікі эмацыянальны зарад, трагічнасць, закладзеныя ў галашэннях, закранаді і мастакоў слова. Пісьменнікі і паэты пры апісанні жалобы ў сваіх творах, здаралася, выкарыстоўвалі гэты жанр,— дзе пераводзячы плач у строга класічную паэтычную форму (Янка Купала. «Адвечная песня»), дзе стараючыся захаваць народную аснову рытмікі і вобразаў, але падводзячы пад уласны сюжэт (Максім Гарэцкі. «Панская сучка», «Памінкі»; Уладзімір Караткевіч. «Каласы пад сярпом тваім»). На падставе звычаяў роднай Навагрудчыны геніяльным Адамам Міцкевічам была напісана славутая сцэна памінак з яго «Дзядоў», пададзеная, праўда, без этнаграфічнай дакладнасці ва ўзнёсла-рамантычным стылі. Згадванне хаўтур і памінальных абрадаў нярэдка можна сустрэць на старонках беларускай літаратуры: у В. Дуніна-Марцінкевіча («Вечарніцы»), у паэтычных творах Янкі Купалы («На куццю», «Яна і я»), Якуба Коласа («Новая зямля»); у радзе вершаў Максіма Танка, Анатоля Вярцінскага («Заазер'е»), Рыгора Барадуліна (цыкл «Бяроза з лістом гаварыла»); у прозе — у Янкі Брыля («Сёння «дзяды»!»), Анатоля Кудраўца («Раданіца») і інш.

---

[74] Дмитриев М. А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края, с. 211.

Мудрасць і талент народа, з такой шырынёй увасобленыя ў яго духоўнай спадчыне, адбіліся і на сумным абрадзе развітання з чалавекам. Калі ў старажытныя часы элементы хаўтурнай урачыстасці былі закліканы абараніць жывых ад нядобрага ўздзеяння нябожчыка, то ў працэсе спасціжэння чалавекам свету, законаў прыроды прымхлівыя моманты адыходзілі ў нябыт або традыцыйна захоўваліся, страціўшы першапачатковы сэнс. У нашы дні пахавальныя і памінальныя абрады нясуць пачэсную і адказную місію ўшанавання светлай памяці памёршых. Гуманістычны характар гэтых абрадаў — у прызнанні і ўдзячнасці жывых за ўсё добрае, што пакінуў пасля сябе на зямлі чалавек.

Пры адборы этнаграфічных і фальклорных тэкстаў для дадзенага тома перавага аддавалася тым, якія вызначаліся найбольшай самабытнасцю, фактаграфічнай паўнатой, мастацкай дасканаласцю. Укладальнікі імкнуліся таксама, каб матэрыял па магчымасці ахопліваў усе асноўныя рэгіёны Беларусі. Згодна з існуючымі для шматтомнага выдання фальклору правіламі, арыгінальныя тэксты пададзены паводле сучасных норм арфаграфіі з захаваннем лексічных і некаторых фанетычных, марфалагічных і сінтаксічных асаблівасцей мясцовых гаворак, зафіксаваных у першакрыніцах. Палічана было немэтазгодным рабіць у томе страфічнае ўпарадкаванне галашэнняў, апублікаваных у празаічнай форме (напрыклад, з прац П. М. Шпілеўскага, У. М. Дабравольскага і інш.). Выключэнне складаюць матэрыялы з «Беларускага зборніка» Е. Р. Раманава, якія ў рукапісах, што захоўваюцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы АН Літоўскай ССР, у адрозненне ад кнігі маюць страфічны падзел.

У перыяд складання тома істотную дапамогу аказалі дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна В. А. Захарава і выкладчык В. В. Каладзінскі, дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта А. М. Пяткевіч, прафесар Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута У. А. Калеснік, дацэнт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта І. Ф. Штэйнер, якія прадставілі шэраг запісаў, сабраных студэнтамі-філолагамі.

Этнаграфічныя апісанні ў радзе выпадкаў пададзены скарочана. Іх пераклад з рускай і польскай моў на беларускую зроблены ўкладальнікам. Збіранне фальклорнага матэрыялу на падрыхтоўчым этапе праводзілася І. Р. Сцяпунінымм. Навукова-тэхнічную работу дапамагалі выконваць А. М. Хрушчова і Д. М. Чэчка.

*У. А. ВАСІЛЕВІЧ*

# ПАХАВАЛЬНЫЯ ГАЛАШЭННІ Ў СУЧАСНЫХ ЗАПІСАХ. ТЫПЫ НАПЕВАЎ І РАЁНЫ ІХ ПАШЫРЭННЯ

У сістэме традыцыйных сямейных рытуалаў, якія бытуюць у сучаснай беларускай вёсцы, рытуалу пахавання нябожчыка адводзіцца асобае месца. Назіранні апошніх гадоў дазваляюць гаварыць аб бытаванні і значнай развітасці паўсюдна на Беларусі ўсіх асноўных яго кампанентаў, у тым ліку і галашэнняў — гэтай традыцыйнай у многіх народаў формы выражэння чалавечага гора.

У Беларусі рускаму паняццю «причитание» адпавядае паняцце «галашэнне» («галасіць», «прыказваць на голас», «прычытваць», «прыплакваць» [1], «кукаваць», «выць», «вылічаць»). Аднак калі, напрыклад, у рускай традыцыі «прычытаць» і «плакаць» азначае адно і тое ж, дык беларуская традыцыя гэтыя паняцці не атаясамлівае. Адрозненне паміж імі самі народныя спевакі тлумачаць наступным чынам: «Плакаць — гэта толькі плач і ўсё, а галасіць — значыць прыгалашваць нада, гаварыць на голас» (на напеў.— *Т. В.*); «плакаць — эта ціха і словы не гаворацъ, а хто вядзе голасам і са словамі, той галосіць. Галасіць нада крэпка, крычаць нада». Толькі ў радзе раёнаў Гродзеншчыны паняцці «плакаць» і «галасіць» азначаюць адно і тое ж.

Носьбіты традыцыі галашэння — пераважна пажылыя жанчыны. Амаль кожная з іх у адпаведнай сітуацыі можа галасіць. Няўменне галасіць у пажылым узросце ганьбуецца, маладых жа (асабліва незамужніх) за такое няўменне асуджаюць рэдка. Прафесійных плакальшчыц беларуская пахавальная традыцыя не ведае, хоць нам вядомы адзінкавыя выпадкі, калі найбольш таленавітых і прызнаных у дадзенай мясцовасці майстрых галасіць аднавяскоўцы спецыяльна запрашалі на хаўтуры.

Мужчыны, як правіла, не галосяць, хоць тут няма спецыяльных абмежаванняў. У адпаведнай сітуацыі галашэнне мужчыны можа ўспрымацца аднавяскоўцамі як нешта зусім натуральнае.

---

[1] Тэрмін зафіксаваны М. Я. Грынблатам (Грынблат М. Я. Матэрыялы да слоўніка Мінскай вобласці.— У зб.: Жывое слова. Мн., 1978, с. 51).

Аднак запісаць мужчынскія галашэнні па-за рытуалам — задача надзвычай складаная.

Нягледзячы на развітасць і актыўнае функцыяніраванне традыцыйнага пахавальнага рытуалу ў сучасным вясковым побыце беларусаў, іменна гэты рытуал да цяперашняга часу вывучаны найбольш слаба. Пры гэтым калі пра тэкставы змест галашэнняў можна атрымаць уяўленне па выдадзеных матэрыялах фалькларыстаў і этнографаў другой палавіны XIX — пачатку XX ст., дык першыя і адзінкавыя пакуль публікацыі напеваў галашэнняў увайшлі ў навуковы абіход толькі ў апошнія гады. [2]

Між тым пахавальнае галашэнне ў цяперашні час нават па-за рытуалам можна запісаць амаль у кожнай вёсцы. Наша экспедыцыйная практыка апошніх гадоў пацвердзіла гэта. Матэрыялы, якія сталі асновай для напісання гэтага артыкула і ўвайшлі ў музычны раздзел тома, сабраны галоўным чынам у 1981—1984 гг. (Палескія запісы ў большасці адносяцца да 60-х гадоў.) Яны збіраліся па вялікай тэрытарыяльнай сетцы, што дало магчымасць аперыраваць запісамі, якія былі зроблены ў 77 з 117 раёнаў рэспублікі; у кожным канкрэтным выпадку высвятляліся этнаграфічныя падрабязнасці мясцовага рытуалу, удакладнялася канкрэтнае месца таго ці іншага галашэння ў ходзе рытуалу, фіксаваліся ацэнкі саміх носьбітаў традыцыі, якія даваліся імі розным момантам рытуалу, галоўным чынам галашэнням і іх выкананню.

У музычным раздзеле тома пададзены тыпавыя напевы пахавальных галашэнняў з усіх этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі — Палесся, Паазер'я, Гродзеншчыны, Магілёўшчыны, Міншчыны.

Улічваючы, аднак, што гэта даследаванне і па матэрыялу, і па выніках з'яўляецца пачатковым і ў многім яшчэ папярэднім этапам вывучэння гэтага спецыфічнага жанру, мы зусім асэнсавана ставілі перад сабой задачу такім чынам фіксаваць напевы, каб іх уласна музычны бок (у прыватнасці, гукавысотны аспект) пры агульнапрынятай сістэме натацыі праяўляўся дастаткова выразна. Іменна таму ў музычны раздзел увайшлі толькі тыя напевы, якія былі запісаны намі па-за рытуалам, ад асоб, якія маглі вы-

[2] Елатаў В. І. Ад песні да песні.— Мн., 1961, с. 54, № 6; Цітовіч Г. І. Анталогія беларускай народнай песні.— Мн., 1975, с. 15, № 4; Мухаринская Л. Некоторые вопросы типологии народных напевов.— У кн.: Традиционное и современное народное музыкальное искусство. М., 1976, с. 77, № 1, 4; с. 85, № 8; Елатов В. И. Песни восточнославянской общности.— Мн., 1977, № 97—101; Мажэйка З. Я. Песні беларускага Паазер'я.— Мн., 1981, № 131—132; яе ж: Песни белорусского Полесья.— М., 1983, № 124—126.

канаць галашэнні ў даволі спакойнай манеры. Такога роду напевы, праўда, з пэўнай нацяжкай, паддаюцца слыхавой расшыфроўцы і з прымяненнем рада ўмоўных значкоў могуць быць у асноўным пададзены ў агульнапрынятай натацыі. Галашэнні ж, якія гучаць непасрэдна ў час рытуалу, такой натацыі не паддаюцца і патрабуюць спецыяльнай машыннай апрацоўкі.

Склад і ход беларускай пахавальнай абраднасці дазваляюць аднесці беларускі рытуал да таго ж тыпу пахавальнага рытуалу, які сфарміраваўся практычна ва ўсіх славянскіх і многіх неславянскіх народаў, што насяляюць нашу краіну, і вядомы па апісаннях этнографаў. Вузлавыя яго моманты — фіксацыя факта смерці члена сям'і (калі смерць здарылася дома), склікание родных і блізкіх суседзяў да памёршага, яго абмыванне, адзяванне і пакладанне на лаву (а потым у труну), своеасаблівая жалобная «вахта» каля труны нябожчыка, вынас цела з роднага дома, шэсце на могілкі, апошняе развітанне з нябожчыкам і яго пахаванне, вяртанне дадому, памінальная трапеза. Кожнаму з гэтых момантаў адпавядаюць пэўныя групы галашэнняў, у тэкстах якіх апрача агульных ёсць таксама і спецыфічныя сюжэтныя матывы, якія ўказваюць на прыналежнасць дадзенага галашэння да таго ці іншага канкрэтнага моманту рытуалу[3].

Першыя галашэнні ў розных мясцовых традыцыях пачынаюць гучаць у розны час. Часцей за ўсё гэта адбываецца толькі тады, «як памыюць, харашанька прыбяруць і паложуць на кут», да гэтага ж моманту можна толькі плакаць. Аднак гэта традыцыйнае прадпісанне выконваецца роднымі далёка не заўсёды: «Як жалка, дык дзе там дажджэсся, як паложуць. Яшчэ нямыты, а ўжо галосіш!» (Пастаўскі р-н, в. Васіліны); «Свой як яшчэ паміраець, і то крычыш і валасы рвеш!» (Чашніцкі р-н, в. Альшанка). У радзе іншых мясцовых традыцый галасіць пачынаюць раней, «як толькі чалавек памрэ», а ў вёсках Астравецкага і Ашмянскага р-наў — «як толькі вочы зажмурае». У в. Бяняны Ашмянскага р-на, напрыклад, «можа яшчэ і не быць памёршы чалавек, яшчэ ён жывы, а ўжо галосяць, што ён збіраецца да смерці. Шкадуюць чалавека, бо ён памірае, выбачэння просяць за якія, можа, абіды, прашчаюцца. Прыходзяць прашчацца ўсе, хто калі-небудзь якую абіду зрабіў. Бывае і сам пахаронны заве якога чалавека і прашчаецца з ім». У асноўным жа над чалавекам, які памірае, не галосяць, а ціха плачуць убаку, каб ён гэтых

[3] Аналагічнае прымацаванне тэкстаў пахавальных галашэнняў адзначана Б. Б. Ефіменкавай (Ефименкова Б. Б. Севернорусская причеть.— М., 1980, с. 15).

слёз не бачыў. Паводле тлумачэнняў жыхароў в. Затон Жлобінскага р-на, у гэты момант нельга галасіць таму, што ў адваротным выпадку «чалавек доўга канчаецца, доўга мучаецца».

Спецыфічны матыў першых галашэнняў — просьба да паміраючага не пакідаць гэты свет (для традыцыі галасіць над яшчэ не памёршым) ці своеасаблівая канстатацыя самога факта смерці:

А мая сястрыца,
Мая міленькая,
Мая родненькая,
Чаму ж ты адкідаешся,
А чаму ж паміраеш,
А чаму ж нас пакідаеш,
Чаму свае вочкі зажмураеш?
Не адкідайся ж ты, мая міленькая,
Не памірай, мая даражэнькая,
Каб я з табой пайшла,
Каб я з табой жыла тама жа...

*(Астравецкі р-н, в. Ізабеліна)*

або:

А дзетачка маё,
А мілае маё,
А солнышка маё,
А жаркая маё,
А далёка ж ты закацілася
І болі нам цябе не відаць,
А далёка ты ат нас пайшло,
А маё дзетачка,
І болі ніколі да нас не прыйдзеш...

*(Крычаўскі р-н, в. Камароўка)*

У першых галашэннях кожнага з прыходзячых родных гэты матыў так ці інакш прысутнічае амаль абавязкова.

Потым ідзе даўгі ланцуг галашэнняў над нябожчыкам, пакуль ён яшчэ ляжыць у роднай хаце. У асноўным гэта тужлівыя бедаванні блізкіх людзей з нагоды канчыны дарагога чалавека, успаміны пра яго жыццё, яго ўзаемаадносіны з людзьмі. Гэтыя галашэнні найбольш працяглыя і імправізацыйныя. Галашэнні іменна гэтага перыяду маюць на ўвазе, калі гавораць: «Хто жалеіць — галосіць і галосіць без канца, колькі сэрца падказвае. Калі толькі ўтоміцца сэрца, тады пакідаюць галасіць. Бывае самлеіць чалавек, як нежывы зробіцца, адліюць — тады зноў галосіць» (Лепельскі р-н, в. Веляўшчына); «у хаце над гробам усю жызнь памёршага ўспомніш. У кожнага сваё ўспамінанне, кожны сваё скажа» (Дзяржынскі р-н, в. Лаговішча). Галашэнні сціхаюць толькі пасля заходу сонца, бо паўсюдна ў Беларусі

(выключаючы толькі Пастаўскі і Браслаўскі р-ны) ноччу галасіць нельга. І хоць прычыну гэтай забароны нашы інфарматары растлумачыць не маглі, усюды яна строга захоўваецца. З усходам сонца галашэнні пачынаюцца зноў, аднак напал іх на другі, а тым больш на трэці дзень трохі сціхае. Тлумачыцца гэта проста і зразумела: «Хазяйства ж ёсць. Як пагалашу — пайду свіней пакармлю, і карове нада даць. Пріду і зноў каля яго сяду, і зноў галашу» (Браслаўскі р-н, в. Далёкія); «Як бы там ні было жалка, а аддыхнуць нада. Пагалосіш — аддыхнеш. Дзе ж ты будзеш трое сутак без оддыху галасіць!» (Лёзненскі р-н, в. Пушкі).

Сярод шматлікіх галашэнняў гэтага перыяду, у сюжэтных адносінах у асноўным бытапісальных, ёсць і такія, якія ў іншыя моманты рытуалу нам не сустракаліся. Яны маюць заклік да нябожчыка ўстаць, абудзіцца, просьбу да зязюлькі памагчы пабудзіць яго:

А мая ж ты Васілінка,
Чаму ж ты ляжыш, вочкі заплюшчыўшы,
А што ж ты гэта выдумала?
Цяпер весенка цёплая,
Усе пташачкі пяюць,
Зязюлечкі кукуюць,
А ты ляжыш ціхусенька,
Ты ляжыш спакайнюсенька,
А ты жа прачніся,
А ты жа агляніся,
Што на свеці вясёлінька жыці.
Тута пташачкі пяюці,
Кукушачкі кукуюці,
А ты жа ўстань жа,
А ты не ляжы тут,
Чаго ж ты ручкі сашчапіла,
Чаго ж ты вочкі заціснула?
А мая ж ты зязюлічка,
Памож жа ты мне кукуваці,
Васілінку пабуджаці.

*(Верхнядзвінскі р-н, в. Ляонпаль)*

Развітанне з нябожчыкам перад вынасам яго з хаты і сам вынас — першая кульмінацыя рытуалу. Эмацыянальнае напружанне ярка падкрэсліваецца адначасовым галашэннем многіх людзей, якое пераходзіць у крык, калі труну выносяць.

На працягу ўсяго гэтага перыяду развіваюцца матывы развітання і немагчымасці вярнуць нябожчыка:

Выносюць цябе, мая родная маманька,
З етай светлай хатанькі,

Па етай шырокай дарожкі,
Болі ты сюды ніколі ні вернісся,
Болі мы тут цябе ні ўбачым...

*(Шумілінскі р-н, в. Прыазёрнае)*

Куды ж ты ляціш, мая дзіцятка,
У якую далёкую староначку,
Адтуль жа дарожкі назад нету,
Адтуль жа прывету мне ня будзець...

*(Гродзенскі р-н, в. Прывалкі)*

У час шэсця на могілкі адным з найбольш яркіх паэтычных вобразаў галашэнняў з'яўляецца вобраз «сцежачкі-дарожачкі», якая «застылась», на якой «травіцца расці ня будзіць», па якой дарагі чалавек ніколі ўжо не вернецца:

Праважаю цябе ў паследнюю дарожку,
Праважаю цябе ў паследні раз.
Ты этай дарожкай хадзіць ня будзіш,
Ка мне ты ня вернісся...

*(Лёзненскі р-н, в. Пушкі)*

А куды, маё дзетачка,
Ты дарожычку пратаптала,
А як жа мне іціць
Па гэтай дарожыццы?
А куды ж людцы цябе нясуць,
Няхай бы ты шла дадоманьку,
А гэта ж дарожка ўся слізамі палітыя,
А гэта ж дарожка горкая-гараванная...

*(Слаўгарадскі р-н, в. Ляцягі)*

Другая кульмінацыя рытуалу сілай драматызму, як правіла, пераўзыходзіць першую. «Як з хаты выносюць,— тлумачылі жыхаркі в. Жортай Барысаўскага р-на,— крычыш, б'ешся, але ўсё ж ты з ім яшчэ пабудзіш і як панясуць на кладбішча, і там яшчэ трохі пабудзіш. А як ужо ў яму закапваюць — тут усё! Ні пабачыш ніколі. Во і млеюць тут, і ў тую яму лятуць, каб і іх разам закапалі».

Асноўныя матывы гэтых галашэнняў — апошняе развітанне, просьба да памёршага перадаць прывітанне раней памёршым родным, якіх ён сустрэне ў тагасветным жыцці, расказаць ім аб жыцці тых, хто застаўся на «гэтым свеце», просьбы родных, што засталіся сіротамі ці адзінокімі, узяць іх да сябе:

Бывай, мая сястрыца,
Бывай, мая міленькая,
Бывай, мая родненькая,
Выбачай, мая сястрыца,
Можа, я калі цябе скрыўдзіла,

Можа, я калі цябе дрэнна зрабіла.
Калі спаткаеш там нашу матульку,
Калі спаткаеш нашага татульку,
Раскажы ім, як я жыю тутака.
Перадай паклончык маёй дачушке,
Раскажы ж ты ёй маё горачка,
Раскажы ж ты ёй маё няшчасцейка,
Калі ж яна мне местачка паішчаць,
Калі ж яна мяне пазавець?

*(Астравецкі р-н, в. Ізабеліна)*

Ашаламляльныя па сіле эмацыянальнага ўздзеяння галашэнні без слоў, калі знясіленая жанчына, якая ўжо не можа знайсці словы, каб выразіць сваё гора, крычыць на пахавальны «голас» толькі «ай-яй-яй-яй!»

Над свежай магілай, як правіла, не галосяць, хоць рыданні чуюцца яшчэ доўга. Потым усе ідуць у хату памёршага на «жалобны абед». Па дарозе з могілак, вярнуўшыся дадому і на працягу памінальнай трапезы таксама ў асноўным не галосяць. Дарэчы, абсалютнай забароны для каго б то ні было, а тым больш для родных, тут не існуе, кожны можа галасіць пакуль «сэрца не ўтоміцца».

На працягу года з дня пахавання родныя часта ходзяць на могілкі і там галосяць, асабліва ў памінальныя дні. Але не толькі на могілках: «Дзе жаль застане, там і галосіш»; «Як да сэрца дапячэ, на ўсю хату галашу»; «Я пріду с кладбішча ў двор, зірнула на дварок і галашу ўжо, што

А хазяін жа мой дарагі,
А я зірну на тваю работачку,
Дак мая душа замірая,
Я ж на яе ніколі не забудусь.
А мае ж вы ножачкі былі,
А мае ж вы ручачкі,
А мая ж ты галовачка.
А твае ножачкі нахадзіліся,
А твае ж ручачкі напісаліся,
А твая ж галовачка начыталася...»

*(Быхаўскі р-н, в. Следзюкі)*

«Пайду ў хлеў да быдла — галашу:

А мая кароўка,
А мае вы свіначкі,
А нашага ж хазяіна няма.
А што ж цяпер буду з вамі рабіць?
А я ж вас так не дагледжу,
А я ж вас не накармлю так...»

*(Браслаўскі р-н, в. Далёкія)*

Галашэнні спыняюцца па меры сціхання болю страты. Плачуць жа па памёршаму часам на працягу ўсяго жыцця.

Некалькі слоў пра асаблівасці пахавання маладых людзей, якія не паспелі пры жыцці ўзяць шлюб. На такіх пахаваннях, якія маюць назву «жалобная бяседа», выконваюцца некаторыя вясельныя абрады. У прыватнасці, юнака або дзяўчыну прыбіраюць у адзенне маладога ці маладой, часам ім надзяваюць пярсцёнкі. Перад тым як апусціць труну ў магілу, дзяўчыне знімаюць вянок і кладуць побач з ёй у труну. Змест галашэнняў на такіх пахаваннях па зусім зразумелых прычынах шмат у чым адрозніваецца ад таго, што выконваюцца пры пахаванні сямейных:

А дачушка мая любенькая,
Я ж не дажыдала гэткае бяседачкі,
Я ж думала, што я цябе прыбяру не на такую
бяседачку,
Я ж думала на вясёлаю,
Ажна ты, мая дачушка, не туды села, куды я
хацела...

*(Сенненскі р-н, в. Ледневічы)*

А мая ты сяструлечка,
А як жа ты зарання ат нас атходзіш,
Мы сабраліся на тваю бяседачку,
А бяседачка нівясёлая.
Прыляціш вясной, як шэрая зязюлічка,
Закукуіш ты ў вішнёвым садзіку,
А мы будзім узнаваць,
А ці гэта мая сяструлічка,
А ці гэта шэрая зязюлічка,
А дзе ж мы пазнаваць цябе будзім:
А ці ў садзі, ці ў карагодзі,
Ці на ржышчы, ці на йгрышчы?

*(Чашніцкі р-н, в. Альшанка)*

Адно з абавязковых патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да пахаванняў,— выкананне рытуалу ў прысутнасці вялікай колькасці родных і аднавяскоўцаў [4]. Пры гэтым нормай лічацца такія

---

[4] Адсутнасць родных і блізкіх успрымаецца як вялікае няшчасце, што знаходзіць адлюстраванне і ў галашэннях:

Ах, сваячок мой родны,
Які ты няшчасны,
А ці ў цябе сясцёр няма,
Няма каму паплакаць.
А хто ж тваёй жонацы паможа,
А хто ж тваім дзеткам добрае слоўца скажа?..

*(Шчучынскі р-н, в. Рожанка)*

іх паводзіны, калі галосяць толькі родныя і самыя блізкія суседзі, што былі ў шчырым сяброўстве з памёршым. Чужыя, як правіла, плачуць, але не галосяць. З чужых галосяць толькі тыя, у якіх нядаўна здарылася якое-небудзь гора, і ў гэтым выпадку яны галосяць пра сваё гора, але пацiху і ўбаку. У цэнтры ж рытуалу заўсёды знаходзяцца галашэнні блізкіх родных. Чым больш родных (асабліва жанчын), тым больш гучыць галашэнняў, тым больш поўна і шматгранна, эмацыянальна насычана выказаны пачуцці і думкі людзей, што смуткуюць. Такія хаўтуры запамінаюцца і потым расцэньваюцца як своеасаблівы эталон мясцовай традыцыі. Да галашэнняў аднавяскоўцы нябожчыка (многія ходзяць на хаўтуры не толькі для таго, каб праводзіць у апошні шлях знаёмага або блізкага чалавека, але і для таго, каб паслухаць, «як будуць галасіць») ставяцца асабліва ўважліва, нават прыдзірліва: яны тады знаходзяць спачувальны водгук у сэрцах прысутных, калі асэнсоўваюцца імі як вынік востраи псіхафізіялагічнай патрэбы выказаць сваё вялікае сапраўднае гора, і ацэньваюцца як «красівыя».

У паняцце «красівыя галашэнні» народ укладвае зусім канкрэтны сэнс. Па-першае, галашэнне павінна быць «складным і жаласным», г. зн. у стройную па мясцовых патрабаваннях форму павінен быць укладзены змест, які здольны выклікаць водгук у душы кожнага з прысутных. Жанчына, якая галосіць, павінна знайсці такія словы і так іх «праплакаць на голас», каб яе настрой перадаўся і іншым: «Па кім жалка загалосяць — і табе стане жалка, і сам загалосіш» (Лёзненскі р-н, в. Пушкі); «Так па бацьку качаліся, вылі чатыры сястры, чатыры зязюлькі — ніхто не ўстояў. Танька як кукнець, кукнець: «Ай, татачка родненькі!» — не дай бог! І не хочыш, а загалосіш» (Крычаўскі р-н, в. Камароўка). Імправізацыйныя знаходкі тут цэняцца высока: «Мы такія прыгожыя словы не чулі нідзе. Слова за словам — як каласы ў полі. І хораша, і жалю дае» (Іўеўскі р-н, в. Морына).

У той жа час у вёсцы з вялікім разуменнем, тактам і спачуваннем ставяцца да такой формы выражэння няўцешнага гора, калі «чалавек быццам бы скамянеў» і не ў стане вымавіць ні слова: «Ен, можа, і рад бы душой пагаласіць, а не можыць. Есць жа такія, што не галосяць, а тое пераносяць — у сем раз боле таго, якія галосяць. У душы пераносяць» (Шаркоўшчынскі р-н, в. Алашкі); «Катораму нянадта шкода — ён табе тады зберыць усё, а катораму шкода — яму заліецца сэрца, што ж ён можа сказаць? Нічога» .(Уздзенскі р-н, в. Магільна); «Еслі ўжо настолька дужа жалка, дык нельга прыдумаць, што гаварыць.

Проста душа заліхаецца і не саабражаеш, што гаварыць. Ну, а еслі трошку чалавеку не так ужо жалка ў душэ, ну, тады могуць некаторыя вывесці» (Сенненскі р-н, в. Ледневічы).

Вельмі адмоўна ставяцца сяляне да праяўлення фальшу, нягшчырасці: «Бабы ёсць такія, што яна галосіць, а ў яе ні слязіны ня вылезіць. Яна не жаласная, яна не жалеіць. Эта яна так, для чужых людзей — хай гаворацъ, што вот яна галасіла!» (Стаўбцоўскі р-н, в. Ячонка); «Крычыць, субарніцу збіраець, як кабыла равець, а слязы ня ўвідзіш! Хто ні плачыць, а арэць крэпка — таму чалавеку ні жалка!» (Талачынскі р-н, в. Райцы). Асабліва рэзка асуджаецца абыякавасць блізкіх родных: «Што ж гэта за дачка! От гэта падумаць нада! Матка памерла ні старая, а яна стаіць, як стоўб, ні слязінкі, ні слоўца. А словы ж самі прама лятуць:

Ах, мая ж мамачка,
А чаго ж ты не пераймаеш мяне?
А тыя ж разочкі
Ты ж мяне пераймала,
А ты ж мяне ўгашчала,
А ты ж да мяне гаварыла.
А цяперачка
Чаго ж ты загневалася,
Чаго ж ты да мяне
Нічагусенькі не гаворыш?..

*(Браслаўскі р-н, в. Далёкія)*

Абурэнне і нараканні выклікаюць тыя, хто не ўмее галасіць: «Галасіць нада жаласна, талкова. З жызні нада ўзяць усе словы. Як чалавек жыў напамянуць. Некаторыя плачуць так жаласна, што сколька людзей — усіх разжаляць, усе захліпаюцца ад жаласці, чужыя дажа. А яна абы-як складвала, саўсім ня ўмее складваць, раве абы-што. Ей і не нада было галасіць. Толькі людзям на смех!» (Чашніцкі р-н, в. Альшанка).

Галашэнні «людзям на смех» — гэта такія, у якіх пачуцці тых, хто галосіць (часта зусім шчырыя), выражаны няўмела, паантымастацку. У тэкстах іх могуць змяшчацца элементы натуралізму, двухсэнсоўнасці, водгулле жыццёвых звадак і сварак. Такія галашэнні пападаюць пад нараканне. Так, абавязкова будуць асмяяныя — ацэненыя як «абы-што, нешта нялюдскае» наступныя словы:

А мая мамачка,
А якоя ж у цябе брушка вялікае,
А якоя ж яно мягінькае...

або

> А мой ты татачка,
> А сколька ж мы на цябе досачак
> патрацілі,
> А сколька ж грошыкаў...

Ацэначны крытэрый з'яўляецца, такім чынам, важным фактарам устанаўлення цэнасных арыенціраў у свядомасці носьбітаў беларускай традыцыі пахавальнага галашэння, і ў гэтым сэнсе ён — актыўная рухаючая сіла ў падтрымцы і развіцці традыцыі. Другі найгалоўнейшы момант тут — суадносіны традыцыйнага і імправізацыйнага ў пахавальных галашэннях.

Даследуючы пытанне аб ролі і значэнні галашэння ў традыцыйным рытуале хаўтур сучаснай беларускай вёскі і высвятляючы думкі саміх народных выканаўцаў аб ступені яго абавязковасці ў рытуале сёння, мы неаднаразова задавалі народным выканаўцам пытанне: ці абавязкова галасіць на пахаваннях, і калі так, дык усім, ці толькі некаторым з прысутных? Сутнасць шматлікіх адказаў зводзіцца да наступнага: усім галасіць не абавязкова, галосяць не па абавязку, а «ад жалю». Пры гэтым адразу ж і дакладна падзяляліся тыя, каму «сільна жалка» — гэта ў першую чаргу родныя, а потым блізкія і шчырыя сябры, і тыя, каму «не жалка» або «жалка не так сільна» — усе астатнія ўдзельнікі хаўтур. Натуральна, галосяць, г. зн. выказваюць свой душэўны боль у найбольш экспрэсіўнай манеры, родныя. Яны, сапраўды, як правіла, цяжка перажываюць смерць сваяка і галосяць са шчырым жалем, укладваючы ў галашэнне разнастайныя адценні індывідуальнага пачуцця. Уражанне спантаннасці такіх галашэнняў родных падмацоўваецца тым, што многія з іншых прысутных не галосяць нават у кульмінацыйныя моманты рытуалу. І разам з тым рытуальная абавязковасць галашэння, няхай у некалькі прыглушаным выглядзе, жыве ў свядомасці вясковых жыхароў. Гэта асабліва прыкметна ў тых выпадках, калі памірае нялюбы член сям'і. Так, праводзячы ў апошні шлях абрыдлага мужа, жонка будзе ў вызначаныя моманты плакаць і галасіць, але не па шчырасці, а па абавязку. У палявой практыцы мы не раз сустракаліся і з такім становішчам, калі, напрыклад, сёстры адмаўляліся галасіць па брату, які ў час Вялікай Айчыннай вайны быў звязаны з фашыстамі, і не былі за гэта зганьбаваны аднавяскоўцамі. У цэлым у пахавальным рытуале, як, дарэчы, і ў іншых традыцыйных беларускіх рытуалах, якія бытуюць у сучаснасці, доля рытуальна абавязковага памяншаецца ў сувязі са зменамі ў свядомасці носьбітаў традыцыі рада момантаў светапогляднага характару, у прыватнасці поглядаў на ўнутрыся-

мейныя і міжсваяцкія адносіны. У хаўтурах гэта асабліва прыкметна яшчэ і таму, што галашэнне заведама дапускае выражэнне асабістай эмоцыі, вылучэнне на першы план імправізацыйнага пачатку. Нездарма В. Я. Гусеў адносіць пахавальныя галашэнні разам з галашэннямі вясельнымі і рэкруцкімі да «ледзь не самых суб'ектыўных» [5]. «Я плачу сваё гора»,— тлумачыць выканаўца, і мы разумеем, што пачуццё гора, адчаю, якое напаўняе жанчыну ў момант галашэння — гэта яе глыбока асабістыя пачуцці, для выражэння якіх яна шукае свае словы, сэнсавыя і інтанацыйныя адценні. Пры гэтым пачуцці будуць неаднолькавымі ў залежнасці ад таго, па кім галосяць — па горача любімаму блізкаму чалавеку ці дальняму сваяку, па суседцы або заўчасна памёршай дачцэ. Таму ніводнае галашэнне ў аднаго выканаўцы не тоесна другому яго галашэнню ні па тэксту, ні па напеву, не гаворачы ўжо пра такія моманты, як тэмп, тэмбр, тэсітура, працягласць, міміка і г. д. Яшчэ больш адрозніваюцца галашэнні розных выканаўцаў, няхай нават жывуць яны побач у адной вёсцы. А жыхары бліжэйшых вёсак часта зусім шчыра лічаць, што ў суседняй вёсцы наогул «плачуць не жалка». Аднак усе гэтыя адрозненні — вынік індывідуальнага асэнсавання, як правіла, адзінай у цэлым традыцыі. Як верна адзначае В. Я. Гусеў, асабістая імправізацыя «ў фальклоры не пераходзіць у індывідуальную творчасць, бо гэтыя пачуцці (пачуцці тых, хто галосіць.— *Т. В.*) знаходзяць тут не індывідуальную манеру выражэння, як у лірыцы ці ў музыцы кампазітараў, а шукаюць традыцыйных, калектыўна выпрацаваных сродкаў... Спалучэнне асабістай эмоцыі, асабістай мастацкай фантазіі з традыцыйнымі сродкамі выражэння пачуццяў, што падкрэслівае як бы агульначалавечы сэнс перажываемага стану, стварае своеасаблівы псіхалагічны комплекс, у якім асабістае і агульнае, суб'ектыўнае і аб'ектыўнае непарыўна звязаны» [6]. З'яўляючыся фактам асабістага лірычнага выказвання, кожнае пахавальнае галашэнне — гэта разам з тым і факт грамадскай свядомасці, гэта такая форма выражэння асабістага гора «на міру», якая дазваляе кожнаму носьбіту дадзенай традыцыі найбольш поўна праявіць свае пачуцці, але так, каб быць зразумелым аднавяскоўцамі, выклікаць у іх душах спачуванне, суперажыванне, шчыры водгук: «Так нада галасіць, каб і сабе лягчэй было і людзям не было смешна». «Каб сабе лягчэй было» — гэта значыць «галасіць і расказваць людзям сваю жызнь, сваю абіду. У кожнага ж свая абіда» (Сенненскі р-н,

---

[5] Гусев В. Е. Эстетика фольклора.— Л., 1967, с: 186.
[6] Там жа, с. 186—187.

в. Ледневічы). Тут адна з карэнных прычын існавання жывога мастацтва імправізацыі, якая, дарэчы, даволі дакладна асэнсоўваецца і самімі народнымі выканаўцамі. Праўда, імправізацыйныя моманты ў тэксце і напеве адчуваюцца імі па-рознаму: так, у напеве яны закранаюць толькі сярэдзінныя (прынцыпова мабільныя) часткі напеву і ў меншай ступені датычацца стабільных яго частак (зачынаў і канцовак), і не мяняюць у свядомасці народнага выканаўцы семантычнага значэння напеву. Таму напеў з усімі яго індывідуальнымі ў кожнага выканаўцы варыянтамі ўспрымаецца ў цэлым як «адзіны голас». Іншая справа з тэкстам. Тут імправізацыйныя моманты фіксуюцца зусім дакладна: «Як песня, так песня — там словы для ўсіх адны, а як галасіць, так хто як прыдумаіць, як каму каго шкода» (Браслаўскі р-н, в. Далёкія); «Што набалела ў каго, так і будзе галасіць, усякія слава́ прычытваць» (Крычаўскі р-н, в. Камароўка); «Словы ў галашэнні з жызні бяруцца. У кожнага чалавека свая жызнь. Які чалавек, якая яго жызнь, такія яму і словы» (Чашніцкі р-н, в. Альшанка); «Жыла я са сваім мужам — у мяне ж у галаве і яго работа, і яго разгаворы, і саветы. І тое ўсё і гаворіш. Як сам жыў, як усё было, так і галосіцца» (Быхаўскі р-н, в. Следзюкі).

Другая прычына, якая абумоўлівае магчымасць значнай праявы ў пахавальных галашэннях індывідуальнага пачатку, а разам з ім і імправізацыі,— выключна сольнае выкананне галашэнняў. Праўда, у кульмінацыйныя моманты рытуалу родныя галосяць разам, але такім чынам толькі падкрэсліваецца прынцыпова сольны характар галашэння — галосяць усе разам і ў той жа час кожны сам па сабе. У выніку ўзнікае своеасаблівы «паліфанічны ансамбль», адметнымі рысамі якога з'яўляюцца адвольны ўступ галасоў, адвольная тэсітура, розны тэкст (хоць, па сутнасці, пра адно і тое ж), адначасовае спалучэнне розных варыянтаў аднаго напеву. Такога роду сумеснае галашэнне можна вызначыць як паліфанічнае ў адрозненне, напрыклад, ад групавога, калі ўсе члены групы інтануюць адзін і той жа тэкст на адзін і той жа напеў.

Нарэшце, трэці фактар, які тлумачыць вялікае значэнне імправізацыі ў пахавальным галашэнні — індывідуальнае майстэрства таго, хто галосіць. Як было паказана вышэй, яго рэалізацыя часта знаходзіцца ў прамой залежнасці ад ступені эмацыянальнага ўзбуджэння чалавека: чым мацней уражаны чалавек асабістым горам, тым менш магчымасці, што ў момант галашэння ён зможа выказаць яго ў высокамастацкай форме. Разам з тым той жа выканаўца ў іншай сітуацыі можа вызначыцца сваімі здольнасцямі. Жыхарка в. Нёман Уздзенскага р-на, хаваючы сваю трагічна загінуўшую васемнаццацігадовую дачку, «рвала на сабе ва-

ласы і крычала, не помня сябе», а на пахаванні старэйшай сястры «ўсё добра зладжыла», бо «жалка сястру, канечне, але ж дачку было жальчэй. Як па сястры галасіла, словы самі ішлі, а па дацэ — галаву зацiснула і ўсё тут!» Як бачым, для выражэння пачуцця ў мастацкай форме патрэбны асаблівыя псіхалагічныя ўмовы, і, калі яны ёсць, імправізацыйны талент таго ці іншага выканаўцы можа раскрыцца ў поўнай меры. Пры гэтым у адпаведнасці з законам дыялектычнага адзінства асабістага і агульнага імправізацыйныя моманты галашэнняў будуць знаходзіцца ў рэчышчы мясцовай традыцыі і цалкам ёю вызначацца.

* *
*

Беларускія пахавальныя галашэнні ўяўляюць сабой суцэльны жанр. Уласцівыя яму стылявыя заканамернасці найбольш поўна раскрываюцца ў супольным аналізе яго агульнанацыянальных і лакальных рыс. Да агульнанацыянальных трэба аднесці непасрэдную сувязь у галашэнні напеву і тэксту, адзінства прынцыпаў ладавай арганізацыі напеваў, прынцыпаў пабудовы меладычных кампазіцыйных форм. Да лакальных рыс — розныя манеры інтанавання галашэнняў і багацце канкрэтных меладычных тыпаў, у кожным з якіх агульнанацыянальнае знаходзіць арыгінальнае прыватнае ўвасабленне.

Адна з сутнасных асаблівасцей жанру беларускага пахавальнага галашэння — яго моўная прырода, што вылучае на першы план праблему асэнсавання форм узаемасувязі слова і напеву ў галашэнні. У цэлым суадносіны паміж функцыямі моўнага і меладычнага пачаткаў у галашэнні могуць быць вызначаны як «$\frac{С}{М}$»[7] у адрозненне ад песні, дзе прэваліруе «$\frac{М}{С}$»[8]. Мелодыка беларускіх пахавальных галашэнняў, як і тыпалагічна родная ёй мелодыка рускага і ўкраінскага эпасу, мяркуе найяснейшае «ўзаемадзеянне сродкаў музычнай і моўнай выразнасці, узаемаабумоўленасць праявы і існавання кожнага з мастацкіх кампанентаў»[9].

Узаемасувязі слова і напеву ў беларускіх пахавальных галашэннях сістэмна раскрываюцца ў працэсе аналізу іх рытмічнай і меладычнай структур. Яны інтэгруюць розныя ўзроўні рытміч-

---

[7] С — слова, М — музыка.

[8] Гриця С. Й. Мелос української народної епіки.— Київ, 1979, с. 111.

[9] Былины. Русский музыкальный эпос / Сост. Б. М. Добровольский, В. В. Коргузалов.— М., 1981, с. 23.

най і меладычнай арганізацыі галашэнняў: складу і гуку, верша і мелерадка, паэтычнай страфы і меластрафы. Два першыя ўзроўні разглядаюцца намі ў межах агульнанацыянальнай традыцыі, апошні — у межах адной з лакальных.

Тыпавыя формы ўзаемасувязі складу і гуку — адпаведнасць аднаго складу паэтычнага тэксту або аднаму гуку мелодыі (сілабічны рэчытатыў), або невялікаму ўнутрыскладоваму звароту, які складаецца звычайна з двух-трох гукаў (меладычны рэчытатыў)[10]. Па тыпу меладычнай рытмізацыі напевы беларускіх пахавальных галашэнняў можна падзяліць на дзве групы:

а) з пераважным рухам роўнымі кароткімі працягласцямі ў асноўнай частцы верша («пірыхічны» рытм)[11]










б) з пераважным рухам у асноўнай частцы верша «ямбічным» рытмам:










Напевы першай рытмічнай групы пашыраны амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі, напевы другой — у цэнтральным Палессі.

---

[10] Зрэдку сустракаюцца распевы больш шырокага дыхання (муз. прыклады ў гэтым томе: № 15, 41, 56, 59, 101 і інш.), але гэта, відаць, вынік творчай ініцыятывы асобных выканаўцаў.

[11] Карыстаемся тэрмінам, прапанаваным Б. Б. Ефіменкавай у цытаванай працы.

«Ямбічная» рытмічная структура, магчыма, з'яўляецца спецыфічнай асаблівасцю беларускай традыцыі. Прынамсі, пакуль нам не вядомыя іншанацыянальныя пахавальныя галашэнні, дзе «ямбічны» рытм вытрымліваўся б з такой паслядоўнасцю.

На ўзроўні складовага музычнага рытму ўзаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць моўнага і музычнага пачаткаў ярчэй за ўсё назіраюцца ў працэсе аналізу суадносін тэкставых і музычных націскаў. Як вядома, сучаснай беларускай мове ўласцівы экспіраторны тып ударнасці, які выцесніў існаваўшыя дагэтуль метрычны і тонавы тыпы [12]. Аднак калі гутарковая і літаратурная беларуская мова, як і вербальная мова беларускага фальклору, «зараз ужо ў значнай меры страціла метрычныя (асабліва) і тонавыя націскі, пакінуўшы ў якасці вядучага толькі экспіраторныя, дык мова музычная ў цяперашнім выглядзе валодае яскрава выражанымі ўсімі трыма». Больш таго, «музыка ўвесь час аднаўляла і аднаўляе ў песенным тэксце ўсе ўласцівыя яму раней тыпы ўдарнасці» [13]. Гэта думка, верная для ўсяго масіву беларускага песеннага фальклору, асабліва актуальная для яго старажытнага пласта, да якога датычацца і пахавальныя галашэнні. У мелодыцы галашэнняў якраз экспіраторны тып ударнасці выражаны няярка, рытмічнага чаргавання моцных і слабых долей тут няма, тактаметрычная сістэма непрыхільная да прыроды галашэнняў. Экспіраторныя націскі тэксту падтрымліваюцца ў музыцы або тонавым, або метрычным націскам, часам іх спалучэннем. Пры гэтым у напевах з «пірыхічным» рытмам у мелодыі пераважаюць тонавыя націскі, у напевах з «ямбічным» — метрычныя. У напевах «пірыхічнага» тыпу неаднолькавая і ступень супадзення вершавых і музычных акцэнтаў у розных частках напеву. У зачынных і кадэнцыйных частках супадзенняў больш. Інтанацыйна ўстойлівыя зачынныя (з перавагай «харэічнага», «ямбічнага» і «анапестычнага» рытмаў) часткі ў цэлым устойлівыя і ў адносінах да меладычнага руху (у межах кожнага канкрэтнага меладычнага тыпу). Тут дзейнічаюць тыя ж заканамернасці, якія адзначаны В. Ялатавым для беларускай традыцыі ў цэлым: харэічным і дактылічным метрычным групам уласцівы зыходзячы меладычны рух, ямбічным і анапестычным — узыходзячы. [14]. На думку даследчыка, прычынай замацавання такіх меладычных малюнкаў з'явілася тэндэнцыя да зліцця розных

[12] Нарысы па гісторыі беларускай мовы.— Мн., 1957.— 216 с.

[13] Елатов В. Ритмические основы белорусской народной музыки.— Мн., 1966, с. 129—130.

[14] Там жа, с. 133.

тыпаў ударнасці ў беларускай народнай музыцы. Магчыма мер-
каванне, што на аснове моўнай практыкі склалася сістэма хвале-
падобных папевак [15], якія замацаваліся потым у выглядзе лада-
меладычных стэрэатыпаў у напевах, што абагульнілі пэўны эма-
цыянальна-сэнсавы змест. У якасці меладычных стэрэатыпаў
папеўкі гэтыя былі ўжо ў значнай меры свабодныя ад непасрэд-
нага ўплыву акцэнтаў мовы, паступова набывалі моц уласна
музычныя заканамернасці. Ва ўстойлівых інтанацыйна-рытміч-
ных комплексах заканчэння напеву і ў пераважна ўстойлівых
комплексах яго пачатку тэкставыя і музычныя акцэнты не толькі
ўзаемаабумоўліваюць адзін аднаго, але і мяняюць сваё даміную-
чае становішча: музычныя акцэнты часам пачынаюць падпарад-
каваць сабе вершавыя.

Іншая справа ў сярэдняй частцы напеву. У шматскладовых
вершах яна бывае дастаткова працяглай (да 12 складоў), а яе
меладычнае разгортванне адбываецца на аснове папевачна-ва-
рыянтнага тыпу развіцця. У гэтых умовах акцэнтная паралель-
насць (тэрмін В. Ялатава) не выступае ў якасці вядучай тэндэн-
цыі. Супадзенні і несупадзенні вершавых і музычных акцэнтаў у
сярэдняй частцы працяглага верша сустракаюцца прыкладна
пароўну, моўны і музычны пачатак тут быццам бы ўступаюць у
барацьбу.

Вялікую цікавасць уяўляюць «ямбічныя» галасільныя напевы.
З аднаго боку, у іх назіраецца яўная тэндэнцыя адзначыць боль-
шай працягласцю гучання наўрад ці не ўсе націскныя склады
верша, «ямбічны» рытм у гэтым выпадку пераплятаецца з «харэ-
ічным», «анапестычным»:




[15] Рубцов Ф. Основы ладового строения русских народных песен.—
У кн.: Рубцов Ф. Статьи по музыкальному фольклору. М.; Л., 1973, с. 21.

З другога боку, рытм музычны скрозь уваходзіць у супярэчнасць з рытмам вершавым, зрушваючы яго акцэнты і навязваючы свае:




У агульнай сваёй масе моманты акцэнтнага паралелізму прыкладна ўраўнаважваюць моманты акцэнтных несупадзенняў. Рытмічная пульсацыя напеваў гэтага тыпу дае падставу меркаваць пра ўплыў тут рухальнага пачатку. Магчыма, перад намі рудымент адной з форм старадаўняга сінкрытычнага трыадзінства слова — рух — музыка, магчыма, і тое, што значная самастойнасць уласна музычнага рытму — вынік вызвалення яго з-пад улады слова, устанаўлення прыярытэту музычных заканамернасцей.

Даследванне суадносін слова і напеву ў беларускім пахавальным галашэнні на ўзроўні верша і меларадка ўскладняецца перш за ўсё нявывучанасцю стылявых асаблівасцей галасільнага верша ў цэлым, у тым ліку і яго рытмікі. Нашы назіранні над стылістыкай паэтычных тэкстаў галашэнняў дазваляюць адзначыць, з аднаго боку, іх большую ў параўнанні з якім бы то ні было іншым вакальным жанрам беларускага фальклору набліжанасць да празаічнай мовы, а з другога — дастаткова ясна выражаны рытмічны пачатак, што дазваляе аднесці іх у цэлым да мовы вершаванай. Да прозы галашэнне далучае перш за ўсё сам прынцып чляненне тэксту праз сінтаксічныя паўзы і адвольнасць рытму гэтых паўз. Рытмічныя адзінкі, якія выдзяляюцца такім чынам,— розныя па працягласці, а іх унутраная рытмічная пабудова свабодная. І разам з тым у тэкстах галашэнняў у наяўнасці такія тыпова вершавыя прыкметы, як упарадкаванасць інтанацыйна-сінтаксічнай структуры, сэнсавае аб'яднанне слоў унутры сінтаксічных адзінак (вершавыя і сэнсавыя межы абавязкова супадаюць), устанаўленне сувязей паміж радкамі і па гарызанталі (паслядоўнае чаргаванне сувымерных адрэзкаў), і па вертыкалі (шляхам алітэрацыі ці рыфмы), мноства сінтаксічных паралелізмаў:

Суседачка наша родная,
Суседачка наша дарагая,
А што ж ты нам такоя гора прынесла,
Зачым жа ты нас адных аставіла?
А мы ж к табе, бывала, на кажды дзень
прыхадзілі,
А ты ж нам што-небудзь харошае гаварыла.
Суседачка наша мілая,
Суседачка наша любая,
Ты ж нам была саветніца,
Ты ж нам была парадніца,
Ты ж была, як родная мамачка нам...

*(Талачынскі р-н, пас. Райцы)*

Рытмічная арганізацыя ў галасільным вершы вызначаецца выключна інтанацыйнымі заканамернасцямі, таму ў цэлым вершаскладанне беларускіх пахавальных галашэнняў можна вызначыць як інтанацыйна-фразавае. Выяўленне рытмічных адзінак галасільнага верша, тэрміналагічнае вызначэнне розных яго метрычных груп — адна з задач будучых філалагічных даследаванняў. Мы ў далейшым будзем карыстацца агульнапрынятым паняццем «верш» і паняццем «складовая група» як частка верша.

Складовая працягласць радкоў розная. Кароткія радкі маюць 3—5 складоў, радкі сярэдняй працягласці — 6—10 (яны найбольш распаўсюджаныя), доўгія — да 16 складоў [16]. Доўгія вершы складаюцца з паўвершаў рознай працягласці. Пачатак радкоў па рытму пераважна харэічна-ямбічны, вельмі характэрныя анафары, якія часцей за ўсё ўтвараюцца злучнікамі «а» і «да». Клаўзулы пераважна харэічна-дактылічныя, у канцы верша нярэдка сустракаецца і ямбічны рытм.

У адрозненне ад паўночнарускай галасільнай традыцыі, дзе «ў напевах мясцовай прычаці яе традыцыйныя структурныя нарматывы выступаюць ва ўстойлівай складовай музычна-рытмічнай форме, якая адпавядае рытму прычотнага верша» [17], або традыцыі карэл, дзе «ў аснове рытмічнага ладу галасільнага напеву ляжыць паўторнасць рада тыпавых ячэек часовага рытму» [18], у беларускіх пахавальных галашэннях адной з важных жанрава-стылявых адзнак становіцца няроўнаскладовасць, рытмічная неперыядычнасць верша і адпаведна рухомасць музычна-рытмічнай формы.

---

[16] Тэрміны «кароткі радок», «сярэдні радок», «доўгі радок» выкарыстоўваюцца намі ў далейшым выкладанні.

[17] Ефименкова Б. Б. Севернорусская причеть, с. 35.

[18] Краснопольская Т. В. О напевах карельских причитаний.— У кн.: Традиционное народное музыкальное искусство и современность. М., 1982, с. 135.

Найбольш стабільнымі на ўзроўні каардынацыі вершавага і меладычнага рытму ў беларускіх пахавальных галашэннях з'яўляюцца кадансы. Можна вылучыць два іх тыпы. Першы каардынуе рытм верша і напеву такім чынам, што канец паэтычнага радка супадае з канцом напеву. Заключны гук пры гэтым аказваецца самым працяглым у напеве, і каданс набывае ямбічна-анапестычны характар.

Калі ж пры каардынацыі рытму вершавага і меладычнага радкоў узнікаюць такія іх суадносіны, калі верш аказваецца даўжэй за напеў, узнікае каданс другога тыпу. У гэтым выпадку напеў заканчваецца раней, асноўны ўстой супадае з нізкім фразавым націскам, і група складоў, што завяршаюць вершавы радок, або не прамаўляецца зусім, або прамаўляецца на няпэўнай вышыні (але ніжэй апорнага тону), або прапяваецца на субквартавым гуку. Апорны гук, як правіла, супадае з націскным складам, за якім ідуць часцей за ўсё 1—2 (радзей 3) ненаціскных склады, з прычыны чаго кадансы гэтага тыпу пераважна набываюць харэічна-дактылічны рытм:




Тыпавыя формы ўзаемасувязі вершаванага і меладычнага радкоў залежаць ад працягласці вершаванага радка і характару меладычнага руху музычнай фразы, якая адпавядае гэтаму радку. Як ужо адзначалася, прынцыпы пабудовы меладычных форм з'яўляюцца агульнанацыянальнымі [19] і вызначаюцца напевачна-варыянтным тыпам развіцця мелодыі.

За асноўную структурную адзінку напеву можна прыняць пэўную, тыпавую для кожнай лакальнай традыцыі напеўку хва-

[19] Тое ж назіраецца ў карэльскай галасільнай традыцыі (Краснопольская Т. О соотношении стиха и напева в мелострофе карельских причитаний.— У зб.: Финно-угорский музыкальный фольклор: Проблемы синкретизма. Таллин, 1982, с. 28—30).

лепадобнага, радзей зыходзячага меладычнага руху з апорай часцей за ўсё на I ступень лада. Каардынацыя папевак (у зыходзячым руху яны трох-, радзей чатырохгучныя, у хвалепадобным — пяці-, васьмігучныя) з радкамі рознай працяглaсці адбываецца ў трох асноўных формах:

1. Зыходзячая папеўка цалкам ахоплівае «кароткі» або «сярэдні» радок (№ 9, 10, 22, 23 і інш.).

2. Хвалепадобная папеўка цалкам ахоплівае «кароткі» або «сярэдні» радок. Гэта, бадай, самая распаўсюджаная форма каардынацыі паэтычнага радка і напеву, якая сустракаецца ва ўсіх тыпах напеваў галашэнняў.

Хвалепадобныя і зыходзячыя папеўкі часта кантамінуюцца так, што хваля ахоплівае пачатковую і сярэдзінную часткі напеву, а зыходжанне да асноўнага ладавага ўстоя прыпадае на клаўзулу (у некаторых лакальных традыцыях клаўзула меладычна афармляецца і па-іншаму).

У «доўгіх» радках папеўка ахоплівае асобныя складовыя групы, якія суадносяцца як паўвершы. Межы папевак супадаюць са словападзелам:




Ва ўсіх гэтых выпадках папеўкі паўстаюць у сваім канцэнтраваным выглядзе.

3. Пры каардынацыі папевак хвалепадобнай пабудовы з «сярэднімі» або «доўгімі» паэтычнымі радкамі папеўка часта паўстае ў разгрупаваным выглядзе. У адных выпадках разгрупаванне ідзе шляхам паўтору асобных гукаў папеўкі (у адпаведнасці з павелічэннем колькасці складоў у паэтычным радку), але не мяняе гукавысотны контур напеву. Межы такіх «расцягнутых» папевак супадаюць са словападзелам. У іншых выпадках разгрупаванне папеўкі адбываецца шляхам паўтору асобных яе ячэек [20]. Музычныя і вершавыя сегменты галашэнняў тут часта не супадаюць, што надае інтанаванню асаблівую гнуткасць.

---

[20] Такі ж прынцып каардынацыі верша і напеву адзначаны ў традыцыі рускамоўных галашэнняў карэл-людзікаў (Николаева С. О принципах координации стиха и напева в русскоязычных причитаниях карел-людиков.— У зб.: Финно-угорский музыкальный фольклор: Проблемы синкретизма, с. 42—44).




Трэба адзначыць, што сегментная паралельнасць верша і напеву (дакладней сказаць папеўкі) не можа лічыцца стылявой нормай ні адной з лакальных традыцый. Кожны тып пахавальнага напеву дае прыклады як супадзення, так і несупадзення межаў папеўкі і складовых груп. Урэшце, сабраны і прааналізаваны да гэтага часу матэрыял дазваляе ўказаць у якасці вядучага для беларускай традыцыі ў цэлым прынцып сегментнай паралельнасці. Аднак па меры назапашвання матэрыялу гэта ўяўленне можа змяніцца (прынамсі для асобных лакальных традыцый).

На ўзроўні музычна-паэтычнага радка ў пахавальным галашэнні больш яскрава і непасрэдна, чым у іншых жанрах беларускага фальклору, праяўляецца інтанацыйная сувязь верша і напеву, моўная інтанацыя тут часта вызначае гукавышынны контур мелодыі. Адлюстроўваецца гэта ў пераважнай адпаведнасці месцапалажэння высокага і нізкага фразавага націску ў радку і размеркаванасці тонаў па вышыні ў музычнай фразе, якая ахоплівае гэты радок. Калі вершавы радок утрымлівае адзін высокі і адзін нізкі націск, напрыклад, «а на каго ж ты нас пакідаеш» (графічна гэту інтанацыю можна паказаць прыкладна так):




то ёй будзе адпавядаць музычная фраза, гукавысотны контур якой надта дакладна будзе паўтараць гэту інтанацыю:




Калі ў радку дзве пары націскаў («А мае слёзанькі ўсю зямельку абмылі»), а адпаведна і дзве моўныя інтанацыйныя хвалі, яны знойдуць адлюстраванне і ў напеве:



Безумоўна, далёка не ва ўсіх галасільных напевах моўная інтанацыя гэтак непасрэдна адлюстравана ў рытмічных прапорцыях і гукавысотным контуры напеваў. Спецыфіка музычных сродкаў выражэння часам пераўтварае моўныя павышэнні ў фактычныя меладычныя паніжэнні і наадварот. Аднак тэндэнцыя да адлюстравання ў гукавысотным контуры напеву гукавысотнага контуру моўнай інтанацыі ў пахавальных галашэннях рэчытатыўнага тыпу відавочная.

Відавочная і структураўтвараючая роля напеўкі, асабліва ў тых выпадках, калі яна, паўтараючыся на працягу верша 2—3 разы, ахоплівае складовыя групы, супадаючы са словападзелам. Інтанацыйная структура галасільнага верша магла б быць выяўлена больш ясна, калі б прымалася да ўвагі паралельная сегментацыя галашэнняў. У гэтым выпадку вершавыя радкі належала б размяшчаць лесвічкай. Напрыклад, тэкст галашэння № 237 больш правільна было б графічна паказаць так:

А мой ты мужычок,
Мой ты міленькі,
Мой ты Янусь,
Як мы с табой
          любіліся,
Як я прыпомню
     маладыя гадочкі,
Як ты быў жа такі
     мне спагадлівы,
Як ты мне памагаў усё,
А як ты ў жызні
     потым мяне
          абіжаў.
А мой ты Янусь, Янусь,
А я ж гэта ўсё
     забылася,
Але ж я ўсё табе
     выбачаю,
          як ты цяпер ляжыш...

Ладава-меладычны змест асноўных напевак беларускіх пахавальных галашэнняў вызначаецца разнастайнасцю і можа быць пададзены ў выглядзе рада мадэляў-гукарадаў, кожная з якіх абагульняе характэрныя інтанацыйныя комплексы вядомых зараз галашэнняў. Падкрэслім яшчэ раз, што яны сканцэнтраваны ў кадэнцыйных і зачынных частках напеваў, дзе выступаюць як устойлівыя інтанацыйныя формулы з адзінай семантыкай.

Асноўных такіх мадэляў чатыры. Першая абагульняе найбольш шырока распаўсюджаныя трыхордавыя комплексы ў аб'ёме вялікай, малой і ладава няпэўнай тэрцый:

1.  [21]

Другая мадэль тэтрахорд у сэксце:

2.  [22]

Трэцяя ўяўляе ангемітонную структуру трыхорда ў квінце. Існуюць дзве яе разнавіднасці: а) з заканчэннем на ніжнім гуку структуры, б) з заканчэннем на сярэднім яе гуку:

3. 


Чацвёртая абагульняе дыятанічныя квартавыя папеўкі рознага віду. Ладава-меладычная мадэль-гукарад можна быць пададзена наступным чынам:

4. 

Прыведзеныя мадэлі — своеасаблівая «лінейная праекцыя» гукавысотнага контуру папевак-інтанацый, якія ў беларускай традыцыі замацаваліся ў пахавальных галашэннях. Параўнаўчы іх аналіз дае аснову для сцвярджэння, з аднаго боку, ідэі множнасці меладычных увасабленняў «вобразу гора» ў беларускай пахавальнай традыцыі, з другога — ідэі інварыянтнай інтанацыйнай асновы беларускага пахавальнага галашэння. Пры супастаўленні 1, 2 і 4-й мадэляў (а іменна яны адлюстроўваюць інтанацыйную сутнасць большасці беларускіх галашэнняў) не можам не звярнуць увагу на тое, што ў кожнай з іх змяшчаецца, калі так можна сказаць, «меладычны мінімум», г. зн. меладычны зварот, які ёсць у абсалютнай большасці напеваў рэчытатыўнай традыцыі. Гэта зыходзячая тэрцавая папеўка (па-рознаму афар-

[21] Ступені, пададзеныя тут і далей без дужак,— інварыянтны меладычны каркас кожнай групы напеваў; ступені, пададзеныя ў дужках, могуць у напевах прапускацца як у асобных меластрофах, так і ў напеве цалкам; ступені, узятыя ў кола, паяўляюцца зрэдку.

[22] Ступені, узятыя ў квадратныя дужкі, зрэдку прапускаюцца.

баваная ў ладавых адносінах) з галоўным устоем на ніжнім гуку тэрцыі. Для напеваў, што абагульнены ў 1-й мадэлі, гэта папеўка з'яўляецца асноўнай, у 2-й — пануе поруч з субквартай, у 4-й — уваходзіць або як частка зыходзячай квартавай папеўкі, або ў якасці самастойнай папеўкі як элемент так званага «суммирующего» ладу [23]. Кожная з пададзеных інтанацыйных формул мае аналагі ў першую чаргу ў каляндарна-земляробчым цыкле, а таксама сямейна-абрадавым і некаторых тэматычных групах жанраў позняй традыцыйнай лірыкі.

Асаблівай шырынёй вызначаецца вобразная семантыка папевак-інтанацый, якія абагульнены ў першай і другой мадэлях. Першая, па назіраннях В. І. Ялатава, асабліва часта сустракаецца ў беларускіх жніўных, купальскіх, калядных, дзіцячых, старадаўніх вясельных песнях [24], другая атрымала яшчэ большае значэнне: лад у аб'ёме тэрцыі з субквартай «ляжыць у аснове амаль усіх жанраў старадаўняй беларускай песні» [25]. Ён таксама характэрны для ўкраінскіх жніўных, веснавых, купальскіх, некаторых песень сямейнага цыкла (асабліва ў паўночных абласцях рэспублікі); Ф. Рубцоў адзначае сувязь тэтрахорда ў сэксце з каляндарнымі песнямі летняга перыяду, а таксама веснавымі і валачобнымі, некаторымі масленічнымі [26].

Трыхорд у квінце адносіцца даследчыкамі да ладу, які рэдка сустракаецца ў чыстым выглядзе. Нашы назіранні дазваляюць, аднак, вылучыць зону паўночна-ўсходняй Віцебшчыны і раёны Смаленшчыны, што прылягаюць да яе, дзе гэта ангемітонная структура не з'яўляецца рэдкасцю. Трыхорд у квінце тут зафіксаваны не толькі ў галашэннях (пахавальных і вясельных), але і ў напевах вясенне-летняга цыкла.

Нарэшце, дыятанічныя тэтрахордавыя напевы галашэнняў таксама маюць рад аналагаў сярод старадаўніх напеваў як каляндарнага, так і сямейна-абрадавага цыклаў.

Пераходзячы цяпер да лакальных характарыстык беларускіх пахавальных галашэнняў, адзначым перш за ўсё істотнае адрозненне ў стыле іх выканання. Вылучаюцца тры стылі: напеўны рэчытатыў, песенны, гаворкавы. Напеўны рэчытатыўны стыль распаўсюджаны на Беларусі амаль паўсюдна, песенны стыль лакалізаваны пераважна ў цэнтральным Палессі, гаворкавы — на заходняй поўначы Гродзенскай вобл. (мяжа з Літвой). «Песен-

[23] Елатов В. И. Ладовые основы белорусской народной музыки.— Мн., 1964, с. 78—79.

[24] Там жа, с. 23.

[25] Там жа, с. 47.

[26] Рубцов Ф. Основы ладового строения..., с. 29.

ныя» і «гаворкавыя» галашэнні, якія пашыраны на параўнаўча невялікіх тэрыторыях, бытуюць у акружэнні рэчытатыўных, і носьбіты розных выканаўчых традыцый нярэдка маюць магчымасць пачуць адзін аднаго. Таму самі выканаўцы выразна асэнсоўваюць адрозненне сваіх напеваў ад напеваў суседзяў. Напрыклад, жыхарка в. Старыя Смільгіні Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл. М. А. Радзіевіч так тлумачыла асаблівасці мясцовага («гаворкавага») выканання галашэнняў: «У нас усё скарачона называецца: і разгаворы, і плачы. Мы не зацягваем, а гуды («гудамі» мясцовае насельніцтва называе беларусаў, якія жывуць на ўсход ад ракі Пеляса.— *Т. В.*) зацягваюць. Яны кажуць «пугавіца», а мы кажам «біч», яны зацягваюць: «ця-пе-ра-ка», а мы кажам «тэраз». І вылічаем мы скаротка, скора славы выказуем, не зацягваем длуга, вылічаем прэнткім ужо ходам. Гуды ж плачуць, зацягваючы на голас, цягнуць, як спяваюць» [27]. А жыхарка в. Белая Мазырскага р-на Гомельскай вобл. Т. А. Дашкевіч расказвала: «У нас усе галосяць песнямі. Я была ў Петрыкаўскім раёне, мая братавая там сільна загаласіла па шурыну. То ўсе пазбягаліся з вуліцы, думалі: што такое? Спевы ў хаце! Потым яна ўжо перагаласіла, яе акружылі і спрашываюць: «Чаго гэта, у вас усягда паюць на похаранах?» Яна кажыць: «У нас так галосяць, прыказваюць песнямі». Дак там ужо людзі сільна ўздзіўляліся, у іх гэтага няма» [28].

Паміж гэтых груп знаходзіцца асноўны масіў беларускіх пахавальных галашэнняў рэчытатыўнага стылю. Іменна гэтыя галашэнні ўяўляюць сістэму меладычных тыпаў, кожны з якіх рэпрэзентуе тую ці іншую лакальную традыцыю. Сістэматызацыя напеваў праводзіцца намі з улікам комплексу структурна-рытмічных і ладава-меладычных кампанентаў, сярод якіх найбольш устойлівым з'яўляецца ладава-меладычны.

Па нашых назіраннях на тэрыторыі Беларусі распаўсюджана восем асноўных тыпаў напеваў галашэнняў рэчытатыўнай традыцыі (гл. карту распаўсюджання меладычных тыпаў, с. 444).

Тып I (№ 1—27) — бадай, найбольш «тыповы» ўзор пахавальнай мелодыкі, які сустракаецца таксама ў многіх іншых народаў. Пададзены дзвюма разнавіднасцямі, якія вызначаюцца па рытмічным тыпе кадансу (гл. с. 79). Разнавіднасць Іа (№ 1—17) лакалізавана ў заходняй зоне Беларусі (Маларыцкі, заходняя

[27] Інтанаванне быстрай гаворкай робіць цяжкай, а часам і немагчымай фіксацыю ў агульнапрынятай сістэме натацыі як дакладнай вышыні прамаўлення асобных складоў, так і адносную іх рытмічную працягласць. Таму галашэнні гэтага стылю ў музычную частку тома не ўключаны.

[28] Асабісты архіў музыказнаўцы І. Д. Назінай.

частка Драгічынскага, Пружанскі р-ны Брэсцкай вобл.; Свіслацкі, Бераставіцкі, Ваўкавыскі, Зэльвенскі, Шчучынскі, Гродзенскі, Астравецкі р-ны Гродзенскай вобл.; Докшыцкі р-н Віцебскай вобл., а таксама, відаць, р-ны Камянецкі, Жабінкаўскі Брэсцкай і Мастоўскі Гродзенскай вобл.)[29]; разнавіднасць Іб (№ 18—27) — ва ўсходняй зоне Беларусі (Быхаўскі, Кіраўскі р-ны Магілёўскай вобл., Рагачоўскі, Жлобінскі, Буда-Кашалёўскі р-ны Гомельскай вобл.). Да тыпу Іа далучаюцца напевы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. (№ 16, 17), да тыпу Іб — Гомельскага і Бярэзінскага р-наў Мінскай вобл. (№ 26, 27), кожны з якіх выходзіць за межы асноўнага арэала дадзенага тыпу. Меладычны змест напеваў тыпу І — ланцуг хвалепадобных або зыходзячых тэрцавых папевак, якія каардынаваны з «пірыхічным» рытмам. Напевы зыходзячага меладычнага малюнка сканцэнтраваны пераважна ў Шчучынскім, Ваўкавыскім, Гродзенскім, Рагачоўскім, Жлобінскім, Буда-Кашалёўскім р-нах. Пераважаюць «кароткія» і «сярэднія» радкі з 1—2 парамі націскаў. Асноўным ладавым устоем у напевах І тыпу з'яўляецца ніжні гук тэрцавай ячэйкі; верхні яе гук у адных напевах выступае ў функцыі супрацьустоя, у іншых — як верхняя мяжа тэрцавай рамкі. Большасць напеваў данага тыпу строга трохгучныя, хоць ёсць двух- і чатырохгучныя ўзоры. Адзіны ўзор дыхорда ў тэрцавай рамцы запісаны ў Гомельскім р-не (№ 16). Чатырохгучныя напевы зафіксаваны ў Докшыцкім, Астравецкім (заходнія р-ны Паазер'я), а таксама ўсіх указаных р-нах усходняй зоны. Асноўная лада-папеўка галашэнняў

Докшыцкага р-на , Астравецкага —

. Незвычайны каданс галашэнняў

Астравецкага р-на (№ 11, 12), які інтануецца вельмі выразна, надае мелодыі своеасаблівую форму «бясконцага» напеву. Вызна-

---

[29] У раёнах, што зазначаны як тэрыторыя магчымага распаўсюджання таго ці іншага тыпу пахавальнага напеву, запісы галашэнняў пакуль не рабіліся. Аднак два моманты даюць нам падставу для такога меркавання:

1) раёны, якія ўказваюцца, знаходзяцца ўнутры асноўнага арэала таго ці іншага тыпу;

2) музычна-стылявое адзінства саміх арэалаў пацверджана аналізам песень каляндарна-земляробчага і сямейна-абрадавага цыклаў.

чэнне асноўнага ладавага ўстоя робіцца цяжкім з-за супярэчнасці паміж рытмічнай важкасцю заключнага тону (ён самы працяглы) і інтанацыйнай няўстойлівасцю заключнага маласекундавага звароту. Перад намі быццам бы разамкнуты каданс. Недахоп беларускага матэрыялу і слабая вывучанасць галасільнага меласу пагранічнай Дзукіі не даюць пакуль магчымасці адказаць на пытанне пра ступень самабытнасці гэтага меладычнага тыпу (тым больш, што ў межах Беларусі яго арэал аддалены ад асноўнага арэалу тыпу I). Можа быць, што гэта не зусім звычайная структура з'яўляецца вынікам перастаноўкі ў мясцовай традыцыі паслядоўнасці 7—1-й ступеней, якая з'яўляецца тыповай у традыцыі Докшыцкага р-на, а таксама ў напевах квартавага амбітуса, асноўная тэрыторыя распаўсюджання якіх непасрэдна далучаецца да тэрыторыі названых раёнаў (с. 90).

У напевах разнавіднасці Iб з усходняй зоны дадатковым гукам да тэрцавай ячэйкі выступае субквартавы, роля якога ў галасільных напевах усходняй зоны асабліва вялікая. З'яўленне яго тут пераважна ў якасці заключнага гуку звязана з рытмічным тыпам каданса: на дакладнай або прыблізнай вышыні субквартавага тона прапяваюцца або прагаворваюцца ўсе склады, якія ідуць у вершы пасля нізкага фразавага націску. Пачатковая субкварта з'яўляецца зрэдку.

Адметныя рысы напеваў тыпу II (№ 28—41) — «ямбічны» рытм і пераважна працяглы паэтычны радок з 2—3 парамі націскаў. Па астатніх асноўных прыкметах напевы дадзенага тыпу ў цэлым аналагічныя напевам разнавіднасці Iа (арэалы іх з'яўляюцца суседнімі). Бадай, толькі роля 3-й ступені больш значная (яна часцей супадае з зацягнутым гукам і націскным складам, паяўляецца ў непасрэдным супастаўленні з 1-й ступенню), акрамя таго, цалкам адсутнічаюць моманты апявання асноўнага ўстоя. Як і сярод узораў разнавіднасці Iа, напевы зыходнага меладычнага руху тут таксама лакалізаваныя (Ганцавіцкі і Ляхавіцкі р-ны), у зачынах напеваў хвалявай пабудовы, акрамя таго, часта адсутнічае 1-я ступень, а ўстойлівасць «ямбічнай» рытмаформулы нярэдка падкрэсліваецца драбленнем кароткай яе долі, што часцей бывае звязана з імкненнем выканаўцы больш працяглым гукам падкрэсліць націскны склад:



Зона распаўсюджання напеваў тыпу II — частка брэсцкага Палесся, якая ахоплівае р-ны Пінскі, усход Драгічынскага, Іванаўскі, Бярозаўскі, Івацэвіцкі, Ляхавіцкі.

На паўночным усходзе Віцебскай вобл.— у Расонскім, Гарадоцкім, Лёзненскім, Шумілінскім р-нах — лакалізаваўся III тып напеваў пахавальных галашэнняў, які існуе ў дзвюх разнавіднасцях адпаведна меладычнаму афармленню каданса (гл. мадэль-гукарад № 3). Пераважаюць напевы разнавіднасці IIIа (Расонскі, Гарадоцкі, Лёзненскі р-ны) з завяршэннем на ніжнім гуку ангемітоннай структуры (№ 42—46).

Разнавіднасць IIIб (№ 47) бытуе ў Шумілінскім р-не. Адметныя яе асаблівасці — разгортванне напеву на аснове абедзвюх разнавіднасцей трэцяй інтанацыйнай формулы і страфічная пабудова. Кожная страфа складаецца з двух вершаў, першаму адпавядае першая разнавіднасць другой інтанацыйнай формулы, другой — другая. У цэлым утвараецца форма, якая вельмі падобная на класічны музычны перыяд з двух фраз з палавінным і заключным кадансамі.

Верш галашэння данага тыпу адрозніваецца большай у параўнанні з іншымі тыпамі структурнай удакладненасцю і можа быць вызначаны як акцэнтны трохнацісны (зрэдку, праўда, сустракаюцца двух- і чатырохнацісныя радкі). Заканамернасці каардынацыі папеўкі з вершам пададзены на наступнай схеме:

– / – – / – – – / – –
Ку- куй, ма- я шэ- ра- я зя- зю-/леч- ка/,

– / – – / – – / – –
Па- тай ма- ё го- ра вя- лі-/ка- я/,

– – / – – / – – – – / – – –
А я- нож у мя- не ні- пі- ра- жа- ва-/е- -ма-я/,

– – / – – / – – / –
Як вай-ду я у шчы- рай ля- со-/чак/,

– – / – / – – /
Я ж та- бе у- сё рас- ка- жу.

Як відаць, асноўная папеўка ахоплівае сегменты, якія ўключаюць першыя два націскі і ўсе склады, якія ім папярэднічаюць. Заканчэнне папеўкі супадае з другім акцэнтам. Прынцып гэты

застаецца нязменным незалежна ад колькасці безнацiскных складоў. Заключны квартавы зварот выразна каардынаваны з трэцім акцэнтам і ўяўляе трохгучную паслядоўнасць узыходзячай і зыходзячай кварты, якая адпавядае двум безнацiскным і наступнаму націскному (трэці акцэнт) складу.

Акрамя ўказанай тэрыторыі распаўсюджання, дадзены тып напеву бытуе, відаць, у Віцебскім і ўсходняй частцы Полацкага р-наў.

Арэал напеваў IV тыпу (№ 48—70) — вялікая зона Паазер'я, якая ўключае Браслаўскі, Міёрскі, Верхнядзвінскі, заходнюю частку Полацкага, Лепельскі, Чашніцкі, Сенненскі, Талачынскі, Аршанскі р-ны Віцебскай вобл., Крупскі, Барысаўскі р-ны Мінскай, Круглянскі р-н Магілёўскай вобл., а таксама, відаць, Ушацкі р-н Віцебскай вобл. Устойлівыя адзнакі данага тыпу — тэтрахорд у сексце як ладава-меладычная аснова напеву, «пірыхічны» тып рытмікі, аднавершавая форма, рытмічны каданс другога тыпу.

Асаблівае меладычнае афармленне каданса ў напевах Крупскага, Барысаўскага, Талачынскага, Аршанскага і Круглянскага р-наў — квартавая паслядоўнасць  замест тыповай для ўсіх астатніх напеваў гэтай зоны зыходзячай тэрцавай папеўкі  або  дазваляе вылучыць іх у асобную падгрупу.

Напевы з Полацкага (№ 53) і Аршанскага (№ 70) р-наў маюць тырадную пабудову і з'яўляюцца пераходнымі да пятага тыпу напеваў.

Тып V (№ 71—81) распаўсюджаны амаль выключна на Магілёўшчыне — у Мсціслаўскім, Крычаўскім, Клімавіцкім, Касцюковіцкім, Чавускім, Слаўгарадскім, Чэрыкаўскім, а таксама, відаць, у Хоцімскім і Краснапольскім р-нах. Напевы гэтага тыпу зафіксаваны таксама ў Жлобінскім р-не Гомельскай вобл.

Напевы дадзенага тыпу ў стылявых адносінах блізкія да напеваў тыпу IV — тая ж кварта-тэрцавая лада-меладычная аснова, «пірыхічны» рытм, рытмічны каданс другога тыпу, агульная манера інтанавання. Але тут іншая форма кампазіцыйнай пабудовы: у напевах тыпу V яна тырадная. Меладычная форма адпаведна больш развітая і можа быць пададзена наступным чынам:



Кожнаму радку, які ўтрымлівае, як правіла, дзве пары націскаў, адпавядае адна разгрупаваная асноўная папеўка з прыпынкам на субквартавым гуку ў канцы вершаў і на цэнтральным гуку — у канцы строф. Гукавысотныя суадносіны тонаў, якія такім чынам утвараюцца ў завяршэннях асобных вершаў і ўсёй страфы ў цэлым, блізкія да таго, які мы наглядаем у кампазіцыях пытальна-адказнай структуры. У радзе ўзораў і ў канцы страфы (у сувязі з тым, што тут каданс другога рытмічнага тыпу) з'яўляецца працяглы субквартавы гук, але перад ім абавязкова будзе не менш працяглы сярэдні гук квартава-тэрцавай ячэйкі, які і адчуваецца як асноўны устой у канчатку страфы.

Асноўная тэрцавая папеўка з субквартай у напевах Чавускага, Слаўгарадскага і Чэрыкаўскага р-наў набывае такі выгляд:



Рэдкім узорам напеву, які вытрыманы на трох гуках асноўнай папеўкі, з'яўляецца галашэнне са Слаўгарадскага р-на (№ 80).

У цэлым трэба адзначыць у тыпе V большую, чым у іншых тыпавых напевах, ролю субквартавага тону, які прымае на сябе функцыю супрацьустоя і робіцца, такім чынам, ладава значным.

VI, VII, VIII тыпы пахавальных галашэнняў — гэта дыятанічныя напевы квартавага амбітуса. У параўнанні з напевамі папярэдніх тыпаў тут інтанацыя галашэння ў цэлым больш апасродкаваная, распетая, больш разнастайная ладавая і меладычная структура.

Найбольш паказальныя ў гэтым плане напевы тыпу VI (№ 82—102), устойлівымі прыкметамі якога, акрамя квартавага амбітуса, з'яўляюцца таксама «піррыхічны» рытм і рытмічны каданс 1 тыпу. Распаўсюджаны на значнай тэрыторыі: у Шаркоўшчынскім, Глыбоцкім, Пастаўскім р-нах Віцебскай вобл., Ашмянскім, Воранаўскім, Іўеўскім, Карэліцкім р-нах Гродзенскай вобл., Дзяржынскім, Стаўбцоўскім, Валожынскім, Чэрвеньскім, Смалявіцкім, Капыльскім, Салігорскім, а таксама, відаць, у Мядзельскім і Маладзечанскім р-нах Мінскай вобл., Петрыкаўскім, Калінкавіцкім р-нах Гомельскай вобл.

Пераважная большасць напеваў — гэта ўзоры «суммирующего» ладу, асноўнымі папеўкамі якога тут з'яўляюцца наступныя:

у зачынах: 

у кадансах: 

Гэтыя папеўкі ўтвараюць разнастайныя меладычныя спалучэнні і не заўсёды паслядоўна праходзяць праз увесь напеў, але заўсёды выразна «прасвечваюцца» як яго інтанацыйны каркас. Тэрцавая і ангемітонная аснова шмат якіх напеваў дастаткова відавочная.

У розных частках указанага арэала лакалізаваліся наступныя ўстойлівыя лада-меладычныя структуры:



Вілейскі, Глыбоцкі, Шаркоўшчынскі, Пастаўскі р-ны



Стаўбцоўскі р-н [30]



Карэліцкі р-н

Напеў з Карэліцкага р-на — адзіны пакуль узор у квартавым амбітусе, дзе 3-я ступень мае так выразна выяўленую функцыю супрацьустоя.

Узоры з Валожынскага р-на (№ 95, 96) — адзіныя з найбольш яскравых прыкладаў «эмацыянальнага» пашырэння верхняй гукавой мяжы напеву (такога ж роду моманты сустракаюцца ва ўсіх тыпавых напевах рэчытатыўнай традыцыі) [31]. Квартавы гук тут замяшчаецца квінтавым, які мае тую ж функцыю, адна ангемітонная папеўка змяняецца другой. Такія меладычныя «прарывы», характэрныя для напеваў з хвалепадобным меладычным малюнкам, адбываюцца, як правіла, у зачынных раздзелах 3—4-й строф.

---

[30] Трыхорд у кварце аналагічнай структуры зафіксаваны таксама ў жніўных песнях паўночна-ўсходняга і цэнтральнага Паазер'я (Жніўныя песні / Уклад. А. С. Ліс; уклад. муз. часткі В. І. Ялатаў.— Мн., 1974, с. 542, № 26; с. 543, № 29; с. 570, № 89 і інш.— (Беларус. нар. творчасць).

[31] Сустракаецца і адваротнае: пры спакойным напяванні галашэння амбітус можа звужацца (параўн. № 63 і 64).

На рытмізацыю напеву № 99 з Капыльскага р-на аказала ўплыў «ямбічная» структура музычна-складовага рытму цэнтральнага Палесся. Напевы гэтага раёна з'яўляюцца пераходнымі да цэнтральна-палескай традыцыі, якая пададзена дзвюма апошнімі тыпавымі напевамі.

Тып VII (№ 103—106), яго ўстойлівыя адзнакі — «ямбічны» рытм, рытмічны каданс 1-га тыпу, тырадная кампазіцыя, «суммирующий» лад які аб'ядноўвае ангемітонныя і дыятанічныя папеўкі рознай структуры:



Лельчыцкі р-н, в. Тонеж

і



або



Лельчыцкі р-н, в. Глушкавічы



Нараўлянскі р-н

Арэал напеваў дадзенага тыпу — Лельчыцкі, Нараўлянскі і, відаць, Ельскі р-ны Гомельскай вобл.

Нарэшце, апошні — VIII тып напеваў беларускіх галашэнняў па памёршых (№ 107—110) узнікае на перакрыжаванні «ямбічнага» тыпу музычна-складовай рытмікі, тыраднай кампазіцыі і рытмічнага каданса першага тыпу. У адрозненне ад усіх іншых напеваў тыраднай пабудовы, дзе адзначаўся канец тырады (у выглядзе рытмічнага зацягвання галоўнага ўстоя), тут адзначаецца яе пачатак у выглядзе больш ці менш распетага вокліча, які ў дадзеным выпадку мае структураўтвараючае значэнне. Вокліч уяўляе сабой структурна адасобленую зыходзячую тэрцавую па-

пеўку ад зацягнутай трэцяй ступені да першай, часам з захопам чацвёртай ступені (№ 107). Верш шматскладовы і мае часцей дзве пары націскаў. Сінтаксічная група, якая аб'ядноўваецца першай парай націскаў, каардынуецца з разнастайнымі тэрцавымі, ангемітоннымі (у аб'ёме кварты) і дыятанічнымі квартавымі папеўкамі; група, якая аб'ядноўваецца другой парай,— з секундавымі або тэрцавымі папеўкамі.

Напевы гэтага тыпу зафіксаваны ў Любанскім, Старадарожскім, Пухавіцкім р-нах Мінскай і Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл. Напеў з Пухавіцкага р-на не мае пачатковага вокліча, тырадная кампазіцыі, што набліжае яго да паўночнабеларускай галасільнай традыцыі.

Другая тыпалагічная група беларускіх хаўтурных галашэнняў аб'ядноўвае напевы песеннага стылю (№ 111—115). Паколькі зараз мы маем толькі пяць узораў напеваў гэтага стылю (прычым усе яны ў меладычных адносінах непадобныя адзін на аднаго), мы пакуль не маем магчымасці гаварыць аб іх ні як аб тыпавых і політэкставых напевах, ні як аб напевах індывідуальнага прымацавання. Характарыстыка іх магчыма толькі ў самым агульным плане. Інтануюцца яны ў больш спакойнай манеры, тут няма недапетых складоў і момантаў моўнага інтанавання; больш шырокі іх амбітус (у трох напевах квінтавы дыяпазон з захопам верхняга секставага гуку, у двух — квартавы); рытмічны рух больш роўны, суразмераны, форма страфічная (або тырадная — № 111, 112, або з аднолькавай колькасцю вершаў у страфе — № 113—115). Інтанацыйны змест галашэнняў песеннага тыпу разнастайны: у аснове напеву № 111 ляжыць квінтавая папеўка

;

галашэння № 112 — .

У галашэннях № 113—115 паэтычныя строфы складаюцца з аднолькавай колькасці вершаў, кожнаму з якіх адпавядае пэўная папеўка. Напевы гэтых галашэнняў маюць па дзве папапеўкі. У № 113 — тэрцавая і квартавая



у першых двух радках чаргуюцца (у трэцім радку, які завяршае страфу, толькі квартавая папеўка). У напевах № 114—115 песенны прынцып меладычнага разгортвання вытрымліваецца больш дакладна: першаму радку галашэння з Калінкавіцкага р-на (№ 114) адпавядае квінтавая папеўка з захопам верхняга секставага тону, якая пачынаецца з устойлівага па месцапалажэнню і вышыні пачатковага вокліч

 ,

другі і трэці радкі інтануюцца на зыходзячую квартавую папеўку  ,якая зрэдку пераўтвараецца ў тэрцавую. Галашэнне ж № 115 па комплексу стылявых прыкмет найбольш блізкае да песні: верш выразна падзяляецца на два паўвершы, першаму адпавядае музычная фраза, заснаваная на зыходзячай квартавай папеўцы  ,

другому — на тэрцавай з субквартай  .

У дадатку (№ 116—117) пададзены два (пакуль што адзіныя) аднатыпавыя напевы, якія запісаны ў аддаленых адна ад адной вёсках Брэсцкага і Гомельскага Палесся. Асноўная ладаінтанацыя тут — зыходзячы квінтавы трыхорд, лада-меладычная мадэль-гукарад —  .

* *
*

Музычная частка беларускіх пахавальных галашэнняў пададзена асобным раздзелам, што абумоўлена неабходнасцю сістэмна-тыпалагічнай падачы музычнага матэрыялу, якая найбольш поўна раскрывае яго змест і форму ва ўзаемасувязі.

Парадкавы нумар напеву падаецца справа, нумар адпаведнага паэтычнага тэксту — побач у дужках.

У тым выпадку, калі тэкст да таго ці іншага напеву не падаецца ў філалагічным раздзеле тома, пры падтэкстоўцы захоўваюцца яго лексічныя і фанетычныя дыялектныя асаблівасці.

Усе натацыі (за выключэннем друкаваных узораў) зроблены аўтарам артыкула. Частка напеваў (№ 1, 15, 19, 30, 56, 60, 73, 91, 103, 107) пададзена ў аналітычнай натацыі па метаду прафесара Я. У. Гіпіуса.

У адпаведнасці з прынятай у міжнароднай практыцы сістэмай абазначэння ключавых знакаў у вузкааб'ёмных напевах ключавыя знакі выстаўляюцца на ўзроўні дыяпазону мелодыі і ў парадку ўзнікнення адпаведных гукаў.

З прычыны прынцыповай аметрычнасці і рытмічнай нестабільнасці напеваў галашэнняў метрарытмічныя абазначэнні ўсюды апушчаны. Значэнні ММ дадзены прыблізна.

Тактавая рыса выкарыстоўваецца як умоўны знак, які вызначае музычна-паэтычныя сінтаксічныя адзінкі галашэнняў.

У круглых дужках пададзены дадатковыя галосныя пры агаласоўцы зычных, а таксама склады, якія прапяваюцца на прыблізнай або няпэўнай вышыні; у квадратных — склады, якія не прамаўляюцца.

Працягласць ферматаў абазначана лічбамі.

У натацыях прынятыя таксама наступныя ўмоўныя абазначэнні:

 — гук прыблізнай вышыні

 — гук няпэўнай вышыні

↓ ↑ — паніжэнне і павышэнне гуку менш, чым на паўтон

| ¦ || — заканчэнне музычна-паэтычнага радка і тырады

// \\ — глісанда ўверх і ўніз

∪ ∩ — невялікае ўкарачэнне і зацягванне гуку

$>$ — акцэнт

V — знак дыхання

*Т. Б. ВАРФАЛАМЕЕВА*

# ПАХАВАЛЬНЫЯ
# І ПАМІНАЛЬНЫЯ АБРАДЫ



# I. Пахавальныя звычаі на Беларусі ў XVI ст.

Чалавека, які развітаўся з гэтым жыццём, кладуць голага на стол і цэлую гадзіну мыюць цёплай вадой. Гэта робіцца толькі ноччу. Абмыўшы нябожчыка, укладваюць яго на пасцель пасярод хаты, каб яму як галаве сям'і нават мёртваму выказаць пашану. І яго баяцца, пакуль жывуць у гэтым жытле. Я сам усё гэта неаднаразова бачыў і дранцвеў, валасы ўставалі дыбам, не мог вымавіць ні слова. Нябожчыка выносяць на трэці дзень. Спераду ў пэўным парадку ідуць паслушнікі. Яны цягнуць жалобную песню, сэнс якой зводзіцца да наступнага: «Глядзіце, людзі, на гэтага нябожчыка і асцерагайцеся. І мы ўсе так пойдзем, і вы пойдзеце, і яны пойдуць». За тымі, хто нясе труну, ідуць тры свяшчэннікі. Сярэдні абкурвае навокал кадзілам. Лічыцца, што чад ад яго настолькі не падабаецца злым духам, што тыя бягуць прэч, нібы ад знаку святога крыжа. Калі наближаюцца да месца пахавання, пахавальныя насілы ставяць на зямлю. Жанчыны, што збіраюцца плакаць, спецыяльна рыхтуюць свае вочы, з лямантам падбягаюць да труны, якую на гэты час адкрываюць. Яны цалуюць нябожчыка і звяртаюцца да яго: «О, дарагі, чаму ты ідзеш з нашых вачэй? Хіба не было чаго табе есці і піць? Хіба ты склаў галаву з-за благой жонкі? Скажы нам, чаго ты пакінуў сваю жонку і няшчасных дзетак і не глядзіш на гэты ясны свет, на сваё дабро, на сваіх сяброў». Аднак слушна тут кажуць: глухому расказваць казкі. У гэты момант падыходзіць свяшчэннік і адсоўвае плакальшчыц ад труны і просіць бога мёртвых, каб ён ні ў чым не замінаў нябожчыку і беспярашкодна дазволіў яму адысці да таго месца шчаслівых душ, куды яшчэ раней адышлі яго продкі; каб ён лёгка мог здзейсніць такі доўгі і не зусім бяспечны шлях. Усё каштоўнае, што ён меў за ўсё жыццё з прадметаў хатняга ўжытку, кладуць у труну. А яшчэ раней адышоўшаму гаспадару абувалі новыя боты і апраналі яго ў новае адзенне. Нябожчыку таксама падкладваюць падушку, напоўненую сухой зямлёй. Калі свяшчэннік заканчвае пахавальную прамову, жонка нябожчыка зноў падбягае з крыкам

і лямантам і звяртаецца да мужа, як да жывога. Яе плач падтрымліваюць спевамі малітваў свяшчэннікі і пеўчыя, трацячы на гэта яшчэ паўтары гадзіны. Затым прыносяць сярэбраны крыж і ставяць на труну. Памёршага просяць, каб, сустрэўшыся з нябеснымі душамі, ён не забываў сваю радню, каб на небе ўвесь час маліўся за яе. Яго просяць таксама, каб перш-наперш ён дагадзіў святому Міколе. Бо той бог — заступнік усіх рускіх. Затым труну апускаюць у яму. Свяшчэннік кідае на труну столькі сухой зямлі, колькі можа ўзяць рукой. Астатнія закопваюць нябожчыка. Такім чынам ачышчальныя таінствы набліжаюцца да канца.

У гэты ж дзень робіцца даволі шчодры і багаты абед. На яго запрашаюцца хрысціяне (так яны называюць жабракоў), паколькі ў іх больш часу, каб маліцца багам за памёршага. Запрашаюць таксама свяшчэннікаў і ўсіх блізкіх сваякоў. Паколькі і мне аказваецца такі гонар, я, вядома, іду да іх, галоўным чынам з той мэтай, каб лепш паназіраць за іх норавамі і звычаямі.

Яны прымаюць кожнага, ласкава цалуюць, саджаюць за стол згодна яго вартасці. Тут я хачу... нагадаць, што ўсе рускія ўшаноўваюць святога Міколу, як бога. Яго абразы сустрэнеш у кожным доме. Тым, што сабраліся за сталом, прыносяць запаленую свечку, пасвянцаную Мікалаю. Яму старанна моляцца за здароўе і шчасце памёршага сябра. Затым ставіцца сярэбраная чаша, у якую насыпана пшаніца і наліта мядовае віно.

Кожны, узяўшы лыжачку, у адзін голас жадае сваякам памёршага ва ўсім багацця, а ўнукам — дабра ў хаце. Затым пускаюць па кругу келіх [...] Калі пастаўлены стравы, старэйшы са свяшчэннікаў зноў курыць памногу фіміам і выганяе з дому злых духаў [...] Найбольш багатыя ў пятніцу раздаюць міласціну — толькі маленькі кавалачак простага хлеба.

## II. Пахаванне і памінкі

...Калі ў хворага пачынаецца перадсмяротная агонія, родныя пасылаюць за *мерцвячыхамі*, г. зн. за старымі жанчынамі, якія даглядаюць хворых у апошнія хвіліны іх жыцця і потым мыюць і апранаюць нябожчыкаў *. Гэтыя старыя, заўважыўшы аслабленне хворага, здымаюць яго з пасцелі і кладуць на падлогу на голай саломе, нягледзячы нават на зіму, на самы моцны мароз.

---

* *Мерцвячыхі* ў некаторых сёлах беларускага краю складаюць асобны клас людзей: яны жывуць у канцы вёскі і харчуюцца, збіраючы хлеб і грошы падчас пахавання. Ім прыпісваюць уласцівасці чараўніц і баяцца іх зняважыць...

Дарэмна ім кажуць, што, здымаючы хворага з цёплай пасцелі і кладучы яго на халодную салому, паскараюць яго смерць,— яны ўсё ж робяць сваё; мала таго, часта нават сам хворы, прадчуваючы свае апошнія хвіліны, адразу ж загадвае сваім родным перанесці яго на падлогу. Здаралася, што разумныя памешчыкі стараліся растлумачыць сваім сялянам шкодныя вынікі такога дзіўнага звычаю, але добры намер на гэты раз сустракаў пярэчанне ў саміх хворых. «Дайце пакой, панок,— заўважаў хворы.— Так паміраў мой бацька і мне так казаў». Вось які адказ у селяніна! [...]

Варта адзначыць, што ў той час, калі паміраючаму даюць у рукі свечку, мерцвячыхі расчыняюць усе дзверы ў доме і вароты ў хлявах: кажуць, гэта робіцца для таго, каб паміраючаму лягчэй было канаць. У гэты час забараняецца ў хаце паміраючага штонебудзь гатаваць, і нават, калі выпадкова паліцца ў печы ці тлее ў попеле гарачае вуголле, тушаць агонь, а вуголле заліваюць вадой.

Як толькі хворы памрэ, мерцвячыхі зараз жа паляць печы і раскладаюць вялікі агонь, часткова на падставе нейкага павер'я, часткова, каб нагрэць ваду, якой яны павінны мыць нябожчыка. Ваду грэюць з дадаткам розных траў, якія таксама маюць нейкае значэнне; найбольш вядомымі і агульнаўжывальнымі травамі дзеля гэтага лічацца: рута, барвенак, беліца, расходнік, папараць, казялец і жабіна лапка. Абмыўшы цела, кладуць яго на той жа саломе, на якой памёр хворы, і, акрыўшы яго саломай ці сенам, пакідаюць так да таго часу, пакуль не змайструюць труну. Труну робяць з новых дошак, а не старых і наогул не з такіх, якія ўжо былі прызначаны для нейкага ўжывання. Майстраванне труны і капанне магілы з'яўляюцца прадметам безлічных абрадаў. Так, напрыклад, труну няможна рабіць у тым доме, дзе ёсць чорны певень ці сівая карова; не можа таксама рабіць труну ўдавец ці бяздзетны сем'янін. Трэскі і ўсе стружкі, што засталіся пасля таго, як труна зроблена, кладуць у труну, аднак не тыя, хто рабіў яе, а мерцвячыхі. Барані божа, пакінуць хоць адну трэску ў доме: гэта значыць прарочыць смерць каму-небудзь з тых, хто ў ім жыве. Зрабіўшы труну, работнік нясе яе як мага хутчэй, каб не сустрэцца з кім-небудзь; у выпадку сустрэчы работнік ні з кім не вітаецца і ні слова не гаворыць, асцерагаючыся, што ў падобным выпадку пашкодзіць сабе ці таму, з кім загаворыць. Цікава, што пры сустрэчы з цяжарнай жанчынай работнік кідае труну на зямлю і прымушае гэту жанчыну тры разы абысці задам вакол труны. Магілу капаюць старыя ці большай часткаю жабракі бясплатна; капаючы, пазбягаюць гаварыць пра нябожчыка,

для якога рыхтуецца магіла. Пры капанні магілы не можа прысутнічаць жонка нябожчыка ці нейкая іншая жанчына, якая нядаўна страціла мужа ці хоць каго з родных. Выкапаўшы магілу, далакопы паведамляюць мерцвячыхам, і тыя з'яўляюцца з вадой, якой абмывалі цела нябожчыка: гэту ваду льюць ці ў магілу, ці толькі акрапляюць яе.

Калі нябожчык быў халасты, на яго труну кладуць вянок з руты, а калі жанаты ці ўдавец, то з папараці. Акрамя таго, у труну часам ставяць гарэлку, бліны ці кашу, таксама амаль заўсёды кладуць грошы і, здараецца, некаторыя прылады хатняга ўжытку, напрыкл. нож, сякеру ці серп. Відаць, гэта сведчыць пра тое, што ў беларускім народзе захаваўся звычай продкаў нашых рускіх славян забяспечваць нябожчыка ўсімі гэтымі прадметамі ў выніку веры ў замагільнае жыццё: такая вера іх яшчэ ясней выявілася ў звычаі *памінаць дзядоў* і адбываць трызны на магілах родных — і наогул блізкіх сэрцу,— у звычаі, які, што мы ўбачым ніжэй, з вялікімі абраднасцямі захоўваецца ў Беларусі ў цяперашні час.

На нябожчыка ніколі не надзяваюць той адзежы, якую ён насіў пры жыцці, наадварот, яе ў большасці выпадкаў закопваюць у зямлю ці спальваюць, асабліва калі нябожчык памёр ад якой-небудзь заразнай хваробы. На гэты выпадак робяць з новага белага, ніколі не мытага палатна нейкі саван у выглядзе доўгай кашулі з шырокімі рукавамі, які называюць *зглішчам* (г. зн. наканаванай для сатлення адзежай); саван гэты такі доўгі, што ён акрывае ногі, якія ў сваю чаргу ўкручваюцца ў невялікія полкі. На галаву надзяваюць шапачку таксама з новага палатна; рукавы ля кісці рукі перавязваюць чырвонай жычкай. На грудзі кладуць невялікі абразок, а за пазуху нешта накшталт хусткі, у якую загортваюць дробныя манеты. Калі ў нябожчыка не закрываюцца вочы ці вусны, тады іх прыкрываюць меднымі грашыма ці халоднымі вуглямі, якія застаюцца ў труне да самага адпахавання; калі апускаюць цела ў магілу, грошы здымаюць і аддаюць старцам; вуглі забіраюць мерцвячыхі, якія ператвараюць іх у прадмет сваіх чар. Гэтымі вуглямі, кажуць, мерцвячыхі *загаворваюць* ведзьмаў і перашкаджаюць ім *абарачацца* ў розных жывёл; дзеля гэтага мерцвячыхі таўкуць вуглі на парашок і сыплюць іх на скрыжаваннях дарог: прайшоўшы па гэтым парашку, ведзьмы губляюць усякую сілу чарадзейства і падначальваюцца ўладзе мерцвячых, якіх таксама ў некаторых вёсках лічаць *вядзьмаркамі*. Калі ў нябожчыка паявіцца з носа ці з рота так званая *рапа*, то яе стараюцца абцерці родныя, але не даюць абціраць мерцвячыхам, нібыта таму, што яны з яе робяць нейкае

чарадзейнае рэчыва, якое можа шкодзіць людзям, з якімі не ў ласцы ці пасварыўшыся.

Нягледзячы на тое што ўжо нябожчык пакладзены ў труну, усё ж такі не чапаюць саломы, на якой ён ляжаў, да таго часу, пакуль цела яго знаходзіцца ў пакоі. У некаторых мясцовасцях труну ставяць на спецыяльна ўладкаванай калодзе; звычайна ж— на лаве і рэдка на стале. Калі ж цела вынесуць з пакоя, у гэты час мерцвячыхі спяшаюцца спаліць салому, каб паспець прысутнічаць на самім пахаванні. Калі паляць салому (на двары), глядзяць, куды, у які бок, ідзе дым, і на падставе гэтага гадаюць, у якім месцы вёскі спасцігне каго-небудзь смерць. Труну галоўным чынам вязуць, вельмі рэдка нясуць, нават калі б могілкі былі б на самай блізкай адлегласці ад вёскі. Калі труну выносяць з хаты, асцярожна тушаць свечкі, асцерагаючыся скінуць ці зламаць іх; у адваротным выпадку пойдуць перасуды, што зноў памрэ хто-небудзь у гэтым самым доме. Калі вынесуць цела на двор, усе прысутныя і пераважна родныя кідаюць па жмені жыта ці пшаніцы на труну; пры гэтым сочаць, каб не падбіралі зерне хатнія птушкі, і таму следам за вынасам з двара труны рассыпанае жыта ці пшаніцу змятаюць і потым кідаюць у магілу. Калі вязуць труну праз вёску, то пазбягаюць сустрэчы з цяжарнай жанчынай ці з людзьмі, што вязуць салому ці сена: дзеля гэтага пасылаюць каго-небудзь наперад і ў выпадку такой сустрэчы прымушаюць жанчыну і праезджых збочыць куды-небудзь у двор ці ў супрацьлеглы шлях.

За труною, акрамя родных і блізкіх, заўсёды ідуць старцы, якія абавязаны несці *куццю* або *канун*, а таксама піва і розныя стравы, якія складаюцца з пірагоў і бліноў. Усё гэта ядуць на магіле, адразу ж, як апусцяць туды цела. Што застанецца, тое старцы забіраюць з сабой.

Калі апусцяць труну ў магілу, а родныя нябожчыка кінуць у яе па жмені зямлі, далакопы кідаюць туды ж усе рэшткі палатна, з якога шыюць саван, а таксама іголкі і ніткі. Асабліва памятаюць на гэты раз пра іголкі, таму што, кажуць, гэтыя іголкі, якія называюць *мярцвіцамі*, у руках чарадзеяў і знахароў могуць прынесці шмат бяды тым, на каго яны злуюць. Пры дапамозе гэтых іголак чарадзеі могуць наслаць на людзей самыя цяжкія хваробы, асабліва слепату і трасцу. Кажуць, нібыта знахары гэтымі іголкамі выкопваюць з зямлі *жаб-рапух* і, пасушыўшы іх, робяць парашок, які ад нязначнага дакранання да яго непрыкметна сушыць чалавека і даводзіць да вар'яцтва.

Пасля пахавання жонка нябожчыка ці муж нябожчыцы пераходзяць на некалькі дзён у чужы дом і там хаваюцца ад позіркаў

сваіх родных: у гэтым нібыта заключаецца жалоба. Здараецца, што гэтая жалоба можа цягнуцца цэлы тыдзень, і толькі настойлівыя просьбы родных ці блізкіх знаёмых могуць пераканаць няшчасных вярнуцца ў свой дом, дзе асірацелая сям'я мае патрэбу ў іх дапамозе. Аднак на працягу ўсёй жалобы не ходзяць на магілу памёршых нядаўна: для гэтага прызначаны сёмы дзень, у які адбываецца асобны абрад, вядомы пад назваю *прыкладзін* і *галашэння*. Але перш чым сказаць пра гэта, раскажам пра пахаванне неахрышчаных дзяцей і самазабойцаў.

Падобныя выпадкі, асабліва самазабойствы, вельмі рэдка здараюцца на Беларусі, і таму яны пазначаны асаблівымі абрадамі, якія характарызуюць непрыемныя пачуцці народнага шкадавання па першых ** і агіды да апошніх падзей. Калі дзіця нарадзіцца нежывое, яго захінаюць у салому і хаваюць дзе-небудзь у кутку сада, агарода і часцей за ўсё на гумнішчы: пры гэтым на нованасыпанай магіле немаўляці распальваюць маленькае вогнішча з *асінавага* голля і гавораць нейкія замовы, якія, на жаль, захоўваюць у тайне знахары і знахаркі і таму не магу пазнаёміць з імі чытача. Калі ж дзіця жыве некалькі гадзін або два ці тры дні і памірае ў выніку пэўных абставін, без хрышчэння, то яго хаваюць за агароджаю могільніка і замест крыжа ставяць просты камень, ці, у некаторых вёсках, трохкутнік з *асінавага* дрэва: у падобным выпадку маці павінна трымаць тыдзень пост і спавядацца. Што ж датычыцца самазабойцаў, то іх хаваюць без абмывання і абкурвання ў той жа адзежыне, у якой яны пазбавілі сябе жыцця. Іх не праводзяць старцы, а толькі некаторыя родныя і мерцвячыхі; нават жонкам і мужам іх забараняецца прысутнічаць пры апусканні труны ў магілу. Характэрна, што труна для самазабойцаў робіцца з асінавага дрэва; акрамя таго, на твар самазабойцы кладуць *асінавыя* трэскі, а калі апусцяць труну у магілу, мерцвячыхі кідаюць на яе попел і халодныя вуглі. Закапаўшы магілу, насыпаюць на ёй вялікі ўзгорак ці курган і навальваюць каменне. У дадатак да сказанага, у будучым кожны прахожы лічыць абавязкам кінуць на гэты курган хаця б маленькі каменьчык. Магілы для самазабойцаў выбіраюцца на скрыжаваннях ці на ўзвышшах у лесе, якія звычайна расчышчаюцца затым, каб іх было відаць здалёк для кожнага, хто б ні праходзіў ці не праязджаў. У некаторых мясцовасцях, напрыклад у Віцебскай губерні, на вяршыні кургана садзяць асінавае дрэва, і калі яно вырасце вялікае, вешаюць на ім забітых крумкачоў, соў, жаб

** Таму што гэтыя выпадкі здараюцца міжволі, асабліва *заспанне* ці *прыспанне* дзяцей: нават нібыта ў апраўданне мацярок кажуць, быццам ведзьмы і чараўніцы насылаюць на іх такі цяжкі сон.

і змей: усё гэта з'яўляецца прадметам чараў ведзьмароў, якія нібыта збіраюцца на гэтых курганах і спраўляюць там па-свойму трызны па самазабойцах... Затое на магілах самазабойцаў у Беларусі не робіцца ні памінак, ні галашэння, ні прыкладзін. Усе гэтыя абраднасці адбываюцца толькі на магілах нябожчыкаў ***, памёршых звычайнай смерцю.

Калі ж іменна праводзяцца гэтыя абраднасці і чым яны характэрныя?

Перш за ўсё робяцца *прыкладзіны*, на сёмы дзень пасля пахавання нябожчыка. Абрад гэты дакладна выконваецца роднымі памёршага ці памёршай. Муж, жонка, бацька, сын, маці або дачка, або ўнук і ўнучка абавязаны з'явіцца на сёмы дзень на магілу роднага свайго і пакласці камень ці дошку з якім-небудзь знакам: гэта робіцца затым, каб, адзначыўшы магілу, потым можна было знайсці яе для тагѣ, каб паставіць на ёй крыж з дрэва ці камень; такім чынам прыкладзіны замяняюць *устаноўку асновы* помніка. У час прыкладзін не могуць прысутнічаць староннія; і калі прыкладзіны робіць жанчына, у такім выпадку непазбежны абрад *галашэння*, які мае характар цалкам беларускай народнай сентыментальнасці. Галашэнне азначае ўзмоцненае рыданне з перарывістымі прамовамі, менавіта прамовамі, таму што галашэнне заключаецца ў тым, што жанчына на магіле блізкага, любімага ёю чалавека прамаўляе ў гонар нябожчыка амаль што сапраўдны панегірык, у якім... расказвае пра ўсё мінулае яго жыццё, пералічвае яго дабрачыннасці, апісвае няшчаснае сваё становішча, выражае свой горкі сум з-за таго, што не магла памерці разам з ім і такім чынам ніколі не разлучацца са сваім мілым; нарэшце, просіць прабачэння ў нябожчыка за абразы і крыўды, якія яна яму прыносіла пры жыцці. Усё гэта выгаворвае яна з рыданнямі і крыкам нараспеў і надзвычай жаласліва; такім чынам, слухаючы збоку, міжволі праслязішся і пашкадуеш бедную ўдаву ці сірату. І трэба заўважыць, што хаця гэты звычай мае характар абраду, але большай часткаю ён адбываецца ў выніку сапраўднага жалю і непрытворнага шкадавання як неабходнага выканання звычаю дзядоў і прадзедаў [...]

Пасля галашэння пакідаюць на магіле куццю, у некаторых мясцовасцях яе закопваюць у зямлю ля ўзгалоўя нябожчыка. Гэтым беларусы даказваюць, што ў іх продкаў была вера ў замагільнае жыццё. Толькі жыццё гэта яны ўяўлялі па-свойму, ім здавалася, што нябожчыкі маюць патрэбу ў страве, адзежы,

*** Цікава, што беларускі народ не называе самазабойцаў *пакойнікамі*: ён прыдумаў для іх іншую назву: *загубак*, г. зн. той, хто сам наўмысна загубіў сябе, і таму душа яго не знойдзе спакою на тым свеце.

грашах і г. д. Ва ўсякім выпадку гэтым тлумачацца даволі светлыя разуменні старажытных рускіх славян пра новае замагільнае жыццё. Забяспечваючы нябожчыкаў рознымі рэчамі, яны выказвалі пры гэтым любоў да сваіх памёршых і памяць пра іх. Памяць гэту яны асабліва выявілі ў так званых *трызнах*, якія захаваліся ў паданні цяперашняга беларускага народа пад назваю *дзядоў* ці памінак. Звычай гэты ўшаноўваць памяць памёршых дае права нам уяўляць сабе характар нашых продкаў з самага светлага боку. Звычай жа гэты, які захаваўся ў беларускага народа, надае яму пачэснае месца ў шэрагу іншых плямёнаў, якія насяляюць зямны шар. [...]

...Дзяды святкуюцца ў хатах і праходзяць без слёз і наогул без суму, таму што ў гэты дзень памінаецца нібыта ўвесь род чалавечы, якога ўжо няма на гэтым свеце; і ў той жа час зусім іначай адбываецца абрад так званай *радаўніцы* ****.

Радаўніца адбываецца ў аўторак на фаміным тыдні, раніцай, нават са світанкам, пад акрытым небам, на могілках, якія ў гэты час прымаюць выгляд страшэннага відовішча: да якой магілы не павярніся, усюды чуеш дзіўны плач і рыданні, паўсюль бачыш сумныя твары і журботны выраз на іх. І нядзіўна: не адна маці аплаквае нядаўна пахаванага сына, апошнюю апору і надзею сям'і, не ў аднае дзяўчыны разрываецца сэрца на часткі пры выглядзе свежай магілы жаніха! Не адзін мужык бядуе, страціўшы мілую жонку! Не адна дачка несуцешна рыдае над магілаю бацькі, што асіраціў яе і са стратай якога яна пазбавілася ўсяго, таму што даўно ўжо страціла маці; і колькі такіх кранальных сцэн! І ўсе гэтыя сцэны вельмі-вельмі працяглыя! Плач, стогны і рыданні напаўняюць сумнае і без таго паднябессе могілак да самага паўдня. Але нарэшце патроху заціхае плач і надыходзіць магільная цішыня. Пачынаюць розныя абраднасці. Качаюць пафарбаваныя яйкі на магілах і потым аддаюць іх старцам; затым

**** Многія выводзяць паходжанне слова *радаўніца* ад дзеяслова *радавацца* ці ад *Род, Рожаніца*. Але першае значэнне не мае ніякай сувязі з журботным абрадам, другое патрабуе доказаў: ці было божышча «Род і Рожаніца», ці мелі яны ўздзеянне на памёршых і ў каго са славянскіх плямёнаў захаваліся паданні пра гэтых божышчаў? Мне здаецца, *радаўніца* паходзіць ад слова «рада», «радзіць». І сапраўды, у беларускіх галашэннях у дзень радаўніцы жывыя раяцца з мёртвымі, просяць у іх рады, як жыць, што рабіць; акрамя таго, у казках і песнях не толькі беларускіх, але велікарускіх і наогул славянскіх вельмі часта ўпамінаецца, што сын прыходзіць на магілу бацькі, каб пабачыць яго цень і пагутарыць з ім, а больш за ўсё, каб папрасіць у яго парады, як яму быць у пэўным выпадку. І ўвогуле існуе на Беларусі павер'е, што хто раней за ўсіх з'явіцца на магілкі ў дзень радаўніцы, той пачуе ад родных нябожчыкаў надзвычай важную параду, як здабыць у зямлі скарб.

акрываюць магілы абрусамі, ставяць стравы і, пакаштаваўшы чаго-небудзь, усё астатняе пакідаюць старцам *****. Пачынаючы есці, абліваюць магілы рознымі настоямі з духмяных траў, затым звяртаюцца да памёршых з наступнымі словамі: «Мілыя радзіцелі! Хадзіце к нам есці, што бог даў!» Пад'еўшы, пачынаюць развітвацца з нябожчыкамі, прыгаворваючы: «Нашы радзіцелі! Выбачайце, не дзівіцеся, чым хата багата, тым і рада». Тут гучаць розныя галашэнні, у якіх жадаюць мёртвым родным *здароўя*, моляць бога, каб зямля не душыла іх там і не заглушала іх пачуццяў да сваіх блізкіх.

У гэты дзень вельмі часта ставяць на магілах крыжы, камяні ці проста нешта накшталт труны з дрэва з рознымі выразанымі дэталямі: галавы, рукі, нагі (апошнія выразаюцца тады, калі ў каго-небудзь з жывых родных баляць названыя члены). Гэта робіцца, па словах народа, для таго, каб нябожчыкі вымалілі ў бога здароўя ці выздараўлення хворых частак цела: тут зноў відаць, як жывыя нібыта раяцца, вядуць перагаворы з мёртвымі — новае пацвярджэнне таго, што слова «радаўніца» можна выводзіць ад «*рада*» ці «*радзіць*»...

Вяртаючыся дадому, сваякі памёршых стараюцца не азірацца назад: у адваротным выпадку, кажуць, нябожчыку зробіцца цяжка — зямля прыцісне яго.

***** Цікава, што колькасць страў павінна быць цотная; самыя стравы рыхтуюцца для гэтага выпадку больш густыя, а не вадкія.

## III. Пахавальны абрад у Брадзецкай вол. Ігуменскага п.

Паміраючаму, як і паўсюль у нашай мясцовасці, па спрадвечнаму звычаю даюць у рукі васковую свечку, асвячоную ў царкве на грамніцы, і ўсе сваякі абодвух полаў збіраюцца ў хату нябожчыка, каб падзяліць з членамі яго сям'і напаткаўшае іх гора. Пачынаюцца галашэнні з прыгаворамі.

Праз некаторы час, калі стане відавочна, што ў чалавеку няма ніякай прыкметы жыцця, свечку вымаюць з яго рук і ставяць на покуці ў падсвечнік; калі ж яго няма, насыпаюць у якую-небудзь пасудзіну жытнёвае зерне і ставяць яе туды *. У гэты час адна з запрошаных суседак пачынае паліць у печы, грэе ваду для абмывання цела нябожчыка і варыць абед — скаромны ці посны,

* У с. Навасёлкі таго ж павета запаленую свечку проста ставяць у пасудзіну з жытнёвым зернем, пастаўленую на куце ў галовах нябожчыка.— З запісаў вучня Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі І. Сіроткі.

гледзячы па тым, у які дзень тыдня здарылася смерць. Нагрэтую ваду наліваюць у новыя ночвы, і суседзі ці знаёмыя (але ні ў якім разе не сваякі), загадзя запрошаныя з гэтай мэтай, пачынаюць абмываць цела нябожчыка. Жанчыну абмываюць жанчыны, мужчыну — мужчыны **. Пасля абмывання нябожчыка апранюць у чыстую адзежу і кладуць на покуці. У гэты самы момант выступае плакальшчыца, і пачынаецца галашэнне, ад якога разрываецца душа. Плача яна да стомы, да знямогі, пакуль яе не заменіць другая. Амаль усе прысутныя, расчуленыя плакальшчыцамі, плачуць паціху. Праз некаторы час да плакальшчыцы-сваячкі памёршага падыходзяць іншыя жанчыны і пачынаюць яе ўгаворваць, каб не мучыла сябе, перастала б плакаць: «Дакуль табе плакаць, яшчэ наплачашся!» І з гэтымі словамі адводзяць яе ад нябожчыка, труп якога застаецца на месцы на працягу сутак. Усю ноч напярэдадні пахавання прысутныя ў доме праводзяць без сна да самае раніцы. Мясцовы псаломшчык ці хто-небудзь з пісьменных сялян чытае над нябожчыкам псалтыр [...] Як толькі надыдзе дзень, запрашаюць свяшчэнніка. Ён служыць паніхіду, пасля якой цела кладуць у труну. На галаву нябожчыку надзяваюць новую шапку, а ў рукі даюць яму хусцінку затым, як кажуць, каб ён на тым свеце не сустрэўся з нябожчыкамі з голай галавой і рукамі. Хто пры жыцці курыў тытунь, таму ў труну кладуць люльку ці табакерку, калі любіў нюхаць тытунь, часта таксама грошы, каб купіць сабе на могілках месца між нябожчыкамі, каб тыя яго не турбавалі. Некалькі чалавек бяруць труну і выносяць яе з хаты, а адна са сваячак нябожчыка ў гэты час насыпае ў пасудзіну жытнёвае зерне і кідае жменю ўслед нябожчыку для таго, каб ён і пасля смерці сваёй не пазбаўляў жывых сваякоў надзённага хлеба. Гэта яна робіць да таго часу, пакуль памёршага не панясуць за вароты з двара. Высыпаўшы апошнія зерні з пасудзіны, яна разбівае яе аб вугал хаты.

** У с. Навасёлкі абмыванне нябожчыка заўсёды робіцца пажылымі жанчынамі...— Там жа.

## IV. Пахавальны абрад у Ігуменскім п.

Як вынясуць нябожчыка з дому, месца яго абсыпаюць аўсом, у які ставяць васковую свечку. Пасля адпявання нябожчыка згодна з царкоўным абрадам цела яго апускаюць у магілу з прадметамі, асабліва паважанымі і любімымі пры жыцці нябожчыкамі. Калі, напрыклад, ён быў майстар плесці лапці, дык аба-

вязкова туды кладуць заплецены лапаць з пічыкам і спіцамі, калі цясляр, ці які-небудзь раменік, дык сякеру, долата, скоблю, пілу і інш. Акрамя гэтых рэчаў з кожным нябожчыкам кладуць у труну: хлеб-соль, яйкі на яечню, арэхі, піва і гарэлку ў пляшцы, таксама як і люльку з тытунём і крэсівам або табакерку з тытунём. Гаспадар дома, з якога вынеслі нябожчыка, ідучы з могілак у дом свой наперадзе ўсіх, бярэ згаданую вышэй свячу, стукае ёю крыж-накрыж у верхні вушак дзвярэй, што вядуць у сенцы, і кідае свечку ад сябе наводмаш. Потым сялянкі збіраюць авёс, якім было абсыпана месца, дзе ляжаў нябожчык, у асобную пасудзіну і ссыпаюць туды, дзе ніхто не хадзіў. Заходзячы ў хату, адна са старэйшых жанчын бярэ акраец хлеба, паварочваецца да дзвярэй і, скрабучы медны грош, гаворыць наступныя словы, якія ўключаюць нябожчыка ў агульны спіс яе памёршых родных: «Дзяды, бабулькі, бацькі, матулькі, дзядзюхны, цётухны, прымеце к сабе памёршага нашага бацюхну (калі памёр бацька) і жывіце тамакі з ім добра, не спорцеся і інш.» Затым пачынаецца частаванне.

## V. Пахаванне ў в. Паставічы Старадарожскага р.

Чалавек памірае. Адразу ж ставяць свечку. Памыюць, адзенуць. Ваду, у якой мылі нябожчыка, выліваюць на прызбу, а начоўкі пераварочваюць. Той, хто мыў нябожчыка, мые і адзенне і вывешвае сушыць там, дзе сонца не свеціць.

Як толькі нябожчыка кладуць у труну, то на тую лаву, дзе ён ляжаў дагэтуль, садзіцца ўся радня, каб хутчэй забыцца пра памёршага.

Дол капаюць у дзень пахавання. Капаюць звычайна людзі не з кола радні. Далакопам даюць ручнікі. Як толькі выносяць нябожчыка з хаты, то наперадзе дарогу пасыпаюць жытам. Перш чым апускаць, у яму кідаюць грошы.

У дзень пахавання даюць жалобны хлеб. Раней запрашалі бацюшку. Запальвалі свечкі. Ставяць стравы: крупнік, мяса, капусту, кануну, кашу. Кожнай стравы бяруць па тры лыжкі. Найбольш абавязковай стравай з'яўляюцца жалейкі. Іх, маленечкія посныя булачкі, разам з вадой каштуюць па тры разы.

Пасля ўсіх страў прысутныя дзякуюць гаспадарам дома за жалобны хлеб.

Назаўтра ідуць пабуджаць нябожчыка на магілу. Абавязкова нясуць жалейкі і віно. Таксама тры разы п'юць і ядуць жалейкі. Усё, што застаецца, сваякі разліваюць па тры лыжкі на магілу

сваяка і суседнія магілы і прыгаворваюць: «Мы на гэтым свеце частуем, а вы нас на тым пачастуеце».

Рытуал хаджэння на магілу з жалейкамі бывае ў сорак дзён, паўгодкі і гадавы.

## VI. Пахавальны абрад у м. Верасніца Мазырскага п.

Памёршага абмываюць і апранаюць як след і затым кладуць на лаўцы пад абразы (на покуць). Боты абуваюць нябожчыку без падкоў і жалезных цвікоў. У левую руку ставяць яму васковую свечку, правую пакідаюць свабоднаю для хрышчэння. Калі нябожчык яшчэ ў маладых гадах, дык, кладучы яго ў труну, яму развязваюць каўнер кашулі для таго, каб удавец ці ўдава, што засталіся пасля іх, хутчэй маглі зноў узяць шлюб. Калі нябожчыка выносяць з хаты, тады адна баба становіцца ля дзвярэй каля печы, а другая — з адваротнага боку за дзвярыма, у сенцах, і як толькі труну пранясуць у дзверы, дык баба, што стаіць у сенцах, перадае праз труну хлеб-соль той, якая стаіць ля печы, гэта азначае: нябожчык з хаты, а хлеб-соль у хату. Такі звычай у нас паўсюдны.

У маёй парафіі нябожчыка вязуць на могілкі не інакш, як на возе, запрэжаным параю валоў.

Калі нябожчыка вынесуць з хаты, бабы, што застаюцца там, адразу ж пачынаюць чысціць яе, мыць лаўку, на якой ляжаў нябожчык, і затым абсыпаюць усю хату знутры жытам і хмелем.

Перш чым апусцяць труну ў магілу, кідаюць туды капейку; гэта значыць, каб ён купіў сабе месца. У некаторых мясцінах кладуць таксама ў труну нябожчыку адну змену чыстай бялізны.

На наступны дзень некаторыя з родных нябожчыка ідуць на магілу будзіць яго, пасля чаго просяць пазваніць па нябожчыку.

## VII. Пахаванне ў в. Суражы

...На пахаванні дзяўчыны 15—20 гадоў: «Паставіўшы цела на двары, даюць, нібыта на вяселлі, дарункі блізкім сваякам па кавалку палатна 2 ці 3 аршына бацькі памёршай. Калі ж на кані вязуць цела, на дугу прывязваюць чырвоны пояс ці стужку квяцістую, труну апяразваюць чырвоным поясам ці хусткаю, і тым, хто ідзе хаваць памёршую, бацькі раздаюць паясы простай работы, рознакаляровыя, шырынёю ў два пальцы, вытканыя памёршай, у знак таго, што яна сваё вяселле ўжо згуляла. І пасля звычайным чынам цела аддаецца магіле».

## VIII. Хаўтуры

У праваслаўных сялян, калі заўважаць, што хворы блізкі да смерці, адразу ж апранаюць яго ў чыстую бялізну, пераносяць яго з ложка на лаву, кладуць галавою да бажніцы, запальваюць перад абразом свечку, і ўся сям'я збіраецца ля хворага і стаіць перад ім, хрысцячыся і кланяючыся, чакаючы, калі той памрэ. З надыходам смерці маці, жонка, дзеці і сваякі жаночага полу, стоячы над памёршым, галосяць на ўвесь голас, пляскаючы рукамі і прыгаворваючы, што каму прыйдзе ў галаву. Так, напрыклад, дачка па бацьках галосіць: «Мой татанька...» ці «Мая маманька-карміліца! Кінула мяне сірацінушку і беззаступную, і горкую». Жонка па мужу: «Салавейка мой карміле̃ц, ягадка мая наліўная! Асталася я адна з сіроткамі! Не к каму мне будзе прышатнуцца, не з кім мне будзе пабаіць». Таксама галосяць і іншыя сваячкі, што жывуць у сям'і, і жанчыны, якія прыйшлі з іншых хат і вёсак. Між тым шлюць у царкву грошы званіць па нябожчыку, рыхтуюць ваду і, неадкладна абмыўшы труп, надзяваюць на памёршага кашулю, порткі і балахон, на галаву — каўпак, а ногі абуваюць у пашытыя са старой бялізны панчохі і лапці. У такім выглядзе кладуць памёршага зноў перад бажніцай, запаліўшы перад абразом свечку. Калі труна зроблена, кладуць у яе памёршага і пераносяць у сенцы, дзе ставяць на лавах ці на які-небудзь насціл, галавою да хаты, а над галавою вешаюць на сцяне абраз і запальваюць перад ім свечку. У сялян больш заможных дзячок чытае псалтыр удзень і ўночы, пакуль не з'явіцца свяшчэннік.

Калі свяшчэннік адспявае над памёршым малітвы, яго саджаюць з іншымі гасцямі за стол абедаць [...]

Са страў спачатку падаецца *куцця*, потым *рыба*, хаця б і ў скаромны дзень, тады — кісель і камы, а ўжо затым іншыя стравы. Тых, хто не змясціўся за першым сталом, саджаюць потым і робяць гэтак, аж пакуль не накормяць усіх прыйшоўшых.

Зараз жа пасля абеду свяшчэннік адпявае над памёршым малітвы на вынас; потым труну выносяць на павозку ці сваякі нясуць да самых могілак на сабе, пры звычайным царкоўным абрадзе, з крыжам, херувімамі і звонам. У гэты час сваячкі памёршага ўзнімаюць страшэнны лямант, галосяць, рыдаюць; некаторыя бліжэйшыя сваякі, развітваючыся з памёршым, цалуюць яго ў вусны, іншыя цалуюць толькі крыж, пакладзены на нябожчыка ці на труну, калі яна зачынена.

Прыбыўшы на могільнік, свяшчэннік адпявае неабходныя малітвы; труна з памёршым апускаецца ў яму, закопваецца, і ўсе,

хто знаходзіцца пры гэтым, кідаюць у яму па прыгаршчы зямлі. У гэту хвіліну сваячкі таксама пачынаюць страшэнны плач, галосячы і рыдаючы; мужчыны, ні калі выносяць, ні калі апускаюць у зямлю, не галосяць, а толькі плачуць. Затым частуюць куццёю, спачатку свяшчэнніка і служыцеляў культу, потым п'юць і ядуць сваякі і, калі хопіць, усе прысутныя. Тады ўсе разыходзяцца па дамах, гэтым пахавальная цырымонія і заканчваецца.

*Заўвагі.* 1-я. На пахаванне не запрашаюць гасцей, толькі бліжэйшым сваякам паведамляюць, у які менавіта дзень адбудзецца пахаванне. Але замест гэтага ёсць звычай усіх, хто б ні з'явіўся на пахаванне, хаця б і зусім незнаёмы, саджаць за стол і карміць, асабліва ж старцаў, таму на пахаванне збіраецца гасцей непараўнальна больш, чым на ўсе сялянскія гулянкі, асабліва ў заможных.

2-я. У дзень пахавання кожны, хто прыходзіць, павінен, падышоўшы да нябожчыка, перахрысціцца, пацалаваць крыж, што ляжыць на ім, і пакласці грош на невялікую васковую свечку; грошы і свечкі пасля аддаюцца ў царкву. Сваякі памёршага, якім паведамляюць пра час пахавання, заўсёды прыносяць ці прывозяць з сабой міску *куцці* і *какоры* (булкі вагой ад 4 да 6 фунтаў) — апошніх кожны прынамсі па адной; калі ж яны вяртаюцца дадому, ім таксама даюць *какоры*, якія пасля вяртання дадому яны раздаюць тым, хто не быў на пахаванні; тыя ядуць і кажуць: «Памяні, госпадзі, у чарстві нябесным Івана» (імя памёршага).

3-я. Сяляне, не маючы ніякага паняцця пра ўяўныя смерці, па магчымасці спяшаюцца пахаваць нябожчыка, асабліва ў цёплы час.

Сяляне спяшаюцца пахаваць памёршых яшчэ і таму, што пакуль цела ляжыць у хаце, яны не займаюцца працаю, а акрамя таго, каб не так далёка разнеслася вестка пра час пахавання і менш было б гасцей, якіх асабліва ў веснавую пару збіраецца так многа, што іх накарміць і напаіць здараецца няма чым.

Пахаванне сялян-католікаў вызначаецца наступным: 1) Католікі не паляць свечак перад абразамі; толькі самыя багатыя, часам узяўшы свечку з касцёла за пэўную плату, запальваюць яе перад памёршым, самі ж ніколі свечак васковых, як праваслаўныя, не запасаюць і не трымаюць іх у доме. 2) Паколькі ў католікаў шмат якія мужчыны і жанчыны ўмеюць чытаць па малітоўніках, то ёсць у іх звычай збірацца пісьменным у дом, дзе знаходзіцца памёршы, і там чытаць і спяваць розныя малітвы. 3) Тыя, хто з'яўляецца на пахаванне ці адведаць нябожчыка, не прыносяць з сабою ні свечак, ні грошай, як у праваслаўных.

## IX. Пахаванне сялян Станіслаўскай вол. Лепельскага п.

Калі паміраючы пакідае пасля сябе сям'ю і іншага гаспадара ў хаце, то апошні благаслаўляе хлебам-соллю нашчадка, а потым іншых сваякоў. Пасля смерці нябожчыка і благаславення яго цела кладуць у труну, якую ставяць у пачэсным куце хаты і з абодвух яе бакоў запальваюць васковыя свечкі. Сваякі, асабліва жанчыны, плачуць, галосяць над нябожчыкам, выказваючы пры гэтым усе вартасці нябожчыка, як ім лёгка было жыць на свеце, пакуль ён быў жывы, і чаго яны баяцца цяпер, чаго павінны чакаць, застаўшыся без яго. Цела памёршага, не далей, як на наступны дзень пасля смерці, вязуць хаваць на бліжэйшыя могілкі. Для гэтага запрагаюць каня ў воз, кладуць на яго труну з нябожчыкам і тут сваякі і суседзі зноў развітваюцца з ім, цалуючы яго ў твар, а той, які застаецца гаспадаром у доме, цалуе капыты запрэжанаму і іншым сваім коням. У некаторых мясцовасцях у падобных выпадках нават і астатняй скаціне цалуюць капыты. Пасля пахавання госці і сваякі запрашаюцца на памінкі па нябожчыку. Тут спярша ядуць куццю, прыгатаваную з ячменю і мёду, кашу з грэчкі [...] Затым усе разыходзяцца па хатах.

## X. Пахаванне ў Себежскім п.

Паўсюдна ў Віцебскай губерні конь, які вязе нябожчыка на могілкі, карыстаецца гонарам і павагаю, гэта відаць з таго, што яго вядуць не за повад, спецыяльна на гэту пару адвязаны, а за ручнік ці пояс, якія замяняюць повад.

У Себежскім павеце, на мяжы з Рэжыцкім, гэтаму каню кланяюцца да зямлі.

Характэрна таксама, што для нябожчыка запрагаюць менавіта таго каня, якога ён больш за іншых любіў пры жыцці.

У Себежскім і іншых сумежных паветах у час праводзін нябожчыка на могілкі і якраз калі свяшчэннік мінае вароты, яго абсыпаюць зернем абавязкова аўса ці ячменю, каб больш ніхто ў гэтым доме не паміраў.

На працягу шасці тыдняў у акне, перад якім ляжаў нябожчык, вывешваецца ручнік, для таго, па-першае, каб нябожчык, з'яўляючыся парой у гэты час у свой дом, мог выцерціся, а падругое, як знак таго, што пра яго памятаюць. Гэты ручнік служыць таксама прыкметай жалобы ў доме.

## XI. Пахавальны абрад у Веляшковіцкай вол. Віцебскага п.

Гэтыя ўспаміны пра пахаванні адносяцца да першай паловы пяцідзесятых гадоў. [...] То вольнымі, то паднявольнымі шляхамі я назіраў тады жыццё «парафіян» ва ўсіх яго праявах на радзінах, хрэсьбінах, вяселлях, ігрышчах, пахаваннях, памінках нябожчыкаў і іншых выпадках, і тых, што выходзяць за межы штодзённасці, і таксама будзённых. Я ніколькі не перабольшу, калі скажу, што тады мне давялося бачыць больш як трыццаць «хаўтур», адпраўленых над асобамі розных узростаў, матэрыяльнага дабрабыту, значэння ў мясцовым асяроддзі і сям'і; даводзілася бачыць «хаўтуры» яўных чараўнікоў.

Як толькі бывала «справюць» нябожчыка, старэйшы член сям'і ішоў у сяло, каб паведаміць пра гэта і запрасіць прычт «хаваць нябожчыка». Тут ён браў з царквы крыж (распяцце), «прачэсіну» (харугву), пакрывала, венчык і ручны званок велічынёю з паштовы званочак. Асаблівасцю званка было тое, што ён брынкліва звінеў; аддавалася перавага званку з адбітым краем. Гэта называлася «браць рэчы»; у час, калі яны выдаваліся, адбывалася «пазвоннае» (кароткі перазвон па нябожчыку). Разам з «рэчамі» наймальнік дамаўляўся і вёз з сабою «пісалтырніка», у абавязкі якога ўваходзіла трымаць незагорнуты псалтыр пад пахаю на працягу ўсяго шляху, нягледзячы ні на якія дарожныя выпадковасці. У час зваротнага шляху з «рэчамі» і «пісалтырнікам» наймальнік часта збочваў то ў падарожную вёску, каб паведаміць родным, то ў шынок; сустрэчным знаёмым коратка аб'яўлялася, хто іменна і калі памёр: «рэчы» красамоўна гаварылі пра няшчасце, якое адбылося. Звычайна ў дом нябожчыка «рэчы» прывозіліся пасля змяркання, а часта і каля паўночы.

Перш за ўсё гаспадары спяшаліся накарміць «пісалтырніка», што адбывалася або ў «ісцёбцы» (хата праз сенцы), або ў сенцах, і ў сваю чаргу прыспешвалі яго прымацца за чытанне. Тым часам «прачэсу» прымацоўвалі да дрэўка і ставілі са знешняга боку хаты каля акна, перад якім ляжаў нябожчык. Крыж ставілі ў галовах нябожчыка, у «бажніцы», а званок ставілі на стол, за якім павінен чытаць «пісалтырнік». Пад псалтыр падсцілаўся кавалак новага палатна, што потым перадаваўся ва ўласнасць чытальніка. У гэтым выпадку адзіны ў хаце стол пераносілі з яго «кутняга» месца і ставілі каля сярэдзіны левай лавы; на правай жа ад увахода лаве звычайна ляжаў нябожчык. На стале, засланым чыстым абрусам, ляжаў цэлы хлеб і стаяла драўляная салонка з соллю. Часам званок ставіўся на хлеб. Як хлеб, так і

соль заставаліся на месцы да вынасу нябожчыка з дому. Трэба аддаць справядлівасць, што чытанню псалтыра надавалася належная ўвага: непазбежныя размовы вяліся тады наскора і шэптам. Побач з чытальнікам неадлучна сядзела некалькі аматараў псалтырнага чытання, якія на змену адзін аднаму ўвечары і ўночы трымалі перад чытальнікам запаленую лучыну, калі толькі сродкі не дазвалялі паліць васковую свечку хатняга вырабу. Па заканчэнні кафізмы чытальнік званіў у званочак: сам ён і ўсе прысутныя тады ўставалі і стоячы пачціва слухалі малітвы, неабходныя пасля кафізмы. Чытаннё перапынялася толькі пасля паўночы, калі чытальніку давалі кароткі тэрмін (каля трох гадзін) для сну. Праўда, пачцівая цішыня пры псалтырным чытанні парою рэзка і нечакана парушалася тым, што якая-небудзь жанчына імкліва падыходзіла да нябожчыка і пачынала над ім свае галашэнні. Гэта, аднак, не спыняла чытанне псалтыра, толькі ў гэты момант яно не было так чутна; прытым жа ўвага прысутных прыкоўвалася да голасу і слоў плакальшчыцы, якая заканчвала сваё галашэнне гэтак жа нечакана, як і пачынала, і імкліва адыходзіла да натоўпу...

Цяжка ўявіць, як бясстрашна і пакорліва сустракае смерць беларускі селянін! За рэдкімі выключэннямі паміраючы робіць свае вусныя завяшчанні са здзіўляючай падрабязнасцю, прычым ім не будуць забытыя не толькі ўсе сваякі, іх наступнае жыццё ў тонкіх дробязях, знаёмыя і сябры, з якімі паміраючы спяшаецца развітацца на смяротным ложы, але таксама будуць указаны абставіны і абстаноўка будучага пахавання. Так можа сустракаць смерць адна толькі высокая хрысціянская душа!

Я не здзіўлю паведамленнем, што беларус сярэдніх год, у асаблівасці жанчына, рыхтуе «смяротную» кашулю, якую яна беражліва захоўвае ў сваім «кубле», разглядвае яе ў вольную хвіліну і гаворыць з ёю, з будучай спадарожніцай у вечнае жыццё: гэта ў нас агульнавядома. У дзяцінстве я сустракаў такіх старых, у якіх падрыхтавана было на выпадак смерці «дамаўё» (труна), што захоўвалася ў клеці; памятаю, што гэтыя старыя паказвалі сваё «дамаўё» мне і бацьку майму як штосьці свяшчэннае, стаялі перад ім без шапак.

Калі пачыналася агонія, паміраючаму давалі ў рукі запаленую «грамнічную свечку», якую часта без дапамогі прысутных ён утрымліваў і пры апошнім уздыху. Гэта лічылася асабліва спрыяльным для нябожчыка. Нягледзячы на пакуты і гора прысутных, менавіта тут можна было назіраць так званае магільнае маўчанне: здаецца, разам з памёршым памерлі ўсе, хто знаходзіцца вакол яго. Такая цішыня працягвалася звычайна хвілін

дзесяць, пакуль бліжэйшы да нябожчыка не патушыць свечкі. Усё гэта рабілася дзеля таго, каб душа паміраючага свабодней адыходзіла ад свайго цела. У выпадку працяглаcці перадсмяротных пакут найбольш блізкія да паміраючага асобы аддаляліся ад смяротнага ложа; гэтым, на думку народа, ліквідавалася цяжкасць пакут паміраючага.

Адразу пасля затушэння свечкі і назірання за дымам — ці слаўся ён па хаце і накіроўваўся ў бок выхадных дзвярэй, ці падымаўся над паміраючым да столі — плач, што дагэтуль стрымліваўся, і гора разам, здаралася, вырываліся з усіх грудзей. Жанчыны, асабліва блізкія да памёршага, падымалі плач, прыпадаючы галавою да трупа, які пачынаў астываць. Трэба заўважыць, што ва ўсіх выпадках, галосячы, прыпадаюць галавой да трупа толькі родныя і асабліва блізкія да нябожчыка жанчыны, астатнія толькі схіляюцца над трупам.

Як тыя, так і іншыя сцерагуцца, каб на нябожчыка не падалі іх слёзы: кожная такая слязінка ўзмацняе, маўляў, цяжкасць магільнага насыпу; а між тым усе, хто застаўся жыць, адзінадушна жадаюць, каб над нябожчыкам зямелька была пухам (лёгкая, як пух).

Гэта першапачатковае галашэнне магло б працягвацца яшчэ доўга, асабліва калі памёр вельмі дарагі член сям'і, калі б не трэба было спяшацца абмыць цела памёршага, пакуль яно яшчэ не «акалянiла». Таму звычайна хто-небудзь з блізкіх стрымліваў плач і гора разважлівым напамінкам пра час. Мыццё трупа і адзяванне нябожчыка выконвалі старонція асобы, але не сваякі: амаль у кожнай вёсцы ёсць бескарыслівыя служкі гэтай справы, якія не марудзяць з'явіцца да ложа памёршага па першаму поклічу. Звычайна «абражалі» нябожчыка і прысутнічалі пры гэтым у хаце толькі асобы таго полу, да якога належаў памёршы. Кожнае сваё дзеянне ў адносінах да трупа той, хто «абражаў», суправаджаў сардэчным зваротам да нябожчыка: «Даруй, Якубка, калі не так зрабіў!» — «Абрадзілі мы вам госціка пачаснага, пакутнага: прымайце, шануйце, частуйце яго, каб ён су ўсвятымі заспачываў у чарстві нябеснэй, раю прасветлым, за вас бога замаўляў»,— гаварылі тады гэтыя добрыя людзі, звяртаючыся да гаспадароў пасля таго, як «абрадзюць» нябожчыка. Пры з'яўленні гаспадароў і наогул блізкіх да нябожчыка асоб адбывалася палажэнне яго на «кут», пад чым у даным выпадку не варта разумець кут пад абразамі, а лаву насупраць уваходных дзвярэй. Разам з іншымі пажаданнямі адносна «людскей» сабе смерці, як, напрыклад, каб пры «смяротным часе» прысутнічалі ўсе родныя, каб сын закрыў вочы, каб дачка пагаласіла і інш., бе-

ларускі селянін хоча ляжаць пасля смерці на сваёй «лаўцы»: ён не па «люцку» памёр, калі ляжаў на «куце» ў чужым доме.

Адначасова з палажэннем нябожчыка на «кут» адчыняўся «душнік» (невялікая адтуліна ў сцяне, пад столлю, між печкаю і палацямі, якая звычайна затыкалася анучаю, набітаю сенам ці саломаю) і вымаўся верхні касяк дзвярэй, каб душа нябожчыка магла свабодна ўваходзіць і зноў вяртацца да цела, пакуль яно знаходзіцца ў доме. Часам душнік адчыняўся пры працяглай агоніі паміраючага па той самай прычыне.

Кожнага нябожчыка апраналі ў чыстую белую адзежу хатняга вырабу і новыя лапці, што падмяняліся ботамі ці чаравікамі толькі ў найбольш заможных сем'ях; яшчэ радзей можна было ўбачыць каляровыя хусткі на галаве ў жанчыны ці на шыі ў мужчыны: і тут пераважалі хатнія палатняныя вырабы. Я неаднаразова бачыў, што мужчыну «абражалі», між іншым, і ў шапку, пераважна — лямцавы каўпак. Тады ж мяне пераконвалі, што «ў кішэні насова», надзетага на нябожчыка, кладуць «піпку з капшуком», крэмень і крэсіва, калі ён курыў пры жыцці, і табакерку, калі «зажываў» тытунь. Да пояса мужчыны паверх кашулі падвешвалі каліту, аздобленую гладкімі меднымі гузікамі. і невялікі нож у скураным чахле — прадметы, з якімі селянін не расстаецца ў штодзённым жыцці. Як мужчыне, так і жанчыне за пазуху «насова» клалі чыстую «хустачку» (палатняная хустка, якую завуць «насавічкай»), каб нябожчык мог у патрэбных выпадках выцерці свае «вочкі, нос і вусцінкі».

Наколькі памятаю зараз, сям'я не толькі не адчувала цяжару ад прысутнасці часта ў адзінай хаце дарагога, «пачаснага госціка», а наадварот, даражыла днямі і хвілінамі, якія ён адбывае ў роднай сям'і. Мне часам наіўна здавалася, што сям'я наўмысна марудзіць з пахаваннем нябожчыка: «рапа», апухласць, невыносны смурод пры гніенні трупа, збрыджванне яго не пераконвалі сям'ю ў неадкладнасці пахавання, якое зацягвалася да трох дзён. У гэты час на двары ў нябожчыка пры дапамозе ўмелых людзей рыхтавалася труна («дымаўё»), калі толькі яна не была падрыхтавана ўжо загадзя, як пра гэта было згадана вышэй. Труна высцілалася стружкамі ад пагабляваных дошак, а падушка рабілася з лісця веніка.

Калі для «падняцця цела» быў запрошаны святар, то ён крапіў труну асвячонай вадой; гэта самае рабілася і ў тым выпадку, калі пахаванне адбывалася без свяшчэнніка. Толькі пасля гэтага акраплення нябожчыка клалі ў труну і адразу ж выносілі з хаты. На падрыхтаваны воз або санкі, што стаялі сярод двара,

ставілі труну, падаслаўшы пад яе кавалак новага палатна, і прывязвалі лейцамі. На труну клалі хлеб і ставілі салонку з соллю, якія да гэтага часу знаходзіліся на стале «пісалтырніка». Назіраць за целам пакідалі другарадных асоб; усе астатнія на чале са свяшчэннікам вярталіся ў хату «правіць стол». Пад гэтым разумелі памінальны абед па нябожчыку, які працягваўся ад дзвюх да чатырох гадзін. Калі цесната хаты не дазваляла прысутным памянуць нябожчыка адначасна, тады памінальны абед праходзіў у некалькі змен: у першай змене акрамя гаспадароў родныя і ганаровыя асобы, у другой — суседзі і наогул, хто драбнейшы, і, нарэшце, у трэцяй — убогія. Свяшчэннік першапрысутнічаў на ўсіх зменах; гаспадары ж частавалі памінальнікаў. Часам яны сядалі за стол у апошняй змене, што лічылася вялікім гонарам для нябожчыка і яго дома. Часцей за ўсё памінальнікі групаваліся за адным сталом і паміналі адначасна, хоць і садзіліся за стол па старшынству.

Памінальныя стравы былі звычайна наступныя: куцця (пшанічныя ці пярловыя зерні), з-за адсутнасці мёду прыпраўленая каровіным маслам ці алеем, клёцкі (у большасці выпадкаў ячменныя, з кавалкамі сала ўсярэдзіне), бліны і каша [...] Памінальнік набожна хрысціўся і гаварыў: «Памяні, госпадзі, яго душаньку, пашлі ёй царства нябесны і рай прасветлы»,— пры гэтым ён успамінаў якую-небудзь асаблівую дабрачыннасць нябожчыка ці сваю агульную з ім справу. Гэтыя ўспаміны датычыліся выключна толькі добрых бакоў. Да гэтага часу я захоўваю пачцівую павагу да гэтага «жалобнага стала»: тут не было месца нясціплым размовам, абгаворам, спрэчкам, сваркам, жартам і наогул усяму, што суправаджае сялянскія зборышчы; мнагалюднае застолле гаварыла стрымана, не павышаючы голасу, і ў сваёй размове, то агульнай, то прыватнай, не адыходзіла ад нябожчыка, яго спраў і нязначных падрабязнасцей патухшага жыцця. Прыгадвалі гаворку і павучанні нябожчыка, зноў жа такія, у якіх выяўлялася дабрыня яго душы. Няма патрэбы пераконваць, якая цынічная бывае лаянка беларускага селяніна і як рэжуць вуха словы, якімі ён перасычвае сваю, нават прыяцельскую гутарку: гэта ведае кожны, хто так ці інакш сутыкаўся з паўсядзённым жыццём беларуса. Аднак затое прыходзіцца прызнацца, што цяжка знайсці дзе-небудзь столькі ласкальных слоў, колькі іх знаходзіць той самы беларус, калі гаворыць ласкавую прамову; самыя недрукаваныя словы, пры неабходнасці ўведзеныя ў яго гаворку, абавязкова прымаюць ласкавую форму. Менавіта пераважна і выключна на хаўтурах можна наслухацца ласкальных беларускіх слоў; галашэнне перапаўняецца імі ад

пачатку да канца. Нават такія ўпартыя часціны мовы, як дзеяслоў, пераходзяць у ласкальную форму — «естынькі», «пітынькі» і інш.

Пакуль ішоў «жалобны стол» і нябожчык знаходзіўся сярод двара, кабыла ў поўнай, але параўнальна беднай вупражы стаяла пад паветкаю і кармілася лепш, чым звычайна. Гэту кабылу запрагалі толькі за некалькі хвілін перад выпраўленнем з двара, прычым аказвалі ёй разнастайную пачцівасць: замест лейцаў да аброці прывязвалі пояс, ці ручнік, за якi і вялі кабылу. Лічылася вельмі непажаданым чыханне кабылы, яе бадзёры выгляд і нават спаражненне, пакуль яна не сышла з двара.

Пахавальная працэсія ішла звычайна ў наступным парадку: спераду хто-небудзь з крыжам у адной руцэ і званком у другой; ён званіў амаль бесперапынна ад дома да могілак. За ім неслі «прачэсу», непасрэдна за якой рухалася труна; замыкалі працэсію ўсе прысутныя. Само сабою зразумела, што кабеты, якія галасілі, ішлі бліжэй да труны, прычым, здаралася, яны трымалі свае рукі на труне. Скончыўшы галашэнне, адны саступалі месца новым плакальшчыцам. Гэты строй пахавальнай працэсіі некалькі змяняўся, калі цела суправаджаў свяшчэннік. Пры вялікай адлегласці могілак ад вёскі свяшчэнніка запрашалі ехаць на асобнай кабыле паперадзе труны.

Калі нябожчыка заносілі ў царкву для адпявання, дык, як мне паведаміла жыхарка Гарадоцкага павета, усе сваячкі і жонка нябожчыка, трымаючы адна адну за рукі, чарадою праходзілі пад труною ў той час, калі яна знаходзілася на шляху ад катафалка да дзвярэй. На пытанне, для чаго гэта так робіцца, сяляне ўхільна адказвалі: «Гэта так трэба». Нічога падобнага мне не даводзілася бачыць ні ў дзяцінстве, да якога адносяцца мае цяперашнія ўспаміны, ні ў наступныя часы.

Магільны насып увенчваўся звычайна невялікім часовым крыжам, змайстраваным пры дапамозе нажа, на месцы, з сырога сука алешыны ці бярозы. Сена ці салома з-пад труны старанна выграбалася і кідалася на ўскраіне могілак. Пастухам ставілася ў абавязак не падпускаць скаціну да такога сена ў выпадку, калі яе пасуць паблізу. Хлеб і соль, якія суправаджалі нябожчыка, аддаваліся непераборліваму жабраку, які спецыяльна з'яўляўся на месца пахавання, ці адсылаўся хоць якому бедняку, калі той не знаходзіўся сам.

Кабыла з-пад нябожчыка вярталася дадому паражняком; на ёй ехаць можна было хіба толькі знямогламу старому ці старой, якія, аднак, не знаходзіліся ў сваяцтве з нябожчыкам. Кабыла выпрагалася ў гумне, дзе заставаўся, пакуль не ўзнікне патрэба,

і воз; летнім часам кабыла непасрэдна адсюль адводзілася ў поле, а зімою заставалася і кармілася асобна ад іншых коней, пакуль на другі дзень не выконвала якой-небудзь гаспадарчай работы.

Варта адзначыць, што звычайная, часта неадкладная работа рашуча прыпынялася не толькі ў гаспадарцы памёршага, але і па ўсёй вёсцы, пакуль не пахаваюць нябожчыка. Прынамсі ў такую сумную пару ніхто, бывала, не арэ, не жне, не ўбірае сена. Калі не зусім прыпыняліся, дык у крайнім выпадку ў значнай меры скарачаліся святкаванні з выпадку вяселля, хрэсьбін. Апошнія зрэшты адкладваліся да іншага часу.

Дарэчы заўважым, што нараджэнне дзіцяці ў такі жалобны для ўсёй вёскі час лічылася неспрыяльным і для яго самога, і для яго сям'і. Далей: мяккасць цела нябожчыка сведчыла пра тое, што ён ці вернецца па каго-небудзь з жывых сваіх родных, ці надта неахвотна паміраў, не выканаўшы важнай справы. Адкрытыя вочы нябожчыка — гэта несумненны знак, што яны выглядаюць і прыкмячаюць новую ахвяру. Як адзінкавы, так і паўторны абвал магільных сцен лічылі ўказаннем на тое, што скора давядзецца капаць новую магілу. Правал магільнага насыпу, здаралася, прымалі за доказ, што нябожчык займаўся «чараўніцтвам» і што яго неспакойная душа вяртаецца да цела дзеля асаблівых пакут; парою гэта ж самае служыла ўказаннем на блізкую смерць сваяка [...]

Завяршаючы свае ўспаміны, я міжволі пытаюся: ці робіцца цяпер хоць што падобнае і што іменна робіцца з «даўнейшых хаўтур», якія я бачыў гадоў трыццаць пяць назад?

## XII. Пахавальны абрад у Віцебскім п.

Калі становіцца відаць, што жыццё пакідае хворага, да яго збіраецца шмат яго сваякоў, сяброў і знаёмых. Агульнае, адзінадушнае шкадаванне і доўгія разважанні пра рэчы, якія датычацца замагільнага жыцця, куды хворы рыхтуецца ўступіць, не толькі не хаваюцца ад яго, а, наадварот, выказваюцца ўголас, без утойвання, і нават, здараецца, уцягваюць яго самога ў агульную гаворку, зразумела, калі толькі ён не страціў яшчэ прытомнасці і здольнасці гаварыць. І кожны з прысутных звычайна плача і, развітваючыся з паміраючым, просіць яго маліцца перад прастолам усемагутнага, абяцаючы яму са свайго боку памінаць яго, нябожчыка, і маліцца аб ім тут, на зямлі.

Паміраючаму даецца звычайна *грамнічная свечка*, і калі яна не выпадае ў яго з рук у час агоніі, то гэта лічыцца асабліва шчаслівым знакам для нябожчыка і яго сям'і.

Гледзячы ў глыбокай цішыні, якая пануе ў хаце паміраючага, на апошнія яго перадсмяротныя сутаргі, усе прысутныя тут у момант яго канчыны разам падымаюць невыказны плач і крык над трупам. У першыя хвіліны ніхто не скажа, што такі і такі памёр, а замест таго кажуць *пераставіўся* і г. д., карацей сказаць, усе пазбягаюць у гэтым выпадку слова *смерць* і іншых, што нагадваюць яго, да той хвіліны, пакуль нябожчыка не пакладуць у пачэсны кут, перад абразамі, — у *кутняе месца*.

Закрыць вочы нябожчыку абавязкова павінны былі яго блізкія родныя, прычым ім ставілася ў абавязак імкнуцца не дапусціць любое магчымае скажэнне ў яго трупе, які адразу пачынаюць мыць, пакуль ён яшчэ не астыў. Мужчыну мыюць мужчыны, а жанчыну — жанчыны. Акрамя двух-трох чалавек, неабходных у гэтай справе, ніхто не ўваходзіць у гэты час у хату, халастым жа хлопцам рашуча забараняецца не толькі прысутнічаць пры абмыванні, але нават і ўваходзіць пры гэтым у дом нябожчыка.

Апранаюць нябожчыка ў поўную летнюю адзежу, г. зн. паверх ніжняй бялізны, у балахон (які перапяразваецца), на галаву ж па большай частцы надзяваюць шапку.

Існуе даволі распаўсюджанае павер'е, што да сыходу 40 дзён нябожчык прыходзіць у свой і чужыя дамы і можа рабіць самыя розныя непрыемнасці жывым, з якімі пры жыцці ён быў у непрыяцельскіх адносінах, між тым як апошнія пазбаўлены магчымасці адпомсціць свайму крыўдзіцелю, паколькі ён, прыкрываючыся сваёй нематэрыяльнасцю, з'яўляецца невідзімкаю або ў выглядзе розных жывёл, што дае яму шырокую магчымасць шкодзіць свайму ворагу паўсюдна. Наконт гэтага існуе безліч характарыстычных апавяданняў накшталт таго, як маці прыходзіла ў свой дом і карміла сваё дзіця, як нябожчык-ліхвяр з'явіўся ў дом свайго даўжніка чорным вепруком, доўга шукаў там чагонебудзь такога, чым бы можна было пакрыць свой доўг, і, убачыўшы на лаўцы шубу, схапіў яе і павалок, але не ў стане пранесці яе праз магільны насып ён яе скінуў там, дзе на другі дзень гаспадар знайшоў яе і ўзяў і г. д.

Калі ж памёршы быў чараўнік, дык пасля смерці ён з'яўляўся ў выглядзе самых нячыстых жывёл, накшталт кошкі, мышы, кажана і інш., і нават сама смерць такога чалавека адбываецца самым страшэнным чынам: з яго чэрава ці рота выбягае кошка або мыш, або якая іншая жывёла. Стары селянін (Гарадоцкі п.,

Віц. губ.), які паведаміў нам гэтыя факты, даказваў, што ў момант смерці чараўніка разам гуляецца 12 чортавых вяселляў, для святкавання якіх загубляецца 12 нявінных душ. Для таго каб чараўнік не мог пасля сваёй смерці шкодзіць добрым людзям, трэба забіць у яго магілу асінавы кол. Гэты сродак так цудатворна дзейнічае, што чараўнік не толькі пазбаўляецца здольнасці ператварацца ў якую-небудзь жывёліну, выходзіць з магілы і інш., але нават і тыя чары, якія ён нарабіў пры жыцці, цалкам губляюць сваю сілу.

Калі цела пакладзена на *кутняе* месца, у хаце адразу выбіраецца дзвярны касяк, а за акно, перад якім знаходзіцца нябожчык, перавешваецца ручнік, з аднаго боку, у знак жалобы, а з другога — для патрэб нябожчыка, які часам, паводле павер'яў нашых сялян, вяртаецца ў пакінуты ім дом.

Пры наведванні нябожчыка ўсе стараюцца выказаць сваю непрытворную тугу, прычым прыгадваюць розныя выпадкі са свайго жыцця, што так ці інакш мелі адносіны да яго ўласнага. Жанчыны выражаюць гэта ў сумным слязлівым галашэнні, а мужчыны ў доўгай гутарцы, якая ўяўляе зварот да нябожчыка з рознымі пытаннямі ўсё роўна як да жывога, прычым абавязкова паўтараць некалькі разоў, што хоць нябожчык і не жывы, але ён вельмі добра ўсё чуе і разумее і толькі не можа выявіць сваіх думак і пачуццяў.

Запрашаюць прычт для суправаджэння цела на могілкі ці не, але з надыходам часу пахавання труну з целам выносяць з хаты і ставяць на воз, дзе пакідаюць да таго часу, пакуль не адправяць *жалобны стол*. Зверху на труну сцелюць палатно і кладуць хлеб з соллю, які застаецца з нябожчыкам да самых могілак. Возчык звычайна абедае каля труны, стравы падаюцца яму адначасна са *сталом* і ставяцца на труну, якая замяняе ў даным выпадку стол. Калі ж могілкі блізка ад вёскі, тады *жалобны стол* адбываецца пасля пахавання. У супрацьлегласць хрэсьбінскаму і вясельнаму *жалобны стол* састаўляецца з некалькіх паасобку адзін ад аднаго пастаўленых сталоў. Калі ж іх не хапае або цеснае памяшканне, часцей за ўсё ідзе запар два, тры і больш абеды за адным і тым жа сталом. У такім выпадку прытрымліваюцца такога парадку: спярша абедаюць асобы найбольш знакамітыя, затым — сярэдняй рукі і г. д., а ў заключэнні ідзе абед для бедных і жабракоў (апошнія абавязаны співаць за сталом адпаведныя абставінам духоўныя вершы і песні).

Пры раскопцы новай магілы нярэдка здараецца, што натыкаюцца на старую, ад якой засталіся самыя мізэрныя сляды: частка чэрапа і касцей. У такіх магілах неаднаразова знаходзілі,

апавядаюць, пляшку з гарэлкаю, якая нібыта захоўвае свой чысты смак і дабраякаснасць. Таксама пераконвалі, што ў такіх магілках калі-нікалі знаходзілі сякеры, долаты, буравы, дробныя грошы і іншыя прадметы.

Вярнуўшыся з могілак, усе перш-наперш падыходзяць да печкі і, пагладзіўшы яе тры разы рукамі, кажуць: «Няхай уміраюць прусакі ды таракны, а не людзі!» — пасля чаго кожны мые рукі.

Сена, на якім ляжаў нябожчык на куце, выносяць на воз разам з труною і падсцілаюць пад яе. Строга забараняецца выкарыстоўваць гэта сена на якія б там ні было патрэбы, таму яго і выкідваюць з воза каля самых могілак.

## XIII. Галашэнні
## ў Веляшковіцкай вол. Віцебскага п.

Побач з іншымі клопатамі аб «люцкей смерці і пахове» беларускі селянін ставіць таксама «галашэнне» над сабою. Гадуючы сына, бацька верыць, а маці, не таячыся, гаворыць, што «ён закрыець мае смяротныя вочынькі і прыхаваіць мае костынькі»; дачка — дапоўніць «людскасць»: «прыляціць шэрай зазуляй і жалобасна прыкукуіць». У гэтым апошняя надзея селяніна, у ім ён бачыць вянец усёй працы, пакладзенай на выхаванне дзяцей.

Памірае зайшлы, бязродны чалавек: першае шкадаванне выклікана тым, што «па ём некаму павыць». Слабы, недастатковы плач па памёршым выклікае нараканні з боку мужчын: «Што ж ета нашы бабы здурэлі — ці няма ўжо каму галасіць?!» Спрабуючы свае пеўчыя сілы ў разнастайных песнях, пастушка ў полі, жняя на жніве, збіральніца ягад і грыбоў у лесе, убіраючы агарод і на іншых «жаноцкіх» работах практыкуюцца і над галашэннем, ці, як называюць гэту спробу, «скуголюць». Такім чынам, галашэнне складае неабходную прыналежнасць «хаўтур па-люцку»: да яго загадзя рыхтуюцца, яго патрабуюць і адсутнасць яго кляймяць «нялюдскасцю».

Галашэнне — гэта плач жанчыны з прычытваннем, у якім звычайна пералічваюцца дабрачыннасці нябожчыка, апісваецца гора з гэтага выпадку тых сваякоў і прыяцеляў, што засталіся жывыя, і выказваюцца розныя добрыя пажаданні ў вечным жыцці, у якое перайшоў памёршы, якога цяпер называюць нябожчыкам.

Без галашэння не абыходзяцца ні адны памінкі па памёршых, як у хаце, так і па-за домам, на магіле: у аўторак фаміпога тыдня (радаўніца), у траецкую суботу (дзяды) і пры выпадковым на-

ведванні могілак. У Гарадоцкім павеце гэта бывае ў «кірмашовыя» дні, адразу ж пасля выхаду з царквы, пасля заканчэння абедні. Але пераважнае значэнне галашэнне мае на хаўтурах, яно суправаджае іх спачатку і да канца, асабліва ў такія знамянальныя моманты, як пагашэнне свечкі, палажэнне нябожчыка «на кут», у труну, вынас з хаты, выпраўленне з двара, набліжэнне да могілак і адданне цела зямлі.

Беларускае галашэнне, наколькі мне яго ўдалося назіраць у розныя часы, на мой погляд, з'яўляецца імправізацыяй, якая нялёгка паддаецца абагульненню. Дарэмна было б шукаць тут пэўныя ўсталяваныя формы, падобныя да тых, якія бачым у песнях хрэсьбінных, вясельных, гульнёвых і інш. «Як хто ведаець, так той па сваёму бацьку й плачыць», гаворыць наконт гэтага беларуская прымаўка. Праўда, у вуснах адных асоб «галашэнне складаецца часам у правільнае вершаванае прычытванне; у большасці ж выпадкаў яно — простая мова, часта нязвязная, створаная пад уздзеяннем разнастайных цяжкіх пачуццяў, але перапоўненая ласкавымі словамі і зваротамі — карацей, *мова беларускай* сялянкі, у якой «волыс довыг, ды вум каротык». Так, напр., пачаўшы сваё галашэнне зваротам да нябожчыка — «на каго ты пакінуў мяне?» — і ўставіўшы ў прамаўленне якое-небудзь слова, з якім нечакана звязаўся ўспамін аб падзеі, плакальшчыца крута пераходзіць да гэтай падзеі і г. д. Да таго ж неаднолькавасць памёршых асоб і адносін да іх плакальшчыцы робіць разнастайным і галашэнне. Ва ўсякім выпадку тэмай і прадметам яго з'яўляюцца: успаміны пра ўласныя адносіны да нябожчыка; розныя выпадкі з яго жыцця, выпадкі дабраты яго душы, яго словы і настаўленні; разлад ці ўпарадкаванасць яго ўласных спраў і спраў пакінутай сям'і, просьбы маліцца богу за тых, хто застаўся жывым, просьбы перадаць нешта накшталт паклону «свойскім нябожчыкам», з якімі несумненна нябожчык стрэнецца на тым свеце; абяцанне маліцца за яго і часта ўспамінаць сярод жывых, абяцанне наведваць магілу як у памінальныя дні, так і ў іншы час, утыркнуць у магілу асвечаную галінку вярбы, пакачаць па магіле велікоднае яечка і многае іншае [...]

Адначасова «галосюць» некалькі асоб толькі ў асабліва выдатныя моманты, адзначаныя вышэй; у астатніх выпадках галашэнне бывае адзіночнае, прынамсі «чужане», якія наведваюць нябожчыка, «галосюць» па аднаму і рэдка далучаюцца да галашэння сваякоў памёршага. Я, грэшны, часам думаў, што ў адзіночным галашэнні прасвечвае штосьці накшталт спаборніцтва між «чужанамі». Я заўважаў, што прысутныя асабліва ўважліва прыслухоўваліся да «голасу» плакальшчыцы і яе прычытванняў,

што такое галашэнне больш звязнае і талковае, чым сваякоўскае, і, што, нарэшце, у той, якая галасіла, не быў заплаканы твар.

Па заканчэнні галашэння плакальшчыца застаецца нерухомая хвіліны са дзве і нібыта шэпча нейкія словы; толькі пасля гэтага яна імкліва падаецца да натоўпу, як перад галашэннем набліжалася да нябожчыка. Калі плакальшчыца не паспела, забыўшыся, «выплакаць» што-небудзь і потым прыгадвала гэта, тады яна зноў ідзе на месца, пачынае новае галашэнне і дагаворвае прапушчанае з далучэннем таго, што падкажа ёй горкае пачуццё. Часта ўласнае гора, нервовасць і іншыя прычыны нібыта прыкоўваюць плакальшчыцу да месца; такіх жанчын парою адводзяць з месца галашэння, а ў выключных выпадках абліваюць нават вядром халоднай вады.

Зразумела, што кожная «чужка», што прыняла ўдзел у галашэнні, пасля гэтага запрашаецца памянуць нябожчыка [...] Чым мацней было галашэнне і «жалабасней» прычытванне, тым большую ўвагу аказваюць плакальшчыцы не толькі пры гэтым частаванні, але і ў наступныя часы.

І між «свойскіх», і між «чужакоў» можна сустрэць жанчын са страчанымі галасамі. Яны ўсё ж такі «галосюць» хоць і сіпатым шэптам, і па заканчэнні галашэння «чужкі» памінаюць нябожчыка [...]

Як на нешта выключнае паказвалі мне, што хтосьці «галасіў акурат, як выюць жонкі — дужа доўга галасіў». Зразумела, што такая незвычайная выключная з'ява здзіўляе і сялян, прымушае надоўга гаварыць пра плакальшчыка самым пачцівым чынам. Мне ж даводзілася са шкадаваннем прызнацца, што сведкам галашэння мужчын я не быў ні разу.

## XIV. Пахавальны абрад у м. Рудня Аршанскага п.

Як толькі памрэ хто-небудзь у хаце, бліжэйшая сваячка выходзіць на вуліцу і на ўвесь голас пачынае плакаць з прычытваннем. Прыходзяць людзі не са сваякоў, абмываюць і апранаюць нябожчыка ў чыстую палатняную бялізну, на ногі нацягваюць панчохі ці проста абгортваюць іх у чыстыя палатняныя анучы. Цела кладуць на лаве, падаслаўшы на ёй аржаную салому і пакрыўшы яе палатном. Мужчын — на правай лаве, а жанчын на той, якая насупраць уваходных дзвярэй.

Галава сям'і накіроўваецца да свяшчэнніка, каб пазванілі па нябожчыку і выдалі крыж і дзве ці чатыры харугвы, а таксама венчык і малітву. Прынесеныя харугвы і крыж ставяцца да вынасу на прызбе, каля сцяны ад вуліцы, па чым прахожыя даведваюцца, што ў хаце нябожчык, і, зняўшы шапкі, моляцца.

У той жа час запрашаецца хто-небудзь чытаць псалтыр. Пры гэтым абавязкова павінна гарэць лампадка перад абразамі ці свяча васковая.

На стале ставіцца [...] чарка і кладзецца хлеб і соль для наставання тых, хто будзе прыходзіць. Чарка павінна стаяць напоўненая да пахавання цела. Пасля пахавання на працягу шасці тыдняў у кутку пад іконамі ставіцца шклянка, напоўненая вадою — згодна з павер'ем, да саракавога дня душа нябожчыка знаходзіцца ў хаце і мае патрэбу ў пітве.

Труна робіцца на двары памёршага з сасновых ці яловых дошак, без асаблівай аздобы, нярэдка нават з нячэсаных. Дно труны высцілаецца прутамі развязаных венікаў; паверх прутоў кладуць поперак труны пояс, на ім труна засцілаецца па дну доўгім кавалкам палатна, а бакавыя сценкі абіваюцца белым каленкорам ці таксама палатном. Разам з труною ў хату заносяць трэскі і стружкі ад яе, пасцілаюць іх на падлозе каля ложа нябожчыка і на іх ставяць труну. Пояс кладзецца ў труну згодна з перакананнем, што нябожчык у час уваскрасення павінен з'явіцца на суд абавязкова падпераваным.

Цела кладзецца ў труну пасля адпявання. Калі яго вынесуць на двор і пакладуць на воз ці сані, жанчына абсявае зернем вакол воза і некалькі спераду яго, па апошняму шляху. Робіцца гэта ў знак таго, что памёршыя ў свой час уваскрэснуць.

Да могільніка нябожчыка суправаджае большасць жыхароў сяла.

Жанчына, якая абсыпала труну, застаецца дома прыбіраць хату. Сабранае смецце і салому, якія служылі падсцілкаю на пасцелі, яна выносіць на вуліцу і спальвае каля вугла дома,— каб у ім не было больш нябожчыкаў.

Калі вернуцца з могільніка, гаспадар запрашае гасцей за стол. Тая ж жанчына, пра якую гаварылася вышэй, памаліўшыся, бярэ кавалак хлеба, канун і чарку і, стаўшы ў дзвярах хаты, запрашае нябожчыка на абед, называючы яго па імені. Пасля гэтага гаспадар, стоячы каля стала [...], гаворыць прысутным:

— Няхай жа ўжо наш пакойнічак Рыгорка свяцінек ляжыць і на нас, грэшных, з таго свету не забываець ды хлеба-солі засылаець,— каб нам самім было што спажываць і яго праведную душачку спамінаць! Чэсныя ж і праведныя радзіцелькі! Хадзі-

це к нашаму сталу [...] за бацькаваю малітваю хлеба-солі пакушаць! За здраўя ж вас, госцікі! [...]

Пасля абеду ўсе разыходзяцца.

«Траціны» і «дзевяціны» адбываюцца сямейным парадкам. Са страў рыхтуюцца: поліўка, клёцкі, каша і бліны. Памаліўшыся перад абедам богу, старэйшы ў сям'і гаворыць:

— Памяні ж, госпадзі, душачку Рыгоркаву! Хадзі ты, Рыгорка, к нашаму сталу хлеба-солі адкушаць!

І пасля гэтага абедаюць.

У дзевяты дзень рыхтуюць яшчэ канун, над якім свяшчэннік служыць у сябе ў доме паніхіду па нябожчыку.

Канун ужываецца хатнімі ў пачатку абеду.

«На шасціны», у саракавы дзень пасля смерці, у царкве служыцца заўпакойная літургія, а на могільніку над магілаю — паніхіда. На памінальны абед у гэты дзень запрашаюцца ўсе тыя асобы, якія асабіста прымалі ўдзел у пахаванні нябожчыка, г. зн. хто мыў яго, рабіў труну, капаў магілу, нёс крыж і харугвы і г. д. Такія ж памінкі адбываюцца і ў дзень гадавіны смерці.

## XV. Пахавальны абрад у с. Гарадзец Быхаўскага п.

Памёршага старога абмываюць старыя мужчыны, а памёршую старую — старыя жанчыны. Маладзейшых мыюць больш маладыя. У выпадку неабходнасці памёршых мужчын абмываюць жанчыны і наадварот. Нябожчыкаў апранаюць у чыстую бялізну, на шыю павязваюць хустку, ногі абуваюць у лапці. Кладуць іх на лаве, у канцы стала: мужчыну кладуць на мужчынскай лаве — насупраць дзвярэй, а жанчыну на жаночай лаве — па левы ці па правы бок ад дзвярэй, гледзячы па напрамку хаты.

Труну высцілаюць стружкамі і прутамі венікаў, падушку набіваюць сенам. Мужчыне ў труну кладуць шапку каля галавы, жанчыне, якая памерла ад пакутлівых родаў да нараджэння дзіцяці, кладуць у труну пялёнкі, пояс-спавівач, кашульку і хусцінку — спавіць дзіця.

Калі памёршага панясуць на могілкі, жанчына, якая засталася дома, спяшаецца прыбраць ложа нябожчыка, падмесці падлогу, вымыць стол, лавы, вокны і дзверы.

Вярнуўшыся з могільніка, усе мыюць рукі і тады садзяцца за стол. Абавязковай стравою лічацца галушкі [...] Выказваюць такое пажаданне:

— Царства яму там нябеснае! Пяром яму зямля, а нам на добрае здароўе!

Пасля абеду пільна сочаць, каб з хаты не выйшаў малады раней за старога: хто раней выйдзе, той раней і памрэ. Павер'е гэта не датычыцца членаў прычту, якія звычайна выходзяць раней за іншых.

Памінкі робяць на трэці дзень, дзевяты, дваццаць першы і саракавы. Запрашаюцца асобы, якія рабілі труну, капалі магілу, мылі нябожчыка і г. д. Абед складаецца з тых самых страў, як і на пахаванні.

## XVI. Пахавальны абрад

У трох суседніх вёсках Хаславіцкай воласці — Шанькоўцы, Галалобаўцы і Прыцькіне — існуе даволі арыгінальны і, здаецца, яшчэ нікім не адзначаны звычай, які можна назіраць пры пахаванні. Ад яго патыхае такою сівою даўніною, што, на нашу думку, ён заслугоўвае пэўнай увагі.

Сяляне названых вёсак на дарозе, па якой ідзе пахавальная працэсія, на недалёкай адлегласці ад могілак, распальваюць касцёр з саломы, што служыла апошняй падсцілкай хвораму, а затым і памёршаму чалавеку. Труну з нябожчыкам ставяць на сані ці воз, у якія запрагаюць спецыяльна прывучанага да агню каня. Калі пахавальная працэсія набліжаецца да кастра, яго запальваюць, і конь правозіць нябожчыка па самай сярэдзіне кастра. Вогненныя языкі ліжуць колы воза і ніжнюю частку труны, якая на імгненне ахутваецца дымам і абсыпаецца іскрамі...

Ці не ўяўляюцца вам, чытачы, тыя старажытнаславянскія пахавальныя кастры нашых продкаў, з апошнім дымам якіх адышла ў глыбіню стагоддзяў наша сівая міфічная даўніна, поўная арыгінальнай паэзіі язычніцкіх часоў? У прыгаданым звычаі гэта сувязь з далёкай даўніною здаецца нам несумненнай. Зрэшты звычай спальваць саламяную падсцілку нябожчыка практыкуецца ў шматлікіх мясцовасцях Мсціслаўскага павета, але там гэта не прыстасоўваецца да дня пахавання і нябожчыка не правозяць праз касцёр. Застаецца толькі нявысветленым той факт, што расказаны звычай захаваўся выключна ў трох названых вёсках, не распаўсюджваючыся на навакольныя мясцовасці. Мясцовы прыходскі свяшчэннік, які пазнаёміў нас з гэтым пахавальным звычаем, расказваў нам, што ён спачатку супрацьдзейнічаў гэтаму звычаю, лічачы яго забабонным і язычніцкім, але затым, зразу-

меўшы не толькі поўную нявіннасць яго, але нават пэўную карысць у гігіенічным сэнсе (спальванне падсцілкі хворага), пярэчыць перастаў.

## XVII. Пахавальны абрад у Святошыцкай вол. Горацкага п.

Калі хворы, галава сям'і, адчуе хуткае набліжэнне смерці, але яшчэ знаходзіцца ў прытомнасці і мае здольнасць гаварыць, ён склікае суседзей, з якімі сябраваў, і ў прысутнасці іх навучае сабраных тут членаў сям'і, каб яны пасля яго смерці не сварыліся, а жылі між сабою ў міры і згодзе, паважалі яго пераемніка і ў выпадку падзелу не крыўдзілі адзін аднаго, прычым называе, што кожны з іх павінен атрымаць. Гэта навучанне лічыцца завяшчаннем. Воля завяшчальніка пасля яго смерці выконваецца дакладна, за выключэннем, калі між нашчадкамі ў наступным узнікае спрэчка з-за спадчыны. Тады пры вядзенні судовага працэсу вуснаму завяшчанню не надаецца асаблівага значэння, што зусім натуральна, паколькі кожны са спадчыннікаў не можа памятаць дакладна словы завяшчальніка, імкнецца змяніць іх у сваю карысць.

Зрэшты, не заўсёды і не кожны галава сям'і перад смерцю робіць завяшчанне, а толькі пры наступных акалічнасцях: 1) калі дзеці, пасынкі і г. д. не выказвалі да яго пры жыцці належнай павагі; 2) калі яны дзялілі між сабой сваю маёмасць насуперак яго волі; 3) калі пастаянна настройваліся супраць яго, рабілі яму непрыемнасці і інш.

У падобных выпадках часцей за ўсё робіцца пісьмовае завяшчанне. Яно складаецца ўжо ў прысутнасці свяшчэнніка і сведкаў, падпісваецца імі ўсімі, запячатваецца ў канверт і аддаецца хвораму, каб той схаваў, дзе ўздумае. Калі ён паправіцца, завяшчанне звычайна знішчаецца, калі ж памрэ, тады яго дастаюць з канверта, прачытваюць у прысутнасці спадчынніка і сведкаў, што падпісвалі яго, і ўсё, што ў ім было напісана, дакладна выконвалася. Паколькі ў Магілёўскай губерні карыстанне зямлёй абшчыннае, то ў завяшчанні амаль нічога не ўпамінаецца наконт зямлі, а калі і прыгадваецца, дык толькі ў такіх выпадках, калі той, хто памірае, перадае свой зямельны надзел свайму прамому нашчадку — сыну. Калі ж у яго зямля ўласная, купленая, ён распараджаецца ёй, як яму ўздумаецца, можа перадаць яе, каму захоча, нават не сваяку.

Пахавальны абрад ва ўсёй Святошыцкай воласці, якая скла-

даецца з 39 сёл і двух засценкаў, амаль аднолькавы, за выключэннем толькі некаторых нязначных адрозненняў.

Хто-небудзь з прысутных пры смерці — старэйшы член сям'і, сваяк ці сусед дае ў рукі паміраючаму васковую свечку, асвячоную ў царкве на грамніцы. З апошнім уздыханнем паміраючага хата напаўняецца плачам і галашэннем жанчын-сваячак. Пад час рыданняў часта здараецца, што паміраючы прыходзіць у пакутлівы, відаць, рух, але без усякай свядомасці. Тады нехта з прысутных староніх асоб адхіляе плакальшчыцу ад паміраючага, часта дзеяннем, а часам словамі, кажучы: «Ну; досыць вам выць! Цыць! Дайце яму спакойна кончыцца».

Пасля канчыны хворага хто-небудзь з кабет сваёй сям'і ці добрая суседка запальвае ў хаце печку саломаю ці сухімі тонкімі паленцамі і грэе ваду для мыцця нябожчыка, а адзін з мужчын у той жа час выпраўляецца да мясцовага свяшчэнніка і затым, каб паведаміць яму пра смерць, і для перазвону ў царкоўныя званы па памёршым і атрымання венчыка. Калі вада, пастаўленая ў печ, нагрэецца да летняй тэмпературы, чалавекі два-тры са старых, з якімі памёршы асабліва сябраваў, пачынаюць яго мыць. Нябожчыка распранаюць, саджаюць яго на лаву, пад якую ставяць вялікія ночвы, і абмываюць усё цела, а, здараецца, гэту аперацыю робяць прама ў ночвах. Пасля заканчэння гэтай работы нябожчыка апранаюць у чыстую белую палатняную кашулю, у такія ж штаны і ў камізэльку, калі яна ёсць, а на ногі — у сёлах Святошыцах, Ланенцы, Чырыне, Кобызеве і Сіпішчаве — абуваюць непадплеценыя лапці або панчохі без лапцяў, гледзячы, як завяшчаў памёршы. У Вячэрыне, Пасуддзеве, Пішчыках, Дабрыні і Глебаве абуваюць лапці з анучамі; у астатніх жа сёлах воласці — адны панчохі, а за адсутнасцю іх ногі абвязваюць чыстымі палатнянымі анучамі. Ваду, якою мылі памёршага, выліваюць у такое месца, дзе не ходзяць людзі, напрыклад пад вугал якой-небудзь нежылой забудовы.

Пасля заканчэння мыцця і апранання памёршага кладуць на лаве ад вуліцы, на сенніку ці падушцы, галавой у пачэсны кут, яму складваюць на грудзях накрыж рукі, у якія ўсоўваюць чыстую хусцінку, закрываюць павекі вачэй (калі яны ў момант канчыны самі не закрыліся) з прычыны павер'я, што калі нябожчык застанецца з адкрытымі вачыма, дык неўзабаве надыдзе новая смерць у сям'і. Каля ікон запальваюць свечы і запрашаюць з мясцовых грамацееў аднаго, двух і больш для чытання псалтыра. Гэта чытанне паўсюдна складае як бы неабходную прыналежнасць пахавальных абрадаў. Калі чытальнік адзін, то ён чытае запар псалмы, калі два, то адзін псалом чытаецца, другі

спяваецца, калі ж чытальнікаў больш за два, то ўсе ўжо псалмы спяваюцца па парадку. Напеў гэтых спеваў сумны і маркотны. Адначасна з запрашэннем чытальнікаў старэйшы член сям'і запрашае каго-небудзь з суседзяў капаць магілу і рабіць труну. Труна робіцца пераважна з яловых дошак, нефарбаваная, звычайна нячыстай работы. У прамежку пабудовы труны і капання магілы свабодныя члены жаночага полу знаходзяцца пры нябожчыку і па чарзе галосяць над ім. Пры з'яўленні ў хаце свяшчэнніка пачынаецца ўзмоцнены плач сям'і і сваякоў і зноў-такі з прычытаннямі. Галашэнне гэта патроху сціхае, як толькі свяшчэннік пачынае літыю, па працягу якой яно зусім замаўкае. Пасля літыі ў хату заносяць нябожчыка, кладуць у труну, пры гэтым усе цяжарныя жанчыны пакідаюць хату затым, каб дзіця, што народзіцца, не было бледнае, як мярцвяк, што было, як пераконваюць, даказана на практыцы. Труну высцілаюць бярозавымі лістамі з сучкамі, што засталіся ад нарыхтоўкі венікаў. Пад галаву кладуць падушку, якая ўяўляе белую навалачку, напоўненую тымі ж лістамі. Знутры труну абіваюць белым палатном, край якога выходзіць наверх на паўчвэрць аршына.

Пасля таго як пакладуць у труну, пачынаецца ўсеагульны плач-сям'і і прысутных з галашэннем з боку жанчын. У сёлах Пішчыкі, Пасуддзева, Святошыцы, Гудава, Карабанавічы, Цілевічы, Волева, Пневічы, Вячэрына, Глебава і Бахава кладуць у труну васковую свечку затым, каб служыла яна памёршаму для асвятлення шляху ў час, калі ён будзе ісці на страшны суд. У сёлах Святошыцы, Гудава, Гараны, Ланенцы, Антоненкі, Хаетчына, Ловеўшчына, Чырвоная Слабада кладуць у труну таксама шапку. У астатніх сёлах воласці не кладуць ні шапкі, ні свечкі. У мінулы час, гадоў 15 назад, па ўсёй воласці ставілі ў труну гарэлку ў бутэльках, тым, хто курыў, клалі люльку, хто нюхаў — табакерку з табакай, што даказваецца знаходкамі гарэлкі ў бутэльках пры капанні магіл у цяперашні час і расказамі старажылаў. Прычыну, чаму ў труну клалі гарэлку, тлумачаць тым, што нябожчык пры з'яўленні на той свет павінен пачаставаць сваіх родных і знаёмых. Пакладзенаму ў труну свяшчэннік чытае адпушчальную малітву, напісаную на аркушы паперы, пасля прачытання якой аркуш даюць у рукі памёршаму. Затым труну выносяць з хаты так, каб ногі нябожчыка былі наперад, супраць дзвярэй. Летам труну ставяць на воз, а зімой на сані і вязуць на могільнік. У сёлах Гараны, Бахава, Чырына, Пуцяціна, Быстрыеўцы, Пневічы, Бірсукі і Беські нябожчыкаў носяць. У час шэсця пахавальнай працэсіі свяшчэннік служыць «провад», а прыбыўшы на могільнік і паставіўшы труну на край магілы, ён служыць

малую літыю; перад яе пачаткам века здымаецца з труны, якая застаецца адчыненай да заканчэння службы. Затым сваякі і знаёмыя развітваюцца з нябожчыкам. Родныя, браты, сёстры і знаёмыя старэйшыя цалуюць нябожчыка ў лоб, шчаку і вусны, а дзеці, унукі і знаёмыя маладшага ўзросту цалуюць толькі ў руку. У гэты час галашэнні ўзнаўляюцца з новай сілай. Па заканчэнні развітальнага абраду труну закрываюць векам, апускаюць на вяроўках у магілу і, паставіўшы яе там, вяроўкі выцягваюць наверх. Тады святар робіць лапатаю па баках магілы крыжы і затым кідае тры разы ў магілу па жмені зямлі. Яго прыклад паўтараюць усе прысутныя. Пасля гэтага пахавальная працэсія накіроўваецца ў зваротны шлях, а труну закопваюць тыя ж людзі, што капалі магілу. Хаваюць звычайна нагамі на ўсход. У сёлах Пішчыкі, Пасуддзева, Гудава, Барадзіно, Карабанавічы, Кляны, Дабрыні, Цыбульскія і Радзякі прысутныя пры пахаванні кідаюць у магілу грошы, пярсцёнкі і г. д., калі ж у іх нічога гэтага няма пры сабе, то частку адзежы, напр., хусткі, шарфы, паясы і інш. На пытанне маё: «Чаму гэта так робіцца?» — я атрымліваў звычайны ў такіх выпадках адказ: «Так дзелалі нашы дзяды і атцы, так і мы дзелаім».

Па дарозе з могілак старэйшы член сям'і запрашае святара і ўсіх, хто тут быў на пахаванні, на памінкі, па мясцовай назве — на *хаўтуры*. Адмаўленне святара ў даным выпадку лічыцца крыўдаю для сям'і нябожчыка, і таму, ведаючы пра гэта, бацюшка ніколі не адмаўляецца ад запрашэння.

Пахавальны абрад мужчын і жанчын усіх узростаў сходны паміж сабой, толькі замужнюю кабету апранаюць у палатняную кашулю, андарак, крамную кофту, на галаву надзяваюць чапец; павязаны хусткай цёмнага колеру, ён нагадвае ўладкаваннем і формай турэцкую феску, толькі без кутаса і драбнейшы, а ззаду забраны на шнурок, які ахоплівае галаву разам з чапцом; на нагі — панчохі белага колеру. Дзяўчыну-нявесту апранаюць, як пад вянец: на руку надзяваюць пярсцёнак, у рукі даюць свечку і хусцінку, галаву ўбіраюць вянком з кветак — летам з жывых, ці з навалкаў матэрыі, а астатні строй — як звычайна ў жанчыны, за выключэннем чапца і хусткі на галаве, якія замяняюцца вянком і заплеценай касой.

Хлопца-жаніха таксама апранаюць, як пад вянец: на руку надзяваюць пярсцёнак, у рукі даюць свечку і хусцінку, на шыю таксама навязваюць хусцінку, астатні ж убор, як у жанатага мужчыны. Дзяцей — як хлопчыкаў, так і дзяўчынак — убіраюць аднолькава: на іх надзяваюць белую кашулю, панчохі і анучкі, труну прыбіраюць кветкамі.

Пасля вяртання з могілак пахавальнай працэсіі старэйшы член сям'і запрашае асоб, якія прымалі ўдзел у пахаванні, садзіцца да загадзя падрыхтаванага стала, дзе пастаўлена місачка з пшанічнай кашай (куццёй), запраўленай мёдам у знак таго, каб памёршаму на тым свеце было соладка (паводле выразу сялян). Калі мёд адсутнічае, кашу запраўляюць каровіным маслам, а ў пост — алеем. Свяшчэнніка садзяць на покуці, псаломшчыка на лаўку, старэйшага суседа ці сваяка, які вызначаецца багаццем, розумам ці добрымі паводзінамі,— каля свяшчэнніка, а астатнія стаяць. Благаславіўшы куццю і трохі паспытаўшы яе, свяшчэннік кладзе лыжку і адпраўляецца дадому. Пасля яго адыходу ўсе прысутныя тройчы спрабуюць куццю, запрашаючы пры гэтым нябожчыка прыблізна так: «Даніла! Даніла! Хадзі куццю есці!» Затым пачынаецца самы разгар памінак: гаспадар размяшчае сваіх гасцей за сталом згодна з вартасцю асоб, і пачынаецца частаванне [...] Закусваюць у скаромны дзень мясам, баранінай, свінінай і інш., а ў посны — *шмайкай* (астраханскай сялёдкай). Пасля закускі пачынаецца абед. Падаюць на стол спачатку ў вялікай місцы капусны боршч, потым клёцкі (галушкі) і нарэшце бульбу з бручкай ці адну бульбу. У скаромны дзень і капусту, і бульбу падаюць з маслам, а клёцкі — з малаком, у посны — з вяленай рыбай, а клёцкі з алеем. Ядуць усе звычайна з адной міскі [...] Пачынаюцца разважанні пра нябожчыка, кожны выказвае сваю пра яго думку, перапыняючы і не слухаючы адзін аднаго: «Ну, добры, добры быў! Ну, бог з ім, знёс майго рубля на тэй свет, вугалькамі аддасць, як сустрэцімся». Пагаманіўшы за сталом уволю, госці дзякуюць гаспадару і разыходзяцца па дамах, а ў хаце нябожчыка кладуцца спаць.

## XVIII. Галашэнні ў Святошыцкай вол. Горацкага п.

Прычытванням ці галашэнням над нябожчыкамі ў нас надаецца даволі важнае значэнне. Вераць, што пасля рыданняў нябожчык атрымлівае адпушчэнне грахоў. Без прычытванняў і плач не ў плач. Калі ў памёршага няма сваякоў, то па ім плачуць староннія асобы, якім ён пры жыцці аказаў якое-небудзь дабро словам ці справай. Гэта пераважна і складае тады прадмет прычытванняў.

Калі памёр чалавек дарослы, у якога няма ні родных, ні знаёмых, па ім плача абы-якая спагадлівая старэнькая з прычытваннем.

Плач старой больш паважаюць, чым плач маладых жанчын, плач дарослай дачкі па бацьку больш мае вагі, чым плач жонкі па мужу, плач маталетніх лічыцца яшчэ больш важкі.

## XIX. Пахавальны абрад у с. Красная Буда і с. Папоўка Гомельскага п.

Калі хворы пачынае паміраць, у доме ўсталёўваецца поўная цішыня. Старэйшы з прысутных запальвае васковую свечку, галоўным чынам прынесеную з царквы ў перадвялікодны чацвер або грамнічную, асвячоную 2 лютага (там, дзе гэта робіцца), і дае яе ў правую руку паміраючаму. У гэты час хворы бласлаўляе членаў сям'і і робіць канчатковыя распараджэнні па маёмасці. У Рагачоўскім павеце пры цяжкай канчыне хворага падкурваюць асвечанай духаўскай травой ці вярбой. Кладуць таксама на кажух, але не на салому. У Гомельскім павеце паміраючага здымаюць з падушак, набітых пер'ем,— якія наогул замаруджваюць смерць,— і кладуць на сена ці на салому. Як толькі наступіць смерць, усе хрысцяцца і моляцца за нябожчыка: «Вечны спакой, царства нябеснае, рай светлы!» І адразу ж накіроўваюцца да свяшчэнніка з просьбай загадаць пазваніць «па душы». Пры гэтым бярэцца венчык і малітва і даецца некалькі капеек «на пазвоннае».

У доме тым часам рыхтуюць чыстую цёплую ваду і мыюць ёй пасярод хаты [...] цела памёршага. Затым апранаюць нябожчыка ў чыстую бялізну, абвязваюць поясам, за які закладваюць кавалак палатна ў выглядзе ручніка, каб было чым уцірацца пры ўсеагульным уваскрэсенні, на ногі надзяваюць ці наскора пашытыя з чорнага каленкору «бушмакі», ці звычайныя лёгкія лапці з ліпавых лык — «пасталы». На акне ставіцца стакан з чыстай вадой і вешаецца ручнік, каб і душа памёршага мела магчымасць вымыцца і чыстай з'явіцца на той свет. Вада гэта стаіць тут ад таго часу, пакуль памёршага пахаваюць. На працягу ўсяго часу не вымятаюць смецця з хаты і не выкідваюць яго на двор, «на сметнішча».

Ложа для нябожчыкаў рыхтуюць на правай лаве пад абразамі для мужчын і на левай для жанчын. Сюды ж кладуць той жа сяннік, на якім ляжаў хворы, і пад галаву тую ж падушку, акрываюць усё гэта прасцінай ці «радном». Нябожчыка кладуць на ложы галавой да абразоў. Вейкі вачэй шчыльна заплюшчваюць, каб нікога не выглядаў, не браў з сабой, ногі працягваюць так, каб не былі сагнутыя, рукі складваюць на грудзях накрыж, дзеля

чаго нават звязваюць іх у кісцях; на галаву накладваецца вянчык, у правую руку зноў устаўляюць свечку і акрываюць усяго нябожчыка намёткай — палатном або сеткаватай хатняй тканінай у выглядзе грубай марлі.

Пасля таго як нябожчык будзе пакладзены на ложа, запальваюць перад абразамі свечку ці, калі ёсць, лампадку і сельскі граматей пачынае павольна, расцягваючы словы, чытаць псалтыр. Пад кнігу гаспадары падсцілаюць кавалак палатна або паркалёвую хустку, якія потым пераходзяць ва ўласнасць чытальніка. Чытаць псалтыр можна і седзячы, аднак пасля кожнай «славы» чытальнік абавязан устаць і, перахрысціўшыся, прачытаць пахавальную малітву. З ім разам устаюць і моляцца ўсе прысутныя.

У дом памёршага збіраюцца сваякі і знаёмыя [...] Кожны, увайшоўшы, моліцца на абразы і шэптам чытае «Ойча наш». Малітва гэта заканчваецца пажаданнем: «Вешны пакой, царства нябеснае, рай светлы душэ праваставўшай (памёршай)!»

Хатнія запрашаюць вопытных суседзяў рабіць труну, капаць яму [...] «Смерць і радзіны не глядзяць добрае гадзіны!..» [...]

Галашэнне па нябожчыку адбываецца некалькі разоў: адразу ж, калі ён памрэ, пакуль робіцца падрыхтоўка да абмывання цела; калі цела апрануць на ложы; у перапынку паміж чытаннем псалтыра; калі нябожчыка кладуць у труну і выносяць з хаты і калі апускаюць у магілу. Калі провады ад хаты да могілак адбываюцца чаму-небудзь без прычту, галашэнне павінна быць абавязкова.

Мужчыны плачуць даволі рэдка. Пры выглядзе скрухі сям'і нябожчыка ў іх толькі наварочваюцца слёзы на вачах. Галосяць жа выключна жанчыны. Галашэнне лічыцца абавязковым, аднак калі яно працягваецца занадта доўга, прысутныя спыняюць плакальшчыцу: «Годзя ўжо табе, Сахвея! Слязамі мёртвага не паднімеш! Усі там будзем, толькі не ў адно ўрэм'я!» Таксама і маці ўтрымлівае сваю дачку, калі яна занадта пакутуе па бацьку: «Мая дзетка, годзе табе слёзкі ліць: бацькі з таго свету не вернеш!»

Труна робіцца пераважна з сасновых дошак і мае звычайную форму. Для дарослага даўжыня яе каля 3 арш., шырыня каля галавы да 1 арш., вышыня каля 12 вяршк. Ні звонку, ні з сярэдзіны труна нічым не абіваецца. У яе кладуць сена і стружкі, а таксама травы, асвячоныя «на Макавея», 1 жніўня. Усё гэта накрываецца палатном. Пад галаву кладуць падушачку са стружак ці з лісця венікаў, у крайнім выпадку — з сена.

Труну заносяць у хату і ставяць каля памёршага, а века пакідаюць у сенцах [...]

Пахаванне адбываецца звычайна на другі дзень пасля смерці. Для пахавання абавязкова запрашаецца прычт, прыносіцца з царквы крыж і харугвы. Сваякі і знаёмыя прыходзяць па жаданню. Перад абразамі запальваюць свечкі і лампады, прысутным таксама даюць свечкі, прычым свечка свяшчэнніка загортваецца ў хустку, а іншыя ў палатно. Свяшчэннік апранае жалобную рызу і адбывае адпяванне, затым нябожчыка кладуць у труну. Тады ўсе развітваюцца з нябожчыкам, цалуючы яго ў руку. Потым труна закрываецца векам, зверху — кавалкам палатна і выносіцца. Следам за трунои сыплюць жменямі жыта ці ячмень,— «каб у доме больш не было смерці», потым прыбіраюць ложа, дзе ляжаў нябожчык, мятуць падлогу і вымятаюць заляжалае смецце. Прыбіраюць з акна шклянку з вадой і ручнік.

Заможных нябожчыкаў перш нясуць у царкву, дзе адбываецца паніхіда ці літыя, бедных нясуць з дому прама на могілкі, але насупраць царквы, пры выхадзе з сяла і на раздарожжы, робяцца прыпынкі і чытаецца евангелле.

На могілках пасля літыі века забіваецца цвікамі, і труна на доўгіх ручніках апускаецца ў магілу. На засыпанай магіле адразу ж ставіцца крыж, хаця б маленькі, часовы, пакуль не будзе зроблены пастаянны.

З могільніка прычт, прысутныя і запрошаныя жабракі накіроўваюцца ў дом нябожчыка і там ім прапануецца «памінальны абед», ці «гарачкі». Гарачкамі абед завецца таму, што да яго абавязкова падаецца гарачы пшанічны хлеб — паляніцы, якія не разрэзваюцца нажом, а разломваюцца на кавалкі рукамі, каб з яго свабодна выходзіла гарачая пара. Робіцца гэта затым, каб душа памёршага гэтай парай падмацавалася напярэдадні далёкага падарожжа на той свет.

Свяшчэннік служыць у доме літыю з абвяшчэннем вечнай памяці нябожчыку, потым усе сядаюць за стол. На стале загадзя ставіцца «канун» з рассычанай мёдам вады і пакрышанымі абаранкамі. Пасля кануна [...] прысутныя хрысцяцца і кажуць: «Дай жа божа нашаму нябожчыку вешны пакой, царства нябеснае, рай светлы! Няхай спачывае ды нас доўга дажыдае!» Стравы падаюць звычайна на стол у наступным парадку: боршч з буракоў ці капусты, суп з якой-небудзь крупы, лапшу, смажанае мяса ці рыбу, піражкі, кашу і ўзвар. Колькасць страў залежыць ад ступені заможнасці.

Пасля абеду ўсе зноў моляцца і, падзякаваўшы гаспадарам, разыходзяцца. Прычту пры гэтым даецца дамоўленая ўзнагаро-

да: пяць паляніц, палатно, якім была пакрыта труна ў час провадаў, і хусцінкі ці кавалкі палатна, у якія былі загорнуты свечкі ў час адпявання. «Царкоўнае» — за харугвы, мары, венчык і малітву і на пазвоннае аддаецца царкоўнаму старасце.

Памінкі па памёршым адбываюцца на трэці дзень пасля смерці—траціны, на дзевяты дзень—дзевяціны, на саракавы дзень—саракі, у дзень паўгоддзя і ў гадавіну. У трох апошніх выпадках служацца ў царкве паніхіды, а дома рыхтуюцца «заздароўныя сталы», якія завуцца так таму, што прычтам адбываюцца ў доме малебны за здароўе жывых. Парадак абедаў той самы, што і ў дзень пахавання.

У астатнія дні памінак паніхіды не служацца, а даручаюць маліцца за памёршага старцаў, якія пяюць звычайна такі верш:

Госпадзі, спамяні!
Дзяды вашы да бабусі,
Атцы вашы да матусі,
Дзядзькі вашы да цёткі,
Браты вашы да сёстры,
Дзетачкі вашы маленькія,
Ангалы хрышчоныя,
Чада вазлюблёныя!
Госпадзі! Божа, спамяні:
Да дзевятага пакалення,
Да дзесятага пачытання,
У вялікам росце,
Каторых мы не знаем,
Сам бог спазнае,
Па імені пачытае!
Данясі, госпадзі,
Да цара Давыда,
Да горада Русаліма,
Да прэдкага Адама,
Да прысветлага царства!
Запішы, госпадзі,
У кнігі духоўныя,
У граматы царкоўныя,
У псалтыр вешны!

Затым абвяшчаецца вечная памяць: «У блажэнным успенні» і г. д.

## XX. Пахавальны абрад у м. Старына Ваўкавыскага п.

Калі чалавек памірае, яму пры апошнім уздыханні даюць у рукі грамнічную свечку. Старэйшы з прысутных у доме хрысціць паміраючага. Цікава, што сяляне нашай мясцовасці пераважна паміраюць без споведзі: не ўведзена чамусьці ў звычай запрашаць свяшчэнніка для споведзі небяспечнага хворага.

Калі ж чалавек, як кажуць сяляне, акасцянее, дык пасылаюць за бабкай-павітухай, якая з дапамогай іншых жанчын павінна абмыць памёршага, за што, вядома, атрымлівае пэўную плату. Памёршага абмываюць цёплай вадой у вялікіх начоўках, пасля чаго яго апранаюць у чыстую белую кашулю з тонкага палатна і такія самыя штаны; жанчынам надзяваюць спадніцу свайго вырабу, на ногі нацягваюць белыя панчохі, апошнім жа

часам часта сталі абуваць боты, жанчынам — чаравікі. Галовы па большай частцы не пакрываюць, але зрэдку надзяваюць шаппа большай частцы не пакрываюць, але зрэдку надзяваюць шапку: мужчынам — мужчынскую, а жанчынам — жаночую, зробленую з чырвонай матэрыі. Калі ж памірае дзяўчына ці юнак, то іх апранаюць, як пад вянец: галаву дзяўчыны аздабляюць рознакаляровымі стужкамі; калі ж гэта здараецца летам ці вясной, то кладуць на галаву вянок з жывых кветак, на руку надзяваюць пярсцёнак. Калі кладуць у труну нябожчыка, пакрываюць яго палатном. Труна робіцца з сасновых дошак сялянамі, якія не даводзіліся нябожчыку сваякамі. (Сяляне чамусьці лічаць за грэх рабіць труну ці капаць магілу для свайго блізкага сваяка.) Таксама труну не фарбуюць ніякімі фарбамі.

Апрануўшы нябожчыка, яго кладуць у пачэсным куце, на лаве, што стаіць уздоўж знадворнай сцяны, галавой да абразоў. Затым пачынаецца галашэнне па нябожчыку. Плачуць жонка, маці, дзеці, сваякі, вядома, калі яны ёсць, плачуць, нарэшце, і знаёмыя прысутныя. Гэты плач не для формы толькі, наадварот, у ім выражаецца сапраўдная туга і шкадаванне памёршага. Тут вы пачуеце, як ад паўнаты пачуцця вусны прамаўляюць. Нярэдка дзяўчаты складаюць цэлыя элегіі, поўныя паэзіі, мастацтва і прыгажосці. Вы, слухаючы іх, міжволі плачаце.

У вёсцы, як толькі дазнаюцца пра смерць каго-небудзь, адразу пачынаюць збірацца ў дом да нябожчыка. Кожны, хто прыходзіць у дом, становіцца на калені і чытае шэптам малітву за ўпакой душы памёршага. Пасля заканчэння малітвы ён падыходзіць да нябожчыка, цалуе яго, развітваючыся з ім, зноў чытае малітву, зноў яго цалуе, і калі яго не запросяць закусіць [...], то ён неўзабаве ідзе дадому. Запрошаныя застаюцца, каб паплакаць над нябожчыкам, суцешыць яго сям'ю і памагчы прыгатаваць яго да пахавання. Калі сям'я нябожчыка ў спасцігшым яе горы звернецца да каго-небудзь за неабходнай дапамогай, як, напрыклад, зрабіць дамавіну і г. д., то ёй у тым ніхто не адмовіць, таму што невыкананне падобнай просьбы лічыцца страшным грахом.

Больш заможныя сяляне запрашаюць чытальніка, які ведае польскую грамату. Ён замест псалтыра чытае над нябожчыкам польскія заўпакойныя малітвы, а здараецца часта спявае тыя ж самыя малітвы, у чым яму дапамагаюць іншыя асобы.

Праз суткі, а то і больш пасля смерці нябожчыка адвозяць у царкву, а часцей за ўсё прама на могілкі. Труну праводзіць ледзь не ўся вёска, толькі некаторыя сяляне, занятыя неадкладнай работай, выходзяць у гэты час на вуліцу і, стаўшы на калені, чытаюць малітву. Натоўп народу не адстае ад падводы з трунои

і пасля таго, як яна выедзе за ваколіцу вёскі. Калі труна па дарозе параўняецца з вялікім драўляным крыжам, які можна сустрэць у канцы кожнай вёскі, шэсце спыняецца і ўсталёўваецца цішыня, усе становяцца на калені і моляцца за ўпакой душы памёршага. Пасля малітвы кожны з праважатых бярэ ў рукі па жмені зямлі, а зімой — снегу, і кідае ў той бок, дзе стаіць труна, замест таго, што яму давялося б рабіць на могілках, калі труну закопваюць у зямлю. Нарэшце падвода з трунай, якая ў гэты час ужо зачыняецца векам, рухаецца з месца і народ з сумам у сэрцы разыходзіцца па дамах. З рыданнем, якое раздзірае сэрца, і галашэннем развітваюцца з нябожчыкам яго родныя. Парой патрэбна вялікае намаганне, каб адцягнуць іх ад труны і адвесці іх дадому. Здараецца, хоць вельмі рэдка, што праводзіць нябожчыка запрашаюць свяшчэнніка, аднак сяляне больш ахвотна бяруць для адпявання свайго грамацея, таму што з ім яны могуць і самі спяваць памінальныя песні, хай сабе і польскія.

Калі царква недалёка, нябожчыка адвозяць туды, дзе ён і застаецца на працягу двух сутак. На трэція суткі, пасля таго як адслужаць паніхіду, а здараецца, і абедню, яго адвозяць на могілкі, дзе яго і хаваюць. Прысутнасць пры пахаванні нябожчыка не лічыцца абавязковай, таму са сваякоў і знаёмых мала хто застаецца.

Калі труну апускаюць у магілу, ці, як кажуць сяляне, *у дол*, усе прысутныя кідаюць туды па жмені зямлі, пасля чаго магілу закопваюць і ставяць на ёй невялікі драўляны крыж, часам саджаюць дрэвы і кветкі, уласна, затым, каб потым можна было лёгка пазнаць магілу, калі прыйдуць на могілкі паплакаць і памаліцца, што нашыя сяляне вельмі часта робяць. Невялікі крыж часам замяняецца ў будучым вялікім, які адначасова служыць помнікам. Іншых помнікаў не робяць.

## XXI. Пахавальны абрад у Лашынскай вол. Ваўкавыскага п.

Памёршага звычайна абмываюць цёплай вадой і апранаюць у самае лепшае святочнае адзенне. Памёршую дзяўчыну апранаюць, як пад вянец: на галаве белая хустка, у якую ўтыркаюць два букеты кветак, пераважна з руты, калі летам, а зімою — са штучных кветак. Нябожчыка, якога б ён ні быў полу і ўзросту, кладуць на лаву (нерухомую, уздоўж сцяны) галавой да пачэснага кута, так званай *покуці*, а нагамі да полу. Ніколі нябожчыка не кладуць нагамі да парога, а абавязкова так, каб таму, хто

ўвайшоў у хату, галава яго прыходзілася з левага, а ногі з правага боку. На покуці, за галавой памёршага, адразу ж ставіцца цэльны аржаны хлеб, *бохан*. Родныя, пераважна жанчыны, становяцца каля ног нябожчыка і пачынаюць яго аплакваць з рознымі галашэннямі, у якіх часта выказваецца цэлае жыццеапісанне.

Сяляне Гродзенскай губерні заўсёды любілі і любяць хаваць сваіх нябожчыкаў з належнай урачыстасцю і таму да вынасу з дома цела памёршага на могілкі заўсёды запрашаюць свяшчэнніка, калі ён толькі ёсць паблізу. У далёкіх жа вёсках замест свяшчэнніка запрашаюць з гэтай мэтай псаломшчыка. За малітву і провады плацяць свяшчэнніку 50 кап., а псаломшчыку, калі ён служыць адзін, без свяшчэнніка,— два гарцы гароху ці сачавіцы, а часам — бабоў, і толькі ў рэдкіх выпадках ячменных круп і 15 к. Калі кладуць у труну нябожчыка, то яму з правага боку ў галовах кладуць тое, што ён любіў пры жыцці, напр. гарэлку (у бутэльцы), тытунь у табакерцы ці люльку і некалькі лістоў махоркі.

Калі нябожчыка выносяць з хаты, хто-небудзь з хатніх ці сваякоў налівае ў міску прыблізна гарнец чыстай вады, высылае туды каля кварты аўса і, абышоўшы тры разы вакол запрэжанай кабылай падводы з гэтай сумессю, аблівае ёю апошнюю. Пры гэтым неабходна адзначыць, што на жарэбнай кабыле нябожчыка ні за што не павязуць, таму што кажуць: «Выбрасіць яна жарабёнка, аж да трэцяга дня і сама здохнець».

Выносяць нябожчыка абавязкова нагамі наперад. «Калі нябожчыка вынясуць,— кажуць,— упярод галавой, то ў доме ўсе да аднаго вымруць». Калі памёршы — гаспадар дома і ў яго ёсць дочкі, яны садзяцца на яго труну, прыкладваюцца да яе галавой і, падтрымліваючы яе рукамі, плачуць, прыгаворваючы: «А мой жа ты татулечка! А мой жа ты раднюсенькі! (Сумная працэсія ў гэты час рухаецца з месца.) Да пажэгнайся ты з цэлым светам, да з суседамі! Да папрасі ты іх, каб яны нас не гнеўбілі да не крыўдзілі». Пад'язджаючы пад хату, гаспадар якой быў не ў ласцы з памёршым, плакальшчыцы гавораць: «А мой ты татулечка, а мой ты раднюсенькі! Да перапрасі ты дзядзькі, што меж вамі была нязгода да нараканне, а цяпер адзін другому даруйце, бо вы, бывала, адзін да другога ваўком глядзелі, а цяпер ужэ няма за што гневацца. І ты, дзядзенька Пятрук ці Баўтрук». А *дзядзька*, калі даруе памёршаму, то, выйшаўшы са свае хаты, становіцца на калені і, узяўшы трохі зямлі, патрасае яе рукамі і гаворыць: «Добры быў чалавек Езыб ці Міхась (імя нябожчыка), дарую я табе, братачка! Няхай табе бог дасць неба!» Калі ж

гэты гаспадар даравацъ нябожчыку не жадае, то ён не выходзіць са свайго дому. У час, калі нябожчыка правозяць, звычайна на дарогу выходзяць усе гаспадары са сваімі сем'ямі, становяцца на калені і чытаюць малітвы («Отча наш», «Багародзіцу» і «Вечную памяць»), па заканчэнні якіх бяруць з напарстак зямлі ў рукі, перацціраюць яе далонямі і гавораць: «Няхай яму ці ёй бог ласкавы дасць неба!» Выкінуўшы затым з рук зямлю, разыходзяцца па хатах. У некаторых вёсках Лашынскага прыходу, як, напрыклад, у Казлах, Канюхах, Магілянах і інш., вярнуўшыся з могілак, воз, на якім везлі памёршага, ставяць аглоблямі ўгору на дах так, што заднія колы стаяць на зямлі, а пярэднія вісяць у паветры. «Гэта на тое,— кажуць сяляне,— штоб нябожчыку лягчэй было ехаці да неба» [...]

Адносна самазабойцаў магу паведаміць наступнае. Труну для іх збіваюць абы-як з самых паганых дошак і мерцвяка кладуць туды неабмытага і непрыбранага. У труну самазабойцы кладуць і тую прыладу, якой ён пазбавіў сябе жыцця, як, напр., нож ці вяроўку [...]

Труну з целам самазабойцы заносяць звычайна ў якое-небудзь багністае месца ці ў лес, калі ён блізка, дзе пры дарозе і закопваюць. Па Гродзенскай і Віленскай губерням кожнаму падарожніку, асабліва ў лесе, кідаецца ў вочы тое месца, дзе пахаваны самазабойца, на ім заўсёды накідана вялізная куча ўсякага ламачча. Справа ў тым, што, паводле павер'яў нашых сялян, кожны прахожы ці праезджы абавязкова павінен на магілу такога няшчаснага кінуць што-небудзь: камень, палена, сучок і г. д., інакш памёршы будзе за ім доўга гнацца.

Калі дзіця памерла і пахавана без хрышчэння, то, паводле веравання народа, часта можна чуць, як яно жаласліва плача, а калі прыставіць вуха да яго магілы, гэты плач чуваць яшчэ лепш. Каб яго супакоіць, трэба тады сказаць, калі мужчынскага полу: «Будзь Іван ці Сцяпан!», а калі жаночага, то: «Будзь Ганна ці Марыя!»

Згодна з вераваннямі сялян Гродзенскага павета, памёршыя без споведзі і прычасця, як, напрыклад, ведзьмары, ведзьмы і інш., ходзяць уночы па хатах і трывожаць спакой жывых. Таму, калі па вёсцы прабяжыць чутка пра падобныя хаджэнні, сяляне хутка збіраюцца на сход і гавораць: «Трэба пайсці ўночы ды адрубаць галаву пакойніку і палажыць яму ў ногі, тулька глядзіце, каб ён рукамі не дастаў галавы, бо ён зноў будзе хадзіць». Такі прысуд яны, хоць у рэдкіх выпадках, выконваюць, зразумела, сакрэтна, каб ні свяшчэннік, ні паліцыя пра гэта не даведаліся.

У заключэнне павінен сказаць, што ўсе прыведзеныя тут факты адбываліся на маіх вачах, я быў не раз іх назіральнікам, паколькі ў канікулярны час 1854 і 55 гадоў з-за хваробы майго бацькі я сам па Лашынскаму прыходу адбываў неаднаразова провады нябожчыкаў на могілках.

## XXII. Пахаванне і памінкі ў в. Гнядзілава Вілейскага п.

Калі цела выносяць з хаты, труна ставіцца зімой у запрэжаныя санкі, а летам на воз, на труну садзіцца адна з галасістых плакальшчыц, сваячак нябожчыка, а каня вядзе адзін з пажылых мужчын. Пры гэтым трэба заэначыць, што для нябожчыка запрагаецца конь самы худы і ніколі не запрагаецца жарэбная самка; пад мужчыну запрагаецца стары конь, а пад жанчыну — старая бясплодная кабыла. Запрагаюцца старыя коні таму, што такіх коней нельга ўжо выкарыстоўваць для вяселля,— каб маладыя, маўляў, былі даўгавечныя, інакш не будуць доўга жыць, калі ў вяселлі ўдзельнічае конь, які вазіў нябожчыкаў; жарэбная кабыла не запрагаецца пад нябожчыкаў затым, каб заўчасна не скінула плода [...]

У час праводзін і пры пахаванні царкоўны спеў заглушаецца нястрымным крыкам з прычытаннем жанчыны, што сядзіць на труне, і натоўпам плакальшчыц, якія ідуць за трупой [...] Галашэнне жонкі па мужу ці мужа па жонцы такое самае, як галашэнне па маці і бацьку, толькі прыгаворваецца: «мілюсенькі, любусенькі, таварыш». Але калі сваячкі плачуць па жонцы, у якой муж быў цяжкі, то галашэнні бываюць дакорлівыя [...] Вось дзе сказваюцца і як сказваюцца ўсе жыццёвыя абставіны нашага простага чалавека! [...] Пасля пахавання народ становіцца на калені вакол свежай магілы і чытае шэптам польскія малітвы [...] Пасля пахавання гаспадар дома дае для ўсіх суседзяў і гасцей пахавальны абед [...] Напачатку абеду, калі кругавая чарка абыходзіць гасцей, пасаджаных за сталом, кожны перш-наперш некалькі кропель з гэтай чаркі пралівае на стол, нібыта на долю памёршай, а потым ужо выпівае яе сам.

Такімі цырымоніямі абстаўляе наш селянін увесь звычай пахавання памёршых, але гэтым ён яшчэ не заканчвае, а аддае апошні доўг памёршым асянінамі, але асабліва ў прыкладах, а наогул усім — у штогадовых дзядах [...]

Самы багаты час у селяніна-хлебароба восень [...] Таму ўвосень мы пераважна сустракаемся з багатымі ўкладамі сялян, на-

прыклад стаўры, прыклады і асяніны. Стаўры і асяніны існуюць пад агульнай назвай дзядоў, ці агульных памінак, і розняцца тым, што 1) не адначасова спраўляюцца: так, стаўры адбываюцца ўвечары, напярэдадні 14 верасня..., а асяніны між змітраўскай суботай і днём Касьмы і Дзям'яна, г. зн. ад 26 кастрычніка да 2 лістапада — дня, у які ў лацінян памінаюцца ўсе нябожчыкі; 2) стаўры адбываюцца з меншай урачыстасцю абстаноўкі ці не так, як кажуць сяляне, «гучна», як асяніны...

Кожны гаспадар стараецца да стаўроў абмалаціць некалькі снапоў пшанічкі, змалоць зернейка ў хатніх ручных жорнах на пірагі і прыняць са свайго стада адну маладую авечку; гаспадыня 13 верасня ўжо варыць квасок і крупнік з баранінай і пячэ пірагі колькасцю адпаведна душам у сям'і і дзве малыя перапечкі: адну для старцаў, другую ў царкву. Увечары таго ж дня пачынаюцца стаўры галашэннем сялянак з прычытаннямі па памёршых родных; пасля гэтага плачу накрываецца стол, на стале—страва, запальваецца васковая грамнічная свечка, чытаюцца малітвы, у ліку якіх і заўпакойная, гаспадар абводзіць вакол налітай стравы тройчы свечку, прымацоўвае яе да абраза і ўся сям'я прымаецца есці і піць.

Пасля гэтай вячэры чытаюцца тыя ж малітвы, што і перад вячэрай, і свечка тушыцца, але стол з рэшткай стравы і прыборам не прымаецца, а застаецца непрыбраным да раніцы згодна з павер'ем, што прыйдуць за гэты стол на стаўры душы памёршых сваякоў. Раніцай 14 верасня гаспадары з перапечкамі, а гаспадыня з кавалкамі палатна, ручаямі льну і горсткай авечай воўны выпраўляюцца, як кажуць, «на кермаш» у тую царкву, храм якой пасвечаны ў імя ўзвіжання крыжа гасподня, дзе перад царквой у два рады рассаджваюцца жабракі. Ідучы ў царкву праз іх рады, сяляне дзеляць ім перапечкі з просьбай памянуць сваіх родных, і тут на розныя лады чуваць прычытанні жабракоў: «Памяні, божа, Антосеву душачку... Ах, памяні ж божа... прыпомні... за спосаб жыцця Петруся... за здаровейка Марысі... за скацінку Яна... за пчолкі Сымона... за ўраджай Якуба» і г. д. У царкве сяляне на прыгатаваны стол кладуць перапечкі, на вынесены абраз вешаюць кавалкі палатна, кладуць ручайкі льну і горсткі авечай воўны... Пасля набажэнства сяляне накіроўваюцца ў карчму ці ў царкоўнай загароджы рассаджваюцца гуртамі і закусваюць прынесенымі з сабой з дому пірагамі і маслянікамі [...] Гэтым і заканчваюцца стаўры, а разам з імі і «кермаш узвіжанскі» [...]

Ад 2-га лістапада на працягу цэлага года да асянін магілы памёршых не прыкладваюцца, і толькі з 1-га кастрычніка сяляне

пачынаюць рыхтавацца да прыкладаў. Больш заможныя гаспадары заказваюць заўпакойныя абедні па памёршых на працягу года сваіх родных; зрэшты, заўпакойныя абедні заказваюцца часам і гаспадарамі, у сем'ях якіх у той год і не было смерці [...]

Ад пакрова прасвятой багародзіцы чуваць таргі заможных сялян з каменшчыкамі наконт помнікаў, бачыш у полі селяніна, які дзяўбе малатком камень і з гэтага каменя выраблае крыж, а там над плітой працуе малады хлопец, выбіваючы на ёй крыжык і год смерці. Менш заможны і бядняк паўзе да пана з просьбай ахвяраваць для нябожчыка яліну на крыж і прыкладку: сякуць, чэшуць, габлююць, робячы крыжы 4-, 6-, а хто і 8-канцовыя. А вось абчасанае палена даўжынёй з магілу — гэта прыкладка. Кіпіць работа сялянская, ды як ёй не кіпець, калі ўсё гэта робіцца ў памяць любімай істоты, якая адышла ў замагільнае жыццё і пакінула нас да часу ў моры жыццёвых хваляванняў, кіпіць з поўнай верай рана ці позна аб'яднацца з ёй вечна. Пры гэтай немудрагелістай дзейнасці ў сельскай глушы бачыш усё багацце духоўнага жыцця простага чалавека, жыцця вечнага...

Надышоў дзень прыкладаў, са светам з'яўляюцца да гаспадара госці, г. зн. усе тыя, хто прымаў удзел у пахаванні, выдаецца поснае сняданне, якое складаецца з аўсянага кісялю, талакна і масланікаў, пасля якога, калі гаварыць пра заможнага, гаспадар і палова гасцей накіроўваюцца на абедню, а другая палова застаецца дома для падрыхтоўкі да прыкладаў. Але вось адслужылі абедню, прывезены на могілкі крыжы, помнікі і прыкладкі, нарэзаны дзёран — пакрывала для магіл, прыбыў і свяшчэннік туды ж з псаломшчыкам: «Дзень добры, братцы!» Простагаловы натоўп мужчын і жанчын у адзін голас адказвае: «Дзень добры, бацюшка!» — «Прымайцеся, галубочкі, за справу і памолімся госпаду». Цішыня парушаецца, і рыдлёўкі паўсюль абгладжваюць і прыбіваюць насыпы магіл, капаюць ямы для крыжоў, рассцілаюць дзярновыя дываны, ставяць помнікі, умацоўваюць крыжы і кладзецца на магілу абчасаная плашка дрэва — гэта прыкладка. «Усё гатова, айцец духоўны»,— дакладвае ганаровы прыхаджанін, і пачынаецца малітва.

Пасля малітвы на магілах рассцілаюцца абрусы, на іх ставіцца закуска, рассаджваецца народ вакол магілы і, як на пахавальным абедзе, кругавая чарка абыходзіць усіх і кожны палівае некалькі кропель на магілу памёршай, а пасля закускі ўсе рэшткі з абруса страсаюць на магілу: і крошкі хлеба, солі, і абгрызеныя косці, мяса — няхай, маўляў, паесць памёршая [...] У былыя часы.. ча прыклады свяшчэнніка не запрашалі, а самі чыталі шэп-

там малітвы і спявалі польскія песні, але, дазнаўшыся пра гэта, я сам умяшаўся ў гэту справу. Гэтым заканчваюцца прыклады, і гаспадар дае дома поўны мясны абед, на якім спачатку ў выглядзе закускі падаюць мяса і аладкі, залітыя смятанай ці маслам, потым кіслая страва, далей груца, крупнік, каша, мяса і, нарэшце, смажаны певень. Усе стравы [...] не маюць характэрных асаблівасцей, акрамя пеўня. Пеўня бярэ адна са старых, пачынае спяваць пеўнікам, падымаецца агульны гоман, госці кідаюцца да старой, каб адабраць пеўня, яна бяжыць, супраціўляецца, але ў рэшце рэшт пеўня ад старой адбіраюць і дзеляць. У падобнай гульні з пеўнем госці выказваюць гаспадару жаданне будзіць жыхароў дома пасля пеўневага спеву, сімвалам чаго ў іх служыць смажаны певень.

...«Трэба пярвей грэшнае цела абмыць, а патом і дзяды адбыць»... Ад гэтай прымаўкі можна заключыць, што дзяды ў селяніна лічацца абрадам свяшчэнным.

...З асянінамі сходны і іншыя дзяды, напрыклад мясніцы, радуніца і сёмка. Адбываюцца яны ў тыя ж самыя дні, калі і святая царква памінае памёршых, а іменна змітраўская субота, субота мясного тыдня, аўторак фаміного тыдня і пярэдадне святой тройцы, аднак спосаб святкавання іх зусім розны і прыгожая карціна жывога і непарыўнага саюза жывых і мёртвых азмрочана ў селяніна туманам прымхаў. У памінальныя дні селянін не лічыць абавязковым памаліцца ў царкве, але адбыць дзяды пасвойму — яго святы абавязак...

Перад асянінамі ў чацвер праводзяцца прыдзедкі з мэтай паесці і папіць уволю, паколькі на асяніны за гасцямі сем'яніну часам не зусім удаецца задаволіць сваё абжорства. Амаль цэлы год селянін харчуецца пасніцай і мякінным хлебам, кажучы, што свінні збіраюцца пайсці на яго з прашэннем за тое, што ён надзённую іх ежу — мякіну — есць, але затое ў пэўныя дні... памінкі, заговіны і дні святочныя ён думае цалкам пра сваё чэрава... У дзень асянін сяляне чакаюць запрошаных гасцей, заможныя клічуць старцаў і паляць лазні. Увечары, пасля лазні, пачынаюцца асяніны: накрываюць стол, а каля печы на лаве ля стаўбца для памёршых засцілаецца абрус, адліваюць трошкі пітва і стравы, пасыпаюць солі, кладуць кавалак хлеба і адчыняюць верхні душнік, праз які павінны ўвайсці душы нябожчыкаў на асяніны. Перш за ўсё на стале з'яўляецца пітво і закуска, якая складаецца з каўбасы, мяса і аладак [...] Потым ставяць на стол страву, запальваецца грамнічная свечка, якую трымае ў руках гаспадар, кладзецца курак і чытаюцца тыя ж малітвы, што і на стаўрах. Затым селянін запрашае на асяніны душы нябожчыкаў, кажучы:

«Прыходзьце к нам на асяніны ўсе тыя, хто займаў гэтую сяліцьбу», выклікаючы па імёнах былых гаспадароў дома, абводзіць вакол стравы тройчы свечку і курак, свечку прымацоўвае да іконы, а курак кладзе на стол, каб раніцай аддаць старцам, і садзяцца вячэраць. Тут таксама ад першай чаркі і ад першай лыжкі стравы кожны пралівае на стол на долю нябожчыкаў... Гэта вячэра багацейшая, чым на стаўры... Пасля вячэры тушаць свечку і тут заўважаюць, куды ад яе пойдзе дым,— калі на кут, то гэты год усе ў хаце будуць жыць, калі пойдзе да дзвярэй, то некаму давядзецца памерці. Стол пасля вячэры, як і на стаўрах, не прыбіраецца да раніцы.

Іншыя дзяды адбываюцца падобна да асянін, хоць і не так багата, але маюць свае асаблівасці. Напрыклад, у мясніцы пасля вячэры ўся моладзь выпраўляецца ў шынкі на ігрышча... «Мясніцы,— гаворыць селянін,— павінна адбываць усякаму, у якой хаце здаўна заведзены такі ўклад, бо не павядзецца скаціна, а ў якой хаце няма здаўна такога ўкладу, той і не пачынае заводзіць яго таму, што тая ж скацінка не будзе весціся...»

На радуніцу сяляне нясуць на магілу яйкі, пірагі, мяса [...] Тут п'юць, закусваюць, паліваюць пітвом магілы, закопваюць у магілах яйкі, кідаюць кавалкі пірага і абгрызеныя косці, мяса — усё гэта служыць тут ежай для зграі сабак; абдорваюць старцаў, а ўвечары адбываюць дзяды таксама, як і на асяніны. У якой хаце памірае гаспадар, ...той, хто займае ў ёй месца гаспадара, павінен у памяць памёршага адбыць сем радуніц, пасля чаго малады гаспадар лічыцца поўным гаспадаром. На пытанне, чаму гэта так? «Вядома, кажуць сяляне, ён праз сем гадоў не можа завесці нічога свайго — у яго і скаціна гіне».

Сёмка нічым не адрозніваецца ад асянін.

## XXIII. Пахавальна-памінальныя звычаі сялян Кобрынскага п. Гродзенскай губ.

Просты рускі народ асабліва ўшаноўвае свайго памёршага сабрата, і абрады, якія адбываюцца ў простых людзей пасля смерці каго-небудзь з родных ці блізкіх знаёмых, уяўляюць даволі шмат цікавага... У нас сярод простага люду ходзіць павер'е, што душа памёршага на працягу трох дзён пасля смерці чалавека знаходзіцца ў тым доме, дзе жыў нябожчык. Таму сяляне стараюцца ў гэтыя тры дні не гаварыць пра памёршага блага, каб не прагнявіць яго душу. Цела памёршага селяніна ці сялянкі блізкія сваякі, а калі іх няма, то знаёмыя, абмываюць чыстай

вадой, апранаюць у белае адзенне і кладуць на лаву тварам да дзвярэй, а галавой у пачэсны кут, дзе ў гэты час павінен быць пастаўлен сноп жыта. Каля галавы нябожчыка ставяць крыж, а па баках запаленыя свечкі, і тады пачынаецца аплакванне нябожчыка. Усе хатнія павінны абавязкова аплакаць памёршага. Але перш за ўсіх пачынае плакаць жонка або маці нябожчыка. Тут яна пералічвае не толькі ўсе добрыя справы памёршага, але і ўсе словы, з пяшчотай сказаныя ім каму-небудзь з родных яшчэ пры жыцці. Гэта называецца прычытваннем ці прыпевам, таму што жанчыны звычайна плачуць нараспеў. У галашэнні жанчыны стараюцца як мага дакладней і выразней паказаць той сумны стан, які чакае сям'ю пасля смерці гаспадара дома, надзяляюць нябожчыка ўсялякімі параўнаннямі і эпітэтамі, як, напрыклад, галубок, зэзулочка..., ябланька мая, месяцу радной, рабыночка..., рыбачка і г. д. І чым болей галашэнняў, тым трапней і арыгінальней робяцца параўнанні, тым болей, лічыцца, гонару для нябожчыка. Затым падыходзяць бацька, старэйшы брат ці старэйшы сын нябожчыка, звычайна дарослыя людзі і, аплакваючы, выказваюць сваё шкадаванне адносна дачаснай смерці нябожчыка, нават калі нябожчык дасягнуў глыбокай старасці. Пасля іх падыходзяць дзеці, цалуюць рукі, ногі і твар нябожчыка і пачынаюць плакаць, хлопчыкі звычайна без прычытванняў, а дзяўчаты з прычытваннямі.

Дазнаўшыся пра смерць свайго аднавяскоўца, сяляне збіраюцца ў доме нябожчыка, каб выказаць сваё шкадаванне з прычыны напаткаўшай родных бяды і суцешыць асірацелую сям'ю. З кожнай хаты павінна хоць адна асоба наведаць памёршага. Дзяўчаты звычайна з'яўляюцца з распушчанымі валасамі, паколькі сярод іх існуе звычай пасля смерці каго-небудзь з сялян хадзіць з распушчанымі валасамі. Затым запрашаюць святара для правядзення паніхіды. Пахаванне адбываецца звычайна на трэці дзень пасля смерці нябожчыка. Памёршага кладуць у труну і ў суправаджэнні святара і сялян нясуць крыж, іконы і харугвы ў царкву, дзе служыцца заўпакойная літургія, пасля якой памёршага хаваюць. Усе дарослыя сяляне, як мужчыны, так і жанчыны з адной вёскі з памёршым, лічаць сваім абавязкам суправаджаць цела нябожчыка са свечкамі ў руках на могілкі. А калі апусцяць цела ў магілу, кожны павінен тройчы кінуць на труну жменю зямлі. Вярнуўшыся з пахавання, сяляне дакранаюцца тварам і абедзвюма рукамі да печкі, каб не было больш у доме нябожчыкаў.

У той жа дзень сваякамі нябожчыка робяцца ў яго гонар памінкі. На самым пачатку падаюць куццю, г. зн. кашу, прыгата-

вануюз ячменнай крупы. Старэйшы са сваякоў нябожчыка, прамовіўшы кароткую малітву за ўпакой душы памёршага..., бярэ адну лыжку куцці і, выкідваючы яе за акно, кажа: «Тобі, Сыдорэ!» Потым з'ядае сам тры лыжкі куцці, затым пачынаюць есці і астатнія прысутныя, па тры лыжкі кожны. Падаюць пітво, і тут чарка тым жа парадкам адпраўляецца за акно. Затым падаюць астатнія стравы, і першую лыжку кожнай з іх старэйшы ў сям'і выкідвае за акно са словамі: «Тобі, Сыдорэ!» За абедам гавораць выключна пра нябожчыка, весці гутарку пра нешта старонняе лічыцца непрыстойным. Чыгун, у якім варылася куцця, міска і лыжка адносяцца на могілкі і кладуцца на магіле нябожчыка, прычым так, каб міска з лыжкай знаходзіліся пад чыгуном.

На саракавы дзень пасля смерці селяніна свяшчэннік па просьбе сваякоў памёршага служыць заўпакойную абедню, пасля якой сяляне ставяць на магіле нябожчыка крыж [...]

У бацькоўскую суботу, якую па-мясцоваму называюць «дзядамі»..., паводле сялянскага звычаю, наладжваюць памінальную вячэру, на якой павінны выставіць 12 страў. Перад вячэрай сяляне моляцца за ўпакой душ сваіх памёршых сваякоў, а ў час вячэры частку ад кожнай стравы і чарку гарэлкі ставяць на падаконнік для дзядоў, г. зн. нябожчыкаў, і калі на наступны дзень па якой-небудзь прычыне гарэлкі ці пакінутага на падаконніку не акажацца, то сяляне бываюць цалкам перакананы, што прыходзілі ўначы нябожчыкі, якія з'елі і выпілі прыгатаванае для іх.

## XXIV. Пахавальныя абрады

Любой сям'і і грамадзе балюча перажываць страту блізкага чалавека, які заслужыў іх любоў, а тым больш вясковым сем'ям, у якіх нават дзевяцігадовыя дзеці прыцягваюцца да гаспадарчай працы. Народ плача жаласліва і на ўвесь голас пасля смерці каго-небудзь са сваіх родных. Гучны плач у хаце, на падворку, на вуліцы чуваць ці ад асіроцелай удавы, ці ад адзінокай маткі, плач гэты напоўнены горам, дарагімі ўспамінамі пра памёршага чалавека, у ім красамоўней, чым дзе, гучаць розныя вытанчаныя пахвальныя прамовы. Гэты гучны і напеўны плач, як і ў іншых краях, у народзе лічыцца абавязковым пры пахаванні. Калі б жонцы, якая засталася ўдавой, гора ў грудзях стрымала голас, то ёй нават нагадваюць, каб зацягвала галашэнне: «Ну ж, галасі!» Пасля таго як нябожчык будзе памыты і прыбраны, яго кладуць на лаву, што стаіць ад сцяны каля акна, якое выходзіць

на вуліцу. Усіх, хто заходзіць, шчыра сустракаюць і частуюць. Паклаўшы цела нябожчыка ў труну, лаву, з якой перанеслі цела, пасыпаюць збожжам, кладуць на талерку булку хлеба і ставяць на лаве ў тым месцы, дзе ляжалі плечы нябожчыка. На некалькі хвілін перад тым, як вынесці з хаты цела нябожчыка, мужчына і жанчына садзяцца па абодва бакі ад булкі хлеба на лаве, пасыпанай зернем. Збожжа і хлеб паміж гэтай парай людзей, якія нібы прадстаўляюць чалавецтва, з'яўляюцца і сапраўдным гербам селяніна, які жывіць сваёй працай чалавецтва, і самым адпаведным яму помнікам. Аднак жа гэты абрад выконваецца, магчыма, і затым, каб прыгадаць існаваўшы некалі звычай класці ў труну для мёртвых падсілкаванне на вечнасць [...] Але сёння-народ ужо не ў стане растлумачыць гэтай з'явы. Калі цела паважанага нябожчыка выносяць з дому, вясковыя кабеты часам кладуць булку хлеба на тапчан, дзе ляжаў нябожчык, садзяцца на тапчан вакол булкі, падскокваюць на ім, матляючы нагамі і выкрыкваючы: «Каб яму так добра было на тым свеце, як ён на гэтым быў добрым для нас». Калі нарэшце цела селяніна выносяць з хаты, пара, што сядзела па абодва бакі ад булкі на лаве, пасыпанай збожжам, устае і накіроўваецца за труной; булку прыбіраюць на далейшы хатні ўжытак, а зерне з лавы аддаюць курам. Пахавальнае шэсце рухаецца па вуліцы за чатырохдошкавай труной, якую ці нясуць на марах, ці вязуць на возе, запрэжаным валамі; жанчыны, галосячы па нябожчыку, на ўвесь голас выказваюць свой жаль. У той час здараецца калі-нікалі бачыць кабету з дзіцем на руках, якая набліжаецца да труны і прыкладвае сваё немаўля да шчыліны паміж векам і бакавой дошкай. Калі пацікавіцца ў кабеты, навошта яна так робіць, тая адкажа, што гэта асцеражэ яе дзіця ад трасцы. Гэты адказ не можа супакоіць. Пінчукі разам з літвінамі маюць перакананне, што пасля пэўнай падрыхтоўкі, зазірнуўшы ў дзірку дошкі, на якой ляжаў нябожчык, чалавек набывае дар бачыць духаў,— дар, які патрэбны жрацам пры святкаванні дзядоў. Набліжэнне дзяцей да шчыліны ў труне можна вытлумачыць як імкненне настроіць іх і падрыхтаваць у такія жрацы, асабліва калі яны дзесьці яшчэ і цяпер ужываюцца на святкаванні дзядоў. Пасля таго як цела нябожчыка будзе апушчана ў зямлю і засыпана, вярнуўшыся з пахавання, сяляне бяруць зімовай парой у прыгаршчы снег і абціраюць ім рукі, у іншы час тое самае робяць пяском. Навошта так робяць, самі ўжо гэтага не ведаюць; тыя, у каго пыталіся, толькі адказалі, што ў адсутнасць снегу бяруць пясок у далоні і тым пяском рукі абціраюць. Родныя, якія засталіся пасля нябожчыка, ходзяць да яго на магілу на працягу некалькіх дзён

раніцай і вечарам, падаюць тварам на магілу, гучна плачуць і клічуць з яе свайго кроўнага ці, як кажуць, будзяць яго. У першы ж год стараюцца пакласці на месцы захавання помнік: калоду, абчасаную гранямі, якая завецца прыкладам (прыклад), ці ставяць драўляны крыжык. Калі ў першы год не паспеюць гэтага зрабіць, тады робяць толькі на трэці ці ажно на сёмы год. Помнікі і крыжы ўстанаўліваюць на магілах звычайна перад запустамі вялікага посту і сёмухай; пасля гэтага, як і пасля пахавання, спраўляюцца ў хаце памінкі, якія таксама завуцца дзядамі, як і лістападаўская вячэра для нябожчыкаў, і на тых памінках успамінаюць сваіх продкаў, заслугі, вартасці і заганы, ядуць *куццю*, п'юць мядовую сыту і кладуць за акном некалькі кавалкаў памінальнай кашы для памёршых душ, але не паўтараюць усіх звычаяў, якія можна назіраць на ўласна дзядах, што праводзяцца ўвосень. Заўсёды захоўваючы сваіх продкаў у жывой памяці, народ у часе велікодных свят ускладае на магілах сваіх родных і сяброў маляваныя яйкі. У некаторым нават двары, дзе трымалі вясковую жанчыну для гадавання дзяцей, для падтрымання сувязі з народам і ведання пра яго патрэбы, якія не заўсёды праходзілі праз сцены палацаў, назіралася, як на вялікдзень чырвоныя яйкі падвешваліся на партрэце памёршага дзіцяці [...] Тая нянька з усёй сардэчнасцю і перакананасцю павесіла яйкі для духа колішняга любімага яе пестуна, верная перакананням, перанятым ад сваіх продкаў, пра душы нябожчыкаў.

## XXV. Пахавальны абрад палескага сяла Андронава

Існавала традыцыя «купляць магілу»: калі каго-небудзь хавалі, выбіралі сабе месца для будучай магілы і наказвалі сваякам, каб пахавалі менавіта там...

Калі чалавек паміраў, адчынялі акно або дзверы, каб душа нябожчыка магла адляцець. Апраналі нябожчыка ў новае адзенне ці прынамсі ў чыстае. Дзяўчат звычайна апраналі ў шлюбную сукенку і вэлюм («вэлён»). Лічылася, што яна на тым свеце можа выйсці замуж. Цела нябожчыка пакрывалі ручніком, што вісеў над абразамі ў яго хаце. Акрамя таго, цела нябожчыкамужчыны пакрывалі зверху галінкамі таполі, жанчыны — часцей за ўсё галінкамі бярозы. Памёршаму ў рот і правую руку было прынята класці грошы. У труну насцілалі сена і пакрывалі яго палатном. Падушку, на якую клалі памёршага, таксама набівалі сенам, шылі яе злева направа. Для выхаду душы рабілася ў труне невялікая адтуліна.

Перад пахаваннем практыкавалася абкурванне і напальванне магіл, каб да мерцвяка не маглі падабрацца злыя духі, якія праследавалі яго пры жыцці. Выкарыстоўваўся для гэтага ядловец, радзей салома...

Пры вынасе нябожчыка стараліся, каб яго цела не дакранулася да парога. Суправаджаючыя апраналіся ў вывернутае чорнае адзенне. Калі везлі нябожчыка на могілкі («моглыці»), кідалі на дарогу кветкі і галінкі елак, і нават каменні цераз плячо. Труну ставілі на слой жоўтага пяску ці падсцілку з бярозавых галінак або ядлоўцу. У магілу кідалі грошы. У труну клалі запасную адзежу. Дзеці кідалі ў магілу пясок, узяты каля дома памёршага.

Калі ўдзельнікі пахавання вярталіся з могілак, забаранялася азірацца назад. Дзеці пры гэтым збіралі кветкі і галіны, кінутыя на дарогу, калі нябожчыка везлі на могілкі.

Існаваў звычай выганяць душу памёршага, якая вярнулася ў дом: мялі венікам пакой, дзе ляжаў нябожчык, размахвалі сякерай.

Госці, якія прысутнічалі на памінках (на абедзе), заклікалі душы продкаў падзяліць з імі трапезу, дзякавалі ім за тое, што пачаставаліся. Душам продкаў для частавання вылівалі пад стол рэшткі недапітай гарэлкі і кідалі кавалачкі хлеба. У часе памінак жонцы нябожчыка належала ўсміхацца і нават смяяцца, каб не прагневаць душу памёршага. У дзень пахавання пад вечар і на наступны дзень нябожчыку на магілу «насілі вячэраць».

Неахрышчаных дзяцей хавалі ноччу, труну з целам дзіцяці неслі «пазагуменнем». Магілкі іх знаходзіліся ў левым верхнім кутку могільніка, каля агароджы. Насыпы на магілах неахрышчаных дзяцей мелі форму авала ці круга.

Могільнік сяла Андронава размешчаны на адкрытай мясцовасці, але воддаль, з усіх бакоў яго акружае лес. Знаходзіцца ён на перакрыжаванні некалькіх дарог.

## XXVI. Хаўтурны абрад

...Хворы, прадчуваючы свой канец, просіць паклікаць свяшчэнніка. Надыходзіць час ачышчэння душы за ўсе грахі перад развітаннем з гэтым светам. І споведзь — самы істотны момант у працэсе паміраня. Згодна з перакананнем людзей, надта цяжка душы таго чалавека, да якога не паспелі прывесці свяшчэнніка. «Яна не можа тады на тым свеце знайсці сабе месца і часта варочаецца да жывых і просіць прабачэння. То ў сне прыйдзе,

то ўдзень прыдасца. А як не паспеюць бацюшку прывезці, то хоць запаленую грамнічную свечку ў правую руку даць трэба»,— гаворыць інфарматарка з Галадоў.

У пакоі сабраліся блізкія. Прыйшлі развітацца, выслухаць апошнюю волю паміраючага. Стаіць падрыхтаваная грамнічная свечка. Не заўсёды сам працэс паміраиня праходзіў лёгка. Даволі часта чалавек доўга мучыўся ў смяротнай агоніі. Перш за ўсё, незалежна ад таго лёгкая смерць ці цяжкая, трэба падаць у рукі запаленую грамнічную свечку. У ваколіцы Заблудава лічаць, што агонь грамнічнай свечкі з'яўляецца праваднікам чалавека ў другі свет, асвятляе яму дарогу аж да моманту смерці. Пасля гэтага свечку тушылі, а запальвалі тую, што стаяла побач.

Калі чалавек доўга мучыўся і смерць доўга не прыходзіла, пасяснялі гэта тым, што быццам ён не ўладзіў поўнасцю сваіх зямных спраў. Засталіся нейкія даўгі, недараваныя крыўды, нанесеныя іншым. Прычына магла быць і ў тым, што ён яшчэ некага чакаў. Гэта не давала яму спакойна памерці. І народ стараўся рознымі спосабамі скараціць гэту доўгую смяротную агонію. Адным з іх была просьба да прысутных агульнага адпушчэння паміраючаму ўсіх крыўд, яго дрэнных учынкаў. І ўсе супольна гаварылі малітву.

Затым адварочвалі паміраючага тварам да сцяны, каб не бачыў людзей і не так шкада было развітвацца з імі. Адначасова гэта рабілася і для прысутных, каб яны не глядзелі на змучаны і зменены твар. На вопратцы паміраючага расшпільвалі ўсе гузікі, развязвалі ў хаце ўсе вузлы, што таксама павінна было аблегчыць і скараціць пакуты. Гэтыя спосабы вядомыя на ўсёй Беласточчыне і не толькі для беларусаў. Таксама адным са спосабаў скарачэння працэсу паміраиня з'яўляецца адкрыванне ўсіх дзвярэй, замкоў. Калі ж смерць была такая цяжкая, што працягвалася некалькі дзён, звярталіся да святара, каб ён адчыніў у царкве царскія вароты. Вядомым таксама з'яўляецца зрыване адной ці дзвюх дошак са столі. Тлумачаць гэта тым, што душа не можа пакінуць хату, не можа выйсці з яе.

У хаце сумны настрой, жалоба. Памёр чалавек. Завесілі (часцей абрусам або ручніком) усе люстры, калі закрыліся вочы нябожчыка. Спынілі ў хаце гадзіннікі. Для памёршага зямны час ужо не існуе. Яго душа падпарадкавалася другім законам. Пераступлен парог ад жывых на «той свет». Няма магчымасці звароту.

Нехта з хатніх ці запрошаных паехаў у царкву па «рэчы» — крыж і чорную харугву. У хаце рыхтуюцца да «нараджання». У залежнасці ад ваколіцы выконвалі гэта або хатнія, як, на-

прыклад, у Малешах, або часцей старэйшыя вясковыя жанчыны. Старую вопратку, як сказала інфарматарка з Галадоў, стараліся па меры магчымасці скідаць праз галаву.

Вось унеслі ночвы з вадой. У іх ручнік. Гэтым ручніком будуць мыць. «Мыць трэба там, дзе чалавек памёр,— гаворыць адна жанчына з Кошак, што ў Арлянскай гміне.— Калі ў кухні — у кухні, калі ў сенях — у сенях». Памёршы ляжаў раздзеты на разасланай на падлозе саломе. Адна падтрымлівала, другая выцірала змочаным ручніком. Ваду, якой мылі, лічылі шкоднай. Вылівалі яе найчасцей у выкапаную за парогам або за вуглом ямку. Парог быў свайго роду сімвалам. Быў ён той мяжой, якая быццам бы аддзяляла два светы — свет хатні ад свету навакольнага. Адным словам, выліць за парог ваду значыла вынесці з хаты няшчасце.

Абмытага пачыналі апранаць. Вопратка ўжо была падрыхтавана загадзя, яшчэ пры жыцці нябожчыка. Яна ляжала складзеная ў скрыні. Як правіла, апраналі ў цёмнае. Адносілася гэта, аднак, да старэйшых. Зусім інакш выглядала «нараджанне» маладой незамужняй дзяўчыны. Апраналі яе ва ўсё белае, на галаву нярэдка накладалі вэлюм і прыбіралі кветкамі. Усё гэта нагадвала выпраўленне да шлюбу, толькі выпраўленне сумнае.

Пакуль «нараджалі» нябожчыка, на панадворку рабілі труну. Некалі збівалі яе з дошак. «Нара́джанага», калі труна яшчэ не была падрыхтавана, клалі на покуці — на пастаўленых у куце пад абразамі і засланых цёмнай саматканкай табурэтках. Клалі яго галавой да абразоў.

Людзі верылі, што памёршы мае лячэбны ўплыў на некаторыя хваробы, асабліва на хваробы скуры, і, калі дакрануцца яго мезеным пальцам да хворага месца (лішая, скулы, бародавак і г. д.), скура ачысціцца, чалавек выздаравее. Былі выпадкі, калі лячылі нават эпілепсію. Як сказала інфарматарка з Кошак, трэба было прывесці хворага ў хату, дзе быў нябожчык, узяць нітку, памераць яго рост і пакласці нябожчыку ў труну. Тады, маўляў, ён забярэ хваробу з сабой на «той свет».

Прывезлі рэчы. На варотах паставілі харугву. Усім відаць — у гэтай хаце памёршы. Крыж клалі каля сцяны, дзе ляжаў нябожчык, перакрэсцем да яго галавы. У хату пачалі сыходзіцца аднавяскоўцы на апошняе развітанне. Чуваць спевы. Блізкія прычытваюць над памёршым. У яго згорнутых на грудзях руках — іконка. Поруч з ім гарыць свечка, у хаце ходзяць у чорным, а калі не — дык прынамсі жанчыны ў чорных хустках.

У хату ўваходзяць людзі. Усё больш і больш людзей у пакоі, дзе ляжыць нябожчык. Ніхто нікога не запрашае. Ідуць усе вяс-

ковыя, нават тыя, з кім памёршы жыў у нязгодзе. Гэта ў добрым звычаі — апошні раз наведаць чалавека, з якім ужо больш ніколі не сустрэнуцца. Хто ведае, калі чалавек памрэ? Смерць часу не выбірае. Назаўтра, можа, гэта чакае наступнага. Да яго таксама збяруцца людзі.

Прысутныя ўспамінаюць жыццё памёршага. Успамінаюць яго заўсёды добра. Ніколі не кранаюць спраў цёмных, дрэнных учынкаў, хібаў: «Не мы суддзёю. Бог яго судзіць будзе», тым больш што ў народзе лічыцца, быццам нябожчык усё чуе, пакуль не прыедзе бацюшка выводзіць і не заспявае «Са святымі ўпакой».

Хтосьці заўважыў, што ў нябожчыка прыадкрытае вока — прыкмета таго, што неўзабаве зноў у вёсцы нехта памрэ. Людзі стаяць, гавораць. Стараюцца не глядзець на твар памёршага, каб ноччу не сніўся. Прыгадваюць сны, якія прадказваюць наступнага нябожчыка.

Нехта з хаты пайшоў прасіць, каб прыйшлі паспяваць і пачытаць псалтыр. У вёсцы ёсць пэўная група людзей, якая гэтым пастаянна займаецца. Адмаўляць нельга. Прыходзяць, сядаюць за стол і пачынаюць спяваць. Існуе пэўная, выпрацаваная народам з цягам часу група песень, якія спявалі выключна над нябожчыкам. Змест іх сумны. Галоўная іх тэма — разлучэнне душы з целам. Спяваюцца яны нібыта ад імя памёршага, што паказвае на спробу пранікнення ў незямное жыццё, на спробу адкрыцця «таго свету». Хаўтурныя песні з'яўляюцца свайго роду кодэксам, згодна з якім павінен жыць чалавек на зямлі, каб запэўніць сабе шчаслівы вечны быт. У іх гучыць павучэнне для тых, хто яшчэ жыве.

Над нябожчыкам сядзяць цэлую ноч, спяваюць, чытаюць псалтыр. Некалі лічылася, што памёршы павінен ляжаць у хаце да трох сутак. Зараз гэтага не прытрымліваюцца.

Прайшла ноч. Набліжаўся час пахавання. У хаце нябожчыка зноў збіраюцца людзі. Прывезлі свяшчэнніка, які, адспяваўшы малітвы, прыступіў да «выводжвання». Чацвёра мужчын, узяўшы труну з бакоў, выносяць яе. Дакрануўшыся ёю па тры разы да парога, выходзяць на падворак. Стуканне труной аб парог — гэта свайго роду развітанне нябожчыка з хатай. Выносяць памёршага заўсёды нагамі ўперад.

У той час хатнія стараюцца як мага хутчэй зачыніць дзверы, асцерагаючыся, што, калі іх не зачыніць адразу за нябожчыкам, у гэтай сям'і неўзабаве зноў нехта памрэ. Толькі паднялі з покуці труну, на тое месца адразу садзіцца той, хто баіцца нябожчыкаў. Дастаткова толькі там сесці, як прападзе ўся боязь, і ня-

божчык не будзе сніцца па начах. Так верацьь, напрыклад, у Леўках і Мокрым, што ў Бельскай гміне.

Труна ўжо на падворку. Паставілі яе на падрыхтаваных зэдліках. Час развітацца з сялібай, асабліва калі памёр гаспадар. Выпускалі тады з хлявоў жывёлу, з якой той быў звязаны ўсё жыццё,— гэта было неабходнай умовай для далейшага паспяховага яе гадавання. У іншым выпадку, як гавораць людзі, яна паздыхала б. Так лічаць у розных мясцовасцях.

Пасля развітання памёршага з сялібай выходзілі на вуліцу. Наперадзе неслі крыж, а побач — харугвы. Далей ішоў свяшчэннік, за ім хор, потым неслі труну, за якой чувацьь быў лямант і плач — гэта ішла сям'я нябожчыка, за імі — аднавяскоўцы. Мужчыны, як правіла, былі з непакрытымі галовамі, жанчыны — абавязкова ў хустках. Пахавальнае шэсце накіроўвалася ў канец вёскі, дзе стаяў адзін або некалькі крыжоў.

У той час у вёсцы ніхто не мог спаць. Будзілі нават дзяцей. Сон і смерць, лічыцца, надта блізкія паміж сабой. Часта можна пачуць, як смерць чалавека называюць сном, а пра памёршага кажуць, што ён заснуў. З другога боку, бытуе перакананне, што ў час сну душа пакідае цела і ходзіць сама па сабе, што сны — гэта ўсё бачанае душой у час яе вандровак. Магчыма, у пару выводжвання нябожчыка людзей будзілі затым, каб нябожчык змог з усімі развітацца.

Пахавальнае шэсце ідзе вуліцай. І ў гэты час нельга пераходзіць вуліцу ці ісці насупраць. Трэба было зайсці за плот і пачакаць пакуль пройдуць. У іншым выпадку ў вёсцы зноў нехта неўзабаве памрэ.

І вось канец вёскі. Труну з нябожчыкам паставілі каля крыжа. Чарговае развітанне — развітанне з вёскай. Свяшчэннік моліцца. У некалькіх сказах успамінае жыццё памёршага, нагадвае людзям пра непазбежнасць, якая чакае кожнага чалавека. Да труны падыходзяць усе тыя, хто не будзе прысутнічаць на пахаванні і не пойдзе ў царкву на служэнне. Яны падыходзяць да нябожчыка і цалуюць яго ў рукі, жадаючы яму «нябеснага царства».

Труну паставілі на падводу. Далей, калі да царквы далёка, яе павязуць. Але здараюцца выпадкі, што калі памрэ нехта надта малады або чалавек, які карыстаўся вялікім прызнаннем, нясуць яго ўвесь час на плячах. Калі памерла малое дзіця, труну неслі абавязкова дзяўчаты на ручніках. Так па сённяшні дзень робіцца ў вёсцы Мокрае. У пахавальнай працэсіі не магла прымаць удзел маці памёршага дзіцяці, баючыся смерці іншых сваіх дзяцей.

Выйшлі за вёску і накіраваліся ў напрамку царквы. Хтосьці з сямейных (маці або жонка) нясе куццю, якую інакш называюць кашай. Пры пахаванні, як і пры нараджэнні, яна была неабходная. Пакуль нябожчык знаходзіўся ў царкве, людзі рыхтавалі магілу. Капалі яе тыя, хто найчасцей гэтым у вёсцы займаўся.

Настаў час апошняга падарожжа. У тым парадку, што і раней, выйшлі з царквы і накіраваліся на могілкі. Над падрыхтаванай магілай гучаць апошнія спевы. Пачуўся стукат малатка — гэта забіваюць труну, якую неўзабаве апусцяць у магілу. Нябожчыка клалі галавой на захад адпаведна дзвярам у царкве. Пасыпалася зямля. Першыя тры разы сыпнуў свяшчэннік. Потым падыходзілі прысутныя і таксама сыпалі па тры жмені, каб памёршаму зямля была лёгкая. Ставілі крыж у нагах, што таксама мела сваё значэнне: калі трэба будзе ўставаць на «страшны суд», памёршы схопіцца рукамі за крыж і яму лягчэй будзе падняцца.

Магіла засыпана. Жонка памёршага або маці, адным словам, той, хто прынёс куццю, частуе ёй прысутных. Бралі заўсёды рукой, жадаючы ўзамен «нябеснага царства» памёршаму. Калі куццёй частавалі адразу на могілках, азначала гэта, што не будзе пахавальнага абеду — гэтак было ў бедных сем'ях. У іншым выпадку ўсе ехалі ў хату, дзе і дзялілі куццю. Абед быў сціплы, ціхі. Апрача куцці, іншых тыпова пахавальных страў не было. Выстаўлялі ўсё, што змаглі падрыхтаваць [...] Пасля абеду са сталоў ніколі не прыбіралі. Усё павінна было заставацца там на цэлую ноч, паколькі верылі, што прыйдзе памёршы і сядзе вячэраць.

Паводле народных уяўленняў паміранне — гэта пераход у іншы свет. Складанне ў магілу памёршага ежы, прылад, якія былі неабходныя пры яго жыцці, з'яўляецца доказам веры ў замагільнае жыццё. Існуе перакананне, што чалавек расстаецца з нябожчыкам назаўсёды, а ў будучым іх чакае сустрэча на тым свеце. Дзе знаходзіцца ў чалавека душа і што гэта такое? Шматлікія інфарматары сцвярджаюць, што душа — гэта тое, што падтрымлівае цела пры жыцці, а знаходзіцца яна ў крыві чалавека. І смерць з'яўляецца ні чым іншым, як аддзяленнем душы ад цела. Якраз гэта і ёсць галоўны матыў хаўтурных песень. Да шасці тыдняў, як гавораць у Галадах, яна яшчэ ходзіць тымі мясцінамі ды дарогамі, якімі хадзіў чалавек пры жыцці, наведвае сваю гаспадарку. Як правіла, пасля сарака дзён па смерці ў царкве адпраўляюць абедню. І толькі тады, як кажуць людзі, душа адыходзіць на той свет. Аднак, перш чым адысці, яна знаходзіц-

ца ў хаце, памяшчаецца пад абразамі ў тым куце, дзе ляжаў нябожчык. Пад абразамі, упрыгожанымі ручнікамі, і было месца пасялення душы. «Да дзевяці дзён,— гавораць у Кошках,— душа аплаквае ўсе дарогі, якімі чалавек хадзіў пры жыцці. Заходзіць у клуню, заглядвае ў хлявы».

Ёсць павер'е, калі ў час пахавання, напрыклад, ідзе дождж ці снег, гэта значыць, што нябожчык шкадуе свету, з якім разлучыўся. Магчыма, пры жыцці ён чагосьці не скончыў, хоць вельмі спяшаўся гэта дарабіць, магчыма, пакінуў малых дзяцей. У народзе кружыць нямала апавяданняў адносна наведвання асабліва памёршай маці сваіх дзяцей. Шмат расказваюць пра наведванне гаспадаром сваёй гаспадаркі: як ён заглядае да жывёлы, ідзе ў стадолу рыхтаваць ёй ежу.

Адначасова лічыцца, што нельга памёршых выклікаць, нельга наракаць на іх. Тады памёршым на тым свеце вельмі цяжка.

Нельга абмінуць маўчаннем самазабойцаў і нехрышчоных. Душа першых, як кажуць у народзе, адразу ідзе ў пекла. Калі да памёршага сваёй смерцю адносіліся з пашанай і яго пазнейшае наведванне не было небяспечным, дык самазабойцы выклікалі страх. Іх заўсёды баяліся. Месца самазабойства, асабліва вісельніка, лічылася месцам розных страшных здарэнняў. Што ж датычыцца няхрышчаных душ, а асабліва дзяцей (з імі гэта найчасцей здаралася), яны былі асуджаны на блуканне, нідзе яны не мелі прытулку. Калі душа памёршага малога дзіцяці, але ахрышчонага, станавілася анёлам, то ў другім выпадку яна лятала агеньчыкам да таго часу, пакуль хоць хто не назаве яе Адамам ці Евай.

Паводле вераванняў, душа памёршага да сарака дзён ходзіць па зямлі: развітваецца з гаспадаркай, дарогамі, полем. Потым адыходзіць яна назаўсёды ў краіну вечнага жыцця — рай або пекла, у залежнасці ад зямных учынкаў чалавека, адкуль у памінальныя дні наведвае яна сваю сялібу, цешыцца поспехамі сваіх родзічаў, сумуе з выпадку іх няўдач...

## XXVII. Прыватныя памінкі ў раёне Гарадзішчанскай вол. Горацкага п.

На трэці дзень пасля пахавання памёршага хатнія адбываюць памінкі па ім у сябе дома. Памінанне гэта, якое завецца «траццінны», звычайна робяць увечары, дзеля чаго гатуецца шмат розных страў, у ліку якіх абавязкова павінны быць бліны і каша. Перад пачаткам вячэры запальваецца перад абразамі васковая

свечка і ўсе хатнія моляцца богу за ўпакой душы нябожчыка, пасля чаго садзяцца за стол. Вячэра пачынаецца з кашы, першую лыжку якой кожны член сям'і кладзе на стол, прама на абрус. Усе стравы, што засталіся ад вячэры, пакідаюцца на ўсю ноч на стале. Так робіцца таму, па словах сялян, што ўночы прыходзіць нябожчык і з'ядае ўсё там пакінутае. Некаторыя, акрамя таго, у гэты дзень з блінамі і кашай ходзяць на магілу памёршага і там моляцца па нябожчыку, але гэта здараецца вельмі рэдка і да таго ж, калі таму спрыяе пара года.

На дзевяты дзень, або «дзевяціны», памінанне адбываецца дакладна так, як і на трэці. Праз тры тыдні на могілкі запрашаецца свяшчэннік, і там на магіле ставіцца каша і кладуцца бліны. Свяшчэннік служыць паніхіду, пасля заканчэння якой запрашаюцца ў дом суседзі, што рабілі труну і капалі магілу, і тут іх частуюць шчодрым абедам [...]

Шасцітыднёвае памінанне, якое завецца «астанне» ці проста «шасціны», адбываецца наступным чынам: хто-небудзь з сям'і памёршага выпраўляецца ў царкву з блінамі, пшанічнай кашай і пірагом, якія называюць «праскураю», і ставіць усё прынесенае сюды перад мясцовымі іконамі на падлозе. Свяшчэннік служыць заўпакойную абедню («закупную»), а затым і паніхіду. Па заканчэнні службы ў царкве каша, бліны і «праскура» нясуцца ў дом, куды запрашаюцца і блізкія суседзі «на стол» (на абед). Тут, памаліўшыся богу перад запаленай свечкай, усе садзяцца за стол і спачатку ядуць «праскуру», кажучы: «Вечны спакой, царства нябеснае (імя памёршага), чэсныя і праведныя радзіцелі, хадзіце з намі абедаць», а потым падаюцца і ўсе астатнія нагатаваныя стравы [...] Гадавое памінанне, ці «гадаўшчына», нічым не адрозніваецца ад шасцітыднёвага і адбываецца таксама, з той толькі розніцай, што на гэта памінанне ніхто з суседзяў не запрашаецца ў дом для пачастунку.

## XXVIII. Сялянскія памінкі ў Мазырскім п.

Кожнага памёршага належыць памінаць на працягу года 6 ці 7 разоў, акрамя агульных памінак, якія адбываюцца таксама 4 разы ў год, у прызначаныя царкоўным уставам дні...

Галоўныя памінкі ў сялян — так званы «заздароўны стол», які робіцца праз 8 тыдняў пасля пахавання. Існуе звычай, што перад гэтымі памінкамі ўдава не можа выйсці замуж, а сваякі наогул лічаць сябе нібыта абавязанымі перад нябожчыкам...

Пра «заздароўны стол». Гатуюць шмат страў: квас, крупнік, кашу, калі ёсць мука, то пякуць бліны і яечню, разводзяць у кубку мёд (сыту), крышаць туды хлеб... Клічуць усіх, у тым ліку і святара... Адбываецца малебен, свяшчэннік вырэзвае ў хлебе сярэдзіну верхняй скарынкі, ставіць туды дзве запаленыя свечкі, бярэ рукой за канец палатна, што ляжыць на стале. Усе іншыя, што прысутнічаюць пры гэтым, бяруцца за іншыя канцы таго ж палатна і ўсе разам некалькі разоў то падымаюць, то апускаюць палатно над гэтым хлебам з запаленымі свечкамі... Пасля заканчэння палатно, хлеб, свечкі аддаюцца свяшчэнніку... Усе садзяцца за стол, і чым багацей гаспадар, тым даўжэй застолле...

## XXIX. Прыкладзіны ў Барысаўскім п.

Існуе ў народзе звычай ставіць на магілу памёршага крыж, камень ці дошку з крыжам, але не адразу пасля пахавання, а ў першую пасля яго восень.

У гэты дзень адбываюць паніхіду па душы памёршага ці памёршай, склікаюць потым суседзяў, каб тыя дапамаглі зрабіць і паставіць крыж, і частуюць іх потым ядой і пітвом. Пры асвячэнні магілы з крыжам, як і пры пахаванні, зноў узнікае выпадак, каб выказаць боль і нараканні на свой лёс. Гэта завецца *галашэннем.* Яно складаецца з доўгіх размоў з нябожчыкамі. У гэтых размовах асірацелыя асобы ўсхваляюць звычайна дабрачыннасці памёршага, апісваюць сваё няшчаснае становішча, шкадуюць аб тым, што не пахаваны ў адной магіле, просяць дараваць крыўды і г. д. Усё гэта выспеўваецца жаласліва, працяглa, перапыняючыся рыданнямі [...]

Такім чынам, мы бачым, што народ наш у святкаванні дзядоў са зменай свайго становішча змяніў таксама пэўным чынам абрадавасць гэтай урачыстасці. Заціхлі песні спевака-гусляра. Галава сям'і кіруе абрадам. Ваенныя подзвігі, здольныя натхніць спевака, ціхія хатнія дабрачыннасці атрымліваюць цяпер сваю ўзнагароду ў простым задушэўным успаміне. Гэты звычай ушанавання памяці дзядоў выстаўляе ў цудоўным святле характар пачцівага нашага народа. Ён пастаянна знаходзіцца ў цеснай сувязі са сваімі продкамі, чатыры разы на год выклікае іх цені і прыгадвае іх знешнасць, не спыняе чулых і цёплых успамінаў, якія яднаюць яго са светам духаў. Вось чаму ён сумленнасцю і абраднасцю не адрозніваецца ад іх. Гэта ўрачыстасць, бытуючы з часоў язычніцтва, з'яўляецца адначасова доказам ранняга во-

пыту ўяўленняў, роднасных хрысціянству, паколькі служыць беспамылковым сведчаннем веры ў будучае жыццё, якое робіць душу ўзвышанай і высакароднай.

## XXX. Дзяды

Асобныя памінкі па памёршых бацьках, па бацьку ці маці здараюцца надзвычай рэдка і толькі ў самых заможных сялян. На такія памінкі запрашаецца свяшчэннік са служыцелямі культу і бліжэйшыя сваякі, іншыя нязваныя госці і старцы збіраюцца дакладна так, як і на пахаванне, і ўсіх іх кормяць і пояць [...] Свяшчэннік, прыбыўшы звычайна ў абедзенны час, зараз жа адпявае паніхіду ў хаце перад абразом з запаленымі васковымі свечкамі. У гэты час сваячкі памінаемага галосяць на ўсё горла, як і на пахаванні.

Пасля паніхіды саджаюць свяшчэнніка і гасцей за стол абедаць, падаючы [...] дакладна такія ж стравы і такім самым парадкам, як і на пахаванні; пасля абеду саджаюць тых, хто не памясціўся за першым сталом, і так робяць, пакуль не накормяць усіх, хто прыйшоў. Пасля абеду свяшчэннік і госці раз'язджаюцца па дамах.

На такія памінкі, так як і на пахаванне, званыя госці прыносяць куццю і какоры, якія і ім даюцца гэтаксама, калі яны ад'язджаюць.

Звычайныя памінкі без свяшчэнніка і гасцей спраўляюцца адной толькі сям'ёй. Кожны гаспадар святкуе іх чатыры разы на год. Існуюць наступныя памінальныя дні:

1) Субота перад мясапусным тыднем. Сяляне завуць яе *тоўстай суботай*, таму што ў гэты дзень рыхтуецца больш страў, чым у іншыя памінальныя дні.

2) Аўторак на другім тыдні пасля св. вялікадня.

3) Субота перад тыднем пяцідзесятніцы, ці св. тройцы.

4) *Змітраўская субота*, г. зн. апошняя субота перад днём св. Дзмітрыя, 26 кастрычніка.

За тыдзень ці раней перад названымі памінальнымі днямі сяляне заказваюць абедні і паніхіды за памін душы сваіх памёршых сваякоў.

У час паніхіды заказчык яе падае свяшчэнніку *памінальніцу*— маленькую кніжачку ў 1/16 долю аркуша, у якой запісваюцца імёны памёршых; такія кніжачкі ёсць у кожнай сям'і. Свяшчэннік у час службы чытае па ёй імёны памёршых.

Акрамя таго, у суботу перад тройцыным днём, пасля паўдня,

сяляне амаль усёй сям'ёй выпраўляюцца на свае *могілкі*, пакідаючы ў доме толькі малых і старых, і бяруць з сабой [...] куццю, какоры і рыбу. Прыйшоўшы на могілкі, зараз жа старэйшая ў сям'і жанчына «апахывае» (абмятае) спецыяльна для таго падрыхтаваным венікам тое месца, дзе пахаваны сваякі ці продкі, пракачвае па магілах яйка, аддае гэта яйка старцам і пры гэтым разам з іншымі жанчынамі той жа сям'і на ўсё горла галосіць, прыгаворваючы, што прыйдзе на розум, як на пахаванні. На гэтыя могілкі прыязджае святчэннік, служыць паніхіды для кожнага з памёршых асобна, на тым месцы, дзе хто пахаваны, памінаючы з пададзенай яму кніжачкі імёны памёршых продкаў.

Пасля таго кожная сям'я садзіцца тут жа, на могілках, п'юць, [...] закусваюць куццёй і іншым і прыгаворваюць: «Памяні, госпадзі, радзіцелей у чарстві нябесным». Пасля таго ідуць з могілак, прычым жанчыны зноў галосяць.

Па хатах у адзначаныя памінальныя дні гатуюць у вялікай колькасці і лепшыя стравы, як у святочныя дні; [...] падаюць на стол спачатку куццю і рыбу. У час абеду на акне вывешваюць ручнік.

Хоць такія сталы бываюць звычайна абедзенныя, каля паўдня, і ва ўсякім выпадку не пазней 1-й ці 2-й гадзіны пасля паўдня, аднак у кожны памінальны дзень яны маюць асобыя назвы, а іменна: стол у суботу перад мясапусным тыднем завецца «*палудзінь па радзіцілях*»; у аўторак на другім тыдні пасля св. вялікадня—«*снеданне па радзіцілях*»; у суботу перад св. тройцай—«*абед па радзіцілях*»; у змітраўскую суботу — «*вячэра па радзіцілях*».

Сядаючы за стол, запальваюць свечы перад абразом, хрысцяцца, моляцца, кланяюцца і не тушаць свечак, пакуль за сталом не [...] з'ядуць куцці.

Пасля стала хрысцяцца, робяць паклон, як звычайна, і зноў гавораць: «Памяні, госпадзі, радзіцілей у чарстві нябесным».

У памінальныя дні пасляабедзенны час лічыцца святам, і сяляне ў сябе ў доме не працуюць.

У католікаў памінкі бываюць толькі адзін раз у год, 2 лістапада, на другі дзень свята ўсіх святых, у так званы «дзень задушны». У гэты дзень яны ідуць у касцёлы, дзе адпраўляецца жалобнае набажэнства. Калі каля касцёла ёсць багадзельня для бедных, то і туды прыносяць у гэты дзень хлеб і рознае мяса. Вярнуўшыся з касцёла, кожны абедае ў сябе дома без усялякіх асобых цырымоній; толькі стравы ў гэты дзень гатуюцца лепшыя, святочныя...

## XXXI. Дзяды змітраўскія ў Барысаўскім п.

Звычайна святкаванне пачынаецца ўвечары. Цэлы дзень праходзіць у падрыхтоўцы неабходнага: гатуюць стравы, наводзяць парадак і чысціню ў хаце і каля дома; найбольш старанна чысцяць кут і запечак, мятуць хату і падворак. Чысціня спрыяе прыходу духаў дзядоў, смачныя стравы і пітво схіляюць іх да знікнення на хвіліну з нябеснай абіцелі, каб спусціцца на родную зямлю.

Калі нарэшце ўся сям'я і прыезджыя збяруцца, гаспадар, кіруючы абрадам, загадвае прыляпіць на куце запаленую свечку, чытае малітвы «*Ойча наш*», «*Багародзіца*», «*Верую*», «*Анёл гасподні*». Пасля заканчэння малітвы свечку гасяць. На стале ўжо стаяць розныя стравы (абавязкова няцотны лік) [...] Усе садзяцца вакол стала. Гаспадар, наліўшы чарку, [...] адлівае з яе некалькі кропель на абрус для духаў, такім жа чынам п'юць па чарзе астатнія. Ніхто не кране стравы, перш чым не адалье па лыжцы ў пастаўленую на стол міску, якая пасля напаўнення рознымі стравамі для дзядоў ставіцца каля акна. Затым пачынаюць есці і піць, аднак размова не ажыўлена весялосцю. У прачулай гаворцы не раз падкрэсліваецца, што душы дарагіх нябожчыкаў прысутнічаюць побач, прымаюць іх пачастункі; за кожным шамаценнем азіраюцца і заканчваюць успаміны шкадаваннем, што не могуць бачыць іх выразней. Калі на свет заляціць матыль, на яго ўсе глядзяць як на божага пасланца, які з'явіўся, каб узяць валасы і пазногці памёршых асоб, якія пры жыцці не забываліся іх захоўваць,— першыя ў абутку, а другія на печы. Пасля заканчэння вячэры ўсе разыходзяцца, пажадаўшы незямным гасцям: «*Святыя дзяды! Елі і пілі; ідзіце да сябе*». Пакінутыя для дзядоў пітво і стравы калі-нікалі свавольная моладзь з'ядала, сцвярджаючы потым, што ўсё паелі дзяды. Аднак часцей за ўсё гэтыя стравы паводле звычаю раздаюцца мясцовым беднякам.

Напярэдадні дзядоў гаспадары загадзя абмяркоўваюць, што з прыхаваных запасаў яны могуць ахвяраваць на ўрачыстасць. Звычайна ў такіх абставінах гавораць: «*Гэта няхай бог пасецъ на дзяды*». Невыкананне падобных абяцанняў абавязкова цягне за сабой пагібель вызначанай на дзяды жывёлы.

*Дзяды зімовыя* святкуюцца перад запустамі. Абрадавасць у іх тая ж самая, што і ў змітраўскіх, толькі стравы тут іншыя, больш адпаведныя гэтай пары года: свіныя ногі і бліны.

## XXXII. Змітраўскія дзяды ў м. Заслаўе Мінскага п.

Паміпанне памёршых адбываецца ў нас хоць і ў розны час, але большай часткай восеньскай парой і пераважна ў кастрычніку. Прычыну неадначасовасці ўстаноўленых для памінак дзён, нават у адным і тым жа прыходзе, адзін селянін растлумачыў мне так: калі цар Дзмітрый пайшоў на вайну з няверпымі, дык ён, праязджаючы па розных мясцінах, прасіў праваслаўных хрысціян маліцца за ўпакой душ тых воінаў, якія па волі божай загінулі на вайне. Вось з таго часу ўстаноўленыя памінкі шмат у якіх вёсках адбываюцца не ў аднолькавыя дні, таму што цар Дзмітрый не ў адзін і той жа час праязджаў па розных вёсках.

На памінках больш за ўсё звяртаюць увагу на тое, каб прыгатаваць як мага болей разнастайных страў, сярод якіх абавязкова павінна быць вараная галава — свіная ці баранова, у крайнім выпадку хай сабе і курыная — усё адно пеўня ці курыцы. Галава гэта ў памінальным абрадзе займае даволі значнае месца.

Пасадзіўшы гасцей за памінальны стол, гаспадар бярэ ў адну руку свечку, загарнуўшы яе ў блін, а ў другую — булку хлеба і абносіць іх тры разы вакол пастаўленай на стале галавы, памінаючы ўголас па імёнах не толькі ўсіх памёршых родных і блізкіх, але нават і тых, што раней жылі калі-небудзь на цяперашняй яго зямлі, запрашаючы іх словамі: «Прыбывайце к гэтаму сталу!» Седзячы за сталом, усе госці [...] адліваюць з чарак на стол некалькі кропель, прыгаворваючы: «Прыбывайце!»

Па заканчэнні памінальнай трапезы на стале на ноч пакідаюць усе стравы, нічога не прыбіраючы: з нажамі, лыжкамі і інш., у поўнай перакананасці, што нябожчыкі прыйдуць уночы і пакарыстаюцца запрашэннем.

## XXXIII. Народны звычай «дзяды»

У некаторых вёсках і гарадах на працягу года спраўляюць пяць «абычайных» свят «дзяды»: 1) мясаедныя, перад вялікім постам; 2) радаўніца — у аўторак пасляветікоднага тыдня; 3) субота напярэдадні сёмухі; 4) перад летнім святам Пятра і Паўла і 5) увосень, калі пападзе, не раней 1 лістапада і не пазней 10 лістапада.

Радаўніца і асеннія дзяды — гэта памінкі па нядаўніх нябожчыках. У каго хто памёр, тыя ставяць крыжы або загародкі. На кожныя дзяды гаспадыня ўвесь дзень рыхтуе многа ежы, каб

было як найбольш: ад пяці страў найменей, а самыя багатыя людзі спраўлялі 7, 9, 11, 13, 15, каб толькі быў няпарны лік страў на стале. Усе стравы, выстаўленыя на стол, падлічваюцца гаспадыняй. Бывае, што клічуць гасцей, а не, дык абыходзяцца і сваёй сям'ёй. Да дзядоўскага стала запрашаюць усіх памёршых у гэтай хаце. Вакол стала са стравамі абносяць запаленую свечку. Успамінаюць спачатку таго, хто апошні памёр у хаце, а затым і астатніх, напрыклад: «Алена, Іра, Мар'яна, Янка, Пятрок, Ганна, Тамаш, Хвядук, Тодар, Хвядора, Язук — усіх помнячых і няпомнячых, прыходзьце ўсе да гэтага сталу». Перад тым, як садзіцца за стол, у хаце адчыняюць усе дзверы, каб заходзілі памёршыя гэтай хаты. Ставіцца асобная міска ці талерка, лыжка, відэлец, [...] налiваецца для памёршых шклянка і кожнай стравы адліваецца па лыжцы. У суботні дзядоўскі дзень гаспадыня абавязана спячы свежы хлеб. Адна булка павінна быць здобная, пячэцца таксама маленькая, якая завецца дзядоўскі курак — пасля дзядоў яго аддавалі жабракам. Калі запросяць да стала ўсіх памёршых паіменна, гавораць пацеры дзядоўскія як найкарацей. Адзначаюць праслаўленых людзей роду і тых, хто найбольш пражыў на свеце. Пасля заканчэння вячэры гаспадар хаты бярэ ручнік і вялікую драўляную кружку ці кубак або нават палойнік, напаўняе вадой, а наверх кладзе хлебны дзядоўскі курак, пакрывае яго ручніком, адчыняе браму ці варотцы і «адпраўляе» ўсіх памёршых, вылівае кубак з вадой у бок могільніка: «Ідзіце з богам да наступных дзядоў!» І на гэтым канчаецца дзядоўская вячэра.

Назаўтра гаспадар і гаспадыня павінны паснедаць тым, што было адкладзена ў міску ці талерку «дзядам». А астатнія члены сям'і снедаюць не даедзенымі напярэдадні стравамі. Можна ўспамянуць некалькі страў, якія цяпер не ўсе нават ведаюць: верашчака, сырніца, усялякія поліўкі (рыбныя, мясныя, крывяныя), кісялі — журавінныя і аўсяныя, перапечкі з канаплямі, затушаныя ў печы або з макам і мёдам саладухі, аўсяныя талокны, ячменныя праснакі ці пернікі і многа другіх страў. Рэдка хто спраўляе цяпер дзядоўскія «абычаі», але памятаюць пра іх у кожнай хаце.

У Расіі дзядоўскіх абрадаў, напэўна, не было, бо мой дзед Янка расказваў такі выпадак яшчэ з першай сусветнай вайны. Рота салдат спынілася ў вёсцы Баранцы на адпачынак якраз на дзяды. Размясціліся салдаты па хатах па 2—3 чалавекі, адзін начаваў у дзеда. Яго запрасілі за стол на вячэру. Наеўся ён першай стравы, але на дзяды трэба пакаштаваць кожнай, і салдат аб'еўся. Казаў: «Калі так усе вячэралі, то загіне ўся рота!»

## XXXIV. Восеньскія дзяды ў Віцебскай губ.

*Астатнія* ў храналагічным парадку, але бадай, што самыя галоўныя дзяды (субота перад 26 кастрычніка) завуцца *змітраўкай*. Не кажучы ўжо пра тое, што да гэтага часу скончаны амаль усе сельскагаспадарчыя работы, за выключэннем малацьбы і апрацоўкі льну, падведзены вынікі мінулага лета, вялікі дастатак у мясе — сям'я паспела адпачыць ад летняй працы і скарыстаць тое, што беларус заве *сыццё*, дзякуючы якому «*шчокі ўспухнулі*». Такім чынам, *святкаванню змітраўскіх дзядоў* садзейнічае матэрыяльны дастатак і вольны час, чаго не стае, напрыклад, на *радыніцу*. У гэтыя дзяды, як і на заговіны, «трэба паесці сем разоў»,— жартам кажуць сяляне. На самой жа справе ядуць толькі чатыры разы, як і заўсёды: снедаюць, абедаюць, палуднуюць (падвячэрніваюць) і вячэраюць.

Пярэдадне *змітраўкі* заканчваецца *лазняй*, мыюцца сцены і нават чысціцца падлога. Прыбраўшы са стала будзённую вячэру, гаспадыня *шаруе* лавы, стол і на ноч засцілае яго чыстым абрусам, прыстасоўваючы ўсё гэта да таго часу, калі ўся сям'я пачынае засынаць. Хутка і яна лажыцца спаць, каб не затрымацца з ранішняй гатоўляй, калі ёй неабходна будзе ў дастатку згатаваць і *прыжаніну* з блінамі, і *юшку* з мясам, і *пячыстае*, і кашу, і *суюдзінь* і шмат чаго іншага.

Па меры таго як гатоўля набліжаецца да канца, мужчыны і дзеці ўстаюць, мыюцца і апранаюцца «*па-святошнаму*». Калі ўжо ўсё падрыхтавана для *снядання*, гаспадар запальвае ў *бажніцы* васковую свечку. Сям'я збіраецца і пачынае маліцца ці паасобку, ці слухаючы агульную малітву старэйшага, па заканчэнні якой, ні слова не кажучы, садзяцца за стол, на сталыя свае месцы. Перад кожным членам сям'і гаспадыня кладзе горку бліноў (штук 10) для *прыжаніны* і ставіць міску з куццёй, якая на гэты раз не салодкая, а *заваложана* каровіным маслам. Сама гаспадыня таксама сядае за стол. Тады гаспадар [...] выразна і ўрачыста гаворыць: «Пымяні, божухна, нашых святых дзядоў! Пашлі ім рай прасветлы, царстве нябесны! Няхай яны су святымі апачываюць, а нам хлеба-солі засылаюць». (Гаспадар і ўся сям'я набожна хрысцяцца.) [...] Толькі пасля гэтага пачынаюць есці *куццю*, а за ёй бліны з *прыжанінай*. На талерку, пакрытую блінам, гаспадар адкладвае трохі з кожнай пададзенай стравы і [...] ставіць талерку або на падаконнік, або на асобна прыробленую палічку са знешняга боку галоўнага акна і ў той час прымаўляе: «Святыя дзяды! Прыдзіця сюды — ета для вас!» Усе члены сям'і часам паўтараюць словы гаспадара, а часам толькі хры-

сцяцца. Гэта *дзедаўская талерка* разам з пітвом аддаецца жабраку, калі ён падыдзе; у адваротным выпадку ўся ежа на талерцы аддаецца чыстым хатнім жывёлам.

Шчодрае святочнымі стравамі *снядание* цягнецца даволі доўга. Адзіным прадметам застольнай гутаркі з'яўляюцца, зразумела, *дзяды*, якіх памінаюць. Агульнымі намаганнямі сям'і прыгадваюцца не толькі дробныя выпадкі з жыцця памінаемых, іх словы і настаўленні, але таксама нязначныя фізічныя асаблівасці, накшталт родзінкі на падбародку і г. д. І ва ўсёй гэтай працяглай гутарцы няма месца выказванням пра адмоўныя бакі *дзядоў*.

Сытая да крайнасці, заспакоеная ад мірнай гутаркі падымаецца сям'я з-за стала і пасля прачытанай малітвы кожны накіроўваецца паляжаць на печы, палацях і *поле* (нарах), «каб сала абвілося кала кішак». Тое самае не марудзяць зрабіць і жанчыны, пасля таго як толькі паспеюць прыбраць са стала, пакрыць яго чыстым абрусам і пакласці на яго нязменны хлеб з соллю. Дзе-нідзе *дзедаўская талерка* не апаражняецца да вечара, а застаецца на стале разам з хлебам і соллю. Значных памераў васковая свечка нязгасна гарыць у *бажніцы* да заканчэння *вячэры*.

Пасля *снядання* і адпачынку выпраўляюцца ў госці да сваякоў, што жывуць далёка, і паспяваюць туды на абед (каля 11 гадзін) ці полудзень (каля 2 гадзін). «Авой! Здаецца, дзядзька з дзядзінай прыехалі, ідзіце сустракаць»,— скажа першы, хто заўважыць гасцей. Хтосьці выскачыць насустрач гасцям, астатнія не пакідаюць месца адпачынку, адкуль і *вітаюцца* з імі. Неўзабаве сям'я і госці садзяцца за стол. Гасцяванне ў змітраўку не абмяжоўваецца рэштай дня, а парой даходзіць да трох дзён: гэта залежыць ад узаемных адносін гаспадароў і гасцей, якія тут жа заручаюцца абяцаннем гаспадароў на «гасціны — або ў запусты, або ў ражство».

## XXXV. Дзяды

...Дзяды — свята продкаў, не звязанае з сонечным культам, прыпадала на восень, менавіта на першае лістапада. Дзісенскія крывічы ўрачыста абходзяць двое дзядоў: веснавыя — «наўскі вялікдзень» і восеньскія — «вялікія дзяды» [...] «Наўскі вялікдзень», веснавыя дзяды, пасвячаецца толькі «наўцам», г. зн. нованамёршым (бацькам, братам, сёстрам, дзецям), а «вялікія дзяды» пасвячаюцца цэламу роду, як толькі можа сягнуць памяць людская, і ў гэтым ёсць істотная розніца паміж веснавымі і восеньскімі дзядамі.

Даўней восеньскія, «вялікія дзяды», абходзілі не паасобнымі сем'ямі, а родамі. Аб такіх родавых памінках апавядаў мой бацька, за якога яшчэ памяці, у 1840-х, 1850-х гадах спраўлялі гэткія памінкі на Дзісеншчыне: Вангіны, Сарокі, Шышкі, Рублеўскія, Рымшы, Дзямідовічы і інш. На гэткія «вялікія дзяды» збіраліся зазвычай у дом найбагацейшай з роду сям'і ўсе дарослыя родзічы — ад найбяднейшага да найбагатшага, кожны са сваімі прыпасамі, і за агульным сталом спраўлялі вячэру. Вячэра пачыналася агульнымі малітвамі і спевамі за памёршых, якія прыпісвала царква. Скончыўшы малітвы, найстарэйшы з роду першы ішоў за стол і, запаліўшы абрадавую свечку, якая дагэтуль стаяла ўткнутая ў карцы, напоўненым збожжам, гаварыў стоючы: «Святыя дзяды, просім за пачэсны стол!» Пасля гэтага забіралі па старшынству месцы за сталом усе пры тым бытныя. Абрадавыя на дзяды стравы — гэта «юшнік» з крыві, вараны з мясам, каўбаса і аладкі. Размова за сталом вялася выключна аб памёршых «дзядах», г. зн. продках роду. Пачынаў яе найстарэйшы ў родзе пасля першай чаркі, якая ішла ўкругавую, звычайным чынам, што першага прашчура роду нашага было імя такое-та, жыў ён там-та, вызначаўся тым-та і г. д. Далей гаварылі аб бліжэйшых продках аж да апошніх. Пасля вячэры размова цягнулася да «трэціх пеўняў», апавядаліся прыгоды, характары продкаў, радавыя і звязаныя з родам успаміны і легенды.

Падобна вышэй згаданым дробнашляхецкім дзядам, абходзіліся «дзяды» і ў сялянскіх родах, толькі з большай прымешкай паганскіх перажыткаў. Гэтак рашчынялі напярэдадні дзядоў хлеб і пяклі яго абавязкова на сухіх лістах; калолі парсюка на дзень «дзядоў» і ўрэшце вечар прысвячаўся гутаркам аб дзеях продкаў [...]

За маёй памяццю, у 1880-х, 1890-х гадах, ужо ў Дзісеншчыне не святкавалі дзядоў родамі, а толькі сем'ямі. У маёй сям'і гэта адбывалася такім парадкам. Напярэдадні дзядоў з самай раніцы жанкі прымаліся за капітальную чыстку хаты і ўсіх гаспадарскіх статкаў. Вечарам уносілі дзяжу, ставілі яе на «крыжох», сярод хаты, пакрывалі чыстым абрусам і садзіліся за стол вячэраць. У час вячэры лічылі «дзядоў», г. зн. прыпаміналі ўсіх памёршых продкаў. У нас налічалі іх да 30-ці. Пасля вячэры рашчынялі «дзядоўскі хлеб» і на другі дзень пяклі столькі бахонкаў, колькі налічылі дзядоў. Раніцай ехалі ў царкву і там раздавалі бахонкі ўбогім, кожнаму па аднаму. Велічыня бахонкаў залежала ад заможнасці сям'і: сем'і багатыя пяклі вялікія бахонкі, а бедныя абмяжоўваліся «бондачкамі» з кулак велічынёй. На вечар бывалі запрошаны бедныя з суседства, чалавек да 10-ці, і пачыналася

за агульным сталом вячэра. На вячэру прыгатаўлялі «юшнік» з крыві, а ў гады, калі не калолі на «дзяды» падсвінка, то клёцкі з «душамі», г. зн. з завернутымі ў цеста скваркамі, і аладкі з верашчакай або замест аладкаў каўбасы з сырой капустай і на заканчэнне «саламатка», г. зн. сушаныя яблыкі, грушы і ягады, вараныя на мёдзе, або замест «саламаткі» аўсяны кісель з мядовай сытой. Варылі на вячэру больш, чым было трэба, і рэшткі мяса, аладак і інш. дзялілі паміж беднымі: кожны вяртаўся дамоў з клункам, у якім заўсёды, акрамя ўсяго іншага, была пара каўбас.

Перад вячэрай маліліся з малітоўнікаў па памёршых, а пасля вячэры, пасядзеўшы і пагутарыўшы на тэмы, пахвальныя для продкаў сям'і, разыходзіліся. Адлівання лыжкі стравы пад стол ніхто з нашай сям'і не практыкаваў, хоць з запрошаных гасцей некаторыя гэта рабілі. Сядаючы за стол, «дзядоў» не прызывалі. Але ніякага начыння пасля вячэры са стала не збіралі і рэшткаў страў, што заставаліся ў місах, не прымалі са стала.

З пераказаў майго бацькі, чутых ад дзеда і старых людзей яго пакалення, з днём дзядоў звязвалі яшчэ адзін цікавы абрад — гэта ўпісванне і выпісванне з сямейнай кронікі членаў сям'і. Нованароджаных упісвалі, а памёршых выпісвалі. Кронікі гэтыя вяліся на бэльках хаты ў «пачэсным» куце. У сваёй Дзісеншчыне я ўжо нідзе не бачыў гэткіх запісаў,але давялося мне іх пабачыць вясной у 1914 годзе ў Бельскім павеце, у сяле Кленіках (заходняя частка Гродзеншчыны). У старых хатах «пачэсны» кут тут, зазвычай заняты глыбокімі выразамі ў яго бэльках, тэкстам славянскім, напрыклад, гэткага зместу: «Рдся. рб. Бж. Микола л. 1881. 20 іюл.+1900. 5 март.», або скарочана: «Антон 1830. 10 мая+1870. 2 авг.» Яшчэ жывых сем'янінаў на сцяне маюцца імёны і даты народзін і насупраць іх пакінута месца для ўпісання даты смерці. Вось жа, у дзень дзядоў, паводле апавяданняў, прыводзілі ў хату грамацея, які падобныя запісы вырэзваў на «пачэсным» куце, натуючы народжаных або памёршых асоб за мінуўшы год у данай сям'і. Праўдападобна, гэты звычай весці сямейныя кронікі пашыраўся па ўсёй крывічанскай тэрыторыі, бо сляды яго, паводле пераказаў, сустракаюцца і ў Вяліжскім павеце, але поўнасцю ён захаваўся яшчэ адзіна толькі ў Бельшчыне...

## XXXVI. Змітраўскія дзяды ў с. Кутня Быхаўскага п.

Агульныя памінкі або дзяды сустракаюцца наступныя: змітраўка, радзіцельская субота, радуніца і сёмуха; гэтыя памінкі маюць вясёлы характар. Змітраўка спраўляецца ўвосень, калі ў сялян усяго ў дастатку, у суботу перад Дзмітрыем Салунскім (26 кастрычніка).

Напярэдадні гэтага дня мужчыны прыбіраюць, мятуць двор, прыводзяць яго ў належны выгляд, а тым часам бабы завіхаюцца ў хаце: мыюць стол, лавы, посуд, мятуць падлогу, пякуць бліны, гатуюць. На заходзе сонца, калі ўсе паспеюць памыцца ў лазні, спецыяльна напаленай дзеля гэтага выпадку, уся сям'я *вячэрае, вячэра бывае посная.* Раніцай бабы завіхаюцца каля печкі: пякуць бліны, смажаць мяса, гатуюць самыя разнастайныя і ў вялікай колькасці стравы: «ладкі», боршч з капусты, з буракоў, бульбу вараную, бульбу цёртую, суп і кашу розных сартоў і назваў: грэчку, прасяную, ячную, яечню на масле, яечню на сале, грыбок і інш., абавязкова трэба 12 патраў. Мужчыны займаюцца гаспадаркай, а адзін з іх з блінамі выпраўляецца на паніхіду ў царкву. Пасля яго вяртання ўся сям'я збіраецца ў хату, гаспадар варыць у чыгунку з гарэлкаю перац, гаспадыня накрывае стол чыстым абрусам, вешае на абразы вышытыя *набожнікі,* запальвае каля бажніцы свечку і кладзе на стол горку бліноў. Пасля доўгай, старанняй, з зямнымі паклонамі малітвы ўся сям'я садзіцца за стол. Гаспадар, седзячы на куце, хаваецца за блінамі і пытаецца ў жонкі, якая садзіцца пасля ўсіх і на самым канцы: «Баба, а баба! Ці бачыш ты мяне?» Тая адказвае: «Не бачу».— «Дай жа, божа, каб ты і на лета мяне не бачыла»,— гаварыў гаспадар. Потым, [...] перахрысціўшыся, працягвае: «Святыя радзіцелькі, хадзіце к нам абедаць! Баба, будзь здарова!» З гэтымі словамі ён выпівае чарку, папярэдне пляснуўшы з яе некалькі кропель на абрус. Гаспадыня, узяўшы налітую чарку з рук мужа і таксама выплеснуўшы з яе некалькі кропель на абрус, кажа: «Няхай са святымі пачываюць і нам хлеба-солі засылаюць, будзьце ўсе жывы!» І следам за тым пачынаецца за ўпакой «радзіцелей!» старанное знішчэнне нарыхтаваных патраў. Кожны член сям'і наядаецца да адвалу, да перасыці. Гэткім самым чынам спраўляюць радзіцельскую суботу ў тыдзень аб мытары і фарысеі і сёмуху — у сёмую суботу пасля вялікадня, напярэдадні пяцідзесятніцы. На сёмуху перад абедам кожны селянін спяшаецца ў што б там ні стала пасеяць каноплі. Сярод патраў на гэты раз абавязкова павінен быць засмажаны певень

ці курыца, а ўвечары ўсе ставяць на двары на вуліцы перад хатай «май», г. зн. утыркваюць у зямлю завостранымі канцамі маладыя дрэўцы.

## XXXVII. Восеньскія дзяды ў Нежкаўскай вол. Магілёўскага п.

Дзядоў у сялян, як і паводле царкоўнага ўстава,— чацвёра: духаўскія, змітраўскія, перад масляным тыднем і радуніца, а ў вёсках Навасёлкі і Васількі ёсць пятыя — перад пакровам: пакроўцы. У абрадах усіх гэтых дзён, акрамя радуніцы, асаблівасцей няма, усе яны паміж сабой падобныя.

Калі прыйдзе дзень дзядоў, то з самай раніцы на вёсцы можна паўсюль заўважыць жабракоў, на дзяды іх звычайна запрашаюць. Аднак не для ўсіх іх прыём роўны: сяляне нашы заўсёды аддаюць перавагу таму з іх, хто карыстаецца славай лепшага спевака і чытальніка, «хто болі прычытвае і лепі пяе». Перш за ўсё ён чытае малітву па *ўмарлых*, потым за здаровых, а ў канцы, калі папросяць, і за жывёлінку. За гэта яму плацяць грашыма ад 5-ці да 10-ці кап., а за жывёлінку асобна і часцей за ўсё даюць кавалачак «*салца*» ці «мясца», а не — дык два ці тры яйкі. Мукі жабракам не даюць, і асабліва за заўпакойную малітву, бо нябожчыкам «будзя нылка на тым свеце».

Бабы ў гэты дзень мыюць стол, лавы, вокны, незасланы канец лавы стаіць збоку каля печкі і служыць падстаўкай для *пола* (г. зн. для нар): там будуць сядзець дзяды, якія будуць памінацца, у чаканні вячэры; выціраюць і самыя нары. Пад вечар бабы пачынаюць паліць у печы, гатаваць стравы, пячы бліны. Да гэтага трэба дадаць, што ў вёсках Студзёнкі і Вішова першы блін рвуць на часткі і кладуць на вокны «для дзядоў».

Ведаючы, у якую пару рыхтуюць патравы, пастух выпраўляецца па вёсцы і, спыняючыся каля акна кожнага дома, пытае: «Гэй, гаспадыня! Ці пякла бліны? Прыслалі дзяды па бліны, свінкі па салянінкі, авечкі па яечкі, баранкі па соль, а кароўкі па сыр». Пры гэтым гаспадыні выносяць пастухам тое, што яны просяць. Некаторыя просяць так: «Хазяйка! Ці пякла бліны? Каб ласкава была, пастуху дала».

Патравы на дзяды тыя самыя, што і на пахаванні, толькі ў каго часта паміраюць дзеці, то для іх пякуць «ладкі», каб жывыя дзеці не паміралі.

Перад вячэрай мыюцца ў лазні і, калі ўсе памыюцца, тады ставяць на палок вядро чыстай вады з чыстым венікам — «для

дзядоў». Менавіта так трэба рабіць, сцвярджаюць сяляне, таму што памёршыя мыюцца ўсяго толькі чатыры ці пяць разоў на год і толькі на гэты час іх адпускаюць. Расказваюць пры гэтым розныя анекдоты, якім яны цалкам вераць [...] У дзедаўскую суботу не варта позна мыцца ў лазні. Гаспадары лазняў нават так робяць: калі хто-небудзь з тых, хто мыўся, у гэтыя дні ў лазні надта затрымаецца там, яго проста выганяюць адтуль, кажучы: «Пусціця ўжо нябожчыкаў».

Калі ўсе вяртаюцца з лазні, гаспадыня вымае з печы чыгуны з патравамі і ставіць іх на лаву супраць печы менавіта ў тым парадку, у якім яны будуць ставіцца на стол: тыя, якія пададуць спачатку, ставяць бліжэй да стала, якія потым — крыху далей і г. д. Гаспадар у гэты час запальвае *грамнічную* свечку перад бажніцай, і ўсе моляцца богу. У вёсцы Студзёнкі ў час малітвы хто-небудзь са старэйшых членаў сям'і бярэ чарапок ад гаршка, кладзе туды некалькі гарачых вугольчыкаў, а зверху траву, асвячоную ў духаў дзень, і ёй абкурвае гаршкі з патравамі, стол з лыжкамі, хлебам і кубкамі і ўсю хату. Запаленая свечка гарыць да таго моманту, пакуль не з'ядуць кануна. Патравы на дзяды бываюць наступныя: канун, поліўка, малако, клёцкі, яечня і каша. Мяса таксама лічыцца асобнай ядой. Колькасць страў абавязкова павінна быць няцотная. Падаюць іх на стол у намечаным вышэй парадку, толькі мяса з поліўкі часам пакідаюць на канец або ядуць адразу ж пасля поліўкі. Усе стравы ядуць з блінамі замест хлеба. Як толькі госці і члены сям'і пасядуць за стол, іх пачынаюць частаваць канунам [...] За сталом неабходна паспытаць абавязкова ўсе стравы, іначай нябожчыкі будуць злавацца. Першую лыжку ці хоць бы некалькі кропель ад кожнай стравы трэба выліць на стол. Лыжку за кожным прыёмам ежы неабходна класці на стол, каб ёй елі *дзяды*, а класці лыжку трэба абавязкова выемкай не ўніз, а ўверх, іначай нябожчыкі перавернуцца ў магілах тварамі ўніз, і калі хто памылкова ці па нявопытнасці пакладзе лыжку ніцма, старэйшыя папраўляюць гэту памылку з адпаведнымі заўвагамі. Калі пад час вячэры што-небудзь з харчоў упадзе са стала ці з лаўкі, то таго падымаць нямožна: «ето *нехта* есці хоча». Падымацца з-за стала па заканчэнні вячэры варта ўсім адразу; калі хто выпадкова паспяшаецца ўстаць раней за іншых, той хутка памрэ. Калі пасля вячэры прыбіраюць стол, прымаюць таксама бліны з акна. Лыжкі, немамытыя, звязваюць ніткай і кладуць на лаве пад абразамі. У час вячэры ніякая адзежына не павінна вісець на *курчыне* (шастку)...

## XXXVIII. Свята дзядоў у Беларусі

Шматлікія забабоны і звычкі беларусаў захоўваюць на сабе адбіткі былога язычніцтва. Нават хрысціянская рэлігія не змагла знішчыць прымхаў, што глыбока ў іх укараніліся. Дамавікі, лесуны з'яўляюцца адзіным прадметам іх казак; памёршыя дзяды і прадзеды, як кажуць яны, не перастаюць і дагэтуль наведваць іх жытло. У памяць гэтых прашчураў у народзе існуюць нават святы, так званыя «дзяды».

У трэцюю суботу пасля пакрова селянін, паабедаўшы, адпраўляецца з сынамі ў лазню, а гаспадыня клапатліва рыхтуе між тым вячэру: пячэ бліны і расстаўляе іх па краях стала ў выглядзе слупкоў. Сядаючы за стол і прачытаўшы малітву, гаспадар так пачынае заклікаць памёршых продкаў: «Святыя радзіцелі! Просім з намі вячэраць!» І моцна ўсе ў тым пераконаны, што цені продкаў нябачна выходзяць у гэту хвіліну з магіл і, седзячы з імі за сталом, жывяцца парай, якая ідзе ад страў.

Нятленныя духі павінны жывіцца паветрам, гэта зразумела. На наступны дзень, у нядзелю, гаспадар заклікае дзядоў таксама на абед: «Святыя радзіцелі! Просім з намі абедаць, каторыя ўчара спазніліся або каторыя саўсім не былі, можа, будзеце гневацца, не забывайце да прыбывайце!»

Калі б хто пажадаў убачыць іх, той павінен увайсці ў сенцы і, дастаўшы салому з акенца над дзвярыма, паглядзець праз яго ў пакой. Напэўна, не адзін цікаўны зрабіў бы гэта, калі б не пагражала небяспека смерці: смяльчак, які адважыўся б на такі ўчынак, на іх думку, павінен абавязкова памерці ў той жа год.

## XXXIX. Дзяды (сямейная сцэна з жыцця беларускіх сялян)

...У дзень дзядоў кола хатніх ці сям'я павінны быць усе дома; усе пасля адбыцця звычайных памінак на могілках павінны сядзець за адным сталом, застаўленым стравай [...] і дабрачынна гутарыць пра нябожчыкаў.

Селянін, які паехаў куды-небудзь напярэдадні дзядоў, спяшаецца ў гэты дзень як мага хутчэй паспець назад... Хатнія за дзедавай трапезай так горка заплачуць, так наіўна беларускі загалосяць, што ў староннягa на галаве валасы стануць дыбам [...]

Перш чым адправіць застолле, заводзяць песню:

*Галава*

Хваліць табе, божа,
Дзядоў дачакаліся!

*Хор*

Ах, прышлі, прышлі

*Галава*

А на гэта святца
Людзі грошы трацця.

*Хор*

Як прышлі, прышлі дзяды!

*Галава*

Ад дзядоў да дзядоў
Моў бы сорак гадоў.

*Хор*

А ўсё-такі, усё-такі
дачакаліся!

*Галава*

Ай, дзяды-дзядовя!
Усё вам гатова:

*Хор*

І віно, і піва, і гарэлка!

*Галава*

Есці вам і мяса,
Есці ж і кілбаса.

*Хор*

Толькі ешце, будзе з вас!

*Галава*

Мёд, гарох і каша:
Усё багацце наша!

*Хор*

Усё багацце, усё і г. д.

Затым усе частуюцца. Далей галава застолля расказвае пра сняткаванне дзядоў у былыя часы. Каб пабачыць дзядоў, трэба цэлы дзень нічога не есці...

## XL. Восеньскія дзяды ў м. Талачын Магілёўскай губ.

Восеньскія дзяды — дзень памінання памёршых, адзначаюць у кастрычніку месяцы, у змітраўскую суботу. Знакаміты дзень беларуса. У гэты дзень яны з асаблівай урачыстасцю гатуюць вячэру: пякуць бліны, смажаць сала, вараць мяса; бяруць пітво і вечарам, памыўшыся ў лазні, садзяцца вячэраць. Самы ўрачысты і свяшчэнны час у гэты дзень гэта вячэра. За вячэрай перад кожнай новай стравай [...] памінаюць памёршых словамі: «Святэя радзіцелі, хадзіце вячэраць». Паводле звычаю беларусаў «на дзяды» павінна быць 12 патраў [...] Пасля вячэры на канец стала кладуць кавалак мыла, ручнік і ставяць «кварту» (кружку) вады. Акрамя таго, на стале пакідаюць усю недаедзеную вячэру з усім прыборам і поўную чарку [...] Усё гэта робіцца з поўнай верай у тое, што дзяды, якія прыйдуць уночы, будуць вячэраць, папярэдне памыўшыся вадой з мылам і ацёршыся чыстым ручніком.

## XLI. Памінальныя суботы

У памінальную суботу гаспадар загадвае гатаваць 9 страў, а менш заможны — 7 (абавязкова: каша, ячня, гарох, капуста). У Слонімскім і Ваўкавыскім паветах мы не раз чулі, як сялянкі назаўтра пасля ўрачыстасці скардзіліся, што іх дзяды былі надта наравістыя, што пасля скончанай вячэры нешта нават перавярнула стол з рэштками ежы, паколькі не было дзевяці страў на стале.

Калі ўвечары на коміне запальваюць святло ці свечку, гаспадар бярэ кілішак [...] і гаворыць нібыта да мёртвых: «Будзь здароў, дзеду»; з таго кілішка вылівае гарэлку за акно, а потым п'е сам тры разы і кожны з хатніх, закусваюць пірагом, які завецца «кныш». Сеўшы за стол, гаспадар бярэ затым лыжку са стравай і выкідвае за акно. Астатнія кідаюць пад стол са словамі: «Дзеду, ідзі да абеду», а іншыя таксама частку страў нясуць у хлеў, дзе стаіць скаціна, і кладуць у яслі. Пасля абеду гаспадар адчыняе дзверы хаты, ставіць у дзвярах барану, бярэ мяцёлку і махае ёй па кутках хаты, прыгаворваючы: «Кыша, кыша (так ганяюць хатніх птушак), душачкі! Каторая старша і больша, то дзвярамі, а катора менша, то вокнамі».

Паведамленне пра гэты абед атрымаў кс. Сасноўскі праз трэцюю асобу, бо непасрэдна ад сялян духоўная асоба ні пра што даведацца б не магла. Калі той жа самы расказчык заўважаў адсялянам, што няможна так разважаць і рабіць, адзін яму адказаў: «Нельга забываць гэта свята, бо калі аднаго разу я не зрабіў памінак як належыць, у мяне вол падох», а другі дадаў: «А ў мяне карову ваўкі з'елі». Такім чынам, выпадковыя няшчасці яшчэ больш умацавалі гэтых прасцякоў у іх спрадвечным забабоне.

## XLII. Народнае свята «дзядэ»

Гэта свята мае асаблівае ў народзе значэнне і абстаўлена шматлікімі абрадамі. Святкуецца яно пяць разоў на год, звычайна па пятніцах і суботах — «дзядэ посны і скаромны». Кола гэтага свята пачынаецца з восені. «Дзядэ Семена» святкуецца ў нядзелю Сямёна Стоўпніка [...], 1-га верасня: другія — у 20-я дні кастрычніка; трэція — у нядзелю перад маслянай; чацвёртыя — у нядзелю перад сашэсцем святога духа на апосталаў і пятыя — у нядзелю пасля сашэсця святога духа.

Праходзячы ў гэтыя дні праз вёску, ужо з раніцы можна заўважыць заклапочаны настрой яе жыхароў, асабліва баб. Калі на двары няма марозу, у многіх хатах выстаўлены вокны і праз

іх можна бачыць, як бабы старана мыюць у сваіх хатах лавы, сталы, вокны і наогул дбаюць пра чысціню сваёй хаты, таму што «нябожчыца-баба, вечны спакой душы яе, не любіла, каб нячыста было ў яе хаце». Прыбраўшы хату, гаспадыня бярэцца гатаваць вячэру і пры гэтым гатуе ўсё, што толькі ўжо раз па якому-небудзь выпадку ў яе доме заведзена. Тут, у Кастравіцкай воласці Слонімскага павета, у большасці сялян абавязковымі стравамі лічацца: у пятніцу — квас, сялёдка, гарох і грачаная каша, а ў суботу — у многіх пякуць «пірагі» (той жа хлеб, толькі прэсны, і булкі качаюць у муку), куцця — гарох з макам ці сухі, бліны грачаныя, квас ці капуста, мясныя стравы — большай часткай свініна, аднак у многіх на розныя выпадкі прынята меці ялавічыну, бараніну і кураціну; пасля мяснога падаюць макароны, грачаную кашу і яечню. Асобыя правілы адносна некаторых страў устанаўліваюцца так: калі ў бабы не вядуцца куры, то яна ахвяруецца к дзядам заўсёды рэзаць курыцу, і раз яна ўжо так завяла, то прытрымліваецца заўсёды, прычым не толькі яна, але і яе пераемніца. Такія ж правілы гаспадары могуць устанавіць і адносна ялавічыны і бараніны...

У доме жыве перакананне, што калі толькі не прыгатаваць да дзядоў таго, што ўжо раз кім у доме заведзена, то па гэтай частцы ў гаспадарцы таго дома будзе нястача. Так, калі няма ялавічыны, бараніны, кураціны і г. д., то ў тым доме прападзе што-небудзь з рагатай жывёлы, авечак, кур і г. д.

Калі селянін у гэты дзень працуе на полі ці ў лесе, ён стараецца раней, чым звычайна, вярнуцца дадому і прыбраць у сябе ў двары, а калі ў яго доме быў перад дзядамі нябожчык, ён робіць невялікі драўляны крыж, нясе і ставіць яго на магіле, калі яго там няма яшчэ, пры гэтым магілу вакол абкладваюць каменнямі, а зверху кладзе камені ў выглядзе крыжа. Часцей за ўсё ў гэтыя дні ставяцца і іншыя помнікі ў выглядзе вялікіх драўляных, а хто багацейшы — і металічных крыжоў. Калі ўжо ўсе гатовыя, гаспадыня накрывае стол і ўсе чынна становяцца сярод хаты і чытаюць малітвы. Адчытаўшы іх, гаспадар бярэ пірог, благаслаўляе яго, абліваючы тройчы куццёй, і ломіць на часткі. Адну частку кладзе на стол, каб у гэты вечар ніхто яе не чапаў, а астатняе ўжываюць. Такім самым чынам галава сям'і пачынае кожную страву, і першы кавалачак адкладвае на стол, а з вадкіх страў пакідае першую лыжку. Першыя кавалкі і лыжкі пакідаюць на стале для дзядоў. У некаторых вёсках чытаюць малітвы перад кожнай стравай, а ў другіх — толькі перад пачаткам і ў канцы вечара. Хлеб і іншыя рэшткі застаюцца на стале адкрытымі на працягу ўсёй ночы для дзядоў...

## XLIII. Дзяды, або памінальныя абрады

...Багата ў якіх мясцовасцях існуюць яшчэ дахрысціянскія жалобныя абрады. На Піншчыне, хоць і часткова, яны захаваліся і па сённяшні дзень, іх адзначаюць у лістападзе пад назвай дзядоў. Ужо нават сам лістапад прыносіць разважлівыя думкі пра тое, у чым выяўлялася жыццё і на нашых вачах перастала быць жывым: на палях востра тырчыць адно толькі ржышча пажатага збожжа; ні тут, ні ў лесе не чуваць болей песень; ні на дрэве, ні пад ім не напявае пастушок, пажоўклае і пачырванелае лісце аблятае з калісьці зялёных вершалін, і смутна ўсцілае ўзгалоўе паміраючай прыроды на зімовы сон. Ціха і глуха: спевы птушак заціхлі, толькі стракаты дзяцел адгукнецца, куе па лону высахлага дуба, толькі часам пачуеш галасы адлятаючых жураўоў, смутныя, як пахавальны плач. Хмура і панура: не відаць сонца, ад нябёс да зямлі навісла густая імгла. Толькі доўгім вечарам і ўночы праясняецца неба полымем зарыва, ці то ад смаляных печаў, ці ад агнёў, рассыпаных далёка па балотных травах і запаленых для паляпшэння багністай сенажаці. Можна сказаць, што гэта зарыва, запаленае пры пахаванні прыроды. Але на сенажацях сабранае сена ўзносіцца шматлікімі стагамі, на палях стаяць, як хаты, у доўгіх радах сцірты са збожжам, і ў сялянскія двары плённая восень натрэсла з поўнага рога і зерня, і гароднiны. У сялянскіх хатах спакойны, добры дух; сяляне маюць час успомніць пра сваіх продкаў, якім яны абавязаны жыццём, бадзёрым здароўем і ўласным набыткам, якія і бога хваліць, і жыць на свеце іх навучылі; цяпер яны маюць час адплаціць доўг удзячнасці душам сваіх продкаў дзякуючы абраду ў гонар іх памяці і спраўляюць дзяды.

На Піншчыне напярэдадні дзядоў альбо вячэры для мёртвых гаспадыні старанна прыбіраюць свой дом, усю рухомую маёмасць, расстаўляюць па кутках усе гаспадарчыя прылады, каб тыя не заміналі ў хаце духам, што збіраюцца прыйсці сюды на бяседу. Назаўтра амаль усёй сямейнай грамадой ідуць на могільнік, падаюць на магілы, плачуць уголас і моляцца за сваіх мёртвых. Вярнуўшыся дадому, мітусяцца ў падрыхтоўцы да памінальнай вячэры і да самага яе надыходу на працягу цэлага дня ніхто нічога не есць. Вечарам засцілаюць стол белым абрусам, пасярэдзіне яго запальваюць гарэлку для нагадвання пра пякельнае полымя [...] кідаюць соль на распаленае вуголле, каб пачуць мову яго таямнічага трэску. Асвяціўшы стол васковай свечкай, ставяць на яго боб ці гарох з мядовай сытой, поліўкамі з рыбы і мяса — кіслымі і прэснымі, смажанай саланінай, аладкамі,

яечняй з каўбасамі, кашай прасяной ці грачанай, малаком макавым і кіслым. Пасярод страў ставяць на стале булку хлеба і нарэзаным хлебам ці малымі боханамі абкладваюць вакол стала так, каб тры булачкі былі ў рад адна каля другой, на пачэсным месцы стала. Тут жа, каля гэтага пачэснага месца ці на покуці, вешаюць драўляную шабельку і пры ёй (калі няма кап'я) — качаргу, у выпадку, калі хтосьці з гаспадароў служыў у войску. Прыгатаваўшы багатую для продкаў вячэру, каб іх духі ў колішнім іх доме шчодра прыняць і ўсім дагадзіць, адчыняюць вокны і дзверы, старэйшыя з сям'і абыходзяць дом навокал, моляцца, паглядаючы ў бок могільніка, і запрашаюць мёртвых. Вярнуўшыся ў хату, у цішыні садзяцца воддаль стала і прыглядаюцца да ўяўнай бяседы духаў. Калі, па разуменню гаспадыні, духі нарэшце насыцяцца, яна падае знак, гаспадар садзіцца за стол і запрашае сям'ю і астатніх вячэраць. Гаспадар пачынае першы, зачарпнуўшы ад сыты з бобам або гарохам, ці так званай куцці, і першыя яе лыжкі адлівае для памёршых у асобную пасудзіну; за ім тое ж робіць гаспадыня, потым пачынаюць есці ўсе астатнія. Такім жа чынам гаспадар з гаспадыняй адліваюць духам і частку з усіх іншых страў. З кашы, акрамя аддзеленай ужо для памёршых часткі, кладуць для іх яшчэ трошкі за акно, з боку двара. Пасля заканчэння ўрачыстасці частка страў, выдзеленая для духаў, аддаецца дзецям, каб не палохаліся навальніц, маланак і перуноў, другія выносяць сваёй жывёле, а іншыя — птушкам, пакідаючы на даху свайго дома, або нясуць на рэкі, азёры ці сажалкі і выліваюць для падсілкавання тых душ, якія рассталіся з целам праз ваду. Рэшткі страў ад гэтай бяседы некаторыя нясуць таксама на могільнік, дзе разам з сабранымі жабракамі заканчваюць вячэру. Яшчэ некалькі дзесяткаў год назад пад час святкавання дзядоў завязвалі вочы смялейшай і спецыяльна выбранай для гэтага дзяўчыне ці жанчыне і саджалі яе на слуп, укапаны ў падлогу каля печы. Гэта жрыца, цэлы дзень перад тым не еўшы, прыглядалася да душ, якія ўваходзілі ў хату, стараючыся пазнаць у іх сваіх знаёмых і родных; бачыла ў сваім уяўленні, як душы далёкіх сваякоў і сяброў дружалюбна набліжаліся да тых, хто сядзеў за сталом, палохаліся выгляду постацей душ, не вядомых яе дому і чужых, і абцяжарных праклянцем за крыўды і прысваенне чужога. Убачыўшы постаці гэтых непрытульных агрэсіўных душ, жанчына палохалася, часам страціўшы прытомнасць, валілася на зямлю, палохаючы тым самым астатніх.

## XLIV. Дзяды ў в. Баравое Лельчыцкага р.

Памінанне душ памёршых продкаў адбываецца ў дні, якія завуць: а) асеннія дзяды, ці змітраўка, б) мясныя дзяды, ці «таўстая субота» (перад заговінамі на масленым тыдні), в) траецкія дзяды, у суботу перад тройцай.

У гэтыя дні гатуюць спецыяльную памінальную вячэру з некалькіх страў, у ліку якіх абавязковымі лічыліся яечня, бліны, тварожнікі і куцця, а ў некаторых месцах і бліны, якімі замяняюць тварожнікі. У паляўнічых, рыбакоў і пчаляроў на памінальную вячэру асобна варыўся другі чыгун куцці, які ў час вячэры стаяў на пячным слупе, які завецца ў гэтых месцах «дзед». У час вячэры, калі ўся сям'я яшчэ сядзела за сталом і не пачынала есці апошнюю страву куцці (варыцца тут з пярловай крупы), гаспадар дома, напрыклад, пчаляр, лез на печ, дзе і еў куццю, не здымаючы чыгун з «дзеда». Тут жа ён звяртаўся да дзядоў з просьбай дапамагчы яму зберагчы пчол «ад гнільца», каб яны не блудзілі, і інш. Пасля вячэры гаспадар спускаўся з печы, браў чыгун з рэшткамі кашы і, застаючыся тварам да дзеда, ішоў задам да дзвярэй са словамі: «Дзяды, дзяды! Паелі куцці — ідзіце дадому». Падышоўшы да дзвярэй, ён адчыняў іх, выходзіў у сенцы, не азіраючыся, адчыняў дзверы на вуліцу, кідаў чыгун у бок могілак і гэтак жа хутка зачыняў дзверы ў сенцы і ў хату.

Стол, за якім вячэрала сям'я, заставаўся на ноч непрыбраным.

## XLV. Зімовыя дзяды ў Якімецкай вол. Рэчыцкага п.

Усіх на год у гэтай мясцовасці памінальных дзён, ці, як кажуць сяляне, дзядоў, чатыры: 1) перад масляным тыднем, 2) радуніцкія — у аўторак на фаміным тыдні, 3) траецкія — у панядзелак перад тройцай і 4) перад днём св. Міхаіла (8 лістапада).

На абрадавай *вячэры* ў гэтыя дні колькасць страў абавязкова павінна быць няцотная, па магчымасці не менш 9, у заможных яна часта даходзіць да 15 і больш.

Калі гаспадыня скончыць сваё гатаванне і выставіць усе падгатаваныя стравы на прыпечак ці лаву, тады гаспадар бярэ гаршчок з гарачымі вугаллямі, кладзе туды некалькі кавалкаў воску і абводзіць ім па тры разы вакол кожнай пасудзіны са стравамі, абкурваючы яе вашчаным дымам са сваёй немудрагелістай кадзільніцы. Потым уся сям'я на чале з гаспадаром становіцца ў

парадку старшынства перад іконамі і моліцца, складаючы па тры паклоны ў пачатку і па заканчэнні малітваў, пасля чаго ўсе садзяцца за стол. Першым блюдам падаецца так званая *сыта*, ці *кануна*. Пачынае абрадавую вячэру гаспадар. Узяўшы лыжку з канунай і скібкай хлеба, ён вылівае яе на стол і следам за тым есць з гэтай талеркі тры лыжкі, што за ім па чарзе паўтарае кожны з прысутных тут членаў яго сям'і. Пасля гэтага кануна прыбіраецца са стала. З астатніх страў кожны з прысутных бярэ колькі захоча, толькі абавязкова аддзяліўшы ад яе папярэдне па частцы на стол — для *дзядоў*. Ад гэтых частачак пад канец вячэры на стале ўтвараецца прыстойная горка якой-небудзь мешаніны [...] Парадак падачы страў прыблізна наступны: 1) сыта ці кануна, 2) посны квас, 3) квас з салам ці мясам, 4) каша посная (з макам), 5) каша з салам, 6) каша з малаком, 7) адно малако падагрэтае, 8) яечня, 9) рыба звараная, 10) рыба смажаная, 11) суп з мясам, 12) парасяціна, 13) суп з малаком, 14) сырнікі, 15) малакоператопленае.

Па заканчэнні вячэры свечку тушаць хлебам, прычым назіраюць, куды пойдзе дым: калі прама ўгору, то ўсё ў доме, у сям'і будзе добра, калі ж ён нахіліцца ў бок дзвярэй хаты, то гэта азначае хуткую смерць каго-небудзь з членаў сям'і. Затым гаспадыня вылівае па чатырох вуглах стала, прама на абрус, з пасудзіны ўсю рэштку *кануны*. На стале застаецца да раніцы горка сумесі, назбіранай з выдзеленых членамі сям'і частак стравы для дзядоў. Пасля гэтага гаспадар ці гаспадыня адсоўваюць ад лавак стол і паліваюць вадой усю падлогу ў хаце да самых дзвярэй, гаворачы пры гэтым: «Што не даелі і не дапілі, то ідзіце на папоў двор». Гэтымі словамі выправаджваюцца прэч душы нябожчыкаў.

## XLVI. Масляныя дзяды ў пас. Крупскі

Сям'я, да якой па запрашэнню я патрапіў на дзяды, па традыцыі збіраецца «дзедаць» (г. зн. адзначаць гэты абрад) пяць разоў на год. Паколькі рытуал спраўляецца ў асноўным па суботах — масляныя дзяды, траецкія, пакроўскія, піліпаўскія (перад заговінамі), то ўсе яны праходзяць пад агульнай назвай «дзедаўскія суботы». Выключэнне складаюць толькі радуніцкія дзяды, якія звычайна прыпадаюць на аўторак пасля велікоднага тыдня. За дзядоўскім сталом я апынуўся ў суботу, напярэдадні масленіцы.

Адразу было відаць, што гаспадыні давялося доўга пашчыраваць, каб як належыць правесці саму вячэру і годна сустрэць гасцей. У гэты вечар у хату з'ехаліся дзеці гаспадыні, нават дачка з Мінска. З самага пачатку вечара кіраванне ўзяла ў свае рукі гаспадыня. Пасля яе запрашэння ўсіх, хто не цураецца спрадвечных абрадавых правіл, да стала адна з госцяў па няведанню тут жа села на ўслон, аднак гаспадыня папрасіла яе ўстаць, бо яшчэ не прыйшла пара — вячэры абавязкова павінна была папярэднічаць малітва, якую ўсе выслухалі стоячы. Гаспадыня ціха прачытала яе, трымаючы ў руках запаленую свечку. Прысутны ў хаце малады («парцейны») зяць гаспадыні перачакаў гэты этап у суседнім пакоі. Пасля заканчэння малітвы ўсе па старшынству былі пасаджаны за стол. Запаленая свечка была пастаўлена ў шклянку з крупой. Калі б хто незнарок затушыў бы свечку, больш яе не сталі б запальваць, але такога не здарылася, і яна гарэла да самага канца вячэры.

Пасля распараджэння гаспадыні («Бацька, ну то скажы!») застолле пачынае негаваркі гаспадар: «Дзяды і бабы, прыходзьце к нам дзедаць, старыя і малыя!» Лыжачку «кануны» — самай першай дзядоўскай стравы — ён адкладвае на сярэдзіну стала, пакрытага цыратай: «Дзядом!» Усе частуюцца канунай. Затым гаспадар адлівае на стол таксама ўсе наступныя стравы. Натуральна, ніхто чаркамі не стукаецца, як і на хаўтурах («Нельга працягваць рукі, бо працягнеш ногі»). Назаўтра гаспадыня расказвала, што даўней, не памыўшыся ў лазні, «дзедаць» не садзіліся. Але ж вядома, шмат якіх даўнейшых звычаяў ужо не трымаюцца ў нашы дні.

На дзядоўскую вячэру колькасць страў мусіла быць заўсёды з лікам: 5, 7, 9, 11... Бедныя маглі абыходзіцца звычайнай вячэрай. Хоць і пачынаюць звычайна з кануны (мядовая вада з пакрышанай у яе булкай), але галоўнай стравай дзядоў лічыцца каша (прасяная, рысавая ці грачаная). На стале расстаўлена халоднае ці гарачае мяса — свініна і курыца з цэлай галавой, хатні сыр, каўбасы, катлеты. Не адразу выстаўляецца поліўка (юшка на свініне), пад якую абавязкова трэба памінаць. Відаць, гэта апошняя дэталь прымусіла кагосьці з прысутных мужчын нагадаць пра поліўку гаспадыні, аднак тая, строга прытрымліваючыся парадку, сказала, што гэту страву яшчэ зарана выстаўляць, на ўсё, маўляў, свой час. Затым падалі на стол малако, піражкі з сырам, салат. Абавязковай завяршальнай стравай з'яўляюцца клёцкі. Каб іх прыгатаваць, цеста замешваюць на малацэ ці на вадзе, пякуць і, заліўшы малаком, запарваюць у печы. Стравы ядуць з агульных талерак, кожнаму прыбор не выстаўляецца.

У час вячэры прыехала яшчэ адна дачка з суседняй вобласці разам з мужам на сваёй машыне. Калі яны са спазненнем пачалі вячэраць, далучыўшыся да астатніх, гаспадыня раптам спахапілася, што яны пачалі не з кануны. Аднак зяць жартам суцешыў: «А мы ёю кончым!»

Гаспадыня, як магла, старалася з самага пачатку падтрымліваць сумную размову за сталом, расказвала пра жахлівыя здарэнні з тымі, хто не пажадаў аднойчы рабіць дзядоў. Але час ад часу гаворка пераходзіла на іншыя тэмы, гутарылі пра ўсё на свеце, не-не ды ўзнікалі вясёлыя ўспаміны і, як звычайна на застоллях, выбухаў смех. І тады гаспадыні даводзілася спыняць вясёлую гаману і нагадваць, дзеля чаго яны тут сабраліся. Смех заціхаў, ды ненадоўга. Калі нехта захацеў паслухаць радыёпрыёмнік, яму строга было сказана: «Падзедаеш — тады ўключай!» Наогул жа падымацца да пары з-за стала было непажадана. Гаспадыні трэба было падаіць карову, але зноў жа — «грэх, не падзедаўшы, уставаць».

Пасля вячэры ўсе павінны падняцца зноў жа па старшынству. Посуд са стравамі не прыбіраецца, а стол на ноч пакрываецца абрусам.

На траецкія дзяды рытуал паўтарыўся ў амаль нязменным выглядзе. Толькі ў дадатак гаспадыня ўпрыгожыла хату і падворак «маем» — галінкамі бярозы, клёну, арабіны і арэшніку.

## XLVII. Дзяды радуніцкія ў Віцебскім п.

*Велікодныя дзяды, радыніца* адзначаюцца ў аўторак фаміного тыдня. Хоць большасць сем'яў паспела наведаць дарагія магілы памёршых яшчэ ў велікодныя дні, пахрыстосавалася са сваякамі, катаючы *свянцонае* яечка па магіле, уваткнуўшы, дарэчы, і вербачку, калі гэта не было зроблена на *вербніцу;* але поўнае ўрачыстае памінанне продкаў адбываецца на *радыніцу*. У прыбранай па-святочнаму хаце гаспадыня рыхтуе стравы: для хатняга абеду — *юшку*, клёцкі і кашу, якая мае значэнне куцці; і бліны, *драчаны, сочні, ляпні*, рознае *пячыстае* — для памінання на могілках. Да апошніх страў дадаюцца таксама рэшткі ад велікоднага *свянцонага*, асабліва сыр і яйкі. Усё гэта складваецца ў кашэль або ў сявалку ці яшчэ ў вялікую палатняную хустку. Пасля кароткай малітвы перад хатнімі іконамі ўся сям'я або толькі галоўныя яе члены выпраўляюцца на могілкі, куды па чарзе нясуць памінальныя стравы. Тыя сем'і і асобы, якія маюць сваякоў на розных могілках, выходзяць з дому каля поўдня; тыя,

каго гэта не датычыцца, звычайна выходзяць з дому пасля паўднёвага адпачынку.

Калі сям'я прыйдзе на месца, жанчыны пачынаюць галасіць і прычытваць, прыпаўшы тварам да магілы; некаторыя пачынаюць галашэнне здалёк, як толькі ўбачаць родную магілу. Мужчыны тым часам развязваюць карзіну з памінальнымі стравамі і, вынуўшы *свянцонае* яечка, катаюць яго па магіле са словамі: «Хрыстос уваскрос!» Тое самае робіць кожны член сям'і, пачаўшы з галоўнай магілы і заканчваючы магіламі сяброў і суседзяў. Кош да часу або стаіць каля ўзгалоўя магілы, або падвешваецца на сук бліжэйшага дрэва, нават на магільны крыж.

Па заканчэнні хрыстосавання і *галашэння* гаспадыня рассцілае хустку на больш зручнай сваякоўскай магіле і раскладвае прынесеныя стравы [...] Калі на магілу прынесен новы крыж або патрабуе абнаўлення стары, які паваліўся таксама, як магільны ўзгорачак, то адзначаны памінальны стол уладкоўваецца пасля таго, як усё *абрадзюць*. Дарэчы, існуе распаўсюджанае палажэнне, што магільны крыж ставіцца на дадзенай магіле толькі раз і што нават нельга ўзнаўляць паваленых ад трухлявасці крыжоў, а неабходна класці іх на магільны ўзгорак, дзе яны дагніваюць канчаткова. Нягледзячы аднак на тое, некаторыя сем'і ўсё-такі ставяць новыя крыжы на месца паваленых старых і прыстасоўваюць гэту замену да *радыніцы*. На свежай магіле крыж абавязкова ставіцца ў гэты ж дзень.

Сям'я размяшчаецца вакол магільнага стала і памінае, выконваючы ўсё тое, што робіцца за памінальным хатнім сталом, прычым мужчыны застаюцца без шапак. Памінаць запрашаюцца сваякі і знаёмыя, якія праходзяць міма, але яны толькі *прынясуць чэсць* і ідуць да сваіх родных магіл. Калі свяшчэннік наведае могілкі, то пасля літыі над магілай сям'я запрашае і яго памянуць *дзядоў* і ў гэтым выпадку не пачынае памінання да літыі.

Незалежна ад царкоўнага памінання, зробленага свяшчэнні-кам на магіле, *дзяды* памінаюцца тут жа *старцамі*, якія з'яўляюцца на могілках у гэты час. Калі *старац знае спевы*, дык ён памінае памёршых пайменна, пад дыктоўку; у адваротным выпадку, частуючы старца, яго просяць памянуць *усіх нашых дзядоў*. Пры такіх магільных памінаннях не заўсёды можна бачыць куццю, паколькі яе ўдала замяняе *свянцонае яйцо;* яшчэ радзей можна ўбачыць тут запаленую васковую свечку.

Рэшткі памінальных страў не нясуць дадому, а раздаюць бедным, якіх на кожных могілках у дзень радуніцы вялікая колькасць, або проста пакідаюць разам з крошкамі на магіле: «Няхай

і птушкі памянуць нашых дзядоў!» Ячнае шалупінне, а здараецца і цэлае яечка, закопваецца ў магільны насып.

У час памінальнай закускі *галашэнне* з прычытваннямі ўзнаўляецца некалькі разоў то на адной, то на другой сваякоўскай магіле; галашэннем і заканчваецца памінанне. Часта здараецца, што плакальшчыца заканчвае сваё галашэнне па дарозе ад магілы.

Усю рэшту дня пасля вяртання дадому сяляне праводзяць асабліва дабрачынна і без усялякай працы. Добры гаспадар праводзіць час дома, раячыся з сям'ёй пра набліжэнне палявых работ, якія тут жа размяркоўвае паміж яе членамі, і затым ідуць спаць не вячэраўшы.

Сказанае мной пра *радыніцу* мела месца ў Віцебскім павеце. Не магу не адзначыць тут, як адбываюцца тыя ж памінкі ў Віцебску, па навакольных могілках. Дабрачынныя мяшчанскія сем'і і сяляне, што жывуць у горадзе, прыходзяць на магілы родных з памінальнымі стравамі, [...] хрыстосуюцца, катаючы яйкі па магіле, запрашаюць свяшчэнніка служыць літыі, пасля чаго адбываюць памінкі такім жа чынам, як і ў вёсцы [...]

## XLVIII. Дзяды веснавыя ў пяты дзень пасля вялікадня, якія завуцца на Палессі «наўскім днём»

Тры разы на год народ памінае сваіх нябожчыкаў у дні, строга вызначаныя векавой традыцыяй. Позняй восенню, закончыўшы сельскагаспадарчыя работы і разам з прыродай збіраючыся на доўгі зімовы адпачынак, ён спраўляе сваім памёршым дзяды, адорвае іх хлебам і кашай, чытае малітвы. У канцы запустаў (на масленіцу) зноў дзеліцца з імі сытасцю страў і пітва, ставіць вечарам стол, запальвае асвячоную свечку, уся сям'я ўрачыста сядзіць на лавах, а гаспадыня, раскрыўшы акно, тры разы гукае: «Дзяды, дзяды, ходзьце вячэраць!»

І чакаюць у маўчанні прыходу духаў, узіраючыся ў грамніцу, лічаць па мільганню яе полымя колькасць тых, хто з'явіўся на вячэру.

З вясной — хто перазімаваў, каго не даканаў добрасумленны пост, які мала чым адрозніваецца ад голаду, хто вытрымаў хатняе ўдушша і бруд, той радуецца ўваскрэсенню Хрыста, той цешыцца, што выжыў, і натуральным зыходам трыумфуе над памёршым.

І тады ў чацвер пасля вялікадня спраўляецца ўрачыстаць дзядоў.

Неўзабаве выблісне сонца, у кожнай хаце адна ці дзве жанчыны рыхтуюцца да адведвання духаў. Прыбіраюцца са светам у белае палатно, выносяць з каморы наўмысна захаваныя для гэтага выпадку рэшткі свянцонага і, загарнуўшы іх у хвартух, паведамляюць сям'і: «Іду цяпер у наўскія госці!»

І ідуць адна за адной шнуры белых постацей за сяло, на могільнікавыя пяскі. Ідуць засяроджаныя і ўрачыстыя, бо спраўляюць спрадвечны абрад. Сонца падымаецца, і могільнік, звычайна забыты і запушчаны, напаўняецца гэтымі белымі постацямі, нібы натоўпам прывідаў.

Доўга блукаюць, адшукваючы свае магілы. Нялёгкая гэта справа. Надмагільных помнікаў там няма, надпісаў не знойдзеш, а чытаць яны не ўмеюць. Калі чалавека тут закапаюць, то нагарнуць трохі пяску і пастаўяць маленькі крыжык. Але праз колькі дзён вецер здзьме ўзгорачак, праз колькі месяцаў крыжык упадзе, яго перакладзіна згубіцца, і магіла нічым ад іншых не адрозніваецца. Жанчыны тады ходзяць і адшукваюць ім толькі адным вядомыя прыкметы. Адна дачка павесіла над магілай на крыжы некалькі пацерак, другая на магіле маці абвязала крыжык чырвонай ніткай, іншая на мужавай магіле павесіла хвартушок з вышытымі па рагах крыжыкамі.

Пастухі і бадзягі часта забіраюць гэтыя памяткі, затым кабеты збіраюцца па некалькі чалавек, прыгадваюць, дзе хто пахаваны, каля каго ляжыць, і нарэшце кожная знаходзіць сваіх.

Тады яна паднаўляе магілу, рукамі зноў падсыпае зямлю на ўзгорачак, збірае абломкі крыжа, выпраўляе яго, прымацоўвае перакладзіну і вешае новы хвартушок. Так завіхаюцца ўсе, а пастухі, пасучы каля могілак скаціну, з цікавасцю назіраюць:

— Бач, як бабы строяць магілы. Зараз пачнуць заводзіць!

Таму што гэта быў толькі ўступ да адпаведнай цырымоніі. Цяпер жанчыны засцілаюць абрусамі магільныя ўзгорачкі і выкладваюць на іх булкі і яйкі, сыр і каўбасы [...]

Тады садзяцца насупраць на кукішкі і, падпёршы кулаком галаву, пачынаюць размову з нябожчыкам:

— Ой, доню мая, доню! — заводзіць матка.— Не хочаш ты мне ні праць ані ткаць. Адну мяне пакінула на работу. Няма ж цябе, няма ж. Ой, доля ж мая, доля, доленька!

Голас уздымаецца вышэй і вышэй, пераходзіць у стогн, амаль выццё і яднаецца ў адзін хор з сотняй іншых, што плачуць па гаспадарах і бацьках, братах і матках, сынах і ўнуках.

Так цягнецца доўга, заціхаючы, то зноў узрастаючы, ахопліваючы ўвесь могільнік, ажно нарэшце каторая падымецца, налівае чарку гарэлкі, хрысціцца і кажа:

— П'ю я за цябе, доню сардэчная, каб ведала, што нічога табе не шкадую, і святло божае няхай табе свеціць.

І вылівае чарку на пясок.

І пачынаецца бяседа.

Ломяць булку на кавалкі і пытаюцца ў памёршага, ці памятае свае палоскі, якія пакінуў, і расказваюць яму пра буйныя руні і зноўнае жніво, якое з імі не стрэне. Крышаць сыр і прыгадваюць скаціну, якую той гадаваў. Расказваюць яму пра карову-радзіцельку, пра быкоў працавітых, якіх не ўбачыць праз зямлю, што закрыла яму вочы.

Расказваюць яму ўсе гісторыі пра хатніх і скаціну, каштуючы прынесенае і выкладваючы на пясчаны ўзгорак частку кожнага прысмаку для свайго духа-субяседніка.

Потым [...] збіраюцца кучкамі, размова робіцца ажыўленая, успамінаюць розныя дзівы, жахі — і, нарэшце, смутак, і галашэнні пераходзяць у нейкую дзіўную ўцеху ад вясны, ад жыцця, сярод магіл мяркуюць пра святы, пра вяселлі — пачынаецца спеў і смех.

Збіраюцца назад, хаваючы рэшткі страў, і цягнуцца ў сяло гаваркім тлумам, нічым не нагадваючы жалобнага абраду.

Вяртаючыся вечарам, пастухі наведваюць могільнік. Ён бялее ўвесь ад новых ахвярных хвартушкоў — на крыжыках блішчаць пацеркі і жычкі чырванеюць. Хлопцы патроху цягаюць з магіл, некаторыя шукаюць па зямлі пакінутую булку ці сыр.

Пасля іх прыходу магілы зноў застаюцца спустошаныя, і ніхто ўжо нябожчыкаў не адведвае аж да наступнага «наўскага вялікадня».

## XLIX. Радаўніца

У аўторак пасля праводнай нядзелі, між другой і трэцяй гадзінамі пасля паўдня, збіраюцца сяляне і сялянкі на могільніку, на неагароджаных магілах. Там размяшчаюцца вакол магільных насыпаў сваіх бацькоў, дзяцей, мужоў, жонак і іншых сваякоў. Адна магіла служыць для памінання некалькіх памёршых. Паводле звычаю іх робяць з шырокіх дошак у форме прамавугольніка і насыпаюць зямлю крыху вышэй дошак. З часам такая магіла зарастае травой і робіцца падобная на вялікую скрыню, пакрытую дзёрнам. На кожнай магіле плачуць, качаюць яйкі і аддаюць іх старцам, якія ў гэты дзень збіраюцца і спяваюць набожныя песні. Затым рассцілаюць на магіле абрус, ставяць на яго прынесеныя стравы, паліваюць насып гарэлкаю і мядовай сытой, а потым, пасеўшы на магіле дарагога чалавека, ядзяць,

папярэдне запрасіўшы памёршых на сваю ўрачыстаць: «Святыя радзіцелі, хадзіце к нам хлеба і солі кушаць, старыя і малыя». Колькасць страў не павінна быць цотнай, г. зн. іх павінна быць пяць, сем або дзевяць, і ўсе не вадкія. Трэба, каб абавязкова быў мёд, тварог, бліны, г. зн. тоўстыя налісннікі з грачанай мукі, яйкі, кілбасы ці таксама вэнджаная свініна. Апрача гэтага, час ад часу бяруць яечню, налісннікі, грыбок і якое-небудзь печанае мяса. Калі хтосьці з сялян настолькі бедны, што не можа выдаткаваць на пералічаныя стравы, тады багацейшы павінен за свой кошт дапамагчы яму ў гэтым. Рэшту, якая застаецца пасля стала, аддаюць старцам. Паабедаўшы, зноў вяртаюцца да нябожчыкаў з такімі словамі: «Мае радзіцелі, выбачайце, не дзівіце, чым хата багата, тым і рада».

Адбыўшы ўсе гэтыя цырымоніі, ідуць у карчму [...]

Звычайна могілкі на Беларусі размяшчаюцца ў гаях, бо пры магіле кожнага памёршага хтосьці з бліжэйшых сваякоў садзіць дрэўца, і з цягам часу вырастаюць вялікія і прыгожыя гаі, якім з'яўляецца і той, у якім была я, і які ўзнік, як запэўнілі сяляне, з дрэў, пасаджаных такім вось чынам.

Як бы там ні было, гэты грубы звычай мае ў сабе штосьці такое, што выклікае пачцівае ўражанне. Гледзячы на гэтых бедных сялян, падзеленых на гурты, рассыпаныя тут і там, якія аплакваюць страты блізкіх людзей, разрываецца душа і набягаюць слёзы. Нельганазіраць за гэтай драматычнай карцінай абыякава. Калі адкінуць розныя забабоны, то можна ацаніць гэты звычай як годны пахвалы, ці прынамсі бяскрыўдны. Калі хочаш суцешыць шчымлівы боль у сваёй чулай памяці, прыйдзі на магілу любімага чалавека. У цябе нейкія турботы? Пайдзі, аблі слязьмі камень, які пакрывае астанкі тваёй сяброўкі ці сябра, і ты адчуеш палёгку...

Падобныя святкаванні адбываюцца чатыры разы ў год, але гэта сярод іншых надзвычайнае. У адных мясцінах у іх прымаюць удзел толькі жанчыны, у другіх удзельнічаюць і мужчыны.

## L. Стаўроўскія дзяды
## ў Барысаўскім п. Мінскай губ.

Звычайныя восеньскія дзяды па-мастацку апісаны ў паэме [А. Міцкевіча] *«Дзяды»*. Хто ж не ведае? Таму я апішу тут *стаўроўскія* як менш вядомыя.

У Барысаўскім павеце каля Докшыц, над Беразіной, на граніцы Белай Русі, яшчэ сёння адзначаюць перад зялёнымі святкамі (тройцай) свята дзядоў стаўроўскіх.

Пры звычайнай у падобных абрадах вячэры гаспадар, сабраўшы частку страў, ставіць іх пад стол і паўтарае тройчы: «*Стаўры, Гаўры, гам, прыхадзіце к нам!*» Толькі гэтым заклікам і адрозніваецца святкаванне гэтых дзядоў ад іншых. Паданне пра іх захавалася не ўсюды. Прыведзены абрад святкуецца толькі на Белай Русі. Там п. Баршчэўскі пачуў наступную аповесць, якая тлумачыць паходжанне: «Над ракой Дрысай знаходзіцца маёнтак Краснопаль, акружаны з усіх бакоў лесам. Там ёсць мясціны, дзе ў язычніцкія ішчэ часы жыў князь Бой, праслаўлены на ўсю Белую Русь як дужы волат. Ён кіраваў усім народам, які жыў па берагах Дрысы. Звычайна пацехай яго было тое, што ён аб'язджаў бары і лясы з лукам і стралой і паляваў на ласёў і іншых дзікіх звяроў. Для гэтага ён меў двух верных сабак: адзін зваўся *Стаўры*, а другі *Гаўры*. Абодва яны былі вельмі дужыя і разумныя. Самы магутны мядзведзь не ў стане быў вытрымаць сутычку з імі: у той жа момант ён быў імі разадраны, нібы той заяц ганчакамі. Калі на паляванні, аддзяліўшыся як-небудзь ад сваіх таварышаў, Бой аказваўся ў акружэнні зладзеяў, ён іх разганяў і разбіваў, нацкоўваючы і напускаючы на іх сваіх сабак. Не раз здаралася, калі ён блудзіў у далёкіх лясах, яны яго выводзілі на дарогу, пад самы яго дом. Часта гэтыя сабакі выратоўвалі свайго гаспадара ад вялікіх небяспечнасцей, і таму яны былі для яго самай прыемнай забавай у жыцці. Ён загадаў сваім падданым аддаваць ім такую ж пашану, як найважнейшым асобам, якія служылі пры ім. А калі ад старасці гэтыя сабакі адзін за адным паўміралі, дык ён, улічваючы іх заслугі, прызначыў асобныя дні ў годзе для ўрачыстага ўшанавання іх памяці. У гэтыя дні народ збіраўся на тыя мясціны, дзе былі закапаны іх косці, і прыносіў з сабой стравы і пітво і банкетаваў там да позняй ночы; аб'едкі і косці кідалі ў агонь, называючы пры гэтым імёны сваіх сабак: *Стаўры* і *Гаўры*, нібыта выклікаючы іх цені з таго свету».

## LI. Дзяды

Прыезд у сяло Домжарыцы адбыўся напярэдадні тройцына дня 1929 г. Пад вечар мясцовы селянін-ляснік запрасіў членаў экспедыцыі «на дзяды». Сям'я лесніка складалася з яго самога, яго бацькі (82 гады), які лічыўся галавой сям'і, з жонкі лесніка і траіх дзяцей. Падрыхтаваная вячэра налічвала некалькі страў, а іменна: бураковы боршч з мясам (але можна варыць любы іншы суп), сырнікі-«тварожнікі», якія ў дзень дзядоў могуць быць заменены клёцкамі з пшанічнай мукі, вараную вяндліну, беларускую яечню, у якую ўваходзяць яйкі, малако і пшанічная

мука [...] Наогул у гэты дзень прынята гатаваць багатую вячэру. Як паведаміла гаспадыня, калі нехта ў вёсцы па сваёй беднасці не мог падрыхтаваць у гэты дзень патрэбную памінальную вячэру, ён меў права звярнуцца за дапамогай у любы дом і ніхто не мог адмовіць яму. У звычайны дзень, збіраючыся на працу, звярнуўшыся за дапамогай да суседа, мог атрымаць адмоўны адказ, але ў дзень дзядоў адмаўляць забаранялася звычаем.

Абрадавы бок памінальнай вячэры быў ужо ў значнай ступені скарочаны (магчыма, у выніку прысутнасці старонніх) і меў наступны выгляд: гаспадыня пакрыла стол чыстым новым абрусам і паставіла другі, таксама пакрыты абрусам стол каля парога. Падаючы на стол вячэру для сям'і, яна перш за ўсё аддзяляла частку кожнай прыгатаванай ёй стравы і ставіла на стол каля парога. Перад вячэрай галава сям'і (бацька лесніка) запаліў свечку, замацаваў яе на стале ў покутнім (пярэднім) вугле і прапанаваў усім памаліцца. Стары чытаў малітвы гучна, уголас, а астатнія члены сям'і ў гэты час маўчалі. Пасля малітвы галава сям'і запрасіў усіх сесці за стол. Стары заняў сваё звычайнае, самае пачэснае месца ля стала. Такім пачэсным месцам лічыцца лава каля сцяны супрацьлеглых дзвярэй. Членаў экспедыцыі пасадзілі пад абразы ў кут. Далейшае выкананне ўсіх абрадавых правілаў ляжала на гаспадыні дома. Яна ўзяла лусту хлеба, паклала яго прама на абрус і тройчы паліла баршчом, зачарпнуўшы тройчы лыжкай з агульнай чашкі. Паліты баршчом хлеб застаўся на стале. Затым стары наліў усім па чарцы [...] і асобную чарку, якую гаспадыня адразу ж паставіла на акно за спіной старога. Пачалі вячэраць. Калі члены экспедыцыі зусім выпадкова паклалі лыжкі на стол, стары, які, відаць, сачыў за іх дзеяннямі, паспяшаў заўважыць, што, чэрпаючы боршч з чашкі, трэба кожны раз класці лыжку на стол, паколькі ў гэтыя кароткія перапынкі лыжкамі карыстаюцца нябачныя «дзяды», якія вячэраюць разам з усімі з той жа агульнай чашкі.

Ад кожнай наступнай стравы, якая падавалася на стол, гаспадыня ў першую чаргу аддзяляла невялікую частку і клала ўжо не на стол, а толькі на акно, дзе стаяла чарка.

Калі ў адным з перапынкаў між тым, як падаваліся стравы, члены экспедыцыі выказалі жаданне пакурыць, стары паставіўся да гэтага адмоўна і не дазволіў ім. Вячэра скончылася падзячнай малітвай, якую стары чытаў уголас, а астатнія слухалі яе моўчкі. Стравы ад вячэры, пастаўленыя на акно і стол каля парога, на ноч не былі прыбраны, застаўся непрыбраным і стол, за якім вячэрала сям'я.

Варта адзначыць, што дому быў нададзены святочны вы-

гляд: падлога чыста памыта і засцелена аерам, звонку ўваход быў упрыгожан маладымі бярозкамі.

Не больш як праз паўгадзіны пасля вячэры гаспадыня прапанавала ўсім класціся спаць.

## LII. Траецкія дзяды ў Дынабургскім п.

...*Пятроўскія*, ці, правільней, траецкія, *дзяды* нагадваюць *радыніцу*, таму што памінкі адбываюцца не ў хаце, а на магіле. У гэтыя *дзяды* звычайныя працы спыняюцца ў полудзень, і *святкуецца астатняя частка дзядоў* таму, што ў гэты час шмат работы, і таму, што наперадзе чакаюцца святы: тройца, духа і трайчона (*«тройчены»* — трэці дзень).

Родныя магілы прыбіраюцца маем, аерам, кветкамі. Гэта надае памінальнаму сталу на магіле прыгажэйшы выгляд, хоць і бяднейшы, чым на *радыніцу*, «бо мужык ніколі ўволю не паесць хлеба з *беркай* (бярозавы сок)». Між іншым, на магілу прыносяць зялёныя яйкі, пафарбаваныя ў адвары з маладой зелянiны. Гэтыя *несвянцоныя* яйкі не качаюцца па магіле, іх ядуць пасля малітвы і галашэння, за выключэннем аднаго, якое пакідаюць на магіле для бедных. Калі няма магчымасці наведаць далёкія родныя магілы, робяць гэта ў тройцын дзень, пасля абедні. У некаторых мясцінах Гарадоцкага павета нават самыя *дзяды* святкуюць менавіта ў тройцын дзень. Аднак гэта — новы звычай і пачаўся ён з не надта далёкіх часоў.

## LIII. Траецкія дзяды ў Себежскім п.

У тройцын дзень памінкі адбываюцца так, як і на раданіцу, з тым толькі адрозненнем, што ў гэты дзень родныя, што прыбылі на могілкі, бярозавымі галінкамі абмахваюць * магілы. Гэта робіцца наступным чынам: мужчыны і жанчыны адломліваюць некалькі галін з бяроз, і старэйшы ў сям'і мяце імі магілу. Затым гэта ж самае паўтараюць малодшыя і пры гэтым чытаюць, якія ўмеюць, малітвы.

---

* Нам дакладна вядома, што ў некаторых мясцовасцях Себежскага павета звычай абмахваць (*«опахивать»*) магілы завецца *парыць старых*. Цябаючы магілы нябожчыкаў бярозавымі галінкамі, сяляне спадзяюцца даставіць ім задавальненне, як ад лазні. У гэтым звычаі праглядае грубая ідэя пра замагільнае жыццё. У гэтыя ж дні вывешваюць у вокны ручнікі затым, каб душы нябожчыкаў маглі беспамылкова пазнаць жыллё сваіх родных (заўвага А. М. Семянтоўскага, рэдактара выдання).

## LIV. Дзень ушанавання памяці загінуўшых землякоў у в. Тонеж

Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў Тонежы замацаваўся новы звычай, прымеркаваны да веснавога свята вялікадня. Ён урываецца рэзкім дысанансам у атмасферу веснавой радасці і весялосці. Гэта звычай калектыўнага аплаквання каля помніка загінуўшым аднавяскоўцам. У выніку мацнейшых узрушэнняў у гады вайны быў уваскрэшан у іншай якасці старажытны традыцыйны жанр галашэння ў новай форме калектыўнай імправізацыі. Нават расказы тонежскіх жанчын пра трагедыю свайго сяла гучаць як галашэнне з ледзьве ўлоўнымі гранямі пераходу моўнай інтанацыі ў музычную.

Здарылася гэта зімой 1942 г. Раніцай 260 тонежцаў—старыя, жанчыны, дзеці — накіраваліся ў сваю вёску з лесу, дзе яны з астатнімі аднавяскоўцамі хаваліся ад фашысцкага праследавання за дапамогу партызанам. У вёсцы яны збіраліся пераначаваць, абагрэцца і ўзяць у лес прадукты. Вечарам у Тонежы з'явіўся атрад эсэсаўцаў. Акружыўшы вёску кулямётамі, эсэсаўцы загналі тонежцаў у царкву і расстралялі, а ўсю вёску, да апошняй хаты, спалілі. З 260 чалавек выратавалася толькі адна Таццяна Бароўская. Параненай, ёй удалося выпаўзці з груды мёртвых цел, сярод якіх былі і яе чацвёра расстраляных дзяцей, і дабрацца да сваіх у лес. А праз некалькі сутак пасля гэтай трагічнай ночы Таццяна Бароўская прыйшла разам з тонежцамі, што жылі ў лесе, на тое месца, дзе была іх вёска, каб пахаваць груды попелу, у якія былі ператвораны іх сваякі і аднавяскоўцы. Менавіта ў гэты страшны момант і ажыла ў свядомасці народа спрадвечная інтанацыя, народжаная горам многіх пакаленняў. «Як закопвалі, было голасу, што ў сяле няможна было быць. Што ж гэта вам — зграбаюць попел! Свет у слязах тапілі, усё навакол разрывалася»,— расказваюць тонежцы.

Некалькі год пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны каля помніка загінуўшым тонежцам галасілі кожны дзень. У цяперашні час «гэта ўжо здаўнілася» і калектыўнае галашэнне каля помніка можна чуць адзін раз у год — у першы дзень вялікадня. Раніцай гэтага дня да помніка, што ўзвышаецца на цэнтральнай плошчы, ідуць жанчыны з вузельчыкамі ў руках. Развязаўшы вузельчыкі, кожная з іх кладзе каля помніка «пасху» (вялікодныя фарбаваныя яйкі, пірагі і г. д.) і, адышоўшы крыху ад помніка, пачынае галасіць. Галосіць кожная жанчына па-свойму, з разнастайна імправізаванымі ўсхліпваннямі і ўздрыгваннямі го-

ласу на адным гуку, на матыў традыцыйнага палескага напеву-формулы.

З кожнай фразай галасы плакальшчыц гучаць усё больш напружана. Пераходзячы амаль на крык, жанчыны галосяць надрываючыся («крычаць на ўсю галаву»). Усе фразы плакальшчыцы заканчваюць доўгім (наколькі дазваляе дыханне) апорным гукам. А паколькі пры калектыўнай імправізацыі яны пачынаюць і заканчваюць фразы не адначасова і працягласць фраз іх розная, у кожны дадзены момант некалькі жанчын цягнуць заключны апорны гук, які, такім чынам, не перапыняецца. Ствараецца ўражанне, што ён цягнецца бясконца. Гэты бясконцы напружаны гук, які рэзка і нібыта ненатуральна парушае ранішнюю цішыню светлага веснавога дня, служыць своеасаблівым «ферментам» у ахопліваючым усіх жыхароў сяла парыве «выгаварыць абіду». І жанчыны, у якіх нядаўна памерлі самыя блізкія ім людзі, як бы не ў стане дачакацца надыходзячага на трэці дзень вялікадня («мёртвых вялікдзень») традыцыйнага ў Тонежы дня памінання, ідуць на могілкі і праз некаторы час адтуль чуецца знаёмы бясконца працяглы гук.

Ашаламляльнае ўражанне пакідае гэта трагічная веснавая пераклічка плакальшчыц на магілах у канцы вёскі і каля помніка ў цэнтры вёскі. «Карыфей» гэтага выражэння народнай жалобы — Таццяна Бароўская. Яна першая прыходзіць да помніка і апошняя пакідае яго. «Гэта цяпер пастарэла ды панягожала, а ўперад дык і няможна было яе адтуль сцягці»,— расказваюць жанчыны. І хоць голас у яе слабы і надломлены, усе астатнія плакальшчыцы міжволі прыслухоўваюцца да яе. Калектыўнае галашэнне пачынае яна:

Ах, мае дзетачкі родныя,
Ах, мае дзетачкі мілыя,
Ах, мае зязюлечкі-дочачкі,
Ах, мае сынкі-галубочкі,
Ах, ніколі ж мне з вамі не святкаваці.
А я ж вас ужо пагадавала,
А я ж вас ужо пажаніла,
Толькі ў госцікі вас не прычакаюся.
А з якой жа чакаць вас староначкі,
А якой жа птушачкай
Вы ка мне прыляціце.

Кожная жанчына, што ўступае ў агульнае галашэнне, прыгаворвае пра свайго загінуўшага сваяка, па-традыцыйнаму параўноўвае яго з птушачкамі, кліча да сябе ў госці. Час ад часу якая-небудзь з плакальшчыц пачынае наракаць на лес:

Ай, усім жа ты быў зашчытнічак,
Ай, усім жа ты быў параднічак,
Ай, усім жа ты быў указнічак...,

які ў гады вайны быў іх абаронцам і толькі не абараніў яе дзяцей, брата, сястру...

Кульмінацыйны момант галашэння — праклён ворагу:

А пабі іх гром на бітым шляху,
На бітым шляху, на гладкай дарозе...

Гэты праклён як быццам узрывае традыцыйную мелодыю-галашэнне. Абарваўшы напружана-працяглы гук, якім заканчваецца радок, жанчыны скандзіруюць словы-праклёны гоманам і тут жа хутка адыходзяць ад помнікаў, не крануўшы і нават не глянуўшы на пакінутую каля помніка «пасху».

Звычай калектыўнага галашэння па загінуўшых у час вайны нагадвае існуючы ў Тонежы традыцыйны грамадскі памінальны абрад толькі ў самых агульных рысах. Вялікую ролю ў ім адыгрываюць якасна новыя асаблівасці. У той час як у традыцыйным памінанні памёршых натуральнай смерцю блізкіх аплакванне іх на магілах (далёка не ўсеагульнае і толькі памёршых нядаўна) — хутчэй даніна традыцыі, чым выражэнне жывога гора (якое ўжо выказана ў момант пахавання), у калектыўным аплакванні расстраляных у гады вайны аднавяскоўцаў на першы план выступае народная трагедыя. І тое, што гэты звычай прымеркаваны не да традыцыйных дзён памінання, а да першага святочнага дня вялікадня, надае яму асаблівы драматызм [...]. Знамянальна, што аплакванне ўголас сваякоў, памёршых натуральнай смерцю, звычайна асуджаецца ўжо праз паўгода-год пасля іх смерці: «Нечага рабіць, дык яна і вые, а калі тое гора было!»

Але галашэнне па аднавяскоўцах, загубленых фашыстамі, не выклікае асуджэння нават праз 30 год пасля іх пагібелі. Больш таго, далучэнне любога староннята чалавека да плачу сваякоў пад час калектыўнага галашэння ўспрымаецца як з'ява цалкам заканамерная. Нарэшце, асаблівы драматызм гэтаму «новаму абраду» надае наяўнасць у ім плакальшчыцы — «карыфея» — адзінай жывой сведкі трагічнай падзеі ў жыцці сяла, якое ўваскрэсіла жанр галашэння ў яго новай форме калектыўнай імправізацыі.

Такім чынам, тут усё — дзень і час прымеркавання, характар і форма самога галашэння — пратэстуе супраць гвалтоўнага, пачварнага, ненатуральнага.

# ГАЛАШЭННІ

13. Зак. 23



## ПА БАЦЬКУ

1. Ах, татулька наш,
Ах, сізы голубе наш!
Ты ж нас гадаваў,
Ты ж нам спагадаў!
А цяпер пакідаеш!
Чы ж ты жаласці не маеш?
Ах, загаднік наш!
Хто ж [у] нас цяпер парадак павядзець?
Хто ж нас цяпер перасцеражэць?
Ах, бедныя ж нашы галоўкі, бедныя,
Ах, гора ж нам, гора!

2. І куды, мой родны татка, адлітаісся,
І каму ж ты мяне, бедную, кідаеш?
На якое ж ты вялікае горачка.

3. Куды ты, мой татачка-салавеечка, адлятаеш?
На каго мяне, сірацінку, пакідаеш?
К каму схілю я сваю адзінокую,
Бедную, сірацелаю галовухну?
Хто пажалеець, абласкаець
Няшчасную сіротухну прагоркую?
Не бачыць цябе болі, мой ты татачка,
Прыйдзецца гаравацць, як тэй пташачцы,
Кідацца па свету беламу,
Шукаць шчасця, долі абыдзеныя.
Закаціліся яны зоркі ясныя,
Ля мяне сіраты няшчасныя.
Вярніся, вярніся, мілы татачка!
Пажалей мяне, бедную сірацінaчку,
'Лянь на мяне, бяздольную,
Як я слязамі абліваюся,
На судзьбіну сваю наракаючы.

Еслі адзін бог змілуецца,
Пакажыць, куды сірацінкі прытуліцца.

4. Татачка мой любенькі,
Татачка мой дарагенечкі,
А каму ж ты мяне кінуў такую сіротачку адну?
А к каму ж я цяпер сваю галовачку прыхіну, мой
татачка?

А што ж мне цяпер дзелаць без цябе,
Куды ж мне цяпер адной,
А куды ж мне цяпер кідацца?
Мне ж ніхто нічогенька не памагаець.
А каго ж ні пайду прасіць,
Дак усе выганяць мяне з хатачкі.
Татачка мой любенькі,
Татачка мой родненькі,
А вазьмі ж ты мяне скарэй і з сабою.
А божа ж мой божачка,
А што ж мне цяпер дзелаць без цябе?..

5. А татулічка ты мой міленькі!
Куды ж ета ты ад'язджаеш,
А з кім жа ты нас пакідаеш?
А татачка, а сізенькі, а міленькі!
Дай я табе хоць у ручку пацалую.
А татулічка мой родненькі,
На што ты нас пакідаў,
А чаму ж ты парадку нам не даў?
Лучша б ты з сабою нас узяў,
Чым гаравадь нас пакідаў.

6. А мой жа ты татулечка!
Да куды ж ты сабраўся іці?
А мой жа ты татулечка!
Цяпер жа за нас, сірот, некаму і заступіцца,
Цяпер жа нас усякі будзець торгаць і смяяцца.
А ты за нас і слоўца нікому не зюкаеш,
А мой жа ты татулечка!
Цяпер жа ніхто не прыгалубіць,
не прыласкаіць так,
Як ты, наш татулечка!
Цяпер жа мы вечныя сіроты, горкія сіроты...

7. А мой татка, мой родны,
А з кім нас пакідаеш,
А нас адных траіх,
А нікога няма.
А ты йдзеш, татка, да мамы,
Забяры нас, татка, туды.
А дзе мы дзенемся,
А куды мы пойдзем,
А хто нас прыюціць?
А мой татачка,
А мой родненькі,
А паглядзі ты на нас,
А мы ўсе маленькія.
А хто нас будзе глядзець,
А на каго пакідаеш?
А пайдзі, татка, скажы дзядзьку,
А можа ён нас дзе прыюціць?
А мой татка,
А мая ж мамачка,
А ты, мамка, паслухай,
А можа ты ўчуеш мой голас,
А можа ты забярэш нас туды ўсіх,
А мая мамка...

8. Куды ж ты, мой татачка, выражаешся,
Адкуль жа мне цябе ажыдаць?
А ты ж паедзеш у доўгую дарожаньку,
Заработкаў мне тваіх не відзець,
Мне і карысці із ніх не імець.
А цяпер жа, татачка, як жа мне з табой
расставацца?
Адкуль жа мне цябе дажыдацца?
А мне ж без цябе, мой татачка, дужа ж
будзець тошна,
Дужа ж маркотненька будзець.
А ты ж сваіх дзетачак кідаеш,
А хто ж іх будзець гадаваць?
А ў іх жа роднага татачкі няма ж,
А ў іх дужа ж многа цяпер будзець бацек,
Дужа многа загаднікаў,
А некаму ж будзець іх пажалець,
Можаць жа, яны будуць пад угольчыкам начаваць,
Можаць жа, яны будуць і абарваныя і абшарпаныя.

А некаму ж іх будзець пажалеці,
А некаму жа [за] іх будзець слаўцо закінуць
А дужа ж яны будуць гаротненькія.

9. А татачка мой родненькі,
А што ж ты надумаўся?
Зарання ў зямельку ідзеш,
Пакідаеш жа ты нас дробненькіх.
А з кім жа мы будзем жыці?
А хто ж нас будзіць учыці?
Мамачка наша слабенькая,
Яна ж нас не зможыць гадуваці,
Добрай пуці ўказаці.
Устань, наш татачка, устань.
Раскажы ж ты нам,
Як нам аставаціся,
У каго добрага слоўца пытаціся.
А будуць людцы смяяціся,
Што мы сіроткамі астаўшыся.

10. А мой жа ты баценьку,
А мой жа ты родненькі,
А мой жа ты лябедзіку,
А мой жа ты салавейку,
А мой жа ты кроліку,
А як жа ты нас пакідаеш,
Каму ты нас астаўляеш?
А хто жа нас пакарае,
Ад непрыязні заслоніць,
Ад напасці абароніць?

11. Ой, муй татанько,
Муй галубчычок,
Ой, як жа мы застанемся малыя,
Хто нас будзе гадаваці?
Хто ж нас будзе шкадаваці?
Ой, муй татанько,
Муй галубчычок...

12. Мой татулічка, мой ты родненькі!
Знаць угнявілі мы свайго татулічку.
Людзям жа будзець празнічак вясёлы,
А нам жа, сіруцінкам, слязлівы.

Мы ж горкія, мы ж бедныя!
Будуць людзі ў празнік на вуліцы сядзець,
А мы ж будзем свайго татулічку гукаць, гукаць,
Да нігдзе не дагукаемся.

13. Ах татачка міленькі!
Нашто мяне пакідаеш сіротку?
Як я буду жыць?
Да раскажы, татачка,
Да раскажы, міленькі мой,
Куды мне хіліцца?
Ці мне за вамі,
Ці сіротцы гараваць.

14. А мой татачка,
А мой міленькі,
А ты мене заставіў,
А я адна.
А як жа я буду жыць?
А я, божачка,
А я сіроткай асталася,
А хто ж мне будзя памагаць,
А хто мне будзя савет даваць,
А хто ж мне будзя радзіць?
Ой, татачка,
Ой, міленькі,
А ў мяне німа нікога,
А ні браціткаў,
А ні сястронкаў,
А што ж я рабіць буду?
Мой ты татачка,
А мой міленькі,
А нашто ж ты мяне аставіў,
А што ж мне рабіць?..

15. Татачка мой, кармільчык,
Міласлівы, жаласлівы!
Хто ж мяне цяпер сужалеець?
Я ж на цябе надзеялася-тка!
Ты ж мяне вырасціш
І да ўма да розуму давядзеш,
Ты ж мяне надзеліш
І ў людзі аддасі.

16. Татулічка мойродненькі,
Куды ж гэта ты прыбраўся,
У якую старonачку, у якую дарожаньку?
Парадні́чак ты мой мілы!
Парай ты мне парадуньку,
З кім мне цяпер парадзіцца
І ў каго праўдачку папытацца?
Як мне жыць цяпер на свеце без свайго татулічкі,
Без свайго параднічка?
Саколік мой ясненькі!
Лябедзька мой беленькі!
Адлятаеш ты далёка,
Век з табою не ўвідзіцца,
Сонца маё ненаглядлнае!
Я ж на цябе не наглядзелася
І ўсю праўданьку не дапытала.
А ні ў мяне мамунькі,
А ні ў мяне татунькі,
Ні ў мяне пітоманнай хатунькі.
Я ж яшчэ не ў розуме,
Я ж яшчэ недарослая і ні ў якім спосабе,
Галоўка мая бедная, сіротунька я вечная.
К каму цяпер прыхінуся,
К каму цяпер прыгарнуся!
Людзі будуць з дарогі татак сустракаць,
А я ж цябе не сустрэну і з табою не ўвіжуся.
Пасведняе наша з табой павіданійка,
Вечнае маё гараванійка.
Трэба мне па людзях хадзіць
І людскім таткам гадзіць,
У канцы стала настаяцца,
І ўсім пітунькі нападавацца!
Прагаманіла я з табой увесь дзянёчак,
А ты мне слоўцам не сказаўся,
Што ж ты стаў такі горды,
Што ж стаў ты такі пышны,
Што ты мне і слоўца не прамовіш,
Ці ты ж на мяне ўсердзіўся?
Віцца, я цябе даглядала
І пітунькі падавала,
І естунькі падпасіла,
І ў бога здаровійка табе прасіла.

Прасці, мой татулічка, прасці, мойродненькі!
Суседзькі мае родныя,
Суседзькі мае мілыя,
Зрубіце майму татулічку дамочак вясёленькі,
Каб ён быў раскошненькі,
Прасячыце ў ім ваконачка,
Каб ён адтуль мог глядзеці
На мяне, бедную сіраціначку.
Паследняе наша павіданнейка,
Паследняе наша цалаваннейка!

17. А мой жа ты татулечка,
Вазьмі ж ты мяне к сабе,
А мне ж тутыцька худзенька
Дужа ж я няшчасная, бедная.
Божа ж мой, божа!
За што ты на мяне разгневаўся?
А мой жа ты татулечка,
Скажы ж ты сваім сынулечкам,
Каб мяне яны не астаўлялі.
А я ж цяпер дужа бедная, няшчасная,
Выраклась ад мяне ўся радзіна,
А мой жа ты татулечка,
Вазьмі ж ты мяне к сабе,
А я тут не хачу жыць.

18. Радзімы бацюшка жаланны, што ж ты мяне, горкую, бросіў бездачорную?

На каго ж ты мяне спакінуў?

Асталась я, горкая, няшчасная, круглая сірата!

Заставіў ты мяне, бацюшка, кукушкай кукаваць, горкай пташкай гаразаць...

Не з кім мне, бацюшка, словічка сказаць, негдзе мне, горкай, няшчаснай, глазачкі прастудзіць. Не з кім мне падумаць, не з кім мне пасаветавацца. А ты, бацюшка, быў мне прыдумшчык, быў са мной саветчык. Када я не пайду з якім горушкам, ты са мной падумаеш, ты са мной пасаветуеш. Аддумаў, радзімы мой бацюшка, адсаветаваў! Прашчай, мой родны бацюшка, прашчай, жаланны! Ускрой свае ясныя вочушкі, прамолві, бацюшка, хоць адно словічка! Клічу я цябе, бацюшка, родны, клічу, не даклічуся!

Нічаво ты, бацюшка, родны, на гэты славечушкі мне не адмолвіў!

Пакланісь ты, мой родны бацюшка, маёй роднай матушке, раскажы ты роднай матушке, как я, горкая, няшчасная, без цябе горушка мычу з малалетнымі з дзеткамі.

19. Радзімы бацюшка, што жа вы, родны бацюшка, уздумалі? Какою вы дарожкаю сабраліся? І вы мяне, радзіцелі, бросілі такую горкую — не дарасцілі вы мне маіх малалетніх?

І вы мяне, горкую і няшчасную, вы б мяне палажылі б к сабе пад праваe крылушка... І как вы, маі радзіцелі, очынь скора паспяшылі і аставілі мяне горкую, няшчасную! Я, матушка, гасударыня, не магу без вас сваіх малалетніх вазрасціць—і находзімся мы, радзіцелі, і галодныя і халодныя!

Вы, мае радзіцелі, маліце госпада бога аба мне, аб горкай, і палажылі б маіх малалетніх вы к сабе пад правае крылушка, і не дайце вы ім па чужым углушкам шатацца!..

20. Радзімая матушка, памагі нашаму горушку! Умёр жа наш бацюшка не сваею смертушкаю. Ніхто ж, наш бацюшка, не відаў тваей канчынушкі! Не было ж пры табе, наш бацюшка, ні ядзінай радзінкі, нікаму нічаго ты не прыказаў, не расказаў сваей пасledняй волюшкі ні жане, ні дзетушкам!

Не ўнімайце, мае саседушкі!

Как мне не плакаць, не гараваць?! Ляжыць мой бацюшка на чужом на полюшке, ляжыць слоўна как калчыжанька,— не даждзёмся мы таго часа-ўрэмяні, як пазволюць радзімага бацюшку прынесці ў нову горынку, палажыць на сваю лавачку, пасматрэць напаследачку на сваяго радзімага бацюшку. Как нам жыць без цябе? Скажы нам, роднянькі! Как без цябе маленькі брацец будзе вясці бальшое тваё хазяйства.

Не пажыў, не пакрасаваўся мой мілы бацюшка ў сваёй новай горніцы, не палюбаваўся сваімі трудамі няўстаннымі!..

21. А татулічка наш родненькі,
З кім жа ты нас пакідаеш?
А хто ж нас будзець карміць-паіць,
А хто ж нас расціць будзець?
Усякі на нас будзець тукаць ды люкаць.
Бацькіны ды маткіны дзеці віну здзелаюць,
А мы, сіроты, за іх атвячаць будзем!

Татулечка ты наш родненькі,
Чымся нас пакідаць,
Лучшы б ты нас пахаваў!..
Не хацеў ты, наш татулічка,
З намі ў раскошнай хаце жыць —
Абабраў ты сабе хатку новую,
Невялікую і невясёлую!

22. Ой, татачко,
А як устрэціш мамачку,
А раскажы ёй усё па-дробнаму,
А як ты нас глядзеў,
А як ты з нас здзяваўся,
А мы не хацелі, каб ты жаніўся,
А ты казаў: «Чаго ты баішся?
А будзе табе лягчэй».
Адно ж не было палёгкі,
А ўстае сам у два часа,
Накрывае жонку, каб спала далей,
А мяне падымае, каб у печы паліла.
А я падумаю —
Мае равеснікі пры мамачках,
А яны спяць доўгенько,
А мне трэба паднімацца...

23. Татулечка ты мой родненькі,
З кім ты мяне пакідаеш —
Ні пры розуму, ні пры ўсём добрым?
Хто ж мяне навучыць к чаму добраму,
Хто ж мяне даглядаць цяпер будзець?
А ты ж, бувала, ўсё прыказыіш:
— Слухайце мяне, людзьмі будзеця!
А цяпер я астанусь без цябе як пень той,—
З мяне людзі зругацца будуць,
Добраму ўчыць не будуць!
Чаму ж ты, мой татулічка,
Большы не пажыў,
Чаму ж ты мяне
Большы не падгадаваў,
Адзежынку б якую мне справіў
І к толку б мяне прыстроіў?!
Я ж цяпер нахаджуся босая і голая.
Прыдзіць святцо якое —

У людзей і тое і сёе ёсь,
А я галюсенькая!
Людзі будуць весяліцца з родненькімі,
А я буду адна-адзінёханька!
Татулічка мой родненькі,
А я ж цябе больш не ўвіджу,
А я ж цябе больш не ўстрэчу,
Галасочка твайго не пачую!
А куды ж ты ад мяне сабраўся?
А ніхто ж там табе не пракукуець,
Толькі шэрая зязюлька ў барочку,
А ніхто ж там табе не прашчабечыць,
Толькі адзін салавейка ў кусточку!..

24. Мой татачка, мой залаценькі,
Як жа нам без цябе зімачку перазімаваці?
У нас жа дроўцаў ні паленца,
Наша печачка халодная.
А мы ж цябе будзем ждаць,
У кожнае аконца будзем паглядаць,
Ці ідзець наш татачка
Нам памагаць, нас навучаць,
Каб не была ў нас долечка гаротная,
Каб не была долечка ліхая?
Мой татачка, папрасі сваіх брацiткаў,
Сваіх брацiткаў, сваю сястрыцу,
Каб яны нам, круглым сіротам, памагалі,
Каб мы горкай долі не зналі.
Як прыйдзе вясёнка,
Мы пойдзем на тваю магілачку,
Каб ты, наш татачка, устаў
І нам парадачку даў.

25. А мой ты татулечка,
З кім ты нас пакідаеш?
А мы ж дробныя, неразумныя,
А наша хатачка разваліцца,
А хто без цябе будзець аб нас клапатаць.

26. А мой татуленька... хто нас паіць-карміць будзець? Да кароўкі мычаць, да авечкі блеюць, чаму не накорміш, чаму не напоіш?

27. А мой жа ты татулічка,
А мой жа ты зязюлічка?
А каму ж ты нас пакінуў?
А хто ж нас будзіць адзяваці?
Хто ж нас будзіць карміці?
Каму ж ты пакінуў сваю сошыньку?
А каму ж пакінуў сваю ніваньку?..
Зарасцець ніванька быльнічкам,
Згніёць сошынька пад бярозачкай.

28. А мой жа ты татачка,
Мой жа ты родненькі,
А куды ж цяпер я прыду,
Куды галовачку сваю прыхіну?
А ты ж, бывала, прыедзеш, мне гнаёчак вывезеш,
І мне ўсё пасобіш.
А хто ж цяпер мне будзіць памагаць?
А ты ж мне і вяровачкі саўеш, і лапцікі спляцеш,
А мой родненькі, мой сівенькі,
А мой татачка дарагі,
А мой ты мілы,
А ты ж не хацеў мяне
За гэтага хлопца аддаць.
А і праўда ж ён п'яніца,
Маю жызню пагубіў...

29. А татанька мой,
А кармілец мой!
Што ж ты не ўстаеш,
Нічога не гаворыш,
На работаньку нікога
Не пасылаеш?
Знаць жа ты, мой татанька,
Кармілец мой —
Краснае сонца,
Знаць жа ты ўсё паробіў,
Усё падзелаў,
І не нада ж табе нічога:
Ні работы, ні заботы,
І ні есць, ні піць,
Не просіш ты нічога.

30. А мой ты татачка,
Ты ж гадаваў мяне з торбачкі,
Ты ж гадаваў мяне з крошачкі,
А ты ж нада мной ночкі не спаў,
Ты ж мяне маленькую калыхаў.
А можа ж ты маліўся,
А можа ж ты прасіўся,
А я ж цябе не дагледзела,
Я ж табе нічога не памагла,
Я ж табе піцькі не падала.
Ты ж мяне маладзенькую выгадаваў,
Я ж цябе старэнькага не дагледзела.
Я ж не знаю сваёй мамачкі,
Я ж не знаю яе жаласці.
Ты не раз прасіў чужых мамачак,
Чужых бабачак, чужых суседачак,
Каб мяне глядзелі.
А ты ж мяне жалеў,
Каб я не была голая,
Каб не была босая,
Каб не была галодная.
Як жа табе цяжанька было
Мяне маленькую гадаваць.
А мы ж ужо цешыліся,
Мы ж ужо сваю хатку паставілі.
Яна ж была нам вясёлая, цёплая,
А цяпер некаму ў ёй жыць.
Што ж я буду рабіць у ёй без цябе?
Як жа я буду жыць без цябе?
Яна ж на полі ў нас стаіць.
Я ж ніколі не думала,
Што будзе такая бедачка,
Што не будзе майго татачкі.
Прасці мяне, татка, што не дагледзела.
Мае дзяўчатачкі, як вам добра:
У вас ёсць татачкі,
А я бедная, няшчасная, бязродная,
У мяне нікога нет.
А мой татачка, мы ж стараліся,
Каб паставіць хатачку.
Я ж служыла, людцам гадзіла,
Я ж думала, каб жыць.
А цяпер у ёй некаму жыць.

А мае цётачкі, дайце мне парадачку,
Як жа мне жыць без свайго татачкі?
А дзякуй вам, цётачкі,
А дзякуй вам, дзядзечкі,
Што памагаеце
Хаваць мне татачку,
Што ка мне прыхінуліся.
Што б я адна рабіла?

31. А мой мілюсенькі, а мой раднюсенькі!
А нашто ты нас пакінуў,
А цябе, як ты сам казаў, татка да мамка
маленькага кінулі.
Да табе было вельмі трудненька на свеці жыці,
Да не было каму цябе глядзеці,
Да цябе надта ўсе крыўдзілі,
Да трэба было для пана паншчыну адбыці,
Да ў дома ўсенка зрабіці,
Да галоднымі рокамі хлеба прыкупіці,—
Але трудна было скуль узяці,
Да трэба было на шыю сваю набраці,
Да прыдумаць, да прыгадаці,
Як потым грошы і квоту заплаціці,
Да зноў, ты казаў, як вырас, да ажаніўся,
Да зноў жыць пусціўся.
Матка, было, ідзе з сярпом, а ты да дня з касою,
Да ты казаў, што вельмі быў лядашты,
Акоман да за якое глупства
Зараз зачне галавіці, да ў морду біці.
Да ты быў не піўшы, не еўшы цэлы дзень.
Да прыдзеш дадому галодны, як сабака,
Да уж было табе не да яды,
Але хоць хутчэй дзе-кольвек галаву прывярнуці,
А назаўтра трэба было ўстаці
Да работу ў рукі ўзяці,
Да за сваёю гаспадаркаю трэба было глядзеці,
Да як табе бог даў дзеці,
То і не было каму глядзеці.
Да мы, як шчаняты, валіліся пад плотам.
Да балазей, што дзянёк пражывеш,
Да ты з мацер'ю з двара прыйдзеш
Ад акомана з крыўдзіны.
Да каб яму рукі пазалацелі,

Да па локаць адляцелі.
Ды мы былі яшчэ маленькія,
Да бульбы вам накапаем і зварым...

32. А мой ты татулечка, а мой ты родненькі!
А як ты нас пакідаеш, няшчасных і бедных сіротачак?
Як ты жыў, то ты за нас, бедных, заступаўся да за
нас занімаўся,
А хто цяпер за нас, бедных сіротачак, займецца
да заступіцца?
Ох! Да кажды нас цяпер абрэша да асмяе.
Да мы пры табе жадых ніколі недастаткаў не бачылі.
Бывала, як галодны год, ты ідзеш да пана хлеба прасіці,
А калі пан не дасць, то ты коніка альбо воліка прадасі
І жытка купіш, альбо ў жыда пажычыш.
А потым, бывала, аддасі яму грошы і квоту,
Да цяпер не будзе каму нас гадаваці да спагадаці.
Да вот прынеслі табе хату цёмную, без акон,
без дзвярэй зраблёну,
Нікуль паглядзець на сваіх дзетак маладзенькіх,
да табе дарагенькіх,
Да папрасі ты пана бога і маткі боскай,
Каб нас, бедных, гэтта тут хавалі, а ад ліхіх
людзей ахранялі
Да сваею ласкаю святою апекавалі,
Да папрасі ты суседзяў добрых людзей,
Каб нас не крыўдзілі
Да не глуміліся над намі, сіроткамі.
Да мой татулечка, да мой саколіку!
Устань да паглядзі, хто да цябе прыйшоў?
Твой брат раднюсенькі з дзядзінай.
Да наш дзядзька мілюсенькі! Да папрасі ты яго,
Каб ён намі апекаваўся да ўсюды заступаўся,
Да над намі спогаць меў.
Апошні разок прыйшоў ксёндз да цябе ў хату памаліцца
Ды цябе да цэркві святой давесці,
Да на вечнасць цябе аддаці.
А мой ты ксянджульку, а мой ты дабрадзею!
Памаліцеся за нашага татулечка, да за нашага
мілюсенькага.

33. А мой жа ты татачка, а мой жа ты родненькі!
Чаму ж ты хадзіў тут каравы і дыравы,
А ў далёкую дарожаньку так хорашанька прыбраўся?

34. А мой жа ты татачка, а мой жа ты родненькі!
Як жа там будзеш хадзіць: ці каравы, ці дзіравы,
Ці такую адзежыньку будзеш насіць, як тут насіў?
А тут жа ты не хацеў абы якой надзець.
А мой жа ты татачка, а мой жа ты родненькі,
Куды ж ты ідзеш, якой дарожачкай? У якую староначку?
А дзе ж мне цябе шукаць? З каторага боку мне цябе
гукаць?

35. Збудавалі табе, мой татачка, новую хатачку харошанькую,
Толькі цесненькую, нявідненькую да халодненькую,
А мой жа ты татачка, мой жа ты родненькі,
Мой жа ты галубок!
Збудавалі ж табе хатачку без сенечак, без аконачак —
А нікога табе відна не будзе, нікога бачыць не будзеш.

36. Татулечка наш родненькі!
Ці па 'быччу табе дамавіну састроілі,
Ці па натуры гэту хату іздзелалі?
*(Пайтараецца некалькі разоў.)*
Разгневаўся наш татулечка,
Разгневаўся наш родненькі!
Нічога з намі не гаворыш:
Хоць сколькі з табой ні гукай,
А ты нічога не 'твічаеш!
Даў спакой сабе:
Не просіш і не просішся,
І нічога не гаворыш з намі...

37. А мой татулечка,
А мой кукулечка,
А каму ж ты мяне пакінуў?
А хто ж нас маленькіх гадаваць будзе?
А табе ж цёмную хатачку зрубілі,
А дужа цёмную хатачку зрубілі.
А нада прасіць суседзечкаў,
А каб табе аконечка прарэзалі.
А выйду ж я на вулачку,
А ў мяне татулечкі не будзець.
А ўсе ж татулечку на вулачцы ўстрачаць будуць,
А ў нас жа татулечкі не будзець.
А ў нас жа толькі адна мамулечка.
А як жа яна нас выгадуе?

А наша сонейка закацілася,
А нам жа цёмная хмарачка найшла,
А каму ж ты нас пакінуў?

38. А мой татачка,
Чаго ж такую цёмную хатку збудавалі,
Акенца не вырубалі?
А цвёрдзенькая,
А хто ж пасцеліць, каб мякенька была?
А будзем чакаці, праз акенца выглядаці,
Адкуль, татка, прыйдзеш?

39. Татулечка мой родненькі!
Нашто ты нас пакідаеш?
Як нам цяпер пражыць?
Як нам цяпер прабыць?
Як нам цябе забываць будзе?
Адкуль нам цяпер дажыдаці,
Із якога ваконца цябе выглядаць?
Пакідаеш нас, татулечка,
Адлятаеш, галубчык-палесачка!
Ты ж наш госцічак, наш міленькі:
Нямнога табе ў нас гасцяваць,—
Навучы, татулечка, як цябе забываці!..
Татулечка мой родненькі!
Нашто ты плотнічкаў наняў?
Сабраў ты работнічкаў,—
Дзяліцца ты хочаш, татулечка!
Чым мы табе не ўнаравілі,—
Чаго ты пакідаць нас хочаш?

40. Ты ўставай, радзімы бацюшка, цябе не та да пара, урэмячко цябе спаць да высыпаціся, нікагда не прабуждаціся. Цябе пара ўставаць да прабуждаціся...

41. Мой жа ты татулечка, да прыдзі к нам хоць раз у госці, да калі ж мы цябе ўвідзім, да хоць сасніся нам.

42. А татачка ж мой родненькі,
А з кім жа ты мяне пакідаеш?
А я ж малая і неразумная,
А я ж вечная сіротачка,
А мяне ўсякі натурхаець,

А мяне ўсякі напіхаець,
Валасочкаў маіх нарвецца,
Лічанька майго наб'ецца.
А я ж многа нап'юся,
А я ж многа наемся,
А я ж рубашачак многа насіць буду,
А я маленька, неразумненькая,
А хто ж мяне будзець кукобіць?
А цяпер жа ўсе казявачкі выпаўзаюць,
Усе мурашачкі вылятаюць,
А мой татулечка не будзець
Ка мне ні з кім выходзіць.
Зязюлечкі кукаваць будуць,
Салавеечкі шчабятаць будуць —
А мой татулечка не каня будзіць.
Зрубілі ж табе сяцёлачку цёмную,
Цёмную без вакошачка.
А не цямненька ж табе будзець?
А не бедненька табе будзець?
Адкуль цябе тут паглядаці:
А з каторыя староначкі,
А з каторыя дарожачкі?
А ці зорачкай ускоцішся?
А ці месяцам ка мне ўзойдзеш?
Адлятаеш ад мяне, татачка,
Як пташачка ад дробных дзетачак.

43. Татулічка мой, галубчык мойродненькі!
Татулічка мой родненькі і любенькі!
Сабраўся ж ты, мой татулічка, ў вялікую дарогу,
А каму ж ты, мой татулічка, сваіх дзетачак
пакідаеш?
Ручачкі мае любыя і мілыя,
Ручачкі мае дарагія, ручачкі мае залатыя!
А нараболіся ж вы, ручачкі!
Ножачкі мае дарагія!
А нахадзіліся ж гэтыя ножачкі ўсюдых.
Ад'язджаеш ты ад нас,
А цяпер жа мы з табою не ўвідзімся ні разу,
А прыляці ж ты к нам хоць птушачкаю,
Каму ж ты мяне, татачка, пакідаеш?
А цяпер я горкая і няшчасная сіраціна,
А некуды ж мне сваёй галовачкі прыхінуці.

Куды ні пайду, ўсюдых чужыя людзі будуць,
Мой жа ты татачка, вазьмі ж ты мяне з сабою.

44. Папачка мой родненькі,
А куды ж ты выпраўляешся!
У даўгую дарожачку!
Калі ж ты ка мне прыйдзеш у госцікі,
Адкуль жа мне цябе дажыдаці?
Папачка мой родненькі,
Чаго ж твае ручачкі сашчапіліся,
Чаго ж твае вочачкі закрыліся!
Чаго ж ты гэтак загардзіўся,
Што ты са мной не гаворыш!
Мой папачка родненькі,
Мой папачка міленькі!
Як жа мне цябе забыць!
А паследнія мінутачкі,
А паследнія гадзіначкі,—
Я ж цябе ўжо больш век не ўвіджу!

45. Татачка родненькі,
Калі я цябе прыжду,
А калі ты к нам прыйдзёш,
А ў яку суботачку,
Ці ў яку нядзелечку,
А з якога боку ждаць,
А ў яку гадзіначку?
Ці ты птушкаю прыляціш,
Ці ты і зязюляю?
Да ўжо мошкі ўсталі,
Да птушачкі прыляцелі,
А цябе няма.
А з якога боку ждаці?

46. А мой жа ты татачка, а мой жа ты зязюлёк,
А мой жа ты галубок, а мой жа родненькі!
Нашто ж ты нас пакідаеш?
А нас жа тут будуць біць, ніхто не пажалее,
Усе птушачкі ў вырай паляцелі,
І ты ўслед за імі..

47. А мой жа ты татачка, а мой жа ты зязюлёк,
А мой жа ты галубок, а мой жа ты родненькі!

Усе птушачкі із выр'я ляцяць,
А ты, мой татачка, у вырай ляціш.
Як усе птушачкі будуць із выр'я ляцець,
Я буду пілнаваць,
З каторай стараны мой татачка будзе ісці.
Усе птушачкі пераляцелі,— я глядзела...
Майго татачкі нігдзе не відна.
А мой жа ты татачка, мой жа родненькі!
А мой жа ты галубок, а мой жа ты зязюлёк,
А мой ты кукулёк!
А к каму я тут прыхінуся?
Нашто ж ты нас тут пакідаеш?
Чаму ты нас з сабой не забіраеш?
Нас ты гадаваў, гадаваў да і пакінуў.

48. А што ж ты нас, татка, пакінуў,
Татка наш кармілец,
Пакінуў ты нас на гора маленькіх,
А чужыя ж таткі не жаласлівы.
Мы ж як пойдзем, татка, на работу,
Мы ж усюдых, татка,
Будзем цябе сачыць і прыглядаць:
Ці не ўзнаем цябе, татка,
Ці на пахотке, ці на работке?
А нашто ж ты пакінуў нас,
Дробненькіх і маленькіх?
Мы ж цяпер, татка,
Усім будзем мяшаць,
Мы ж цяпер, татка,
Будзем многа месцічка занімаць,
А ў цябе ж, татка,
Мы былі не значны і не відны.
Усі ж над намі, татка, надзругуюцца.
А мы ж будзем цяпер, татка,
Ліха есь, ліха піць!
А татка, наш кармілец!
А настанець летца цёплае:
Пташачкі запаюць,
Зязюлічкі закукуюць.
А мы ж цябе, татка,
Усюдых будзем сачыць:
Ці пад белай бярозай,
Ці пад крутым берагам.

А татка ты наш, кармілец,
Салавейка ты наш!

49. А мой ты папашка,
А мой ты любенькі,
А дзе ж цябе ўбілі,
А дзе ж схаранілі?
Я ж цябе не бачыла,
Дзе ж цябе пахавалі.
А мой ты папашка,
А дзе ж цябе шукаці?
Я ж цябе не бачыла,
А мой даражэнькі,
А як цяпер мне жыці,
Дзе ты цяпер мой любенькі?
А хто ж мяне будзе
А цяпер вучыці?
А як жа анной мне
А век увесь жыці?
А божа ж мой, божа,
А што ж ты нарабіў?

50. Мой татка, мойродненькі,
К каму ж мне цяпер хадзіць?
А дарожка мая цяпер доўгая,
Лесам іду — татку гукаю,
Нідзе ж яго не дагукаюся.
Татка мой родненькі,
Мая ж цяпер дарожка зарасце ельнічкам,
Ніколі я [к] табе не дайду.
Мой татка родненькі!
Свяцце прыйдзе, а я буду глядзець,
Адкуль мой татка будзе іці ка мне ў госці?
Зязюлька закукуе, а я слухаю, ўсё думаю,
Што мой татка ка мне ідзе.
Салавейкі зашчабечуць, і я ўсё прыслухаю і думаю,
Што мой татка родненькі ка мне ідзе.
Выйду я на вуліцу, ўсе мужчыны ходзяць,
А майго таткі няма.
Ніхто не запытаецца,
Як ты, мая дачушка, жывеш тут?

51. А мой ты татачка,
А мой ты родны,
Чаго ж ты нас аставіў сіроткамі?
Усе ж бацьку маюць,
Усе радзяцца,
Усе папытаюцца.
А мы ж каго папытаем?
Каго мы ўвідзім,
Хто ж нам парадзе?
Хто ж нам паможа?
Нас усе абіжаць будуць...
А мой ты татачка,
А мой ты родны,
Чаму ж нас асіраціў?..
Дзе мы будзем ісці,
Усё будзем успамінаці
Гэтыя дарожкі,
Гэтыя сцежачкі.
Яны пазарасталі,
Пясочкам пазасыпаліся.
А я ж буду хадзіці
Па гэтых сцежачках,
Па гэтых дарожках
І буду ўспамінаці свайго татачку.
Можа, ён да нас прыйдзе,
Можа, ён нам паможа,
Можа, ён нам парадзе,
Як нам жыці?
Мы асталіся сіроткі —
Ні таты, ні мамы,
Нікога не маем.

52. На каго ж ты, мой татанька, мяне пакідаеш,
Да на каго астаўляеш?
Да дзе ж мне свае маладыя гады пражываці?
Да ўсе дзяўчаты будуць з мацерамі
і бацькамі,
Да ўсе весяліцца,
А я буду слёзкамі абліваццa.
Да скуль я цябе буду ажыдаці,
З якое стараны выглядаці?
Да скінься, мой татанька, салавейкам,
Да прыляці раненька,

Што я буду салавейка пытаці
І цябе спамінаці.
Мой татанька, мой родненькі,
Я думала, што ты ідзеш
У калхоз на работу,
А ты калхозны двор мінаеш
Ды ў вялікую невясёлу дарожаньку
Паварачаеш.
А можа ты, татанька,
З кім пасварыўся, на каго абідзеўся,
А нам не саэнаўся,
Шчо ўсё табе спрацівілае.
Да ты нас пакінуў і не вернесся.
Да прысніся, татанька,
Да раскажы нам,
Як там цябе страчалі.
Чы ты там да каго прыкінуўся,
Чы прыхіліўся?
Да можа, ты там найшоў
Бліжнейшу радзіначьку за нас.
Ох, мне здаецца,
Шчо мы цябе тут не абіжалі,
Не даглядалі,
І чым мы табе не ўгадзілі,
Шчо ты ад нас адлятаеш
І нас пакідаеш.

53. Дарагі татачка, як жа хораша прыбраўся,
Куды, татачка, сабраўся?
Ты адзін, татка, паедзеш ці пойдзеш,
І нікога з сабою не возьмеш?
Ты, татачка, ніколі так не рабіў
І нікуды адзін не хадзіў.
Заўсёды з мамай саветаваўся
І нам даваў знаць.
А сягоння ляжыш, сівы галубочак,
І не даеш савета ні мамке — сваёй галубке,
ні нам.
Мамка-галубка сядзіць каля свайго галубка
І кліча цябе.
А ты такім глыбокім сном заснуў
І не адказваеш ёй.
Чым жа яна цябе так угнявіла?

Вы ж з ёй, што голуб з галубкай, варкавалі
І праваркавалі 60 год умесце.
Мамка просіць мяне, каб я цябе разбудзіла.
Я, татачка мой старэнькі,
Галубок мой сівенькі,
Размаўляю з табой, і ты мне не адказваеш.
На каго ж ты пакідаеш сваю сівую галубку,
Такую старэнькую, такую слабенькую.
Я ж, мой сівенькі галубочак, разгубілася,
Не ведаю, з чаго пачаць,
Як з табой размаўляць.
Як прыйду я — заўсёды расказвала, як прыехала.
Ты заўсёды пытаўся, як прыехалі, чым.
А сягоння, сівы галубочак татачка,
Маўчыш і нікому нічога не адказваеш.
Цябе ўжо нічога не цікавіць.
Ты, мабыць, пакрыўдзіўся на мяне і мамку,
То скажы, за што.
Прашу ў цябе, прасці нам,
Калі не так што сказала ці зрабіла.
Дарагі татачка, мілы мой,
Раскажы нам, як далей жыць, што рабіць.
Дарагі татачка, я заву цябе,
І браточкі мае — твае сыночкі размаўляюць
з табой.
А ты ім нічога не адказваеш нікому.
Ты ж нас, татачка, гадаваў.
Дзякуем за ўсё, што нас даглядаў.
Дарагі татачка, і ўнукі стаяць ля цябе,
Ты з імі нічога не размаўляеш.
Як жа нам цяжка праводзіць цябе ў далёкую дарогу!
Як пращчацца з табой!
Я хадзіла, дарагі татачка,
І прасіла дзядзькі Пятра,
Каб ён у тваёй хатцы акенца зрабіў,
А ён не паслухаў.
І зрабілі такую хатку —
Без акенца і дзвярэй.
Табе будзе цёмна, а ты любіў сонейка.
А цяпер яно на цябе не будзе свяціць,
Мой залаты татачка.
Дарагія мае браточкі, сыночкі і дачушкі —
Татавы ўнучкі,

Завіце ж вы яго, гукайце,
Можа, ён вам адзавецца?
Паследнія нашы мінуткі з табой,
Твае плямяннікі цябе забіраць ідуць
І ў хатку тваю класці.
Мае дарагія суседзі,
Памаленьку яго ж бярыце
Ды паціхеньку кладзіце.
Ён жа наш слабенькі, старэнькі татачка.
Паціхеньку яго нясіце.
Татачка наш дарагі,
Парай, як нам быць, што рабіць.
Спасіба, татка дарагі, за ўсё,
І прасці нам, калі што не так.
Сонейка так хораша свеціць,
Цябе ў апошнюю дарогу праважае.
Павыходзілі і суседзі і суседкі прашчацца
з табой.
А ты такі стаў ганаровы,
Што нікому ні слова не адказваеш.
Дарагі татачка, якая глыбокая магіла твая,
Якая страшная,
А табе нічога не страшна,
І не просіш нас нічога — ні папіць, ні есці.
Дарагі татачка, забіваюць тваю хатку,
а ты не чуеш.
То ж заўсёды, калі стукнем у вакно,
ідзеш адчыняць.
А цяпер і не просіш, штоб не забівалі наглуха.
А мае дарагія суседзі,
Ціхенька яго хатку апускайце
І ціхенька сыпце пясочак.
Татачка мой дарагі,
Паследняе тваё праважанне,
Паследняе з табой прашчанне.
Дзякуй, дарагі татачка, за ўсё,
Будзем глядзець галубку тваю — нашу мамку.
Спі спакойна, наш дарагі татачка.
Дарагія мае людцы, дзякуй, што нам памаглі
І нашага татку з намі праважалі.
Я, дарагі мой татка, падзякавала ўсім.
Ты ж нас вучыў дзякаваць за ўслугі людзям.
Прашчай, наш татачка,

Ты адзін тут астаешся, а мы пайдзём.
Дзякуй, мой дарагі, за ўсё і да спадання.
Мамка мая дарагая, пойдзем мы з табой,
Ужо больша не ўбачым свайго дарагога татку.

54. Дарагі татачка,
За што раззлаваўся на мамку, прабач ты ёй.
Яна ж цябе шкадавала і глядзела.
Яна кажа, што выпраўляла на вайну цябе,
А зараз не ведае, як цябе праводзіць
У такую дальнюю дарогу, як прашчацца.
Як чакаць цябе?
Калі прыедзеш, яна просіць, пастукай у акенца
Ці паспявай салаўём у садзе,
Яна паслухае тваю песню.
Дарагі татачка, прыехалі ўжо ўсе чатыры сыны
твае і я,
І ты нікому нічога не гаворыш.
Прасці нам, дарагі татачка,
Можа, мы не па-твойму калі зрабілі.
Мы, дарагі татачка, будзем глядзець маму,
Не дамо ў крыўду нікому.
Цябе просяць сыны, каб ты ім параіў што-небудзь,
Але ты маўчыш, наш сівенькі галубок, татачка.
Як цяжка, калі табе гаворыш-гаворыш, а ты маўчыш,
Дарагі татачка, дзякуй табе,
Што вы з мамай нас выгадавалі, у пуць-дарогу
выправілі.
Дзякуй за ўсё, мой дарагі.

55. А мой жа ты татанька, а мой жа ты родненькі!
Куды ж ты паедзеш? Каму ж ты нас кідаеш?
Каго ж мы будзем цёмнаю ночанькай пераймаць?
Каму ж я буду белыя ножанькі разуваць?
Каму ж я буду белую пасцелечку слаць?
Калі ж мы цябе дачакаемся?
Ці цёмненькай ночанькай, ці буйненькім ветрыкам?

56. Пайшоў мой татачка ў сваю хатачку,
у новенькую.
А хто ж цябе там разбудзе?
Хто ж табе анучачкі пасушыць?
Да хто табе іх падасць?
Хто ж табе пасцельку пасцеле?

57. Радзімы мой, кармілец, родны татулька!
Куды ўцякаеш ад нас, горкіх сірацінак!
Кідаеш нас сіротанькамі, малымі-маленечкімі!
Закацілася цяпер нашае яснае сонейка,
Што не грэець нас, горкіх сірацінак!
Веюць на нас ветры буйныя-сцюдзёныя:
Куды ветрачкі падуюць — туды мы пацягнемся.
Ні з каторай старонухны няма нам цёплага ветру,
Няма нам, горкім сіротухнам, крэпкіх заступнікаў,
Апусцела наша цёплая хатанька!

58. А мой татачка,
А каб я знала,
Што ты гэтак скоранька
Ад нас уцячэш?
А хто ж мне будзіць памагаць,
А хто ж мне будзіць ра́дзіць?
Ты ж усё памагаў,
Да ты мне ра́дзіў,
Да дзе што рабіць,
Да дзе што сеяць.
Хто ж мне цяпер будзіць ра́дзіць?
Хто ж мне будзіць па́магаць?
А мой татачка,
Хоць ты мне ўва сне парадзь,
Хоць ты мне праз сон раскажы.
А к каму ж я прыхінуся —
А ні ў мяне братоў,
А ні ў мяне сясцёр —
Адна ж я асталася.
Будзіць зязюлька кукаваці,
А я буду памагаці.
Да напроць вясёначкі
Мошачкі аджываюць,
Птушачкі прылятаюць,
А ты ад нас уцякаеш
У такую старонку,
У такую далёку.

59. Ой, татачку, татачку, чом вы нас пакінулі? А скуль вас цяпер выглядаці?! Не ступяць больш вашы ножанькі цераз парог, не будуць хадзіці па сцежачках! Не глянуць ужо

больш вашы вочы на жытачка ў полі! Чом, татачку, да нас не адазвецеся? На каго нас, сіротак, пакінулі?

60. Ох, татка, мой вінаградка,
Да ці ведаеш, што ў мяне да чужая ж да
сямейка.
А вы колісь мяне да не 'дпраўлялі вы ж
да туды замуж.
А хто ж мяне да любіў,
А хто ж мяне да хацеў.
Ой, дачдалась да такога да ўрэмячка,
Да што ж пайшла на чужых на дзетак,
А яны ж булі да маленькія,
А яны ж булі да чужненькія.
Да як я прыйшла да іх глядзець,
Да я ж іх прыгалубіла, прытуліла.
Да яны ж сягонні да мне родныя.
Да мне ж здаецца, што людзі кажуць,
Бяздзетныя, дак не жаласлівыя,
А я ж усё адно нікому да не веру,
Што ў мяне такія да чужыя,
Да й багата да я не баюсь.
А свае ж родныя да не такія,
А такія е, да непаслушныя.
А яны ж у мяне да чужыя,
Да яны ж мяне да й слухаюць.
Ох, татка ж мой, вінаградка,
Да я ж учары да прыходзіла
Да цябе ж вельмі ж да прасіла,
Да штоб вы мне адтуль да прыялі,
Штоб я ж пагадавала сваіх дзяцей-сіротак,
А я ж ужэ да прыжылася
Да к такому ж ужэ да цяжоламу да ўрэмячку,
Што ж я ж не здолею да рабіць да дзелаць.
А ў мяне ж 'шчэ ды дзеткі не ўгадаваныя,
А ў мяне ж дзеткі хочуць 'шчэ ж да вучыцца,
Да дарма што чужэнькія,
А яны ж у мяне да ў душы,
Да вельмі ж да родныя.

61. Ох, мой татачка,
Мой радненькі,
Мы ж табе торбачку шыхавалі.

Мы ж не зналі,
Што нам людзі
Таку весць прынясуць.
Увечары людзі вярнуліся,
А цябе нежывога прывезлі.
Ох, ты ж наш яварэ зялёны!
Хто ж цябе падсёк,
Хто ж цябе падрубаў,
У каго такая гостра сакера була,
Шчо магла цябе ссекці?
Татанька родны!
Як калхозны калекцыю ўзнаў,
(А ты ж быў перадавы рабочы),
То ўсе злякнуліся,
Усе здрыгануліся.
Калхоз для цябе і аркестру наняў,
Шчоб ты, татачка, знаў,
Як па табе ўсе плакалі.
Ох, наш татачка,
Ох, наш родненькі!
На каго ж ты нас пакінуў?
Спасіба нашым людзям,
Што памаглі нам
У гэту цяжкую мінутачку
Да не аставілі нас.

62. Татка, чаго ты загневаўся на нас?
Татка, адзыўніся.
Мы ж табе піцькі падавалі,
А ты на нас абідзеўся.
Ці мякка пасцелька твая,
Пухова падушка твая?
А мы ж па пер'ічку сабіралі,
А ўсё для нашага татачкі,
А цяпер ты загневаўся.
Мой татачка, мой даражэнькі,
Я ўсё сама буду рабіць,
Толькі ты не ідзі ад нас.
Мне ж цяжка з табой расстацца,
Навек сёння папрашчацца.
А як папрашчаюся.
Буду выхадзіць на вулічку і слухаць,
Ці ідзець мой татачка.

Мой татулька, мой мілюська,
Як пачую твой галасок,
Адчыню табе варотцы.
Тут усе табе вулачкі вядомыя,
Усе людцы знаёмыя.
Мой татачка, прыхадзі нам памагаць
Хоць добрым слоўцам,
Хоць маленькай парадачкай.
Прыхадзі к нам часценька
І днём і ночкай цёмнай,
Каб было цёпла ў нашай хатачцы,
Каб быў хлеб на нашым століку,
Каб мы бяды-гора не зналі,
Каб дружненька жылі.

63. Пераймай мяне, кармілец, родны татухна,
На шырокім сваім падвор'іцы,
Пераймі мяне, горкую сірацінухну,
Абхапі мяне за буйную галаваньку,
Прытулі мяне, сірацінухну, да грудзей сваіх!
Запытай мяне, сірацінухну,
Пра маё горкае горачка
Без цябе, кармільца-татухны!

64. А мой жа ты татачка, а мой жа ты родненькі!
Якая ж твая ямачка глыбокая!
А табе ж будзе тут цесненька і нявідненька.
Засыплюць жа цябе жоўценькім пясочкам...
А мой жа ты татачка, а мой жа ты родненькі!
А прыйду ж я дамоў, пагляджу я ў куточак,
Дзе мой татачка сядзеў,
Дзе ж ён дзеўся ад нас? А ён жа нас пакінуў!
Цяпер таткі ў нас нямашкі, а яго ж
не відненька там,
Мой братка, мой родненькі! Не забывайся на нас!
А мы цяпер бедныя сіроты засталіся!

65. Спасіба вам, мой татулечка,
За сваё прыкраснае гадаванійка,
Што ты мяне да сяго ўрэмя,
Да сіх пор гадаваў.
Спасіба табе, сырая зямелечка,
Што ты расхінешся і нас прымеш.

## ПА МАЦІ

66. Ах, мая ж ты зязюлечка!
Ах, мая ж ты матулечка!
Ах, чаму ж ты мяне пакідаеш?
Ах, каму ж ты мяне астаўляеш?
Хто ж цяпер мяне будзіць навучаці,
Хто ж цяпер мне будзіць спагадаці?
Ах, гора ж маё, гора,
Ах, я бяздомніца нешчаслíва!

67. Э, маманька мая родная,
Каму ж ты мяне пакінула,
Э, каму ж ты мяне аставіла?
А ты, мая маманька,
А ты, мая родная.
А радзіла ж ты мяне.
Худый доленькай надзяліла.

68. Радзімая мая мамачка,
Ды на каго ж ты мяне пакінула?
Ды на каго ж ты мяне аставіла, сірацінaчку?
Ды к каму я цяпер прыхілю сваю буйную галовачку?

69. А мая мамка, да нас пакідаеш, да нас маленькіх, да нас драбненькіх; хто ж абмываць, хто нас абшываць будзець? Да мы не ўмеем, да мы ж не знаем; да мы выйдзем на вулку каравыя да дзіравыя, да нас абсмяюць, да нас абгаворуць.

70. Матулічка ж наша родная,
Пакінула ж ты нас, пакінула дробных сіротак,
Каму ж ты нас прыказала?
Будзе нас цяпер усюдых поўна.
Цяпер жа у нас і бацяк і матак

Будзя ўсюдых многа!
Находзімся мы і голыя і босыя,
І галодныя і халодныя!
Як жа ж нам цяпер заставацца?
У каго ж рубашачкі нам прасіць?
Хто ж нас цяпер абшываць будзя?
Хто ж нас будзя абуваць?
Хто ж нас будзя даглядаць,
Матулічка ж наша родная?

71. Ой-ой-ой-ой, мая мамка,
Ой, мая ж ты даражэнька,
Ой, мая ж ты родненькая,
А што з табою гэта сталася,
А чаго ж твае ясныя вочкі закрыліся,
А чаго ж ты да нас не гаворыш,
А на каго ж ты нас пакінула.
Ой, устань, устань, паглядзі ты на нас,
На сваіх дзетак.
А хто ж нам будзе памагаці,
Хто нам будзе есці варыці,
Хто нас будзе дома сустракаці.
Устань, мамка родна, падыміся
Ды на белы свет падывіся.
Ой-ой-ой...

72. А матулічка мая родненькая!
Каму ты нас пакідаеш, дробных?
Чаму ты нас не падрасціла?
А мы цяпер набярэмся гора.
Усякі нас будзець біць і драць.
Чаму ты нам парадку не дала якога,
Нашая і радня паатрачэцца ад нас,
Усе дарожачкі і сцежачкі, ідзе ты хадзіла,
Я слёзкамі абаллю!

73. Матушка-карміліца, нашто ты нас, маленькіх, аставіла, на горушка парадзіла?! Нас жа то людзішкі натукаюцца, налюкаюцца, а мы ж то, несмыслёныя, не знаем нічога, каму нам сваю галовушку прыхінуць!.. Людзішкі будуць всегда к сваім матушкам беч, а нам-та не к каму: у нас ні матушкі, ні бацюшкі — нету нікога!..

74. Матулечка ж наша родная,
На каго ж ты нас пакінула,
Сіротачак бедных.
Цяпер мы будзем хадзіць
І босыя, і голыя,
Галодныя і халодныя.
Будзе цяпер у нас другая маці,
А цябе не будзе.
А з кім мы будзем саветавацца?
А хто будзе нас сустракаць?
А хто будзе ў дарожачку праважаць?
Закрыліся твае ясныя вочкі,
Больш ты не ўстанеш,
Не паможаш нам, не пасаветуеш.
А можа, мы цябе калі не паслухалі,
А можа, слова не тое сказалі —
Дык ты прабач нам усё,
Прашчай, прашчай, любая наша мамачка.

75. А матулька мая,
А зязюлька мая,
Нашто ж ты мяне кінула,
Бедную сіротачку?
А хто ж мяне будзе павучаці?
А я ж буду гараваці.
А к каму ж я прыхінуся,
Сваім горам пахвалюся,
Бедная сіротачка?
Мяне ж будуць піхаці,
З мяне ж будуць смяяцца.
Хто ж мяне будзе павучаці
І хто ж будзе зашчышчаці,
І работу памагаці?

76. Мамулічка мая родненькая,
А куды ж ты выражаешся?
А з кім жа мяне пакідаеш?
А я ж астаюся вечнаю сіратою,
З мяне ж цяпер усякі надругаецца,
А я ж буду, мамка, і каравая, і дзіравая,
Я ж буду і голая, і галодная,
А мне ж не к каму прыхінуцца,
У мяне ж няма і татулічкі, і мамулічкі.

З каторае ж мне староначкі пазіраць цябе,
Адкуль жа ты ўсходзіць будзеш ка мне,
Ці ты ж ка мне птушачкай узляціш?
Ці ты ж ка мне казявачкай успаўзеш?
А па чым жа цябе, мая мамка, узнаваць?
Ці мне ж цябе па паходунцы спазнаваць?
Ці мне ж цябе па гаворунцы спазнаваць?
А я ж буду, мая мамка, па вуліцы гуляць,
А я буду к чужым мамкам прызнавацца.
Мамулічка мая родненькая!
Прасі, мая мамка, госпада бога,
Бяры, мая мамка, мяне з сабою,
А мне ж тут дужа тошненька,
А я ж тут асталася, як шэрая зязюлька,
З мяне, мамка, усякі надругнецца.

77. А мая матулічка, шэрая зязюлічка!
Нашто нас пакінула горкіх сіротачак?
Выйдзем на вулачку,
А ўсе мамкі за ручкі дзетак водзяць,
А нашай матулічкі нідзе не відаць,
Адкуль цябе, матулічка, дажыдаць?
Ці з-пад цёмнага лесу паглядаць?
Куды нам, матулічка, пад цябе падходзіць?
Ці ў зялёны гаёчак, ці ў жоўты пясочак?
Паследняе наша пагуканне,
Паследняе наша расставанійка,
А болей нідзе не ўвідзімся мы:
Ні на вулачцы зялёненькай,
А ні ў кампаніі вясёленькай.

78. Мая ж ты мамачка,
Дзе ж ты будзеш сядзеці?
На каго я буду глядзеці?
А ці ты ў гаёчку?
А ці ты ў садочку?
А калі ў гаёчку —
Сядзь жа на пясочку.
Я на цябе буду глядзеці,
Я з табою буду сядзеці.

79. Мамка-зязюлька, мамка-кукушка!
Што ж ты нас пакінула

На гора маленькіх?
Чужыя ж маткі не жаласлівы і не міласцівы!
Мамка-зязюлька, мамка-карміліца!
Хто ж цяпер нас будзець
На работку снаражаць,
А хто ж цяпер будзець разбужаць?
Мамка-зязюлька, што ж нас не ўзрасціла,
Уму-разуму не давяла?
Мамка, мы ж яшчэ глупы,
Мы ж яшчэ дурны!
Чужыя ж маткі нас не будуць
Да разуму давадзіць, мамка!
А яшчэ большы будуць з толку збіваць, мамка!
Чужыя ж мамкі нас
Непрыятна на работу снаражаюць, мамка,
І з работы непрыятна дажыдаюць, мамка!

80. Мамачка мая родненькая!
Хто ж нас цяпер будзець работачку вучыць?
Хто ж мяне, мая мамачка, будзець на пуць
наварачываць?
А ўсе ж, мая мамачка, будуць дзетачкі ў грудачкі
сабірацца,
А мы, мая матачка, будзем слёзкамі абліваццa,
Усе ж дзетачкі сваіх мамачак устракаюць,
А мы сваёй мамачкі нійдзе не сустрэцім.
Агарчыла ж ты нас і аслязіла,
Горкія мы, мая мамачка, вечныя сіроты,
Не на́йдзем жа мы цяпер сваёй мамачкі нійдзе.
З кім жа ты нас цяпер, мая мамачка, пакінула,
А і дзе ж нам, бедным, цяпер дзецца.

81. А мамачка мая родная,
З кім жа ты мяне пакідаеш?
Я ж яшчэ саўсім малая.
Некаму мяне навучыці
І работкі ўказаці.
Як бы была мая мамачка,
Яна б мяне работкі навучыла.
Лі мяне б людзі не смяяліся,
Я б усё ўмела зрабіці.
Устань, мая мамачка, устань.
Скажы мне хацял адно слаvечка:

К каму мне галоўку прыхінуці,
У каго ласкава славечка пачуці.
А будзіць зязюлька кукуваці,
А я буду мамачку гукаці.
Зарання ж ты, матулька, галоўку схінула,
У зямельку сырую зарыюць.

82. Ой, (ды) мая мамачка, (д) мая мілая,
Ды нашто ж нас пакінула?
А як жа ж мы цяпер жыць будзем,
Як мы адны рабіць будзем?
Я за ўсіх старэйшая,
Мне за ўсіх цяжэй будзе.
Ой, мамачка родная.

83. А мая матуленька, а мая ягадка, а што ж ты мне зрабіла, што ж ты ўчыніла? А напроць зімушкі халоднай, сцюдзёнай да ўлятаюць усе пташачкі, да ўсе мурашачкі, а мамкі не будзець відаць і не будзець чуваць; а мы ж будзем пазнаваць не па галасочку, не па валасочку; да нігдзе не пазнаем, да нігдзе не увідзім, да нігдзе не пачуем.

84. А мая мамачка,
А мая родная,
Чаму ж мяне нарадзіла
Ў такую гадзінку,
Ў такую нешчаслівую,
Ў такую бяздольнаю?
Вясніца прыходзя,
Усе пташачкі,
Усе мурашачкі,
Усе ажываюць,
А я сваю мамачку
У зямельку кладу.
Калі ж я цябе дачакаю,
Калі ж я цябе ўвіджу?

85. А мая мамулечка,
Што ж ты гэта надумалася,
А куды ж ты ад нас паляціш?
А ў шчырыя барочкі,
А ў цёмныя лясочкі,

А ў жоўтыя пясочкі.
Мамулечка мая,
Даражэнькая ты мая,
Я ж цябе болей не ўвіджу.
Што ж ты ета надумалася,
З кім жа ты мяне пакінула,
Мамулечка мая, зязюлечка мая.
Што ж ты ушла ў лецечка?
А кукулечкі кукуюць,
А пташачкі вылётаюць,
А казявачкі выпоўзаюць,
Мамулечка мая,
Зязюлечка мая.

86. А мая мамачка, а мая зязюлечка!
А нашто ж ты мяне пакінула
Наўпроці цёплага лецічка?
Зязюлькі закукуюць, салавейкі запяюць —
Мае мамкі не чуць будзе.
Усе людзі выйдуць на вулку,
А мае мамкі не відаць будзе.
Я ж тут буду прыглядаці:
Ці не мамка мая ідзе
З якой-небудзь дарожачкі,
З якой-колек староначкі?
А ўсе людзі іці будуць і гаварыць,
А я буду прыслухацца і прыглядацца:
Ці не мамка мая ідзе за імі?
Ці не мамка мая ка мне ідзе?
Ці не яна навуча мяне?
Я нічога не ўмею, нічога не знаю,
Я шчэ невяліка, я ж малая, неразумелая,
А каля мяне чужына, нічому яна мяне не навуча,
А мне трэба ўсякага прасіць, усякаму гадзіць.
Мая ж ты матачка, якая ж ты гордая.
Ці вось я цябе прашу, а ніяк не ўпрасіць.
Чаму ты мне не адгукнешся,
Чаму ж ты не абзавешся?
Чаму ты не ўстаеш,
Чаму мне нічога не скажаш?
Мая матачка, нямножка ж табе гасціць —
Уж паследняе прашчаннейка.

87. А мамулечка наша,
А зязюлечка ты наша!
А каму ты нас пакідаеш?
Ты нас, маленькіх, глядзела,
Ты нас, маленькіх, даглядала.
Мы ў цябе гадаваліся
І нічога не зналі, не ведалі,
А ўсе мы былі харошанькія,
І здзелухі, і работніцы.
А цяпер усякаму мы будзем —
І вялікі, і гультайкі, і нязнайкі,
А чужая мамка нас не даглядзіць,
І нашага гора і работкі не будзець відзець,
Мы [ў] яе загнаны будзем.

88. Мамачка мая родная,
Жаласніца мая!
Хто ж мяне так пажалееuь,
Як ты, мая мамачка?
Не на свеце купіць можна,
І не на свеце нажыць можна,
І няма нігдзе той лавачкі,
Што купляюць радзімыя мамачкі.
Нікога на свеце няма мілей таго,
Як родная мамачка.
Каму я такую праўдачку скажу,
Як роднай мамачке?
К каму я цяпер пайду
І к каму прыхінуся?
Хто ж мяне сустракаць будзець?
Хто ж мяне правадзіць будзець?
І каму ж я вернае слаўцо скажу?
Цяпер, мамачка, з табой разлучаемся,
Разлука наша дужа страшная,
І дарожка твая невазвратная.
А што ж бы мая волечка,
Я ж бы луччы разлілася вадзіцаю,
Луччы б я рассыпалася белаю мучыцаю!
Дужа мне без цябе будзець тошненька,
І не к каму хадзіць будзець.
Дарожка мая зарасцець,
Усе сваe я абхадзіла,
І ўсе я свае адгасціла,

Астанецца цяпер толькі мая валыначка
І мамкіна магілачка.
Прыйду я на тваю магілачку,
І жоўты пясочак са мной гаварыць не будзець.
Мамачка мая жалкая,
Магілачка мая страшная,
Гдзе ж мая мамачка закрыта
І сырой зямелькай зарыта?

89. Што ж ты, радзіцельніца, ронная матушка,
Аставіла мяне горкаю няшчаснаю сірацінушку!
К каму ж мне цяпер сваю буйную галовушку прыхінуць?
У нас жа ж у чыстым полі
Не сады пасажаны, не лугі пасеяны,
Няшчасных, горкіх сірацінушак.
Ты ж, радзіцельніца, ронная матушка,
Размахні свае белыя ручанькі ад рацівога
сярдзечушка,
Ты ж устань, радзіцельніца, ронная матушка,
Пагавары з нам, горкім сіротушкам,
Навучы нас цяжолаю работку робіць!
Не атвячаеш, наша радзіцельніца, ронная матушка,
Ні ядзінага славечушка сваім горкім, няшчасным
сіротушкам!..

90. Куды ж ты, радзіцельніца, ронная матушка,
Куды ж ты знарадзілася
Ад нас, горкіх сіротушак?
Запусцеець жа твая цёплая ізобушка,
Шырокая вулушка, гладкай дварочак!
Не ўслышым мы ад сваёй радзіцельніцы,
Роннай матушкі, нікакога гулочку,
Толькі ўслышым у чыстым полі
Дробных птушачак, шэрых кукушачак.
Буду ж я, горкая сірацінушка, прымячаць,
Дзе будуць кукушачкі кукаваць, увівацца:
Ці не радзіцельніца, ронная матушка,
Прыляціць к нам, горкім сіротушкам?..

91. Мамачка ты мая родная,
А куды ты ад мяне прыбралася,
А ў якую ж дарожачку,
А ў якую ж староначку?

А калі ж мне цябе ў госці ждаць?
Я б вулачкі павымятала б,
Дарожачкі павысыпала б,
Я б мамачку ў госці ждала
І столікі б пазасцілала,
І кубачкі паналівала б,
Мамачка мая родненькая!..

92. Мамачка мая, радзіцелка, што ж ты мяне рана пакінула? А к каму мне сваю галовачку прыхінуць, каму ж мне сваё горачка расказаць? Пазапусцелі мае дарожачкі, пазарасталі мае сцежачкі...

93. Мая ж ты матулечка!
Многа ж будзець мне матушак,
А роднае ніводнае.
А хто ж мяне з-пад вянца ўстрэціць?
Да хто ж мне трубачкі ў парадак прывядзець?
Да к каму ж я ў госці прыйду?
Да хто ж мяне так ласкава ўстрэціць
і правядзець,
Як не ты, мая матулечка?

94. Здароў ты, мая мамулічка,
Што ж ты сягодня заспалася?
Не будзіш ты нас, на работу не пасылаеш,
Мая ж ты мамулічка!
Куды ж ты сабіраешся
Проціў ночанькі, проціў цёмныя,
Проціў зімухны халодныя?
А мая ж ты мамулічка!
Ты ж баялась у нас дужа холаду,
А цяпер нічым не жалішся,
Цяпер табе цёпла стала.
Хто ж будзець без цябе пра нас думаць?
Хто ж будзець без цябе мне кублечкі саружаць?
Знаць мы цябе, мая мамулічка, не ўмелі
наравіць.
Верна, ўгнявілі, да не ўнаравілі.

95. І мая мамулечка,
А куды ж ты ад нас сабіраешся?
А каму ж ты нас, маленькіх, пакідаеш?

А каго ж мы дзе пераймаць будзем?
А мы дужа маленькія,
А татулечка ж не мамулечка,
Ён жа возьмець чужую маму,
А яна ж нас не будзець глядзеці,
Яна ж нас будзець дужа абіжаці.
Мая мамулечка,
А я ж прыйду на тваю сялібачку,
Яна ж новая, невясёлая,
На яе сонейка не свеціць,
Мамулька мая,
А я ж буду з табой гаварыці,
На зялёнай мураўцы,
А на жоўтым пясочку.

96. Ох, мая ж мамачка,
Да мая ж парадніца,
Да парай мне:
Дзе ж мне цяпер падзецца?
Да бацька ажаніўся,
А ўчора напіўся
Да выкінуў мяне і маё ўсё з хаты.
Я ж пайшла да сястры.
А ў сястры, ты сама знаеш,
Свая сямейка,
Да і хата старэнька
І сама слабенька.
Да і не знаю, каму гадзіці,
Ці сястрэ, ці швагру, ці дзецям.
Як швагер прыйдзе з работы
Да да мяне абраціцца,
Можа, і з харошым настроем,
А мне здаецца,
Што я ў іх лішняя,
І я іх не сем'янін.
Да прыйдуць дзеці,
Да іх умываю, і ў школу праважаю,
Шчо сястра така слаба,
А мне ўсё здаецца:
Ваны ўсё думаюць — чаго я ім, чужая?
А іх маці слабая.
Ох, мая маманька,
Да мая парадніца,

Да памажы мне,
Да адзавіся да мяне,
Да дай які савет,
Дзе ж мне падзецца:
Ці ехаць на Украіну,
Ці на цаліну.
Да як зараблю хлеба,
Да зараблю пшаніцы,
Да няма каму везці,
Бо ў мяне няма хаты
І няма да каго прыхінуцца.
Да скажы мне, чы ўтапіцца,
Бо чужа старональка —
Не радзіналька,
Заўсёды там не будзем.
Каторы гадочак я цябе, маманька,
Гукаю.
А як прыйшла да мяне беданька
І дасаданька,
То я не прыйшла да цябе пагаварыці
І савету пытаці.
Бо зарэ мне, маманька,
На душэ так важэнька,
Шчо я магу і вадою ўдавіцца.
Да сястра просіць і швагер просіць:
«Хадзі, Надзя, есці».
А мне ж здаецца:
Каб вы мне якой труцізны далі,
То мне легчы було б,
І я, не знаўшы, за гэта ўхапілася б.
А мая ж маманька,
Жывая смертанька страшна,
А можа, я да чаго даб'юся
І чаго даждуся,
Або, як старыя людзі кажуць,
Можа, зайдзе сонца і ў маё аконца.
А можа, я і после выб'юся на людзі,
Я ж яшчэ маладая.

97. Ах, мая мамачка родная,
Куды ты ўвабралася?
Лета перакідалася, а на зіму ад нас сабралася.
А твая хатка маленька,

А твая хатка цёмненька,
А ні аднаго акенца.
А ты не будзеш чуць, як зязюлькі кукуюць.
Ува ўсіх дзяўчатак мамкі е,
А ў мяне ўжэ няма.
Устань, мамко, устань,
Устань, пагавары з намі, пасаветуйся.
Няўжэ ты больш не прыйдзеш да нас?
Як помню, бывала, вясною, іду я сабе з поля,
Адно мая мамачка стаіць на парозе
І кліча нас у хатку, усміхаецца,
Жартуе і ўсё пытаецца.
І ў каго мы будзем савету пытаць?
А хто ж нас частаваці будзе?
А хто ж нас шкадаваці будзе?
Ох, мамко, мамко,
Каму ты нас астаўляеш, сірот?
Ах, мая мамачка мілая,
А зязюлечкай абярніся,
А прылятай, прылятай у наш садочак,
А пытайся, пытайся ў нас пра ўсё,
А мы табе, мамка, расказваці будзем,
А мы з табою горушка сваё дзяліць будзем,
А мы ў цябе, мамачка, пра жыцце тваё пытацца будзем,
А мы ў цябе будзем пытацца савету,
А будзем ждаць ад цябе прывету.
Ох, мамко, мамко...

98. Мамулька мая радзіцелка!
А што ж ты мяне не пераймаеш?
І што са мной нічога не гукаеш?
Я ж гэты ўсе дзянёчкі
Да сваёй радзіцелкі збіралася,
Шчыранька хацела з табой пагукаці
І ўсё сваё гора расказаці.
Аж мая мамінька мяне не пераймаіць
І са мной нічога не гукаіць,
І пра маё гора вялікае не пытаіць.
Ты ўстань, мая мамка,
Хоць на 'дну гадзінку,
І пагукай са мной шчыранька,
І распытайся аб маё гора вялікае,

Як я, сірацінка, гарую,
І як я чужым таткам слугую,
І як я чужым мамкам улажаю.
І раскажы мне, мамка,
Як мне чужым мамкам палажаць:
Ці мне раньшым уставанійкам,
Ці мне познім палажанійкам.

99. Мамулька, наша родная!
Мамулька, наша мілая!
Каму ж ты нас прыказала?
На каго ты надзеішся?
Татулька, наш родны!
Татулька, наш мілы!
Ці тошненька табе?
Ці маркотненька,
А табе ў дальняй дарожаньке?
Прыляці-т-ка ты на гэта ўрэмячка,
Пaглядзі на нашу мамулюшку;
Мы дурнешынькі і глупешынькі,
А да каго мы прыступімся цяперытка?
А дзядулька наш родны!
Не кідай жа ты нас цяперытка.

100. А мая ж ты матачко,
А мая ж ты родненька,
А мая ж ты зязюлечко!
А нашто ж ты аставіла
Гэтакіх маладзенькіх,
Гэтакіх неразумненькіх?
А хто ж нас навучаць будзе?
А хто ж намі пасылаць будзе?
Ах мая матачко, мая родненька,
А чым жа мы цябе так угнявілі,
Што ты нас кідаеш?
А каму ж ты нас у апеку здаеш?
А мая матачко, мая парадначка!
А ўстань жа ты, а парадзь жа нам,
А як жа мы маем на свеце жыць,
А як жа мы маем людком гадзіць?
Бо мы самі не ведаем,
Бо мы ящчэ дурненькі.
А ўжэ ж тая гадзінка зближаецца,

Што ты нас назаўсёды апусціш,
Што ж мы тады рабіць будзем?
А мая мамачко, а мая родненька,
Прыкажы ты старшаму сыночку,
А нашаму браточку,
Каб ён з нас не збыткаваўся,
Бо мы не мецьмем перад кім паскаржыцца
Ані каму пажаліцца.
А мая матачко, а мая родненька,
А куды ты так прыбралася?
Ці ты к сваім донькам у прыданачкі?
Ці ты да суседзя на якую бяседу?
Чаму ты такая гарда?
А ўжэ другі дзянёчак,
Як я над табою стаю,
Як я цябе прашу і упрасіць не магу.
Калі ты гневаешся на нас,
То загавары хоць для суседачак сваіх,
Няхай яны на цябе не гневаюцца,
Ліхім словам не спамінаюць,
А ў бога неба благаюць.
А мая мамачко, а мая саколачко,
А мая матачко, а мая родненька,
Пазарастаюць твае дарожкі,
Кудэю ты пахаджала,
Свае дзеткі прыкрывала,
Каб раненько не ўставалі,
Каб большыя падрасталі.
А мае ручкі, а мае работнічкі,
Што яны нас гадавалі,
Для нас на хлеб працавалі!

101. А мая мамачка, а мая родная,
Ужо ж болей не ўвіджу,
Ужо ж болей не пачую.
Нямножка ж будзеш гасціць,
Нямножка будзеш гаварыць.
Дзе ж я цябе ўвіджу?
Дзе ж я цябе пазнаю?
Надта ж далёка ад'язджаешся,
У такую хатачку,
У такую глыбокую,
У такую цёмную.

Соўнейка не засвеціць,
Ветрык не павеіць.
А мая ж мамачка,
Ты ж тут была за соўнейку,
Была ў віннай хатачцы.
А цяпер пойдзеш у такую хатачку,
У такую цёмную,
У такую безаконную...

102. Ах, мая мамулечка,
Чаму ж ты ў сыру зямліцу зышла?
На каго ж ты мяне, сірацінушку, пакінула?
Чым жа я табе надакучыла,
Што ты мяне, таку маладзенькую, адну пакідаеш?
А хто ж мяне будзе кожны ранак
З пасцелькі падымаці?
А хто ж мне будзе косачкі заплятаці?
А з кім жа мне будзе раіцца,
Чые саветы слухаці,
Як не стане цябе, мая мамулечка?

103. Устань, прасніся, радзімая мамачка,
Памагі ты нам гора гараваць.
А ўсе та нас забіжаюць
Без радзімай мамачкі.
А прыйдзі ты к нам раскажы,
Як жа нам жыць.
Гукаем мы цябе, не дагукаемся,
Кажыную зорачку мы цябе гукаем,
Радзімая мамачка.
Ды мы цябе праважаем
З свайго падвор'я шырокага.
Ды госцечка ты наша дарагая,
Гасцюеш ты ў нас адзін дзянёчак
І адзін часочак.
Ды мае та вы людзі добрыя,
Да якое ж нам бальшое горачка.
Няма ў нас радзімай мамачкі.

104. А мая ж ты мамачка даражэнькая,
На каго ж ты нас, сіротак, пакінула?
Мы ж не гучаныя.

А хто ж нашу свадзьбачку будзе гуляць?
Хто ж нашых гасцей будзе вітаць?
Любая, дарагая мамачка!
А з кім жа мы будзем саветацца?
А каму ж мы будзем жаліцца?
А каму ж мы будзем хваліцца?
А хто ж наша горачка будзе рассуждаць?
А хто ж нашу радасць будзе успрымаць?
А хто ж нас будзе з дарожачкі устрачаць?
А хто ж нас будзе ў дарожачку адпраўляць?
А хто ж нам будзе сумачкі накладаць?
Хто ж нам будзе пісемцы пісаць?
Родная мая, мілая мамачка!
А ў каго мамачка — той шчаслівы.
А мы сваю мамачку ўтрацілі.
Болей жа, мамачка, мы з табой не ўстрэцімся.
Паглядзім, што ў другіх мамачкі,—
Наша сэрца баліць.
Прашчай, прашчай, мамачка,
Прашчай, прашчай, родная!

105. Мамачка мая любая,
А мы ж з табой ўсё, бывала, нагаворымся,
А мы ж, бывала, з табой нагалосімся,
А мы жа раскажам адна адной пра ўсё плахоя і хароша,
А к каму ж мне цяпер галовачку прыхінуць?

106. А, да мамка мая, мамка,
Да чаго ж ты мяне пакінула адну,
Да на етум свеце я страдаю адна,
Да ні роду, да нікога ў мяне.
А, да мамка ж мая, мамка,
Да чаго ж ты мяне так засмуціла?

107. Мамка мая родная,
Як я цябе хараніла.
Мая мамачка, калі ты ка мне прыйдзеш?
Мамка мая, даражэнькая,
Калі табе соўнейка ўсходзіць,
Калі ты ка мне прыйдзеш?
Мамка ж мая, даражэнькая,
А мне ж без цябе цяжка,

Луччай ба ты, мая мамачка,
Са мной ўмесці жыла.
Мамка ж мая, даражэнькая,
Хай бы ты мяне, мамка, разам ўзяла,
А нашто ж мне ета жэ гора,
Як я цяпер мучуся,
А ў мяне ж цяпер нікога няма...

108. Мая мамулечка,
Што ж ты ляжыш ціхусенька,
Ні з кім не гукаешся?
На двары ўжо цёмненька,
Хутка будзем расхадзіціся,
А скажы ж ты нам,
Калі цябе дажыдаціся?
А дзе ж ты будзеш хадзіці?
А дзе ж ты будзеш гаварыці?
А дзе ж цябе прыслухаціся?
Ці ж ты будзеш ісці па цемнаце?
А ты ж, мая мамулечка,
Замыкаешся, запіраешся
Крэпкімі замочкамі.
Сонейка к табе не ўвойдзе,
Мы ж к табе не прыйдзем,
А хатачкі мы ж твае не адчынім.

109. Ах, мая мамачка дарагая,
Да каго ж я цяпер прыхінуся?
Хто ж мяне цяпер пяроймець?
А зарастуць усе дарожкі, усе сцежкі.
Да каго ж я прыхінуся?
Дзякуй, мая мамачка,
Што ты мяне вырасціла.
Табе ж нідзе за мной стыдна не было.
Як жа я з табой цяпер расстануся?
Я ж буду, як птушачка тая, лётаць да цябе,
Каб у мяне крылле было.
Я б кожную мінуту прылятала,
Але ўсё роўна я не пакіну тваёй магілкі,
Хоць і далёка жыву —
Буду прылятаць птушачкай да цябе.
А ты ж мне ўсё саветавала,
А ты ж навучала, як жыці.

Я жыла, як ты мяне навучала, мая мамачка,
А цяпер няма такой цёплай старонкі,
Хто б мяне прыхіліў,
Навучыў бы як жыць.
Кругом усе чужыя,
І ніхто мяне так не навучыць, як мамка.

110. Ох, мая ж маці,
Ты ж мяне радзіла,
А чаго ж ты пакінула мяне?
Ты ж мяне шкадавала
Да і паскам лупіла, як буў малы.
Ох, мая ж маманька,
Да мая родная,
Я і сам ужэ стары,
Але ж плачу, да й кудачу,
Шчо ты ў мяне була така добра
Да така да ладна.
Да ты ж нас семярых вучыла,
Ты нас гадавала,
Часам сама не даядала,
А дзецям паследні кусок хлеба
Аддавала.
Я і сам ужо ўнукаў маю,
Але цябе, мая маці, не забуваю.

111. А мая ж ты мамулечка,
К каму ж я цяпер прыхінуся,
З кім я цяпер гаманіць буду.
А я ж, бывала, ці позненька,
Ці раненька бягу к табе,
Калі худа мне — раскажу табе.
Мая ж ты мамулечка,
Зарасцець жа к табе дарожачка.
Скажы ж ты сваім сынулічкам,
Няхай яны і на мяне не забываюць,
На сваё падвор'е пускаюць.
А гора ж сваё вялікае
Хоць я ж свайму братцу раскажу.
Мая ж ты мамулечка,
Вазьмі ж ты мяне к сабе!
Не магу я жыць без цябе.
Дзеткі мае маленькі,
Муж мой няўдаленькі.

112. Харашо лі цябе, матушка, харашо лі цябе, родная,
я цябе сабрала?
Куды ж ты, матушка, скора паспяшыла?
У какую ты дарожаньку ты адпраўляешся, у дарожаньку
невазвраціімую?
Ты мая матушка, родная, была прывумніца,
прыдумшчыца...
Прыйдзем к цябе, горкія, у госці мы з сваім горам,
А ты мяне, матушка, усё ўзвесяляіш!..
Чаго мне не дастанець, чаго мне не прыбрыцець муж
з плахою галовушкаю,
Ты мне, бывала, усё, усё дабаўляеш.
Нахажусь разутая і раздзетая — сжальцесь да мяне,
да горкай
І не дайце мне на белым свеце горушка мыкаць.

113. Ой, мамачка, нашто ж ты мяне пакінула?
А як я тыя сіроткі пагадую?
А як я ім плацечка пакупую?
А хто ж мне будзе іх гадаваці?
А хто ж мне будзе іх глядзеці?
А куды ж я, мамка, цябе павязу?
А якою сцежачкаю буду ісці?
Гэта ж я буду цябе шукаці,
Буду цябе выглядаці.
А то ж зазулька куе,
А я не ведаю, у якім бачку.
А куды ты, мамка, едзеш?
А куды я цябе вязу?
А калі ж ты да мяне прыйдзеш?
А хто ж мяне разрадзіць?
А хто ж мне будзе дзетак гадаваці?
А што ж ты мне іх столькі накідала?

114. А мамка мая да родная,
А куды ж ты ад мяне сабралася,
Да куды ж ты ад мяне да пойдзеш?
А калі ж, мамка, ка мне да ў госці прыйдзеш,
А калі ж, мамка, я цябе ж буду дажыдаць?
А мамка ж мая, салавейка,
А мамка ж мая залатая,
А мамка ж мая каханая,
А ці ты не знаеш, што я ў цябе да адненька,

А ці ж ты мяне не шкадуеш,
Што ты ад мяне да выбралась.
Ох, мамка ж мая каханая,
Ты ж мяне ўгаварала,
А штоб я на чужую сям'ю да не йшла,
Да вельмі ж чужых дзяцей да трудненька ж гадаваць.

А я ж тады не баялась,
Да толькі баялась хазяіна,
Штоб ён не піў да не біўся.
А ён жа мяне да не б'е,
Да ён жа мяне не карае.
Да ўсе 'дно чужая ж да сямейка.
Вох, мамка ж мая залатая,
А ці ты знаеш, што я ўжэ ж
Вялікіх дзетак да сіротак пагадавала.
А я ж думала, што я іх не ўзгадую,
Да не буду ж ім да не маткаю,
А не буду ж ім не радзенька.
А яны ж мяне, да дарма што чужыя,
Да завуць мамкаю.
Да што ж чужыя — да глядзяць,
Патаму ж я ім сягоння да раблю,
Да я ж іх гадую да й адпраўляю,
Да ім накладаю да й даглядаю.

115. Мая ж ты матулечка,
К каму ж я цяпер прыйду?
З кім я парадуюсь?
Хто ж мяне цяперацькі вернае слова скажаць?
Мая ж ты матулечка!
Цяпер жа і дарожкі пазарастуць,
Якімі я к табе хадзіла.
Да мне цяпер ніхто і абедаць не дасць,
А хто ж цяпер сустрэнець?
Да хто ж маіх дзетухнаў паняньчыць?
А хто майго супастата цяпер уймець,
Як ён разгуляецца?
Цяпер жа я і па падстрэшайкам паначуюся,
А дзетачкі з-пад печы не будуць вылязаць.

116. А мая ж ты мамачка,
А мая ж ты міленькая,

А як жа ты памярла,
А каму ты аставіла сваіх дзетачкаў?
А мамусенька міленькая,
Ты ж памагала мне унучкоў гадаваць,
А яны ж каля цябе спалі,
А ты ж іх пераспавівала,
А мамусенька міленькая,
А скажы ж ты, калі ж ты да мяне будзеш ісці?
А якой жа ты сцежачкай?
А я ж буду кветачкамі сцежачкі выкладаць,
А я ж буду дарожачкі пясочкам пасыпаць.
А мамусенька, мамусенька,
А чаму ж ты да мяне слоўца не скажыш,
Як мне жыць, з кім мне быць?
А мой жа ж мужычок п'яніца,
А ён жа мяне будзя абіжаць,
А ён жа ж мяне будзя папіхаць.
Мамусенька міленькая,
А чаму заснула,
А чаму слоўца да мяне не скажыш?
А мамачка міленькая,
А ты ж астатняю ночачку ў гэтай хатаццы начуеш,
А мамачка, мамачка,
А я ж да цябе буду хадзіць,
А я ж цябе слёзкамі буду сцежачкі палівадь.

117. Мамулічка мая родная, жаласніца мая!
Верная сустраканніца мая прыхільная,
Праваднiца мая шчырая!
Хто ж мяне так сустрэнець,
Хто ж мяне так правядзець,
Як мая мамулічка, як ты, мая родная?
Хто ж у мяне аб здароўі папытаець,
Хто ж пра маю худобаньку праведаець,
Хто ж пра майго няўдаліцу так распросіць,
Як ты, мая мамулічка, як ты, мая родная?
Хто ж па майму гору так папячаліцца,
Хто ж маёй дабраце так урадуецца,
Як ты, мая матулічка, як ты, мая родная?
К каму я так пайду, каму шчырую праўданьку скажу,
Як ні табе, мая мілая, як ні табе, мая родная?

А цяпер, мая мамулічка, усё ж маё мінуецца:
Не к каму мне прыйці,
Не к каму мне шчырай праўды сказаць,
Не к каму мне прыхінуцца,
Не к каму мне прыгарнуцца!
Мне, бывала, усё міла,
Мне, бывала, усё люба,
Як была мая мамулічка,
Як жыла мая кукулічка.
Цяпер мы з табою ўсё перагукалі
І ўсё перагаманілі.
Цяпер жа мы разлучаемся разлукаю вечнаю.

118. А мая ж ты матушка,
А мая ж ты зязюлечка,
Чаму ж ты, чаму памерла,
Сваю дачку асіраціла?
Ах, каб ты відзіла, знала,
Якая мяне доля спаткала:
Ах, устала ж бы ты, устала,
Раданьку бы ты мне беднай дала.
Ах, некаму ж мяне пажалеці,
Я й у хаці, я й у клеці
Слёзкамі, слязамі плачу.
Ах, шчасця, долі да й не бачу,
Ах, свякроўка ж мяне заганяіць,
Ніколі мне не спаганяіць,
Ласкавага слоўца не прамовіць,
Усюды толькі гоніць да гоніць,
Плакаць па табе не пазваляіць,
Ой, хоць добра зраблю, усё лаіць.
Ах, бярозка ж ты мая бярозанька,
Чаму ты мне ў матачку не пераменішся?
Чаму ж ты са мной да не пагукаіш,
Сваёй дачкі да й не распытаеш,
Як яна жывець, да й гаруіць,
Як яна начуіць, як днюець?
Ах, цяжэнька ж мне, цяжэнька,
Ах, трудненька ж мне, трудненька
У чужой хаце жыці,
У чужой матулькі быці.

119. Мамулічка мая, галубачка мая залатая!
Мамулічка мая дарагая!
А куды ж ты, мая мамулічка, ад нас ад'язджаеш?
Галовачка мая дарагая!
А наклапаталася ж, мая галовачка, і нагаравалася ж
Ручачкі мае міленькія, ручачкі мае любенькія!
А наработаліся ж мае ручачкі,
А яны ж то, бувало, мае ручачкі,
А яны ж, як дзень, так ноч, усё работалі,
Ножачкі мае дарагія!
Да нахадзіліся ж яны ўсюдых,
А ім жа то ні было спакою ні ўдзень, ні ўноч.
Мая пташачка,
А ты ж, бывала, мая мамунічка,
На мяне ўсердзішся, да пажалееш
Да і яшчэ закрычыш:
«Дзелай, сукіна дочка, не ляніся,
А то будзеш голая і нагая».
А я гэтаму не верыла,
Я думала, мамачка яшчэ са мной пажывець
Хоць гадочка два-тры.
Зрадзіла мая мамачка, а зрадзіла мая дарагая.
Зрадніца мая залатая!
А няма ж мае зязюлечкі.

120. Мамулічка ж мая родненькая,
Як жа ты мяне, маладзенькую, аставіла,
А як жа я цяпер буду расставацца,
А як жа я буду размышляцца?
А я ж і маладая, і дурная, і неразумная,
А я ж ужо чужы парожак пераступіла,
А я ж усім нагадзілася і наравілася.
Бяры ж ты лучча мяне ўжо з сабой,
Нічымся мне гора гараваці.
А мамулічка ж ты мая родная!
Ці мае ж слёзы богу пацешныя,
Што яны маю мамулечку атабралі?
Хоць бы я ж і гаротная была ў цябе,
Хоць бы я ж к табе перахадзіла,
Жуду, бяду падзяліла.
Галовачка ж мая буйная!
А зараненька ж ты скланілась.
А вочачкі ж мае яркія,

Зараненька ж вы зачыніліcь.
А ручачкі ж мае белыя!
Зараненька ж вы сашчапіліcь,
А ножачкі мае бóрздыя!
Зараненька вы падламіліcь,
А славечкі мае верныя,
А славечкі мае шчырыя!
А ці я сваю мамулічку чым угнявіла?
А я ж к ёй прыйшла блізюсенька,
А я ж гавару з ёй вернюсенька,
А яна мне нічога не атвячаець.
А ці я цябе тым угнявіла,
Што я к табе часценька захадзіла?
Што я табе часценька пасцелькі не праслала?
А мая матулечка родненькая,
А ці ж я цябе тым угнявіла,
Што я табе часценька піткі не давала?
А ці табе сянні палягчала?
А не баляць твае, мамачка, сянні грудачкі,
А не баляць, мая мамачка, сянні плечачкі?
Ці табе сягодні палягчала,
Ці табе ж сянні палепшыла?
А пчолачка мая дарагая!
Куды ж ты раненька паляцела?
Ці ты ў яравое полечка, ці ты ў жытавое?
Адкуль жа мне цябе дажыдаці?
Адкуль жа мне цябе пазіраці?
Ці ты ранняю зарой ускінешся, ці ты позняю?
А мамулічка ж ты мая родная!
Ці ты ка мне жаркім соўненькам ускоцішся?
Ці ты ка мне ясным месяцам?
Ці ты, мая мамулічка, дробнымі звёздамі?
Ці мне ж цябе па гаворунцы спазнаваці,
Ці мне ж цябе па паходунцы ўзнаваці?
А славечкі мае вèрныя,
Нічога ж ты, мая мамулічка, не слухаеш,
А я ж у цябе пытаюся шчырусенька,
А я ж пры табе стаю блізюсенька,
Чым жа я цябе, мамачка, угнявіла?

121. А матулька мая,
Я іду да цябе,
А ты мяне пытаеш:

— А што ты сёння варыла,
А чым ты дзетак карміла?

122. Мая ж ты матулечка! Да мы ж ужэ з табою пасledні разік бачымся, да прыйдзі ж к нам хоць разочак у госці, да раскажы ж нам, як у вас тамацькі жывуць, да навучы ж нас, як тут жыць, а не прыйдзеш, то хоць сасніся нам.

123. Ой, мамачка мая, дарадчыца мая,
Ой, куды ж ты на лета адлятаеш?
Ой, куды ж ты на лета ўцякаеш?
О, матанька, ластаўкі прылятаюць
І ўсе пташачкі прылятаюць,
А ты, матанька, куды хочаш адляцець перад летам?
О, матанька мая, зорачка!
...Як жа загадаеш, матанька: ластаўкай?
Як жа загадаеш, матанька: салоўкаю?
З якой стараны нам цябе выглядаць?
О божа, божа высокі!
О чаму ж ты маю матку забраў?
Ой, чаму ж, божа, сірот нарабіў?
О, божаньку, божаньку высокі!
Як жа ты сірочыя слёзы любіш!
Ой, матанька мая, зорачка!
Ой, матанька, дарадчыца мая,
О, загавары ж ты са мною,
Чаму ж на мяне загневалася,
Што не хочаш, мамачка, са мною гаварыць?
Матанька мая, зорачка,
Прысніся мне, мамачка, у сне
І адкажы, мамачка, хоць што-небудзь са мной пагавары...

124. Радзіцелка мая родная!
Я ж за тваёй галовушкай
Нічога не знала,
Усё на цябе надзеялася-тка.
Ну, цяпер мне сваёй галовушкай
Нада прыдумаваць.

125. Ах, мая мамачка, мая родненькая...
Мае ножкі лятучыя,
Мае ручанькі гарнучыя...

126. Упусціла я сваю радзіцельніцу,
Роннаю матушку,
Не ўвіжу ж я ні краснага дзянёчка,
Ні вясёлага часочка!
Зазнабіла маё сярдзечушка
На цэлы гадочак!

127. Матулька мая родная,
Як жа я пайду тымі дарожкамі,
Дзе я цябе праважала,
Пад якімі кусточкамі аддыхала?
А хто ж ка мне будзе хадзіць?
Ды каго ж я буду пераймаць?
Я ж у ваконца паглядала,
Я ж цябе, мамка, дажыдала.
Цяпер не буду дажыдаці,
Цяпер не буду пераймаці.

128. Ой, мая мамачка,
Ох, мая родная,
Ох, да каго ж я прыхілюся?
Ой, да каго ж я прытулюся?
Маманька мая,
Верная мая,
Зязюленька мая.
Ох, наша мамуленька,
Наша гадавальніца,
Наша страдальніца.
Ох, маманька, маманька,
Як цяжанька расставацца,
Як цяжанька разлучацца
Мне з табою.
Да дзе ж маманьку шукаці,
Да дзе ж маманьку выглядаці?

129. А мая мамачка,
А ты ж мяне навучала,
Ты ж мяне прасіла,
Што хаця ж як ты астанешся,
Будзеш адна гараваць.
А ты ж мне памагала,
А ты ж мяне развражала,
Еслі ў мяне што не так...

Прасці, можа, не так дагледзела,
Можа, не так цябе лячыла,
Можа, не так цябе карміла,
Хаця не абіджайся,
Хаця ўжо зла не думай,
З таго свету мне прыяй.

130. А мая мамачка,
А мая любая,
А мая мілая,
А нямножка гасціла,
А нямножка ж пабыла,
А ўжо жэ распрашчаюся,
Ня ўсё й мамцы расказала,
Ня ўсё й у мамкі папытала,
Можа ж, мамку калі угнявіла,
Можа ж, мамку калі і ўквяціла,
Так жэ, мамачка, і мне прасці.
Я ж гэтыя слоўцы перадумаю,
Я ж гэтыя слоўцы пеgражалею.
Можа, калі я не тоя сказала,
Можа ж, буду сама ўсю жызню жалеці
А мая мамачка мілая.

131. А мая мамачка,
Да што ж ты нам зрабіла,
Нашто ж ты нас кінула?
Да мы ўсе цябе просім:
Прыйдзі к нам на вячэрку.
Да ці ж ты не чуеш,
Ці ты зазлавалася,
Што к нам не йдзеш сёння?
А мы ж цябе ждалі,
А мы ж цябе ўстрачалі,
А ці ты на нас забыла,
А што ж ты нам зрабіла?
А мы ж усё ходзім —
Усе твае куточкі,
Усе твае сцежачкі —
Нідзе цябе не найдзём.
А мы ж цябе просім:
А ты ж нас не забывай,
А ты ж нам усё прашчай.

Можа, што абідзелі,
Можа, не так што табе прыладзілі,
Можа, што не так пераймаем,
Можа, не так устрачаем?
А ўсе ж сабраліся —
Уся твая радзінка,
Усе цябе просім:
Хаця ты да нас прыйдзі,
Хаця адно слоўца скажы,
Ці табе там лепей,
Ці табе там горай?
А ты нам усё раскажы,
А ты нам хоць сасніся.
Што ж ты на нас абідзелася,
Чаму к нам не прыходзіш,
Чаму нам не гаворыш?

132. Ох, мая ж мамачка,
Ох, мая родная!
Скуль я цябе буду дажыдаці,
З якімі ты пташачкамі будзеш ляцеці?
Чы з качачкамі,
Чы з гусачкамі,
Чы з жураўлямі?
Усіх я буду пытаці:
«З кім мая маманька ляціць?»
Дарагая мамачка!
Уся родзіна зышлася,
А ты ж ляжыш,
Нічога не пытаеш,
Чы ж мы снедалі,
Чы ж абедалі?
Ох, мамачка родненька,
Злажыла ты ручанькі,
Каторыя мяне насілі.
Згарнула ты ножанькі,
Каторыя мяне вадзілі.
Мамачка мая дарагенькая,
Прашу я цябе,
Не гневайся на мяне.
Што я твае смертанькі
Не дагледзела.
Мне ж напісалі,

Шчо ты бальная,
А я ж не магла
У тэ ўрэм'ячка прыехаць.
А як прыехала,
А ты ж ляжыш
І не хочаш нішчо мне расказаці,
Шчо ў цябе балела.
Ох, дзе ж тыя магазіны,
Дзе ж воны стаяць,
Шчо мацярок купляюць?!
Прыляці да мяне заўзулькаю,
А ў мяне ж лес недалёка.
Да я на заўзульку гляну,
Да і маманьку ўспомню.
Да я ж яе галасочак пазнаю.
Мая ж маманька,
Мая родная!
Мая заўзулька сівая!
Я ж дазналася ад паштальёна,
Як прынёс мне целеграму,
Шчо ты ўмерла,
То я не магла нічога рабіці.
Усё кінула і еду да цябе.
Ох, я ж прыехала,
А ты ляжыш,
Як быліначка зламана,
Нічога мне не кажаш,
На каго ж ты дочачку,
А маю сястрыцу, пакінула,
Каму прыручыла?
Яна шчабеча, як пташаня,
А ты ляжыш і не чуеш,
Шчо мы абое цябе просім:
«Устань, наша мамачка!
Да падзівіся, шчо мы ўдвох
Сядзімо над табою».
Ох, маманька!
І твае сёстры прыйшлі
Да цябе нарадзілі.
Ужэ табе і дамавіну зрабілі,
А ты і не знаеш,
Добра табе хата, чы цесная.
Маманька наша!

Устань, падзівіся,
А ты да нічога не гаворыш.
Раньшэ была гаваруха і спявуха,
А цяпер маўчыш.
Ох, наша маманька!
Галубка сіза,
Скажы нам,
З якімі пташачкамі прыляціш?
З якімі ажыдаці вясною:
Чы з салаўямі,
Чы з заўзуляю,
Шчоб мы, дочкі, устрачалі?

133. Маманька мая,
Карміліца мая,
Красная мая сонца!
Адкуль жа мне цябе паглядаць?
З каторага боку,
З каторай старонкі?
А ты ж, маманька мая,
Карміліца мая,
Красная сонца!
Закацілась жа ты
За цёмныя лясочкі,
За шэрыя барочкі.
Нідзе ж я цябе, маманька, мая карміліца,
Нідзе ж я цябе не ўвіжу,
Нідзе ж я твайго галасочку не ўслышу.

134. А мая мамачка,
А мая мілая,
А прабачай мяне,
Што я рэдка цябе адведвала.
Я ж далёкая,
Я ж адзінокая,
З малымі дзеткамі.
А мая мамачка,
Чаму ж ты не адзываешся,
Пра сваіх унучыкаў не пытаешся?
Як жа ты мне іх гадаваць памагала,
Як жа ты імі цешылася,
Як жа ты іх пераймала!
Хоць я раз у гадочак,

Але шчырае слоўца ад мамкі чула.
А цяпер да каго ж я прыеду,
Хто ж мяне ўстрэціць?!
Не будзе ў мяне мамкі.
Ты ж мяне аж за кусточкі праводзіла,
Аж каля рэчачкі ўстрачала.
А цяпер, мамка мілая,
Ляжыш, ні слоўца не адзываешся,
Нічога не пытаешся.
Мая мамачка,
Зарастуць сцежачкі,
Зарастуць дарожачкі,
Як нет маёй мамачкі.
Ці напрасіла ты сваю нявестачку,
Майго брацітку,
Каб ён мяне не вычурваўся,
Каб ён мяне за сястрыцу шчытаў?
Ах, мая мамка родная,
Як жа мне цяжанька,
Як жа мне трудненька.
Мы ж ніколі не думалі
На такую бедачку.
Мы ж усё думалі,
Што наша мамка крутая,
Што наша мамка крэпкая.
Як прыедзеш да мяне,
Ты ж адной мінуткі не пасядзела,
Ты ж адной мінуткі не пагуляла.
То дварышчыйка мяцеш,
То ў гарод ідзеш.
А ўсё работку сама сабе знаходзіш.
Ты ж мяне усё цешыла,
Ніколі не прызналася,
Ніколі не пахвалілася,
Што ты была гэткая хворая,
Што ты не магла хадзіць,
Не магла рабіць.
А нам усё казала, што ты здаровая.
Ах, мая мамачка, ах, мая мілая,
Ах, мая родная,
Паследні дзянёчак, паследні часочак
Відзім сваю мамачку.

135. А мая хатачка,
Ты ж будзеш мне чужая.
А мае куточкі,
А вы ж усе цёмныя будзеце,
А вы ж усе чужыя мне будзеце.
А ўсе сцежачкі,
Усе дарожачкі пазарастаюць.
Не будзе мне да каго прыхінуцца,
Не будзе маёй мамачкі.
Ніхто ж мяне не будзіць дажыдаць,
Не будзе каму выпраўляць.
Паследнія разочкі я на цябе гляджу,
Паследнія разочкі я сюды прыхаджу.
Мая мамачка, мы ўсе лічылі,
Што ты яшчэ крэпкая,
Што ты ўсё здаровая,
А цяпер я бачу ўсё тваё мучэнне.
Ты мяне цешыла,
Ты ж мне казала,
Што табе лепей,
Што ты папраўляешся.
А цяпер я бачу,
Што ты, мамка, часочкі дажываеш.
Я ж табе нічога не жалела,
Што табе аддала.
Я ўжо сама саслабела,
А я думала,
Што ты, мамка, аджывеш.
Ох, матанько, матанько, да ўжэ й не пабачу.
Пасledняя й гадзінка,
Пасledняя й мінутанька
Сваю й матаньку бачу,
Яе бачу ў сваёй хатцы.
Куточак будзе й парожні,
За столікам не будзе.
Матанько ж мая,
Каго ж я й буду называці?
Слоўца ж мае лёганькае,
Слоўца ж мае прыятненькае,
Матанька ружоная,
Ой, дабранач, мамко.

136. Дзякуй табе, матко,
За тваё гадуваннечка,
За тваё шкадуваннечка,
Што ты мяне, мая матко,
Раненька й не будзіла,
Бо ты ж мяне шкадувала.
Скажаш, бувало, мая матко:
«Спі, дочачка, спі, родная,
Бо ты яшчэ маладзенька,
Да прыйдзе табе й гадзінанька,
Што будзеш раненько і ставаці,
Рано расіну трусіці».
Дзякуй, матко, дзякуй, міло,
Мая й галубка сівая,
Мая матанька родная,
Мая матанька верная,
Мая й матанько цёпленькая,
Якое слоўца лёгенькае,
Якое слоўца й прыятненькае.
Матанько ж мая,
Родна ж мая,
Куда ты ад мяне ўходзіш,
Ці ты, матко, й у гасціну,
Ці ты, матко, на каравай,
Ці ты, матко, дый у гарод?
Матанько ж мая,
Родная ж мая,
Дзе ж я цябе й устрачаці,
Ох, якою й пароюʔ
Ці раначкам, ці вечарком?

137. Мая мамачка, а мая госціца,
А з якой старонкі дажыдаць будзем,
У каторае аконца пaглядаць будзем,
Ці ідуць нашы татка з мамкай
Нам памагаць, нас навучаць?
Мая мамка, папрасі сваіх браціткаў,
Сваю сястрыцу,
Каб нам, круглым сіроткам,
Яны што памагалі.
А мая мамка, хоць бы ты хворынькая,
Хоць бы ты якая, каб ты ў нас была.
Хоць бы ты не рабіла,

Хоць бы ты нас на работку выпраўляла,
Сваімі слоўцамі пацяшала,
Сваімі слёзкамі абмывала,
Сваімі гарачымі саграваліа.
Ва ўсіх дзяўчатак і таткі, і мамкі,
А мы ж засталіся адны,
Як калочкі, як пянёчкі.
Нет у нас ні таткі, ні мамкі.
А мы ж яшчэ малыя,
Як жа мы будзем жыць?
Чаму наша доля такая няшчасная?

138. Мамулечка ж мая родная,
Куды ты сабралася, ў якую дарожачку,
Ў якую старонаку далёкую?
Мамулечка мая родненькая,
Астылі дарожачкі,
Ні разачку ты ка мне ў госцікі не прыйдзеш.
Мамулечка мая родненькая,
Каго ж мне цяпер ажыдаці,
Каго ж мне цяпер з етыя дарожачкі ўстрачаці?
Мамулечка мая родная,
З кім жа ты мяне кінула,
К каму ж я цяпер галовачку прыхінаці буду?
Каму ж я сваё горачка расказываці буду?
Мамулечка мая родная,
Няма ж у мяне нікоганька,
Ні сяструлечкі, ні братулечкі.
Папагіблі яны, мая мамулечка родненькая,
Мае братулечкі, твае сынулечкі,
У дальняй дарожачцы.
Схілілі яны свае галовачкі
На чужой старонаццы, на чужой зямельцы.
Мамулечка мая родненькая,
Я й цябе часценька буду ўстрачаць,
Каб ты ка мне ў госцейкі прыхадзіла.
А ты, мая мамачка родненькая,
На мяне дужа крэпка рассердзілася.
Чаго ты мяне сённі, мая мамулечка родненькая,
Не вітаеш і нічога не кажаш?
Сабрала ты, мая мамачка, сёння
А ўсю сваю радзіначку,
А ўсю сваю скаціначку.

Чаго ты, мая мамачка,
Нічогачка не кажаш і нічым не ўгашчаеш,
А ты, бывала, мая мамачка,
Хто не заедзець, хто не прыйдзець,
А ты ж усіх харашэнечка прывітаеш.
Мамулечка мая родненькая,
Чаго ета ты мяне кінула адзінокую?
Нарадзіла ты мяне, мая мамачка родненькая,
Не ў шчаслівы дзянёчак, не ў шчасліву мінутку.
Ці ты, мая мамачка,
Ля быстрай рэчачкі не хадзіла,
Ці ты, мая мамачка,
Па цёмненькім лесіку не блукала.
Луччы б ты мяне, мая мамачка,
Маленькую ў быструю рэчачку кінула,
Луччы б ты мяне, мая мамачка,
Маленькую ў цёмным лесіку пакінула,
А я тады, мая мамачка,
Нічогачка, маленькая, не знала,
А цяпер я, мая мамачка,
На свае ножачкі ўстала
І ўсё сваё горачка пазнала...

139. Дзякуй, матко, за гадаванне,
Дзякуй, матко, за ўсё, за ўсякае за відаванне.
Дзякуй, матко, за падарачкі,
Што і сваімі ручкамі вытыкала,
Да нам сундукі накладала.

140. Ах, мая мамачка,
Ах, мая міленькая,
Хто ж нас пераймаць будзець,
Хто ж нас дажыдаць будзець?!
А ты ж нас ля кусцікаў сустракала,
За канаўку праважала.
А мая ж мамачка,
Мы ж усе казалі,
Што наша мамачка здаровая,
Наша мамачка работніца.
Ты ж нам і грыбочкі,
І ягадкі, і шчырыя слоўцы,
А ўсё памагала.
Прыедзеш да мяне,

А ты ніколі не пагуляла:
То ў гарод ідзеш, то дварышча мяцеш.
Мая дачушка, падзякавай бабульцы:
Яна ж ўсё знала,
Якую табе сукеначку пашыць,
Якое табе калечка купіць,
Калі табе пасылачку пасладзь.
А цяпер, мамачка, зарастуць сцежачкі,
Зарастуць дарожачкі.
Няма нашай мамачкі,
Не будзець нас каму выпраўляць,
Няма каму дажыдаць.

141. Ох, мая маманька, апошняя гадзінанька, як я з табою бачуся. З каторага боку буду цябе выглядаці? Да буду к тваім слядкам прыглядацца, з каторага боку ты прыйдзеш?

142. Паследні разочак, паследні часочак
Свідання, прашчання,
Радзіцельніца, родная матушка!
Закацілась маё цёплае краснае соўнушка,
Не стала яно нас, сіротушак, грэць,
Маё цёплае сагрэішча!
Выйду ж я, горкая сіротушка,
Заўтра ранёшанька на шырокую вулушку,
Пагляджу ж я, горкая сіротушка,
На чатыры старонушкі:
Ці ня ўвіжу ідзя маёй радзіцельніцы,
Роннай матушкі?
Ці не размахаваіць яна
Сваім белым ручанькам,
Сваім скорым ножанькам?

143. Ох, мая ж мамачка,
Мая ж родная, мая ж вучная.
Ты ж мяне шкадавала,
Ты ж мяне гадавала,
Ты ж мяне вучыла на ўсё харошэнька,
Шчоб я ўмела на свеце жыці.
А цяпер ты забралася ў тэ сяло,
Дзе сонейка не грэе,
Дзе ветрык не вее.
Мамачка родная,

Зазулькаю куй і мне ў сне сніса.
А ты ж у таку хату забраласа,
Дзе няма ні вакон, ні дзвярэй.
Да я ўжэ, мамачка, к табе сцежкі не найду,
Каб к табе ў госці зайсці.
Да ты ж мне савету не дасі,
Да й не скажаш, як мне на свеце жыці.
Прасці мяне, мамачка, як я калі цябе чым
абідзела,
Як табе чым не ўгадзіла.
Да шчо ты на нас так зазліласа,
За шчо обідзелас, шо нас саміх пакінула.
Да вось твэй унучко стаіць дэй плача.
Больш ён к табе босымі ножкамі не прыбяжыць,
Да й табе ў поле вады не прынясе.
Да хто ж яго маленькага пашкадуе,
Хто яго прыгалубіць,
Хто ж яму гасцінца дасць да й казачку раскажа.

144. Ой, мамачка ж мая родненька,
Мамачка ж мая, міленька мая.
Дзе ж я, мамачка, цябе ўбачу?
Паследні дзянёчак, мая мамка міла,
Ой, скідайся ж, мамачка,
Зязюлькаю ў садочак,
Прылятай, мамачка, я цябе пазнаю
па галасочку.
Мамка ж мая, родненька мая,
Мамка мая, міла мая,
Як жа мне цябе, мамачка, забуцца?
Не магу, не магу, мамка мілая.
Ой, мамачка ж мая, родна мая,
Дзе ж я твае слядочкі пазнаю,
Дзе ж я, мамачка, цябе ўжо ўбачу?
Мамка мая, прысылай пісямко мне,
Мамка ж мая, міла мая,
Адкуль мне цябе ў госці ждаці?
Ой, мамачка ж мая,
Да ці мне ж цябе, мамачка, з Лёцкі ждаць?
Да мне ж цябе, мамачка, з горада Мінска.
Мамка мая, галубка мая,
Як мне цябе ўжо ўбачыць?
Я ж цябе не ўбачу, пакуль мае вочы зачыняцца.

Мамачка ж мая, галубка мая,
Нашто ж ты мяне, няшчасную, радзіла,
Што мяне, маладую, пакінула?
Я ж, мамачка, думала з табою доўга жыць.
Мамка ж мая дарагая,
Да свідання, да свідання,
Паследняе цалаванне, паследняя мінутачка,
Мамка родненька, да свідання, да свідання,
Перадавай прыветы ўсім сваім, маім.

145. Мая маманька, радзіцелка!
А куды ж ты адлятаеш?
На каго ж ты нас пакідаеш?
А скажы ж ты нам вернае слоўца —
З якой старонкі нам цябе пераймаць?
Ці з тэй старонкі, дзе ясна сонца ўсходзіць?
А ці з тэй, дзе ясна сонца заходзіць?
У якое нам ваконца паглядаць?
Калі цябе пераймаць?
Ці ў суботу — позна, ці ў нядзельку — рана?
Да каго ж мы цяпер прыхілімся?
Зацямнелі ўсе нашы куточкі і відныя ваконцы,
Як адлятаець наша маманька-радзіцелка!
Ні ад каго ж мы не пачуем добрага слоўца!
Ні з якой старонкі не павеюць на нас цёплыя вятры!
Ні ад каго ж нам не будзе ні абароны, ні жаласці!
Мая маманька-радзіцелка! Зарастуць сцежкі-дарожкі
Дубняком, бярэзнікам, маладым алешнікам!

146. Мая мамачка,
Мая родная,
Нашто мяне асціраціла?
Як я буду жыці?
Дзе я буду хадзіці?
Я мамачку буду ўспамінаці.
Людскія дзяўчаткі,
Яны мамачкаў маюць,
А я не маю.
Мне трудненька,
Мне невясёленька.
Прыходзе вясніца,
Прыляціць зязюля,
Стане кукаваці,
А я буду слёзкі выліваці.

147. Мамачка ж мая,
Прыяцелка мая,
Хто ж етаму дварочку
Цяпер прыяць будзе?
А я ж куды пайду,
Я ж куды паеду,
Так я знаю, што ў мяне
Мая мамачка ўсё прыгледзя.
Усіх панакормя,
Усіх пазачыня ў пунячку.
Мамачка ж мая,
Родная мая,
Верны ты мой замочык.
Забудзя мяне,
Мая мамачка,
Ўся наша радзіначка.
Мамачка ж мая,
Мілая ж мая,
Хто ж мяне жалець будзя?
А ты мне казала,
Ты мне гаварыла,
Мая дачушачка,
Жыві з добрымі людзьмі, як я жыла.

148. А мая мамачка, а мая родная,
Чаму ж ты гэдак скора ўцякла,
Хоць бы я табе паслужыла,
Хоць бы я з табой пагаварыла!
А мае дзетачкі,
А вы ж не ўвідзіце сваей бабулічкі...

149. Мамачка мая родная,
Мамачка мая любая,
Куды ж ты сабралася?
Дарожка твая далёкая,
Хатачка твая цёмная,
Куды ж ты, мамачка, ад нас паедзеш,
Нам жа дужа будзе скучненька,
Адкуль жа нам цябе ждаці?
У якога акошачка?
А будуць іцці старушачкі,
А я думаю — мая мамачка.

150. Ой, а матка, мая матка,
А родненька ж мая.
А як жа я цябе ўгледжу,
А дзе ж я цябе ўчую?
А матачка, матачка,
А як жа мне ў хаце жыць?
А мне ж і сумненька,
А мне ж і кроўненька.
Адкуль жа я іціму?
А дзе ж я цябе ўчую,
А дзе ж я цябе ўгледжу?
А матка-зязюлька ж кавацьме,
То ж я думаю, мая маці йдзе!
О, матка, матка родная.

151. Ах, мая мамачка,
Ах, мая родная,
Прыйдзе вясніца,
Прыляціць зязюлечка,
Сядзя на вішаньку,
А йна будзя кукаваць,
А мая мамачка думаць будзя,
Што дачка прыйшла яе пабуджаць,
А яна выйдзе на надворачак,
А зязюлька закукуе,
Крыллейкамі маханець і паляціць,
А маёй мамацы нічога не скажа.
Ах, мая мамачка,
Ах, мая родная.

152. Ой, мая мацюнка,
Ой, і мая родная,
Дзе ж і цябе шукаціму,
Скуль я цябе і выглядаціму?
Ой, мая й маточко родна,
З кім ты а мяне й пакідаеш
Да і саменькую,
Да і адненькую?
Да я ж цябе знайду,
Я жэ буду хадзіці,
Я жэ буду й шукаці,
Як зазуліка рабая,
Буду куваці,
А мацюнкі не найду.

Мая мацюнка,
Мая й родная,
Мая й мілая,
Дзе ж ты, мая мацюнко, падзелася,
З каторага, матко, боку дажыдаціму,
З каторага, мачачко, боку й выглядаціму?
Ой, матко наша родна.

153. Мая ж ты матанько родна,
Як жа, матанько, табе ўмерці цяжко,
Як жа, матанько, ты дадому не прыйдзеш?
Ох, і матанько жэ родна,
Хіба ж прыляціш зазулькаю
Да станеш у мяне й на бярэзіне, будзеш куваці,
Я ж думаціму, што матанько да мяне прыляцела
зазулькаю.

154. Не ўлятай, мая радзіцельніца, ронная матушка!
Запусцеець твая цёплая ізобушка,
Шырокая вулушка, гладкай дварочак!
Паслухай ты нас, горкіх сваіх сіротушак:
Мы ж, горкія сіротушкі,
Нашатаемся ў чыстым полі,
Быдта травінушкі.
Зазнабіла наша сярдзечушка знаблёханька,
Не ўвідзім мы, горкія сіротушкі,
Ні краснага дзянёчка, ні вясёлага часочка,
Зарастуць нашы пуці-дарожанькі
Частым ельнічкам, густым бярэзнічкам,
А і горкім асінушкам.

155. Атапры, мая радзіцельніца, ронная матушка,
Атапры ты нам дзверцы!
Хадзі ты ў цёплаю ізобушку,
Абагрэй свае белае ручанькі,
Свае скорае ножанькі!
Ім там знабнёшанька, халаднёшанька...
Што ж ты рассярдзілася,
Радзіцельніца, ронная матушка,
Не атвячаеш нам, горкім сіротушкам,
Ні ядзінага славечушка?
Каторай дзянёчак
Не слышалі мы ад цябе гулочка!..

156. Добры дзень, мамачка, мамачка мая любая!
Чаго ж ты маўчыш, не адгукаешся,
Не пытаешся, з кім я прыехала, чым я прыехала?
Мы, мая мамка дарагая, па цёмнай ночы размаўлялі.
Ты мне расказвала, што рабіла, а я — табе.
А сёння, мая галубачка, вочкі закрыла, губкі стуліла
І маўчыш, нічога не гаворыш.
Колькі ты людзей сабрала,
На якую бяседу і чаму нікому нічога не гаворыш?
Ты заўсёды казала, як людзей устрачаць, чым іх частаваць.
А я сёння з табою не сустракаю іх.
Я цябе, мая галубка, заву-заву, а ты маўчыш.
І сынкі твае завуць цябе і пытаюцца, і ўнукі.
Ты паслухай, мая дарагая, як яны к табе гавораць,
Аж жаль бярэ, а ты маўчыш.
Мамачка мая любая, ты заўсёды давала параду,
Як мы прыязджалі, а сягоння і не глядзіш на нас —
На дачушку, на сыночкаў і на ўнучкаў —
Так ужо загневалася.
Дарагая мамачка, прасці мне,
Можа, я калі зрабіла не так, як ты хацела.
Але ж, мне здаецца, ты ніколі не папракала мяне,
Што не паслухалася.
Выбачай, мамка, што не была з табой
У паследнія твае часіны і хвіліны.
Выбачай, мая галубка дарагая.
Я ж была ў цябе нядзелю назад.
Ты мне казала ехаць дамоў, я і паехала.
І сама сябе цяпер караю,
Што не была з табой.
Але я паслухала цябе і паехала.
Скажы, мая мамка, куды так убралася
І хто цябе так хораша ўбраў?
Сколькі я з табой ні гavару, ні прашу,
І сыны твае просяць і гавораць, і ўнукі,
А ты маўчыш і не глядзіш ні на каго.
Мамка мая любая, глянь хоць адным вочкам
На каго-небудзь з нас, ці скажы хоць слоўца.
Нам усім лягчэй будзе.
Маўчыш, пакрыўдзілася... Выбачай нам усім.
Што нам рабіць, мамка, далей?
Мы заўсёды слухалі твае парады,

А сёння ты нам не даеш.
Як мы паедзем без іх і як будзем праважаць цябе?
Нам было лягчэй, як мы праважалі татачку.
Ты нам усё радзілася,
А сягоння ўжо няма таткі і мамкі.
Я ж пісала пісьмы табе і заўсёды плакала,
Татку прасіла перадаць прывет,
Як пойдзеш на магілку яго.
Цяпер, мамачка мая любая, няма каму пісаць,
Няма ў мяне самых дарагіх радных — бацькі і маці.
Як цяжка думаць пра гэта.
Я ж думала, ты, мая мамка, так хораша прыбралася
І ў дарогу сабралася к сыночку свайму
Ілі к унуку — майму сыну.
Але ж гляджу — і сынкі прыехалі,
А ты ляжыш і ўсё маўчыш.
Браточкі мае, галубочкі мае,
Няўжо ж мы не будзем бачыць сваю мамку дарагую
І не будзем чуць яе галасочка.
А мамачка наша ўжо не будзе сярод нас,
Пойдзе ўжо назаўсёды ад нас
К свайму галубочку, міламу мужычочку.
Мамка, у памяці ты нашай
Будзеш заўсёды і ўсюды, як самая любімая,
Самая дарагая, самая красівая, самая бясцэнная.
Мамка мая мілая, галубка сівенькая,
Ты там убачыш татку.
Раскажы ты яму, як мы жывём,
Як шкадуем яго і цябе і дзякуем вам абоім,
Што выхавалі нас і ўнукаў
І памаглі выйсці на верную дарогу.
Ён з табой заўсёды клапаціўся пра ўсіх нас і казаў
«Дзеці, заўсёды і ўсюды будзьце людзьмі».
Дзякуем вам, мае дарагія, мамка і татка.
Мамачка мая дарагая, чаго ж маўчыш,
Чаму не гаворыш і не робіш нічога?
Столькі людзей сабралася, а хто іх частаваць будзе?
Ты ж, мая дарагая, ні адной мінуткі не маўчала
І не сядзела, усё рабіла.
А сягоння свае ручкі такія рабочыя зглажыла
І ўжо два дні ляжыш і нічога не робіш і не гаворыш.
Мы ж заўсёды прыязджалі да цябе ў водпуск
І нам так добра было.

Вы з таткам сустракалі нас і праважалі,
А сягоння ж нам прыходзіцца праважаць цябе,
Мая дарагая мамачка.
Склала свае ручкі рабочыя,
Colькі яны працавалі —
І пралі, і ткалі, і ўсё рабілі,
А сягоння не варушацца — такія халодныя.
Ты ж, мая мамка, холаду баялася, цёпла адзявалася,
А сягоння так па-летняму адзелася і ляжыш,
І не баішся, што холадна.
Няма ўжо татачкі, і сёння забірае мамачку,
І ўсё пуста, і не будзе куды ехаць, з кім гаварыць.
Дзякуй, мая дарагая,
Што навучыла ўсё рабіць
І як жыць. Дзякуй за ўсё.
Мамка мая дарагая, ты любіла сонейка,
А табе зрабілі домік без акон і дзвярэй,
Табе будзе цёмна.
Пaследнія мінуты расставання з маёй мамкай,
Пaследняя твая дарожка, а якая ж яна цяжкая,
Што не падняць нам.
Праважаем мы цябе пасделні раз у пасделнюю дарогу,
Страшную, што наша мамка не вароціцца да нас.
Усе твае суседачкі і радня сабраліся цябе праважаць.
Дзякую я ім ад сябе і ад цябе,
Што не забылі пра цябе і праважаюць
І мяне суцяшаюць, каб не плакаць.
А як жа не плакаць, калі не будзе ўжо ў нас
І мамкі і таткі — асталіся мы сіротамі.
Татачка наш мілы! Сустракай мамку і вядзі яе за руку,
Пакажы дарогі там.
Дарагі татачка і мамачка, дзякуем мы вам,
І дзеці, і ўнукі, за ўсё.
Да свідання, дарагія мама і тата, спіце спакойна!..

157. Мамка мая любая, куды ж ты сабралася?
У якую дарогу, ды ў такую страшную,
Што ніколі не будзем бачыць сваю дарагую мамачку.
Мамка мая мілая, ты давай вестачку нам.
Стань зязюлькаю ці салаўём,
Прыляці ў свой садок і заспявай,
То пачуем мы галасок сваёй мамкі дарагой.

Я, мая дарагая мамачка, усюды буду шукаць цябе,
Буду думаць, што ты едзеш да мяне аўтобусам,
Буду страчаць, але такога ж не будзе.
А мамачка мая ўжо не будзе сярод нас,
Пойдзе назаўсёды ад нас...
Даруй мне, мая дарагая, можа, што не па-твойму
было?
Даруй, мая галубка старэнькая, даруй мне.
Паследняя твая дарожка,
Колькі раз ты нас праводзіла і стаяла ля каліткі,
А сягоння мы цябе праводзім
У такую страшную дарогу, з якой ніхто не вярнуўся.
Дзякуй табе, дарагая, і да свідання!
Спі спакойна, мая мілая.
Татачка, сустракай мамку нашу, тваю жонку.
Яна прыйшла к табе, пакінула ўжэ нас...

158. А мамулька,
А зязюлька,
А ты ж адзавіся,
А ты ж адгукніся,
А мае ж ножкі,
А мае ж слядочкі
А пазарастаюць,
А пазаплываюць.
А мая мамка
Ставіла хатачку,
Аддзялілася,
Адлучылася.
Калі ж цябе ўстрачаць буду?
Калі ж табе варотцы адчыняць буду?
Калі ж буду браць вешачку,
Ды мясці табе сцежачку?
А мая мамачка,
А мая любая,
А маё сонейка
А закацілася
А за цёмную хмарачку.
А я ж цябе не ўвіджу,
А я ж цябе й не ўстрэчу.
А мая зязюлька,
Дзе ты будзеш кукаваць?
Дзе я буду мамку пазнаваць?

Мамулечка мая,
Прыйдзі ж ка мне хоць позненька,
Прыйдзі ж ка мне хоць раненька.
Узыдзі ты хоць месячкам,
Паявіся хоць зорачкай.
А мая мамачка,
А мая любая,
А ножкі адхадзілі,
Ручкі адрабілі.
А я ж цябе не ўвіджу,
А паследні дзянёчак,
Паследні вечарочак,
Мамулечка мая,
Зязюлечка мая...

159. Ах, мая мамачка,
Ах, мая родная,
А нашто нас пакінула?
А хто нас глядзець будзя,
А хто нас шкадаваць будзя,
А хто гэтых маленькіх купаць будзя,
Галовачкі памыці,
Галовачкі прыбраці?
А мая маманька,
А мая залаценька,
А я да цябе прыходзіла,
І ты да мяне.
А як цяпер будзем,
А як мы з табой разышліся,
А як мы будзем расхадзіцца?
Апошнія мінутачкі,
Апошнія гадзіначкі.
Ай, божа мой, божа мой,
А дзе ж пахіліцца,
А дзе раданьку ўзяці,
А ў каго папрасіці,
Ці ету раданьку купіці,
Ці яе пажычыці,
А памажыця ж мне.

160. Ах, матанька ты мая родная,
Матанька мая мілая!
Куды ж ты прыбралася, у якую дарожаньку?

Калі мне цябе дажыдаці?
А хто ж мне без цябе цяпер парадзеіць?
А з кім мне цяпер пагаварыці?
Паклонься там майму батаньку,
Няхай ён на мяне не забываіць,
Мая матанька родная!
Адкуль мне цябе паглядзеці?
Ці ты соўнійкам узыйдзеш?
Ці ты вутанькай праплывеш?
Ці ты птушачкай праляціш?
Не маю я надзеі, штоб я цябе ўвідзела.

161. Мамачка ж мілая,
Да куды ж ты ўбіраесса,
Да ў якую ж ты дарожку,
А калі ж ты ка мне прыйдзеш,
А кім жа ты мне накажаш?
Ці салавейкам-рабейкам?
А я ж цябе буду ждаць
Кажныя нядзелькі.

162. Пейце, ешце, людзі добрыя,
Успамінайце маю радзіцельніцу,
Ронную матушку!
Мой любімы брацец, салавеюшка!
Выйдзі на шырокую вулушку,
Пад касястая вакошачка,
Пад пярэдняй вугалочак,
Ці не стаіць мая радзіцельніца,
Ронная матушка?
Скажыце вы, добрыя людцы:
Чыю вы бяседушку бяседуеце,
Чыю вы пірушку піруеце,—
Ці не маёй радзіцельніцы,
Роннай матушкі?
Вы схадзіце, прывядзіце яе
У цёплую ізобушку:
Ці панравіцца ёй сміронная бяседушка
Нас, горкіх сіротушак?..

163. А мая ж ты мамулечка,
А мая ж ты кукулечка,
А куды ж ты сабралася?

А ў якую дарожачку,
А ў якую далінаку,
А ў якую дамінаку?
А ў дарожаньку далёкую,
А ў дарожаньку няезджаную.
Што ж без цябе мне рабіці?
А ў каго мне савета спрасіці?
А хто ж мне парадачку дасць?
А ты ж мяне жалела,
А ты ж мяне халіла,
А ты ж мяне любіла.
А мая ж ты мамачка,
А мая ж ты галубачка,
А як жа ты там будзеш жыць?
А ў цябе даміначка цёмная,
А ў цябе ж даміначка цяжкая,
А табе ж там цяжка будзе жыць.
А прыходзь ка мне, мая мамачка,
А давай мне парадачкі.
А раскажы мне свае навасці.
А божа ж мой, божа,
А што ж ты надзелаў,
А чаго ў мяне маю мамачку забраў?
А прашчай, мая мамачка,
А прашчай, мая мілая.
А мне ж няма жызні без цябе.
А людзечкі, а мілыя,
А прашчайцеся з маёй мамачкай.

164. Ой, мамачка мая родная,
На каго ж ты мяне пакінула?
Ой, шчо ж мне рабіці,
А за шчо ж мне брацісе,
У які мне куток стаці,
У які куточак ісці?
У каго ж мне радачкі пытаціся?
Ой, мамачка, мая родная,
Куды ты сабралася,
[У] якую дарогу нарадзілася?
У пясок цёмны і страшны?
Ой, мамачка, мая родная,
Як мне будзе цяжэнько без цябе.
Якую табе хатку пастроілі цесную,

Без аконачка, цёмную.
І нікога табе не відна будзе,
Ні дзяцінaчку, ні саседачку.
Ах, падскажы, як мне жыці без цябе.
Ой, мамачка мая родная,
Ох, куды цябе нясуць,
Ох, куды цябе вязуць.
Ой, якую табе ямачку выкапалі глыбокую.
Ты, мая мамачка, больш не прыйдзеш да мяне,
З гэтага страшнага пяску не пачую я твайго
дарагога галаска.
Ох, мамачка мая любая, не пакідай мяне.
А каб ты бачыла, сколька да цябе людак
сабралася.
О, людкі мае дарагія, прасцеце маю мамачку,
Можа, каго абідзела.
Прашчай, мамачка, мая дарагая.

165. Ах, мамачка, ах, галубачка,
На каго ты мяне пакідаеш?
А куды ж ты ад мяне ўцякаеш?
А сонейка свеціць, а птушачкі спяваюць,
А мая мамачка спіць, нікога не чуе і не бачыць.
Ах, мамачка, ах, галубачка,
А я твае ручкі адагрэю,
А я твае вочкі адкрыю,
Толькі ўстань, паглядзі на сваіх дзетак.
А мы ўжэ другі дзень галодныя, халодныя.
А чаму ж ты не чуеш?
А чаму ж ты не бачыш?
А хто мяне пашкадуе?
А хто мяне пашануе?
Ах, мамачка, ах, міленька!
Ці ж я цябе больш не ўбачу,
Ці ж я цябе больш не ўчую?
А твае вочкі закрытыя,
А твае ручкі халодныя.
Людцы мае мілыя, людцы мае родныя,
А ўсе плачце, крычэце,
А маю мамачку разбудзеце.
А мне без мамачкі не жыць,
А што я без яе буду рабіць?
Ах, мая мамачка, ах, маё сонейка!

Чаму ж ты мне так мала свяціла,
Чаму ж ты мяне так мала грэла?
Брацікі мае, сястрычкі,
А вы ўжэ сірацінкі.
А што мы без мамачкі будзем рабіць?
А як мы без яе будзем жыць?
Ах, мамачка, устань!
Ах, родненька, устань!
А на вуліцы сонейка зямельку абаграе.
А чаму ж ты нас не абагрэеш?
А чаму ж ты нас не прытуліш?
А мы яшчэ малыя, а мы яшчэ дурныя,
А як нам далей жыць?
А што нам далей рабіць?
Ах, мамачка, ах, міленька!
А я тваё вочкі цалую!
А я тваё ручкі цалую!
А вочкі не адкрываюцца!
А ручкі не разнімаюцца!
А яны і шылі, і мылі,
А яны і нас галубілі.
А цяпер ляжаць, не варушацца.
Ах вы, мае ножанькі,
Ах вы, мае харошанькія.
Як мала вы хадзілі,
А цяпер не туды ідзяце.
Ах, мамачка, ах, галубачка!
А куды ты ад нас сабралася,
А куды ты ад нас направілася?
А паглядзі на сваіх дзетак,
А яны плачуць, заліваюцца.
А больш цябе мы, мамачка, не дачакаемся.
Ах, мамачка, ах, галубачка!
А куды цябе ложаць?
А там табе будзе цёмненька,
А там табе будзе халодненька,
А тут і сонейка свеціць, а тут і птушачкі спяваюць.
А мая мамачка ляжыць і не чуе.
Вельмі моцна яна на нас загнявілася.
Мамачка мілая, кветачка ясная!
Чаму ж ты так скора перацвіла,
Чаму ж ты ад нас так скора адышла?

А мы не ўспелі наглядзецца,
А мы не ўспелі нацалавацца.
А больш ніхто нас не пашкадуе,
А ўсе з нас будуць насміхацца,
А не будзе каму за нас заступіцца,
Бо наша мамачка нас не чуе і не бачыць,
Як яе дзетачкі крычаць і плачуць,
Як яны галосяць.
Ах, не закрывайце маёй мамачкі,
Ах, не закрывайце мае галубачкі.
Дайце пасле́дні разок на яе наўглядацца,
Дайце пасле́дні разок нацалавацца,
Бо больш не ўбачу я маёй мамачкі,
Бо больш не ўбачу я сваёй кветачкі.
Перацвіла наша кветачка, асыпалася
І ад нас усіх закрылася.
Закрылася мая галубачка,
Сабралася ў далёкую дарожаньку.
Ой, бярэце, людцы, маю мамачку,
Ой, бярэце ды асцярожненька.
А хай яна ў сваю дарожаньку ціхенька зайдзе,
Бо яна не чуе і не бачыць нас.
Ах, мамачка, ах, пташачка,
А чаго ж ты ад нас паляцела?
А я мала-мала да цябе тулілася,
А я мала-мала з табой мілавалася.
Ах, пясочак, ах, жаўценькі,
Ах, расступіся, ах, разыдзіся,
Адкрый маю мамачку, адкрый маю зорачку.
А мне так цяжанька
І няма ў каго савету спытаць,
А мамачка спіць і не хоча нічога сказаць.
А ці ты чуеш, мамачка, як я тут гарую?
А ці бачыш ты, мамачка, як я тут бядую?
Ах, загневалася мая вішанька,
Не захацела больш расці-цвісці,
Схавалася ў домік маленькі,
Накрылася пясочкам жаўценькім.
А калі ты, мамачка, устанеш?
А калі ты на нас глянеш,
Як жывуць твае сірацінкі,
Як яны тут гаруюць, як яны тут бядуюць,

Як ім цяжанька без цябе жывецца,
Як ім няма да каго прытуліцца.

166. Ой, мамка мая,
Ой, залатая,
Да ты ж ад нас улятаеш.
Да усе птушачкі папрылятаюць,
А ты, мамка, уляцела на чужыначку.
Ой, мамка мілая,
Папрасі бога, кабы нас не абіжаў.
Ох, мамка мілая,
Твае слядочкі пазарастаюць,
За мохам не будам відзець.
Ох, мамка, папрасі сваіх сыноў,
Кабы мяне не абіжалі.
Ох, мамка мілая,
Ты ж у нас добра была,
Да што ж ты раненька памерла?
Ой, мамка мілая,
Паследня часіна,
Паследня мінютка ты у нас.
Ох, мамка, да не ўлятай да,
Ох, мамка мілая,
Не ўхадзі ад нас,
Бо нам будзець скучненька без вас.
Ой, мамка, не ўлятай,
Кажыннаму парадак давай.

167. Ах, мая мамачка мілая,
А ўжо ўсе госцейкі вярнуліся,
Усе сусядочкі прыйшлі,
Толькі ты, мамачка, там засталася.
А сонейка ясна-ясна свеціць,
Толькі мне сёння цёмненька,
Цёмненька дый балюча:
Апошні разок мамачку бачыла,
А савету ніякага не дала,
Славечка ніводнага не сказала...

168. Пращчай, пращчай, мая мамачка,
Пращчай, пращчай, мой папачка,
Большэй ужо мы вас не ўвідзім,
Большэй ужо мы к вам не прыйдзім.

А дарожачка ж ваша дужа плахая,
А дамовачка ж ваша цёмная,
А ножачкі вашы дужа ўсім пасвіваныя,
Жоўтыя пясочкі ў глазачкі зацяклі,
Грабовы дошкі сціснулі ножкі,
Сырая зямля грудзі залягла.
Змянялі вы сваю дамовачку
Ай на гэткаю цёмнаю,
А на гэткаю нехарошаю,
А там жа й была ў нас відненька,
А там жа й была ў нас чысцінька,
Хто ж вас сюды падгаварыў,
Хто ж вас сюды падманіў,
А мае ж вы родныя,
А мае ж вы мілыя.

169. Узнімiцеся, буйныя вецярочкі,
Развейцеся, жоўтыя пясочкі,
Прыляці, мая мамка-радзіцелка!
З якой старонкі цябе дажыдаць?
У якое вакенца паглядаць?
Адкуль цябе пераймаць?
З кім жа я буду гаварыць?
Хто мяне цяпер будзіць вучыць?
А ты ж са мной гаварыла
І мяне ж ты вучыла.
А цяпер жа ніхто
Шчырага слоўца не скажыць,
Ніхто не прыгалубіць, не пажалеіць.
Устань, устань, мая радзіцелка,
На каго ж ты дачушку пакінула?
Маткай роднай будзе для мяне
Ночка цёмная ды халодная,
Жыццё беднае і галоднае.
Разнясіце, вецярочкі,
Маю пячаль па мамачцы,
Падніміце радзіцелку
З зямелькі сырой цяжанькай.
Разнясіце досачкі сасновыя,
Развяжыце ручкі яе белыя,
Адкрыйце вочкі яе ясныя,
Вярніце мне маю мамачку!

170. Мамачка мая любенькая,
Нашто ж ты мяне на горачка кінула?
А я жа ўсё ўрэмечка мучуся,
А дакуль жа я буду мучыцца?
А куды ж мне цяпер кінуцца,
А ў якую ж мне дарожку,
А з якой жа я цябе дарожачкі цяпер буду ждаць?
А табе ж дарожачка адна,
А мне ж дарожачак многа.

171. А мая ты мамка мая,
З чым жа ты мяне пакінула,
А як я жыць буду?
А чаго ж ты мне не раскажаш,
Дзе мне падзецца, да каго прыхінуцца,
Каму я гора раскажу?
Каго я пытацца буду,
А хто ж мне парадзіць усё,
А да каго ж мае дзеткі будуць хадзіць,
А каго ж яны сустракаць будуць?
А цябе ўжо няма,
А ты ўжо ў зямліцы ляжыш,
А я ж цябе бачыць не буду.
Мая ты мамка мая,
Мая дарагая мая,
А дзе ж ты тутака асталася адна
У гэтых кусціках,
У гэтай лазе вялікай?
А мы будзем да цябе хадзіць,
Табе кветачкі насіць,
А ты ж будзеш спамінаць нас,
А ты кветачкі любіла,
А цяпер ты іх не бачыш.

172. А мая ж ты матухно! А на каго ж ты мяне пакінула?
А хто ж мяне гадаваці будзе?

## ПА МУЖУ

173. А дубочак ты мой зялёненькі,
А бярозка мая кудравая,
А ці ветры ж цябе падвеялі,
А ці буры цябе падламілі?
А супружачык мой міленькі,
А куды ж ты гэта прыбраўся,
А нашто ж ты мяне пакінуў?
А к каму ж я цяпер прыхінуся:
Няма ж у мяне нікога раднога!
Буду я хадзіць, як заблудная авечка ў лесі,
Так я без свайго дружочка буду жыць!..

174. А мой жа ты родненькі,
А мой жа, ты міленькі!
А куды ж ты сабраўся ад нас?
Сабраўся ты ў дальнюю дарожку
І не вернешся ўжо к нам!
А на каго ж ты нас кінуў адных?
А хто будзе маіх дзетачак гадаваць,
А хто будзе ім хлебца дабываць?
А ёсць жа ў нас скацінка,
А хто яе дагаядаць будзе?
А ёсць у нас пальцо,
А хто ж яго нам пахаць будзе?
А хто ж цяперака будзе рана ўставаць
Да нам работу заказаваць?

175. Мой гаспадарык, мой галубчык,
Нашто ты мяне пакінуў,
Нашто ты мяне разарыў?
Каму ж ты хадзяйства сваё адказаў?
Каму з дробнымі дзецьмі мяне прыказаў?
Як жа мне з дробнымі дзеткамі

Цяпер пражыць?
Як жа ж мне іх
Цяпер гадаваць?..

176. А мой жа ты гаспадарочак,
А як жа ты мяне пакідаеш,
А з дробнымі дзетачкамі?
А хто ж ім будзе загадаваць,
А хто ж іх пажалее,
Вуму-розуму навуча?
А не к каму ж ім будзя
Галовачкі прыхінуці!..
А ў вялікаю ж ты дарогу сабраўся,
Да ты ж ужо адтуля не вернешся.
А ці табе ж надаела ўжо
На етым свеце?..
І выбраў жа ты сабе
Хатачку дужа цёмную,
Няма ж у ёй ні ваконца, ні дзвярэй!..

177. Падружынька мой міленькі,
Як жа мне жыць цяпер без цябе,
Як без цябе пуць мне нахадзіць і толк,
Што дзянёк прыйдзіць, усё буду думаць,
Які мне сянні толк нахадзіць?
Лепей бы ты мяне пахаваў,
Чым мне без цябе аставаціся!
Я ж за табой пакрасавалася,
А цяпер жа я гора нацярплюся!
А каму ж ты сваіх дзетачак
Дробных, неразумных пераказуеш?
А хто ж іх да толку, да розуму давадзіць
будзець?
Цяпер жа яны горкімі сіротачкамі астаюцца,
Усякі жа іх абіджаць будзець...

178. А куды ж мне пайсці,
А куды ж падацца?
Няма жыццейка без цябе, мой любенькі.
Кругом пусценька і сухенька.
Ці памерці, ці дзетак глядзеці?
А як жа адной углядзеці,
А мой родненькі, мой харошанькі!..

179. Да як жа мне дробных дзетушак етых пітаці? Прыляці ты сюды к нам птушачкай аліба какушачкай!.. Верна, дужа далеча ты, мой гаспадарок, да не слышыш, галубчык, да майго горкага горушка, да й бальшой маёй кручыны!.. Ну, ды к катораму беражку мне галовушку сваю прыхінуці? Ну, какую ж ты думушку мне загадаў: да й у скорае ўрэмечка ад мяне адлятаў?! Гаспадарочак ты мой, галубочак, прыляці жа ты за дзеткамі за дробнымі, да за малымі несмыслёнымі: а іх жа цяпер, мой гаспадарочак, налюкаюцца дый натукаюцца і сабакі, і тыя накусаюцца,— па міру ходзя, прымуць жа яны холаду да і голаду, да і голы будуць і галодненькі.

Ніхто ж маіх дзетушак не відзіць, як яны маленькі, як іх васпітаць!.. Да вон, вон усе суседушкі гавораць: «Вон, распуснікі, безбацькавічы! Да ім ужо што, етым дзіцём: лі галавы адкруціць, лі жалудкі выгнісць — ане да самавольнікі: усю моркву пацягалі і агурцы памялі!..»

180. А ты мой хазяін,
А ты ж мне кінуў горачка,
Маленькіх дзетачак,
А яны ж маленькія,
А мне ж іх нада накарміць,
А мне ж іх нада надзеці,
А іх жа нада наўчыць.
А каго ж ты кінуў у горачка?
А я ж нядужая,
А я ж хворанькая,
А ты ж мне кінуў у горачка.
А я ж не ведаю,
А як жа мне дальша жыць,
Як жа я буду іх васпітаваць,
А мне ж іх нада пусціць на людцы.

181. А мой да ты сакалочак!
Хай бы ты іх гадаваў... Хай бы ты з імі гараваў...

182. Мае міленькі,
Мой саколіку,
Мой ты орліку,
Мой ты харошанькі,
Дзе ж ты дзеўся?
Што ты да мяне ўжэ й не прыехаў,

Сваёй галовайкі й не прынёс?
Ты свае й дзетайкі aставіў,
На ўсю сваю жызню,
І мяне й няшчаснаю.
Ох, доленька,
Галованька няшчасная.

183. Ой, мой жа ж ты мой міленькі, да куды ж ты ад мяне адлучыўся? Ды засталіся дзеткі ўсе маленькія... Ой, да з кім жа я цяпер буду жыці? Да з кім жа я буду гаварыці? Да тваіх дзетак усе будуць біці, бо няма ў іх заступы, бо яны сіроты.

184. А мой жа ты галубочак,
А з кім жа ты мяне пакінуў,
З дробнымі дзеткамі?
Як мне з імі пражыць цяпер,
Хто мне пасобіць гадаваць іх,
К каму мне сваю галовушку прыхінуць?
Многа найдзецца і бацек і матак
Пабіць і пажурыць,
А к пуцю прывесці будзець некаму!
Не хацеў ты сам
Сваіх дзетак жалець, расціць,
Чужыя бацькі-маткі жалеюць,
Да з тваёй халупінкі
Будуць вонкі гнаць!
А цяпер твае ручкі-ножанькі
Ляжаць спакойненька:
І нараборталісь, і нахадзіліся!..

185. А хазяін мой даражэнькі,
А хто ж са мной трудзіцеся цяпер будзець,
А хто ж памагаць будзець?
Заранне твае ножанькі падламіліся,
Заранне твае ручанькі сашчапіліся.
А з кім жа ты мяне пакінуў?
А з кім жа я дзетак дробненькіх
Гадаваць буду?
А яны ж яшчэ маленькія,
Яны ж будуць сіротачкі,
Яны ж будуць, як авечкі, заблудныя,
Не к каму ім будзець прыхінуцца.

Сіротачкі, мае дзетачкі,
А міленькі мой Ванечка,
А як жа я цяпер адна жыць буду?
Папрашусь я цябе харашэнечка,
Вазьмі ж ты мяне к сабе...

186. Ох ты, мой гаспадарочак, мой! Што ж ты гэта ўздумаў? Каму ж ты гэта сваё хазяйства павяраеш, на каго ж ты сваіх дробных дзетушак выстаўляеш: ці на атца свайго, ці на мацер астаўляеш? Агарчыў ты сваіх дзетушак да крайнасці: верна, яны госпаду праграшылі, будуць жа яны, галодныя і халодныя — некаму іх будзіць наставіці к добраму парадку, не к каму ім сваёй галовушкі прыхінуць!.. Ні з воднай старонушкі цёплы ветрычак не вееиь. Ачніся ж ты, мой татухна, ачніся, карміле<u>ц</u>, пакажы ж ты нам парадак: як нам на белым свеце пражыці,— а мы яшчэ не ўзрашчоны і к парадку не прывядзёны!..

187. Федырка ты мой, а што ж ты, супраці цёплага леиечка, што ж ты нам думушку задумаў? Як нам без цябе ўгадываць?

А гэтыя думушкі я не раздумаю, не разгадаю. Сокал ты наш ясны, сокал ты наш мілы, куды ж ты далёка ад нас адлятаеш, па каторай дарожухны нам цябе сустракаці, з каторага боку цябе дажыдаці?

Не ўмелі мы госпада бога маліць і прасіць аб тваім здароўіку, прагнявілі мы госпада бога, а прагнявілі.

Як ты, Федырка, з дробнымі дзеткамі нас пакінуў? Як жа мне з імі ўгадываць? К катораму нам цяпер углушку прыхінуцца? А іх жа таперычка будзіць усюдах многа і давольна. Як жа нас чужэя бацюшкі будуць на работу пасылаць і з работушкі дажыдаць? Адкуль жа ў нас, Федырка, цёплы ветрык павееиь? З каторай старонушкі і жаркае соўнышка прыгрэіць? Нет жа ў нас ні дзядзюшкі роднага. Чужыя дзетушкі празднічка дажыдаюцца, яны празднічку радуюцца — ім к празднічку лапаткі плятуць і аборачкі ўюць; мы празднічка дажжомся — слёзкамі абаллёмся: нам і празднічкі не радасны, не веселы.

Зацеяў ты нас, Федырка, па чужых горынках хадзіць, па чужых углушках сланяцца, усякаму наравіць і гадзіць. А мы ж то з свайго углушку павышлі, слова птушачкі павылецелі!

Зацеяў ты нас, Федырка, век гаравацъ, чужыя углушкі шчытаць.

Мы куды не йдзём, не едзем, усюдах гаруем, нідзе мы свайго бацюшкі радзімага не найдзём — зацеяў нас век гаравацъ!

А ты ж то казаў: «Я вас не пакіну, не забуду — я буду за вас госпада маліць і прасіць!»

Знаць, Федырка, не твая воля — самаго госпада бога.

Надзеждушка наша верная, надзеждушка наша мілая, як жа нам без цябе быці, як жа нам без цябе жыці?

Мы ж то без цябе ўсе дзянёчкі і ўсе часочкі пералічылі. Нідзе нам прыюту нетуці: ні ў ізбі, ні на дварэ! Нас, слова перапёлачак, з таго боку і з другога заганяюць: мы і там месца занялі, і там.

Як выйдзем за двор, гаруем, гаруем; какуем, какуем,— слова пташачкі, цябе дажыдаем. Скінься ты, Федырка, сізым галубочкам, прыляці ты к нам хоць на 'дну мінутачку, на 'дну часіначку, разгадай ты, Федырка, наша горушка вялікае!

Па каторай нам дарожухны ісці, з каторай старонушкі нам цябе дажыдаць? Зацеяў ты нас няшчаснымі навек!..

А твае ж, дзетушкі па полю ходзюць, яны ўсё какуюць,— слова какушачкі какуюць, яны свайго бацюшку клічуць:

— «Нет нам ад бацюшкі ні зрады, ні пувады!.. Бацюшка мой радзімы, бацюшка наш мілы, як мы ні гаравалі, як мы ні кукувалі, мы ў сваём углушку былі — усё нам была радасней, весялей, а тапер мы, як птушкі, разляцелісь па разным па гнёздышкам па чужым!..»

188. А бацечка, ародненькі,
Ты ад нас ад'ехаў.
Калі ж мы ўвідзімся?
Ці ж ты нашага горачка не чуеш,
Што мы бедныя гаруем,
Што мы бедныя працуем...
Я ўжо старэнькая,
Сілы не маю,
Няма каму мяне замяніці,
Няма каму памагаці.
А чаму ж ты надумаўся
Так нам зрабіці —
Так нас пакідаці?

Так далёка ты ад'ехаў,
Ні да цябе пісьмачкі,
Ні да цябе лісточкі.
Цябе дачакаць не можна,
Калі ж ты да нас прыедзеш,
Калі ж ты мяне забярэш там.
Хацела б я за цябе пайсці,
Хацела б я з табой жыці,
Калі ж ты надойдзеш,
Калі мяне забіраць будзеш?
А мой бацечка, а мой родненькі.

189. А гаспадарык мой,
А верны мой,
А на каго ж ты мяне пакінуў?
А хто ж мне дзеткі будзе гадаваць,
А хто ж мне будзе іх ладаваць?
Ой, а ішімуць жа людзі касіць,
А адкуль жа я цябе ждацьму,
А ці ты ішімеш із лесу,
А ці ты ж адкуль?
А нідзе ж я цябе не ўчую,
А нідзе ж я цябе не ўгледжу.
Ой, а гаспадарык мой верны,
А гаспадарык мой любы!

190. А мой Ляксейка,
А што ж ты мне зрабіў,
Нашто ж ты мяне з малым дзіцем кінуў?
Што ж я буду рабіці,
Як я буду адна жыці,
А як я буду сыночка расціці,
Што мне гэтак цяжанька,
А мне гэтак трудненька.
Хай бы ты мне яго падгадаваў!
Я ж не падумала,
Што ты ад нас уцячэш,
Што ты нас адных пакінеш.
А ты ж ад нас з'ехаў,
Хоць бы ты ў нас памёр,
Хоць бы мы тваю магілачку зналі,
Хоць бы мы табе цвяточкі саджалі.
А ты ж у сваю родзінку з'ехаў...

191. Хазяінка мой любенькі,
А што жа ты мяне кінуў адну,
Да пяцера дзяцей аставіў.
А што я цяпер буду дзелаць,
А як жа мне расціці,
А як мне гадаваці?

192. А мой ты Язэпка,
А што ж ты мне нарабіў?!
А з кім я буду поле абсяваць,
З кім буду малых дзетак гадаваць?
Мае палоскі, як мне вас убіраць,
Як вас засяваць?
А памажыце мне, палоскі,
Дробных дзетак гадаваць.
А мая Галечка, а мая дачушка,
Ты ж не будзеш знаць,
Што ў цябе татка быў.
А ты ж яшчэ засталася маленькая,
Ты ж за ўсіх горшая бясчасніца.
Мае дзетачкі, мае дробныя,
Што я з вамі рабіць буду?
А ты ж мне ўсё казаў,
Што будзем старацца гадаваць,
А яны ж усе нашы.
А цяпер ты мяне аставіў
З гэтакімі маленькімі.
А мой ты Язэпка,
А папрасі ты сваіх суседцаў,
Каб яны мяне не астаўлялі,
Каб што памагалі, мае палоскі ўбіраць.
Мае дзеткі будуць абіджаны,
Ва ўсіх будуць таткі.
Што ж я зраблю з імі, маленькімі?!
Мой Пётрачка, ты ж у мяне самы большы,
Ты ж у мяне самы гаротнейшы.
Табе ж будзе горачка большае за ўсіх.
А ты ж яшчэ маладзенькі,
Ты ж яшчэ нядужанькі,
Цябе ж плужок будзе валяць.
Мой ты Язэпка, я ж цябе прасіла:
Ты ж вучы сынка, каб ён рабіць умеў.
А ты ж мне казаў, што яшчэ рана,

Што яны маленькія.
А цяпер уся цяжбачка
Узвалілася на яго плечы.
А мае дзетачкі, а мае маленькія,
Вы ж пасследні дзянёк відзіце свайго татку.
Вы ж, маленькія, будзеце яго дажыдаць,
У ваконца наглядаць, што татка прыходзіць.
Вы ж маленькія, вы ж не знаеце,
Што татка пойдзе ад нас назаўсёды.
А мой Петрачка ў мяне самы большы,
Ён будзіць самы гаратнейшы.
А мае палоскі...
Ён жа яшчэ маладзенькі, ён жа яшчэ
нядужанькі.
А мае палосачкі...
Яго ж плужок будзе яшчэ валяць.
Мае дзетачкі, мае дробныя,
Што ж я буду рабіць з вамі?
Вы будзеце дробныя слёзкі ліць,
Будзеце горкія слёзкі глытаць,
А я буду з вамі гаварыць.

193. А мой Антонька,
Асірацію ты свайго сыночка
І мяне, маладую.
А мой Віцечка,
А маё дзетачка,
Як табой татка цешыўся!
А ты яго не будзеш помніць,
А ты ж не будзеш знаць,
Што ён у цябе быў.
У дзетак будуць таткі,
А ты ж будзеш пытацца:
«А дзе ж мой татачка?»

194. Чаму ж мы такія няшчасныя?
А ты ж ніколі не жаліўся.
А я ж цябе ждала,
Што ты мне паможаш
Дзетак гадаваць.
А мы ж з табой жылі,
Мы ж ніколі не паспорылі.
А я ніколі не думала,

Што ты мяне пакінеш,
Мой ты Ігнаська.
Божа мой, божа,
Чаму наша радзінка змёрла?

195. А мой Мікалайка,
Ты ж казаў,
Што будзем дзетак гадаваць.
Ты ж яблынькі ім садзіў,
А сам яблычкаў не дачакаўся.
Як прыйдзе восень,
Я дзеткам яблычка сашчаплю,
Пра іх татку раскажу.
А мой Мікалайка,
Жоўценькім пясочкам
Засыпяць табе вочкі,
Як ты на дзетак глянеш,
Як ты пацешышся?!

196. А мой ты Міхалка,
Як жа ты так мог мяне пакінуць?
У нас жа малыя дзеткі,
Што ж я буду з імі рабіць?
Я ж пайду ў чыстае поле,
Я ж буду цябе гукаць на раздоллі,
Я ж буду слухаць,
Як над тваёй магілачкай
Старыя бярозы шумяць.
Я ж буду хадзіць і прасіць,
Каб дожджыкі палілі
І зямельку размылі,
Каб перуны труначку
Тваю разбілі,
Каб соўнейка ажывіла.

197. А мой міленькі, а мой любенькі,
А нашто ж ты мяне пакінуў?
Шчо ж я буду з гэтымі дзеткамі рабіці?
А хто іх будзе гадаваці?
Нашто ж ты мяне ў такіх дзецях пакінуў?
А дзе ж я буду цябе выглядаці?
А хто ж мне будзе так рабіці?
А то ж цяпер куды пайду,

А то ж цяпер куды паеду?
А мой Ляксандэрка, а мой міленькі,
А скуль я цябе буду выглядаці?..

198. Ах ты, мой Васілька,
Ах, мой галубок.
Куды ж ты ляцеці сабраўся
Зімою халоднаю?
На каго ж ты дзетачак пакідаеш?
Хто ж іх устрачаці будзе?
У школку выпраўляці будзе?
Якому ж суседчыку ты наказ даваў,
Каб тваіх сіротачак даглядаў?

199. А мой міленькі, сокал ясненькі,
А ты ж памёр, памёр,
Аставіў дзетачак,
А сваіх дзетачак, малалетачак.
А ты ж ляжыш цяпер
Ды і не думаеш,
А як далей нам жыць.
А я ж падумаю — душа баліць.
Я ж паеду ў лес ды па дровачкі,
А находзішся — забаляць ножачкі.
А мой работнічак,
А мой гаротнічак,
А як жа цяпер жыць нам?
А каму ж я дзетачак аддам?
А як я адзяваць буду?
А як карміць мне іх?
А як далей нам жыць?
Хіба, як набяжыць?

200. А мой Віктарка,
А мой даражэнькі,
А мой добранькі,
А нашто ты мяне пакінуў
З малымі дзеткамі?
А што я рабіць буду?
А я ж з голаду памру
Ды з малымі дзеткамі.
І мяне вазьмі з сабой,
Каб я не гаравала,
Каб я з голаду з дзеткамі не ўмірала.

201. Хазяінка дарагенькі,
А хто ж будзе цяпер сена касіць?
А хто ж будзе цяпер поле араць?
А ці ведаеш, што кінуў на гора мяне?
Гумно раскрыта, нейдзя малаціці.
Мой татка дарагі,
І вароты паламаліся,
Некаму ж будзе строіць, мой хазяінка.
Чужыя ж хазяінкі будуць браць за коскі,
А я ж за слёзкі.
А як жа мне на свеце жыць,
Як жа дзяцей гадаваць.
А ў мяне ж сямёра дзетак
І ўсе ж малыя.
Усе малыя, не бяруцца за цэп,
А бяруцца за хлеб.
Хазяінка ж мой даражэнькі,
Як жа мне дзетак гадаваць,
Мой дарагі, мой мілы.
А чужыя хазяіны будуць брацца за сошкі
А я за слёзкі.
Пращчай, пращчай, хазяінка.

202. А як я буду жыці?
А хто будзе памагаці?
Мае дзеці малыя,
А чаму ж ты пакінуў свае птушаняткі?
А хто ж ім будзе за татулечку?
А хто ж будзе іх карміці, расціці?

203. А мой ты хазяін, а мой ты кармілец,
Чаго ж ты ляжыш, не падымаешся?
Можа, ты не чуеш, як я спяваю?
Можа, ты не бачыш, як я гарую?
Устань хоць на часок, на мінутачку,
Паглядзі на сваіх дзетак маленькіх.
На каго ж ты пакінуў нас,
На каго, бедных.
Ці ж табе хата была малая,
Ці ж не глядзела цябе я?
Чаго так хутка ты сабраўся ў дарогу?
Чаго ж перайшоў у такую хатку?
Хатку цёмную, дзе няма ні акенца, ні дзвярэй.

204. А мой гаспадарку! А скуль я спосаб знайду! Ужэ ты цяперыка на месцы аднаму богу служыш, а я, бедная, сірата асталася, што нічога не маю, ані каня, ані вала, толька адна сабою і дзетак двое... Як я цяпер буду жыці, я бяздольная, я бязшчасная!.. А расступіся, сіняе возера! А, залей мяне з дзеткамі малымі! Бо я цяперака бедная, нічога не маю; а ты быў у мяне добры гаспадар: я за табою піла і ела і харашо хадзіла... А божа мой ласкавенькі!..

205. Мая буйная галовушка!
Как я буду жыць з малым мілым дзетушкам?
Хто ім будзець кармілец, радной бацюшка?
Адкуль павеюць ветры на іх цёплыя?
Не павеюць на іх ветры цёплыя,
А павеюць ўсё халодныя.
Не будзець у вас, уміленныя дзетушкі,
Вашага кармільца, роднага бацюшкі,
Астанецца ў вас толькі родная матушка.
Цяпер не скажаць мне ніхто шчырай праўдушкі.
Пастаўлю ўміленых дзетушак
На ўсіх старонушках,
Сама выйду на крутую горушку,
Буду глядзець на красна соўнышка,
Адкуль павеюць ветры цёплыя,
Абагрэюць маіх уміленых дзетушак.
Как мае дзетушкі ўлажываюць
Чужому не роднаму бацюшке,
Чужой не роднай матушке.
Веюць ветры, ідуць дождж ы халодныя
На маіх дзетушак-сіротушак,
Майму сярдзечушку тошненька...

206. А мой ты галубчык!
З кім ты мяне пакідаеш
Проціў лецечка проціў цёплага,
Проціў праздьнічка гадавога,
З дробнымі дзеткамі?
А людзі будуць у полі работаць,
А мае дзеткі будуць плакаць і татульку гукаць.

207. А мой ты галубчык!
Куды ты выражаешся: чы ў дарогу, чы ў лес,
А людзі будуць зарабатываць,

А дзеткі твае будуць з голаду паміраць,
Адкуль жа цябе дажыдаць?
Чы з лесу, чы ты на ярманку паедзеш?
Галубчык жа ты мой!
А з кім ты пакідаеш сваіх дзетак?
А хто пра іх будзіць клапатаць,
А хто ім будзіць старанне даваць?
А мой ты галубчык!
Не захацеў ты ў етай хаце жыць,
А твая хата будзіць цёмная і безваконная.

208. А мой ты міленькі!
Нашто ты, гаспадарочак, мяне пакінуў?
Цяпер я асталася з дробнымі дзеткамі,
Усякі нада мной надругаецца.
А як ты жыў быў, то клопат мой не ўвесь быў.
Дружочак ты мой міленькі!
Здрадзіў жа ты мяне з малым дзіцятачкам,
Ідзе мне цяпер месцічка абабраць з малым дзіцятачкам?
Здзелаў жа ты мне дасадачку вялікую.

209. А мой жа ты гаспадарочак!
Чаго ж ты на мяне рассердзіўся,
Што ты мяне, горкую, бяздольную, пакідаеш?
Скажы ж ты мне, мой гаспадарочак,
Як мне жыць і быць,
Куды ж мне сваю галовачку прыхінуць?
А я цяпер горкая і бяздольная,
Каму ж ты, мой галубчык сізенькі,
Сваіх дзетачак пакідаеш?
Яны ж яшчэ маленькія, несмышлёненькія.
А хто ж нашых дзетачак прыгалубіць і прыглядзіць?
Дзетачкі мае маленькія, сіротачкі мае дробненькія!
А няма ж жа вашага татачкі, а няма ж вашага родненькага!
А нагаруюцца ж мае дзетачкі!
А цяперыцька вам усе і наб'юцца, і наругаюцца
Да некаму за вас заступіцца,
Цяпер жа то ўжо маіх дзетачак усюдых будзець поўна,
І па заўголлю і па падстрэшшу,
А дзетачкі мае і любыя мае, і мілыя.

210. Куды ж ты ета, мой гаспадарочак, проця зімы
выбіраўся?
А хто ж то нам, мой гаспадарочак, дроў прывязець
із лесу?
А цяпер жа то памерзнуць мае дзетачкі ў хаце,
А некаму ж маіх дзетачак прыглядзець.

211. Мой ты гаспадарочак!
А каму ж ты пакінуў дзетачак?
Яны дужа маленькія.
А хто ж іх будзець даглядаць?
А ты ж, бывала, куды пойдзеш,
Яны ж цябе на вуліцы пільнуюць:
Адно сядзіць пад ізгародай,
Другое — пад замётам,
І яны ж цябе даждуцца.
А цяпер ніколі не даждуцца,
І дамой ніколі цябе не прывядуць.

212. Дружочак жа мой, галубочак,
А куды ж ты выражаешся,
А з кім жа ты мяне пакідаеш?
А ў мяне ж дзетачкі дробненькія.
А каго ж ты абабраў сваім дзеткам за роднага
татулічку?
А яны ж цяпер вечныя сіротачкі,
А яны ж будуць на вуліцы гуляць,
Яны ж будуць к чужым таткам прызнавацца,
А будуць мужчынкі на вуліцы іці
І дзетак на руках нясці,
А мае ж дзеткі будуць на вуліцы стаяць
І таткі дажыдаць.
А я буду пазіраць і слёзкамі абліваецца,
Іхны татулька не прыйдзець і не возьмець іх.

213. Гаспадарочак ты мой!
Што ж ты гэта сабе здумаў,
Што ж гэта сабе змысліў,
З кім ты мяне пакідаеш — з дробнымі
дзеткамі?
А яны яшчэ няўзрослыя, а яны яшчэ маленькія.
Гаспадарочак мой міленькі,
Гаспадарочак мой любенькі!

Куда ж ты гэта прыбраўся,
У якую дарожаньку?
Адкуль я цябе паглядаць буду?
Адкуль я цябе пазіраць буду?
Галубчык мой сызенькі!
Далёка ты ад мяне адлятаеш,
А мяне з дзеткамі пакідаеш,
Яны ж яшчэ не ў розуме,
Хто ж ім работку пакажаць,
Хто ж ім загадаець без цябе, мой галубчык,
Без цябе, мой сызенькі?
Ці я ж гэтага спадзявалася,
Ці я ж гэтага надзеялася,
Што ты мне гэта зробіш,
Пакінеш мяне ўдавою,
А дзетак сіроткамі.
Я ж усё думала,
Што мы гора пагаруем,
Што гора паменшаець,
Аж яно пабольшала,
Галубчык мой любенькі!
З кім я дзетак гадаваці буду,
З кім работку прыбіраць буду
Без цябе, работнічка,
Без цябе, стараннічка?
Ты ж, бывала, аба ўсём стараўся,
Ты ж, бывала, на ўсём трудзіўся,
Ты ж усім запасаўся,
Ці смертунькі спадзяваўся?
Працаўнічак мой міленькі!
Ручкі твае рабочыя,
Яны ж дужа мазолеваныя,
Божа ж мой найвышненькі!
Бяседа наша невясёлая,
Песенькі нашы маркотныя!
Як жа мне з табой разлучыцца?
Як жа мне з табой распрашчацца?
Гаспадарочак мой родненькі!
Вазьмі ж ты лепі мяне з сабой,
Чым без цябе заставацца.
Суседзькі мае мілыя!
Прасціце майму гаспадарочку.
Можа ж, ён каму быў прыкры,

Можа ж, з кім напрыкрыўся,
Прасціце яму і не кляніце яго,
Любыя суседачкі і мілыя дзетачкі.

214. Дзеткі мае галубяткі! Большы ж нам бацькі не відаць,
Як зімою ў полі цвеціка.
Бывала ж ён, пакойнічак, адкуль едзя,
То так не прыедзя.
То бублічкаў, то балабушак — а ўсё дзеткам прывязе.
Бывала, ляжаць спаць, ён савет мне дасць,
Заўтра што мы будзем дзелаць.
А цяпер жа хто мне дасць савет?
Сізенькі мой ты галубчык!
Куды ж ты ад мяне адлятаеш?
Што ж я з німі буду дзелаць?
Хто ж іх будзя карміць?
Абзавіся ж ты, мой сэрданька, мой дарагенькі!
Дай мне савету хоць адно славечка:
Як мне ў свеце жыць і гэтых сірот расціць?
Сізенькі мой галубчык: адчаго мне не атвячаеш?
Усё на мяне гора і бяду астаўляеш,
Цераз год я й сама к табе прыйду,
Што ж нашым сіроткам тады дзелаць,
Як мы ў сырой зямлі будзем?
Разайдуцца нашы дзеткі па беламу свету,
Не будзець ім нейдзе места і прывету.
Саколік ты мой родны!
Бувала, ты коней на ноч вядзеш да і прыказваеш:
«Ты позна не спі, а раней уставай
Да абед варыць зацявай,
Печку стапі і боршчу свары».
Цяпер жа некаму боршчу варыць
І не з кім будзя гаварыць.

215. А мой жа ты галубочак сізенькі!
Сакалочак жа ты мой ясненькі!
Куды ж ты ад мяне далёка адлятаеш?
На каго ж ты мяне з дробнымі дзеткамі пакідаеш?
А ты ж у мяне быў ўся рада і парадачка.
Чым жа я цябе, маё дарагое, прагнявіла?

А дзетухны ж мае дробныя,
К каму ж мы цяпер прыхінемся і прыгорнемся?
А хто ж аб нас падумаець і пагадаець?
Усякі жа цяпер над намі надругаецца і насмяецца,
Як за нас цяпер некаму заступацца.

216. А мой жа ты міленькі!
А парай жа ты, што мне дзелаць цяпер,
Як жа мне цяпер распарадзіцца
Без цябе з дробнымі дзеткамі?
А іх жа ўсе наскубуцца.
Хто іх будзець хлебам карміць?
Хто іх будзець рабоце вучыць?
Яны ж цяпер усюдых нацягаюцца,
З іх жа ўсе людзі сасміхаюцца
І ўсе набіваюцца.

217. А спадарочак мой, шчамялёчак,
А з кім жа ты мяне астаўляеш?
Ці мне ў гэтым куточку жыць,
Ці мне другі нахадзіць?
Цяпер мае усе вугольчыкі панямеюць без цябе,
Не будзець мне шчырага тута куточка,
Цяпер аб нас будуць людзі і судзіць і гаварыць
Усякімі гаворкамі...
А каму ж ты сваіх дзетак адказаў?
А што ж ты ўсю радзінку сваю ў галоўкі залажыў?
А ты ж, бывала, і стараўся,
А ты ж, бывала, і клапатаўся.
Як пайду я на тваю работку,
А я буду слёзкамі абліваціа,
Як зірну я на чужых мужчынак,
А я адна, як шэрая зязюля,
Мае даберцо паедзенае,
Мае і пожанькі пастраўленыя,
А як прыйду я дамой, я слёзкамі абліваюся,
А мая хатка пустая,
А куды ж я прыхінуся,
А мае ж усе вугольчыкі панямелі,
Ніхто мне шчырага слоўца не скажаць,
Ніхто ка мне так шчыра не абернецца.
А як прыйду я ў хатку,— мае дзеткі плачуць,
А як прыйду я з работкі,— мае дзеткі плачуць,

А не даждусь я шчырага слоўца.
А скажы ж, мой дружочак,
А куды ж мне цябе дажыдацца,
А куды ж мне цябе пазіраць?
А ўсе мужчынкі ідуць з работы,
А цябе я і век не даждуся.

218. Куды ты, мой мілы салавеечка, адлятаеш?
На каго мяне, бедную ўдовухну, пакідаеш?
Заеў ты маю бедную галовухну,
К каму яе прыхіліць — не ведаю.
Хто пажалеець мяне, ўдовухну,
Асірацелую з дзяцьмі, бедную?
Прыйдзецца, як тэй зязюльцы,
Кукаваць, па свету лятаючы,
У чужых гнёздах прыючацца,
Ад злых языкоў усяго начувацца.
А дзе бабскія сені ні стаялі,
А ўсюдых жа яны запуставалі.
Смагі няма гадаваць дзетак дробных,
Няма каму пажалець няшчасных.
Чы баславіў жа іх, як бацька,
Шчасцем-доляю, як усе людзі,
Злажыў ты свае ручухны,
Адказаўся памагаць ім, няшчасным.
Гу-у-у! Божа маё, гора маё — ух-ця мне!

219. Мой жа гаспадарочак, мой жа ты сакалочак!
А хто ж цяпер будзець нашу ніўку араць?
Хто ж нам будзець хазяйства супаўняць?
А ты ж, бывала, куды паедзеш, ты ж у мяне рупішся,
Як і ў двор паспець і там дзела супаўняць;
Ты ж, бывала, у поле паедзеш — і ў двор рупішся,
Каб і копку прывезць і ў гумно паглядзець,
Каб жа мне выцепляць, каб і змалаціць,
І ў поле паспець,— пасеяць і запахаць.
А цяпер жа мне без цябе худзенька пражыць.
Мае межы пазапалі, мая ніўка запустуіць —
Маё непаханае, маё нясеянае,
Маё прасла абламілася, маё ўсё патраўлена, свіннямі паедзена:
Некаму мне жардзінкі прывезць,
Некаму мне прасла разгарадзіць.

Усе людзі на сенакос ідуць —
Маё закашываюць, маё вытраўліваюць;
Каго папрашу, хоць ай дзе і скашу,
А пакуль сабярусь прывезць, дык гатовае паядуць
А ўсе ж людзі к соўніку сена раскідаюць,
Сушуць, грабуць і ў двор вязуць,
А маё ляжыць не сушанае, не грэбенае
І прывезць некаму...

220. Ох, Ільючка,
Ох, разлучка!
Мы з табою разлучыліся.
Ты мяне пакінуў,
Як сіраціначку.
Я ж цяпер сама, адна,
Як быліначка ў полі...

221. А божа ж, мой божа!
Нашто ж ты нас разлучыў?
А што ж мне цяпер рабіць?
Нашто ж ты, мой гаспадарочак, мяне пакідаеш
З дробнымі да з дзеткамі?
А куды ты гэта прыбраўся? У якую дарожку?
Адкуль цябе мне ждаць?
Калі ж ты ка мне ў госці прыйдзеш?
А ці ты зімовай парой, а ці ты летняй?
Зімовай парой — халодная дарога,
Летняй парой — зялёная дарога,
А мой гаспадарочак! Куды ты пойдзеш,
А ці ў дуба, а ці на ваду?
Ці ты касіць пойдзеш, ці араць пагоніш?
Куды мне табе несці абедаць, а на якую палосу?
А мой гаспадарочак! Ці ты не чуеш,
Што твае конікі ірзуць і волікі рыкаюць?
Што саха твая ляжыць, хто ёю араць будзе?
І дзеткі твае плачуць, хто імі пасылаць будзе?
Яны будуць на вуліцы сядзець,
Будуць людзі іці, яны будуць зваць «тата»!
А людзі будуць казаць: «шчаняты!»
А мой гаспадарочак, а мой яварочак!
А мае ножачкі! Дзе ж вы хадзіць будзеце?
А мае ж ручачкі? Што ж вы рабіць будзеце?
А мой гаспадарочак, а мой яварочак!

А чаго ты ад мяне адваліўся?
А ці цябе ветры падвалілі?
Ці цябе дажджы падмылі?
А мой гаспадарочак, а мой яварочак!
Збудавалі табе свяцёлачку цёмнаю, нявіднаю...
Няма ні дзвярэй, ні вакошачак,
Што не зайдзе яснае соўнейка,
Ні ветрык не павее, ні дождж.ык не зайдзе.

222. А мой жа ж ты міленькі, да мой жа ж ты харошанькі, пташачка родненькая! Чы ж я табе не спадручна была, не ўмела цябе гутарыць? Мы з табою жылі, як рыбка з вадою. Ты ж, бывала, устанеш з расою, працуеш у полі, робіш за ўсіх,— пачынанне і сканчанне ўсё з цябе. Ты ж такі не быў ні п'яніцай, ані лайдаком, не бадзяўся ў карчме; ты любіў парадкі ўсюды. І адзёжка чысценька, і ножкі прыбраны — штоб было ў цябе, ты казаў заўсёды; чы ж не спадобіла я табе, чы ж не шанцавала табе за мной? А мой ты родненькі! А мой ты залаценькі каласок! Што ж мне зрабіць, сіраце, без цябе? Надарэмна плачу толькі, не дагнаць цябе, не ўбачыць майго сакалка... Чы ж на тое я з табою жыла, штоб цяпер толькі плакаць на магілцы тваёй? Ой, прыйдзі, хадзі ты к нам, мой ты прыгожанькі! Паглядзі на сваіх дзяцей: што пачну я без цябе? Цяжка жыць без мужыка ў хаце. Ты спіш, мой любы, і ніколі не ўстанеш паглядзець на сваю галубку, што яна без цябе не варкуе, толькі плача і сэрца дратуе... Ты ж такі быў жаласлівы, чы ж перастаў жалаваць сваю *(імя)*. Ой, божа наш, божа! Горкая мая доля! А бадай жа ж я з табой апынулася! А мой ты сізы галубок! Прабачай мяне, дурную: можа, я цябе не сцерагла? Можа, я табе напрыкрылася? Можа, мы не залюбіў сваёй печкі-лаўкі і папробаваць прыйшлося зямлю сырую, сцюдзёную... Чы ж табе не лепей цёпла было жыць? А мой ты мілюсенькі! А вэй, а вэй!.. А бедная я, бедная... Ой, цяжка мне, цяжка. А вэй! А вэй! А вэй!..

223. Ой, галубчыку ты мой, ужо ты пакідаеш нас, на каго ты астаўляеш мяне з дзеткамі; да не скора мы пабачымся з табою. Паследні раз мы з табою бачымся; ой, чаго ты ад нас уходзіш, чаму ты яшчэ з нядзельку не пабыў, шчоб мы з табою пагаварылі; ой, ты ж мой міленькі, ох, ты маё сонейка, ох, ты ж маё золатка, ох, ты ж мой месячык, ох, чы хутка з табою пабачымся?

224. Ой, мой гаспадарыку,
Яка ж у цябе смертанька?
Ох, а я ж не думала,
Ох, а я ж не гадала.
Да няхай бы ж я ўперад,
Бо я ўжэ хворая,
А ты ж такі буў здаравенькі.
Ох, дзе ж яна цябе стрэла,
Да тая смертанька?
Раскажы мне, Мікалаенька,
То і я пайду з табою разам.
Ох, шчо я буду цяпер рабіці?
З кім жа я буду смерці дажываці?
А хто ж мне цяпер пасее,
А з кім буду збіраць гатовае?
Ох, Мікалаенька, вазьмі ж і мяне з сабою!

225. Гаспадарчык мой,
Як ты мяне пакідаеш?
А як я буду жыці?
А ты быў гэткі здаровенькі,
А я даўно хвора,
А ты мяне пакідаеш.
А будуць чужыя мужчыны
Ісці работу рабіць,
А я буду цябе шукаць,
А я цябе буду пазнаваць,
А я пра цябе пытацца буду.

226. Ой, мая і долейка, мая і няшчасная, судзьба мая бедная... Дзе ж я цябе буду шукаць, ой, мой дубочку і мой галубочку, ой, мой Яшачка? Ды ўсе птушкі і звяры будуць, а цябе і не будзе. Я ж цябе і не ўбачу, мая дружжайка і прыхілайка!

227. А памёр ужо ж мой гаспадарык. А з кім жа ж я цяпер гаварыць буду? А ўстань, устань жа ж, і мой галубчык, ды раскажы мне ўсю праўду, бо цяпер мне ніхто нічога не скажа. А з кім жа і я буду разгаварываць? А што ж я сваім дзеткам буду расказываць? А мне ўжо ўсё цёмна будзе. А сонейка яснае і за хмарачку схавалася. А калі ж яно засвеціць да прыйдуць дзеткі над магілкаю і заплачуць. А варонкі кружацца, кружацца і грачуць...

228. Ты мой Бутлеўскі,
Ты мой квет дарагусенькі,
Бутлеўскі, ты мой Бутлеўскі,
Друг мілюсенькі,
Прасі ты господа бога,
Каб за мяне ўступіліся,
Кінуў жа ён мяне
У горанькі вялікім,
У абіданькі бальшой,
Адкуль ветры не павеюць,
Усюды мяне клонюць.

229. А мой жа ж ты галубок!
А мой жа ж ты сакалок!
Чаму ж ты мяне пакінуў?
Без цябе мне свет загінуў.
Учора ж ты касіў, араў —
А сёння ўжо бараду задраў.

230. А мой хазяінка,
Мой міленькі, даражэнькі!
Ой, да пасаветуй,
Шчо прыходзіць лецечко,
Як жа мне пражыць?
Усе людзі будуць соткі садзіць,
А ў мяне няма ні ездавога,
Ні гайдая, ні павадыра,
Да скора ж прыйдзе касавіца,
Да як забраскаюць косы,
Да нідзе месца не найду,
Да прыйду да цябе на магілу
І буду цябе гукаці,
І буду перад табой каваці,
Каб ты прыйшоў, хоць косу выклепаў,
Бо я ўжэ стара і слаба,
Не ўмею ні касы кляпаць,
Ні сена касіць.
Да ў нас з табою і дзяцей мала,
Адно ж дзве дочанькі,
А няма ж сыночка,
Каб кала яго прыхіліцца.
Да прасіць трэба касяра чужога,
А балота глыбокае ды куп'істае,
Да трава рэдкая.

Да пайшлі да й таго чужога касяра,
А можа, я ж і не ўмею прасіці,
'Шчэ ж ніколі ў чужой ласцы не стаяла,
А за табою толькі добра була,
Шчо ты мне накосіш і паможаш,
Да ты ў мяне такі добры буў,
Ніколі не зругаў,
Да ты ж мяне шкадаваў,
А цяпер мне без цябе, як без рук.
Да скажы, хазяінка,
Да скажы, работніку,
Можа, ты каму прыказаў,
Каб мяне ніхто не пакідаў.
Або пасаветуй мне карову прадаці,
Шчо так трудненька мне сена касіці.
А сама лучша прашу цябе,
Каб ты забраў мяне з сабою,
То я буду і там тваёю слугою.
Да як жылі мы з табою
На гэтым свеце дружненька и добранька,
Да нам людзі ўсе завідавалі,
Так і там мы будзем жыці.

231. А куды ж ты, мой Валодзечка, сабраўся?
У якую дарожку невясёлую,
У дарожаньку нікому не вядомую.
А з той дарожанькі ніхто дамоў не прыходзіць.
А куды ж ты, мой Валодзечка, сабраўся,
У сваёй Ганначкі не спытаўся?
Як я буду жыці, што буду рабіці,
Чым буду дзетачак карміці,
Што буду адзяваці, куды выпраўляці?
Яшчэ ўчора казаў, што будзеш сенца касіць,
А сёння ў гуменца вазіць.
А сам прыбраўся,
У дарожку сабраўся,
У хатачку новенькую ды цёмненькую,
Дзе ні дзверак, ні акенца,
Дзе достачкі ды прыцісnуць ножачкі,
А пясочак засыпіць вочкі,
А зямелька прыдушыць грудкі.
А чаму ж так моцненька ты заплюшчыў вочкі
І не хочаш глянуць на сваіх дзетачак?

А твае дзетачкі ўсе каля цябе стаяць,
На цябе глядзяць.
А што ж ты ім скажаш, а што ім парадзіш?
А яны яшчэ маленькія,
А слёзкі ў іх драбненькія.
Хоць слёзкі дробненькія,
Але пальюць рэчкі поўненькія,
Як пачнуць плакаці, бацьку ўспамінаючы.

232. А мой ты Сцяпанка,
А мой ты гаспадарык,
А як ты жыў —
А мне было добра за табою,
А як я цябе пахавала —
Якое мне горачка
Цяпер без цябе.
А Сцяпанка мой,
А забяры мяне да сябе,
Каб я доўга без цябе не гаравала.
А мой жа ты Сцяпанка,
А ты хатку ставіў новую,
Казаў: добра будзе жыць
У новай хаце.
А казаў майстрам,
Каб пяць акон рабілі.
А гэта хатка вясёлая,
А гэта хатка ясная,
А табе зрабілі — цёмную,
А ні аднаго акенца не пусцілі.
А мой ты Сцяпанка,
А мой ты гаспадарык,
А як ты быў —
Мне нічога не рупіла за табою,
А не рупіла, як сенца на карову накасіць,
А не рупіла, як дроўцаў мне навазіць,
А цяпер прыходзіцца мне самой рабіць.

233. Мой жа ты гаспадарочак! Цяпер будуць замкнуты нашы клеці і амбары, і ключоў мне не дадуць, да не буду ж я ведаць свайго дабра.

Мой жа ты сакалочак! Да мяне ж цяпер не пусцюць ні к печы, ні к полу і ні к столу, цяпер жа мне месцечка ў парозі, а столічак на прыпечку, а кушанне — што астанецца.

Мой жа ты галубчычак! Здзелалі табе хатунку новую, невясёлую, цёмную, безваконную, да ты ж у ёй адзін будзеш жыць...

234. Куды ж ты, мой гаспадарочак, проця ночачкі сабраўся?
А куды ж ты на ночкі папросісся?
А ніхто ж цябе не пусціць у хату,
А на цябе ж былі ўсе людзі злыя, сярдзітыя, нядобрыя...

235. А мой раднюсенькі, а мой мілюсенькі!
Да як ты мяне цяпер пакідаеш?
Да хто цяпер мне дзетак будзе гадаваці
Да і хлеба заробіці?
Як мне цябе трудна будзе забыці,
Хоць ты мяне, бывала, апаганіш,
Вышкалюеш да набрэшаш,
Але як на Сідору паедзеш, то ўсенько забудзеш,
То і што-кольвек прывязеш,
Альбо хусцінaчку, альбо запоначку,
Альбо што другое,
Хоць піражок, альбо бараначак,
Альбо як да Гарадна, бывала, як паедзеш,
То і зноў прывязеш мне што-кольвек,
А дзецям хоць стужачак...

236. Куда ж ты, мілы дружачка, і харашо лі цябе я, мілы дружачка, ўвабрала?!

Што жа ты, мілая дружачка, ты мяне з маладых гадочкаў бросіў і з малымі дзетушкамі?!

Я за табою, мілы дружачка, пажыла і ў волюшкі і ў холюшкі, была я адзета і абута, была я і сыта, і давольна.

Не дай мне, мілы дружачка, мне, горкай, мучыцца — і палoжця вы мяне, горкаю, к сабе радушкам і сваіх дзетушак, мілых, недарашчоных.

Расступісь, матушка сыра зямля, раскаліся, грабава даска! Раскалыхніцесь, белы палотны! Развядзі свае уста халодныя і прыкажы мне, мілы дружачка, как мне малалетніх вазрастаць будзець.

237. А мой ты мужычок,
Мой ты міленькі,
Мой ты Янусь,

Як мы з табой любіліся,
Як я прыпомню маладыя гадочкі,
Як ты быў жа такі мне спагадлівы,
Як ты мне памагаў усё.
А як жа ты ў жызні потым мяне абіжаў,
А мой ты Янусь, Янусь,
А я ж гэта ўсё забылася,
Але ж я ўсё табе выбачаю, як ты цяпер ляжыш,
Я ж госцікаў ўсіх зазвала,
Я ж іх частую, я ж іх гашчу,
А яны ж кветачкаў пананосілі,
А кветачкі ад галоўкі да ножак цябе абставілі.
Ах, Янусь, Янусь, як цябе заўтра панясуць,
А як жа будуць кветачкі ўперадзе несці,
А я ж буду слёзанькі ліць,
А мае слёзанькі ўсю зямельку абмыюць.
А-я-я-яй, а мамусенька, ты ж не чуеш,
Што нас спаткала такая нядолечка,
Што я, маладзенькая, асталася ўдавой.
А божа ж мой, божачка,
А мае ж дзетачкі будуць паглядаць,
Адкуль баценька будзя ісці,
А ўсе дзетухны будуць мець бацюхноў,
А мае ж будуць сіроткамі.
А Данусенька, а Галіначка,
А Чэсюнечка,
А хадзіця ж вы, а памажыця ж мне а Януся пабудзіць,
Свайго бацюхну.
То ж ён астатняю гадзіначку ў хатцы будзя,
То ж яго зараз будуць выносіць,
А ўсе ж людцы ўжэ ж пазабіраліся,
А божа мой, божачка,
А-я-я-я-я-а-а-а-аі!

238. А мой жа ты гаспадарочак!
Нашто ж ты мяне з дробнымі дзеткамі пакідаеш?
Я ж ужо і так за табою нагаравалася,
Не знала ж я ні будня дня і не празніка,
З табою ж я ані ў пір, ані ў бяседачку,
Бывала ж я і збіта і зжурана,
А цяпер жа мне было гора дый пагорша.
Усю сілачку я патраціла і працухны прыняла.

А чаго ж я не выжыла? Толькі ўсе сваё добранькае патраціла,
А цяпер адзянёшанька з дробнымі дзеткамі,
І голінькімі і босінькімі я засталася.
Няма ж у мяне ні хлеба ні крошачкі, ні мучыцы ні шчапотачкі,—
Як жа цяпер сваю галовачку прылажу?
І дзе ж я з дробнымі дзеткамі падзенуся?
Чым жа цябе пахаваю і памяну?

239. А мой жа нямужылачка забіванінькі!
Ты ж мяне не любіў, не жалеў,
А каб жа ты адтуль не вярнуўся,
Я з табой нажылася, нагаравалася.
І калела я, і гарэла я, і недапітая, і забітая,
А я і босая нахадзілася, па марозу нацягалася,
За табой ні піла, ні ела, ні добра хадзіла,
І свае лята маладыя ўсе патраціла.
А не плачце, дзеткі, па худым бацьку,
А плачце, дзеткі, па роднай матцы,
А матка куды йшла, за ручку — вас вяла,
З кішанька вас гадавалася —
Ад худыя жысці сцерагалася.

240. Ох, мая дружына!
Ты ж у мяне не заслужыў,
Шчоб я па табе плакала,
Бо ты сам знаў,
Як я з табою пражыла.
Мая ж дружына мілая!
Усе ж людзі збіраліся,
Як зробім авантуру ў хаце.
Пражыла з табою васемнаццаць год
І наплакалася.
То добра, шчо бог цябе ўзяў,
Можа, мае косці апачынуць
Ад тваіх рук.
Шчоб табе на том свеце
Калода ў зубы,—
От чаго я табе бажаю.

241. Ох, мой хазяінка,
Да мой Іваначко,

Я прыйшла цябе даведацца.
Ужэ ж мае сінякі пагаіліся
І рукі адышлі.
Ох, ты ж думаў,
Шчо я без цябе прападу.
І ты ж казаў,
Шчо я табе не хазяйка.
А я ж зарэ, можа, і менш раблю,
Да спакайней і весялей жыву.
Шчо за мною не ляціць
Ні сакера, ні залязняк,
Ні калок на плячах не ляжыць,
Ні ў дзвярах пальцы не трашчаць.
Да нашыя цяпер дзверы не ляскаюць,
Да дзверы не браскаюць,
Да паціху адчыняюцца
І шчылка закрываюцца.
Да я ўстану рана,
Да ты са мною не б'есся
Да не ругаесся.
Некаму мяне ганяць,
Няма перад кім мне дрыжаць.
Да хоць мае рукі табою пабітыя
Ішчэ і зарэ баляць,
Але ўсё роўна здаецца,
Шчо яны здаровыя:
Шчо вазьму, то зраблю.
Да я зарэ і мужчынскае, і жаноцке раблю,
І ўся работа ідзе, як у вянку.
Да я ж пайду касіці,
Да мне ўсе мужчыны
Хоць па пакосу пройдуць,
А я ўсё раўно слязьмі не абліваюся,
Што мой касар у зямлі ляжыць,
А я гэтым не валнуюся.

242. Мой ты Сяргейка, ты ж не знаў,
Што мне пажаліцца некаму,
Пахваліцца нечым.
Не раз я начавала ў чужой хатцы і пад вуглом.
Калі дзетак успею захваціць, а калі і не.
А ты ж як браў мяне,
Казаў, што будзем, Манечка, добра жыць,

Я ўжо не буду піць.
А цяпер ўсё тое самае.
Я ж не слухала ні таты, ні мамы,
Я ж за цябе ішла, я ж цябе любіла.
Я ж думала, што будзем жыць.
А ты ж гэту гару не кінуў піць.
А п'яны ты мяне з дзеткамі трудзіў.
Ты ж не раз іх, бедных, напужаў,
Ты ж не раз іх паразганяў.
У нашай жа хатцы ніколі не было парадку.
Ты ж не глядзеў, што нашы дзеткі абарваныя,
А ты ж не папытаўся, ці накормлены.
У цябе ў галаве была толькі чарка,
Табе ж не думалася гаспадарка.
Мой ты Сяргейка,
Ты ж сваёй смерцю і не памёр.
Каб ты мяне з дзеткамі не паразганяў,
Можа б, я цябе да такога няшчасця не дапусціла.
Мы ж спалі ў хляве за кароўкай,
А ты ж навек заснуў у хатцы.
Каб я лепей у таткі сядзела,
Сівую касу насіла,
Чым з табой было жыць,
Горкія слёзы ліць.
А цяпер мае вочкі
Не будуць цябе відзіць,
Можа, трошкі асохнуць.
Я ж табе прабачаю,
Усё сваё горачка забылася:
Як ты нас муштраваў,
Як ты нас разганяў.
Мой ты Сяргейка,
А я ж усё думала,
Што ты не будзеш піць,
Што ты не будзеш разбівацца.
Усё ж некалі нап'ешся, наб'ешся,
А як цвярозы, дык і паможаш.
А цяпер я асталася з гэтай дробяззю,
Яны ж яшчэ маленькія,
Яшчэ нядужанькія,
Ім жа трэба памагаць.

243. А мой гаспадарык,
А ты ўмёр, умёр,
А я па табе не буду плакаць,
Бо за табою жывым ўсе слёзы выліла.
А я цябе выпраўлю, як трэба,
А пахаваю, як усе людзі,
А слёз у мяне боле ж няма,
Бо яны ўсе выліліся.

244. Памёр мой міленькі,
А калі я цябе дождуся?
Усе пцічкі ляцяць,
А ты ад мяне ўлятаеш.
Адкуль жа мне цябе ждаці,
Ды з якія старонанкі?
Ой, салавейкі ляцяць,
А ты ўбіраешся.
А куды ты сабраўся
Да ў жоўтыя пяскі,
Да ў чорныя ляскі,
А там жа цябе ніхто не пабачыць,
Ніхто ж не адкрые...

245. А мой дзядочак, а каму ж ты мяне пакідаеш?
А каму ж я раскажу сваё горачка?
А каму ж я раскажу сваю абідачку?
Можа ж, я буду ля чужых ножак валяцца?
Можа ж, я буду за платы чапацца?
Забяры ж ты мяне з сабою.
Каб жа я людцам не дакучала,
Каб жа я людцам не гадзіла.
А мне ж нада кажнаму загадзіці,
А мне ж нада кажнаму прамаўчаці,
А мне ж нада кажнага ўважаці.
А нашто ж мне гэткае горачка?
А цямнее мая хатачка,
Як дождуся з цёплай вясёначкі,
Як закукуюць кукушачкі,
А дзе ж мне тады дзявацца?
Забаліць мая галовачка,
Закамянеіць маё сэрдачка.
А я ж буду прыглядацца,
А я ж буду прыслухацца,

Буду глядзець тую староначку,
Адкуль жа ты прыхадзіў,
Адкуль цябе даглядала,
Адкуль цябе дажыдала.

246. Маё горачка,
А ты ж на мяне не забылася.
А мой ты Янучок,
Які ты, Янучок, шчаслівы,
Што ідзеш за дзецьмі,
А мяне, старую,
Пакідаеш на гора.
Мой Сашачка і Антонька...
Мне ж і тут
Лепшага не будзе.
Яны ж абое нядужанькія,
Яны ж абое хворанькія.

247. Мой гасцёк мілы,
Калі ж цябе дажыдаць?
Адкуль цябе пераймаць?
У катора аконца
Мне цябе паглядаць?
Ці ты мурашачкай,
Ці ты пташачкай
Будзеш прылятаці?
Па чым цябе пазнаваці —
Ці па пер'ейку,
Ці па галасочку?
На каторым кусточку
Будзеш шчабятаць?

248. А мой ты хазяін дарагі,
А мой ты саветчык любы,
А што ж ты надзелаў?
А як мне з дзетачкамі жыць?
А што ж нам рабіць?
А як мне дзетачак гадаваць?
Ці ж мы цябе не жалелі,
Ці ж мы цябе не любілі,
Хіба мы цябе абідзелі?
А мае ж вы дзетачкі,
А падыміце свайго папачку,

А можа ж, ён вас паслухае?
А як вы будзеце жыць без папачкі?
А хто за вас заступіцца,
А хто з вамі пагуляе?
А паслухай ты нас,
Падніміся сыра зямелька,
Аддай мне майго мужа.

249. А ты мой гаспадарочак!
Адкуль жа я цябе буду ждаць з работкі?
І дзе ж ты будзеш на рабоце,
Ці на поле з сошкаю,
Ці на пожні з коскаю?
А ўсе людзі з работы прыйдуць,
А я ж цябе не даждуся.
Адкуль цябе пазіраць буду:
Ці з усхода, ці з захода сонца?
А як пайду на вуліцу і на гумяную,
Нігдзе цябе, гаспадарочка, не найду
і не загляну.
Збуда[ва]лі табе хатачку цёмную і не відную
І ваконца не прасеклі,
А я ж цябе выпраўляю ў доўгую дарожку —
Невядомую, незнакомую,
У жоўты пяскі, у сырую зямельку.

250. А хазяін жа мой даражэнькі,
На каго ж ты мяне прыказаў,
А хто ж будзя мяне глядзецькі,
А катораму ж ты прыказаў дзяцёнку, каб ён
мяне і ўзяў к сабе?
А ці к далёкаму мне ехаць, ці к блізкаму?
*(Як развітаецца на могілках)*
А прашчай, мой хазяін,
А прашчай, мой даражэнькі.
А я ж боле цябе не ўбачу,
А боле ж мы з табой не ўстрэцімся,
А боле ж мы з табой не пагаворым,
А боле ж мы з табой не парахуім.
*(На дварэ, вярнуўшыся з могілак)*
А хазяін жа мой даражэнькі,
А я зірну на тваю работачку,
Дык мая душа замірае,

Я ж на яе ніколі не забудуся.
А мае ж вы ножачкі былі,
А мае ж вы ручачкі былі,
А мая ж ты галовачка.
А тvае ж ручачкі напісаліся,
А твая ж галовачка начыталася,
А тvае ж ножачкі ўсюдах набегаліся,
А хазяін жа мой даражэнькі.

251. А нямножачка ж ты, мой гаспадарочык,
Не даждаўся да краснага яічка.
А ўсе ж то людзі прыйдуць к празнічку,
А ўсе то прыйдуць вясёлыя празнічкі,
Адной жа мне з маімі дзетачкамі празнічак невясёлы,
А ўсе ж то людзі прыйдуць за столік з сваімі дзетачкамі,
Адна ж я, як тая птушачка непрытотная,
Куды ж мне сваю галовачку прыхінуць?
А куды ж ты, мой саколік, мой сізенькі,
Проця лецечка ад нас адлятаеш?
А людзі будуць, мой саколік, і пахаць, і сеяць,
А хто ж нам, мой саколік, зямельку прыпашыць і прысеець?
А божа мой, божа, ухця мне! Не буду ж я жыва!
Ай вазьміця ж мяне, забіця ці зарэжця!
А хазяін ты мой любы!
А хто ж тваіх конікаў павядзець на начлег да і пасвіць будзець?
А ці відаў ты, мой гаспадарочак, што на тваім дварэ дзелаецца?
А строюць жа табе хатачку цёмненькую і безваконную.

252. Мой міленькі дружок,
З кім ты мяне пакідаеш,
Толькі з дробнымі дзеткамі.
А мой жа ты парадглічак,
А мой жа ты работнічак!
З кім жа я астаюся,
Толькі з дробнымі дзеткамі.
З кім жа іх гадаваць буду,
Чым я іх адзяваць буду?
Я ж іх не адзену,
Я ж іх не прыгадую.

Я ж як прычыхаюся,— я і ўлякаюся,
Куды мой друг вянчальны падзеўся:
Ці ён паехаў у дарожаньку?
А ці ён пайшоў у цэркаўку?
У мяне дзеткі пытаюцца:
«Куды наш татка дзеўся?»
Дзеткі мае мілыя,
Страшнае гэта слаўцо,
Што я завуся «ўдованька»,
А вы дзетунькі — «сіротанькі».
Сяду з вамі абедаці,
Вамі, дзеткі, абсажуся
І слёзкамі абальюся.
Што вы, дзеткі, маленькі,
І слёзунькі вашы дробненькі,
А як дзеткі пабольшуюць —
І слёзунькі пагоршуюць,
Што ёсь каму загадаць вамі,
Да некаму пажалець вас
Без свайго роднага татунькі,
І вы будзеце ведаць,
Што і быў у вас родны татунька.
Цяпер вы, дзеткі, сіротунькі,
А [я] астаюся ўдовунькай.
Што ж вы, дзеткі, не пытаецесь,
Хто вас будзець гадаваці
І ў салдаты выпраўляці
Без свайго роднага татунькі?
Людскія таткі будуць выпраўляць дзетак,
А [я] адна, удовушка, бедная мая галовунька,
Нельзя мне слаўцом нідзе абазвацца
Без свайго дружачка, без вашага татунькі.
Прыйдзець цёплае лецічка,
Людзі паедуць з сошкамі,
А я з кім і з чым?
У мяне зямелькі было нямножка:
Палосанька была і вузенька, і караценька,
А цяпер стала і доўга, і шырока,
І будзець стаяць някошана,
Будзець ляжаць няворана,
А я буду хадзіць і ручанькі ламаць.
Як прыйду я ў хатуньку,
Мая хатачка не міла:

Нет майго парадпічка, а дзеткам татунькі.
Усё мне не міла і хатунька пастыла,
Як устануць дзеткі і спытаюцца татунькі,—
Адраклась бы лепі гэтай хатунькі,
Як жа вас гадаваць без татунькі?
Няма чаго вам зварыці,
Няма чым пасаліці.
Трудна рыбке без вадзіцы,
Трудна дзеткам без татунькі.
Дасць бог цёплае лецічка
Вазьму дзетак за ручаньку
І павяду на магілачку.
— Гукайце, дзеткі, свайго татуньку:
«Устань, устань, наш татунька,
Верна, ў гробе дошкі
Прыціснулі твае ножкі,
Што нельга табе ўстаці.
Гора наша і сэрцу тошна,
Таткі вярнуці з магілы не можна.
Галовачкі нашы бедныя,
Асталіся мы сіроты вечныя».

## ПА ДЗЕЦЯХ

253. А маё дзіцятка маленькае, хто ж цябе будзець спавіваць, даглядаць, калыхаць і соўкаць; чы неўпадабала майго спавівання, майго даглядання, майго калыхання?

254. Маё дзіцятачка родненькае,
Адлятаеш ты далёка.
Утраціла ж я сваю ягадку.
Мая ягадка недазрэлая,
Адвалілася ж ты без пары.
*(Вясной)*
Цяпер усе пташачкі з выр'я ляцяць,
А ты ж, маё дзіцятачка, паляцела ў выр навекі.

255. Не баішся ты, мая пралесачка,
Ні марозу, ні ветру, ні замеці,
Хто ж там цябе будзець даглядаць,
Хто ж там цябе будзець спавіваць,
К каму ж ты там прыхінешся,
Хто цябе там спазнае,
Хто цябе там угадае?

256. А мая ж ты ягадка недазрэлая,
А чаго ж ты так рана адсыпалася?
Ці на цябе ж халодныя дажджы ішлі,
А ці цябе яркае соўнушка спякло?

257. А мая ягодачка,
Мая недаспелая,
Чым жа цябе здзьмухнула:
Ці буйным ветрыкам,
Ці пташачкі скляvalі?

258. А божа мой, божа,
За што мне такое горачка,
За што мне такое няшчасцейка?
Як жа беднай мне жыці без дзетанькі?
Як жа людзям у вочы глядзець?
Не ўберагла маю ягадку.

259. Яблычка маё садавое,
Чаго ж ты ад мяне адкацілася?
А ці буры цябе адвеялі,
А ці ветры цябе адкацілі?
Усе пташачкі з выраю выляталі,
А ты, маё дзіцятачка, у вырай заляцела!
Ці зязюлічка падкукавала,
Ці салавеічка падшчабятаў?
А ці, маё дзіцятачка,
Туды цябе падгаварылі?
Усіх пташачак з выраю даждуся,
А свайго дзіцятачкі ні век не даждуся...
А ці я ж цябе не гадавала,
А ці я ж цябе харашо не калыхала?
А хто ж цябе там
Без мяне калыхаць будзя,
А без свае люлічкі,
Без свае матулічкі?

260. А мая ж ты буйная галованька!
Што ж ты раненька адкацілася?
Мае ж ясныя вочанькі!
Што вы раненька замурыжыліся?
А мае ж вы белыя ручанькі!
Што ж вы раненька сашчапіліся?
А мае ж вы рэзвыя ножанькі!
Што ж вы раненька прытаміліся?

261. Дзіцятка мае мілае, крошачка дарагая, чаму ж так хутка шчэзло, як ранняя раса, як волас у агню?!

Божа мой, божа, чаму ж ты не даў мне нацешыцца маім жаваранaчкам нябесным, маім салавейкам пеўчым у хаце, маім сонейкам ясным на небе?!

Сонца накрыла чорная хмара, хата анямела, а на душы лёг важкі камень. Божа, божа, за што ты мяне так люта пакараў?!

262. А дзіцятка ж маё маленькае,
А дзіцятка ж маё дробненькае,
А куды ж ты выправілася,
А хто ж цябе там будзець даглядаць,
А хто ж цябе там будзець кукобіць?
А я ж цябе даглядала дужа шчыранька,
А я ж цябе даглядала дужа верненька,
А я ж ўсю работку бросіла,
А я ж цябе не закідала,
А хто ж табе там будзець лучча родныя маткі?
А хто ж табе будзець пасцельку слаць мягчэй за мяне?..
Ці табе пасцелька луччы крэстныя маткі,
Ці яна ж табе мягчэйшая,
Ці яна ж табе лепшая за мяне?
Дзіцятачка маё роднае,
А ці відная ж твая будзець хатачка?
А ета ж хатка і цёмная, без вугольчыкаў,
А табе ж не можна будзець і ўстаць і з лялькай пагуляць,
Прасі, маё дзіцятка, госпада бога,
Бяры, маё дзіцятка, мяне з сабой,
Я ж буду табе пасцельку слаць дужа мякенька,
Я ж цябе буду дажыдаць дужа ж шчыранька:
А мне ж тут дужа тошненька,
А мне ж тут дужа бедненька,
Не магу ж я з табой разлучыціся,
Не магу ж я з табой разайціціся,
А хто ж цябе падмовіў туды, маё дзіцятка?
Ці цябе родная бабулічка,
Ці цябе родны татулічка?
А каго ж ты паслухаў лепей за мяне?
А зрадзіла ж ты мяне
Проціў лецечка цёплага.

263. Хто к табе тут на сустрэчу выйдзець?
Ці к табе татулечка,
Ці к табе родная сяструлечка?
А хто ж цябе будзець кукобіць тута?
Ці цябе родная бабулічка,
Ці цябе сяструлечка?
А яны ж цябе не знаюць,
А яны ж будуць дзівіціся,

Адкуль гэтакая дробная казявачка праявілася?
А як жа тут прывыкнеш?
А тут жа дужа цямненька,
А тут жа ветрыйкі не завеюць,
Ані сюды пташачкі не залетаюць.

264. А дзіцятухна ты маё роднае,
Не чараз мяне ты на тэй свет пайшло:
Я ж цябе вярцела-хухліла,
Каб табе цёплынька було!
Ажны ж я цяпер
Вярцела цябе пасследні разочак!
Прыйдзець вясна —
Усіх дзетачкі будуць ны дварэ гудзець,
Аднаго толькі цябе не будзець, маё
дзіцятухна!
А штоб ведала я гэтый дзянёчак няшчасны,
Я ж бы не рылася із дому!
Знаць жа табе бацькавае лаўкі не було,
Што ты на чужэй лаўцы ляжыш,
Вясёленькае, давольненькае,
У чужэй магільнік глядзіш...

265. А дзетачка маё маленькае,
А дзетачкі ж мае кветачкі!
Чаго ж вы ад мяне адсыпаецесь?
Ці вы ж мяне жалееце,
Што я дужа гаротная;
Вы ж бы не былі голыя,
Вы ж не былі галодныя,
А няхай бы вы гадаваліся,
А я бы з вас уцяшалася.
Як увіжу я вашых равеснікаў,
Мне ж будзе дужа тошненька.
А мяне ж будзець пераломачка браці,
А як будуць чужыя мамкі
Сваіх дзетак гукаці,
А маіх не чуць, нейдзе не відаці.
Ці я вас не ўмела кукобіці?
Ці я вас не ўмела кукаваці?
Хто ж вас там лучша будзець гадаваці?
Ці вы там сабе лучную мамачку абабралі?
Ці вы там сабе лучную нянічку абабралі?

Хто ж па цябе сюды прыходзіў,
Ці па цябе родная бабулечка прыходзіла?
Што яна цябе ад мяне адманіла?
Ці твой дзядулечка па цябе прыходзіў?
Ці па цябе родныя цётачкі прыходзілі?
Ці яны табе лялечкі прыносілі?
Што яны цябе ад мяне адманілі?
А надзелаў жа ты мне перасадачкі вялікія,
Хоць жа б я горачка гаравала,
Хай жа б я сваіх дзетак гадувала,
Я ж ба за іх уцяшалася,
Я ж ба ж сабе адменачкі дажыдала,
Можа б, мае ручкі б паадменілі,
Можа ж бы, мае плечачкі адменілі,
Можа б, я да чаго дагаравалася.

266. Да ні снілася мне такое горачка,
Да не гадалася.
Ой, да не ўдалося пакрасавацца,
Палюбавацца ў сваіх дзетачак,
У сваіх родненькіх...

267. Ох, люданькі, мілыя,
Чаму я ў бога така нешчаслівая?
Ох, чаго ж вон ад мяне
Да забірае мае дзетанькі.
Ох, чым я яго ж прагнявіла?
Да няхай, госпадзі, мяне караў,
Як я вінавата.
Чаго ж ты злобу зганяеш
На маіх дзецях?
Ой, божа ж мой,
Да забяры ў мяне ўсё,
Адно ж аддай назад маіх дзетачак.

268. Ах, мае дзетачкі родныя,
Ах, мае дзетачкі мілыя,
Ах, мае зязюлечкі-дочачкі,
Ах, мае сынкі-галубочкі.
Ах, ніколі ж мне з вамі не святкаваці,
А я ж вас ужо пагадавала,
А я ж вас ужо пажаніла.
Толькі ў госцікі вас не прычакаюся.

А з якой жа чакаць вас староначкі?
А якой жа птушачкай вы ка мне прыляціце?

269. Няхай ужо адна Ірынка,
Дык ужо і сынок,
Мой міленькі,
А вы ж там гасціце
У маладым веку.
Мая Ірынка,
Пераймай свайго брацітку.
Ён табе раскажыць
Пра наша няшчасційка.
Няхай бы мы,
Старыя, ляглі,
Чым мы вас палажылі.
Мая долячка,
Чаму ж ты мяне не ўзяла,
Нашто такіх маладзенькіх палажыла?

270. Маё ты дзетачка,
Хоць бы я старая...
Нашто вы мяне
Кінулі на гора?
Чаму мы такія няшчасныя?
Я ўсіх кладу,
А сама ўсё жыву.
Няхай бы я
Залягла ямку,
Чым я кладу
Вас усіх, маладзенькіх.

271. Мае дзеткі,
Нашто ж вы пакінулі мяне, старую?
А я нядужая, а я няўклюжая,
А мне нада вашых дзетак гадаваць.
А мае дзетачкі,
А я ж на вас не нагледзелася,
А я ж вамі не нацешылася.
А цяпер вы мяне гэдак абідзелі.
Я ж ніколі не думала
На такое няшчасцейка.
А цяпер я за ўвесь свет няшчасная.

Пайду ў хатку — хатка нямая.
Гукну ў хатку — хатка глухая,
Няшчасцейка толькі гукаець.
Хоць бы вы адзін гадочак жылі,
Хоць бы вы мне памаглі.
Дзеткі мае, птушачкі мае,
А прылятайце ка мне,
А памагайце мне
Маленькіх дзетак гадаваць.
А што ж я рабіць буду?
А мае ж ужо не гадочкі
З гэткімі маленькімі.
А што ж вы мне нарабілі?
Навек засмуцілі.
Няхай бы я старая
На ваша места ішла,
А вы б цешыліся сваімі дзеткамі.
А мае ўнучыкі, а мае маленькія,
Вы ж не будзеце помніць
Ні сваю мамачку, ні свайго татачку.
Дзеткі мае,
Хоць вы мне здайцеся,
Хоць вы сасніцеся.
Чаму ж вы ў мяне
Мала пагасцілі?
Чаму ж вы ў мяне мала пацешыліся?
Мае ж госцейкі любыя,
А вы ж пакінулі
Такое горачка, гэткае няшчасце.
Я ж вочкі заплюсну,
Я ж вас не забуду.
Мае дзеткі мілыя, мае залатыя,
З якой старонкі вас пераймаць?
У якое аконца мне паглядаць?
Я ж буду ночкі не спаць,
Я ж буду вашых дзетак калыхаць.

272. Мае дзетачкі, мае мілыя,
Не ўмею ж я вас гадаваць,
Настаялась я ўжо па вавароццю,
Напрасілась чужых слуг.
Чужыя дзеткі на ранкі гонюць,
А я сваіх нідзе не ўгадаю,

Нідзе не спазнаю,
Не хаціце вы ў мяне гадавацца,
Не ўмею, дзетачкі, я вас расціць, гадаваць.

273. Дзеткі мае маленькія,
Куды я вас выпраўляю?
У доўгую дарожку,
Мне вас ужо не відзеці і не бачыці.
*(Калі летам)*
А насупраціў лецечка,
А насупраціў цёпленькага,
А ўсе казявачкі павылязуць,
А ўсе мурашачкі павыпаўзуць,
А я вас не ўвіджу і нідзе не сустрэну.

## ПА СЫНУ

274. Мой сынок, мой галубок!
Я цябе радзіла, я цябе гадавала,
На цябе ўся была мая надзея.
На каго ты мяне астаўляеш?
Хто маю старасць прыгледзіць?
Хто мае костачкі прыхароніць?

275. А я ж на цябе, мой сынулечка, спадзявалася,
Я ж усё думала, што ты мне пры старасці лет будзеш хлебнічкам,
А цяперыцькі ж я ўсю маю надзеюшку пацярала.

276. Што ж ты, дзетачка мілая, куды ж ты сабраўся? Ці я, дзетачка, за табою плоха хадзіла? Ні за чэм, дзетачка, я не кідалася, ні за какою работушкаю... Я цябе наблюдала: я думала, што цябе ўзрашчу — ўсё на цябе радавалася — думала вырасціць к старасці на пракармленне.

277. А мой сыночак-галубочак,
Ці я не ўмела цябе даглядаці,
Ці не ўмела цябе гадаваці?
Сынулька мой любенькі,
Прасці, што ты маленькі ўміраешся,
Што я цябе адпраўляю і хаваю.

278. Соўнейка маё яснае, залатое,
Нашто ж ты мяне
Пакінуў старую, такую гаротніцу?!
А я ж цябе маленькага глядзела,
За табой хадзіла,
Ночкі не спала.
Я ж цябе калыхала,
Я ж табе спявала,

Што будзець у цябе долячка,
Што будзець у цябе шчасційка.
А як цяпер зрабілася,—
Няма шчасційка,
Няма долячкі ні ў цябе, ні ў мяне.

279. Дзетка мая,
На каго ты галоўку палажыў?
Ні ў цябе браткоў,
Ні ў цябе бацькоў.
Святая нядзелька прыйдзе,
А цябе й няма.

280. Мой Іванька даражэнькі,
Мой салавейка маладзенькі!
Я ж толькі ў сне буду цешыцца,
Як ты, мой сынок, смяяўся,
Як хадзіць вучыўся,
Як гаварыць злаўчыўся.
Мая кветачка,
Мая красачка,
Я ўжо не пацешуся,
Я ўжо не засмяюся.
Мой Іванька, мой сынок!
А ты ж мяне наведвай,
Ты ж мяне не астаўляй,
Ты ж мяне не пакідай.

281. Сынок мой міленькі,
Іванька мой даражэнькі,
Мая дарагая ягадка,
Мая садовая малінка,
Мая мілая былінка!
А што ж ты мне нарабіў,
Навек засмуціў.
Для мяне і сонейка закрылася,
І птушачкі болі не запяюць,
І галасок твой не зазвініць.
Сынок мой, Іванька мой,
Як мне да цябе загаварыць,
Як мне цябе папрасіць,
Каб ты да мяне прыхадзіў,
Свае бедачкі прынасіў?

282. А сыночак мой, сакалочак мой!
А чаго ж ты, наш сынулечка,
Так разгневаўся на нас —
Не хочаш разгаварваць з намі.
А сынулечка, а катулечка,
Пчолачка ты адлётненькая,
Адлятаеш ад сямеечкі
У сырую зямелечку.
Сынулька, катулька,
А калі ж мы ўстрэцімся?
А нагнаў жа на мяне дасадачку і цьму.
Цёмна мне на свеце без цябе жыць.

283. Мой сыночак міленькі,
Куды ты сабраўся?
У якую староначку?
А мой салавейка,
Дзе шчабятаць будзеш?
А хоць пісямцо прышлі.
А я цябе прашу:
Не забудзь мае просьбы.
Уставай, сынок,
Уставай, міленькі.

284. А сыночак мой,
А галубчык мой,
А залаценькі,
А міленькі,
А чаго ты так рана пайшоў?
А ты ж маладзенькі быў,
А мой ты сынок,
А чаго ж ты так раненька?
Цвяточак ты мой раненькі,
Як ты рана так савяў...
А мой сыночак,
А пазарастаюць твае сцежкі-дарожкі,
А хто ж па іх хадзіць будзе?
А хто ж мне пісмяцо прышле?..

285. Ах, дзіцятка, сакolік мой родны,
У такую дарожаньку доўгую сабраўся,
У такую даміну цёмную пасяліўся,
Цёмную ды халодную,

Нікому не даходную.
Хто ж вестачку нам сюды прынясе?
Якая кукушачка пракукуе?
Якая пташачка праспявае,
Як дзіцятка маё пажывае?..

286. А мой татулечка,
А мой родненькі,
А чаму ж ты мяне
Адну сустракаеш?
А чаму нічога не пытаеш,
А дзе сыночак мой,
Маё сонейка?
А мой сыночак,
Мой галубочак
Пайшоў ад нас далёка —
Не прыйдзе больш зусім.

287. А мой ты Ігнаська,
Я ж табе казала,
Што наша хатка з сухастою,
Адны бедачкі тут жывуць.
А маё горачка,
Як мне цябе пакінуць,
Як цябе аставіць?
Як ты ў нашу хатку заляцела,
Як пасялілася з дзеткамі,
З маімі няшчасційкамі?..

288. Мой ты Адаська,
А я думала,
А я радавалася,
Што ты ўжо здаровенькі.
А ты ж у мяне
На вочках зачах.
Ты ж пойдзеш у госцейкі
Да тваёй сястрыцы,
Да сваёй Альжбеткі.
Чаму ж ты, мая доля,
Такая няшчасная?
Чаму ж ты, мая доля,
Зрабіла мне другую бедачку?
Чаму ж ты адклікнулася,

Мая доля,
Ды дзвюма бедачкамі?

289. А куды ж ты ўбіраешся,
Ці ў чужую дарожуньку?
Хто ж цябе там дажыдаць будзіць?
Хто ж цябе там будзе карміць?
А ты ж дужа махенькі,
А куды ты ўбіраешся?
Ці я ж цябе не карміла,
Ці я ж цябе не паіла?
Ці цябе ж нянечкі не даглядалі,
Ці цябе ж пасцелькі не слалі?
З кім жа цяпер я астануся без цябе?
Усе дзеткі будуць на вуліцы гуляць,
А ты ж там з кім будзеш?
Пагасцюй у нас яшчэ хоць адзін дзянёчак,
Болі ніколі не будзеш у нас гасцюваць...

290. Дзетачка маё, галубятачка,
Саколічак ты мой ясны.
Да куды ты, маё дзетка, ад нас улятаеш?
Да дзе нам цябе шукаці,
Да ў каго нам цябе пытаці?
Пташачка мая пералётная,
Да ў якую гэта ты старану пералятаеш,
Да на каго ты сваю матку пакідаеш?
Салавеечка мой сізенькі,
Прашчабячы ты, мой салавейка,
Хоць адну сваю песеньку,
Парадуй ты, мая пташачка, сваю мамачку!

291. А ты ж пытаўся, чаму ў нас малыя ваконцы,
А цяпер не будзіць у цябе ніякіх ваконцаў.
А ты ж не будзеш чуць, як птушачкі будуць пець,
Як зязюлічка будзіць кукаваць,
А я ж ёй буду памагаць...

292. А мой жа ты сынулічка!
А мой жа ты лебядзюлічка!
А чаго ж ты, мой сынулічка,
Ад мяне ўцякаеш?
А ці я ж табе надаела?

А скажы ж, скажы, мой сынулічка,
А калі ты ка мне прыйдзеш у госцейкі:
А ці з васходу, а ці з захаду?
Каб я знала, мой ты лебядзёчак,
Калі ты прыйдзеш ка мне,
Тады б я нічога б не работала.
А ты ж паедзеш, мой сынулічка,
У хатачку дужа цёмную, безваконную.
А там жа дужа цёмна, мой сынулічка!
А тут жа ты дужа баяўся цёмнага,
А цяпер жа ты ідзеш
У хатачку цёмную і безваконную і не баішся!..
Гасцюй, гасцюй, мой ты сынулічка!
Нямножка ж табе ўжо ў нас гасцюваці.
Прасі ж, прасі, сынулічка,
Сваіх цёценек і дзядзенек,
Каб яны цябе прыбралі!..
Агарчыў жа ты мяне, маё дзіцятухна!
Знаць жа ты на мяне дужа разгневаўся,
Што ты са мной нічога не гаворыш?
Знаць жа ты, маё дзіцятухна,
Дужа богу ўгодзен,
Што ён цябе ад нас аднімаець,
К сабе ў выслужнічкі...
Прашчай, прашчай, мой сынулічка!
Прыходзіцца із табой расстацца на векі,
Мой ты сынулічка, мой ты лебядзюлічка!
Упраўляем жа мы цябе, маё дзіцятачка,
Проці лецічка, проці цёплага!
А ўсе ж дзетачкі
Будуць на вуліцы гуляці і красачкі ірваці,
А майго ж дзіцятачкі
Не будзець відаці...

293. А мой ты сыночак, мой яварочак!
І куды ж ты паедзеш?
А калі ж ты к нам у госці прыедзеш?
А із якой дарожкі я цябе буду ждаці?
А ці ўлетку ў чаўночку,
Ці ўзімку ў вазочку?
Я ж буду прыслухацца:
Адкуль ты будзеш ехаць,
Мой сынок, а мой жа ты яварок!

А калі ж мне цябе забыці?
Будуць дзеткі чародкамі ісці,—
Я ж буду прыгадаці:
Ці не сынок мой ідзе?
А мой сыночак, мой жа ты яварочак!
Дзе ж ты будзеш шчабятаці.
Ці ў барочку, а ці ў лужочку?
А ўсе птушачкі з выраю ляцяць,
І мурашачкі з выраю ідуць,
А ты, мой сыночак, ад мяне адкаціўся,
Ад мяне адваліўся,
А божа ж мой, божа! А мой сыночак!
Я ж цябе насіла, галасіла,
Раджала — умірала,
Гадавала — гаравала.

294. А мой жа ты саколічак! Да куды ж ты выбіраешся? А хто ж мне дравец прывязець? А хто ж мне ужо коніка дась з'ездзіць куды да небудзь? Да я ж, бабылка, цяпер саўсім прападу без тваё помачы.

А маё ж ты дзетухно! Да што ж гэта ўздумаў? Да ці табе тутацькі цесна было, што ты ад нас выбіраешся? Да ў цябе ж няма нікога роднага, штоб хто па табе плакаў і прыгуварываў.

Мой жа ты галубчык! Да ты ж тут усім пользачку прынасіў, да ўсе ж табою былі давольны, да ніхто ж цябе не судзіў, не гудзіў — усякі знаў, што ты прыгадзішся, аж ты на гэта не глядзіш.

295. Дзіцятачка маё даражэнькае!
Абламіла ты мяне проці цёплага лецічка,
Людзюхны будуць рабіць, а я буду слёзкамі заліваціа,
Мне не можна рабіць работачку.
Лучшы б ты мяне, старуху, пахаваў,
А чымся я цябе пахаваю, саколік мой любенькі!
Усе дзетухны будуць у грудачкі сабірацца,
А маёй дзетычкі нійдзе не будзець.
А маё ты дзетухна! Я з табою хадзіла,
Я цябе насіла, а цяпер ты мяне пакідаеш.

296. Мой жа ты даражэнькі!
Мой жа ты міленькі!
Куды ж ты глядзіш?

У якую ты дарожаньку ідзеш?
Ніколі ж я цябе не ўвіджу,
Паследні раз я цябе віджу.
Як ты быў маленькі,
Які ты быў вясёлы,
А цяпер ты хмарны.
Я ж цябе насіла,
Я ж цябе спавівала,
А што ж ты мне цяпер скажаш?

297. Дзіцятка маё роднае, дзіцятка маё мілае,
Куды ж ты ад мяне адлятаеш?
І з кім ты мяне пакідаеш?
Ці ты адлятаеш у лес за пташку,
Дзе я цябе глядзець буду?
Ці з пташачкамі лятаючы,
Ці з дзеткамі гуляючы?
Цвяточак мойродненькі!
Што ж ты ад мяне адсыпаешся:
Ці цябе ветрыкі адбілі?
Ці цябе дождзікі адмылі?
А загадала ты мне загадачку
І збуда[ва]ла сабе хатачку,
Хатачку новую, за адзін дзянёчак гатовую.
Хатачка твая цёмная,
І хадзіць мне к табе нельга будзець.
Як прыйдзець цёпла лецечка,
А пайду я ў зялёны лес.
Там кукулькі кукаваць будуць,
І салавейкі шчабятаць будуць,
І я буду слухаць:
Ці не маё чадзенька з пташачкамі песенькі пяець?

Куды ж ты гэта прыбраўся,
У якую дарожаньку і ў якую староначку —
Проціў лецечка цёплага,
Проціў урэмячка вясёлага?
Усе мурашачкі паажываюць,
Усе казявачкі павыпаўзаюць,
А мне будзець тошненька,
Як рыбачцы без вадзіцы,
А травіцы без расіцы,
Што людскія дзеткі цвяточкі ірваць будуць,

А не будзець майго дзетунькі;
Будзець ірвацца маё сэрданька.
Я ж цябе гадавала і думала,
Што ты мой пракапаннічак будзеш.
Хто ж маю старасць дагледзіць,
Хто ж мне пасцельку пасцеліць,
Як прыйдзець мая цёмна ночанька?
І хто ж мне пітунькі падасць?
А без свайго дзіцятачкі дзянёчкі мае будуць маркотныя.
Бяседунька мая маркотная,
Бяседунька мая пячальная!
Музыкі ў мяне не іграюць.
І радзінка мая песенькі не пяець,
Толькі адна я гаратніца
Хаджу да слёзкі лью.
Страшны мой дзянёчак —
Пахараніць мой мілы сыночак,
Дзетка маё мілае.
Як я з табой разлучуся?
Людскія дзеткі будуць на рабоце,
А мая галоўка будзець у забоце,
Што я з табой разлучылася.
Каб ты ад мяне было сагнатае,—
Я ж бы хадзіла, пыталася,
І я ж бы цябе нахадзіла;
Каб ты было забранае,—
Я ж бы цябе адсудзіла.
А як узяла цябе зямлічка,
Дык я цябе не найду,
Дык я цябе не адсуджу.

298. Дзіціна мая мілая,
Дзіцятка мая дарагая!
Да куды гэта ты, маё дзіцятка, убіраешся?
Да ў якую гэта ты пуць-дарожачку?
Як жа нам гэта без цябе жыці?
Да хто нашых будзе на поле коней вадзіці?
Пастушочак ты наш дарагенькі,
Асталіся твае конікі,
Асталіся твае любімыя.
Таварышы твае будуць па табе таскаваці,
Што ім не з кім будзець гуляці.

299. Мой сынок, мой Васілёк,
А я радавалася,
Што цябе ўзрасціла,
Маладога дзецючка,
Дарагога сыночка.
Мой Васечка, мой сынок,
А ты ж мне ўсё памагаў.
Я ж ужо думала,
Што болі горачка ў нас не будзе.
Ты мне і вадзіцы прынясеш,
І кароўку напасціш,
І сенца збярэш,
І скацінку накорміш.
Сынок мой, Васілёк мой,
Васечка мой, устань,
Я лягу на тваё месца.

300. Ой ты, мой сыночак!
Ой ты, мой харошанькі!
Да куды ты йдзеш адзін, такі малодзенькі.
А як жа без цябе мне быць?
А як жа мне свой век дажыць?
Устань, я лягу за цябе.
Ой, устань і йдзі да мяне.

301. А мой жа ж ты сыночак,
А мой жа ж ты міленькі,
А мая ж ты ягадка маленькая,
А мая ж ты кветачка найдаражэнькая,
А як жа ж ты раненька завяла.
А чаму ж ты мяне пакінуў?
А хто ж мяне будзя глядзець на такія годзікі?
А хто ж мне будзя памагаць?
А я ж буду адна без сыночка,
А ў мяне ж няма ні мужа, ні бацюхны,
А мая ж ты дзетачка,
А маё ж ты слонейка,
А то ж яно перастала нам свяціць,
А як жа ж нам было светленька, як ты жыў,
Як ты каля хаткі хадзіў.
А маё ж ты дзетанька,
А ты ж мне касіў,

А ты ж мне дроўцы сек,
А ты ж мне ўсё памагаў:
І бульбачку ўкапаеш,
І бурачкі звязеш.
А я ж нічога табе не памагала,
А цяпер жа ты мяне пакінуў адну,
як былiначку ў полі.
А як я буду хадзіць,
Як твае слядочкі буду лічыць?
А твае слядочкі ўсе дождж змые,
Пясочкам замяцець.
А маё ж ты дзіцятка,
А маё ж ты міленькае,
А ты ж ляжыш, як каласок,
А на цябе ж пташачкі шчабечаць.
А чаму ж зязюлечка прылятала да мяне,
У акенца стукала?
Яна ж вызывала цябе,
А ты ж у лясочку хацеў, муся, ёй памагаць
кукаваць.
А дзетанька, дзетанька,
А міленькая, міленькая мая,
А чаму ж ты такі вялікі ляжыш?
А ты здайся, як жыў,
Ты ж быў маленькі,
А цябе смертухна так выцягнула.
А маё ж ты дзетухна,
А ты ж касцюмчыка пры жызні не купіў...

302. Скабронічак прыляцеў,
То я на падворачку стаяла,
То ён мне песеньку граў,
А я чакала пісьмочка,
А ён мне атвецiў:
«Матуля старэнькая,
Ты тут не стаі,
Ідзі да свае хатанькі,
А мы там не ляцімо,
А мы пісьмачкаў не носімо,
ні целеграмачкаў
І з таёй стараны».
«А я не ўвяраю,
Я пад камушок бягу,

А белага паперчыка шукаю,
А там няма ні славочка, ні радочка...»

303. Ах, сынок мой родненькі,
Прыйшла касьба, людзі пойдуць з косамі,
А я буду аблівацца слёзкамі.
А дзе ж цябе спаткаці?
Якімі сцежкамі-дарожкамі ісці?
Можа, спаткаеш свайго роднага татулечку,
Раскажы яму пра сваё горачка.

304. Мой сыночак,
Мой любочак,
Да быў дубочак,
Да ляцела жэ бура,
Да зваліла дубочка,
Да майго сыночка.
А сыночак мой родны,
А сыночак мой да добры мой,
А дзіцятка маё,
А кучаравеньке маё,
А куды, сыночак, уязджаеш,
А куды, сыночак, адлучаешся,
А дзе ж я буду шукаць сваво сыночка?

305. Ой, мой дубанька кучаравы, дзе ж я цябе буду шукаць? Ох, дзе ж я цябе буду выглядаць? А хто цябе, мой сынок, хто цябе зваліў такога маладзенькага? Раба зязюлька будзе вясною каваці, а я ж буду свайго сына выглядаці, мо' зязюленькаю скінуўся ды прыляцеў каваці. Да чужыя хлопчыкі будуць ісці, а я свайго сынанька буду выглядаці, мо' дзе забавіўся.

306. Ой, мой ты дубочак,
А куды ж ты забраўся?
А хто ж будзе цяпер
Са мною вячэраці?
А каго ж я буду выглядаці?
А каго ж я буду адпраўляці?
Ох, мой ты саколік белы,
А чаго ж ты рассердзіўся на мяне?
А чаму ж слоўца не прамовіш?
Ці я ж цябе не прымала,

Ці я табе естанькі не давала,
Ці я табе жонку выбірала?
Ох, сынанька мой!

307. Ах, сыночак мой, галубочак мой,
Пташачка пералётная.
Так рана ўлятаць сабраўся,
З дзеткамі і з жонкаю папрашчаўся.
Ах, сынок, ах, галубок,
Што ж ты надумаўся?..

308. А мой ты сыночак,
А мой ты дарагенькі,
Мой ты каханенькі!
У якую далёкую дарогу ты сабраўся?
Чаму ты не ўстанеш?
Чаму не загаворыш?
Прыйшлі к табе твае таварышы,
сябры твае.
Чаму ты ім слоўца не скажаш?
А мой ты гаспадарочак!
А ты ж у мяне самы старшанькі быў,
Ты ж у мяне за бацьку быў.

309. А маё ж ты дзіцятка,
А мой жа ж ты саколік!
А куды ж ты ідзеш,
А каму ж ты мяне пакідаеш?
Я ж цябе гадавала,
Я ж цябе шанавала.
Як на дубочак, на цябе я глядзела,
А дачакацца помачы я хацела.
А ты ж мяне пакідаеш,
У сыру зямельку ўцякаеш.
А мой жа ж ты саколік,
Што ж я табе не дагадзіла,
Што ж я табе зленькае зрабіла?
Чаму ты, гледзячы на татку,
Асірочваеш бедну мамку?
А-я, я-я-я-я-я-я-я...
Дык што ж мне цяпер рабіці?
Каго ж я буду туліці?
Як жа я буду цяпер жыць?

А хто ж мяне будзе карміць?
Уцякла ад мяне ўжо сілушка,
У кручочак сагнулася спінушка,
Асталося мне мала ўжо жыць,
А хто ж будзе мяне хараніць?
А мой жа ж ты галубік!..

310. А дзетачка, а ты ж быў паслухмяны,
А мой ты Васячка, а маё дзетачка,
Ты ж нас не збадзяў.
А вы ж як пабольшалі,
Вас жа людзі смушчалі,
А вы ж нікога не слухалі.
З роднымі дзеткамі людцы так не жылі,
Як мы з вамі.
Учора столькі зорачак гарэла,
А сёння ўсе пагаслі,
Небачка пашарэла.
А мой ты Васячка,
Ты ж учора з намі гаварыў,
А сёння маўчыш.
А мой сынок,
Ніколі благога слоўца
Ад цябе не чулі,
Мы ж цябе лічылі
За роднага сыночка.
А цяпер мы болі не ўвідзімся,
Табой не пацешымся.

311. А сыночак ты мой міленькі,
Лепей бы я цябе цару аддала,
Чымся пахавала!
Я ж бы цябе дажыдала,
Я ж бы ўсё надзеілась з цябе хлеба!
А я ж думала цябе к толку прывесці,
Падружаньку табе выбірала...
А цяпер жа ўжо
І падружанька не трэба!
Лепей бы я цябе сусім не раджала,
Нячымся я цябе гадавала
І вялікага закапала...
Я ж над табой хварэла-балела,
А карысці ніякія не мела.

Я ж цябе не раз не забуду,
Пакуль жыва буду,
Усе слядочкі твае праплачу,
Вочанькі ўсе свае патрачу,
Па табе, мой сыночак міленькі!
Дажыдала я перамены-спомачы,
А даждала кручыны-немачы...
А хто ж табе, мой сыночак,
Цяпер пракукуець, прашчабечыць?
Ай, я ж па табе млею-гарую,
А ты ляжыш вясёленькі, спакойненькі...

312. Маё дзіцятачка маленькае,
А маё несмышлёненькае!
А куды ты ад мяне адлятаеш?
Не баішся ты ні голаду, ні холаду!
А выйду я цяпер на вуліцу,
А ўсе дзеткі там гуляюць,
Толькі майго нямашыцькі!
Абідзеў ты мяне, маё дзіцятачка,
Знаць, я большы за ўсіх саграшыла!
А ўсе птушачкі з выр'я вылятаюць,
А ты ад мяне адлятаеш!
Запусцела мая хатычка —
Некаму мяне разбудзіць і развесяліць...
Ножачкі мае маленькія,
Ножачкі мае міленькія,
Набегаліся вы і нагуляліся...
Тружданнічак мой невялічанькі,
Натрудзіўся ты і нагуляўся,
А цяпер ляжыш спакойненька...
Свадзебка мая горкая,
Свадзебка мая невясёлая,
Беза ўрэмя падышла ты!
Каго мне на ету свадзебку звацi,
Дзіцятачка маё міленькае?..

313. А мой жа ты сынулечка!
За што ж ты на мяне разгневаўся?
А вяселле ж тваё не вясёлае.
Ці я ж цябе не ўмела калыхаць?
А ці я ж цябе не ўмела даглядаць?
А ты ж дужа маленечкі!

А хто ж цябе там будзець даглядаць?
А хто ж цябе там будзець калыхаць?
Божа мой, божа!
За што ж я такая няшчасная?
За што ж я такая грэшная?

314. А дзетунька маё любае,
Куды ж ты выражаешся,
Насупраціў цёплага летца?
А цяпер жа ўсе пташачкі вылятаюць,
А цяпер жа ўсе казявачкі выпаўзаюць,
А ты глыбей патачылася,
А цяпер жа будуць усе рабяткі на вуліцы,
А цяпер будуць гуляць,
А як жа ўбіджу я іх,
А мне ж дужа будзець тошненька,
Дужа маркотненька.
А мне ж мае песенькі надаелі,
А яны ж мне надакучылі,
А яны ж мне наялычылі.
Вяселлейка маё невясёлае!
Не такое ж яно, як людское:
А людзі ж гуляюць па два дні і па тры дні,
А мы ж гуляем абыдзенныя вяселлейкі,
А няхай жа б гулялі б мы па два дні
і па тры дні,
А мы ж бы б весяліліся.
А нас жа пераломачка бярэць.
А каго ж ты будзеш прасіць падбратнічкам?
А каго ж ты будзеш прасіць падмузычнікам?
Каго ж ты будзеш сабе ў сваценкі браці?
Чаму ж ты свайго татачку не гукаеш на радачку?
Каторага ён табе будзець коніка выпраўляці?
Каторага ён табе вывадзіць будзець,
Табе вываджываці?
Толькі наняў ён табе плотнічкаў;
Ці па табе яны хатачку збудавалі?
Збудавалі табе сялібачку новенькую
і невясёленькую.
А няма ж жа ў ёй ні ўгольчыкаў, ні аконцаў,
Не ўстанеш жа ты, не паглядзіш ў ваконца,
Хто ж табе на сустрэчу выходзіць будзець?
Хто ж цябе падмовіў, падгаварыў?

Ці твае родныя цётачкі цябе туды падазвалі?
А ці ім там скушненька без цябе,
Што яны цябе туды падмовілі?
Табе ж быцца і тут было хораша жыці,
А чаго ж ты туды выпраўляешся?
А хто цябе сустракаць будзець?
Ці твае сястрыцы родныя?
А сыночак жа мой, а галубчык жа мой!
А ты жа ўчора за таткам і за сошкай хадзіў,
А сягоння ж ты і не гукаеш мне.
Што ж ты, мой сыночак, і на татку забыўся,
І ляжыш ты ціхонька і нікога не гукаеш
к сабе.

315. Сыночак, мой,
Мілы мой,
А ты ж мой дарагі,
А ты ж мой залаценькі,
І хатанька твая цёмная
Без аднаго акеначка,
І дзверачкаў няма.
А што ж дзверкаў не зрабілі,
Ключыкаў не ўлажылі,
То не адамкнеш,
То не прыйдзеш,
То не выйдзеш.
Як я цябе на работаньку выпраўляла,
Як я цябе спатыкала,
Як чакала,
Як ты мне памагаў.
Не ведала я, што там смертанька
стаяла для цябе,
То я б яе ад цябе адпіхаўшы
А сваімі ручанькамі,
Да сваіх грудачкаў старэнькіх туліўшы.
І пташачкі паснуўшы былі,
Не пастукалі ў акенца маё,
То я была б вадзіцы цябе занесшы,
То галоўку аблажыўшы,
То губачкі прамачыўшы...
А ручачкі мае, а белыя мае,
То вы асыпаліся,
То я лісточкі пабіраю,
То ў адну ручачку складаю,

Можа ж, вы зноў ручкамі стаўшы,
Мяне, матулю старэнькую, абняўшы...

316. Сыночак мой маленькі!
Куда жа выражаешся? У якую дарожаньку?
К якой жа дзеваньке едзеш у сваты?
А твая ж вяселля не вясёлая,
А твая свадзьба не прыятная.
Скажы ж, мой сыночак,
Чым мне цябе благаслаўляць?
Ці цябе хлебам, ці цябе соллю?
Ці цябе шчасцем, ці цябе доляю?
Ці цябе вобразам, ці цябе грошмі?
А табе ж гэта нічога там не нада,
Толькі трэба чатыры доскі,
Чатыры доскі ды сажань зямлі.

317. Сыночак міленькі,
Дубочак мой зеляненькі!
Вяселлейка наша не вясёлае,
І дужа яно не радасна.
Што ж ты гэта сабе ўздумаў,
Што ж ты гэта сабе змысліў?
Саколік наш ясненькі,
Лябедзька наш беленькі!
А што ж бы мая воленька,
Я ж бы цябе адмяніла,
Ці табе ў нас напрыкрыла,
Ці табе ў нас наскучыла?
Ідуць святыя праздічкі,
Ідуць святыя святачкі,
Я ж буду паглядаць,
І я ж буду пазіраць —
Ці не йдзець маё дзіцятунька?
Ці не йдзець маё любае?
Ці не йдзець пакорнае?
Паследняе наша павіданнейка,
Паследняе жа папрашчаннейка!
Суседзькі нашы мілыя,
Суседзькі нашы любыя!
Прасціце наша дзетунька
Паследняе павіданнейка
І паследняе папрашчаннейка.

318. Хрыстос васкрэсе! Хрыстос васкрэсе, маё дзіцятачка! А ўкруг жа цябе, майго дзіцятачкі, да ўсё так прыгожанька, цяпер і бярозачка ўжо ў лісцейку, і ты ж не ўстанеш, сірацінка мая бедная! А цяпер жа і мотачка на свет божы выходзя, і цыплёначак з яечка выклюецца, і лісточак і травіначка вылазя на цёплае соннейка, адзін жа ты, горкі мой сыночак, з зямелькі не выйдзеш...

319. Яблычка маё недаспелае,
Ягадка мая недазрэлая!
Дзетанька маё міленькае,
Дзетанька маё любенькае!
Лісточак мой зялёненькі,
Цвяточак мой чырвоненькі!
Без пары ты адпадаеш,
А мне пячаль пакідаеш,
Пташачка мая любенькая!
Салавеінька шэранькі, шчабяцяннічак мой!
Ты ж гаворыш, як салавейка шчабечаш.
Ты ж хацеў быць татку пераменачка,
А цяпер проці лецічка цёплага
Здзелаў нам пераломаньку вялікую.
Усе пташачкі заспяваюць,
Усе казявачкі пааджываюць,
Усе мурашачкі павыпаўзаюць,
Усе рабяткі на вулку павыбягаюць,
А цябе нідзе не будзець.
У пясочак закапаюць,
Дужа мне будзець тошненька,
Дужа мне будзець маркотненька,
Што цябе, салавеюнькі, не чуць будзець
шчабечучы,
Адкуль я буду цябе спадзявацца,
Адкуль буду дажыдацца?
Хто маю хатаньку даглядзіць?
Хто скацінку прагоніць?
Хто татку па коніка збегаець?
Пацера наша вялікая,
Пацера наша дарагая,
Пацяралі мы сыночка,
Пацяралі дарагога.
Вот паследні разочак
Цалую цябе, сыночак.

320. Плачаць маць па вас заўсягда ў начное ўрэмя, кажную мінуту; сэрца маё абліваецца кроўю: не магу я жыць на белым свеце, не магу дасадушкі перанесць.

Сынок мой мілы, сынок мой дарагей, сынок мой вазлюбленны, і рада б я была б як бы вы мне прагаварылі!..

321. Сыночак мой міленькі,
А затуманіліся твае вачаняткі,
А закацілася сонейка яснае.
А ты ж жыць ідзеш у сыру зямліцу.
А мой залаценькі,
А мая ж птушачка, а шчабятушачка,
А чаго ж ты раненька ад мяне ўбягаеш,
А мяне адну-адну сваю матараньку пакідаеш?
А я ж думала, вочы прагледзела:
Ты прыйдзеш дамоўкі ў нядзелю.
А прыйдзеш ціхенька, ой і ціхенька,
Сваю матачку не разбудзіш нават
Ды і аддыхаць будзеш пасля работанькі.
А мая рыбанька залаценькая,
А ты ж як пакупалася,
Так не паднялася.
А маё сонейка, а хто ж свяціць будзе мне?
А мне ж будзе гаранька
І на зямлі без цябе.
Пайду ж адна ў Нёман —
Можа, і мяне забярэ,
Калі праглынуў ён, сівы,
Дзіцятка маё.

322. А чаму ж ты наша хадзяйства не папуціў? А чаму ж нам новую хатку не здзелаў? Ці ў нас жа чаго табе не даставала?

323. Ох, мой сыночак,
Ох, мой родны!
Ох, якія твае раны вялікія.
Хто ж табе іх перавязваў,
Хто табе кроў замаўляў,
Як ты, мой сыночак,
Разбіў так галаву.
Ох, ты ж мой сокал,
Ох, ты ж мой месяц ясны!
Ох, нашто ж табе буў

Гэты матацыкель?
Гэта ж я не знала,
Шчо гэта смерць твая,
Я б яго сакераю пасекла.
Ох, мой дубе зялёны,
Ох, мой явар высокі!
Няхай бы ты мне сказаў,
Якая ў цябе дзеўчына була,
То я б яе пазвала б,
Няхай бы яна табе нарадзіла.
Ох, мой сынанька,
Ох, мой родны!
Як людзі сказалі,
Шчо ты на дарозе ляжыш,
То я ўся занежывела,
Але 'шчэ мацерына сэрца здарова
Яно не лопнула і не разарвалася.
Ох, як жа мне выдзержаці
Гэту бедаиьку,
Ох, як перанесці,
Шчо ты ж такі малады
У зямлю папаў,
А я 'шчэ жыву.

324. А мой сыночак,
А мой галубочак,
А ты ж круценькі быў,
Усюды ж ляцеў, усюды ж далятаў.
А куды ж ты адлятаеш?
Я ж цябе болей не ўвіджу,
Болей не пачую.
Адкуль буду пераймаць,
Да дзе буду пазнаваць?
Ці я на вуліцы?
Ці я на свадзьбе?
А я ж думала, даждуся нявестачкі,
Аж ты ўстроіў вяселлейка,
Надта ж не вясёлае,
Надта ж не паравое.
А я ж думала, даждуся за табой
аддыхнуць,
Аж ты адчураўся мне памагаці.
А хто ж мне будзе памагаці?

У каго ж я буду старасць дажываці?
А хто ж мне будзіць памагаці?
А ні ў мяне братоў,
А ні ў мяне сясцёр,
К каму я прыхінуся?
Дзе мне помач знайсці?
Хто ж мяне будзіць даглядаць?..

325. А мой сыночак,
А мой дарагі,
Чаго ж ты нас абідзеў?
Нашто ж ты нас пакінуў?
Мы цябе прасілі,
Мы цябе выручалі,
А ты апяць так надзелаў,
Яшчэ й хужай...
Усягда прасіла:
З водкай штоб быў астаражней,
Штобы зберагаў сябе.
Нам жа удваіх няплоха было,
А цяпер аднэй — што дзелаць?..

326. Сыночак ты мой мілы, сыночак ты мой любімы, вішанька наша дарагая, вішанька наша не сазрэлая, яблычка маё наліўное, яблычка не назрэлае, куды ж ты ад нас, неназрэўшы, адлятаеш?

Дзетанька маё мілае, а я ж то думала: вырашчу цябе, дзетанька, тапер на ўцяшэнне, а пры старасці лет на зберажэнне,— а ты ж то, маё дзетачка. адлятаеш ад нас!.. Загадаў ты мне загадачку, а я ж гэтай загадушкі не магу ні раздумаць, ні разгадаць, ні добрым людзям расказаць. Ды, мая дзетачка, няўжлі ж я цябе не ўмела расціць, не ўмела карміць? Я ж бы свайго дзіцёначка знала, як на работушку пасла͡ць і як з работушкі даждацца. Саграшылі мы госпаду богу, прагнявілі мы госпада бога; не ўмела я госпада бога прасіць, штоб мой дзіцёначак вырас. Надзежда ты мая верная, надзеждушка мая крэпкая, а куда ж ты, мой сыночак, ад нас адлятаў?

Адкуль жа нам цябе, дзетушка, дажыдаць, с каторай старонушкі? Каторую дарожкаю цябе сустракаць?

Сыночак ты мой, цяпер жа ты мяне агарчыў да крайнасці! Мы ж на цябе надзеяліс і начаяліс. На каго ж цяпер

нам надзеяцца і на каго ж нам цяпер начаяцца? Цяпер, маё дзецятка, усе нашы углушкі запусцелі.

Падвар'я маё мілае, падвар'я маё любімае, і дзе ты, мой сыночак, уцяшаўся і гуляў!..

Цяпер, мой сыночак, не магу пра цябе забыць: і дзе я ні хаджу, усё пра цябе думаю...

Свой і галодны ідзець і халодны — ні к чужым ляк; чужога і кармя не ўкорміш, і пая не ўпоіш.

О када б ён быў жыў, не хадзіў бы па чужых углушках! Парадушка наша верная, парадушка наша мілая, як нам цябе забыць?

327. Паціхусеньку вы, мае дзядзечкі,
Яго вы снімайце!
Яго ж костачкі дужа больныя!
Ці прасіў жа ты, мой сынулічка, свайго
татулічку,
Каб ён запрог табе свайго коніка
Заехаць у хатачку дужа цёмную, безваконную?
Замкнуць жа цябе, мае дзіцятачка,
Трыма замочкамі.
Первый жа замочак — грабовыя дошчачкі,
Другей жа замочак — жоўты пясочак,
А трэці замочак — травачка-муравачка...

328. Гу! Гу! А мой ты сыночку, мой галубочку, а я вячэру варыла, у мяне прыпечак гуляе!

Гу! Гу! А мой сыночку саколіку, мой галубочку, у мяне за столікам мясцечка гуляе!

Гу! Гу! А мой сыночку, мой галубочку, мая зорачка ясная, хадзі баржджэнька да мяне вячэраць, а ўсяго смашнага наварыла!

329. Дзяцёнак мой,
Мілёшанькі мой,
І сыночак мой,
Ягадзінка мая —
Не спелая,
Не зрэлая!
Дзяцёнак мой,
І міленькі мой,
І сынок мой дарагі!
Адкацілась жа ты,
Ягадзінка мая нязрэлая;

Адкацілась жа ты ў сырую зямлю,
У сырую зямлю, у жоўты пясочак;
Сыночак жа мой,
Мілёшанькі жа мой!
А я ж адкуль не йду,
Як у хатуньку прыйду,
Я ж не даражыла
Ні работай, ні заботай.
А я ж, мой дзяцёначак,
Мой мілёшанькі,
Адкуль жа я з работы прыйду,
Перва цябе на рукі вазьму,
Сынок жа ты мой прыятны,
А як прыйду ж я цяпер у хатаньку,
Стану цяпер сярод хаты —
Ніхто ка мне не бягіць,
Ніхто не сустракаіць,
А я ж пагляджу на ўсе старонушкі,
Ва ўсе ўголушкі —
Нет жа майго прыятнага сынка нідзе.

330. А з кім мне цяпер гаварыць,
Мой Мікітка, мой сынок,
Толькі з шэрай зязюлькай,
Толькі з пустой хаткай.
А цябе ж павязуць
У бор баравы,
У жоўтыя пясочкі,
У цёмныя скляпочкі.
Мой Мікітка, мой сынок,
Застанься ў мяне,
Не пакідай мяне адну,
Не кідай мяне ў пустой хатцы.

331. А я ж к табе, маё дзіцятачка,
Буду хадзіць кажны дзянёчак!
Я ж буду па табе кукуваці,
Цябе ў госційкі к сабе зваці...
Як жа мне забыцца
Еткага дзіцятачку, еткага любенькага?
Ён жа весяліў усю нашу сямеічку...
Мой ты дзіцятачка,
Мой ты любенькі сыночак!..

332. Што мне нарабілася,
Што мне натварылася!
Ой, гукаю, гукаю каторы суткі,
Да й не дагукаюся
Сваёй роднай дзетачкі.
Ой, зашчабячы, мой салавеічка,
Зашчабячы, дарагі мой,
Зашчабячы вясёленька.
Я ж не нахаджу свайго салавеічкі
Да за столькі сутак.

333. Ох, сынок мой залаты,
Ох, сынок мой дарагі,
Ох, ручкі мае дарагія,
Ох, ножкі мае залатыя,
Ой, дзе ж вы хадзілі,
Дзе ж вы, ручкі, рабілі?
Ой, галоўка мая кучарава,
Вой, галоўка мая кудрава.
Ой, прачніся, мая радзіна,
На сягодняшні дзянёк,
Да паслухай, мая радзіна, мой галасок.
Ой, да зараслі ж яго сцежачкі,
Да зараслі ж яго дарожачкі,
Ой, да кудою хадзілі,
Да кудою ж хадзілі яго ножачкі.
Ой, ножачкі не ходзяць,
А ручкі не робяць.
Ох, божа ж мой, божа,
Пачаму я няшчасна такая ў бога?

334. А мой сыночак, мой дубочак,
Да я цябе трудненько гадавала,
Да на вайну маладзенькага адправіла,
Да нідзе наш сыночак цяпер без спогадзі і ласкі.
А мой сыночак вясёленькі,
А мой сыночак і добранькі,
А дзе я свайго сыночка найду,
З якога боку я буду выглядаці, і мой сыночак,
А мой сыночак, мой дубочак.

335. Сыночкі мае, верныя мае,
Ох, Колічак, мой сыночак, залаты, дарагі,
І гармонечка паліцаі забралі,

А мой сыночак ляжыць, да трэба пахаваць.
Ох, сыночак, цвяточак,
Сыночак і верненькі мой,
Я цябе гадавала, да цябе трэба пахаваць.
І ў службу не адпраўляла, і не жаніла,
І сыночкам хаты не астаўляла,
Сыночкі мае, цвяточкі верныя,
Ды трэба ж пахаваць вас пяць.
Ох, ды тыя ж меншыя, а Колічак жаніхом,
Мой жанішок, мой залаты.
І ў армію не адпраўляла, не жаніла.
Мой сыночак, завідую, як ходзяць і к мацярам, а мацеры к ім,
А я ж завідую, мае сыночкі,
Ні ў каго ж пяць не пахавана, адна я.

336. А мой Валодзечка,
А нахадзіўся, а наскітаўся
Па лясочках, па кусточках.
А гэта нячыстая сіла
Забіла майго сыночка.
Каб гэтыя фашысты згарэлі,
Каб іх ваўкі паелі.
Мой Валодзечка,
Мой сынок даражэнькі,
Ты ж падніміся, устань.
Як вайна кончыцца,
Тваё таварышы папрыходзяць,
Табе вестачкі папрыносяць.

337. Дарагі мой сыночак, маладзенькі ты такі!
Я ж думала, сынок, што буду цябе праважаць у армію,
А прыходзіцца праважаць на той свет,
Што ніхто адтуль не варочаецца.
Чаму ж я такая няшчасная і не даў мне бог
Праважаць сынка ў армію і страчаць яго?
Мой дарагі малалетачка, мая дзетачка, як мне быць?
Я не знаю, што рабіць.
Сабраліся твае аднакласнікі
І ўсе к табе падходзяць па аднаму,

А ты, мой сыночак, маё птушанятка,
Не адказваеш нікому.
Мой сынок, мой галубок,
Ты ж быў у нас такі шустры,
Што ўсё бягом хадзіў і хутка рабіў,
А сягоння як жа ты церпіш і не бяжыш
І не памагаеш мне рабіць і маўчыш?
Вот як сталася, як злая смерць зрабіла
З маім сынком.
Як яна замарыла і забрала ад нас цябе.
Ты ж, сыночак, на канікулы ехаў заўсёды
К дзедушку і бабушке і памагаў ім там.
Дзедушка кажа, што ты ўмеў добра касіць
і грабсці,
Абганяць бульбу і ўсё цябе дзедушка навучыў.
Ён сядзіць ля цябе і гаворыць,
Што яму цяжка, старэнькаму,
Што не будзе памочніка дарагога.
Ён жа заўсёды ажыдаў цябе ўжо ў чэрвені.
Дзякуй, мой сынок, табе за работу.
Мой работнічак маладзенькі,
Мой сыночак даражэнькі!
Я ўжо трэйці дзень заву і цябе прашу,
І татка твой гаворыць з табой,
І мая мамка — твая бабушка, і дзедушка,
А ты нікому ні славечка.
Мой дарагі сыночак, які табе домік зрабілі,
Як хораша прыбралі.
Толька ў тваім доміку ні акенца, ні дзвярэй,
Як жа ты там будзеш ляжаць у цемры і холадзе?
Ніяк я не веру, што цябе больш не буду бачыць
і чуць,
А толькі ўспамінаць, як ты хадзіў і рабіў.
На той год мы цябе праважалі б у армію
І ажыдалі б цябе.
А злая смерць не дала нам гэтага.
Чаму ж мы такія няшчасныя!
Вот, сыночак, яшчэ я з табой і не ўсё
перагаварыла,
А ўжо нясуць твой домік і будуць цябе класці.
Кладзіце, мае людцы, памаленьку
І нясіце яго паціхеньку.
Ён жа вельмі бальненькі, у яго галоўка баліць.

Дарога ў нас нядоўгая, але ж цяжкая
і ўжо пасledняя.
Мамка мая, любка мая, галубка мая,
Папрасі майго сыночка — твайго ўнучка,
Каб ён нас навяшчаў —
Хоць салавейкам або галубком прылятаў.
Ну вот ты, сыночак, нікому нічога не гаворыш.
Ужо, сынок, дайшлі да твае магілы.
Якая яна глыбокая, якая яна шырокая,
І ты не збаішся і астанешся тут адзін,
Мой сынок, мой маладзенькі галубок.
Прасці, мой сынок, можа я цябе калі ругала
за што,
Але ж я ўсяму добраму вучыла.
Бацька ў цябе просіць, каб ты прачнуўся і ўстаў,
Але ж гэта немагчыма — мы знаем.
Пасledні раз цябе бачылі і праводзілі
У пасledнюю дарогу.
Прашчай, наш сынок, наш дарагі,
Прашчай, наш сынок, наш мілы!
Як многа пясочку на твой домік насыпалі,
Якая магілка глыбокая і шырокая.
Прашчай, наш сыночак, наш дарагі галубочак,
Усе твае таварышы і таварышкі адыходзяць
І пацяшаюць мяне, што яны будуць навяшчаць нас
І памагаць нам.
Каб ты бачыў, як бабка абгладзіла тваю магілку,
Якая яна гладзенькая!
Не адарваць яе ад магілкі, усё заве цябе,
А ты не адзываешся.
Прашчай, мой сынок, прашчай, мой галубок.
Пойдзем, мая мамка і татка,
Ужо няма майго сыночка,
Да свідання, мой дарагі!

338. Дарагі сынок,
Куды ты сабраўся,
У якую сторану пойдзеш ці паедзеш?
У якую часць?
У танкісты ці артылерысты,
Ці маракі сабраўся?
Не хочаш гаварыць.
Ручкі мае залатыя,

Як яны работалі, як стараліся,
А цяпер усе злажыў
І нічога не хочаш гаварыць з маткаю
І сабраўся ад'язджаць...

339. Ох, мой сынок даражэнькі!
Скажы ж мне,
Хто твае раны перавязваў,
Як ты схадзіў кроўю?
Хто цябе лячыў?
Ох, мой дубочак зялёны!
Гэта вайна праклятая
Цябе ад мяне адняла.
Ты ж недзе енчыў,
Ты ж прасіў рады.
Тваіх друзей усіх пабілі,
А я ж цябе жду,
Вестачку ажыдаю,
А ты мне славечка не даў,
Дзе твая магілка е?
Мой сыночак, мой родны,
Катора ўрэмячка жду,
А ад цябе вестачкі няма,
І я больш цябе не пабачу...
На тваю работу гляну,
Шчо ты мне пакінуў,
І заўшэ цябе спамінаю.
Вочы твае ў сне бачу.
Дарагі сын мой,
Каб знала, дзе твая магіла,
То б да цябе крыльмі ляцела б,
Хоць магілу пабачыць.
Сыночак мой, дубочак зялёны!
Праклята вайна цябе ссекла,
Так, як дуба з пня.
Ох, сынанька родненькі!
Я ж думала нявестку маці,
Шчоб мяне наметкамі вязалі.
А я ждала і не даждалася.
Я мусіла і рукавязнікі,
І ручнікі ў цэркаў даваці,
З аброкам у цэркаўісці.

340. А дзіцятухна мае роднае,
А я цябе цяжанька гадувала,
А я думала на пацеху,
А ты даўся мне на дасаду,
Я цябе адпраўляла
У далёку чужу сторану.
А паехаў ты чужу зямелюшку таптаць,
Гарачую кроў праліваць.
А ты скажы, мая дзіцятухна,
Ці прыляціш ка мне шэрай пташачкай,
Ці ні ясным саколікам,
Ці соўнейкам уўскоцішся,
Ці ветрыкам узвеішся,
Ці на коніку прыедзеш,
А ці лецічкам у чаўночку,
А ці зімачкай у вазочку?
Я ж таго і не ведаю,
Калі цябе дажыдаць,
Якія вароты расчыняць,
У якое акошка наглядаць?
Наляцелі на цябе люты звеpы,
Загубілі цябе, маладзенькага.
Я не знаю, дзе тая магілка,
Дзе ты палажыў сваю буйную галовачку.
Я не відзела цябе ляжачага,
Хто прыкапаў твае костачкі,
Ці іх пташачкі скляваліʔ
Хто мяне, старэнькую,
Прывітаць будзець,
Хто мае костачкі прыкапаець?
Не чула я вясеначкі,
Не пяялі ж мне пташачкі,
Не кукуяла зязюлька,
Не відала я цёпла лецічка,
Не свяціла мне ясна соўнейка,
Што так рана яно закацілась,
Што мне свяціць перастала,
Сталі цёмныя ўсе дзянёчкі,
І не ўвіджу я твой слядочак,
І не ўчую я твой каласочак.

341. Мой сыночак даражэнькі,
Мая ягадка любая,

На каго ж ты мяне пакінуў?
А да каго ж мне цяпер прыгарнуцца?
Да каго ж мне словачка сказаць?
А каму мне сваё горачка паведаць?
А ці помніш, як расціла я цябе,
Як маленькага ў люльцы калыхала,
Як песні над табой спявала?
А я ўсё думала, што сыночак мой жывы
будзе,
Што на старасці ўцехай будзе мне,
А я ж глядзела на цябе, не наглядалася,
Маё сэрца чула нешта нядобрае,
Як бы чула хуткую разлуку.
Я ж так табой даражыла,
Мая зорачка ясненькая.
А як пойдзеш ты куды гуляці,
Маё роднае дзіцятка,
Я ж чакаю цябе, не дачакаюся.
Свае вочы прагледжу я,
Дажыдаўшы сына любага...
Мая рыбачка даражэнькая,
Ну, глянь ты хоць разок на сваю мамачку,
Як яна слязою горкаю абліваецца,—
А як жа мне цябе забываці,
А як жа мне ад цябе адвыкаці,
А я ж хаджу па тваіх слядочках,
А ты ляжыш ужо ў сырой зямельцы,
А не ўспела яшчэ добра ягадка саэрэці,
Наляцелі чорны вораны
І зацьмілі сонца яснае.
А як я цябе выпраўляла
У пуць-дарожку нялёгкую,
Я ж табе тады наказывала,
Мой сыночак даражэнькі,
Каб ты за свайго татачку адпомсціў,
Звяроў лютых выгнаў ты
З нашай роднае зямелькі.
Твой татачка раней цябе пайшоў
Зямлю родную бараніць,
Наша шчасце адстаяць,
Каб твае ясныя вочачкі
Не бачылі гадзіны праклятай.
Два гады ён біўся крэпенька,

Не шкадуючы свае сілачкі,
Але насунулася туча чорная,
Празвінела куля вострая
І папала ў галовачку
Твайму тату роднenькаму.
І паклаў ён сваю буйную галовачку
А дзесьці на чужой староначчы.
А як жа мне гэта горачка перажыць,
А ўся надзея на цябе была,
Мой галубочак шызакрылы..
За свайго ты татачку адпомсціў,
За нашу спаленую хатачку,
Але і сам лёг смерцю храбрага.
Няма меры майму горачку,
Маё сонейка ты яснае,
Дарагі ты мой сыночак, залаты,
Спі спакойна, мая ягадка.
І мне не сорам за цябе:
А загінуў ты, сыночак любенькі,
Як верны сын сваёй мацеры
За сваю зямлю родную,
За сваю маці-Радзіму.
Сыночак мой даражэнькі,
Ну, скажы ты мне хоць словачка,
Адкрый свае вочачкі ясныя.
Няма ўжо фрыца праклятага,
Твае таварышы адпомсцілі
І за тваё жыццё маладое,
І за маю галаву сівую,
І за мае слёзы горкія,
І за ўсе мае пакуты.
Жывём зараз мы свабодна зноў,
Толькі ўсіх не далічыліся,
І няма майго сыночка любага,
Ні хазяіна майго дарагога...

342. А мой жа ты саколічак,
А як жа ты туды папаў,
Што на чужую старонaчку
Свае костачкі паклаў.
А не прыйдзе на тваю магілачку
Ні сястра, ні мамачка,
Толькі ветры буйныя павеюць

Ды птушкі заспяваюць.
Мой сыночак любы,
Мой салдацік дарагі,
Ты зарыты ў сырой зямельцы,
А твая мамачка чакае цябе;
А як даведалася, што паклаў ты сваю
галовачку
Ды на чужой староначчы,
Дык часцей стала хадзіць на магілачкі,
А над чужымі магілачкамі
Боле стала рыдаць.
Ой, устань жа ты, мой саколічак,
Паглядзі, што робіцца навокала.
Ужо няма праклятай гадзіны,
Што таптала нашу зямлю родную,
Убівала нашых дзетачак,
Выганяла нас з хатачак.
Многія дамой варочаюцца
З пабедай і вялікай радасцю;
Мой жа ты саколічак,
Можаш спаць спакойненька,
За цябе твае таварышы адпомсцілі,
Ворага лютага разбілі,
І няма яму нідзе прыстанішча.

## ПА ДАЧЦЭ

343. Ах, мая ж ты квятэчка,
Ах, мая ж ты пташачка!
Куды ж гэта я цябе наражаю?
Куды ж гэта я цябе выпраўляю?
Ой, ня ў цэркаўку пад вянец зеляненькі,
Ай, на магілу ў пясок сырэнькі.
Ах, хто ж мне цяпер зашчабечыць?
Ах, хто ж мяне цяпер да й пацешыць?
Хто будзіць старасці маёй пільнаваці?
Хто будзіць мяне матулькай цяпер зваці?
Ах, ці ж гэта мне нада цябе хаваці?

344. Донька мая міленькая,
Донька мая любенькая,
Упусціла я сваё дзіцятка,
Ой, калі цяпер прыжду?
Ой, калі ж цяпер прыжду,
Калі яна ка мне ў госці прыйдзе?

345. Дзіцятка ж ты маё родненькае,
Пташачка ж мая ненаглядная,
Куды ж ты далёка ад мяне адлятаеш?
Чым жа табе ў тваёй матухны не спазрылася?
Яблычка ж ты маё сахарнае!
Чаго ж ты, не сазрэўшы, адкацілася?
Цяпер жа ка мне ніхто не прыласкаецца
І не прыгорнецца.
А бывала ж ты, як тая ластавачка,
Усё мне расшчабечаш.
А соўненька ж ты маё краснае,
Чаго ж ты без пары так раненька закацілася?
А цяпер жа я куды не пайду — цябе не знайду.

Адкуль не прыду, ты мяне не ўстрэціш
І пацешнага славечка мне не прамовіш.

346. Дачушачка ты мая родненькая!
Лепей бы я цябе ў людзі аддала,
Чым на тэй свет прыбрала!
Лепей бы ты, мая дачушка,
Красавалася
І жыўшы весялілася,
Чымся ляжаць будзеш
У сырэй зямеліцы,
На цвёрдай пасцеліцы!
Ягадка мая недазрэлая,
Без пары ты адвалілася,
На етым свеце не павесялілася...
А ты ж у мяне адна была,
Як рожа ў садзе цвіла!
Хто ж маёй цяпер старасці прыглядзіць,
А хто мне пры старасці
Естанькі, пітанькі падасць?
Дачушачка мая міленькая,
Куды ж ты прыбралася,
У доўгую дарожку сабралася?
Ні разу ж ты ка мне ў госці не прыйдзеш,
А я ж цябе буду ждаць-ждаць і не даждуся!..

347. А скажы ж ты мне, скажы, мая й дзетачка,
Куды ж ты сягонні так заранніка сабіраешся,
А ты ж прыбралася, мая дзетачка, дужа красівенька,
А я ж думала, што я цябе прыбяру ні ў такую
і бяседачку,
Я ж думала, што мы будзем, мая дзетачка,
лі цябе пець песенькі,
Ажна мне прышлося, мая дзетачка, пець песні
саўсім другім галасочкам.
Дзетка мая дзетка, дзетка мая мілая,
Ягадка мая, ягадка несазрэлая,
А заранейка ты ж, мая ягадка, адвалілася,
А заранейка ты ж, мой цвецік, адцвіў
ды абсыпаўся.

348. А дзіцятка маё маленькае,
А ягадка мая недазрэлая.

А куды ж ты ад мяне адлятаеш,
А кім жа ты ка мне праявішся?
Ці казявачкай, ці мурашачкай,
А ці шэранькай зязюлечкай,
Ці маленькай дзіцятачкай?
А дачушка,
А твая ж хатачка дужа цёмная, дужа цесная.
А хто ж цябе забаўляць будзець,
А хто ж цябе калыхаць будзець?
А ты ж дужа маленькая...

349. Маё ж дзіцятухна, маё ж любенькае!
Я ж цябе раджала — уміpала,
Я ж цябе гадавала — гаравала,
Цёмнай ночкі недасыпала.
А цяпер жа мне некага зацяваць,
Некага пасылаць.
Ты яблачка маё, сахарнае маё,
Недазрэўшы, адвалілася!
Галоўка мая буйненькая!
Чаго ты рана пакацілася?
Вочкі мае ясненькія!
Чаго вы рана заплюшчыліся?
Ручачкі мае беленькія!
Чаго вы рана сашчапіліся?
Ножачкі мае бодранькія!
Чаго вы рана падламіліся?
Госційка мая любенькая!
Адкуль жа мне цябе дажыдаць?
З якія дарожкі?
Чаму ты са мною не вітаешся?
Чаму ты са мною не пращчаешся?
Чаму ты са мною не гаворыш?
Адкуль мне цябе дажыдацца?
З якія дарожкі і з якога боку?
Служачка мая любенькая!
Нашто ж ты мяне пакінула?
Каго ж мне цяпер зацяваць,
Маё гора памагаць?
Выйду я на вуліцу, пагляджу —
Людскія конюхі вядуць,
Ранішніцу гонюць.

А я, бедная, слязамі абліваюся,
Чужому укланяюся,
Што некага мне зацяваць.
Бывала ж я выйду на жніво ў поле,
Сама стану жаць, а ты кала мяне,
А ўвечары ты мне і снапочкі паносіш,
А я ж цяпер адзінокая:
Мае і снапочкі непаношаныя.

350. Дзетачка мая родная,
Рожа ты мая чырвоная,
Адцвілася ты, мая кветачка,
Нагаравалася ты, мая дзетачка,
Пташачка мая, ластавачка,
Да чаго гэта ты перастала шчабятаці?
Зачэм гэта ты задумала нас пакідаці?
Донечка мая мілая!..
Доля ж мая нешчаслівая!

351. А мая ты дачушачка,
З кім ты мяне пакідаеш?
А лучша б ты мяне прыбрала,
Чым прыбрам я цябе.
Даждала я слугі, сама што пажыць,
А цяпер астаюсь адна,
З кім ты мяне пакідаеш?
А ўсе твае дарожачкі і сцежачкі,
ідзе ты хадзіла,
Я слёзкамі абаллю.
Хто мяне цяпер пераменіць?
Хто мяне пажалеець?

352. А дачушачка мая родная,
З кім жа ты мяне пакідаеш?
А на цябе мая ўся надзеждачка была,
А дачушачка ты мая, а хто ж мне будзець
памагаці?
У людзей дочкі растуць і красуюцца,
А ты, мая дачушачка, і не напацешыш,—
Як ты мяне прэжды пацяшала.

353. Ой-ой-ой! Ой, мая ж ты дочанька!
Ой, маё ж ты золатка!

Чаго ж ты нас так рана пакінула?
Ой, устань, устань, мая Валечка!
Ой, мая ж ты кукалка!
Хто ж мэні тэпэр будэ памагаты?
Ой, мая ж ты зузулечка!
На каго ж я тэпэр буду дывытыся?
Чаго ж ты так рана пайшла ў сырую зэмэльку?
Ой, мая ж ты дочанька!
Ой, мая ж ты ненаглядна!
Ой, устань, устань, мая кукалка.
Ой-ой-ой...

354. Мая галубачка, мая ластачка, мая залётная!
Лябёдачка мая беленькая! Зязюлечка мая, кукушачка!
Ад мяне адлятаеш, а з кім жа ты мяне пакідаеш?
А хто ж цяпер нашу радачку парадзіць?
Да гадавала я сваю дачушачку любую і мілую,
А я ўсё думала, што мая дачушачка будзець росць год ад году,
Дажыдала сабе пераменачку — да не даждала,
Ажно мая дачушка мне зрадзіла.
Нашто ж ты мяне пакінула горкую і няшчасную?
Да і вазьмі ж ты мяне з сабою!
Не дарам я сягоння сон відзела:
Закацілась зорачка ясная —
Ажно мая дачушка ад мяне адказалась.
Да ці ж то ета думала?
Чула, мая дачушка, чула.
Да ні разу я на сваю дачушку не надзеялась.
Як толькі маё дзетачка заплачаць,
Дык я к ёй бягу, аж спатыкаюся,
Не давала ёй ні піскнуць, ні віснуць.
Да божа мой, божа! Агарчылася я цяператка на век,
Да не ўвіжу я сваёй дочачкі ні разу!
А як жа яна хварала, дык я ёй і пірог і яблака давала,
І мёд у роцічак клала, штоб мая дачушка выздаравела,
А яна ж нічога не брала і на тэй свет душачку адправіла,
А яна ж то мне і прала, і ткала, і харашо вышывала.

355. А бяроза мая кудравая,
А ці ветры цябе падвеялі,
А ці буры цябе падламілі?..

356. Госційкі мае любыя, госційкі мае мілыя,
Сабраліся вы на бясёданьку на маркотную.
Павалілася наша бела бярозунька,
Павалілася наша кудравая,
Дачушка мая любая!
Што ж ты гэта сабе ўздумала проці зіманькі лютае?
Я сама нездарова, хто жа плацийца памыець,
Хто мае ручкі адменіць?
Я ж гэтага не спадзявалася,
Я ж гэтага не надзеялася,
Каб ты зрабіла гэту пераломаньку
Проціў зіманькі студзёнае,
Проціў зіманькі лютае.
Зрабілася вяселлейка невясёлае!
Дачушачка мая любая,
Ты ж яшчэ ўсіх таварышак не пааддавала (замуж)
І ўсіх вяселлейкаў не адгуляла,
А зрабіла мне вяселлейка пячальнае.
Нашы песні невясёлыя,
Нашы госці маркотныя,
А ні музыкі не іграюць,
А ні дзевачкі не скачуць,
А ўся наша бяседанька слёзкамі ўмываецца,
Пераменачка мая мілая!
Чаму ж ты з таварышкамі
На паследні раз не прашчаешся?
Дзевачкі, таварышкі, прасціце маю дачушачку.
Паследняе наша прашчанійка
І паследняе наша павіданійка.
Я ж думала, што ты будзеш мая кукаванніца,
Я ж думала, што ты будзеш мая прыкапанніца,
Аж ты мая зрадніца,
Зрадзіла мяне без порачкі.

357. Дачушка мілая,
Што ж ты так раненька
У адзенне малодухі апранулася,

Ад усіх адвярнулася?
Усе падружанькі твае сабраліся,
Усе дружкі пазляталіся,
А ты, дачушка, ціхенька ляжыш,
Нікога не ўгашчаеш,
Гуляці не прыглашаеш,
Такое сумнае вяселлейка спраўляеш.
Дачушка мілая,
Устань ды паглянь,
Скажы хоць слаўцо адзінае...

358. Мілая мая дочачка,
А чаго ж ты ад мяне адлятаеш
Такая маладзенькая.
А сабрала ты ў нашым двары
Свадзебку невясёлую.
Ды я ж гэта, мая дочачка,
Не думала і не ждала
Невясёлай свадзебкі.
Ды адкрый ты свае карыя глазачкі,
Скажы мне хоць адно словачка.
А я цябе ўсё ўрэмячка гукаю,
І ў вутраннюю зорачку і ў вячэрнюю.
Када памру — тада забуду пра цябе,
мая дочачка.
А я думала, ты мяне помніць будзеш,
Будзеш памагаць мне,
І век з табой дажыву.

359. А мая ж ты донечко,
А маё ж ты дзіцятко,
А куды ж ты так прыбралася?
А дзе ж твае сваткі?
Чаму ж я іх не бачу?
Чаму ж яны такія нядобрыя?
Бяруць доньку, не пытаюцца,
А ты ідзеш, мяне не шкадуеш!
Ах маё дзіцятко, маё міленькае!
Ці ж я таго спадзявалася,
Што ты мае смерці не дагледзіш,
Што ты мне ложкі вады не дасі?
А хто ж мне цяпер кашульку вымые?
А хто ж мяне, старэньку, пацешыць?

А маё ж дзіцятко, а маё міленькае,
А каму ж ты падарачкі пакінула?
Чаму ж ты мне не расказала,
Якую табе сукеначку ўлажыць?
Бо я ўжэ не маю для каго астаўляць!

360. Маё дзіцятка, маё мілае!
Я ж думала, шчо даждуся вяселля тваго,
Ажно я хаваю цябе!
Ты ж была мая слуга,
Ты ж была мая верная!
Каго ж я пашлю,
Дзе я найду цябе,
Мая дзяціна, мая родная!
Я ж думала, шчо я буду на тваім вяселлі спяваці,
Аж мне прыйшлося па табе тужыці!
Мая дзяціна, мая родная!
Дзе ж я цябе найду?
Дзе ж я цябе шукаць буду?
Дзе ж я цябе буду выглядаці?
З каторай дарогі зустрачаці?

361. Дачушка мая, зязюлечка мая!
А калі ты ка мне ў госці прыйдзеш?
Ці зімою ў вазочку, а ці ўлетку ў чаўночку?
Ці зязюлькаю закукуеш, ці салавейкаю зашчабечаш?
А я ж буду прыглядацца і прыслухацца:
Ці не дачушачка мая ка мне ідзе?
Дачушка мая, зязюлечка мая,
Ягадка мая, недаспелая мая!
Без пары ты адкацілася ад мяне,
Без пары адвалілася.
Ці цябе ветрыкі падвалілі?
Ці цябе дожджыкі падмылі?
Дачушка мая, красачка мая!
Дзе ж ты будзеш зацвітаці:
Ці ў вішнёвенькім саду?
Ці ў далёкенькім бару?
Дачушка мая, зязюлька мая!
З каторага боку ты ка мне ў госці прыйдзеш?
Ці са сходу соўнейка, ці із заходу?

А я ж буду цябе сустракаці,
Буду цябе пераймаці.
Вяселлейка маё невясёлае!
А ні музыкі не йграюць, а ні дзевачкі
не гуляюць.

Дачушка ж мая, зрадніца ты мая! Зрадзіла ж мяне!
Я на цябе не наглядзелася, не нацешылася.
Мае ножкі міленькія! Дзе ж вы будзеце хадзіці:
Па якіх дарожачках, па якіх старожачках?
А ты ж нікога там не ведаеш,
Ты нікога там не знаеш.
Дачушачка мая, зязюлечка мая!
Як мне без цябе астацца?
Як нам з табою расстацца?
Дачушачка мая, зязюлечка мая!
А выйду я на вуліцу, гляну я на дзевачак,
А мяне сыра зямля ломе,
Няхай да мая дачушка з дзеўкамі пагуляла!
Мая ты гаратніца, мая ты бяздольніца!
А ўтраціла ж я сваю дачушачку!

362. А мая Танечка,
А як жа вам весела,
А як жа вам добранька.
А вы ж жывенькія,
А маёй Манечкі ўжо няма.
А куды ж вы яе прыбіраеце,
Куды ж заплятаеце?
Мая дачушка, а ты ж не хвалішся,
Куды ж ты пойдзеш,
Куды ж ты ад'язджаеш?..
Болі я цябе не ўвіджу,
Тваіх песенек не пачую.
Ах, мая птушачка,
Я ж буду прыслухацца,
Як будуць дзяўчаткі пяяць.
Мне ж будзе здавацца,
Што я галасок маёй Манечкі пачую.
Ах, мая птушачка,
Ах, маё соўнейка яснае,
Ты ж мяне засмуціла,
Ты ж мяне зацямніла,
Дачушка мая мілая,

Дачушка мая родная,
З якой староначкі мне цябе дажыдаць,
З якой дарожачкі мне цябе пераймаць?
Ах, мая Манечка,
Ах, маё дзетачка,
Хоць разок адзыўніся.
Сабраліся і твае сястрыцы,
Сабраліся і таварышкі,
А ты на ўсіх загневалася,
Ні да каго не адзываешся.
А ты ж засмуціла ўсю нашу радзінку.
Ты ж зацямніла нашу сямейку.
Мая дачушка,
Нашто ты мяне астаўляеш, старэнькую,
Мяне, нядужую?
Я ж буду рада ісці з табой,
Каб нас закапалі
У адну ямачку,
У адну магілачку.

363. А мая дочанька, мая галубанька,
А нашто ж ты мяне пакінула?
А ў якія далі-дальнія ты ўехала?
А ў якія бары-лясы ты ўшла?
А хто ж мяне будзе глядзеці?
А мая доню, мая міленька,
А нашто ж цябе гадавала?
Каб ты ў зямліцы чорнай начавала?
А дзе ж тыя сінія вочкі,
Што на мяне глядзелі?
А я ж табе і сукеначку,
А я ж табе і спаднічку...
А чым я табе не ўгадзіла?
А мая дочачка, а мая родная,
А чаго ж ты так рана ўшла?
А чаго ты мяне не пачакала?
А мая ж ты шэрая зазулька,
Не гібаці табе ніколі караваю,
Не расціці табе зялёнае рутанькі,
Не гадаваці твае малыя дзетанькі...

364. А мая дачушка,
Я ж ждала ад цябе помашчы,

Ты ж у мяне самая большая.
Мая дачушка, што ж ты нарабіла?!
А мой Пятруська,
А мне ж хваціла горачка.
Я ж без цябе іх гадавала,
А цяпер яшчэ горшая бедачка.
А мой Пятрусечка,
Табе ж цяпер весялей:
Ты ж забіраеш у мяне сваю дачушку,
А мяне пакідаеш
З гэтай калекай і з гэтым маленькім.
А мая Танечка,
А падзякавай сваім суседцам,
Што яны цябе ўвідзелі,
Няшчасную сіротачку, няшчасную
бяздольнічку,
Што яны мне памагаюць,
Што яны мяне ў бедачцы не кінулі.
Соўнейка маё яснае,
Калі ж я з табой пагавару,
Калі ж я табой пацешуся?
Мой цвяточак міленькі,
Не ўспеў расцвісці, а ўжо і завяў.
Чаму ж я табой так мала пацешылася,
Чаму так мала парадавалася?
А ты ж у мяне кожны дзянёк у ваконцы.
Я буду ўставаць і класціся,
Я ж буду да цябе гаварыць,
Я ж буду цябе прасіць:
Прыйдзі ка мне, дзетачка,
Памажы гараваць горачка.
Ты ж будзеш са сваім таткам ляжаць,
А я з гэтымі бясшчаснікамі гараваць.
Хваціла ж мне аднаго горачка:
Як памёр мой Пятруська.
А ты, мая дачушка,
Гэткае гора зрабіла.
Я ж, маё дзетка,
Не хачу глядзець на белы свет.
Людцы будуць рабіць, будуць весяліцца,
А мая радасць у зямельцы будзе ляжаць.
Мая дзетачка, мая памочніца, мая няшчасніца,
Што ж тут зрабілася,

Што ж тут учынілася?
На адной бедачцы ў мяне не кончылася,
Другая яшчэ горшая.
І птушачкі паляцелі, і лісточкі апалі.
А хапіла, што Пятруська пайшоў,
Дык яшчэ і ты, мая дачушка,
Мяне пакідаеш,
Такую бясшчасніцу,
З гэтым маленькім.

365. Ах, мая дачушачка,
Ах, мая малютачка,
Ці я цябе не ўмела шкадаваць,
Ці я цябе не ўмела гадаваць?
Чаго ж ты ад мяне ўцякаеш,
Чаго ж ты са мной не гаворыш?
Чым жа я цябе абідзела,
Чым цябе ўгнявіла?
Я ж цябе шкадавала,
Я ж табе патурала.
А мая дачушачка,
А мая міленькая,
Чаго ж ты ўцякаеш,
Чаму ты нічога не кажаш?
Дзе ж я цябе буду пазнаваць,
Дзе ж я цябе буду ўстрачаць?
Ды ці я і з дзеткамі,
Ды ці я і з кветкамі...
А мая дачушачка,
А мая міленькая,
Нямнога ж цешылася,
Нямножка ж гасціла.
А мая госціца,
А мая маленькая,
Нямножка ж будзеш гасціць,
Нямножка ж будзеш гаварыць.
Ужо закрыешся,
Ужо схаваешся
У цёмную хатачку,
У глыбокую ямачку.
Ветрык не павеіць,
Соўнейка не засвеціць...

366. Мая ты дачушка,
Як я табой цешыўся,
Што відзеў цябе.
Якая ты радасная была,
Як мы табе радачкі стараліся.
Маё дзетачка,
Мы ж цябе вазілі,
Мы ж цябе лячылі,
Нічога табе не памагло.
А чаму ж ты нас аставіла,
Чаму ж нас пакінула,
Наша золатца?!

367. Мае дзеткі, нашто ж вы пакінулі
Мяне, старую?!
Нашто ж вы пойдзеце ў зямельку?!
Чаму ж я не пайшла
На ваша месца?!
Мая дачушка,
А мы ўсё стараліся,
А ўсё па дактарах ездзілі,
Радачкі стараліся.
Мы думалі, каб табе памагчы,
А цяпер табе і свет-галоўка не баліць,
І ножкі не ломіць,
І ручачкі не круціць.
Мая дачушачка,
Мая красачка,
Ты ж ідзеш да свайго брацітка.
Вы там будзеце разам,
А я тут буду адна.
Буду зязюлькай кукаваць.
І лецечкам, і зімой,
Буду вас, дзеткі,
У госцікі зваць.

368. Мая дачушка,
Мая дарагуська,
А куды ж цябе вязуць?
Можа, ў лясок па ягодкі спелыя,
Па грыбочкі баравенькія?
А вязуць цябе,
Мая дачушачка,

У гэткую хатку цёмную,
У зямельку халодную.
Мая дачушачка,
Мая птушачка,
А ты ж прылятай
Да мяне ў госцікі.
Як толькі пачую
Я твой галасок,
Я адчыню табе аконца,
Я буду табой цешыцца.
Мая дачушка,
Мая Анютка,
Ужо ўсе ўсталі,
Усе падняліся,
Яснае соўнейка ўзнялося,
А ты ўсё ляжыш,
Помашчы не просіш.

369. Ах, маё дзетачка,
А была ты ў цёпленькім,
А была ў сухонькім,
А ты ж гэткая маленькая,
А проці зімачкі халоднай.
А ты халодненькая, а ты голенькая,
А ўсе твае костачкі змерзнуць.
А ў гэткую хатку цёмную,
У гэткую невясёлую,
У зямельку халодную
Ты ўцякаеш ад нас.
А маё дзетачка,
А ты ж засмуціла
Усю нашу сямейку.
Мы ж стараліся радачкі,
Нічога табе не памагло.
Ты ж бедненькая плакала,
Ручкамі зубкі дзёрла.
А мае зубачкі, чаму ж вы схаваліся?
Я ж вам зеллейка баравога прынясу,
Каб вы маю дачушку не гнявілі.
Мая дачушка,
Чаму ж я такая няшчасная?
Бабкі вясной выйдуць гуляць
Са сваімі дзеткамі на вуліцу,

А я ж буду на магільнічку кукаваць.
Мая дзетачка, мая пацешачка,
У мяне ж усе далёкія.
А я ж з табой гуляла,
А я ж цябе забаўляла.
А цяпер нет маёй Марусечкі,
Нет маёй дачушачкі.
Птушачка мая мілая,
Ты ж мне хоць сасніся,
Хоць у вочкі здайся.
Я ж буду да цябе кожны дзянёк прыходзіць.
А я ж з табой там не пагукаю,
А я ж цябе там не пазабаўляю.
Я ж цябе не ўвіджу.
Мая дачушка, мая міленькая,
Ты ж у мяне за ўсё даражэйшая.
Мне ж нада з табой расстацца,
Навек папрашчацца.
Ах, мая птушачка вясенняя,
Ах, маё соўнейка яснае,
Ты ж мяне засмуціла,
Ты ж мяне зацямніла.
Дачушка мая мілая,
Дачушка мая родная,
З якой староначкі мне цябе дажыдаць,
З якой дарожачкі мне цябе пераймаць?
Соўнейка маё залатое,
Адкуль цябе глядзець,
Адкуль выглядаць?

370. Ох, мая Леначка,
Ох, мая дочанька!
Ох, мая каліна высокая, харошая!
Хто ж цябе так рана зламаў?
Шчо ж ты не пакрасавалася?
Ох, мая дочанька,
Ох, мая мілая!
Як жа ты рана ад нас улятаеш.
Да дванаццаць гадочкаў гадавалі,
Да гэтак глядзелі,
Да раду шукалі,
Як ты хварэла маленькая.
А зарэ цябе мы не збераглі,

Да і рады не знайшлі табе дактары.
Ох, мая дочанька,
Ох, мая мілая!
Да ты мне пакідала напамінак —
Толькі вышыванне і кніжкі.
А куды ж мне ўсё зарэ дзець?
Дочанька мая мілая,
На каго ж ты нагневалась?
Да не ўстанеш і не дасі савета.
Ты ж мо нагневалась,
Шчо табе мы рады не шукалі?
Ох, мая дочанька,
Мая пташачка мілая,
Куды ж ты ўлятаеш,
У якую старонаньку?
Ты ж будзеш з пташачкамі страчацца
І ляцець з выраю з імі.
Да скажы, дочанька, мне зарэ,
Якою пташачкаю ты скінешся,
Да назад прыляціш,
Да будзеш шчабятаці,
А я буду пазнаваці.
Да ты будзеш са мною гаварыці,
Да будзеш успакойваць,
Бо ты ж пакінула нас адных.
Ох, Леначка, да ты ў нас адненькая.
Мо ты не схацела нам надакучаці,
Да ў школу цябе праважаці,
Каб я рана ўставала
Табе снеданне гатаваці.
Ой, мая дочанька, мая памочніца,
Мая мілая, да ўдалая.
Да ты мне памагала
Усё рабіці: і падлогу мыці,
І пасцель праслаці.
Да ты мне цэла лета
Дзялку абрабляла.
А цяпер я буду гукаці
І выглядаці,
З якой мне стараны помачы ажыдаці.
Ох, Леначка, ох, дочанька!
Да да цябе ўсе вучэльнікі
І вучыцеля прыйшлі.

То як ты на мяне зазлілася.
То ўстань, Леначка,
Да да іх адзавіся.
Ох, мая дочанька,
Мая каліна спелая,
Якую ж табе хату цесную зрабілі.
Чаму ж ты не захацела
Жыць у вялікай хаце?
Ох, мая ж дочанька,
Прыехалі ж музыкі,
То мо' гэта не вяселлечка?
Да ўстань і складніся,
Да не гневайся, а скажы,
Каторых мне сватоў падперазаць?
Да на якую старонаньку замуж ідзеш?
Да пісьмо напішы.
Ох, мая дочанька!
Да ўжэ ж паследнюю мінутачку
З табою гавару,
Да паследнюю мінутачку
Цябе бачу.
Ох, людачькі!
Не закрывайце!
Да не ўпускайце ў ямку!
Яна ж заснула так моцна!
Ох! Яна ж зарэ ўстане.
Да не засыпайце,
Яна прачнецца,
Да вылезе, да прыйдзе дадому,
Бо яна ж у нас адненькая,
Яна ж прыйдзе нас даведацца.

371. А мая дачушачка любая,
А што ж я цябе прыгадавала
І цябе не вароціш.
А ты ж у мяне красівенькая,
А ты ж у мяне была шчаслі[вая].
А нашто ж цябе божачка так прыбраў,
А што ж ты так ляжыш красі[ва]?
А мая дачушачка,
А мая родненькая ма[я],
А я нашто ж я цябе расціла,
Цябе гадавала і людзей прасіла,

Штоб людзішкі цябе тожа ні кіда [лі]?
Мая дзетачка, мая родная,
А маё вочачка дараго [я].
А луччы ж бы я памёрла і з табою.
Што ж ты мне нарабі [ла].
Я ж табе думала, каб вяночак надзеці,
Каб тваю свадзебку паглядзець,
Каб тваіх дзетак пакалыхаць [кі].
Гляну, як ідуць на кладбішча.
А куды, маё дзетачка,
Ты дарожычку прыкла [ла]?
А як жа я буду йціць,
А я ж буду ўсяжды галасіць,
А мая дачушачка, а мая родненькая,
А куды ж ты ўходзіш,
З якою сторану цябе ўстра [чаці]?
А я ж да цябе з таго боку прыйду,
А ты ж, мая дачушачка, па мяне не пры [йдзіш].
І я ж цябе ні разачку нідзе не ўстрэ [ну].
А мая родна дачушачка,
Ты ж мяне тожэ сабірайся ўстрэць,
Штоб я к цябе прыйшла ско [ра].
А родная мая дачушачка,
Што ж ты мне надзелала такое гора?..

372. А маё дзетачка, а маё мілае,
А ты ж была ўсёй сям'і вялікая,
Ты ўсіх апівала,
Табе малачка жалелі.
А мая дзетка,
Сколька я па табе праплакала!
А цяпер ты ад мяне назаўсёды атышла.
А мой татачка,
Пераймай маю дачушачку, сваю ўнучачку.
Маё дзетачка, маё яснае соўнейка,
Раскажы свайму дзядулечку
Пра маё горачка.
Гаравала дома пасля цябе, татачка,
А цяпер мне яшчэ горшае горачка.
Такая долечка мая няшчасная.
Каб мая долечка згарэла,
Я б ручкі пагрэла,
Чым я на свет радзілася такая няшчасная.

Маё дзіцятка залатое,
Маё дзіцятка дарагое,
Як мне прасціцца,
Як мне расстацца?!

373. Ох, мая дочачка,
Ох, мая Любачка,
Ох, мой хазяін,
Мой касяр,
Мая дбальніца!
Мая Любанька,
Мая дочанька,
Мо ты паляцела
Бацька шукаці?
Скуль цябе выглядаці,
З каторае старональкі,
З каторае дарожанькі,
З якога калхозу?
Каго мне пытаці,
Шчо ты будзеш рабіці
У том калхозе:
Ці лён рваці,
Ці жыта жаці?
Скіньса, Любанька, заўзулькаю,
Да прыляці,
Да сядзь перад акном на грушы,
Да заспявай.
Да я буду знаць, шчо гэта ты.
Да як жанкі ідуць з калхозу,
То я іх пытаю:
«Дзе ж вы маю Любу пакінулі?»
На каго ж ты, дочанька,
Мяне пакінула,
На каго прыпаручыла?
От, аплакала вас, дочанькі,
Акавала вас.
Хай зямля вам будзе пухам.
А цяпер пацягнуся дадому.

374. Ох, не заўзуленька ў сырым бару кує,
Не салавейка ў зялёным саду свішча,
А гэта я — твая маманька,
Па дочаньцы плачу...

Ой, мая дочанька, мая родная,
Да ты ў мяне адненька,
Да радненька,
Як каліначка ў лесе,
Як быліначка ў полі.
Зарана, дочанька, зарана, родная,
З белым светам папрашчалася.
Я прыйшла цябе даведацца,
А ты не аказваешся.
Я прыйшла з табою пагаварыць,
А ты не адзываешся.
Да які ж мне дзянёчак
Цяпер невясёлы:
Усе дзевачкі выйшлі на вуліцу
Гуляць і спяваць,
А цябе ж нямае.
Да я ж нідзе месца не найшла,
Да ўзяла мяне така таска.
Да сколька гадочкаў прайшло,
Да сколька мінула!
Я думала, дочанька,
Шчо ты паехала на цаліну,
Да можа там выйшла замуж,
Да думала, шчо пазавеш
Мяне пісьмом на вяселле.
А ў мяне па сёй дзень
Няма вестачкі ад цябе.
Да прыйшла я сюды
Цябе пытаці і гукаці,
Шчо ты так ціхенька
У сыру зямлю схавалась.
Да я ж думала, дочанька,
Палучу ад цябе пісьмо,
Да спраўлю табе плаццейка,
Да згуляем свадзебку,
Да па-цяперашняму, па-камсамольску.
Чаму ж, мая дочачка,
Да мяне не прыйдзеш?
Шчо ж ты так на мяне
Нагневалася, да абідзелася,
Шчо я каторы гадочак
Цябе гукала да спамінала,
Да каторэ ўрэмячка

Пра цябе кую.
Да аплакала цябе, Надзенька,
А цяпер аплачу другу дочачку,
Любаньку.
Да ж вы разам ляжыце
І не скажаце мне,
Як вы там жывеце.

375. Дочачка мая родная,
Я ж думаў кала цябе смерці даплакаці,
А ты ж мяне пакінула на старасць,
Як паля ў полі, аднаго.
Ні да каго не магу прыбіцца,
Ні да каго не магу прылучыцца,
Бо я ж адзін, нікога ў мяне няма,
Адна ты, донечка, была.
Да і ты забралася,
Уляцела ад мяне.
Я ж цябе, мая дочачка,
Не мог утрымаці,
Бо я ж тваго ліха не знаў:
Ты ж мне не сазналася,
Шчо ў цябе баліць.
Мая Леначка, мая родная!
Хто ж мяне на старасць
Будзе даглядаць?
Ты ж сваёй мацеры не прыказала,
Шчоб яна мяне даглядала.
Ох, мая каліналька,
Ох, мая маліналька,
Ох, мая вішанька, устань,
А я лягу.
Ох, мая ж дочачка,
Ох, мая качачка шэрая,
Ох, мая шчабятуха мілая,
Устань, а я лягу,
Бо ты ж маладзенькая,
А я стары, да ўжэ нажыўся.
Да як маці часам крычыць на мяне,
То ты заступалася.
Ох, мая Леначка!
Ох, мая заступніца!
Ох, як можна,

То і мяне забяры з сабою,
Няхай бы я тут не мучыўся
На гэтым белым свеце.
І 'шчэ, Леначка, прашу цябе,
Прысніся мне,
Чы на том свеце праўда е?
Бо ў нас гавораць:
Гэты свет — макаў цвет,
А той свет — будушчы век.
Леначка, дочачка, прашу цябе,
Не адкажы да прысніся мне.

376. Ох, мая дочанька,
Ох, мая родная!
Куды ж цябе забіраюць,
Куды ж цябе адпраўляюць?
Да ў чужую староньньку,
Да ў чужыя людзі,
Да хто ж цябе там шкадаваці будзе?..
Да з якой староньнькі цябе выглядаці,
Да якую вестачку ажыдаці:
Чы вясёлую, чы смутную, чы жалобную?..
Едзь жа, доню,
Шчасліваенькі табе пуць,
Адно ж на чужыні дому не забудзь!

377. Мая дачушачка,
Мая птушачка,
Мая перапёлачка,
Нашто ж ты мяне пакідаеш?!
А я нядужая, а я няўклюжая,
А мне тваіх дзетак гадаваць.
Мая пташачка,
Мая дарагая,
А ці ж я цябе не глядзела,
Ці ж я табе не памагала?!
Мая дачушачка, падніміся,
Глянь на сваіх дзетак.
Ты ж іх мамачка,
Ты ж іх залаценькая,
Ты ж іх даражэнькая.

378. А мая ж ты дачулечка!
Да хто ж цяпер ка мне прыйдзець?

Да хто ж мяне адведаець?
А хто ж мне сваё горачка раскажыць?
А хто ж мяне ўцешыць?
З кім жа ты сваіх дробных дзетушак пакінула?
Да ты ж над імі траслася і іх шкадавала.
Цяпер жа ў іх будзець чужая матка —
не родная.
Да яна ж ім і есці не дасць у пару,
А яна ж іх будзець паторгаваць і пасморгаваць.

379. А мая ж ты дачушачка,
А мая ж ты залатушачка,
Нашто пакінула нас?
А ты ж мая маленькая,
А што ж ты нам зрабіла?
А як жа мы будзем жыць без цябе?
А куды ж ты сабралася
Напроці лецейка?
А ўсе кветачкі павырастаюць,
А ўсе казявачкі павыпаўзаюць,
А ўсе дзетачкі будуць гуляць,
А майго дзіцяткі няма.
А хто ж мяне цяпер пацешыць,
А хто ж мне казачку раскажа?
А хто ж мамачку пажалее?
А мая ж ты дачушачка,
А давай мне вестачкі,
А ці добра табе там будзе.
А-ёй, а-ёй...

380. Мая Зіначка,
Мая дачушка,
А ў цябе ж было ўсё добра
І ў сямейцы, і ў дзетак.
А мая дачушка,
Ты ж не была змараная,
Не была збузаная,
А жыла ў жаласці,
А жыла ў шанасці.
Цябе ўсе любілі,
Усе так паважалі,
А цяпер ты ўсіх
Сама пакідаеш.

381. А мая Ірынка,
А мая дзетачка,
Толькі праз мяне
Табе зрабілася.
А я цяпер усё перажалею,
Усё перакаюся.
Няхай бы ты ішла
За каго хацела.

382. Мая дачушачка, мая ціхусечка,
Мая гаротнічка, маё яснае соўнейка,
А ты ж нагаравалася, натрудзілася
У гэтай ціхай сямейцы.
Мая дачушачка, мая зязюлечка,
А ўсё ж людзі казалі, угаварывалі,
Каб ты не ішла, што жыцця ў вас не будзе.
Мая зязюлечка,
Лепі б ты сівую касу до́ма знасіла,
Лепі б ты брацікам дзяцей калыхала.
А калі ў цябе будзе якое дзіцятка,
Мы ж будзем табе памагаць гадаваць.
А яны ж цябе бяруць і не хочуць,
Пад прымусам.
А ты ж нікога не слухала,
Ты ж нагаравалася, натрудзілася.
Маё соўнейка,
На тваю ж дачушку
Ніколі не сказалі, што дзіця плача,
А ўсе казалі, што шчанё пішчыць.
Мая ты дачушка,
Ты ж і мне ніколі не пажалілася,
Мы ж цябе не хацелі аддаваць.
Ты ж ім з хаткі ўступіла,
А мяне навек засмуціла,
Дачушку-сіротку мне аставіла.
Маё соўнейка яснае,
Мая дачушка няшчасненькая,
Мая пакутніцка, мая пралесачка,
Твае ж бачкі былі сашчыпаныя,
Ты ж не адну ночку пад вуглом стаяла
З маленькай дачушачкай,
З маленькай пралесачкай,
Вы ж ім былі нямілыя,

Вы ж ім былі нялюбыя.
Маё соўнейка яснае,
Мая дачушка няшчасненькая,
Мая пакутніцка,
А ў гэткім маладзенькім веку
Ты будзеш у зямельцы ляжаць,
А я буду па табе кукаваць.
Ты ўжо не пацешышся
Сваёй маленькай дачушачкай.
Яна ж не будзе помніць,
Яна ж круглая сіротачка.
Яе ж бацька з бабай не любяць,
А я ж ужо старая.
Хто ж ёй пацешыцца,
Мая дачушка мілая?
Ах, мая дачушка,
Я ж ніколі не думала,
Што ў гэткіх гадочках
Будзеш зямельку парыць.
Я ж дзярночкі буду ўзнімаць,
Свае ручкі буду ламаць.

383. Мая дачушка, мая гаратнічка,
А набаялася, а напужалася.
А кажды кусточак табе быў за хатку,
А пад кусточкам твая пасцелька.
А ты ж не раз уцякала і праз аконца,
А ты ж не раз і ў лазенцы начавала.
Мая дачушка,
А я ж табе не раз казала,
Каб лажылася на пасцельку.
А ты ж, як прыбяжыш,
Усё лезеш на печачку, каб абагрэцца.
А ты ж мяне жалела, а ты ж баялася
Мне і прызнацца,
Што была пад кусточкам ночкай цёмнай,
І набаялася, і напужалася.
А я ж старая, а я ж глухая.
Лажуся спаць — дачушкі спяць.
А прачнуся, ляжыш, як карчок, на печы.
А дзякуй табе, мая Валечка,
Мая нявестачка,
Што ты яе не кідала,

Што ты ёй хатку адчыняла.
Мы ж глухія, мы ж не чуем,
Калі яна прыйдзе.
Сядзем есці,
А ты, мая дачушка,
Казала, што вячэрала.
А ты ж была і галодная,
А ты ж баялася нам прызнацца.
А мой Міцечка, а мой унучачак,
Цябе ж мамка глядзела,
Табе ж мамка памагала.
Няхай гэты п'яніца
Над ёй гэтак здзекаваўся,
А то і ты не хацеў прыехаць яе адведаць.
Якая яна была нядужанькая!
Мая дачушка, няхай бы я на тваё месцечка.
Мая пакутніцка, няхай бы ты жыла.
Як мне цяжанька, як мне трудненька
Старасцю на цябе глядзець.
Мая бясшчасніцка,
Ты скольki гадочкаў жыла,
Ты ўсё гніла.
Я ж табе казала:
Ты ж кідай,
А пажалей ты сваё здароўечка.
А ты ж усё казала, што, мая мамачка,
Я ж і людцаў стыдаюся,
Як жа гэта я разлучуся.
Гэта ж будуць з мяне людцы смяяцца.
А ты ж усё скрывала,
А ты ж усё казала:
Маім дзеткам бацькі не будзець.
А цяпер зрабілася,
Што ні бацькі, ні маткі.

384. А маё дзетачка, а проці вясёнкі,
Проці цёпленькай,
А ты ж уцякаеш
З віднoй хатачкі,
Ад свайго татачкі,
Ад сваёй мамачкі.
Нясуць табе хатачку
Гэткую цесную,

Гэткую цёмную, невясёлую.
Мая дачушачка,
Мая птушачка,
Зязюлькі будуць
Да цябе прылятаць,
А я буду
З зязюлькамі кукаваць.
А я буду да цябе
І раненька і позненька хадзіці.
А я ж на цябе
Не нагляджуся,
Я табой не нацешуся.
Мая дачушачка,
Маё соўнейка яснае,
А я твайго татку
З вайны ждала,
Над табой ночкі не спала.
А цяпер мы пажылі весела,
Пажылі добранька.
Твой татка прыйшоў,
Табой цешыўся.
А маё соўнейка залатое,
А ты ж засмуціла
Усю нашу хатку,
Нашу ўсю сямейку.
Мы ж ніколі не думалі,
Ды што тут такое,
Што такая бедачка?
Прабачай мне, дачушка,
Я ж цябе хворанькую глядзела,
Можа што не ўгадзіла.
Твае падружкі гуляць будуць,
А я на іх буду глядзець,
Буду слёзкі праліваць.

385. Мая Манечка, маё дзетачка,
Памёрла Ірынка з Міканорам,
Хоць мне горачка не аставілі.
А ты ж дзвюх маленькіх мне пакінула.
А мне ж старасцю нада ім памагаць.
Я ж вас маленькіх расціла,
Я ж вас вучыла, каб вы былі добрыя,
Каб людцам пакорныя.

А цяпер вялікімі закладаю ў ямкі.
Дзеткі мае мілыя,
Бярыце мяне з сабой.
Мая долячка, мая няшчасная,
Дакуль я буду старая жыць,
Сваіх дзетак хаваць?
Мая долячка,
Чым я цябе ўгнявіла,
Чаму я такая няшчасная?
Чаму, мая долячка,
Заклала ямкі дзеткамі,
А мяне пакінула?

386. А мая дачушка,
А мая залаценькая,
А прыйдзе вясёнка,
Усе птушачкі запяюць,
Зязюлькі закукуюць.
А я ж прыйду,
Ты ж да мяне не загаворыш.
А была гараваная,
А была ў халодным, у сцюдзёным.
А па чужых хатках бадзялася,
У сваёй хатцы месца не было.
А прыйдзе дачушка,
Хто ж будзе сустракаць?!
А прыедуць дзеткі,
Не будзе каму пераняць.

387. А соўнейка,
Калі ж узыдзеш,
Калі ж ты паднімешся,
Я ж пайду да Гэлячкі,
Жоўтыя пясочкі ўзніму,
Свае ручкі заламлю.
Дачушка дарагая,
Дачушка мілая,
Устань, маё соўнейка,
Устань, дарагое.

388. Мая Волечка,
Мая зязюлечка,
Як жа я буду жыць без цябе?

А я буду гаварыць з табой,
Шэра зязюлька,
І зімачкай, і лецечкам.
А я буду прасіць цябе,
Шэра зязюлька,
Даць мне парадачку,
Памагчы мне работку парабіць.
Дачушка мая,
Зязюлька мая,
Ты ж прылятай да мяне ў сенцы.

389. Мая дачушка міленькая,
Ты ж у мяне
За ўсё даражэйшая.
Мне ж нада з табой расстацца,
Навек папрашчацца,
На шаўковай траўцы,
На жоўтым пясочку,
На летнім муражочку.

## ПА БРАТУ

390\. А брахнінька ж ты мой родненькі!
Чаго ж ты так скоранька
Ад нас уцякаеш?
Ці не жаль жа табе
І татухны і мамухны?
А яны ж та цябе
Ускармілі і ўзгадавалі,
А цяперыцькі пад старасць
Адны на гора засталіся.
А хто ж іх цяпер
Пачытаць і паважаць будзець?
Не з кім жа ім
Старыя костухны прыбярэч,
А мне ж дзявоцкую галавою
Аднэй не збегацца,
Брахненька мой родненькі!..

391\. Брацец мой родны!
Месяц жа мой ясны!
Не будзеш ты ўжо наглядаць
За сваёй гаротнай сястрыцай.
Без цябе няма жыцця,
Як без вады раслінцы.
Чаму ж ты мяне з сабой не ўзяў
У смяротнай часінцы.
Заўчора ты араў, касіў,
А ўчора ўжо пітачкі прасіў,
А ўранні ты свечачку дзяржаў,
А ў вечары і саўсім сканаў.

392\. Брахнейка мой родненькі!
З каторае нам цябе дарожачкі дажыдацца?
А ета ж дарожачка доўгая і невясёлая.

Здзелаў жа ты нам бяседачку невясёлую,
Усі людзюхны будуць весяліцца,
А мы будзем слёзкамі абліваццa.
Як жа нам цяпер за работачку брацца?
Адбіліся мы ад усяго і адлучыліся.
Куды ж ты, мой брахнейка, надумаўся?
Як жа нам цяпер, мой брахнейка, забыцца?

393. А мой брацийка, а мой родненькі!
А чаго ж ты ляжыш дужа ціханька?
Прасі сваю ўсю радзіначку —
Няхай конікаў запрагаюць і званочкі пачапаюць,
Музыкаў нанімаюць, цябе ў зямлю выпраўляюць.
А на тваёй бяседаньцы музыкі не йграюць
І мальчыкі не гуляюць.
Толькі слёзы праліваюць, цябе ў зямлю
выпраўляюць,
Мы ж не знаем, куды выпраўляем —
Ці туды, куды сонейка заходзіць,
Ці туды, адкуль сонейка ўсходзіць,
А скажы ж ты, мой браценька:
Адкуль цябе дажыдаць,
У каторае ваконца пaглядаць?
Будзем цябе дажыдаці —
Цвятком сцежкі усыпаці.

394. Мой жа ты браценічак, мой жа родненькі, згуляем тваю свадзебку пароЮ невясёлаю, без дудачак і скрыпачак, мы ж будзем не радавацiся, а плакаці.

395. А мой брацішка, а мой родненькі, да тваё вяселейка да невясёлае; скрыпачкі не іграюць, дзевачкі не пяюць. Пішы лісточкі, пашлі пасло̄чкі да сваёй радзінкі, штоб збіралася на вяселейка; да будзеш убіраць сваю радзінку, каторых свашачак, каторых сваточкамі. А цётачкі мае, а дзядзінькі мае, чы вы не чуеце, чы вы не відзіце?

396. А мой жа ты галубчык!
Не захацеў жа ты з намі і з татулькай жыць;
А там жа хто цябе будзець жаніць?
Хто аб табе будзець хлапатаць?
Зраднік жа ты, мой брацец!
Зрадзіў ты нам раду нехарошую,

Сваму татулечку і мамулечцы.
А цяпер жа ты, мой брацец,
Сабраў свадзебку невясёлую,
У цябе ж няма ні сваціkaў, ні падбраціkaў,
А ні скрыпачак і ні дудачак.
Прасі ж свайго татулечку,
Каб асядлаў ён табе коніка вараненькага,
Каб выправіў ён цябе ў дарожаньку невясёлую.

397. А братулечка ж ты мой,
А гуляець жа твая краватачка,
А братулечка ж ты мой!
А і гдзе ж мы будзем цябе находзіць,
А братулечка ж мой!
А ты ж у нас цяпер госційка,
А братулечка ж ты мой!
Ты ўжо ў госційкі выражаешся,
А заранейка ж ты прыбіраешся.
Братулечка ж ты мой!
А твой жа татулечка старэнькі.
Братулечка ты мой!
А мы ж думалі, што ты татулечку пахаваеш,
Братулечка ты мой!
А цябе ж татулечка схаваў.
Братулечка ж ты мой!
А ён жа цяпер старэнькі і горачка гаруець.
Братулечка ж ты мой!
А мы ж думалі, што ты мамулечку схаваеш.
Братулечка ж ты мой!
А мамулька цябе схавала,
А яна ж горачка гаруець.
Братулечка ж ты мой!
Сынулечка ж твой гукаў цябе «татачкай»,
А цяпер каго татачкай гукаць будзець?
А братулечка ж ты мой!
А ў яго ж татачкі цяпер не будзець,
А ніхто ж яго не пажалееець.
А брацец жа ты мой!
А яго ж цяпер усякі будзець біць,
Ён жа цяпер сіротачка маленькая.
А ў тваёй жа жаны муж будзець,
А ў яго татулечкі не будзець.
А цяпер жа, мой братулечка,

Твае і конікі стаяць так,
А цяпер жа, мой братулечка,
Усю работачку тваю відзім,
А цябе толькі не відзім.
А цяпер жа, мой братулечка,
Мы твой хлябец ядзім,
А калі ж мы свой заработаем?
А цяпер жа, братулечка,
І вугольчыкі гуляюць, і пожнечкі гуляюць,
А мой братулечка, цябе не відаць.
Цяпер жа, мой братулечка, ва ўсіх ёсць братцы,
А ў нас, мой братулечка, нямашаткі.
А братулечка ж мойродненькі!
І дзе ж мы будзем цябе шукаць цяпер?
А мы ж, братулечка, дужа ж маленькія яшчэ.
А цяпер жа, мой братулечка,
Усе сястрыцы к табе сабраліся,
А ты ж нікога к сабе не гукаеш,
А ты ж, мой братулечка!
Як прыйдуць к табе людцы, усіх саджаеш,
А цяпер усю лавачку заняў,
Нікога не пускаеш.

398. Чаму мы такія няшчасныя?!
Чаму мы ўсе выгадаваліся добра,
А цяпер у нас усе паміраюць?
Мой ты Сашачка, мой браток,
Усю вайну прайшоў.
А наш Сашачка, ты нас усё цешыў.
А мы ж не думалі, што болі не ўвідзімся,
Што будуць твае костачкі бадзяцца.
Ты нам усё пісямцы слаў,
А сваю смерць прынёс у сваю хатку,
Памёр на сваёй пасцельцы.
А маё горачка, добра, што хоць смерць
Прынясла ў сваю хатку, на сваю пасцельку.
Мой татачка, мой родненькі,
Пераймай свайго сыночка.
Вас там чацвёра,
А нас тут трое засталося.

399. А братка мой,
А мой міленькі,
А мой родненькі,
А хатка во твая цёмная,
А хатка твая невясёлая.
А мой братка мой,
А ты ж ад нас уходзіш,
А ты ж ужо да нас не прыйдзеш,
А братка мой,
А мой родненькі,
А куды ж ты ад нас ідзеш,
А куды ж ты ад нас уходзіш?
А як ты жыў,
Табе добра было,
А цяпер ты памёр,
А дзеткі пакідаеш.
А хто ж іх будзе глядзець,
А хто ж іх будзе гадаваць?
А ты добра рабіў,
І табе добра жылося,
А цяпер ты ўходзіш,
І мы цябе не ўбачым.
А братка мой,
А вясна прыйдзе,
А сонейка засвеціць,
А зязюлечка кукаваць будзе,
А ты не пачуеш,
А цвяточкі расцвітуць,
А ты не ўбачыш,
А дзеткі твае стаяць,
А дзеткі галосяць,
А людцы стаяць,
А людцы плачуць,
А людцы цябе шкадуюць,
А ты ад нас уходзіш.
А куды ж ты ўходзіш?
А ў тваёй хатцы
Было светленька,
Было харашо,
А к табе ж сонейка
Свяціла ў вокначка.
А цяпер жа ты сонейка
Болей не ўбачыш,

А цяпер цябе цёмненька
У тваёй новай хатаццы.
А па ёй хадзіць няможна,
А ў ёй сонейка няма,
А ў ёй зязюлечкі не чутна.

400. Ой, мой дубочак, малады і зялёны!
Хто ж цябе падсёк,
Хто ж цябе падрубаў,
Такога маладога?
Да ты ж 'шчэ не разрося,
Да ты 'шчэ не расцвіў,
Да такою ранняю вясною
Ты голлечка сваё
На зямлю палажыў,
А вяршэчка долу апусціў.
Да раскажы, мой брацейка,
Да раскажы, мой родненькі,
Шчо ж табе тут не панравілася,
Шчо ж не спадабалася?
Да раскажы, мой брацейка,
З якімі пташачкамі
Ты ў вырай паляціш:
Чы з гусачкамі,
Чы с буслечкамі,
Чы з салаўямі?
Ох, мой брацейка,
Ох, мой родненькі.
Ох, паспяшыў,
'Шчэ пташачкі не ўляцелі,
Бо толька шчо да нас прыляцелі.
Ох, мой брацейка,
Ох, мой родненькі!
На каго ты сваіх дзетачак кідаеш?
Кала каго іх прыручваеш,
Бо яны маленькія?
Але мы ім будам расказваць,
Шчо ты так іх гадаваў,
За імі душу клаў,
І яны цябе будуць помніць.
Мой брацейка,
Ты мабыць чуствavaў,
Шчо пакінеш іх, маленькіх,

Бо ты іх лучшай сябе шкадаваў
І вачэй з іх не спускаў.
І ты ж імі не нацешыўся,
Не налюбаваўся
І з імі не папрашчаўся.
Мой брацейка!
Якая твая хатанька невясёлая,
Да цёмная —
Няма ні акенца, ні дзвярэй.
Да ты ўсім завідаваў,
Шчо хаты харошыя,
Да казаў, шчо сваю выстраіш.
Ох, да не ўспеў свае хаты кончыць
Да ўжэ ўходзіш.
Ох, і не нажыў, не нажыўся,
А цяпер з яе выбраўся.
Мне ж здаецца, брацейка,
Шчо тут радзіна ў цябе бліжнейша,
Бо тут дзеткі твае.
Шчо ж ты на нас нагневаўся,
Шчо не даеш савету
Ні нам, ні жонцы, ні дзеткам?
Чаму ж ты, мой брацейка,
Да не адкрыеш вачэй,
Да не пабачыш,
Сколька за табою ідзе людзей?
А ты ні на каго не падзівішся
І рукою не памашаш.
Як жа ты буў усім людзям рады,
Так цяпер на ўсіх нагневаўся.
Я думала, мой брацейка,
Шчо ты звернеш да мяне ў госці
Або хоць папросіш,
Шчоб мы хоць дзеткі твае
Памаглі гадаваць,
А ты не павярнуўся,
А ты не падзівіўся
На нашу хату.
Да скінься, брацейка, салавейкам,
Да сядзь на ту хвою,
Шчо ты пасадзіў.
Да я буду салавейка пытаці
І свайго брацейка спамінаці.

Дабранач, брацейка!
У паследнюю гадзіначку
Да ў паследнюю мінутачку
Я з табою бачуся!
Да выдайся, мой брацейка,
Хоць уночы.
Да прысніся, да раскажы,
Як табе там жывецца?

401. А мой браток, а мой галубок,
А да каго ж я буду ездзіць?
А да каго ж я буду хадзіць,
А хто ж мяне будзе так глядзеці?
А браток, а міленькі,
То я ж цябе гадавала,
А хто ж цябе цяпер будзе гадаваці?
А хто ж мяне цяпер будзе шкадаваці?
А хто будзе наўчаці?
А мой браток, а міленькі,
А нашто ж ты нас пакінуў?
А то ж ты такую сям'іцу маеш,
А то так цябе глядзелі,
А то ў цябе ж і дочачка,
А то ў цябе ж і зяцькі,
А то ж цябе ўсе глядзяць.
А хто ж да цябе будзе ездзіці?
А то да цябе з'едуцца,
То ты [...] і закусачку на стол:
«Дзеткі, жывіце адно харошанька,
Жывіце адно добранька».
А тап'ерака яны — зазулькі,
Дзе ж яны цябе будуць шукаці?
Бо то ўсе сцежачкі пазарастаюць,
То мы ж не нагледзямося,
То ж мы не ўбачымо.
А браток, а міленькі,
А куды ж я буду ехаці,
А куды ж я буду ісці?

402. Дарагі браток Іван,
Што ж ты сабраў так многа людзей на баль?
Але ж усе ў чорным адзеты.
Баль ты сабраў невясёлы.

Раскажы, браток, як нам пачынаць яго
І чым частаваць тваіх гасцей.
Мы ўсё зробім па-твойму.
Перад табой стаяць і твае дзеткі, і жонка.
І яны гавораць к табе,
А ты злажыў ручкі, закрыў вочкі
І маўчыш, нічога нікому не гаворыш.
Твой сынок маленькі просіць цябе:
«Папка, адкрый вочкі і ўставай!»
А ты яму маўчыш.
Скажы сваім дзеткам хоць славечка.
Яны ж цябе заўсёды слухалі.
Жоначка твая так з табою ўжо другі дзень
гаворыць.
Просіць яна ў цябе прашчэння.
Можа, калі што сказала на цябе,
Ці не паслухала, не зрабіла па-твойму.
То ты ёй прасці.
Ты ж, браток мой, прыязджаў ка мне,
Памагаў мне і саветам і ўсім — спасіба
табе!
І прасці нам, што пасленія мінуты
Мы з братамі не былі ўмесце з табою
І не пагаварылі, а злая смерць забрала
ад усіх нас
Цябе зразу.
Ты ж ніколі не жаліўся, што табе нешта
баліць.
Няўжо ты хаваў ад нас і ад сваёй жонкі?
Чуеш, як яна цябе хораша просіць, а ты маўчыш.
Ужо, мой браток, кажуць, што табе зрабілі домік.
Я пайду пагляджу і скажу табе, які ён...
Вот схадзіла я, брацік, і паглядзела:
Вельмі ж зверху харошы, хораша ўбраны.
Гэта ўбралі табе твае дзядзькі.
Але я пабачыла ўсярэдзіне — так страшна:
Ні аднаго акенца, ні дзвярэй, цёмна.
А ты любіў сонейка, а яго табе там не будзе,
Такой цесненькі домік, брацік.
Браточак наш, галубочак,
Пасленія мінуты расставання з табой,
Як нам цяжка, і ў памяці не ўкладваецца,
Што цябе ўжо не будзе сярод нас.

Астаўляеш усіх нас радных
І сваіх маленькіх дзетак з жонкаю.
Ты чуеш, як дачачка крычыць:
«Не бярыце папку, не нясіце яго ад нас!»
А жонка просіць, каб памаленьку неслі цябе,
Але так ціха — у яе ўжо і голасу не стала
За два дні гукаючы цябе.
Я прашу, браток, цябе, прасці, калі што не так,
І сніся хоць нам.
Як жа цяжка будзе пісаць пісьмы тваёй сям'і
І не пісаць «дарагі браток», бо цябе ўжо
не будзе.
Ці чуеш, брацік, як прашчаюцца з табой твае
браточкі,
І братавыя твае, пляменнікі і суседзі?
А цяжэй за ўсё прашчацца з табой тваёй
і нашай мамцы.
У яе не хватае і духу гаварыць.
Толькі ломіць свае ручкі і заве: «Сынок,
сынок мой!»
Ой, як цяжка нам усім глядзець на гэта!
Ты заўсёды памагаў саветам, каму цяжка.
А сёння, дарагі брацік, не можаш ніяк.
Вось ужо нясуць цябе і на цябе свеціць сонейка,
Ідуць за табой твае дзеткі, жонка, браты
і сёстры,
А мамка чуць ідзе і ўсё заве цябе.
Ідуць і суседзі, і блізкія твае,
А ты ні на кога не глядзіш
І не гаворыш ні слова нікому.
Так ужо загневаўся на нас,
Ці табе нельга сказаць.
Мы табе, брацік, за ўсё прашчаем
І абяцаем, што будзем памагаць тваім дзеткам
І цябе ніколі не забудзем...
Вот ужо прыйшлі к тваёй магілке.
А якая ж яна глыбокая і шырокая!
Не верыцца, што твой гробік з табой апусцяць
туды.
Прашу я, мой браток, і мамка твая,
Каб апускалі цябе ціхенька
І кідалі пясочак памаленьку,
Бо табе ж так цяжка!

Закрылі цябе, браток, і засыпалі, зрабілі
магілку,
А мне здаецца, што ты сярод нас.
Шукаю вачыма цябе сярод людзей
І не веру сваім вачам, што цябе няма.
Бывай, браток, спі ўжо, калі так здарылася,
спакойна.

403. Чаму ты, мой брацейка,
Ніколі ў госці не прыйдзеш?
І ў сне мала выдаешся,
І ніколі пра сваіх дзяцей
Не папытаеш:
Як яны гадаваліся,
Чы яны раскашаваліся?
Настрадаліся, брацейка,
Але ж пагадаваліся,
Хоць жадныя былі куску хлеба,
А цяпер павывучваліся
І сталі на ногі.
Але ж нам свет нямілы,
Шчо дзеці жылі без бацькавай ласкі.
Да я ж надзеюсь, брацейка,
Шчо цяпер прыйдзе да мяне
Твая дочанька,
Бо яна мая хрышчэніца,
Мае хаты не міне.
А я ж не знаціму,
Чым устрачаці:
Чы з хлебам і чаркаю,
Але страчаціму з добраю ласкаю [...]
А поўныя вочы слёз.
Бо яна тожа знае,
Шчо трэба да сваіх хіліцца
І хоць са мною павесяліцца.
Ох, мой брацейка!
Шчо б ты зарэ пабачыў!
Які твой сынанька Іванко!
Да які высокі,
Да які вясёлы,
Да які прыгожы,
На цябе пахожы.
Да як прыедзе летам на канікулы,

Да як заграе на баяне,
Да як заспявае,
То не толькі мы, родныя,
Але і людзі плачуць,
Шчо сірата, а такі ўдаўся
І на ўсё прыдаўся.
Да ўсе людзі кажуць,
Шчо яму цаны ў міры няма.
Да пісаў мне пісьмо,
Шчо прыедзе ў госці.
Да я ж яго буду са слязьмі страчаці
І цябе спамінаці.
Шчо ніхто яго не вучыў,
Ніхто не напраўляў,
А свая галава направіла і вывучыла.
Да прашчай, мой брацейка!
Да прашчай, мой родненькі!
Можа, не ўсё табе расказала,
А можа, ты і сам усё добра знаеш,
Но нам не саабшчаеш.
Можа, табе там няволенька?
Ты нам не раскажаш.
Можа, ў цябе там работы багата?
А можа, табе цяжка,
Шчо насыпалі сырое зямлі на цябе?
Можа, ты там і гаворыш пастаянна,
А мы не чуем?
А можа, там цябе замарылі,
А можа, ўтапілі,
Шчо за семнаццаць гадочкаў
Мы слова не пачулі?

404. Ох, мой братка, мой родны,
Ох, чаго ж ты ляжыш,
Чаму ты не ўстаеш да работу не робіш?
О, брацíку, адкуль ета хмара выйшла,
Адкуль ета й бура выйшла,
Да й зламала, да й струшчыла маго брата?
Ох, мой братка, мой родны,
Прылятай, братка, салавейкам,
Да сядзь, брацейка, ў нашым садку на каліне,
Да зашчабячы галосненька,
Да зашчабячы харошанька,

То я й выйду да й паслухаю.
Да й думаці мне — то мой братка ў садочку
шчабеча.
Ой, дзякуй жа табе, братка, за работу,
Дзякуй табе, братка, й за заботу.
Ох, матанька, устрачай сваго сына, а брата маго,
Хто ж табе, братка, будзе воду там падаваці,
Бо табе ж вельмі галава баліць.

405. Ах, наш брацітка дарагі,
Ах, наш брацітка залаты,
А чаго ж мы цябе не ўмелі,
А мы ж цябе не дагледзелі,
А гэтакага малодзенькага,
А гэтакага дубочка мы пакідаць будзем,
у зямельку класці.
Ах, мой брацітка дарагі,
А падымайся ты,
А гэдакая пара харошая падходзіць,
А вясёначка,
А ўсе дзераўкі ажываюць, каторыя паламаныя,
Лісточкі пускаюць,
Ах, наш брацітка такі маладзенькі,
А ты ж пойдзеш у зямельку,
А мы ж боле цябе не ўвідзім.

## ПА СЯСТРЫ

406. А мая ж ты сястрычка, мая міленькая,
А як жа нам з табою расставацца,
І дзе нам з табою сустракацца?
Людзі ж — сястра з сястрой сайдуцца,
Сястра з сястрой пагаворуць.
А і з кім жа мне,
Сястрычка мая родная?

407. Ох, мая сястрыца,
Ох, мая парадніца,
Ох, мая совесніца!
З кім жа я буду саветавацца,
З кім я буду радзіцца?
Хто ж мяне будзе абшываці?
Хто ж мяне будзе абмываці?
Ох, мая сястрыца,
Да скажы мне,
Дзе ж мне падзецца?
Да куды ж я буду ў госці хадзіці?
Да да сястрычняй буду хадзіці,
Да твае слядочкі буду шукаці
І сваю сястрыцу пазнаваці.
Да скінься, сястрыца, галубкаю,
Да зашчабячы, да мне ўсю праўду
раскажы.
Да скажы, сястрыца, сваім дочкам,
А маім сястрычням,
Няхай яны мяне не цураюцца,
Да няхай мяне даглядаюць,
Да не пакідаюць.
Ох, мая сястрыца,
Чаго на мяне нагневалася?
Устань да пагавары.

Да я цябе замяню,
Няхай лепш я ўмру,
Бо мне ж вельмі трудненька
Адзінокаму.
А табе добра було жыці
Са сваімі дзеткамі.
А ты сабралася не ў пару.
Да няўжэ ты не чуеш,
Як яны цябе гукаюць?
Да чым яны цябе ўгнявілі?
Мо яны табе не ўгадзілі?
Да яны стараліся,
Ды да дактароў цябе вазілі,
Да думалі: табе раданька будзе.
Да заўзуленька прыляціць з выраю,
Да я буду выглядаці,
Да сваю сястрыцу пазываці.
Мо ты скінесся катораю пташачкаю
Да мне вестачку прынясеш,
Як жа ж табе там будзе?
Ох, сястрыца!
Да ўжэ табе не трэба нічога,
Ужэ ж ты адрабіла,
Ужэ ж ты адхадзіла.

408. Мая ж ты сяструлечка родненька! Куды ж гэта прыбралася? Ці пад вянец іці? Уся ж ты ў красачках, як у раёчку. Лучша б ты, мая сяструлька, з намі жыла і ў гразным хадзіла, весялей бы нам было.

409. Сястрыцка мая міленькая,
Нашто ж ты дзетак пакінула?
Настрадаюцца яны, па свету ходзячы,
Сваю матку шукаючы.

410. Мая ж ты сяструлечка родненька!
Каму ж ты прыказала, каму ж ты запаведала тваіх дзетухнаў глядзець? Да яны ж яшчэ малыя, не ўмелыя. Да яны ж па свету находзяцца, да ўсякаю матулькаю назавуць, а ў нас жа няма ж нікогачка роднага.

411. Ох, сястрычачка мая, дык ты ні йдзеш,
На каго ж ты сваіх дзетак пакінула?
Хто ж іх будзе ладзіці, хто іх будзе шкадаваці?

Сястрыначка ж мая й міла,
Чаму ж ты іх не пагадавала,
Чаму ж ты іх не падружыла?

412. А мая сястрыца, а мая Янінка,
А што ж ты зрабіла, а каму ж ты дзіцятка сваё кінула,
А хто ж яго будзіць гадаваць?
А мой швагрочык, а мой міленькі,
А тваё дзетачка будзіць гаротнае,
А ты пойдзеш работку рабіць,
Не будзе каму тваё дзіцятка прытуліць...

413. Прашчай, мая сястрыца,
Я ж цябе больша не ўвіжу,
Прыхадзі, мая сястрыца, за мною,
Мне ж дужа бальшоя горанька.
Каму ж ты пакінула сваіх дзетак?
Сястрыца мая любая,
Прыхадзі ж ты іх навяшчаць,
Прыхадзі у сваю хатачку,
Паглядзі жы ты сваіх дзетачак.
І сонейка свеціць,
І птушкі пяюць,
А ты не бачыш,
А ты не чуеш,
А ты ляжыш, не ўстаеш, не глядзіш у акно,
Дзетак не дажыдаеш,
Іх устрачаць не выходзіш,
І работка твая стаіць уся,
І хатка не мецена, і пасцелька не сцелена,
Ай, гора-горачка.
Прашчай, прашчай, мая сястрыца,
Праважаю цябе ў паследнюю дарожачку,
Праважаю цябе ў паследні раз,
Ты ў ету дарожку хадзіць не будзеш,
Прашчай, прашчай, мая сястрыца,
Прасці ж ты мне ўсё, мая дарагая.

414. Сястрыца мая, краснае сонца!
Каму ж ты сваіх дробных дзетак пакідала?
Каму ж ты іх прыказала?
Хто іх будзець да вума

Да розуму давадзіць?
Хто ж іх будзець на работу наражаць,
Сястрыца мая, краснае сонца?
На работу ж іх нарадзіць хто-небудзь.
А сястрыца мая, краснае сонца!
А з работы іх некаму дажыдаць.
Прыйдуць жа яны з работы —
Некаму іх пажалець.
Сястрыца мая, краснае сонца!
Яны ж а дзе не глянуць,
А дзе не сядуць —
Роднай сваёй маманькі нідзе не найдуць;
Без роднай жа іх маманькі,
Сястрыца мая, некаму іх пажалець.

415. Сястрычка мая родная!
Якое ж цябе горачка спасцігла.
Чаму ты мне не прызналася,
Шчо ты забалела гэтым ліхам?
Я б табе радачку шукала б
Чы ў дактароў,
Чы ў знахароў.
Ты ж мне, сястрычка, не прызналася,
Да ты ж умерла.
Сястрычачка родная!
Ох, які бог несправядлівы,
Шчо цябе ўзяў,
Маленькія дзеткі пакінуў,
Каму ты іх прыручыла,
На каго пакінула,
Каму ж ты іх даверыла,
'Шчэ б трое дзетак гадаваці?
Мая ж сястрыца,
Мая ж каліна,
Мой ты з розы цвяток,
Чаму ж ты рана асыпалася?
Чаму ж ты рана завяла?
Чаму ж ты не прыручыла мацеры сваёй?
Мая ж сястрыца,
Мая ж каліна,
Скажы ж ты мне,
З якімі ты пташачкамі ляціш?

Сястрыца ж мая,
Мая ж ты родная,
Як зайду я да цябе,
А твае дзеткі гукаюць,
Чаго ж ты не чуеш?
Мая ж сястрыца,
Мая ж родна!
Гукаюць цябе дзеткі,
Так, як сініцу
У кубле сінічанята,
А ты ж ляжыш
І не адзываешся да іх.
Ох, да загневалася, да зажурылася
На роднага чалавека
І да яго не гаворыш.
Ох, рана-рана, сястрыца,
З белым светам папрашчалась,
Рана...

416. Сяструлечка мая роднека,
Што ета ты надзелала
Сваім дзетачкам, сваёй дружынаццы?
Кінула ты сваіх дзетачак
Пад цёмненькай хмарачкай,
Пад вялікім дождыкам.
А ніхто ж іх, мая сяструлечка,
Цяпер не абагрэець, не пажалеець.
Будуць жа яны хадзіці
Па цёмных лясінках,
Па шырокіх дарожачках,
Сваю мамулечку шукаць.
А хто ім, мая сяструлечка,
Адгукнецца цяпер за мамачку.
Будзе ў іх, мая сяструлечка,
Нядродная мамачка,
Будзе ж яна ім
Сарочачку шыці,
Борздзенька праклінаці.
Будзе ж іх другая мамачка
А галовачку мыці,
За валосікі калаціці.
Сяструлечка мая родненькая,
Прасі ты свайго татулечку,

Прасі ты сваю мамулечку,
Каб яны тваіх дзетачак не кідалі.
Будзець жа, будзець, мая сяструлечка,
Горачка без мамулечкі жыць.
Дужа ж, мая сяструлечка,
Сіротачкам трудненька жыць.
Будуць жа іх усе
І штурхаці і піхаці.
Сяструлечка мая дарагая,
Прасі ты свайго братулечка,
Прасі ты сваю ўсю радню,
Каб яны тваіх дзетачак прыглядалі.
Будуць жа яны хадзіць, мая сяструлечка,
Як у полі й авечкі без пастуха,
Будуць жа яны сваю мамачку гукаць.
Адгукніся ж ты ім,
Мая сяструлечка дарагая,
Сваім дзетачкам хоць раз у гадок.

417. Сястрычка мая родная,
Прыехала к табе на такую цяжкую бяседу.
Ужо сабраліся ўсе і браты і сёстры,
І мама з бацькам, дзеткі твае і мужычок.
Усе гаворацъ к табе, а ты маўчыш.
Нікому нічога не адказваеш.
Мамка мая і твае — чуеш —
Просяць мяне, каб я з табой пагаварыла.
Я не знаю, з чаго пачаць.
Ты чуеш, сястрычка, я пытаю ў цябе,
Куды ты так сабралася далёка.
І так загневалася на ўсіх нас, нават на дзетак сваіх.
Яны ж стаяць каля цябе і трогаюць твае рукі.
Няўжо і дзетак сваіх не чуеш?
На каго ж ты іх пакідаеш, каму ты іх паручаеш?
Просяць яны свайго татку — твайго мужа,
Каб цябе нікуды не везлі і не неслі.
У іх астаўся татка, а мамкі не будзе.
Як цяжка ім будзе з чужой цёткай быць.
Сястрычка мая родная, мы з мамкай просім цябе,
Каб ты не абіжалася на нас.
Мы не былі пры тваіх паследніх мінутах жыцця.
Муж кажа, што вельмі цяжка табе,

Але ты нікому не казала да пасляняй мінуты.
Так твая галоўка балела, так твае ручкі балелі!
Мае ручкі трудалюбівыя? Ты не мінуткі не сядзела
без дзела,
А сягоння ляжыш і нічога не дзелаеш, аддыхаеш.
Але рана яшчэ табе на такі отдых.
Смерць забрала ад нас цябе не ў пару,
Яшчэ табе жыць ды жыць.
Мужычок твой сядзіць ля цябе з дзеткамі
І гладзіць твае рабочыя ручкі.
Сястрычка мая, мяне ты вучыла,
Каб берагла я сябе, калі што баліць — іці
к доктару.
А сама да пасляніх дзянёчкаў не шла,
а лячылася сама.
Чаму ты так зрабіла, мая сястрычка, чаму
не лячылася?
Татка мой дарагі, сустракай сваю дачушку,
Яна сёння к табе ад'язджае ад нас,
Раскажа табе, як мы жывём.
І з сваім сынком і ўжо з дачушкаю там будзеце,
Яны ж хоць хворыя, але цябе, старэнькага,
Будуць глядзець.
Сястрычка мая родная, так харашо прыбралася
У далёкую дарогу.
Ужо, сястрычка, нясуць твой домік,
А ён без акенцаў і дзвярэй, які страшны.
Як жа цябе праважаць, што табе на дарожку
сказаць?
Бярыце маю сястрычку памаленьку ды кладзіце
паціхеньку.
Вельмі ж ёй баліць галоўка.
Выносьце яе паціху.
Дзеткі, прасіце сваю мамку,
Каб яна прыходзіла к вам
Ці прылятала галубком ці кукушачкай
І садзілася на кляночку пад акенцам
Ды кукавала вам і на вас паглядала.
Пасляняе прашчанне з табой, дарагая сястрычка,
Пасляняе расставанне.
Сняжок падае на тваё лічанька і на ручкі,
Так холадна, а ты ляжыш і не чуеш холаду.
Як цяжка нам усім расставацца з табой.

Ужо больш ніколі не будзем бачыць цябе,
Не будзем гаварыць з табой.
Прашчай, наша любімая сястрычка,
Слухай, як хараша просяць твае дзеткі:
«Астанься, мамка, з намі, не хадзі!»
Крычаць: «Не закопвайце мамкі!»
Як цяжка нам усім ісці дамоў без цябе!
Прашчай, мая дарагая сястрычка!

418. А мая сястрыца, ты, бувало, нас увідзіш — нам не казала; а ты ж, бувало, раненька ўцякала, позненька ўцякала, голымі рукамі яму агонь насіла.

419. Мая ж ты сястрыца,
Мая ты родная,
А я ж цябе гадавала,
Ты асталася сіротка
Пяцігадовая.
Усе пташачкі,
Усе мурашачкі,
Усе пааджываюць,
А ты ж у зямельку кладзешся,
А я ж да цябе буду хадзіці,
Да цябе буду лятаці
Штонядзельку на магільнічак.
Я кветачкі садзіла,
Я кветачкі палівала,
А я ж магілачку тваю
Слёзкамі аблівала.
А калі ж ты да мяне прыйдзеш,
Калі ж ты да мяне загаворыш?
А я ж цябе гадавала,
А ўсе твае таварышкі
А ўсе вялікія выраслі.
Я на іх пагляджу,
Слязьмі заліваюся...

420. Мая ты сястрыца,
Мая ты родная,
Як я цябе гадавала,
Як я цешылася,
Што я з табой буду жыці.
Як ты памерла,

Асталася я адна.
Усе твае таварышкі
Усе твае гуляюць,
Усе весяляцца.
А ты, маладзенькая,
У зямельцы ляжыш.
Зязюля кукуе,
А я слёзкі выліваю.
Мая ты сястрыца,
Я толькі прашу бога,
Каб цябе сасніць,
Каб з табою
У сне пагаварыць.
Усе твае таварышкі,
Яны ўсё гуляюць,
Яны ўсё збіраюцца,
А ты, маладзенькая,
У зямельцы ляжыш.
Прыходзе вясніца,
Усе кветачкі расцвітаюць...

421. А мая Анчычка,
Мая сястрыцачка,
Што ж ты нарабіла?
Хатку аставіла,
Косцічку аставіла,
Пайшла ў цёмную хатку,
У віднай не захацела жыць,
Што ж ты нарабіла?
Будзеш адна ляжаць
У цёмнай хатачцы,
Без сваёй радзінкі.
Прыйдзець вясёнка,
Зязюлька будзіць кукаваць,
А мы будзем памагаць,
А ты нагаравалася,
Набадзялася.
У Германіі пагаравала,
Толькі даждалася жыткі.
Хата харошая,
Дзеткі павыраслі,
А ты хатку кідаеш,
Астаўляеш усіх.

А мая сястрыца,
А калі ж убачыш мамачку,
Раскажы ёй пра мяне,
Як я тут гарую,
Як я тут мучуся.

422. А мая ты сястрыца,
Мая ж міленькая,
Чаму ж ты адкідаісся,
А чаму ж паміраеш,
А чаму ж нас пакідаеш?
А каб я з табой пайшла,
А каб я з табой жыла тама жа...
Бывай, мая сястрыца,
Бывай, мая міленькая,
Бывай, мая родненькая,
Выбачай, мая сястрыца,
Можа, я калі цябе скрыўдзіла,
Можа, я табе калі дрэнна зрабіла.
А мая ж ты сястрыца,
Ты ж ідзеш на тот свет,
Ты ж там будзеш раней за мяне,
Ты ж там пабачыш нашу мамульку
І нашага роднага татульку,
Можа, ты там спаткаеш
І нашага брацітку.
Пакланіся ўсім ад мяне,
Раскажы ім, як я тут гарую.
А мая ж ты сястрыца,
А мая ж ты родненькая,
А вазьмі ж ты мяне з сабой...

423. А прашчай, мая сястрыца,
А прашчай, мая дарагая,
А болі ж я цябе ні ўбачу,
А болі ж я цябе ні ўстрэчу.
Зарастуць твае сцежкі-дарожкі,
А на якой жа мне дарожаццы цябе сустракаці?
А ў якой жа кучачцы цябе пазнаваці?

# ПА ДЗЯДУЛІ І БАБУЛІ

424. Дзедка мой, галубочак мой!
А хто ж мне цяпер лапцейкі спляце?
А хто мне цяпер аборачкі саўе?
А хто ж мне цяпер гарошак перавее?
Цяпелца дагледзе ў гумне?
Хто ж мне цяпер мяцёлачку звяжа?
А цяпер нам з табой, дзедка, болі
не ўбачыцца.
Усё ты мне, дзедка, адказаў,
Нахажуся босая і голая,
Некаму мне без цябе, дзедка, ні сплесць,
ні звіць.

425. А мой жа ты дзедзечка!
Да ты ж нам хадзяйства вадзіў,
Хоць сам стар быў, а ты ж усюды даглядзіш.

426. А мой жа ты дзядулечка!
Да ты ж нам лапцікі плёў і баронкі збіваў,
Хто ж нам усё гэта цяперацкі будзець дзелаць?

427. Мой жа ты дзюдзечка! Да ты ж бывала нам грабелькі зробіш, да ты ж іх і памеціш, штоб мы за іх не сварыліся.

428. А мой жа ты дзядулечка!
Як наш татулечка куды пойдзець,
А ты ж усё з намі сядзіш,
Нас усяму навучаеш.

429. Мой жа ты дзядулечка,
Нас жа цяпер суседзі расканаюць.
А ты ж нікогачка не будзеш баяцца
і слушацца.

430. Мой жа ты дзядулечка!
Да прыехаў к нам бацюшка,
Да не вясёла ж ён будзець маліцца,
Да ён жа цябе будзець праводзіць
на месца,
Куды яшчэ вам ранонцы.

431. А мой ты дзядулечка, а мы ж цябе ўжо не ўвідзім, а ты ж гэткі добры быў. А хто ж з намі гуляць будзе? А чаму ж цябе ў цёмную цямніцу вязуць, цяжкімі дзярночкамі ножкі спаўюць?

432. А мой жа ты дзядулечка!
Да ты ж ужэ з намі паследні разочак
відзішся,
Да табе ж аднаму будзець скучна.

433. Дзедушка міленькі, устань!
Паглядзі на нас, унучат!
Паглядзі, якія мы вялікія выраслі,
Адкрый свае глазанькі галубыя,
Што на нас так весела глядзелі.
Адкрый свае губанькі,
Што нас цалавалі пры сустрэчы.
Дзедушка, міленькі,
Калі б я тут жыла,
Я б табе кожны дзень
На магілу кветачкі насіла б,
А зімою на паперы рысавала б.
Дзедушка міленькі!
Мы ехалі к табе і не зналі,
Што ты памрэш і ў сырую зямельку пойдзеш.
Я вязу табе свае адзнакі,
Каб ты паглядзеў і парадаваўся.
Я ж табе ў пісьмах пісала,
Што вучуся толькі на «пяць».
А можа, ты, дзедушка, чуеш, што я гавару,
Можа, ты слабы, што мне не адказваеш.
Дзедушка, дзедушка,
Адкрый свае вочкі ды паглядзі.

434. Мая ж ты бабулечка!
Да ты ж нас глядзела, як родная матка,
Да ты ж нас абмывала,

Да ты ж нас абцірала,
Да ты нас усякаму парадку навучала
І ад бяды нас ізбаўляла.

435. Бабулечка наша родная,
А нашто ж ты нас пакідаеш?
Ты ж нас калыхала і гадавала,
Наша тружданніца, наша бабунічка,
А цяпер ты нас астаўляеш!
Мы ж твае ручкі па'тарвалі,
Нас носючы,
Твае ножкі прытамілі,
Нас калыхаючы,
Прыказкі нам усякія спяваючы,—
Бабусечка наша родненькая!

436. Бабачка наша родная,
Як наша маці ўмерла,
То ты ж нам яе замяніла.
Ты була нам і мамачка,
І парадніца, і саветніца.
Бабачка родная,
Галубачка сівая!
Твае ручанькі нас насілі,
Твае ножанькі калыхалі.
Ты ночы не спала,
А нас даглядала.
Бо наш бацька родны
Як аддаў да цябе,
То ніколі не заглянуў,
Як мы тут у цябе жывём.
Ох, бабачка наша,
Ох, грушачка старэнькая!
Яка ж ты нам міла,
Яка ж ты нам салодка.
Да каго мы прытулімся,
Да каго мы прыхілімся?
Як жа мы цябе забудзем?
Ты ж нас калыхала,
Ты нам песні спявала,
А цяпер да нас не адзываесся.
Ох, ты ж нам найраднейша,
Ох, ты ж нам наймілейша.

437. А бабачка, а родная!
А казюлечкі павылазяць, а мурашачкі,
А нашае бабкі не будзе.
А бабка, бабка, пазарастаюць нашы сцежачкі,
Нас чужыя дзеткі біцьмуць,
А некаму ж бараніць будзе.
А прыедуць жа дзяўкі,
А хто ж іх частаваць будзе,
А хто ж іх глядзець будзе?
А нашае бабкі ўжэ не будзе.
А мы ж і скажам:
— Бабачка, міленечка, уставай,
Бо табе ж цёмненька,
Табе ж тут кроўненька,
Хадзем жа, бабачка, дадому.

438. Бабка мая, зязюлька мая!
Хоць бы ты ў запечку пасядзела,
Дзіцяткі майго паглядзела.
Хоць бы ты яго панянчыла,
Хоць бы ты яго пакалыхала.
А цяпер некаму яго паглядзець,
Некаму яго пакалыхаць.
А як ты была, мая бабачка,
Куды я не пайду, мой дварок быў заведумам,
Мае дзеткі былі прыгледжаны.
А цяпер няма маёй бабачкі,
Некаму мне скацінку загнаць,
Некаму мне дзіцяткі пакалыхаць.

439. Мая ж ты бабулечка! Да прыехаў к нам татуля з дзячком, да нядобрую весць яны скажуць нам, да запяюць яны вечную памяць табе, а што ж ты так рана захацела таго, да хто ж цябе ўгнявіў так, а божа наш, божачка.

# ПА ІНШЫХ СВАЯКАХ

440. А цятулечка ж мая, а зязюлечка мая!
А цётачка ж мая, лябёдачка!
А куды ж ты выпраўляешся?
Куды ж ты ранелька выражаешся?
Не ўсю ж ты сваю радзіначку пасабрала,
Не паслала ж ты сакалiначку
Па сваю родную радзіначку.
А цётачка мая, зязюлечка!
А няма ж жа ўсіх тваіх пляменнічкаў,
А некаму ж табе шчабятаці.
А цётачка ж мая, зязюлечка!
А пакінула ж ты сваіх дзетачак дробных,
А хто ж іх будзець гадаваці?
А няма ж у іх татачкі роднага,
Цятулечка ж мая, зязюлечка ж мая,
А яны ж усе дробненькі і неразумненькі,
А некаму ж іх будзець гадаваці,
А іх жа будуць людцы забіджаці,
А некаму ж іх будзець прадасцерагаці.
Многа будзець загаднікаў —
А хто ж жа будзець парадачак ім паказваць?
Хто з імі будзець распаражацца?
А хто ім будзець пуць паказваць?
Аніводнаму ты парадак не дала,
Хто ім будзець парадак даваць?
Ніводнаму ж ты парадку не дала,
А цётачка ж мая, зязюлечка!
А як жа ты будзеш там прывыкаць?
А не баляць жа сягодні твае ручачкі, ножанькі,
А нікога ж ты к сабе не гукаеш,—
Чым жа мы цябе ўгнявілі?

441. А цётачка мая родная,
А ты ж мяне параймала.
А чаго ж ты мяне цяпер не устрачаеш,
А ці твае белыя ножанькі астылі,
А ці твае белыя ручанькі сашчапіліся?
А цётачка мая мілая,
А пазарастаюць жа твае сцежкі-дарожкі,
А дзе ж хадзілі цётчаныя роднае ножанькі,
А начнецца ж цёплае лецетка,
А прыляцяць жа з таго боку салавейкі,
А я ж буду ў вакошка паглядаць,
А ці (а)дтуль салавейка, дзе наша родная
цётачка?
А я ж яго буду салавейку распрашаваць,
А як жа наша цётачка там гаруіць,
А як жа наша цётачка па нас там таскуіць...

442. Здрастуй, мая цётачка мілая, здрастуй, любімая! Лябёдушка мая мілая, лябёдушка мая любімая, а што ж ты гэта гурненька дужа стала? Уся к табе радзіна папрыйшла — слова птушачкі, пазляцеліся усе мы; па табе, мая цётушка, какуем і гаруем, а ты, мая цётушка, гурненька стала, нікому ты ні 'твету, ні прывету не даёш, а ты ж то бывала на мяне гаворыш:

— Пляменушак мой мілы, пляменушак мой любімы, ты ж то мне не пляменушак, а ўсё раўно як родная дачушка: мы б з табою, Аўдотачка, і дзень ба і ноч гаварылі — ні разу б свайго гора не перагаварылі!..

— Пляменушак мая мілая, пляменушак мая любімая, а што ж ты, пляменушак, рана гасподзь цябе агарчыў?

— Цётушка мая мілая, цётушка галубушка, цётушка Дзям'янаўна, знаць я госпаду богу праграшыла.

Не ўмела няўжлі ж то я, цётушка, богу маліцца, госпада бога прасіць? Саграшыла я госпаду богу і прагнявіла, што мая цётушка раненька, дружачка, мяне пакінула!..

Агарчыў ён мяне з дробнымі дзеткамі: паразляцеліся мы, слова птушачкі, па чужым гнёздушкам — так мы ходзім па чужых людзюшках.

А ў чужых жа людзей нада ўмеючы жыць, усякаму нарравіць і гадзіць, а ў чужых людзёх і гадзя не ўгадзіш, і наравёмшы не ўнаравіш, і служа не ўслужыш, калі сілушкі нету, ножухны падламаюцца і ручухны апускаюцца — з адных дум толькі што думаеш, думаеш, гадаеш, гадаеш, як то

на белым свеце жыць, як то па чужых углушках хадзіць, сілушку надбіўшы, век наджыўшы...

*(Цётка ёй, Аўдотцы, адказвае:)*

— Пляменушак мая мілая, пляменушак мая любімая, гаруй, мая какушачка, знаць ты, пляменушак, у няшчасны дзень зарадзілася, худэю доляю надзялілася!..

— Цётушка мая галубушка, цётушка мая мілая, а як жа нам цяпер без дружачкі ўгадываць? Яны ж цяпер, дзеткі дробныя, засталіся, калі б я ж адна засталась, не клапатала б я і не гарувала,— у мяне жа ж то і сілушка падабралася. Як жа то мне гэтых дзетушак узрасціці і на месцечках апрыдзяліці?

— Пляменушка мая мілая, пляменушка мая любімая, і не клапаці ж ты, і не захадзіся ты дужа, і не ўбівайся так ужо: када госпаду богу ўгодна будзець, не будзеце ж вы галодны — гэта ўсё госпадня сазданія: госпадзь разгневаецца, госпадзь і памілуець.

Маліська ты госпаду аб сваём здароўі і аб дзетках аб сваіх! Цэла ж ты будзеш,— не ўбівайся ты так, а ў госпада бога міласці многа прасі: не забудзець цябе госпадзь.

443. Да ўжэ каторa ўрэмячка
Я цябе, цётухна, гукаю.
Бо ўжэ ўсёй двор наз'язджалася,
Поўна хата, поўна вуліца людзей.
Чаму ж ты іх у хату не зазываеш,
Чаму ж ты іх не ўгашчаеш?..
Да табе ў сваёй сямейцы
Толькі жыці і парадачкі весці.
Да ў цябе нявестачка,
Што родная дочачка,
Да ў цябе і чалавек добры.
Да няхай бы ты Васечку
У армію выпраўвадзіла
І з арміі сустрэла,
Бо над роднай маманькі
Няма лепшай радзінанькі.

444. Раскажы, цётухна,
Няўжо твая хата гэта
Така невясёла,
Шчо ты з ею прашчаешся
Да ў такую малую,

Да ў такую цёмную
Ты перабіраесся?..
Куды ты адпраўляесся?
На каго ты нас пакідаеш?

445. Ох, як прыйшоў твой сынанька,
То я думала, шчо ў армію
Звацъ выправажаці.
Аж вон прынёс вестачку невясёлую.
Ох, мая цётухна, мая мілая,
Шчо ж ты так рана
Ад нас улятаеш?
Да падзівіся, цётухна,
На сонейка краснае,
Бо там сонца не пабачыш
І людзей не ўбачыш...
З якімі пташачкамі ты паляціш?
Ох, цётухна, пасняшыла:
'Шчэ ўсе пташачкі кругом лятаюць
І з намі спяваюць.

446. У якую невясёлую дарожаньку
Ты нас вядзеш?
Ох, я ж думала, цётухна,
Шчо ты ідзеш
На сваю старую пасе́лею.
Можа, будзеш грушачкі збіраці,
Да пражыла там больш за трыццаць
гадочкаў.
Да була така рабоча да ахвоча,
Да не ўцякалі ад цябе ні ягады ні ґрыбы,
Да ты ў калхоз хадзіла
І дзялкі рабіла.

447. Паследнюю мінутачку,
Паследнюю гадзіначку
Я з табою бачуся.
Ох, дабранач, цётухна,
Дабранач, мілая.
Мы ж з табою больш не пабачымся,
Мы ж з табою больш не пагаворым.
*(Звяртаючыся да дачкі)*
Ох, Жэнечка, ох, сястрыца,

Пагукайма тваю мамаиьку,
Няхай яна хоць адтуль пастукае,
Да мы стук паслухаем
І ніколі яго не забудзем.

448. Ох, наша цётанька,
Наша хрышчоная,
Ты ў нас була не за цётку,
Да за мацяру.
Да мы ж да цябе прыходзілі
За саветам і за парадаю.
Да ты ж нас ніколі
З голымі рукамі не выправадзіш,
Не ў торбачках, то ў вузельчыках
Нам заўсёды надаеш.
Наша цётанька, наша мучальніца,
Не гневайся,
Шчо мы да цябе часта не прыходзілі.
Бо сама знаеш —
Мы далёка жывём,
За ракою Прыпяццю.
Да мы і самі сіроты гадаваліся,
І цяпер свая сямеечка,
І здароўейка няма.
Да папрыяй нам, цётухна,
Можа, мы пасля тваёй смертанькі
Будзем здаравейшыя.
То прашчай, наша цётанька,
Да спі спакойненька,
А мы ўжэ паедзем дадому,
Бо наша дарога не блізкая.

449. Як жа табе, цётухна,
Тут спалася, як начавалася?
Ці ты вячэрала,
Ці ты снедала?
Да раскажы, цётухна,
Як там цябе стрvaraчалі:
Чы з сур'ёзам, чы з угрозам,
Чы з ласкаю, чы з музыкаю?
Устань, цётухна, устань, мілая,
Да хадзі з намі снедаць...

450. Здрастуй, пляменушак мой мілы, пляменушак мой любімы! Што ж ты, пляменушак, нічога не гаворыш? Бывала, як прыйдзем:

— Цётушка мая мілая, цётушка любімая, пасядзі ж ты ў нас!

Голуб наш сізы, голуб наш мілы, пляменушак мой любімы, куды ж ты ад нас адлятаеш? А і дзе ж нам, пляменушак, па каторай дарозе нам цябе сустракаці, з каторай старонушкі нам будзіць цябе дажыдаці?

Сястрычанька мая мілая, сястрычанькая мая любімая, худая наша долюшка з табою!

Знаць, мы не ўмелі, сястрычанька, госпада бога маліць і прасіць.

Адзін у цябе сыночак быў, сакалочак, надзеждушка верная, мілая!

А ў вас ужо сілушка падабралася: на каго начаяцца і надзеяцца?

Каго ж то вам цяпер на работу зацяваць, з работушкі дажыдаць?

Людзі будуць ісці, а вашы дзетушкі у вокны глядзяць, усё плачуць, слёзкамі абліваюцца, яны ўсё свайго татухны дажыдаюцца.

Дзетушкі мае мілыя, дзетушкі любімыя, што ж, калі наша долюшка худая, нешчаслівая? Не ўмелі мы свайго бацюшку з работушкі дажыдаць і на работушку пасылаць. Не дай жа, госпадзі, сіротушкам аставацца, з чужымі бацюшкамі заставацца: ён яго харашо не прызрыць і на работушку харашо не пашлець, з работушкі радасна не дажыдаець.

З каторай старонушкі цёплы ветрык на вас павеець, горкіх сіротушак жаркае соўнышка прыгрэець?! Яны ў горынку прыйдуць, яны сабе месца нідзе не найдуць; куды ні глянуць, усё бацюшкі роднага нету.

Пляменушак наш мілы, пляменушак наш любімы, якую ты загадачку загадаў? Якую думушку задумаў, што не магем яе ні раздумаць, ні разгадаць, ні добрым людзём расказаць?

Парадушка наша верная, парадушка наша мілая, уся к табе, мой пляменушак, радзінушка пасабралась. Што ж ты, мой пляменушак, ні з кім не хочаш гаварыць? Ты ж, бывала, к нам прыбежыш і прыюцен ка ўсякаму; цяпер жа, наш пляменушак, ні з кім нічога не гаворыш, нічогенька нікому не 'твічаеш.

А мы ж то каля яго, слова тэя птушачкі, б'ёмся, усе, слова тэя кукушачкі, у полі какуем.

Як ты матушку зрадзіў, як ты бацюшку абідзеў?! Яны ж то, дзіцёначак, усё табе радаваліся: «Слава табе, госпадзі, што наш сыночак і вумен і разумен!..»

Цяпер жа ты зрадзіў сваю мамухну і татухну: а як ім цяпер старасці дажыдацца?

А мы ж то на цябе надзеяліся і начаіліся — хоць жа ў нас у дзвюх сястрычаньках адзін сыночак радзіўся!

Бывала, мне гаворыш ты:

— Цётка ты, цётка, не гаруй ты, не гаруй: людзі і чужых не кідаюць. Хоць жа бог табе талані не даў — я ж цябе буду бярэч!..

Пляменушак мой мілы, пляменушак мой любімы, а мы ж то на цябе надзеяліся і начаяліся, усе: усім у сваім раду пячалі задаў,— усе мы па табе гаруем, усе мы па табе какуем.

Нашы па табе, пляменушак, ножухны падламіліся, нашы па табе, галубок, ручухны й апусціліся.

Якаво ж то нам з табою разтрывацца? Пляменушак мой любімы, велей бы мы на тваім месцы ляглі, чым ты нам гэтакую загадушку задумаў!

Твая ж то мамухна ўсе свае глазухны праглядзела ў вакошачка, цябе з поля дажыдаючы. Як маханькія ўміралі, ну, не так вас тада жалка была.

Падвор'ейка наша мілае, падвор'ейка наша любімае, красавалась ты пры пляменушку!.. Бёрнушка к бёрнушку прыгоніць так ладненька, ажно сматрэць прыгожа і люба. Ці харашо? Ды харашо, пляменушак, дужа харашо: для сябе ж ты стараешся.

Усягда дравец прыпасець: раненька нарубіць і сам прынясець — такей рупатлівы, услужлівы [...].

Без нажа ты нас зарэзаў — агу, мой галубок! Галубок, а, галубок, спрашыюць цябе твае дзетухны: Петрачок твой і твая Паволка:

— Ідзець, не йдзець наш бацюшка, наш радзіменькі? Вон, вон ён ідзець... Не, не, не, ён, не ён... І давай плакаць узрыгаючы.

Душа рвецца, на іх гледзючы — мы тожа плакаць наўзрыд — нясцерп нам тады.

Прыляці ж ты к нам хоць сізым галубком, пабяседуй хоць адну часіначку з намі, паваркуй са сваімі дробнымі дзеткамі, павесялі іх нямножка!..

451. А мой жа ты пляменнічак,
Ты харошы быў,
Сваю цётку любіў,
А я ж табе лякарствачкі насіла,
А я ж табе дактароў вазіла,
А ты памёр...

452. Міша, устань,
Паглядзі, што твае друзья
Прыйшлі цябе ўсе праважаць
І твой настаўнік.
Хоць адно слова ты ім скажы на прашчанне.
Перадавай прывет бабушке і дзедушку.
Можа, ўбачыш і майго тату,
То прывет перадай.
Каго ўбачыш, усіх,
То прывет перадай
І раскажы, як мы жывём,
І жджэце нас наўсягда.
Ты ж яшчэ гэтакі малады,
Табе сюды не трэба йці.
Устань, Міша,
Я лягу на тваё месца.

453. Валодзечка, да сзідання!
Ты ж мне ўсё прыязджаў,
Да мне ўсё памагаў,
А цяпер жа ўжо не прыедзеш,
Да нічога не паможаш.
Паглядзі, Валодзечка,
Што ля цябе робіцца,
Сколькі цябе таварышаў праважаюць!
Да падзякуй жа ты ім усім,
Як яны цябе хорашанька неслі
Да пяць кілометраў.
Да яны з трудамі не шчыталіся,
За што ж ты так на іх абідзеўся,
Што ты нічога ім не скажаш?
Прашчай, Валодзечка, прашчай,
Не абіжайся!
Можа, што табе я нядобра калі зрабіла,
За ўсё прасці...

454. А Колічак, пляменнічак,
А дзетачка мае,
А няхай бы я лепш лягла на тваё месц
Няхай бы ты свае дзеткі гадаваў.
Як ты сваю мамачку пакінуў?
А ці табе, Колечка, было гора,
А ці табе было дома плоха,
А як ты свае сыночкі аставіў?
А Колечка-пляменнічак,
А што ж ты і зрабіў нядобра,
Да як такі маладзенькі,
Да як ты там улежыш?
А прыйдзець вясна, Колечка,
Да закукуе зяўзюлька,
А як жа твая мамачка будзе плакаць,
Яна ж думае, што ты ёй славечкі гаворыш,
А будзе слухаць,
А ты ж ёй нічога не скажаш.
Ой, а Колечка, Колечка,
А яка хатка твая цямненька,
Да без вокан,
Да ў яе сонейка не свеціць, не,
Да як ты тут ляжаць будзеш?

455. А што ж ты нарабіла,
Дзеванька маладзенькая?!
Ты ж усю радзінку засмуціла,
Мамачку ўгнявіла.
Мая сястрыца,
Мая даражэнькая,
Адкуль да цябе
Такое горачка прыкацілася?
А Зонька гэткая вясёлая была,
Гэткая пацешная,
Такая разумная.
Мая сястрыца,
Мая міленькая,
Як табе дапамагчы
У гэткім вялікім горы?

456. А мая сястрыца,
А мая мілая,
Чаму ж да цябе

Такое горачка прыкацілася?
Чаму ж такую
Дзяўчыначку-ягадачку
У трунaчку палажыла?
Яна ж у маладым веку
Будзець зямельку парыць.
А чаго ж ты, пташачка,
А чаго ж, вясенняя,
Ды ад нас адлятаеш?
А ці ты, пташачка,
А ці ты, вясенняя,
Ды на нас загневалася?

457. Адлятае ў садочку з вішанькі цвет,
Пакідае хатачку Кацярынка,
Пакідае татку з мамкай,
Усю нашу радзінку.
А што ж ты ляжыш, Кацярынка?!
Па табе ж мамачка твая
Ужо зусім знясілілася.
Ёй піцькі падаюць,
Яе ж усе угаварываюць,
А яна трудзіцца
Па табе, дзіцятка,
Па табе, наша Кацярынка.
Мая сястрыца,
А ты ж ужо не паможаш,
А ты ж падумай,
Што табе яшчэ
Дзетак гадаваць.

458. А мой ты татухна, нашто ты нас пакідаеш?
Ты стары чалавек быў, усё нам лучша было.
Чаму ты маіх дзетухнаў не падрасціў?
Чаму ж ты нам парадку не даў?

459. Ах мой ты татачка, хто ж наша будзець прыглядаць усё?
А хто ж нашых дзетачак і хазяйства прыгле́дзіць?
Мы на работачку пойдзем, а ты ж нам, бывала,
усё прыглядзіш.
Мы ж з работачкі прыйдзем, дык у нас усё гатовае.

460. А мае дзетанькі,
А мае кветанькі,
Што ж гэта нарабілася?
А мой ты татачка,
А мой жа родны далёка.
А ты ж у мяне
Быў за роднага,
А ты ж мяне ўважаў,
А ты ж маю радню прымаў.
А ты ж мне і дзетак
Памог гадаваць.
А прабачай мне,
Мой татачка,
Можа, я цябе не паслухала калі,
Я ж старалася.
Дзякуй табе, татачка,
За ўсё тваё добрае.
А ты ж і навучаў мяне.
Я ўсё і не ўмела,
А ты ўсё падказваў мне,
З дзеткамі вадзіўся.

461. Ох, наш татанька!
Ох, наш родненькі!
Чаго ты ад нас так рана адыходзіш?
Чаго ты на нас так нагневаўся?
Да ты ж у мяне буў
За роднага, за адзінага.
Да мы будаваліся,
То ты прыходзіў да нас
І днём, і ўночы памагаў.
Да хто ж цяпер да нас
Будзе прыходзіці?
Каго ж нам устрачаці?
*(Да мужа)*
Ох, мой Санечка!
Ох, мая дружынанька!
Ох, якія мы нешчаслівыя!
Да ў мяне няма татанька,
А цяпер і ў цябе няма.
Ох, мае дзетанькі,
Ох, мае сыночкі,
Ох, мае мілыя!

Вы ж таго дзеда не знаеце
І з гэтым прашчаецеся.
Няхай бы ён 'шчэ трохі пабуў,
Каб вы яго ўспаміналі,
Да шчоб больш запомнілі.
Да прысніся, родненькі,
Да папрыяй нам з таго свету,
А ў сне пасаветуй нам,
Як жа жыць,
Каб мы цябе ўспаміналі
І ніколі не забувалі.

462. А матулечка мая, а з кім ты мяне пакідаеш?
А хто маіх дзетачак будзець вадзіці?
